

Павел Савоська

# Апошні сезон

ПАВЕЛ САВОСЬКА

# АПОШНІ СЕЗОН

Аповесці, апавяданні

Мінск
"Галіяфы"
2009

УДК 821.161.3
ББК 84(4Беи)
С12

**Савоська, П. П.**
С12 Апошні сезон : аповесці, апавяданні / Павел Савоська – Мінск : Галіяфы, 2009. – 398 с.
ISBN 978-985-6906-25-4.

Павел Савоська стварае цікавыя і запамінальныя вобразы і характары, дакладна перадае каларыт сваёй эпохі. Аўтар знаёміць нас з падзеямі і асобамі, прымушае кожнага задумацца і суперажываць за іх лёс. Героі кнігі – звычайныя людзі, якія трапляюць у складаныя ўмовы жыцця, паўстаюць перад праблемай выбару і вымушаны на аснове свайго досведу рабіць аналіз сітуацыі і прымаць рашэнні; гэта людзі неспакойныя, яны не ўмеюць прыстасоўвацца, шчыра вераць у чалавечую дабрыню і ў перамогу светлага. У кнігу ўвайшлі новыя аповесці "Апошні сезон", "Фіктыўны шлюб", "Грэшнік" і шэраг апавяданняў.

**УДК 821.161.3**
**ББК 84(4Беи)**

**ISBN 978-985-6906-25-4**

© Савоська П. П., 2009
© Афармленне. ПВУП "Галіяфы", 2009

*Маці сваёй, Марыі Міхайлаўне, прысвячаю*

# АПОВЕСЦІ

# Апошні сезон

*Шурфоўшчыкам Калымы і Чукоткі*

*“Вся Чукотия есть не что иное, как громада голых камней, климат же здесь самый несносный”.*

**Капитан Иосиф Биллингс, 1792 год.**

## Частка першая

Дзесьці так у канцы верасня ўдарыў урэшце сапраўдны мароз. Праўда, падмарожваць пачало значна раней, але толькі цяпер ён з размахам і імпэтам узяўся за сваю справу. Даўно пабялелі вяршыні навакольных сопак. Снегам на Чукотцы здзівіць цяжка, бо ён можа завітаць у госці нават у сярэдзіне кароткага і халоднага лета.

У горнага майстра разведучастка Сцяпана Артамонава з самай раніцы быў прыўзняты настрой. Праз які тыдзень можна будзе выязджаць на праходку шурфоў. А гэта значыць, што ў ягоным жыцці хутка пачнуцца змены. Апошні шурфовачны сезон. Як ён яго чакаў! Праз якіх восем месяцаў скончыцца ў яго тэрмін адпрацоўкі пасля інстытута, а там... Нават уявіць сабе цяжка: яго чакаў шасцімесячны водпуск з наступным звальненнем.

Вось так! А як вы думалі! Налюбаваўся і прыгажунямі-сопкамі, і палярным ззяннем. Няхай і другія крыху хапянуць паўночнай рамантыкі.

Калі шчыра прызнацца, то на Чукотку Сцяпан трапіў не з уласнага жадання. У яго і ў дум-

ках не было размяркоўвацца ў гэткую далячынь. Але ўсё так склалася, што выбару ў яго амаль не было. Пачалося ўсё яшчэ на трэцім курсе інстытута. Выкладала тады ў іх палітэканомію Таццяна Іванаўна Бугаёва. Удзельніца вайны, жанчына сур'ёзная, са сваімі думкамі і поглядамі на жыццё.

І трэба ж было яму аднойчы выступіць на семінары ў абарону Мікалая Бухарына. Ён многа пра яго ведаў. А тут, на ўсю аўдыторыю, бэсцілі ні за што ні пра што такога чалавека. Слова за слова... Карацей кажучы – усчалася спрэчка. Ён ніколі не думаў, што Таццяна Іванаўна можа так разнервавацца. Стаяў ля акна, а яна паволі падыходзіла ад дошкі да яго... Твар збялелы, а ў вочы страх было зірнуць. Ён не на жарт спалохаўся, бо яму падалося, што яна зараз ударыць яго. Чамусьці гэтая думка адразу ж засела ў галаве і найбольш палохала яго. Ударыць – гэта яшчэ што, а куды пасля падзецца ад сораму? Каб жа толькі адна іхняя група была на семінары, а то ж яшчэ прысутнічалі дзяўчаты з эканамічнага факультэта.

Таццяна Іванаўна падышла так блізка, што Сцяпан адчуў яе дыханне. З які міг затрымала на ім свой раз'юшаны позірк, а пасля, так нічога і не сказаўшы, порстка павярнулася і хуценька выйшла з аўдыторыі.

Ён працягваў стаяць ля акна, а ўсе моўчкі пазіралі на яго. І тут выратавальна празвінеў званок. Аўдыторыя імгненна апусцела, а да яго падышла Таня Калмыкава. У мінулым годзе працавала разам з ім у студэнцкім атрадзе на будоўлі газаправода "Бухара-Цэнтр".

– Ну, Сцёпа, заварыў кашу! А як цяпер экзамен ёй будзеш здаваць? – ціха спытала яна.

– Не ведаю, – разгублена адказаў ён. А пасля зірнуў на яе і дадаў: – Якая ж ты прыгожая...

– Дагаварыўся! – Таня ўсміхнулася, і яны выйшлі з аўдыторыі.

Да экзамена заставалася яшчэ два месяцы, можна было падрыхтавацца, але праз які тыдзень яго нечакана забралі проста з лекцыі два супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнай бяспекі, якія былі ў цывільным.

Тут ён не на жарт спалохаўся. Хлопцы былі накачаныя, з каратка падстрыжанымі валасамі. Адзін з іх моўчкі паказаў Сцяпану пасведчанне супрацоўніка КДБ і сказаў, што іхні палкоўнік хоча з ім пагутарыць. Выйшлі на вуліцу, селі ў чорную "Волгу" і паехалі.

Калі зайшлі ў кабінет, адзін з іх каратка адрапартаваў: "Таварыш палкоўнік! Ваша заданне выканалі!" І яны тут жа выйшлі.

Сцяпан здзівіўся, бо за сталом сядзеў у шэрым касцюме і гальштуку чарнявы хлопец. На выгляд было яму не больш за трыццаць гадоў. Праўда, скроні крыху пасівелыя, валасы кароткія, "пад вожыка".

Ён падняўся з-за стала, падышоў да Сцяпана і працягнуў руку. Яны парукаліся.

– Артамонаў Сцяпан Аляксеевіч, – прамовіў палкоўнік, пільна ўглядаючыся ў Сцяпанаў твар. – Прысаджвайся. Прыемна пагутарыць з земляком на роднай мове.

Ён усеўся за свой стол і пачаў даставаць з папкі паперы. Сцяпан таксама прысеў непадалёку ад стала.

– Тут вось якая справа, – працягнуў палкоўнік, – на цябе рэгулярна паступаюць скаргі з інстытута.

– Скаргі? – чамусьці шэптам перапытаў Сцяпан.

– Так-так, яны самыя...

– Дык я ж нічога такога...

– У адной з іх, – перабіў яго палкоўнік, – напісана, што студэнт трэцяга курса Артамонаў Сцяпан распаўсюджвае сярод студэнтаў нездаровыя чуткі наконт палітычнага ўкладу нашага жыцця. – Ён перастаў чытаць і запытальна зірнуў на Сцяпана.

– Якія чуткі? Што вы?! Проста выказваў свае думкі на семінарах.

– А вось яшчэ. – Палкоўнік на хвіліну змоўк, а пасля зноў пачаў чытаць. – Наведвае канспіратыўны гурток. На семінарах пастаянна ўсхваляе сістэму арганізацыі працы на заводах капіталістычных краін. Ну і так далей...

– Адна хлусня! Хто б такое мог напісаць?! – з абурэннем усклікнуў Сцяпан. – Наведвае гурток! Смехата ды і толькі! Я тры разы на тыдзень хаджу на трэніроўкі па валейболе, а пасля яшчэ і ў шахматны клуб заглядваю, летась нават выканаў нарматыў першага разраду па шахматах.

– А як праходзяць у вас семінарскія заняткі? – спытаў палкоўнік.

– Рыхтуемся, а пасля выказваем свае думкі ў форме дыскусіі.

– А з выкладчыкамі якія адносіны?

– Добрыя. Вось толькі нядаўна крыху паспрачаўся з Таццянай Іванаўнай. Яна ў нас палітэканомію выкладае.

– А што здарылася?

– Я за Мікалая Бухарына заступіўся, а яна так разнервавалася, што...

– Так... – Палкоўнік адкрыў яшчэ адну папку. – Толькі не думай, што хачу цябе напалохаць, але вось спіс студэнтаў, усяго дваццаць сем прозвішчаў, выключаных з інстытутаў Ленінграда без права паступлення ў вышэйшыя ўстановы нашай краіны.

– За што? – шэптам спытаў Сцяпан.

– Летась раскрылі гурток ва універсітэце. Мелі сваю праграму, друкавалі лістоўкі, нават зброю збіралі...

– Нічога сабе... Але ж я да іх дачынення не маю. – Сцяпан смела зірнуў у вочы палкоўніку.

– А такія прозвішчы табе нічога не гавораць: Вагін, Платонаў, Іваноў?

– Упершыню чую.

– Дык вось, яны стварылі ва універсітэце арганізацыю пад назваю УХСВН – Усерасійскі хрысціянскі саюз вызвалення народаў. Гэта былі

сур'ёзныя людзі. У іх была нават свая служба бяспекі. Калі мы іх арыштавалі, то знайшлі спісы з адрасамі і тэлефонамі ваенных і партыйных кіраўнікоў Ленінграда. Для чаго б гэта?

– Не ведаю, – адказаў Сцяпан.

– З цягам часу і Сцяпан Артамонаў трапіў бы ў іх поле зроку.

– Чаму?

– Бо ты веруючы, – адказаў палкоўнік. – І не адпірайся, бо мне ўсё вядома. Дарэчы, у адным з даносаў напісана, што ты агітаваў за веру ля Смаленскай царквы, так? І было гэта якраз на Вялікдзень.

– Я не агітаваў, – Сцяпан усміхнуўся. – Проста расказваў студэнтам з універсітэта, што зараз вось-вось адбудзецца вынас Плашчаніцы... Бо яны нічога не ведалі пра царкоўную службу.

– Верыць у нас нікому не забаронена, – перабіў яго палкоўнік. – Гэта патаемная і асабістая справа кожнага. Нават Ісус Хрыстос вучыў, што маліцца трэба не выстаўляючы сябе на паказ. А што не маеш дачынення да бунтаўшчыкоў, то гэта добра, – усміхнуўся палкоўнік. – Як там наша Гродзенская вобласць мацуецца? Я, праўда, з-пад Мастоў родам, а ты са Смаргоншчыны, так?

– Жывуць землякі. Я вось хачу пасля экзаменаў на касьбу паспець.

– Студэнцкія гады самыя шчаслівыя, – палкоўнік на хвіліну задумаўся, а пасля дадаў сцішаным голасам: – А недахопаў у нас хапае. Думаеш, нават я – палкоўнік КДБ, з усім згодзен? Вось так... Але ж не крычу пра гэта на кожным рагу.

Тут Сцяпан крыху асмялеў і спытаў:

– Няўжо вы палкоўнік? Вам жа дзесьці не больш за трыццаць гадоў.

– Трыццаць пяць, – ён усміхнуўся. – Але здзіўляцца няма чаму, бо ў мае гады ёсць і генералы.

На развітанне ён моцна пацiснуў Сцяпану руку і пажадаў паспяхова скончыць інстытут.

Пасля такога папярэджання Сцяпан пачаў адмоўчвацца на семінарскіх занятках. І не праз тое, што спалохаўся, а проста крыўдна стала, быццам плюнулі ў твар у людным месцы.

А тут неўзабаве і летняя сесія падаспела. Яму адразу ж пашчасціла – палітэканомія стаяла ў раскладзе апошняй. Падрыхтаваўся даволі добра, але крыху палохала будучая сустрэча з Таццянай Іванаўнай.

Прымаць экзамены ёй дапамагала даволі маладая і прывабная аспірантка. Яна зусім нядаўна з'явілася на кафедры. Многія хлопцы стараліся трапіць да яе, бо яна нярэдка завышала адзнаку. Праўда, у такім выпадку Таццяна Іванаўна давала пытанне на засыпку, але гэта хлопцаў не палохала.

У Сцяпана і ў думках не было трапіць да аспіранткі. Але тут здарылася нечаканае. Калі пасля падрыхтоўкі ён падышоў да Таццяны Іванаўны, яна мельгам зірнула на яго і коратка кінула:

– Фаіначка, прымі экзамен у гэтага студэнта, бо я за сябе адказваць не магу.

Фаіна са здзіўленнем зірнула на Сцяпана і ўсміхнулася. Ён пачаў адказваць. Аспірантка слухала, як зачараваная. А пасля, калі ён скончыў, быццам чагосьці спалохаўшыся, зрабіла сур'ёзную міну на твары і пачала ганяць яго па ўсім курсе. Адказаў на ўсе пытанні.

– Выдатна, – прамовіла аспірантка, звяртаючыся да Таццяны Іванаўны.

Тая адшукала Сцяпанаву залікоўку і сказала:

– Але калі мы паставім Артамонаву чацвёрку, ён на нас не пакрыўдзіцца, так?

– Згодзен і на чацвёрку, – ціха адказаў ён.

– Вось і цудоўна! – Таццяна Іванаўна распісалася ў залікоўцы, а пасля дадала: – Веды ў яго ёсць, але гэта яшчэ не самае галоўнае.

Папраўдзе кажучы, не думаў ён, што так удала ўсё для яго скончыцца. Веды ведамі, а заваліць на экзамене можна любога студэнта.

А перад самым размеркаваннем сабраў дэкан іхнюю групу, каб дамовіцца загадзя, хто куды паедзе на працу. Месцы былі ўжо вядомы, і, каб не затрымліваць камісію, вырашылі пагаварыць аб усім у спакойнай абстаноўцы.

Па паспяховасці Сцяпан займаў пятае месца ў групе, але гэта яму амаль нічога не давала. Бо найбольш шустрыя хлопцы даўно пажаніліся з ленінградкамі, каб застацца ў горадзе, балазе і месцы былі ў праектных інстытутах. Другія прыехалі па накіраваннях сваіх прадпрыемстваў.

І калі прыкінулі, то Сцяпану не было з чаго і выбіраць – засталася адна Чукотка. Бачачы ягоны засмучоны выгляд, дэкан суцяшаў як мог: “Не сумуй! Такую практыку атрымаеш – лепш не трэба! Станеш сапраўдным горным інжынерам!”

Івана Іванавіча Сцяпан паважаў. І не толькі за тое, што ён цудоўна выкладаў і ў любы момант гатовы быў стаць у абарону студэнта, не! У ім было штосьці большае, чаго яны ў той час, па сваёй маладосці, нават і зразумець да канца не маглі. Ён мог, напрыклад, лёгка зайсці адзін адвячоркам у інтэрнат, і не дзеля праверкі, а проста так...

Успомнілася, як аднойчы ён нечакана завітаў у іхні пакой. Спытаў пра жыццё, падняў з дзесятак разоў двухпудовік, што стаяў у кутку і задаволена ўскрыкнуў: “Ёсць яшчэ порах!”

І тут, як на тое ліха, прыкмеціў бутэльку сухога віна, што асірацела стаяла на падаконніку. І не выпівалі яны амаль ніколі – спартыўны быў пакой.

Іван Іванавіч усміхнуўся, падышоў да акна, узяў бутэльку ў рукі і пачаў уважліва разглядваць, быццам упершыню ўбачыў “Рыслінг”. Пасля паставіў бутэльку на месца і сказаў: “Я ў свой час такога і ў рот не браў”. І ўжо ля парога падміргнуў усім і дадаў: “Толькі калі-нікалі перакульваў чарку-другую спірту для сагрэву душы”. І адразу ж знік за дзвярыма.

Ведалі яны, дзе давялося саграваць душу Івану Іванавічу. У свой час восем гадоў правёў ён на Ка-

лыме. У далёкім трыццаць сёмым годзе маладога аспіранта разам з групай выкладчыкаў асудзілі на дзесяць гадоў за шпіянаж на карысць Германіі.

Адбыў тэрмін да апошняга дня. Што там гаварыць – пашчасціла Івану Іванавічу – жывым застаўся, а галоўнае – не азлобіўся, не зламаўся. Працягваў самаадукацыю ў неймаверна цяжкіх умовах.

А як клапаціўся аб студэнтах свайго факультэта, як абараняў іх... Раскажы каму – не павераць. Узяць хаця б адзін з іхніх інтэрнатаў. Колькі ён паабіваў парогаў у чыноўнікаў, колькі паклаў свайго здароўя, каб адваяваць для сваіх студэнтаў шасціпавярховы будынак на Малым праспекце, аднаму Богу вядома.

А ваяваць, як потым высветлілася, было за што. У царскія часы быў пабудаваны той дом. Як толькі Сцяпан упершыню пасяліўся ў інтэрнацкім пакоі, яго адразу ж здзівіла цішыня. А якая высачэзная была столь! Каб змяніць электралямпачку, даводзілася ставіць на стол яшчэ і крэсла. А гукаізаляцыя была – лепш не трэба! У суседнім пакоі студэнты гарлапанілі песні, хадзілі на галовах, а побач, усяго праз сценку, была мёртвая цішыня...

І толькі пасля Сцяпан даведаўся, што тут доўгі час, ажно да самай рэвалюцыі, быў публічны дом, на самай верхатуры якога заўсёды гарэў чырвоны ліхтар.

І ўсё-ткі, як бы там ні было, Сцяпан і ў думках не скардзіўся на свай лёс, бо пашанцавала яму, як нікому іншаму. Гэта ж трэба – пяць гадоў правёў у такім горадзе!

Другія вучацца ў невялічкіх гарадках, дзе нават тэатра свайго няма. А тут! У першы год ён нават разгубіўся, бо не ведаў, куды найперш падацца, што паглядзець. Усюды было цікава. Чаго варты толькі адзін Эрмітаж! Які палац – заблудзіць можна.

У першы раз яму хацелася паглядзець на ўсё: ён спехам пераходзіў з залы ў залу, урэшце стаміўся.

Разбалелася галава, і на гэтым усё скончылася. Велічнае ўбранства залаў, карціны вядомых мастакоў – усё гэта ашаламляла, было таямнічае і незразумелае. Патрэбен быў час, каб да ўсяго прывыкнуць і разабрацца.

Пасля ён стаў хадзіць у Эрмітаж толькі ў будні дні, калі было не так людна. Але асабліва радасна было на душы, калі за акном церусіў нудны дождж ык. І яму было пацешна слухаць, як хтосьці са знаёмых казаў: "У Эрмітажы паспеў пабываць, у Рускім музеі, а вечарам яшчэ і ў тэатр трапіў".

Уклаўся чалавек у адзін дзень, вось так! Нічога не паробіш – экскурсія на выхадныя.

Гады вучобы праляцелі непрыкметна. Наперадзе яго чакала Чукотка, пра якую ён мала што і ведаў. Атрымаўшы дыплом, накіраванне на працу і грошы на дарогу, ён заехаў да сваёй маці, якая жыла ў невялічкай вёсцы за Маладзечнам.

Бацькі ў Сцяпана не было. Ён памёр ад запалення лёгкіх, калі Сцяпан вучыўся на другім курсе.

Маці з хваляваннем трымала ў руках ягоны дыплом, а пасля нечакана заплакала. "У такую далячынь пасылаюць! Божа ж ты мой! Ды яшчэ аднаго!"

Ён суцяшаў яе як мог. І не спяшаўся з ад'ездам, бо верасень якраз падаспеў – вырашыў дапамагчы маці выкапаць бульбу, а Чукотка пачакае. Хвалявала маці і тое, што Сцяпан так і не ажаніўся. Дваццаць сем гадкоў стукнула – самая пара.

Праўда, быў у яго намер ажаніцца на чацвёртым курсе, але не пашчасціла яму. Ды яшчэ так, што цэлы год пасмейваліся з яго хлопцы ў інтэрнаце.

А здарылася вось што. Таня Калмыкава, якая яму вельмі падабалася яшчэ з першага курса, урэшце згадзілася выйсці за яго замуж. Яны нават заяву падалі. А праз які месяц яна адмовіла, бо пазнаёмілася з дэканам факультэта журналістыкі. Яму было пад пяцьдзесят. Жонка загінула ў аўтамабільнай катастрофе. Трохпакаёвая кватэра, "Волга", дача... Што яшчэ трэба? І выглядаў яе

абраннік някепска: высокі, хударлявы, з крыху пасівелымі валасамі, якія нядрэнна пасавалі да яго-нага маладжавага твару.

Можа, і сапраўды Таня пакахала яго, бо была яна не з тых дзяўчат, каб паквапіцца на "Волгу" і дачу. Але Сцяпана гэтая акалічнасць мала суцяшала. Крыўда пасялілася ў душы. Крыўда на ўсіх дзяўчат і жанчын. Добра яшчэ, што неўзабаве пачаў працаваць над дыпломным праектам, стаў менш бываць у інстытуце.

Дый размеркаванне не вельмі яго напалохала. Падумаеш – Чукотка! Працуюць жа там людзі, не ён першы. Вось толькі маці сваёй было шкада. Але ён суцешыў яе тым, што паабяцаў пісаць кожны тыдзень, а праз год абавязкова прыляцець у водпуск.

Так непрыкметна прамінуў і другі шурфовачны сезон. А пасля – што ж, не было рацыі ехаць, бо засталося крыху папрацаваць – і ён атрымліваў шасцімесячны водпуск з наступным звальненнем.

І Сцяпан Артамонаў з асаблівым стараннем рыхтаваўся да свайго апошняга выезду ў тундру. Трэба было пра многае паклапаціцца: і каб шурфовачных ломікаў было дастаткова, і вяровачных лесвіцаў самім нарабіць, дый вараткамі ўсур'ёз заняцца.

Шурфоўка – праца для сапраўдных мужчын. Тут патрэбна моц і здароўе, і досвед. Шурф – гэта амаль той вясковы калодзеж, толькі з крыху іншымі параметрамі: паўтара на адзін метр. Праходзяць яго ў векавой мерзлаце падрыўным спосабам. Ломікам дзяўбуць невялічкія паглыбленні, якія называюцца буркамі, закладваюць туды выбухоўку і падрываюць. Пасля ўзрыхленую пароду адгружаюць у вялізныя бодні і пры дапамозе варатка падымаюць на паверхню, выкладваюць у праходкі, якія абавязкова нумаруюць.

А пасля іх прамываюць і вызначаюць колькасць металу ў кубічным метры пароды. Самае складанае – забурыцца. Гэта значыць, ломікамі, якія шурфоўшчыкі ласкава называюць "карандашамі",

прабіць бурку. Чым глыбей атрымаецца – тым лепш. Але ж на адну адпалку трэба прабіць дзве, а то і ўсе тры буркі.

А калі валун трапіцца, то справы зусім кепскія. Ляжыць такі прыгажун на ўвесь шурф ды пасмейваецца – паспрабуй з ім управіцца!

Сцяпану з самага першага шурфовачнага сезона пашчасціла ў галоўным: шурфоўшчыкі былі ў яго хаця і ва ўзросце, але з досведам. Не першы год бадзяліся на Чукотцы. І што дзіўна – амаль усе былі землякі, з Беларусі. У брыгадзе было пяцёра – па два чалавекі ў звяне, і падрыўнік.

Праўда, рыхтаваўся з імі і адзіны навічок – Праватараў Міхаіл Пятровіч, былы шахцёр, якому было пяцьдзесят гадоў. Спачатку Сцяпан не хацеў яго браць, але калі даведаўся, што ён былы франтавік, ды яшчэ дваццаць гадоў адпрацаваў у шахце, то даў сваю згоду. Дый шурфоўшчыкі за яго прасілі.

Вось толькі аднаго не мог зразумець Сцяпан: чаго падаўся Міхаіл Пятровіч у такія гады на Чукотку? Неяк няёмка было дапытвацца, але ўсё-ткі аднойчы не вытрымаў. Зайшоў да яго ў пакой, бо жылі пакуль яны на сваёй базе, дзе быў інтэрнат.

Міхаіл Пятровіч сядзеў на ложку і чытаў кнігу. Убачыўшы Сцяпана, хуценька паклаў кнігу на тумбачку і зняў акуляры.

– А куды ж гэта мужыкі падзеліся? – спытаў Сцяпан, сядаючы на табурэтку.

– У кіно падаліся, – адказаў Міхаіл Пятровіч. Ён толькі што пагаліўся і ў пакоі лунаў густы пах трайнога адэкалону.

– Так-так... – Сцяпан запытальна зірнуў на Міхаіла Пятровіча, а пасля нядоўгага маўчання спытаў:

– Як настрой?

– Так сабе. Хутчэй бы ў тундру. Надакучыла тут ацірацца.

– Дні праз два адправімся, – адказаў Сцяпан.

– Тут жа заснуць немагчыма. Дзень і ноч гарэлку глушаць, – паскардзіўся Міхаіл Пятровіч.

– Толькі што прамывачны сезон скончыўся. Нічога не паробіш – традыцыя. Я вось усё хацеў спытаць... Якім ветрам занесла цябе на Чукотку?

– І сам не ведаю, – Міхаіл Пятровіч уздыхнуў. – Выйшаў на пенсію і адразу ж засумаваў. Захацелася, як і ў маладыя гады, зірнуць за край зямлі. Каб жа жонка яшчэ была, то наўрад бы паехаў, а так...

– А што – развёўся?

– Ды не. Два гады таму як памерла. Напісаў у Магадан. Прыслалі запрашэнне ў геаграфічную партыю. Усё лета па сопках сноўдаў, надакучыла. А грошы мне не вельмі і патрэбныя. Два сыны даўно самастойна жывуць, нават унукаў маю, вось так. А наконт працы, Аляксеевіч, не сумнявайся – не падвяду. Праўда, на шурфах не працаваў, але не падкачаю. У шахце праходчыкам укалываў.

– Ды я і не сумняюся! – Сцяпан усміхнуўся. – Проста ўспомнілася, як мне самому не хацелася сюды ехаць пасля вучобы.

– Яно так... – Міхаіл Пятровіч пачухаў патыліцу. – Калі пасылаюць – ехаць няма ахвоты, а калі сам – чорту на рогі ўзаб'ешся.

– А са здароўем як?

– Камісію прайшоў. Праўда, бывае, часам нага крыху на змену пагоды пабольвае. Асколак там у мяне. Ды ў такім месцы, што ўрачы і не рэкамендуюць ад яго пазбаўляцца.

– Былі паранены? – Сцяпан перайшоў на "вы".

– Дый не адзін раз.

– А калі трапілі на фронт?

– У самыя першыя дні вайны. А да гэтага я ў тэхнікуме вучыўся, але ў саракавым годзе, амаль прымусова, трапіў у пяхотнае вучылішча. Час такі быў – рыхтаваліся да вайны. І ўжо ў жніўні сорак першага, калі ад нашай роты засталося сем чалавек, трапіў у палон. Быў паранены ў нагу і ў плячо. Немцы гналі калону палонных на захад. Параненых, хто не мог рухацца, прыстрэльвалі. Мяне падтрымлівалі да апошняга. Адчуваючы, што больш няма сіл, я азірнуўся і ўбачыў падводу. Два немцы ледзь утрымлівалі гнядога жа-

рабца. Доўга не думаючы, я ўхапіўся рукамі за драбіны і з апошніх сіл падцягнуўся, прымасціўся ззаду, чакаючы вокрыку. Але канваіры нічога не заўважылі, навакол узнімаліся ў паветра клубы пылу.

Калі крыху ад'ехалі, то салдат, які трымаў лейцы, азірнуўся і, убачыўшы мяне, сцебануў два разы пугай. Хацеў яшчэ, але другі махнуў рукой і штосьці сказаў. Абодва зарагаталі.

Абагнаўшы калону, хвілін праз дваццаць, прыехалі ў вёску. І тут з-пад плота выскачыў вялізны певень і з лямантам пабег да ракі. Немцы хуценька прывязалі жарабца і кінуліся за ім, а я злез з падводы і папоўз да найбліжэйшай хаты.

Ля самых веснічак сівы дзед падхапіў мяне пад пахі, а з хаты выскачыла бялявая дзяўчынка гадоў чатырнаццаці і ціха ўскрыкнула: "Ой, хто гэта, дзеду?"

"Свой-свой, дапамажы мне", – адказаў дзед, і яны пацягнулі мяне ў склеп.

Міхаіл Пятровіч змоўк, дастаў з пачкі цыгарэту, шчоўкнуў запальніцай.

– А што ж далей было? – ціха спытаў Сцяпан.

– Паправіўся, год партызаніў, а потым зноў франтавыя дарогі. Дайшоў да Берліна. А пасля вайны закружыла жыццё...

– А ці былі пасля ў той вёсцы?

– Сорамна прызнацца, але так і не давялося. І збіраўся ж не адзін раз. Тая дзяўчынка, а звалі яе Галя, даглядала мяне... Бінтавала, прыкладвала травы – што толькі ні рабіла. І – падняла на ногі. Па сённяшні дзень памятаю яе дрыготкія рукі... Праўда, ужо з Берліна, прыслаў ёй з дзедам дзве пасылкі. А іхнюю вёсачку да гэтай пары помню – Канстанцінаўка.

– Але думаецца мне, – Сцяпан падняўся з табурэткі, – што і цяпер яшчэ не позна наведаць сваіх выратавальнікаў.

– Яно так, – Міхаіл Пятровіч уздыхнуў. – Пасля шурфоўкі падамся дамоў, а там і ў Канстанцінаўку пад'еду.

– Ну што ж – адпачывайце, набірайцеся сіл, хутка ў тундру. А хлопцам скажыце, каб заўтра а дзевятай былі ў начальніка.

Ён развітаўся і выйшаў з пакоя. На ганку інтэрната спыніўся, зірнуў на неба: там у неабсяжнай далечы ярка зіхацелі зоркі. Добры марозік будзе, падумаў ён і накіраваўся да аднапавярховага будынка, у адным канцы якога былі службовыя кабінеты кар'ера, а ў другім – два пакоі для прыезджага начальства – так званая мясцовая гасцёўня. Сцяпан пасяліўся ў пакойчыку, дзе стаялі ўсяго два ложкі.

Выпіў чайку, пасля распрануўся, улёгся ў ложку і пачаў чытаць. Але чамусьці не чыталася. Ён адклаў кніжку і выключыў святло. І адразу ж успомнілася маці. Як яна там цяпер пажывае? Напэўна, яшчэ не ўправілася з бульбай. Хутка і ён пакіне гэты халодны край і паедзе ў сваю Белую Русь. Засталося якіх паўгода – гэта не тэрмін. Вось толькі б з маці нічога не здарылася. Хваляваўся за яе здароўе. Як пацягае, бывала, кошыкаў з бульбаю або так чаго, то адразу ж сэрца балела. А ў яго акрамя яе нікога няма.

І скупануцца хацелася ў сваёй рэчцы. Многа дзе даводзілася яму пабываць, але прыгажэйшай рэчкі за сваю Вяллю ён не сустракаў. Шырыня яе месцамі даходзіла да ста метраў – больш і не трэба. А якая вадзіца! Залезеш – вылазіць не хочацца. У дзяцінстве цэлымі днямі прападаў на рэчцы. Лавіў на вудачку рыбу, а калі хацелася падсілкавацца, то на палянках уздоўж рэчкі было многа калачоў. Яны падобныя на садовыя клубніцы, толькі меншыя па памерах. Але ж затое і салодкія. Ён знаходзіў такую палянку, лажыўся на жывот і... пачынаўся цудоўны абед.

Наядаўся, як казаў калісьці стары дзед Мажуль, "ад пуза". Праўда, вечарам даставалася ад маці, але выратоўваў бацька. Ён разглядваў у кацялку акунькоў ды плотак і прыгаворваў маці: "Ты зірні! На тры патэльні хопіць!"

А на Чукотцы хіба скупанешся? Нават улетку тут прыганяе да берага ільдзіны. Так што можна распрануцца, гэта дзесьці ў пачатку чэрвеня, а пасля налятаюць камары.

Вось ужо брыдота! Нашы камары ў параўнанні з чукоцкімі – проста анёлы нябесныя. Іх не так і шмат у нашай Беларусі. А на Чукотцы лётаюць улетку цэлымі аблокамі. І да таго нахабныя, што могуць вывесці з раўнавагі любога падарожніка. Але Сцяпана выратоўвала барада, тут без яе не абысціся. Узімку саграває, а летам ратуе ад камароў.

Маразы на Чукотцы не вельмі і вялікія – трыццаць-сорак, але ж з ветрыкам. Праўда, не заўсёды. Бывае, што ўсталюецца такая ціша – у вушах ломіць, а то і звініць без прычыны.

Выратоўваў ад камароў ліпурдзін. Гэта такая вадкасць. Памажаш ім рукі, твар і з якую гадзіну адчуваеш палёгку. Трымаюцца камары месяцы два. Асабліва даймаюць, калі няма ветрыка, тут ім раздолле. І прападаюць дзесьці ў сярэдзіне жніўня. Чукотка вялікая. Бліжэй да акіяна, то камары знікаюць яшчэ раней.

Сон не браў. Сцяпан варочаўся з боку на бок, думаў... Ды і як тут было заснуць, калі заўтра яго чакаў ад'езд у тундру. Яшчэ раз абдумваў, каб чаго не забыцца. Бо пасля, ужо ў тундры, з-за якой-небудзь дробязі можаш трапіць у такую нагоду, што і дзесятаму закажаш. Здаецца ж, усё было падрыхтавана, але чамусьці неспакойна на душы. У першы раз ён і то смялей выязджаў у тундру, чым цяпер. Тады было ўсё невядомае, цікавае, амаль і не хваляваўся.

І начальнік чагосьці выклікае з самай раніцы. Здаецца ж, заўчора аб усім паразмаўлялі. На начальніка Сцяпану таксама пашчасціла. Андрэй Іванавіч быў спакойны, а галоўнае – разумны кіраўнік. Праўда, была ў яго адна вада: крыху пабойваўся вышэйшага кіраўніцтва – прадстаўнікоў з ГоКа. І чаго тут здзіўляцца – у кожнага свае недахопы. Але ж і яго можна

зразумець – праз год выходзіў на пенсію. А паважалі яго за тое, што ён ніколі і ні на каго нават не прыкрыкнуў. Хаця, а здаралася гэта не раз, было за што. Шурфоўшчыкі – народ біты, палец у рот не кладзі. Другі раз такое могуць адмачыць, што дзесятак псіхолагаў не разбяруцца. Іх трэба разумець, папрацаваць з імі не адзін год, вось тады можна сёе-тое пра іх і даведацца.

Сцяпан не раз здзіўляўся спакою Андрэя Іванавіча. У самых складаных сітуацыях, калі трэба было прыкрыкнуць, ён размаўляў спакойным голасам. І гэтым як бы абяззбройваў свайго суразмоўцу. Нават самі шурфоўшчыкі не раз казалі: “Прыкрыкнулі б вы, Андрэй Іванавіч, а то сорам працінае да мозгу касцей!”

Але ён толькі ўсміхаўся ды пагладжваў сваю густую сівенькую бародку. Сцяпан так і не мог зразумець аднаго: ці такім ён быў ад нараджэння, ці здолеў перавыхаваць сябе сам.

Яму і самому хацелася быць падобным на Андрэя Іванавіча, але як ні стараўся – нічога не атрымлівалася. Былі моманты ў ягоным жыцці, што прыходзілася не толькі крычаць, але і брацца загрудкі са сваімі рабочымі.

У першы свой шурфовачны сезон здарылася такое. Аднойчы вёз да іх у тундру трактарыст прадукты. І калі пад’язджаў, то паламаў вадзіла, пры дапамозе якога сані счапляюцца з трактарам.

Адчапіў той сані і прыехаў да іх, каб забраць такое ж вадзіла ў аднаго з балкоў, у якіх яны жылі. Балкі – гэта такія вагончыкі на палазах. Унутры стаіць грубка, якая паліцца днём і ноччу. Але вадзіла было толькі адно – пры балку Аляксея Гарбунова.

Трактарысту вадзіла не даў. І тады давялося ўмяшацца ў гэтаю справу Сцяпану. Ён разумеў, што калі цяпер не настаіць на сваім, грош яму цана – які ж пасля гэтага ён горны майстра.

І тут нечакана на яго кінуўся, быццам той паранены вяпрук, сам Гарбуноў з ломікам ў руках.

Сцяпан ухіліўся ад удару, сам схапіў таго за рукі і, адабраўшы ломік, моцна прыціснуў да балка і закрычаў: "Прыб'ю на месцы!"

Шурфоўшчык быў хударлявы, ніжэйшы за Сцяпана, было яму сорак гадоў, але выглядаў на ўсе пяцьдзесят. Той раптоўна збялеў і мяшком асунуўся на зямлю.

Непрыемная гісторыя. Але што было рабіць? Правалэндайся яны гадзіну-другую – ад прадуктаў засталіся б адны ўспаміны. Мог белы мядзведзь пагаспадарыць, дый расамаха не адмовілася б ад дармавога пачастунку.

Але калі разабрацца па шчырасці, ва ўсім было вінавата кіраўніцтва кар'ера, бо ўжо не адзін год абяцала, што вадзілы будуць ля кожнага балка. І толькі ў наступны год, калі ў тундры пабывала камісія з Магадана, справа была вырашана. Атрымаў іхні разведучастак не толькі вадзілы, але і новенькія балкі, бо старыя даўно спарахнелі і ў моцную пургу да таго рыпелі, што жудасна было ў іх знаходзіцца.

Урэшце Сцяпан вырашыў, што заўтра яшчэ раз усё праверыць і, супакоіўшы сябе на гэтым, непрыкметна заснуў.

## Частка другая

На наступны дзень толькі а дзесятай гадзіне раніцы ўдалося Сцяпану прывесці шурфоўшчыкаў да начальніка. А ўсё з-за таго, што дасталі дзесьці яны пяць пляшак гарэлкі ды ўсю ноч замочвалі ад'езд у тундру. Да таго панапіваліся, што ляжалі покатам, быццам тыя снапы на полі. Дурная традыцыя, тут нічога не паробіш. Начальнік гэта разумеў.

Калі яны зайшлі да яго і павіталіся, ён зняў акуляры, уважліва зірнуў на кожнага, а пасля сказаў:

– Сядайце. Апахмяліцца паспелі?

– Каб жа было... – з цяжкасцю прамовіў Аляксей і ўздыхнуў.

– Яшчэ вугаль патрэбна загрузіць, а вы ўжо гатовенькія з самага ранку.

– Загрузім! – адказаў Валянцін. – Вось гарачага чайку па кубку вып'ем – як рукой здыме.

– Сёння вас адпраўляю, – прамовіў начальнік, раскрываючы папку чырвонага колеру. – Хопіць лынды біць.

– Нам бы ў дарогу, так сказаць, да сагрэву душы... – падаў голас Кузьма.

– Толькі па бутэльцы на нос, – адказаў Андрэй Іванавіч, – а пасля хуценька дадаў: – І то з цяжкасцю выбіў, бо даўно завозу з Певека не было. Але на Кастрычніцкія святы ўсё будзе ў поўным парадку. А цяпер ёсць не вельмі прыемная навіна. Я быў супраць такой пастановы, але ж тут і доля вашай віны.

– Павялічылі дзённую выпрацоўку? – з абурэннем ў голасе прамовіў Валянцін.

– Так. Праўда, на якісьці мізер, усяго дзесяць сантыметраў. Норма цяпер у вас будзе дзевяноста сантыметраў, а каб яшчэ і прэмія выйшла, то трэба даваць метр за змену.

– Каб нам якую тэхніку далі, або яшчэ што прыдумалі, – прамовіў Аляксей. – А то як быў ломік, так і застаўся, а норма расце кожны год.

– А хто вінаваты? – Начальнік запытальным позіркам абвёў прысутных. – Вось няхай вам Кароціч раскажа, як раней шурфавалі. Сорак пяць сантыметраў за змену – і баста! Паспрабуй толькі перавыканаць, брыгадзір адразу ж турне з тундры.

– Яно так, – сцішаным голасам адказаў Валянцін.

– А вы за мінулы сезон, разам з брыгадай Каваленкі, амаль ў два разы перавыканалі нарматыў выпрацоўкі!

– Даліна такая трапілася, – заступіўся за шурфоўшчыкаў Сцяпан, – самі ж ведаеце – вадзяныя лінзы, а валуноў амаль і не было.

– Па ўсёй краіне такое робіцца, на любым заводзе. Тут нічога не паробіш, – дадаў начальнік. Ён закрыў папку.

– Пытанні будуць? Пытанняў няма, – павесялелым голасам сам адказаў ён. – Тады ўсе адразу ж на загрузку вугалю. А ты, Сцёпа, застанься.

Калі шурфоўшчыкі выйшлі, начальнік з якую хвіліну моўчкі пазіраў на Сцяпана, а пасля сказаў:

– Ну што, Сцёпа? Апошні ў нас з табой сезон?!

– Выходзіць, што так, – адказаў Сцяпан.

– Я пачну пенсіённае жыццё, а ў цябе якія планы? Можа, застанешся на годзік-другі?

– Што вы?! Мяне маці чакае не дачакаецца. Дый пра жаніцьбу трэба думаць. Трыццаць гадоў у снежні стукне – даўно пара!

– Паспееш яшчэ ажаніцца... А цяпер пра справы. Трэба ўсё праверыць, вось... Каб не забыў чаго. А праз які тыдзень будзем закідваць у тундру брыгаду Валодзі Каваленкі.

– А дзе ён цяпер?

– Павінен з водпуску прыляцець, ды штосьці затрымліваецца. Можа, у апошнім сезоне апярэдзіш яго па сацспаборніцтве? Як думаеш?

– Хто яго ведае. Хлопцы ў яго маладыя, учэпістыя, заробкі любяць. Куды нам цягацца!

– Яно так. Метраж даюць – рэкордны па ўсёй Чукотцы! А ў цябе, Сцёпа, на гэты раз самае адказнае заданне. Тваю даліну на будучы год будзем старацелям здаваць. Тут трэба і шурфоўку правесці на ўзроўні, дый з прамыўкай нам не падкачаць. Бо калі што – то скандалу не мінеш! Ведаю я старацеляў – звяглівы народ. Калі што не атрымаецца – на нас бочку пакоцяць.

Выехалі толькі на наступны дзень. А ўсё з-за таго, што не быў адрамантаваны да канца адзін з трактароў. Генка Глазкоў, адзін з найлепшых усюдыходчыкаў камбіната, да позняга вечара корпаўся ў рухавіку. Начальнік і не падганяў, бо калі здарыцца паломка ў тундры, то тут справы кепскія, усё можа быць...

Першы трактар цягнуў за сабою вялізныя сані, да самага верху нагружаныя вугалем. Другія былі з прадуктамі і інструментам, а на трэціх – выбухоўка.

І хаця ўжо наступіла палярная ноч, дзесьці так а палове дванаццатай дня крыху развідняла, але ненадоўга – каля дзвюх гадзін, а пасля зноў насоўвалася цемра. Але выратоўваў, калі не было пургі, месяц. У зацішныя марозныя ночы ён так асвятляў даліну і сопкі, што бачнасць была цудоўная. Нават на паляванне можна было хадзіць, асабліва на зайцоў, якіх усё менш і менш заставалася на Чукотцы.

У мінулым годзе, калі яны выязджалі ў тундру, у іх здарылася бяда. Першы трактар, які вёз сані з прадуктамі, праваліўся спачатку па гусеніцы, як бы завіс, не жадаючы трапіць на дно акіяна. А ўсё з-за таго, што Генка не захацеў аб'язджаць вялізную гурбу снегу, якую намяло з высокага берага. А пад той гурбай лёд быў значна танчэйшы, чым у другіх месцах.

Толькі выскачылі яны з кабіны, як трактар пайшоў на дно. Але праўду ў народзе кажуць, што адна бяда не прыходзіць. Застаўся ў іх апошні трактар з вугалем. Паехалі далей. Але дзесьці кіламетраў праз трыццаць зноў непрыемнасць – заглох рухавік у трактара. Гадзіны тры прамучыліся, так і не запусцілі.

Вырашылі далей дабірацца пешшу да доміка паляўнічага Мікалая Іванавіча. Яны заўсёды рабілі ў яго прыпынак. Той быў карэнны жыхар – чукча, паляваў на пясцоў, здабываў і нерпу. Ледзь тады дабраліся. Гэта раней Сцяпан думаў, што замерзлы акіян роўны, быццам тое поле. А на самай справе ён увесь у таросах. Вялізныя ледзяныя глыбы, да трох метраў вышынёй, ды кожная выглядае пасвойму. Тут не толькі на трактары, але і пешшу не вельмі разгонішся.

Можаш – такія выпадкі бывалі не раз – запраста сутыкнуцца і з белым мядзведзем. Праўда, той першы ніколі не нападае на чалавека. Хіба калі будзе паранены, або мядзведзіцы не спадабаецца, што вы занадта блізка разглядваеце яе малых.

Аднойчы пашчасціла Сцяпану ўбачыць мядзведзіцу з двумя малымі. І што б вы думалі

яны рабілі? Каталіся на азадку з горкі, быццам тыя дзеці. Справа ў тым, што пурга да таго трамбуе снег на Чукотцы, што толькі сякерай або вострай рыдлёўкай можна з ім управіцца. Вось было пацешна глядзець на такое відовішча!

Мядзведзіца спакойна ляжала і назірала за сваімі гарэзамі. А тыя з'едуць уніз і адразу ж караскаюцца да маці, каб зноўку імгненна апынуцца ўнізе.

А пад вясну з'яўляюцца і бурыя мядзведзі. Крыху меншыя па памерах ад белых, але да таго злыя – спасу ад іх няма, бо вельмі галодныя. Зайца цяжка ім злавіць, то палююць яны на еўражак, якія вельмі падобныя на звычайных суслікаў. Узімку спяць у сваіх норках, а прыгрэе сонейка, яшчэ снег ляжыць, а яны ўжо вылазяць з норак, каб пагрэцца.

Бывалі выпадкі, што накідваўся такі галодны мядзведзь і на адзінокага чалавека ў тундры, нават калі ў таго і стрэльба была за плячыма. Летась такое здарылася з Мікалаем Іванавічам. Пайшоў ён на азярцо качак упаляваць. А тут адкуль ні вазьміся – мядзведзь. Ён яшчэ здалёк яго ўбачыў, хацеў схавацца, але куды там – мядзведзь шпарыў проста на яго. Каб быў карабін, то запраста ўправіўся б, а са звычайнай стрэльбай цяжка адбіцца.

Але Мікалай Іванавіч не разгубіўся. Падпусціў звера метры на тры і выпаліў з абодвух ствалоў. Толькі такая вытрымка ўратавала яго. А праз які час, трэба ж такому здарыцца, пачаставаў той медзвяжацінай шурфоўшчыкаў са Сцяпанавай брыгады. Яны якраз выязджалі з тундры на базу. Наеліся мяса, а пасля схапіліся за жываты, бо мядзведзь быў хворы. Сам Сцяпан яшчэ раней выехаў на базу. І калі даведаўся пра ўсё, то адразу ж сцяміў, у чым тут справа. Вызвалі па рацыі верталёт, ды ўсіх у раённую бальніцу. Толькі там іх уратавалі, бо своечасова прамылі страўнікі.

Тундра, тундра... Натужна завывае рухавік на пад'ёмах, пільна сочыць за дарогай Генка. Хаця, папраўдзе кажучы, ніякай дарогі пакуль і няма.

Летась дзесьці тут праходзіла, і вось цяпер ён арыентуецца па аднаму яму вядомых прыкметах. А за ім рухаюцца яшчэ два трактары.

Сцяпан не любіў размаўляць у дарозе, Генка гэта разумеў і таксама маўчаў. Было яму трыццаць гадоў. У тэхніцы ён разбіраўся на ўсе сто, адно было дрэнна – любіў выпіць. І што цікава – ніколі не напіваўся. Але амаль заўсёды быў пад "мухай".

Вось і цяпер, перад рэйсам, таксама прыняў сваю норму. Што тут паробіш? У тундры свае законы. Але галоўнае выпрабаванне чакала іх наперадзе – перавал Рагаты. Не такі ён высокі, але ж вельмі стромкі, заўсёды цяжка было на яго ўзбірацца. Асабліва цяпер, калі яшчэ не было пракладзена ніводнага саннага следу.

– Як думаеш, – парушыў маўчанне Сцяпан, – возьмем Рагаты з першага заходу?

– А куды ён дзенецца! – усміхаючыся, адказаў Генка і дадаў: – Праскочым на адным дыханні! А там, – ён махнуў рукой, – будзем крыць морам ажно да самай нашай даліны.

І сапраўды, на перавал падняліся даволі лёгка, бо дапамагло тое, што на ім яшчэ было мала снегу. Але ж і спускацца трэба ўмела, бо можна так загрукацець, што і касцей не збярэш. Асабліва баяўся Сцяпан за сані з выбухоўкай. Але ўсё абышлося. Цяпер да мора было кіламетраў трыццаць. Можна нават і крыху падрамаць. Але чамусьці сумна было Сцяпану на душы. І з чаго б гэта? Часта з ім здаралася такое – навальвалася самота і не адпускала. А ўпершыню завітала да яго ў госці адразу ж пасля заканчэння інстытута, бо літаральна праз дзень пасля абароны дыпломнага праекта ён адчуў, што як бы спыніўся ў сваім развіцці. Не трэба было рыхтавацца да залікаў, пазнаваць штосьці новае і цікавае.

Дый размеркаванне, калі шчыра прызнацца, не вельмі ўзрадавала. Але цяпер усе страхі прайшлі, застаўся апошні сезон, а там... як калісьці ў арміі, на апошнім годзе службы, так і цяпер, яго быццам магнітам цягнула ў сваю родную вёсачку...Так дык

яно і нядрэнна ў маладыя гады паблукаць па незнаёмых мясцінах, але заставацца тут працаваць – такога Сцяпан і ў думках не дапускаў. Чукотка старыць чалавека імгненна. А ўсё з-за таго, што тут не расце лес. А раз так, то і кіслароду малавата. Урачы кажуць, што да дваццаці пяці працэнтаў яго не хапае, а мо і больш. У першы свой прыезд у тундру Сцяпан на сабе адчуў, што штосьці тут не так. Бо калі ўзбіраўся на лыжах нават на невялічкі пагорак, задыхаўся. А ён жа ніколі не курыў, дый у чарку амаль не заглядваў.

А пры недахопе кіслароду ўзрастае нагрузка на сэрца. Нават чукчы, якія жывуць тут не адну тысячу гадоў, так і не змаглі прыстасавацца да такога жыцця. Хварэюць на сэрца, а ў апошнія дзесяцігоддзі і з лёгкімі ў іх вялікія нелады пачаліся. Спачатку Сцяпан думаў, што ўсе гэтыя хваробы звязаныя з кліматам, бо ўсё зіма, а лета кароткае і халоднае. Дый ежа, калі на тое пайшло, усё мяса і мяса. Праўда, і рыба трапляе на стол, але толькі зрэдку. А з ягад – адна марошка. Чукчам-пастухам або паляўнічым і збіраць яе няма калі.

Не адзін раз даводзілася чуць Сцяпану, што раней чукчы жылі больш, чым у наш час. Спачатку яго здзівіла такая акалічнасць, але пасля ён зразумеў, што не ўсё тут так проста і ясна...

Урэшцэ выехалі на ўзбярэжжа Усходне-Сібірскага мора. Хаця якое там мора – Ледавіты акіян. Спыніліся. Сцяпан выскачыў з кабіны і азірнуўся.

Якая моц, якая веліч! Закуты ў малады лёд, увесь у таросах, акіян, здавалася, задрамаў да будучай вясны. Але гэта толькі на першы погляд. Колькі разоў Сцяпан бачыў яго, і пры кожнай сустрэчы хацелася зняць перад ім шапку. Дзесьці там, далёка-далёка, дзе сыходзяцца ільды і неба, – Паўночны полюс. Перамахнуўшы цераз яго, можна трапіць у такую далёкую Канаду, або Амерыку.

Каб размяць ногі, а заадно хапянуць і свежага паветра, павыскаквалі з кабін усе шурфоўшчыкі.

Сцяпан з Генкам спусціліся на лёд. Прайшліся крыху, бо прагноз прагнозам, а тут усялякае можа здарыцца.

– Лядок яшчэ не вельмі і моцны, – сказаў Сцяпан. – Так што трымайцеся бліжэй да берага. І ў першую чаргу абмінайце снежныя гурбы.

– Не хвалюйся, Сцёпа! Адзін раз далі прамашку, то з кім не бывае!

Пасля кароткай размовы з трактарыстамі зноў рушылі ў дарогу. На ўсялякі выпадак Сцяпан прыадчыніў дзверцы ў трактары. Хаця былі выпадкі, што і пры адчыненых дзверцах трактарыст не паспяваў выбрацца з-за рычагоў, бо машына імгненна ішла на дно.

Гэта ў першы год Сцяпану пашчасціла, але ж раз на раз не прыходзіцца. Галоўнае было дабрацца да доміка Мікалая Іванавіча, а там ўжо можна, калі што якое, то і па ўзбярэжжы прабівацца да сваёй даліны.

І з надвор'ем пакуль ім шчасціла. Навокал стаяла цішыня, браўся марозік, зрэдку скрозь аблокі паблісквалі зоркі на небе.

Урэшце, праз якую гадзіну, нечакана ў святле фар паказаўся домік. Пад'ехалі бліжэй, спыніліся і прыглушылі рухавікі. Замка на дзвярах не было, тут ён без патрэбы.

Сцяпан дастаў з кішэні ліхтарык. Зайшлі у невялічкія сенцы, а пасля і ў сам домік. На сцяне, ля самай лямпы, на цвіку вісела запіска: "Паехаў на Шэлагскі. Буду дзён праз дзесяць!"

– Ого! – прысвіснуу Генка. – У якую далячынь падаўся! Да Шэлагскага будзе больш за сотню кіламетраў.

Хуценька запалілі лямпу і вырашылі згатаваць чайку, каб крыху падмацавацца, а пасля зноў у дарогу. Дроў у Мікалая Іванавіча было навалам. Праз хвілін дзесяць загула грубка. Чай на Чукотцы ў пашане – саграваe душу, прыдае новыя сілы, без яго тут не абысціся.

Па два кубкі выпілі, крыху пасядзелі, пасля прытушылі грубку ды зноў у дарогу.

Усё часцей пачалі трапляцца на шляху ледзяныя таросы. І кожны трэба было абмінуць. Яны да таго надакучылі, што Генка ўрэшце не вытрымаў:

– Давай, Сцёпа, па беражку рванём, а то выкручваемся, як той мянтуз на патэльні.

– Паспрабуй! Толькі выберы больш пакатае месца! – адказаў Сцяпан, пільна ўглядаючыся наперад.

Ён і сам пра гэта думаў. І неўзабаве яны ўжо імчалі па ўзбярэжжы на пятай перадачы, толькі снег курэў з-пад гусеніц. Генка любіў шыкоўную язду, дый стараўся хутчэй дабрацца да месца, каб уволю адаспацца. Даліна называлася Левы Кайнваам. На геалагічнай карце ўсё проста, а на самой мясцовасці разабрацца намнога цяжэй, тут указальнікаў няма.

Праўда, Генка летам тут быў з маркшэйцэрам – праводзілі разметку шурфовачных ліній. І там, дзе павінен быць пройдзены шурф, забівалі ў крыху адталую тундру кадок, а каб пурга не зваліла, то абкладвалі камянямі.

Адзіным указальнікам тут спраўна служылі два невялічкія караблі, або як усе іх тут называюць – “ліхтары”. Калісьці іх у вялікі шторм выкінула на ўзбярэжжа, і з тае пары так і прыпісаліся тут да канца сваіх дзён. Тоны карыснага металу! Але ж нікому да іх і справы няма. Праўда, што можна было адкруціць і зняць, тое даўно было знята. Стараццелі ў свой час тут добра пажывіліся. І засталося толькі тое, чаго без крана і зваркі не зварухнеш з месца.

“Ліхтароў” усё не было. І Сцяпан, бачачы як соладка пахрапвае з правага боку ад Генкі Кароціч Валянцін, і сам вырашыў крыху падрамаць. Тут не ў цягніку, але пакімарыць можна. Бывае, так падкіне, што ляціш потырч носам проста ў лабавое шкло. Але нічога, праз якую хвіліну сон зноў бярэ ў свае чэпкія абдымкі.

Сцяпан заплюшчыў вочы і ні аб чым стараўся не думаць. Але ж і сон не браў. Здаецца ж, што ўсё пакуль ідзе спраўна ў ягоным жыцці.

Без асаблівых выкрунтасаў, але неспакойна было на сэрцы... Крыху хвалявала будучая праца на мацерыку. Дый з жаніцьбай трэба будзе штосьці рабіць. З першага наскоку не атрымалася, што ж, бывае, не ў яго аднаго. Але сядзела камянём крыўда ў душы. Вось табе і Таня Калмыкова! Катаецца дзесьці на "Волзе" ды заканчвае кандыдацкую. Што ж – кожнаму сваё.

Але ж і самому трэба не спаць у шапку. Пароznаму жывуць людзі. Узяць хаця б ягоных шурфоўшчыкаў. Вось у каго вольнае жыццё. Тут ён зірнуў на Валянціна і ўсміхнуўся. Шурфоўшчык ад Бога! У маладосці нават у тэхнікуме вучыўся. Але пасля давялося кінуць вучобу, бо не было каму дапамагаць. У цёткі вырас. І падаўся на заробкі. Спачатку ў Сібіры бадзяўся, на лесапавале, а калі ўзмужнеў, перабраўся на Чукотку. Праз два гады на пенсію. Што працаваць, што выпіваць – аднолькава: з размахам і імпэтам! Ну, і розуму да канца не губляў. Сёе-тое меў на чорны дзень.

Дый пенсійнае жыццё распланаваў з самага першага дня. Меў ён намер купіць хацінку ў зацішным куточку на Палессі, адразу ж ажаніцца і пражыць пад сотню гадоў. А з жонкаю спаць да васьмідзесяці пяці. Вось так: ні больш, ні менш! На добрым падпітку ён не адзін раз апавядаў пра сваё будучае жыццё захмялелым шурфоўшчыкам. Тыя толькі рагаталі і паляпвалі Валянціна па плячы.

У нечым быў падобны на Кароціча і Аляксей Гарбуноў. Праўда, быў маладзейшы – усяго сорак гадоў. Невялічкі, але жылісты, прагны да працы і гарэлкі. На Чукотцы дзесяты год. Карцёжнік – якіх свет не бачыў. Раней жыў у Віцебску, была жонка, кватэра. Але... Пацягнула на заробкі. Прайшоў год, другі, а фінал вядомы – развод. Усё цешыў сябе тым, што аліменты засталося плаціць усяго тры гады. Раней працаваў экскаватаршчыкам на цагельным заводзе.

Буданаў Кузьма, хаця і нарадзіўся ў Беларусі, але быў з мясцовых бічоў. Падабраў яго начальнік

дзесьці у Певеку. Вока ў яго было набіта – у людзях разбіраўся. У трыццацігадовым узросце трапіў Кузьма на Чукотку. І з тае пары пятнаццаты год блукаў па яе неабсяжных прасторах.

Кім толькі яму не даводзілася працаваць: і рыбаком быў, і паляўнічым, і пастухом у аленегадоўчай брыгадзе. Правёў некалькі сезонаў і ў старацельскай арцелі. Але не пашчасціла яму, як ён любіў казаць: "не падфарціла". Карацей кажучы – два сезоны запар прагарэла іхняя арцель.

А на шурфоўцы, хаця і работа не для слабакоў, але заробак стабільны – да тысячы рублёў у месяц, а то і больш.

Самым маладым быў у брыгадзе падрыўнік Бярозкін Віця. Ішоў яму дваццаць пяты год. Адразу ж пасля арміі падаўся на заробкі. Сам быў з Гомельшчыны. Чацвёрты год працаваў на шурфах. Калі і браў якую чарку-другую, то толькі дзеля таго, каб не пакрыўдзіць сваіх старэйшых таварышаў. Усё рабіў з нямецкай акуратнасцю, Сцяпан прызначыў яго нават сваім намеснікам, бо здараліся выпадкі, што трэба было адлучацца на дзень-другі, каб праверыць разметку шурфоў у суседняй даліне.

Бо на шурфоўцы выхадных няма. Праўда, у табелі іх праастаўляюць, але сапраўдныя выхадныя дае ўсім Снежная каралева. Закруціць, замяце, нагоніць пургу дзён на пяць, а то і на ўсе дзесяць! З балка носа не высунеш! Тут шурфоўшчыкам поўная лафа – бакі адлежваюць, аб'ядаюцца мясам, набіраюць вагу.

Па-свойму і Сцяпану падабаліся пургавыя дзянёчкі. Можна было адпісаць лісты маці, пачытаць кнігу, а галоўнае – падумаць аб сэнсе жыцця.

Праўда, пра гэта думалі да яго больш разумныя і светлыя галовы, але ўсё адно было цікава. Летась упершыню амерыканскі касманаўт ступіў нагою на паверхню Месяца. Сцяпан углядаўся пасля таго на гэтае патаемнае нябеснае свяціла і не мог паверыць, што там пабываў чалавек. А што на другіх планетах? Няўжо там няма разумных істот?

І што наша жыццё? Для чаго жывем? І чаму такое кароткае? Пытанні былі без адказу.

Урэшце Сцяпан задрамаў. І адразу ж убачыў у сне сваю маці. Яна палола буракі ў агародзе, а ён стаяў з рукзаком на сцежцы і ўсё чакаў, што яна азірнецца на яго. І толькі хацеў аклікнуць, але ў гэты момант адчуў штуршок у плячо. Тут жа расплюшчыў вочы.

– “Ліхтары”, Сцёпа! – Генка падміргнуў і хуценька дадаў: – Цяпер дзве даліны прапускаем, а трэцяя наша.

– Вось і цудоўна! – Сцяпан соладка пазяхнуў. – Цяпер спаць грэх, бо можам праскочыць! Вось небаракі, – ён паказаў рукой на караблі,– уладкаваліся і адпачываюць.

– Адплавалі сваё! – Генка засмяяўся.

Настрой у яго прыўзняўся, бо праз якую гадзіну прыбудуць яны на месца, а там застанецца толькі распаліць грубкі ў балках, ды завалiцца адпачываць.

Сцяпан хваляваўся за балкі. Іх перацягнулі сюды яшчэ летам, двое шурфоўшчыкаў іх рамантавалі, але апошнія тры месяцы былі яны без нагляду. А гэта небяспечна, цяпер па тундры бадзяецца многа рознага люду: чукчы-пастухі, геолагі, дый старацелі могуць нашкодзіць. Нават і скрасці, калі на тое пайшло.

І як толькі яны завярнулі ў сваю даліну, Сцяпан адразу ж пачаў углядацца наперад, але пакуль нічога не бачыў. Месяц то свяціў, то хаваўся ў рванае ашмоцце аблокаў.

– Стаяць, галубчыкі! – як бы згадаўшы Сцяпанавы думкі, усклікнуў Генка.

– У цябе вочы, як у таго сакавіцкага ката! – смеючыся, адказаў Сцяпан, хаця сам балкоў яшчэ не бачыў.

Генка паддаў яшчэ газку і трактар ляцеў, быццам той танк. Урэшце і Сцяпан убачыў удалечыні ледзь прыкметныя дзве чорныя кропкі.

– Каб толькі грубкі былі на месцы, – сказаў Генка. – Летась у брыгадзе Валодзі Каваленкі сцягнулі з двух балкоў.

– А хто? – насцярожыўшыся, спытаў Сцяпан.

– Хто ж яго ведае! Хутчэй за ўсё старацелі. Яны там непадалёку дзяжурылі на перавале, расчышчалі дарогу бульдозерам.

Але дарэмна хваляваўся Спяпан. Балкі былі ў спраўнасці, іх нават ніхто і не адчыняў, бо дзверы былі забітыя дошкамі.

Адразу ж пачалі ўладкоўвацца. Адны кінуліся распальваць грубкі, другія ўзяліся за разгрузку прадуктаў, выбухоўкі і вугалю. Працавалі хутка. Сцяпан дапамагаў разгружаць выбухоўку ў спецыяльны склад, які стаяў пад сопкай метраў за чатыраста ад іхніх балкоў.

Ён жыў адзін у асобным балку. У яго стаяла рацыя і захоўвалася неабходная дакументацыя. Два разы на дзень, акрамя суботы і нядзелі, звязваўся з базай.

Усё было даўно вядома і адпрацавана, але на Поўначы здарэнняў хапае, тут трэба быць пільным і ўважлівым. Невялікая памылка можа каштаваць вам жыцця.

Гэта Сцяпан добра зразумеў у першы свой сезон. Вось так жа прыехалі на новае месца, а ягоныя рабочыя адразу ж пачалі насіць вёдрамі вугаль у тамбур балка. Ён не стаў гэтага рабіць, бо вялізная куча вугалю ляжала за сем метраў ад ягонага балка.

І так здарылася, што першая пурга, якая працягвалася пяць дзён, ледзь не прымарозіла яго. Дзесьці на другія суткі скончыўся ў яго вугаль. Хуценька апрануўся, узяў вядро і выскачыў з балка. З цяжкасцю ўдалося накідаць вугалю ў вядро, бо навокал гуло на ўсе лады.

Зліпаліся вейкі, немагчыма было дыхаць. Але галоўная бяда чакала яго наперадзе. Рушыў з вядром да балка, зрабіў добрых дзесяць крокаў, а таго няма – раптоўна знік, быццам і не было, а здаецца ж, добра запомніў, адкуль прыйшоў. Добра яшчэ, што праз які час пашчасціла зноў трапіць да кучы з вугалем. Дачакаўся, калі стала на імгненне зацішней, ды ўбачыў балок у зусім іншым кірунку.

Пашкадавала яго ў той дзень Снежная каралева. Толькі крыху папужала, быццам папярэдзіла: "Глядзі ў мяне, галубок!"

Той першы яе ўрок ён запомніў на ўсё жыццё. Цяпер праблем амаль не было. Як толькі разгрузілі выбухоўку, ён зайшоў у свой балок і адразу ж пачаў распальваць грубку. Налажыў дроў, абліў салляркай і чыркнуў запалкай. Як толькі дровы ўгарэліся, адразу ж насыпаў зверху вугалю. Без яго ў тундры і тыдня не пратрымаешся.

Грубка ажыла, загула і пачала даваць выратавальнае цяпло. Яго трэба было многа, бо балок быў халодны і настылы. Сцяпан распрануўся, паставіў на грубку вядро са снегам і пачаў рыхтаваць снядaнак. Пасля выпіў чайку і адразу ж у ложак. Заснуў імгненна. Бяссонніца на Чукотцы амаль нікому не дакучае.

## Частка трэцяя

На наступны дзень Сцяпан падняўся а дзесятай гадзіне. Спяшацца не было куды, бо працягвалася палярная ноч. Дзесьці так пасля адзінаццаці павінна было крыху пасвятлець. А пасля абеду зноў спаўзае ў даліну змрок з вяршынь навакольных сопак.

Ён адразу ж узяўся за ўстаноўку антэны для рацыі, каб вечарам паспрабаваць звязацца з базай. Ды яшчэ патрэбна было ў гэты кароткі светлы час адшукаць першую шурфовачную лінію, праверыць разметку шурфоў, а падрыўніку заняцца сваёй справай – устанавіць мінную станцыю. Яна ўяўляе з сябе спецыяльную скрынку, дзе знаходзяцца строга на сваіх месцах выбухоўка, капсулі-дэтанатары і дэтаніруючы шнур.

Сцяпан паснедаў, апрануўся і выйшаў з балка. Навокал стаяла цішыня, амаль што развіднела. Ён крыху пастаяў, зірнуў на сопкі, а пасля накіраваўся ў нізоўе даліны.

Без асаблівых цяжкасцей знайшоў першую шурфовачную лінію. Там, дзе павінны быць шурфы,

стаялі драўляныя калы-вешкі. Наступную лінію, якая была зададзена па карце за чатырыста метраў уверх па даліне, Сцяпан вырашыў не шукаць, бо пасля часу будзе многа – дзён дзесяць, а то і больш. Галоўнае – пачаць праходку, а там, дасць Бог, усё пойдзе без асаблівых прыгод.

Калі вяртаўся назад, то ўбачыў падрыўніка Віцю. Той валок на санках мінную станцыю. Падышоў бліжэй, парукаліся.

– Добрых дзвесце метраў адмерай ад шурфоў, а пасля працягвай званковы провад, – сказаў Сцяпан. – А як усё будзе гатова, пойдзем на склад па выбухоўку, – дадаў ён і, порстка павярнуўшыся, накіраваўся да балкоў.

Шурфоўшчыкі таксама даўно прачнуліся і ладкавалі свой быт: хто вугаль цягаў у тамбур, хто ложкі рамантаваў. Па даўнешай завядзёнцы ў першы дзень ніколі не пачыналі працу, бо іншых спраў хапала.

Сцяпан вырашыў у першы ж дзень агледзець даліну. Ён закінуў за плечы стрэльбу-двухстволку, паклаў у кішэню кажушка з дзесятак патронаў, палову пачкі цукру, на выпадак нечаканай пургі, стаў на шырокія паляўнічыя лыжы і няспешна пасунуўся ў вярхоўе Кайнваама.

Даліна была сярэдніх памераў, але з выкрунтасамі – выпруджвалася, быццам тая змяя, як бы не жадаючы адразу ж раскрыць сябе незнаёмаму падарожніку. З абодвух бакоў цягнуліся да яе, быццам тыя сыночкі, – раўчукі-распадкі. Вясною, з вясёлым і шумлівым гулам, несліся па іх патокі вады, змятаючы ўсё на сваім шляху.

Але цяпер яны былі прыціхлыя, надзейна і надоўга ўхутаныя снегам, які з цягам часу да таго ўтрамбоўваўся вятрыскамі, што можна было смела хадзіць без лыжаў.

Спачатку Сцяпан нічога асаблівага не заўважыў. Але як толькі мінуў чарговы паварот, то справа ўбачыў, як з пакатага схілу збягалі ўніз паўразбураныя невялічкія хаткі-мазанкі. Стрэхаў у іх не было – толькі сцены, умела і надзейна выкладзеныя з серпантыну.

“Вось табе і чортава пята”,– падумаў Сцяпан, успамінаючы словы начальніка. Несвядомаму чалавеку магло нават падацца, што ён натрапіў на старажытнае паселішча першых абарыгенаў Чукоткі.

Але Сцяпан адразу ж зразумеў – тут калісьці працавалі зняволеныя. Праўда, спачатку не дапетрыў, чым яны тут займаліся. Але калі прайшоў яшчэ з якую сотню метраў ды выпадкова кінуў позірк улева – на вялізную сопку, то адразу ж усё зразумеў. Ён убачыў тры штольні, якія пагрозліва ашчэрыліся сваімі ўваходнымі дзірамі-пашчамі, выкладзенымі з тоўстых бярвенняў. Сцяпан дакладна ведаў, што такія штольні на касітэрыт або золата не праходзяць. А раз так – тут шукалі штосьці іншае. Калі падышоў бліжэй, яму не спадабаўся нават колер серпантыну ля самага падножжа сопкі, бо той быў сіваваты, быццам чымсьці пашкоджаны.

Вырашыў пры выпадку спытаць пра штольні ў начальніка, а сам тым часам падняўся яшчэ крыху ў вярхоўе, бо не былі відаць калы-вешкі чарговай шурфовачнай лініі. Але паціху даклыпаў і да іх. Усе былі на месцы, але стаялі панура нахіленыя, быццам тыя малайцы ля крамы.

Хацеў ужо вяртацца назад, але тут заўважыў некалькі вялізных валуноў-камянёў. Гэта яго не здзівіла, але насцярожыла. Бывала, што трапляліся валуны пры праходцы шурфоў, але каб вось так ляжалі, як тыя адкормленыя парсюкі, на самай паверхні даліны, такога ён яшчэ не бачыў.

І хаця ўжо браліся добрыя прыцемкі, Сцяпан вырашыў яшчэ прайсці якую сотню метраў, бо вельмі ж хацелася пераканацца, што больш сюрпрызаў не будзе. Але ён памыліўся. Праз якую хвіліну ўбачыў столькі камянёў, праўда, крыху меншага памеру, што спыніўся і пазіраў на іх, як той зачараваны вандроўнік.

Здавалася, што хтосьці незнарок насыпаў іх з неба, як таго гароху, бо яны бессаромна засцілалі ўсё рэчышча даліны. Тут яны навідавоку, але ж чым бліжэй да акіяна, то, напэўна ж, будуць хавацца ў мерзлаце, апускаючыся ўсё ніжэй і ніжэй,

ажно да самых карэнных парод. Так, прадчуванне яшчэ ніколі Сцяпана не падводзіла. Задоўга да ад'езду ў тундру пасялілася ў ягонай душы думка, што апошні сезон будзе не з лёгкіх.

Ён яшчэ крыху пастаяў, а пасля ўздыхнуў і накіраваўся да сваіх балкоў. Уцямнела даволі-такі добра, але свой лыжны след ён яшчэ бачыў. Лёгкі вецер-цягунок, які амаль заўсёды любіў гойсаць да акіяна, нясмела падштурхоўваў яго ў спіну.

Сцяпан вырашыў пра ўбачаннае пакуль сваім не расказваць, каб не сапсаваць настрою, а там яшчэ невядома як яно складзецца, бо ў прыроды столькі таямніц, што хопіць не на адно пакаленне геолагаў.

Бывала ў гісторыі, і не адзін раз, што барадатыя акадэмікі прадказвалі адно, а на практыцы атрымлівалася такое, што і ў страшным сне не ўбачыш.

Як толькі Спяпан зайшоў у балок, то адразу ж уключыў рацыю, бо хвілін праз дзесяць павінен быў выйсці з ім на сувязь Андрэй Іванавіч. Пасля запаліў лямпу, падкінуў у грубку вугалю і пачаў раскладваць па паліцах свой няхітры скарб.

Перш-наперш асцярожна дастаў з рукзака папку з дакументамі, дзе была надзейна ўпакавана невялічкая іконка Ісуса Хрыста. Яму яе падарыла нябожчыца-бабуля як толькі ён скончыў дзесяць класаў і рушыў са свайго дома ў самастойнае жыццё. Калі вучыўся ў інстытуце, то ў інтэрнаце адважыўся павесіць яе на сцяну толькі на пятым курсе. Раней проста баяўся, бо пасля выкліку ў КДБ маглі і выключыць, як ненадзейнага будучага будаўніка камунізму.

Прымацаваў іконку ў самым кутку, і адразу ж пасвятлела на душы – раптоўна знікла трывожнасамотнае пачуццё, якое апошнімі днямі не давала яму спакою.

І тут адразу ж ажыла тэлефонная трубка рацыі. У ёй пачуўся трэск, шум, а праз хвіліну, калі ён узяў яе ў руку і хуценька крутануў рычажок гуку, пачуў голас начальніка.

– “Бяроза!” “Бяроза!” Я “Клён”, як чуеш мяне, прыём!

– Чую вас, Андрэй Іванавіч! Заехалі выдатна, уладкоўваемся. Заўтра прыступаем да праходкі сто пятай лініі. Якія навіны?

– Праз тыдзень-другі чакай гасцей з дзяржтэхнадзору, а пасля і я пад’еду з маркшэйдэрам. Усё! Канец сувязі!

Сцяпан паклаў трубку і выключыў рацыю. У пачатку кожнага шурфовачнага сезона надакучвалі розныя камісіі, якія сваімі праверкамі і занудзістымі парадамі рабілі толькі адно – заміналі працаваць. Калі інспектара з тэхнадзору, які кантраляваў захаванне выбухоўкі і правядзенне падрыўных работ, яшчэ можна было зразумець, то розных гасцей з ГоКа, а то і з самога Магадана Сцяпан цярпець не мог. Бо ў тых адно было ў галаве – вырвацца з кабінетаў у тундру ды ўрэшце па-сапраўднаму расслабіцца, выпусціць пару, а прасцей кажучы – напіцца да чорцікаў, каб і лыка не вязаць. І нікога не трэба баяцца: ні табе жонкі, ні начальства, ні сваіх падначаленых. Тое надзейна замацавалася ў няпісаным паўночным правіле, ніколі і нікім не аспрэчвалася.

Павячэраўшы, Сцяпан прылёг на ложак і ўключыў прыёмнік. Старэнькая “Спідола” надзейна служыла яму пяты год. Праўда, перадачы з Масквы злавіць было не проста, заўсёды такія памехі, што месяцамі не ведаў апошніх навін. А вось голас Амерыкі вяшчаў – лепш не трэба! Яно і не дзіўна – амаль побач жылі амерыканцы. А вазьмі да вайны, то іхнія камерсанты гойсалі па ўзбярэжжы Чукоткі, як у сябе дома. Кажуць, што нават і ў цяперашні час іхнія падводныя лодкі нярэдка заходзяць у халодныя чукоцкія воды.

Праслухаўшы навіны, ён падняўся, выключыў прыёмнік і вырашыў наведаць шурфоўшчыкаў, бо заўсёды перад пачаткам работ яны збіраліся разам, каб вырашыць усе праблемы, дый заяўкі на харчаванне ўдакладніць – што каму прывезці.

У балку ўсе былі ў зборы. Дый куды яны маглі падзецца, калі далей за палову кіламетра без Сцяпанавага дазволу разгульваць не маглі.

– Праходзь, Сцёпа, расказвай, – прамовіў Міхаіл Пятровіч, падкідваючы ў грубку вугалю. – Што з базы перадалі?

– Нічога асаблівага. – Сцяпан усеўся на лаву ля стала і зняў шапку. – Дзесьці так праз тыдзень інспектар прыедзе, а пасля і начальнік.

– Як даліна? Штосьці ты доўга быў у вярхоўі? – спытаў Валянцін.

– Нічога асаблівага. Праўда, непадалёку ад нас убачыў паўразбураныя домікі, зняволеныя тут працавалі, тры штольні прабілі ў вялізнай сопцы.

– А што шукалі? – дапытваўся насцярожаны Валянцін.

– Бог іх ведае. На Чукотцы карысных выкапняў навалам. Адно скажу – не золата і не касітэрыт.

– То яны ж, напэўна, і шурфы праходзілі, – уступіў у гутарку Кузьма.

– Хто іх ведае. Магчыма, і прайшлі з які дзесятак, каб даць геолагам наметку на будучыя работы. Але мы – эксплуатацыйная разведка, ставім, так бы мовіць, апошнюю кропку. Пасля нас тут пачнуць прамыўку пяскоў старацелі.

– А я думаў, што мы тут самыя першыя, – з расчараваннем у голасе працягваў Кузьма.

– Чаго захацеў, – Сцяпан усміхнуўся. – Першым тут калісьці пабываў Мікіта Шалаўраў. Купец, які гойсаў тут яшчэ ў далёкім 1761 годзе. Ён першы даў апісанне Чаўнскай губы, дзе цяпер порт Певек. Няўдачай скончылася ягоная першая спроба прайсці ад ракі Лены на ўсход у пошуках праліва да Ціхага акіяна. Дабраўся ён толькі да мыса Білінгса, дзе і загінуў. А пасля яго тут столькі народу пабывала, што і не злічыць. Нават і мы з вамі дапалі, каб злавіць птушку шчасця за хвост.

– Дзе ж яе цяпер схопіш з такой нормай, – сказаў Аляксей.

– Самі ж і вінаваты, – спакойным голасам адказаў Валянцін. – Мне пашчасціла захапіць

яшчэ тыя залатыя дзянёчкі, калі нормай быў саракоўнік, – са смакам пацягнуўшы цыгарку, працягваў ён.– Шчыра скажу – працавалі да абеду, а пасля вольныя казакі: хто на паляванне, хто спаць, хто ў карты гуляць. Бугор наш пільна сачыў – каб ні сантыметра больш за змену, бо ведаў – заўтра ж накруцяць расцэнкі.

– І якія заробкі былі за такую работу? – пацікавіўся Кузьма. – Гэта ж за месяц праходзілі толькі дзесяць метраў – адзін шурф.

– З навалачкай хадзілі палучаць, – з усмешкай адказаў Валянцін, – бо яшчэ старымі грашыма атрымлівалі. А так за месяц выходзіла да васемнаццаці-дваццаці тысяч. Легкавушка “Пабеда” каштавала ў тыя гады шаснаццаць тысяч, а задрыпаны “Масквіч” і таго меней – усяго восем штук. Бывала, як у водпуск прыедзем, то новенькага “Масквіча” бралі, але больш за тры месяцы той не вытрымліваў, бо нап’емся ды шпокнем радыятарам у бярозу. А цяпер,– ён уздыхнуў, – да таго ўсё змянілася, што вось прыеду ў свае мясціны – на Палессе, то далібог не пазнаю. Летась ліст атрымаў, што да таго павысушвалі балоты – вада са студняў знікла. Проста скажу – не хапае шэрага рэчыва ў галовах нашага кіраўніцтва. Няўжо не разумеюць, што без вады і балот усё звяр’ё вынішчаецца. Як цяпер памятаю – бацька прыносіў з палявання па дванаццаць зайцоў. Маці, бывала, крычала, каб больш пяці не страляў, бо кешкацца з імі дацямна. Дый на Чукотцы белякоў было навалам. Бывала, выйдзем у тундру месячнай ноччу, навокал цішыня, крыху адыдзем ад балкоў, а яны гарцуюць... То мы яшчэ выбіралі – якога стрэльнуць, а цяпер зрэдку толькі і ўбачыш. Усё вынішчаецца. Да чаго ідзем, Сцёпа. Ты ў нас чалавек веруючы – адкажы грэшнікам.

– Зямля, як планета, забруджваецца, – пачаў Спяпан, – і не толькі ад фабрык і заводаў, але нават і ад нашых грэшных думак.

– Штосьці не даходзяць да мяне твае словы, – сказаў Валянцін.

– Тут усё проста: пажадаў ты каму непрыемнасці, а праз які час твая ж думка-пажаданне абавязкова вернецца да цябе, але ў іншай форме – захварэць можаш або валун трапіцца ў шурфе з добрую печ. Чалавек павінен кожны дзень пачынаць і заканчваць з малітвы, пра гэта я вам кажу не першы год, вось тады ўсё пойдзе на лад.

Сцяпан падняўся з лавы, адзеў на галаву шапку і ўжо ля самага парога азірнуўся і дадаў:

– Нагадваю пра правілы бяспекі, а галоўнае – працуйце без фокусаў, шпіёнаў нам больш не трэба, усяклі?!

І пад рогат бадзяг-шурфоўшчыкаў ён выйшаў з балка. Тыя адразу ж сцямілі, што ён меў на ўвазе. Летась, калі вясною займаліся прамыўкай рэчышчавых шурфоў, яны злавілі "дыверсанта-разведчыка", які, на іх думку, быў высаджаны з амерыканскай падводнай лодкі. А здарылася анекдатычная гісторыя, як у тым кіно.

Сцяпан у той дзень вырашыў махнуць цераз перавал у суседнюю даліну, каб прыкінуць колькасць рэчышчавых шурфоў, якія патрэбна будзе прамыць у першую чаргу, бо праз дзень чакалі трактар для пераезду. А сваім рабочым загадаў збірацца ў дарогу.

І толькі тыя пачалі рыхтаваць прамывалку, як адкуль ні вазьміся падышоў да іх незнаёмец у новенькай з іголачкі форме – зялёнага колеру штаны і такая ж куртка з прыгожымі нашыўкамі і незразумелымі надпісамі на замежнай мове. Асабліва насцярожыла шурфоўшчыкаў тое, што размаўляў незнаёмец з акцэнтам.

Гэта і вырашыла ягоны далейшы лёс, бо першым сцяміў, што і да чаго, Валянцін. Выбраўшы зручны момант, ён шапнуў хлопцам: "Амерыканскі шпіён з падводнай лодкі".

І, нядоўга раздумваючы, наваліліся ўсім кагалам, звязалі таму рукі ды зацягнулі чамусьці ў Сцяпанаў балок. А самі абмяркоўвалі, што за ўзнагароду атрымаюць ад супрацоўнікаў КДБ.

Калі Сцяпан вярнуўся, то адразу ж развязаў палоннага, бо той сказаў, што ён – новы галоўны

маркшэйдэр з ГоКа, а ехаў на ўсюдыходзе з геолагамі, але той на перавале зламаўся, дык ён вырашыў дабрацца да іх пешшу, бо балкі былі ўжо відаць.

Так яно і аказалася. А гутарыў з акцэнтам таму, што сам быў з Латвіі, хаця і вучыўся ў Маскве.

На наступны дзень, як толькі крыху развіднела, Сцяпан выпісаў накладную і выдаў падрыўніку дзённую норму аманіту і капсуляў-дэтанатараў. А праз якую гадзіну даліну ўскалыхнулі першыя выбухі. Згаладаўшыся па сапраўднай працы і адпачыўшы за лета, шурфоўшчыкі працавалі з ахвотай і натхненнем. Праўда, у кароткае чукотскае лета яны таксама не былі без працы: хто заставаўся ў тундры на рамонце балкоў, хто быў пераведзены на кар'ер, дзе працавалі на спецыяльных прыборах, якія прамывалі пяскі і здабывалі мінерал касітэрыт, з якога пасля на абагачальных фабрыках атрымлівалі волава, без якога нават кансервавую бляшанку не зробіш. Але ж хіба такую працу можна было параўнаць з шурфоўкай?

Не кожны вытрымае па дванаццаць гадзін дзяўбаць ломікам векавую мерзлату ды пасля ўзрыву падымаць на паверхню ў вялізных боднях пароду, якую яшчэ трэба выкласці ў кучы-праходкі – іх пасля прамывае спецыяльная брыгада.

Амаль кожны сезон, у першы месяц працы, праходка па метражы была самай высокай. І тут Сцяпану даводзілася частку метражу пакідаць на наступны месяц, каб увесь сезон працаваць з запасам. Але свае карэктывы ўносіла пурга: па чатыры, а то і ўсе дзесяць дзён выпісвала выхадныя.

Месячны заробак у шурфоўшчыкаў быў да тысячы рублёў. І пры ўдачным сезоне можна было зарабіць на дзве легкавушкі. Але ж затое і здароўе зношвалася быццам на той цёрцы. Недахоп кіслароду вельмі хутка даваў аб сабе знаць. Сцяпан аднойчы нават вычытаў, што хто пражыве на Чукотцы бязвыезна пяць гадоў, то ў таго пачынаюцца незваротныя змены ў арганізме: змяншаюцца ў аб'ёме лёгкія і вельмі хутка зношваецца сэрца.

Першы працоўны дзень скончыўся даволі ўдала – амаль па паўтара метра прайшлі шурфоўшчыкі. Цяпер Сцяпана непакоілі толькі будучыя тундравыя госці. Звычайна, асабліва перад іх прыездам, Сцяпану паведамлялі з базы па рацыі, каб рыхтаваўся да сустрэчы. Але не адзін раз былі такія выпадкі, што налятаелі яны на сваіх усюдыходах, а то і верталётах зусім нечакана, як снег на галаву.

Тут трэба было, як той казаў, "зёву" не даваць. І калі на аманітцы ў Сцяпана быў поўны ажур, бо горны інспектар прывучыў: даволі часта налятаў знянацку і адразу ж ішоў правяраць колькасць выбухоўкі па накладных, а калі што, то мог і забараніць правядзенне падрыўных работ. То па гэтай частцы Сцяпан быў вучоны.

Але ж заставаліся яшчэ шурфы. Тут былі свае няпісаныя законы, пра якія, дарэчы, добра ведалі ўсе правяраючыя. Праўда, заўсёды рабілі выгляд, што ўпершыню ў сваёй практыцы сустракаюцца з тым, што кожны паважаючы сябе шурфоўшчык абавязкова самастойна праводзіць зарадку шпуроў на ноч. Бо раніцай, пры ўзрыве, атрымліваецца за адну адпалку даволі значная ўходка па метражы – марозік за ноч надзейна прыхоплівае забойку ў шпурах.

Але ж па правілах бяспекі такога рабіць нельга. Больш за тое – праводзіць зарадку шпуроў павінен падрыўнік, а не шурфоўшчык. А гэта вельмі небяспечна, калі той сам забурваецца, а пасля адразу ж праводзіць зарадку двух, а то і трох шпуроў.

Тут і да трагічнага выпадку рукой падаць. Мала таго, знаходзіліся сярод іх і такія "рацыяналізатары": каб хутчэй забурыцца, устаўлялі ў невялікую бурку капсуль-дэтанатар і пры дапамозе звычайнай пляскатай батарэйкі падрывалі яго, прычым самі не вылазілі з шурфа, а толькі адварочваліся тварам у процілеглы бок.

Летась у Сцяпана ад такога вынаходства ледзь не загінуў самы дасведчаны ягоны шурфоўшчык – Кароціч Валянцін. Выпадкова застаўся ў жывых. А здарылася так, што ў старой бурцы ад папярэдняга ўзрыву засталося крыху аманіту, такое бывае.

І калі ён падарваў дэтанатар, то адбыўся хаця і слабы, але выбух. Здарылася гэта на глыбіні дзесяць метраў. Добра яшчэ, што Кузьма, пачуўшы выбух, адразу ж падняўся на паверхню і зазірнуў да Валянціна. Той ляжаў без прытомнасці, нават не варушыўся. Спяпан тады сам спусціўся ў шурф, аперазаў Валянціна тросікам пад пахі, і яны паднялі небараку на паверхню. Каб крыху спазніліся, то загінуў бы той ад газаў, якія ўтвараюцца пры выбуху.

А так асколкамі ад пароды пасекла таму мяккае месца, спіну, дый твару добра-такі дасталося. І толькі ачуняў той, селі абедаць, а тут, як на тое ліха, на табе – усюдыход вуркоча ля балка. Горнага інспектара прыгнаў нячысцік. І каб жа ў Сцяпанаў балок завітаў, як гэта звычайна рабіў, не – да шурфоўшчыкаў папёрся. Нюх, як у той расамахі. Толькі зірнуў на пакалечаны Валянцінаў твар, як адразу ж кінуўся ў роспыты: што, ды як...

Сцяпан таксама паспеў зайсці да іх у балок і стаяў за інспектарам, ля самага парога. Ён не на жарт спалохаўся, бо штосьці ж трэба было адказваць. Але Валянцін не разгубіўся, а, усміхнуўшыся, спакойным голасам прамовіў: "Учора дзербалызнулі крыху, выносіў попел з вуголлем ды з тамбура паляцеў потырч носам проста на тазік, вось і прысмаліла крыху..."

На гэтым усё і скончылася. Пад вечар таго ж дня падаўся інспектар на праверку іншых участкаў.

Тое здарэнне нават саміх шурфоўшчыкаў праняло да пятак – больш такімі фокусамі не займаліся.

А дзесьці так праз тры дні, якраз пасярод ночы, у дзверы Сцяпанавага балка моцна пастукалі. Ён усхапіўся і зазірнуў у акенца. Непадалёку ў месячным святле ўбачыў усюдыход. Апрануўся і адчыніў дзверы. У балок зайшлі двое. Былі яны ў карычневых кажушках, у якія звычайна апранаецца ўсё чукотскае начальства і чорных касматых шапках.

Сцяпан адразу ж сцяміў, што гэта не геолагі.

– Прывітанне разведчыкам! – з весялосцю ў голасе сказаў чарнявы незнаёмец, здымаючы шапку. Другі моўчкі стаяў ля парога. Сцяпан адказаў на прывітанне і запаліў лямпу.

– Праверка пашпартоў, – прамовіў чарнявы.

– А вы хто? – спытаў Сцяпан.

– Капітан Камітэта дзяржаўнай бяспекі Бутар Генадзь Іванавіч. – І ён тут жа працягнуў сваё пасвечанне. Сцяпан уважліва прачытаў яго, мельгам зірнуў на маленькую фотакартку і перадаў капітану.

– Можа, чайку? – прапанаваў Сцяпан.

– Не, не! Мы спяшаемся.

Сцяпан паказаў свой пашпарт, а пасля адправіліся да балка шурфоўшчыкаў. Тыя спрасонку не маглі ўцяміць, што і да чаго, але пасля, хаця і з цяжкасцю, пашпарты свае адшукалі.

## Частка чацвёртая

І пацяклі падобныя адзін на аднаго, як тыя блізняты ў гаротнай матулі, шурфовачныя дзянёчкі. Мінула толькі тры тыдні, а першая шурфовачная лінія была амаль скончана. Засталося дабіць толькі два рэчышчавыя шурфы. Давялося павалэндацца і з валунамі, сустрэліся яны амаль перад самымі карэннымі пародамі, да якіх звычайна праходзяць шурфы.

І калі Валянцін з такім падарункам справіўся даволі хутка, то Кузьме давялося цэлы дзень з ім пабарукацца. Вечарам Сцяпан зайшоў у балок да шурфоўшчыкаў.

– Сцёпа, рассудзі нас, грэшнікаў, – адразу ж прамовіў Валянцін.

– А што такое?

– Паслаў мне сёння Бог валун у шурф, то я і не крыўдую, бо няверуючы, дый ні адной малітвы не ведаю. Але ж за што Ён такога велікана Кузьме падкінуў, га? Ён жа ў нас, лічы, старавер, нават моліцца пасля вячэры.

– А тут і здзіўляцца няма чаму, – адказаў Сцяпан, прысаджваючыся на лаву і здымаючы шапку з галавы.

– Як гэта няма чаму? Ды мы бітыя дзве гадзіны пра гэта спрэчку вядзем! Нават галасы пасадзілі.

– Бог таму паслаў Кузьме такі валун, каб пераканацца ў ягонай веры і, заадно, не тое б што прымусіць, а даць яму імпульс, натхненне і разуменне таго, што жыццё на зямлі кароткае, і мы павінны рыхтаваць сябе ў царства нябеснае.

– Ну, калі так, то гэта іншая справа, – працягнуў Валянцін.– Але калі ў другім шурфе Усявышні пашле яму яшчэ некалькі валуноў, то ні паразумення, ні тым больш натхнення ў яго ўжо не будзе.

– Як сказаць! – Сцёпа паляпаў Кузьму па плячы. – Трымайся, а гэтых грэшнікаў не слухай. Калі што – заві на дапамогу.

– І пра сопку са штольнямі хачу ў цябе спытаць, – працягваў Валянцін.

– Чым жа яна табе не дагадзіла?

– Колер яе серпантыну не падабаецца. Быццам тая белая варона ў чарадзе. Даведайся у начальства, добра?

– Спытаю, але думаецца мне, што няма нам чаго яе баяцца. Толькі самастойна лазіць у штольні не дазваляю. Як той казаў: "Сцеражонага Бог сцеражэ!"

– Вось-вось, я ўжо ў такіх справах вучоны, – з весялосцю ў голасе адказаў Валянцін. – На прыіску "Вогненны" курсы скончыў.

– Раскажы, як ты там разбагацець хацеў, – прамовіў Кузьма.

– Была, хлопцы, справа. Гадоў з пяць таму загуляў я ў Певеку па-чорнаму. Усё да капеечкі прасадзіў, згаладаўся, з бічамі ў аэрапорце. І тут пашчасціла – сустрэў знаёмага даўняга сябрука, які і параіў падацца на "Вогненны". Дабраўся туды даволі ўдала – з геолагамі. На працу прынялі адразу – нават мая спісаная працоўная кніжка не выклікала ў іх падазронкі.

Заробкі – лепш не трэба! Да двух тысяч у месяц набягала, а калі нават і больш. Расцэнкі павышаныя – усім так плацілі. Мінуў месяц, другі, амаль усё на ўзроўні, вось толькі здаровыя зубы ў роце пачалі без той патрэбы гойсаць туды-сюды, ды яшчэ кроў з дзёснаў ледзь не цурком бяжыць. Кінуўся я ў роспыты, а мне і кажуць: "А што ж ты хочаш? Кінавар здабываем, з якой пасля ртуць атрымліваюць. Ідзе атрутнае выпарэнне, праз год-другі і капыты можаш адкінуць!"

Пасля такіх размоў схапіў я свой рукзак ды даў дзёру – толькі мяне і бачылі. Бо пажыць яшчэ хочацца, а грошы заробім, было б здароўе.

– Яно так, – у задуменні прамовіў Кузьма, – але ж пасля шурфоўкі злятаеш на піва ў Магадан і прасадзіш усё да капеечкі.

– Выпіць, канечне, давядзецца, – Валянцін запаліў цыгарку, – але і на чорны дзень нешта маю. Дый векаваць у гэтай тундры не думаю. Тысяч пяцьдзесят збяру ды падамся на сваё Палессе. Прыдбаю хаціну ў зацішным месцы, каб лес быў побач, ды рэчка... Хаця згодзен і на невялікае азярцо, ды буду бабу шукаць. І не замухрышку якую, а ў самым саку – каб цыцкі па вядру і з прывабна-прыглядальным азадкам, усяклі?! Вось так! Пасля і вас, грэшнікаў, запрашу ў госці.

Пагаварыўшы яшчэ крыху пра надзённыя справы, Сцяпан адправіўся ў свой балок.

На наступны дзень, дзесьці так к абеду, толькі выйшаў ён з балка, кінуў прывычны позірк у нізоўе даліны, туды, у бок акіяна, і анямеў: яшчэ здалёк убачыу чорную кропку, якая хвалепадобна рухалася і на вачах павялічвалася ў памерах.

"Яшчэ кагосьці чорт нясе!" – вылаяўся пра сябе Сцяпан і хуценька падаўся да шурфоўшчыкаў, якія якраз завіхаліся ля вараткоў, адкачваючы пароду пасля выбуху.

Тыя імгненна прыхавалі аманіт і працягвалі працаваць. Урэшце Сцяпан разгледзеў, што гэта быў не трактар, а ўсюдыход, які шпарка імчаў па даліне.

Хвілін праз дваццаць, так і не даехаўшы нават да шурфовачнай лініі, усюдыход порстка развярнуўся і спыніўся.

Хтосьці выйшаў з кабіны, махнуў рукой і той, быццам застаялы жарабец, ірвануў па сваім жа следзе да акіяна.

Сцяпан чакаў незнаёмца ля балка. А той крыху пастаяў, закінуў на плечы невялічкі рукзак і накіраваўся да балкоў. І тут Сцяпан урэшце пазнаў у незнаёмцы Валодзю Каваленку – іхняга горнага майстра, з якім ён беспаспяхова спаборнічаў ужо трэці сезон. Валодзя са сваімі шурфоўшчыкамі працаваў у рэчышчы даліны Паалявам. Хлопцы ў яго былі зухаватыя, маладыя, працавітыя, кожны марыў пабольш зарабіць ды прыдбаць адным махам кватэру і легкавушку.

– Што, навёў я на вас сполаху? – смеючыся, спытаў ён, падышоўшы да Сцяпана і моцна паціскаючы яму руку.

– Ты ж ведаеш маё стаўленне да гасцей: ні працаваць, ні адпачыць, ні напіцца як след не дадуць.

– Дык ты ж і кроплі ў рот не бярэш.

– Затое мае хлопцы не промах – бочку могуць за тыдзень асушыць. Яны зайшлі ў балок і распрануліся. Сцяпан паставіў на стол чайнік, дастаў бохан хлеба, балгарскія памідоры і дзве банкі фаршу.

– Геолагі з раённай экспедыцыі да цябе падкінулі, гадзіны праз тры абяцалі зноўку за мной заехаць, – прамовіў Валодзя, уплятаючы фарш з памідорамі.

– І якія ў цябе навіны? – пацікавіўся Сцяпан.

– Працуюць хлопцы. Вось мы падняліся ў вярхоўе даліны, а там якраз пачынаецца высачэзная града, і штосьці з базай не магу які дзень звязацца. Вось і прыехаў, каб паспрабаваць наладзіць сувязь з табой, а ты з базай.

– Давай паспрабуем, – Сцяпан дапіў чай і хуценька прыбраў са стала. Пасля зноў усеўся на ложак і спытаў:

– Як у цябе даліна, валуністая?

– Ды не. Дзе-нідзе бывае і высуне нос камянюка, але памерамі з бодню, а то і менш.

– Зноў нас па метражы абскачаш?

– Не ведаю. Але за гэты месяц па сорак метраў на чалавека павінна выйсці. Летась мы добра хапянулі. Нават я па тысячы рублёў за месяц паклаў на ашчадную кніжку.

– Як жа ты зарабіў? – здзівіўся Сцяпан. – У нас з табою аклады, нават па чатыры сотні з палявымі не выходзіць!

– Трэба ўмець! – рассмяяўся Валодзя.

– Можа, у вольныя часіны займаешся паляваннем на пясцоў?

– Якое там! У мінулы сезон толькі два ў капкан трапілі, ды і то выпадкова. Іх жа ўлетку прыкармліваць трэба, раскідваць мяса ля іхніх нораў. А зарабляю грошы звышсакрэтнай метадай – нават табе пакуль не магу сказаць. Хачу і ў гэтым сезоне паспрабаваць, мо штосьці і выйдзе, а там – лахі пад пахі ды ў сваю Украіну. Але ж з пустымі рукамі грэх адсюль выязджаць. На Чукотцы ўсе грабуць дзеля сябе, пачынаючы з самага высокага начальства. Ты ж, напэўна, чуў пра першага сакратара Магаданскага абкама Малафеева, так?

– Штосьці там нашкодзіў, не ведаю.

– Нашкодзіў – мякка сказана! Злодзей і бабнік, якіх свет не бачыў! Мяхамі прадаваў пясцовыя шкуркі за мяжу, а грошы сабе ў кішэню. Ды гэта яшчэ што! Прыгожую жанчыну ўбачыць – адразу ж да сябе ў ложак цягне. Сваю жонку выгнаў, а ажаніўся з сяброўкай сваёй дачкі – дзесяцікласніцай. Пасля такога выбрыку нават наш шаноўны Леанід Ільіч не вытрымаў – летась зняў з пасады, бо надалей трымаць такога хапугу і ахальніка не было магчымасці. Што пра натхняючую і накіроўваючую людзі скажуць?

– І што з ім сталася? Пайшоў пад суд?

– Ты што?! – здзівіўся Валодзя. – Перавялі намеснікам міністра геалогіі Расіі ў Маскву. Вось так! І калі ўжо такія людзі хапаюць, то нам і сам Бог наказаў.

– І да чаго дойдзем, калі ўсе будзем красці?

– Асабіста я не краду, магу цябе супакоіць, – Валодзя ўсміхнуўся. – А калі гаварыць наогул, пра ўвесь наш вялікі і непераможны саюз рэспублік, то нашай Кампартыі ў хуткім часе ва ўладзе не ўтрымацца. Успомніш калісьці мае словы.

– Тут ты перабраў, галубок.

– Ніколечкі! Сам прыкінь – яе вярхі загрузлі ў карупцыі. Ты ж проста ўсяго не ведаеш. Маюць асабістыя ўклады ў замежных банках, ды яшчэ тое, пра што мы і не марым...

– Але ж калі ўзяць нас, то трэба жыць з чыстым сумленнем, каб не было грахоў на душы. Я не супраць таго, каб разбагацець, але чэсна, без махінацый.

– Хто ж такога не хоча? Але не заўсёды так атрымліваецца. Абставіны бываюць мацнейныя за нас. Як кажуць у народзе, не хацеў браць, ды давялося.

Пасля яны згулялі тры партыі ў шахматы, і толькі хацелі ўзяць па кубку гарбаты, як пад акном завуркатаў усюдыход. Валодзя спехам апрануўся і выскачыў з балка.

І ўвесь вечар Сцяпана даймала думка, як Валодзя здабывае такія грошы ў тундры? Магчыма, дапамагае шурфоўшчыкам адкачваць пароду, а тыя яму даплачваюць? І такі метраж давалі ягоныя хлопцы, што толькі і было гаворкі пра Валодзю Каваленку на кар'еры і ў камбінаце.

Сцяпан за грашыма не вельмі і гнаўся, але ўсё-такі крыўдна было, калі летась ён ні разу не атрымаў прэміяльных. Бо заўсёды ў яго быў перарасход выбухоўкі. А што паробіш, калі даводзілася размалочваць на асколкі вялізныя валуны ў шурфах.

На наступны дзень, як яны і дамовіліся, ён звязаўся з Валодзем па рацыі. Праход радыёхваль быў цудоўны, пагаварылі хвілін дзесяць, а ў прызначаны час Сцяпан і на базу перадаў гэтую навіну. Начальнік узрадваўся і абяцаў прыехаць з прадуктамі за які тыдзень да Кастрычніцкіх святаў.

Ён з дня на дзень чакаў горнага інспектара, але той чамусьці ўсё не заяўляўся. Першая шурфовачная лінія была ўжо скончана, і ўсе перайшлі на другую. Прайшлі дзесьці так па чатыры метры і капітальна селі на валуна.

А тут і пурга ўсчалася: адно без другога не бывае. Добра, што Сцяпан паспеў нацягаць вугалю ў тамбур, а то давялося б выскакваць па яго на мароз.

Вятрыска са снегам з такою злосцю пачаў раз-пораз накідвацца на Сцяпанаў балок, што той нават паскрыпваў, быццам скардзіўся, што ўлетку яго дрэнна падрамантавалі.

Цяпер, пад няспыннае завыванне пургі, якая галасіла быццам па нябожчыку, можна было смела адлежваць бакі ў ложку і думаць пра сэнс чалавечага жыцця.

Чамусьці цяпер успомніў Сцяпан тых небаракаў-зняволеных, якія вось у такую халадэчу не сядзелі ў цёплых балках, а працавалі ў штольні або мерзлі ў сваіх мазанках. Колькі іх тут было – аднаму Богу вядома. Дый відаць – многія тут і засталіся назаўсёды.

З базай на сувязь ён выходзіў два разы на дзень, але ў трубцы панаваў пастаянны трэск і шум, нічога не было чуваць. Але ён усё-такі сказаў у эфір, што ў іх пурга і канчаюцца прадукты. Бо не адзін раз было такое, што ён голасу начальніка не чуў, а яго там добра разумелі.

Бывалі выпадкі, што цешылася пурга цэлы тыдзень, а то і больш. Але звычайна ёй хапала чатырох, а то і двух дзён.

Сцяпан навучыўся вызначаць яе прыход па месяцы. Калі той пачынаў "плакаць", гэта калі вакол яго з'яўляўся расплывісты круг, то назаўтра пачынала пуржыць.

Спачатку ўзнімалася з вярхоўяў даліны ледзь прыкметная замець, якая, быццам агромністая змяя, не спяшаючыся, паўзла на жываце да мора. А пасля пачыналі ўсё мацней і мацней курэць

вяршыні навакольных сопак, якія ўтваралі суцэльную граду. Тут ужо трэба было рыхтавацца да схову.

А пасля, праз нейкі час, амаль імгненна ўзмацняўся гул, даліны і вяршыні сопак не былі відаць.

І калі ўжо здарыцца так, што прыхопіць пурга ў дарозе, то гэта сапраўдная бяда. Яна нікога не пашкадуе. Бывалі выпадкі, што людзі нават у трактары або машыне замярзалі, асабліва калі заглохне рухавік.

Сцяпана толькі аднойчы прыхапіла пурга на ўзбярэжжы праліва Лонга. І ўратавала яго толькі тое, што ён выпадкова ўбачыў балок, які яшчэ летам пакінулі геолагі, бо не паспелі адрамантаваць палазы, з якіх адзін зусім адарваўся, а другі ледзь трымаўся. Амаль двое сутак заставаўся ў балку, бо ежа ў яго была, дый для печкі знайшлося крыху дроў.

Але цяпер ва ўтульным і цёплым балку пурга не палохала, вось толькі адно было дрэнна – пазаносіць яна вялізнымі гурбамі дарогі на перавалах, ды да таго ўтрамбуе снег, што трактарам будзе цяжка прабівацца па цаліку.

Толькі на пятыя суткі ўтаймавалася пурга. Пазаносіла яна снегам не толькі шурфы, але і іхнія балкі, Сцяпан ледзь са свайго выбраўся, бо прываліла ўваходныя дзверы, а з усім астатнім можна было мірыцца.

А вось шурфы, хаця і былі накрытыя брызентам, але да таго былі завееныя, што давялося цэлы дзень з імі валэндацца. Каб жа толькі іх трэба было ратаваць, яшчэ ж і пляцоўку перад імі патрэбна было ачысціць ад снегу, куды выкладваўся грунт пасля ўзрыву.

З вялікай неахвотаю працавалі шурфоўшчыкі. Сцяпан гэта бачыў, бо сам дапамагаў падрыўніку нацягваць званковы провад ад міннай станцыі і да шурфоў, які быў увесь перablытаны і занесены снегам.

І чаго ім было радавацца, калі ў кожным шурфе іх чакала па валуне. Тэмпы праходкі і так упалі, а тут яшчэ пурга пяць дзён запазычыла. Сцяпан прадчуваў, што валуны будуць яшчэ трапляцца не адзін раз, і вельмі чакаў прыезду начальніка, каб выказаць яму свае думкі і меркаванні. Але чым той зможа суцешыць? Мо, магчыма, хаця б наконт выбухоўкі штосьці прыдумае. Чвэрць скрынкі, бывала, ішло на разбіўку толькі аднаго валуна.

Урэшце дзесьці так праз два дні прабіліся да іх з базы два трактары з санямі. Адны былі загружаны вугалем, а на іншых – прадукты і бочкі з саляркай. Пакуль шурфоўшчыкі забурваліся ў шурфах, Сцяпан з Віцем перанеслі дзве скрынкі гарэлкі ў ягоны балок.

Андрэй Іванавіч хуценька перакусіў, выпіў чайку і кінууся ў роспыты.

– Ну, як тут у цябе? Баішся валуноў?

– Хто ж іх не баіцца! У мяне такое прадчуванне, што іх тут як таго гароху ў полі – не злічыць, – адказаў Сцяпан.

– Чаму?

– Быў я ў самым вярхоўі даліны, то такога ніколі не бачыў – адпачываюць яны там розных фасонаў і памераў проста на паверхні, нават не спрабуючы схавацца ад людскога вока. А калі пачынаеш спускацца ў нізоўе, то бачна, як яны пачынаюць паступова знікаць у зямельцы. І калі на сто пятай лініі сустрэліся два валуны, то на сто першай ужо чатыры размалацілі, а да карэнных парод яшчэ далёка.

– Але ж трэба праходзіць, – начальнік уздыхнуў. – Гэтая даліна павінна быць вельмі багатай на касітэрыт.

– Яно так, – адказаў Сцяпан, – але ж дзе тут выканаеш месячны план, дый выбухоўка так расходуецца, што ў аніякія нормы не ўкладваецца. А што рабочыя заробяць з такім метражом?

– Ты ім скажы, што заробкам не пакрыўдзім: прыпішам расчыстку ад снегу, ды яшчэ сёе-тое. Гэта ў нашых сілах, а цяпер, – начальнік падняў-

ся з табурэткі, – трэба збірацца ў дарогу. Думаю яшчэ да Каваленкі заскочыць, бо ў іх з саляркай тугавата.

Зайшоў Сцяпан з начальнікам і ў балок да шурфоўшчыкаў. Тыя адразу ж засыпалі яго пытаннямі.

– Андрэй Іванавіч! – першым адразу ж выкрыкнуў Валянцін. – Ці прывезлі вы шнапсу для сагрэву душы? Бо без яго нам такія валуны не адолець!

– Прывёз! Вечарам Сцёпа выдасць па бутэльцы на нос, а рэшту, як толькі запуржыць, усяклі?!

– Згодны! – пачуліся галасы ў адказ.

– А наконт валуноў будзем штосьці думаць, – працягваў Андрэй Іванавіч. – Але ж і вы не падкачайце, бо гэтую лінію трэба абавязкова прайсці.

– А што гэта за штольні побач з намі ў сопцы? – спытаў Кузьма.

– Сакрэтныя штольні. Але вам раскажу, каб не дай Бог не залезлі калі ў іх. Праходзілі іх зняволеныя адразу ж пасля вайны. А здабывалі тут не касітэрыт, а уранавую руду.

– Ого! – усклікнуў Валянцін. – Я адразу ж прыкмеціў, што колер сопкі адрозніваецца ад іншых. Дык мы тут можам, чаго добрага, і канькі адкінуць! Нахапаемся той радыяцыі, як бедныя японцы ў Херасіме, бо прамянёвая хвароба пакуль невылечная.

– Гэта вам не пагражае, – супакоіў усіх начальнік. – Тут таго урану мізэрная колькасць, вось чаму і закансервавалі ў свой час гэтыя штольні, бо геолагі знайшлі намнога лепшыя радовішчы. Вазьміце ва Украіне, у Жоўтых Водах, там і сёння здабываюць уранавую руду ў шахце. І нічога – жывуць людзі, працуюць...

– А цяпер, – Андрэй Іванавіч спехам зірнуў на гадзіннік, – бывайце здаровы і не напівайцеся.

Ён развітаўся і выйшаў з балка. А праз якую хвіліну падалі свой голас рухавікі трактароў. Сцяпан зірнуў у акенца. Трактары шпарка імчалі да акіяна.

– Ну што, Сцёпа! – з весялосцю ў голасе прамовіў Валянцін. – Выдай нам двайную норму, а то ў нас, сам бачыш, сала скварчыць на патэльні.

– Ці не замнога будзе? – усміхнуўся Сцяпан.

– У самы раз. Сёння крыху дзербалызнем, ды яшчэ раніцай на пахмелле будзе. І на працу выйдзем – слова даю!

Тут нічога не паробіш – давялося Сцяпану прынесці ажно дзесяць бутэлек гарэлкі. І хаця ведаў – дабром такое можа не скончыцца, але сам разумеў – іншага выйсця няма.

Дый настрой быў ва ўсіх прыгнечаны, бо заканчваўся месяц, а метражу не было...

Сцяпан у тую месячную ночку доўга сядзеў ля сваёй грубкі, пазіраў на гарачае вуголле і думаў пра тое, што трэба штосьці тэрмінова вырашаць з валунамі, бо змагацца з імі толькі ломікам – марная справа.

Ён нават зайздросціў у думках свайму начальніку, бо таму было ўсё да фені. “Як будзе, так і будзе!” – любіў ён паўтараць. Ды яшчэ заўсёды заканчваў: “Прырода! Што з яе возьмеш!”

Яму што – сеў ды паехаў, а тут паспрабуй разбярыся, што і да чаго...

Назаўтра ніхто з шурфоўшчыкаў на работу не выйшаў. Сцяпан зайшоў да іх у балок, а там халадэча, бо грубка амаль згасла. Усе былі ў адкідоне – быццам тыя мерцвякі. Ён спехам пашураваў качарэжкай у грубцы, падкінуў туды дроў, а калі ў ёй загуло, то сыпануў зверху вугалю. Цяга была добрая, вугаль пачаў разгарацца. Ажыла грубка, павесялела, пачала даваць цяпло...

Першым падняў ускудлачанную галаву Міхаіл Пятровіч. Кінуў вінаваты позірк на Сцяпана і ціха прамовіў:

– Перабралі ўчора з галадухі, прабач грэшнікам...

Ён з цяжкасцю падняўся з ложка, узяў дрыготкаю рукою кубак са стала,падышоўшы да вялізнай жалезнай бочкі, зачарпнуў халоднай вадзіцы, у якой плаваў лёд, і з асалодаю выпіў.

– Няўжо ўсе бутэлькі асушылі? – са здзіўленнем спытаў Сцяпан.

– Ды не. Павінны яшчэ застацца на пахмелку, – адказаў Міхаіл Пятровіч і пачаў прыбіраць са стала.

Між тым цяпло рабіла сваю справу. Праз якія паўгадзіны папрачыналіся ўсе, толькі Валянцін не вылазіў з-пад свайго кажушка, якім ён надзейна ўкрыўся, ратуючыся ад халадэчы.

Урэшце і ён падняўся, абвёў памутнелым позіркам прысутных і з весялосцю ў голасе прамовіў:

– Сцёпа! Усё будзе на найвышэйшым узроўні! Зараз па грамульцы цяпнем, а к абеду мы як тыя гуркі на градцы – будзем ля шурфоў, усёк?

– Якія з вас сёння работнічкі? – адказаў Сцяпан, адзяваючы шапку. – Адпачывайце, але заўтра каб з самага ранку былі на працы.

– Залатыя словы, Сцёпа! – працягваў Валянцін. – Такога горнага майстра ў нас не было і, мабыць, ужо ніколі не будзе. За вярсту відаць, што чалавек веруючы і як ніхто разумее нас, грэшнікаў. А шурфы мы скончым. Праўда, да святаў не гарантую, але...

Тут ён махнуў рукой і засмяяўся. Віця ўжо ваўсю завіхаўся ля грубкі, бо быў маладзейшы за ўсіх, дый учора, напэўна ж, не перабраў. Хаця, калі быў у настроі, то і ён мог перакуліць не адну чарку.

Кузьма тым часам дастаў са скрынкі тры пляшкі гарэлкі, ды яшчэ сіратліва стаяла на стале адна распачатая.

– На пахмелку ў вас ёсць, – сказаў ля парога Сцяпан, – а на большае і не разлічвайце, а чакайце спадарыні пургі. Толькі яна вас можа выручыць.

Сцяпан адправіўся ў свой балок, бо трэба было рыхтаваць рацыю для размовы з Каваленкам і базай. Часу яшчэ было, і ён не спяшаючыся згатаваў амлет з яечнага парашку, з асалодаю паснедаў. Пасля ўключыў рацыю і пачаў чакаць. Праз якую хвіліну ў трубцы пачуўся голас Каваленкі:

– “Бяроза!” “Бяроза!” Я “Топаль”, прыём.

– “Топаль!” Чутно цябе выдатна. Расказвай пра навіны.

– Хлопцы працуюць. Месячны план перавыканалі на сто пяцьдзесят працэнтаў. Праз сем дзён патрэбен вугаль, дый балкі будзем перацягваць у вярхоўе даліны.

– “Топаль”! Цябе зразумеў. Усё перадам на базу. Канец сувязі.

Сцяпан выключыў рацыю і прылёг на ложак. “Вось табе і на!” – у роспачы падумаў ён. І няхай бы яму трапілася ў апошні сезон безвалуністая даліна. Дык не!

Але што тут наракаць. Ён кінуў вінаваты позірк на абразок Ісуса Хрыста і адчуў, як раптоўна паспакайнела на душы.

Ён толькі баяўся, што ягоныя шурфоўшчыкі на трох пляшках не спыняцца... Але страхі былі дарэмнымі – да яго так ніхто і не зайшоў. А ў наступны дзень з самага ранку ўсе былі на шурфах.

## Частка пятая

Хаця і з цяжкасцю, але сто першую лінію скончылі толькі ў сярэдзіне лістапада. А што паробіш, калі глыбіня шурфоў раптоўна павялічылася да пятнаццаці метраў.

Вельмі ўзрадвала Сцяпана тое, што валуны амаль зніклі. А тут і горны інспектар нечакана наскочыў, але ў Сцяпана на аманітцы быў поўны парадак, а да новай лініі яны толькі рыхтаваліся, то інспектар, спехам выпіўшы чайку, падаўся ў брыгаду Каваленкі. Сцяпан таго якраз паспеў папярэдзіць па рацыі.

На новай лініі ўсе працавалі з натхненнем. Сцяпан не мог нарадавацца, бо дзесьці за дваццаць дзён перакрылі месячную норму. Але як той казаў: “Не доўга музыка іграла...”

Якраз пад Новы год напароліся на такія валуны, што змагацца з імі было немагчыма. Сцяпан

перадаў на базу, што шурфоўшчыкі адмовіліся выходзіць на працу і патрабуюць прыезду самага высокага начальства.

У адным толькі недабітым шурфе Валянціна было чатыры валуны. Ён іх разбіў, але не прайшоў і паўметра, як напароўся на пяты. Той быў сапраўдны велікан – займаў увесь шурф.

Сцяпан сам спусціўся на васьміметровую глыбіню і пераканаўся, што накладнымі зарадамі яго не адолець. Начальнік спакойным голасам абяцаў прыехаць з галоўным геолагам камбіната. Але праходзілі дні, а суцяшальных звестак з базы не было.

Так і сустрэлі яны ў забастовачным стане новы 1973 год. Добра яшчэ, што з базы падкінулі на ўсюдыходзе крыху навагодніх прысмакаў: шампанскае, апельсіны і яблыкі. Але настрою не было, а тут непрыемнасці не прымусілі сябе чакаць.

На трэці дзень Новага года Каваленка яму перадаў, што ў яго загінуў у шурфе рабочы Дардэнка Ігар. Сцяпан ведаў гэтага хлопца. Яшчэ ў мінулым годзе падарыў ён Сцяпану маленькага сабачку. Спяпан даволі хутка пасябраваў з Рэксікам, але праз тры месяцы яго пашкамутала ашалелая ліса. Лісу ён застрэліў са стрэльбы, а вось сабачку выратаваць не ўдалося.

І вось цяпер загінуў і сам Ігар, якому ішоў усяго дваццаць чацвёрты год. Адразу ж атрымалі па рацыі загад ад раённай інспекцыі аб спыненні на ўсіх участках падрыўных работ.

Сцяпан кожны вечар пасля сувязі з базай заходзіў да шурфоўшчыкаў, каб расказаць пра навіны ды пагаварыць пра іх невясёлае жыццё.

Вось і на гэты раз, толькі ён завітаў да іх на агеньчык, як Валянцін не даў яму нават і павітацца.

– Вось цяпер, Сцёпа, і да нас загляне начальства самага высокага рангу.

– Яно так, – адказаў ён, здымаючы шапку і прысаджваючыся на шырокую лаву ля акна. – Але ж вельмі Ігара шкада, вясёлы быў хлопец.

– А ўсё з-за таго, што летась змянілі схему падрыву шурфоў, – сказаў Кузьма. – Дзе ж гэта бачна, каб за адзін мах узрываць чатыры шурфы. А калі збой? То ў кожны трэба не адзін раз спусціцца. Раней толькі паасобку ўзрывалі, і я не прыгадаю, каб хтосьці загінуў.

– Цяпер праверкамі ды інструкцыямі будуць мучыць да канца сезона, – прамовіў Сцяпан і ўздыхнуў. – І Валодзю Каваленку шкада – пойдзе пад суд.

– Гады тры могуць укляпаць, – падаў голас Міхаіл Пятровіч.

– А які метраж давалі ягоныя хлопцы! Амаль па дзве месячныя нормы, – сказаў падрыўнік Віця.

– Метраж іхні на добрую палавіну прыпісны, – прамовіў Валянцін, запальваючы цыгарку ад лямпы.

– Як гэта?! – здзівіўся Сцяпан.

– А вось так! – Валянцін з асалодаю зацягнуўся і, як той фокуснік у цырку, пусціў дым маленькімі колцамі пад самую столь балка.

– Цяпер, – працягваў ён, – магу вам усё расказаць, бо камісія з ГоКа ўсё адно выведзе брыгаду Каваленкі на чыстую ваду.

– Наконт метражу, – перабіў яго Сцяпан, – то я сам не адзін раз пытаў у Валодзі, але той заўсёды адказваў: “Звышсакрэтная метода”. Большага нічога з яго не мог выцягнуць.

– Вось менавіта – звышсакрэтная! – Валянцін засмяяўся. – Я іх яшчэ пазалетась раскусіў, але маўчаў. Навошта мне гэтыя клопаты – у самога іх навалам. А метода, як і ўсё геніяльнае, вельмі прасцецкая. Праходзяць яны ў новай разведлініі два, а то і тры шурфы як і належыць – да карэнных парод. Напрыклад, яны ў іх аказаліся дзесяціметровымі, так? А вось астатнія праходзяць не да канца – да метраў чатырох-пяці, вось... Праходкі ж ля іх выкладваюць на ўсе дзесяць, усяклі?! Пры такой методзе любы месячны план можна перакрыць у два, а то і тры разы. Але яны такога не рабілі, каб не выклікаць падазронкі ў начальства, вось і давалі рэгулярна па паўтары

нормы, ды яшчэ ў загашніку мелі на пургавыя дзянёчкі. Прэмію атрымлівалі на любы густ: месячную, квартальную, гадавую. Заробкам дзяліліся з Каваленкам, а той яшчэ атрымліваў шалёныя грошы за эканомію аманіту.

– Але ж гэта сапраўднае спланаванае злачынства! Яны ж усе даліны затуфцілі. Пры прамыўцы шурфоў атрымаецца несусветная бязглуздзіца! – не стрымаўшыся, ускрыкнуў Сцяпан.

– А бязглуздзіцы не атрымліваецца таму, – працягваў Валянцін, – што на прамывалцы працуе майстрам стары прайдзісвет Ерамееў Вася. Той, я сам бачыў, дасыпае ў кожны пакецік пасля прамыўкі праходкі крыху касітэрыту, і здае такім макарам усю даліну ў поўным ажуры.

– Але ж старацелі калісьці там будуць весці прамыўку. Што тады? – спытаў Міхаіл Пятровіч.

– Прагараць як шведы пад Палтавай! – імгненна адказаў Валянцін.

На нейкі час у балку ўсталявалася нязвыклая ціша.

– А што ж ты хацеў, Сцёпа, – урэшце зноў прамовіў Валянцін. – Крадуць на неабмежных прасторах Саюза амаль усе. Гэта вялікі грэх, але факты, як кажуць англічане, вельмі ўпартая рэч. Закон тундры: калі ты не абдурыш кагосьці, то цябе самога спрытна абуюць у лапці, нават вокам лыпнуць не паспееш. Так было і так будзе пры любой уладзе!

– А як жа асабістае сумленне? Душа, страх перад Усявышнім? Надыдзе час, і Ён будзе судзіць і грэшнікаў, і праведнікаў, – сказаў Сцяпан.

– Калі тое будзе? Дый ці існуе Ён на самай справе? Азірніся навокал: хапугі ўсіх чыноў і рангаў жывуць прыпяваючы і плююць на ўсё і ўся.

– І да чаго дакоцімся з такімі паглядамі? – не сунімаўся Сцяпан.

– Хто яго ведае. Але мая бадзяжная душа прадчувае, што ў Расіі будзе калісьці зноўку вялікі шмон. І, магчыма, больш крывавы, чым у далёкім семнаццатым годзе.

– Тут ты, галубок, зрабіў яўны перабор, – уступіў у гутарку Аляксей.

– Ніколечкі, – спакойным голасам адказаў Валянцін. – Бо да гэтага ідзе. А наконт крадзяжу магу вам расказаць адну гісторыю. Гады тры таму быў я ў адпачынку. Заехаў да дзядзькі на Палессе. А ягоны сусед Вінцук працуе егерам у Белавежскай пушчы. Туды на паляванне пад добрую закусь і чарку прылятае часцяком з Масквы самае высокае начальства. Бываў там калісьці і сам Хрушчоў, а наш шаноўны Леанід Ільіч адтуль амаль і не вылазіць.

І вось Вінцук пад вялікім сакрэтам яму расказаў, што аднойчы хтосьці з гасцей, калі ўсе былі на добрым падпітку, вазьмі ды спытай у самога Брэжнева: "Леанід Ільіч! Як вы глядзіце на тое, каб падняць у краіне мінімальны заробак?" І што вы думаеце той адказаў? Адразу ж адмоўна хітнуў галавой, а пасля з цяжкасцю прамовіў: "Ані ў якім разе! Бо ў нас усе маюць дадатак да заробку – крадуць! Калі я вучыўся ў землямерным тэхнікуме, то на ўборцы бульбы мы цэлымі мяшкамі яе кралі і везлі ў свой інтэрнат. У нас толькі дурні не крадуць". Вось так.

– Тады трэба гэта ўзаконіць, каб кожны ведаў – колькі ён можа за месяц скрасці, – хуценька прамовіў Кузьма.

– А што – цікавая прапанова, – падтрымаў яго Валянцін. – Давай выберам цябе ў Вярхоўны Савет, а там ужо і вынось сваю прапанову ў праект закона. Але пакуль давайце думаць пра нас. Вось прыляціць начальства ў сапсаваным настроі, а што мы скажам, што прапануем, га? Якія, Сцёпа, у цябе задумкі наконт праходкі шурфоў у гэтай даліне, гары яна сінім полымем!

– Выручыць нас зможа толькі добры кампрэсар і адбойны малаток, – адказаў Сцяпан.

– Правільна! – ухваліў ягоную прапанову Міхаіл Пятровіч. – Адбойным малатком можна бурыць паўметровыя буркі. Але ж ці дадуць кампрэсар?

– Калі прыедзе галоўны інжынер ГоКа Сызганаў, то я ў яго выпрашу, бо ведаю, дзе ўзяць, – з усмешкай адказаў Сцяпан.

– У каго? – спытаў Валянцін.

– Ды ў старацельскай арцелі "Мінерал", якой мы здаём гэтую даліну. Але ж гэта яшчэ не ўсё. Трэба абавязкова дабіцца таго, каб нам павялічылі расцэнкі, хаця б у два разы. Гэта ўсё я бяру на сябе, а вы, – Сцяпан пільным позіркам абвёў прысутных, – каб не сядзелі панурыўшы галовы, як тыя мышы пад венікам, а ў неабходны момант падтрымалі мяне. Карацей кажучы, аддаю загад: трымаць хвост пісталетам!

– Каб жа твае слоўцы, Сцёпа, ды Богу ў вушы, – сказаў Міхаіл Пятровіч.

– Сызганаў, – працягваў Сцяпан, – чалавек хаця і круты, але адкрыты і справядлівы. Памятаю, як ён летась з'явіўся на кар'еры. Пайшоў на палігон, дзе бульдазерысты вялі ўскрышу на наступны год. Ну, і паскардзіліся тыя, што вельмі мала зарабляюць – усяго па дзвесце рублёў, праўда, у каго няма надбавак, то гэта не грошы. Я якраз прысутнічаў пры той размове. Ну, думаю, зараз пачне іх угаворваць ды вешаць лапшу на вушы... Ажно не! Уважліва ўсіх выслухаў і кажа: "Ды я б на вашым месцы за такія грошы і камбінезон не апранаў бы!" Хлопцы са здзіўленнем зірнулі на яго і падбадзёрыліся. А ён тут жа падаўся ў кантору. Выклікаў маркшэйдэра, нарміроўшчыцу, начальніка кар'ера і сам сеў за разлікі. І што ж вы думаеце? Тыя, дзеля эканоміі, наўмысна заніжалі расцэнкі, спасылаючыся на састарэлыя нормы выпрацоўкі. Уляпіў усім па вымове ды пазбавіў квартальнай прэміі. А яна ў іх дай Бог кожнаму – да пяці тысяч, якраз на новенькія "Жыгулі", што нядаўна пачалі выпускаць. І ўзняліся ў хлопцаў заробкі да тысячы рублёў у месяц. Так што на такога чалавека ў мяне вялікія спадзяванні. Вось толькі ці будзе ў яго настрой на размову? Бо мы, калі браць па замежных мерках, забастоўшчыкі чысцейшай

вады! Але будзем спадзявацца на найлепшае. А цяпер, – ён зірнуў на гадзіннік, – час рыхтавацца ў люлю.

– Жартаўнік ты, Сцёпа, мы і так усе бакі адляжалі, – сказаў Міхаіл Пятровіч.

– Нічога. Я дзесьці чытаў, што ўсе мышцы ў спартсмена экстра-класа поўнасцю прыходзяць у норму толькі за дзесяць дзён. Гатуйце пабольш мяса і набірайце вагу. Тут яшчэ давядзецца праліць з добрае вядро поту. І не курыце так часта, беражыце лёгкія, яны і так усыхаюць на Чукотцы.

Ён падняўся з лавы, насунуў шапку і выйшаў з балка. Месяц толькі што вынырнуў з-за рваных аблокаў і заліў наваколле лагодным святлом. Стаяла такая цішыня, што нават звінела ў вушах. Марозік мацнеў. Сцяпан не спяшаючыся ішоў да свайго балка і адчуваў, як мароз пашчыкваў яго за шчокі і нос. Сопкі адкідвалі ад сябе цені розных памераў. Своеасаблівая прыгажосць была і тут, амаль на самым ускрайку зямлі.

Ён яшчэ з якую хвіліну пастаяў, паслухаў цішыню, а пасля зайшоў у тамбур балка і накінуў вялізны кручок на дзверы. І не таму, што кагосьці баяўся, але ў тундры ўсё можа здарыцца.

Адразу ж распрануўся, запаліў лямпу, падкінуў у грубку вугалю і пачаў рыхтаваць вячэру. Павячэраўшы, як і заўсёды, стаў перад іконай Ісуса Хрыста і памаліўся.

Пасля патушыў святло і прылёг на ложак. Вугаль у грубцы да таго разгарэўся, што адзін яе бок пакрыўся ледзь прыкметнай чырванню. Цяпло папаўзло па балку. Праўда, ля самай падлогі было халаднавата, а ў вялікія маразы, асабліва пад раніцу, мароз бессаромна пасяляўся па вуглах і ля парога.

Любіў Сцяпан у такія зацішныя марозныя вечары падумаць пра сваё жыццё. І хаця грэх скардзіцца, але ж і радавацца не было чаму. Калі ж так разважыць па шчырасці, то ўсё ў гэтым свеце мітусня. Мала чалавек думае пра сваю душу, спяшаецца ўсё жыццё і не прыкмячае, што даўно трэба спыніцца і спытаць у сябе: “А ці так я жыву?”

Сцяпан яшчэ ў інстытуце многа чытаў кніжак святых і прарокаў. Многае разумеў, але жыццё іншы раз паварочвалася такім бокам, выкідвала такія круцялі, што пра ўсё забываўся, грашыў, а пасля – спалохаўшыся, нават плакаў, бо саромеўся сваіх учынкаў.

Адно яго суцяшала – вялікіх грахоў за ім не было. Бывае ж так, што дрэнны ўчынак мучае чалавека ўсё жыццё, да самых апошніх дзён...

І адразу ж у такія хвіліны паўставаў перад ім вобраз ягонай бабулі Наташы, якая пражыла доўгае і гаротнае жыццё, а памерла на сто пятым годзе, ён вучыўся на пятым курсе.

Шкадавала ўсіх, асабліва гаротных людзей – жабракоў-пагарэльцаў, якія пасля вайны хадзілі адзін за адным па хатах і прасілі толькі скарыначку хлеба. І яна заўсёды дзялілася апошнім, што ў яе было.

Як ён быў маленькі, то часта спаў разам з бабуляй пад яе цёплай коўдрай. Перад сном яна доўга малілася перад іконай Божай Маці, хрысцілася, клала паклоны ў пояс

Ён у такія хвіліны ціхенька ляжаў, зашыўшыся пад коўдру, і толькі краем вока назіраў за бабуляй. А пасля яна ўкладвалася побач і расказвала яму казкі. Цёпла было, утульна, а на сэрцы радасна і вольна...

Раніцаю будзіў яго пах бліноў, якія пякла бабуля. І да чаго ж смачныя яны ў яе атрымліваліся! Ён не ўставаў, ляжаў у ложку колькі хацеў, бо дзіцячых садкоў у тыя часы і заваду не было.

А ў святы хадзіў з бабуляй у царкву. Спачатку вельмі баяўся ліку святых, якія пагрозліва пазіралі на яго. Але пасля Сцяпан асмялеў, бо бабуля расказвала яму пра жыццё і подзвігі святых мучанікаў... і ён вельмі іх шкадаваў. Ад бабулі ўпершыню даведаўся пра нараджэнне і жыццё Ісуса Хрыста. Доўгімі зімовымі вечарамі, калі маразы даходзілі да трыццаці градусаў, яны сядзелі з бабуляй на цёплай печы і перад самымі Калядамі рыхтавалі з паперы розныя цацкі на ёлку.

Здавалася, што ўсё гэта было зусім нядаўна, а прайшло, імгненна праляцела дваццаць пяць гадкоў. Так, зямны час бяжыць імкліва, не паспееш азірнуцца, а ўжо трэба рыхтавацца ў царства нябеснае...

Маладыя пра гэта не думаюць, а шкада. Сцяпану вось толькі трыццаць стукнула, а ўжо выразна пачаў адчуваць бязлітасны бег зямнога часу. А што ж далей будзе?

З гэтай нагоды прыпомнілася яму адна сустрэча. Хадзіў ён тады, здаецца, у трэці клас. І вось прыйшоў аднойчы да іх марозным адвячоркам стары дзед Скурка. Было яму пад сотню гадоў, але моцны яшчэ быў, нават браў у рукі касу і дапамагаў сынам на пакосе. Разгаварыліся яны з бабуляй, а пасля тая і пытае: “Напэўна ж, нажыўся ўжо Ігнат, га? І паміраць будзе не так страшна?”

А ён усміхнуўся ў свае доўгія рыжыя вусы ды кажа: “Я ж да гэтага часу, шаноўная мая Наташка, лічыў цябе самай разумнай бабай на Амеліне. Але цяперака бачу, што памыліўся. Праз год, калі дасць Бог дажыць, споўніцца мне сто гадоў. А як падумаю, то здаецца, яшчэ толькі ўчора без штаноў гусей ля рэчкі пасвіў. А ты кажаш... Гадочкі праляцелі, як адзін дзень!”

У той час Сцяпан не вельмі разумеў сэнс ягоных слоў. Вядома ж, быў малеча, толькі шкада было дзеда Ігната, што ягоныя гадочкі так хутка праляцелі.

А пра свае ён тады і не думаў, толькі адно было ў галаве, што ягонае жыццё будзе бясконцым...

А як ён крыху падрос, то бабуля казак яму ўжо не расказвала, а час ад часу апавядала пра здарэнні са свайго жыцця. А тых дзівосных здарэнняў у яе было багата, хоць адбаўляй. Яна ўжо тады пачынала рыхтаваць яго ў вялікую жыццёвую дарогу.

Аднойчы, у далёкай маладосці, была яна ўжо замужам і мела на той час трох маленькіх дзетак, зайшла да яе ў старэнькую хаціну адна жабрачка. Яны ў той год вельмі ж галадавалі, да таго збяднелі, што скарынкі хлеба ў хаце не было.

Збянтэжаная бабуля вынесла той жабрачцы толькі дзве вараныя бульбіны. Але тая ўважліва зірнула на яе і прамовіла: “Вялікі табе дзякуй! Але мне нічога не трэба. Я толькі памалюся за тваіх дзетак”.

Такі адказ жабрачкі здзівіў бабулю. І калі тая, памаліўшыся, выйшла ў сенцы, бабуля хуценька падышла да акна, каб зірнуць на яе яшчэ раз...

Але жабрачка не прайшла праз падворышча на вуліцу, а бясследна знікла. Тады бабуля выбегла на вуліцу, зірнула на сцяжынку, што вяла да іхняга гумна, але дарэмна – там нікога не было...

У самы абед, як толькі прачнуліся яе дзеткі, кінулася яна ў роспыты да суседзяў: ці бачылі яны сёння жабрачку ў вялікай старэнькай хусцінцы. Але тыя адказалі, што такой яны з самага ранку не бачылі.

І вось тады бабуля здагадалася, што гэта была не хто іншая, як сама Божая Маці... Як пасля не адзін раз бабуля расказвала, яе вельмі ўразілі вочы той жабрачкі. Столькі ў іх было спакою, пяшчоты, дабрыні і святасці, што яна нават не магла зварухнуцца з месца.

Але ж на гэтым усё не скончылася. Сапраўдны цуд чакаў яе ў наступны дзень. Дзесьці так пад вечар спынілася ля іхняй хаціны фурманка. Бабуля была якраз на падворышчы і ўбачыла, што ля веснічак стаіць незнаёмы дзядок. Сам невялічкі, з сівай бародкай, у даволі зношанай світцы і зрэбных штанах.

Павітаўся, пасля і пытае: “Ці тут пражывае Рамановіч Наташа?” І калі дазнаўся, што гэта яна і ёсць, то пайшоў да фурманкі і прынёс ёй у сенцы два мяшкі мукі. У адным была жытняя, а ў другім пшанічная...

А даслаў муку з Гануты яе родны дзядзька Пятрык, які толькі што вярнуўся з самой Аргенціны, дзе быў на заробках. Удалося яму там падзарабіць, вось і вырашыў зрабіць пляменніцы такі своечасовы падарунак.

Узрадвалася яна тады, як ніколі ў жыцці! Напякла духмянага хлеба, булак... Праўда, большую частку параздавала, бо суседзі таксама без хлеба сядзелі. Але ж дацягнулі да жніва.

Пра гэты выпадак бабуля расказвала Сцёпу не адзін раз, бо была ўпэўнена, што сама Божая Маці ўратавала тады яе з дзеткамі ад голаду. І Сцяпан ёй не пярэчыў. Бабулі ён давяраў, бо тая ніколі яго не падманвала, а ўсё жыцце пражыла з малітвай.

І што яшчэ цікава: за ўсе гады яна ніколі не хварэла. А былі ж такія часіны, што халера касіла людзей, быццам тую траву.

Толькі на сто трэцім годзе жыцця пачала яна слабець. А калі адчула, што ў хуткім часе пакіне гэты свет, то вельмі прасіла ў малітвах Бога, каб памерці не ў халодную зімку, а восенню. Бо вельмі шкадавала людзей, якім давялося б у маразы дзяўбаць ломікамі зямлю.

Так і здарылася. У сярэдзіне лістапада яе не стала. З тае пары яе светлы і пакутніцкі вобраз не раз паўставаў перад вачыма Сцяпана.

Яму не раз падавалася, што яе душа бывала з ім у гэтай халоднай і заснежанай тундры...

## Частка шостая

Толькі на трэці дзень завуркатаў ля Сцяпанавага балка гокаўскі ўсюдыход. Сцяпан спехам апрануўся і выскачыў на двор, каб сустрэць вялікае начальства. Спачатку падумаў, што будзе іх з добры дзесятак, але на ягонае шчасце з усюдыхода з цяжкасцю выбраліся трое: у калматай пыжыкавай шапцы быў сам галоўны інжынер Сызганаў Віктар Пятровіч, другім – галоўны геолаг Жукаў Аляксей Іванавіч і іхні начальнік.

– Прывітанне галоўнаму падбухторшчыку забастоўшчыкаў! – з весялосцю ў голасе прамовіў галоўны інжынер і, падышоўшы да Сцяпана, моцна паціснуў яму руку.

– Паказвай свае каменныя шурфы! – працягваў ён.

– Дык можа чайку з дарогі? – прапанаваў Сцяпан.

– Пасля пап'ем! А цяпер вядзі адразу ж на шурфовачную лінію,– скамандаваў ён.

– Яна там! – Сцяпан паказаў рукою ў вярхоўе даліны і першым рушыў па ледзь прыкметнай сцяжынцы.

На шурфах быў поўны парадак: усе былі акуратна закрытыя брызентавымі пакрываламі. Сцяпан першым паказаў ім шурф Кароціча Валянціна, бо там у бакавых сценках выразна былі бачныя асколкі ажно чатырох валуноў, а пяты, з выразнымі і пукатымі абрысамі, адпачываў на самым дне.

Ён хуценька адкінуў брызент і спусціў у шурф моцна замацаваную на двух ломіках вяровачную лесвіцу. Першым па ёй з асцярогаю пачаў спускацца галоўны геолаг. Быў ён каржакаваты, у чорных вялікіх акулярах, то бачыць павінен усё.

Але быў ён з тых двудушных людзей, якія бачылі адно, а гаварылі заўсёды зусім іншае.

І на гэты раз чагосьці доўга корпаўся на дне шурфа, высвечваючы ліхтарыкам ва ўсе бакі. Урэшце падняўся на паверхню, працёр насоўкаю акуляры, бо спацеў з непрывычкі, небарака, і прамовіў:

– Валуны ёсць, але ж можна было і апошні разбіць.

– А вы бачылі, якіх памераў пяты валун на самым дне шурфа?! – не стрымаўшыся, ускрыкнуў Сцяпан. – Мы ж чатыры разбілі, а глыбіня шурфа толькі сем метраў! Колькі ж аманіту трэба толькі на праходку аднаго такога шурфа?

– Трэба ўмець і валуністыя шурфы праходзіць, – не зважаючы на ўсё, адказаў галоўны геолаг.

– І ў кожным шурфе такое становішча! – Сцяпан з надзеяй зірнуў на галоўнага інжынера.

Той сам узяў у рукі ліхтарык і хуценька спусціўся ў шурф. Моўчкі ўважліва ўсё агледзеў і, падняўшыся на паверхню, прамовіў як адрэзаў:

– Сапраўдная жалезабетонная сцяна, шаноўны Аляксей Іванавіч. Я дзіву даюся, як яны такія

камяні разбілі. А на самым дне накладнымі зарадамі і не ўзяць, тут і да бабкі хадзіць не трэба! Быццам той адкормлены парсюк разлёгся.

Ягоныя словы ўзрадавалі Сцяпана. Ён зразумеў, што падтрымка з боку галоўнага інжынера яму гарантавана. Яны яшчэ агледзелі два шурфы, а пасля накіраваліся да балка шурфоўшчыкаў.

– Трэба зірнуць, як жывуць твае хлопцы, – прамовіў галоўны. – А пасля будзем вырашаць, што тут можна прыдумаць.

Шурфоўшчыкі, напэўна ж, таксама ўбачылі ўсюдыход, бо калі зайшлі да іх у балок, то там быў ідэальны марафет: падмецена падлога, а даўжэзны стол, на якім увесь час стаялі два чайнікі, кубкі і талеркі, на гэты раз пуставаў, яго нават паспелі накрыць газетамі. Павітаўшыся, яны прыселі на лаву, а шурфоўшчыкі моўчкі ўселіся на свае ложкі.

– У вас тут сапраўдны Ташкент, – сказаў галоўны інжынер, здымаючы шыкоўную шапку і расшпільваючы гузікі на кажушку. – Замучылі валуны? – спытаў ён, акідваючы позіркам прысутных.

– Адзін на адным! – адказаў Валянцін. – Такой валуністай даліны я за сваё жыццё яшчэ не сустракаў.

– Бываюць яшчэ горшыя, – працягваў галоўны інжынер. – Але ж гэтую абавязкова трэба прайсці. Якія вашы прапановы?

– Без кампрэсара з адбойным малатком нам тут не ўправіцца, – адказаў Сцяпан.

– Гэта слушная прапанова. А што яшчэ турбуе?

– Расцэнкі на шурфы трэба павысіць, – дадаў Валянцін. – Усе рукі паадбівалі на гэтых валунах, а метражу – кот наплакаў. За мінулы месяц на харчы не зарабілі.

– Згодзен! – галоўны інжынер злёгку ўдарыў рукою па стале.– Павялічваю вам расцэнкі на шурфы ў тры разы, але толькі для гэтай даліны. Каб у наступны сезон я не чуў аніякіх там размоў!

На якую хвіліну ў балку ўсталявалася цішыня.

– А што здарылася ў нашых суседзяў? – сцішаным голасам спытаў Міхаіл Пятровіч.

– У іх бяда, – галоўны інжынер уздыхнуў. – Напэўна ж усе чулі, што ў брыгадзе Каваленкі загінуў, як цяпер высветлілася, пры загадкавых абставінах Дардэнка. Следчыя там працуюць. Каваленку з падрыўніком ужо адправілі ў Певек, бо акрамя гэтага мы там знайшлі і недабітыя шурфы... Вось такія ў іх сумныя навіны. А як у вас з харчамі? Не крыўдзяць?

– Асаблівых нараканняў няма, – адказаў Валянцін. – Але калі з'явіцца на базе які дэфіцыт, то ў тундру амаль і не трапляе. А нам таксама хочацца і апельсінаў, і тых жа яблыкаў...

– Як гэта разумець? – галоўны інжынер кінуў позірк на Андрэя Іванавіча.

– Усё, што можна, мы ім прывозім. Але пакуль не памяняем загадчыцу нашай крамы на базе – нічога не будзе. Да таго нахабная, хабарніца – свет такіх не бачыў! Толькі і забяспечвае далікатэсамі старшынь старацельскіх арцеляў, бо тыя ёй добрыя грошы плацяць. Я ўжо ў сварках з ёю сэрца пасадзіў.

– Знойдзем і на яе ўправу! – галоўны падняўся з-за стала. – З заўтрашняга дня аддам загад найперш забяспечваць дзіцячыя садкі і працуючых у тундры, а пасля ўсіх астатніх. Калі больш пытанняў няма, то будзем развітвацца – другія суткі без сну матаемся па тундры. Усяго вам добрага!

Калі вышлі з балка, то зноў сказаў:

– Ну што? Вып'ем у Сцёпы чаю ды ў дарогу!

Сцяпан сабраў на стол усё, што было: дастаў дзве бляшанкі мясных кансерваў, балгарскія памідоры, чайнік і пячэнне.

Калі крыху перакусілі, то галоўны зноў сказаў:

– А цяпер, Сцёпа, інфармацыя асабіста для цябе: слухай і наматвай на свае вусы. Але спачатку маю пытанне: ці думаў ты калі пра тое, чаму ў Каваленкі другі год запар такі высокі метраж?

– А як жа! Нават зайздрасць брала ў абдымкі, але пасля прыйшоў да высновы, што шанцуе яму з

далінамі: безвалуністыя, з ледзянымі лінзамі. Калі ж казаць пра шурфоўшчыкаў, то мае ягоным не саступяць, хаця і старэйшыя па ўзросце, але ж больш вопытныя.

– Так... Дык вось што я табе скажу: наш перадавік Каваленка на самай справе аказаўся хабарнікам і махляром, якіх свет не бачыў! Палова шурфоў у яго недабітыя па пяць-шэсць метраў, а праходкі выкладзеныя як і трэба. Летась так усю даліну запароў, а прэміі атрымліваў. А ты, я тут падняў дакументацыю ў твайго начальніка, толькі вымовы меў ды пазбаўляўся прэміяльных, так?

– Было такое. У асноўным за перарасход аманіту, але ўсе шурфы ў поўным парадку – праведзены да карэнных парод.

– Што на гэта скажаш, Андрэй Іванавіч? – звярнуўся галоўны да начальніка.

– Віну сваю прызнаю. Але Каваленка такі хітры ліс, што проста дзіву даюся! Бывала, знянацку наскочу, усе шурфы асабіста аблажу – нічога такога. А дапамагала яму махляваць сама прырода: даліны траплялiся з сушанцамі, вось... Вусце кожнага шурфа трэба было мацаваць бярвеннямі. А пасля, як іх здымалі, то шурфы і прысыпаліся.

– Вось так спрацоўвае наша сацыялістычная сістэма, – у роспачы прамовіў галоўны інжынер. – Махляры атрымліваюць прэміі, а чэсныя працаўнікі – вымовы і пакаранні. Не! З такім падыходам нам капіталіста ўзяць за шчэлепы не скора давядзецца! Пабываў я ў іх, нагледзеўся... Працуюць як тыя мурашы, але ж і атрымліваюць – што нам і не снілася. Але пройдзе час – навядзем і мы парадак на камбінаце!

Бачачы, што госці пачалі збірацца ў дарогу, Сцяпан сказаў:

– Але ж да кампрэсара нам і бульдозер патрэбен.

– На кар'еры іх навалам. Прыгонім вам спраўны, вы толькі яго не глушыце, бо ў маразы цяжка завесці. А цяпер, – ён моцна пацiснуў Сця-

пану руку, – трымайся! А наконт прэміяльных, то Андрэй Іванавіч сваю памылку выправіць, дый камбінат не пакрыўдзіць. Галоўнае для нас – здаць гэтую даліну старацелям. А тыя тут метал возьмуць, хаця і з валунамі паваявацъ давядзецца.

Урэшце ўсе выйшлі з балка.

– Заўтра раніцай выходзь на сувязь! – паспеў выкрыкнуць з ўсюдыхода Андрэй Іванавіч.

Дзверцы ляпнулі і ўсюдыход паімчаў па даліне. Сцяпан крыху пастаяў, а пасля вырашыў зайсці зноў да шурфоўшчыкаў. Тыя якраз заканчвалі вячэру.

– Адправіў гасцей? – адразу ж спытаў Валянцін.

– Паехалі. Выпрасіў яшчэ і бульдозер, бо кампрэсар давядзецца перацягваць туды-сюды.

– Калі нас толькі галоўны не падвядзе, то справа пойдзе, – сказаў Кузьма. – Думаю, што да двух тысяч будзем выганяць за месяц.

– Гэта яшчэ як Бог дасць! Праўда, Сцёпа? – уступіў у гутарку Аляксей.

– Будзем спадзявацца на лепшае, – адказаў Сцяпан.

– Можа, штосьці расказалі сакрэтнае пра брыгаду Каваленкі? – спытаў Міхаіл Пятровіч.

– Нічога асаблівага. Але прагноз Валянціна поўнасцю спраўдзіўся: махлявалі яны ўсім кагалам. Нават у мінулы сезон палову шурфоў запаролі. Тую даліну будуць перашурфоўваць.

– А я пра што вам казаў? – з усмешкай прамовіў Валянцін. – І наконт Ігара магу дабавіць – наўмысля падарвалі яго...

– Ну, тут ты ўжо хапіў залішне! – ускрыкнуў Сцяпан.

– Ніколечкі! Ведаю я хахлоў з ягонай брыгады. З-за якой сотні могуць горла перарэзаць, а там хаўтурнымі тысячамі варочалі. З-за грошай яго ўхайдохалі, бо не маглі праўна іх падзяліць. Адно за другое, вось і да турмы дакаціліся. А Каваленка будзе яшчэ гадоў пяць пасля адсідкі выплачваць дзяржаве за сваю хаўтуру.

– Табе б у следчыя падацца з такой інтуіцыяй, – сказаў Віця.

– Вось праз які месяц расколюць іх на допытах, тады скажаце, хто з нас меў рацыю, – дадаў Валянцін.

– А ўсё гэта з-за таго здарылася, што без веры ў душы жывуць на гэтым свеце, – сказаў Сцяпан. – У сувязі з гэтым хачу расказаць вам адну прытчу. Быў аднойчы Ісус Хрыстос з вучнямі ў Храме і назіраў, як людзі клалі грошы ў скарбонку. Адны клалі многа, другія крыху менш... І вось падыходзіць адна бедна апранутая жанчына і кладзе ўсяго дзве лепты, што азначае кандрант, самыя дробныя манеты на той час.

Ісус убачыў гэта і кажа: “Гэтая бедная ўдава палажыла больш за ўсіх, бо багацеі клалі многа ад свайго лішку, а яна паклала ўсё, што мела, усё харчаванне сваё”.

– Каб жа ўсе жылі па сумленні, дык чалавецтва і бяды ніколі б не спазнала, – сказаў Кузьма.

– А наконт галоўнага інжынера, – сказаў Сцяпан, – магу вас запэўніць – слова сваё ён стрымае. Вось толькі б тэхніку спраўную даставілі, а то будзем паўдня кампрэсар запускаць.

– Яго ж, па-мойму, дзесьці гадоў пяць таму ў ссылку адпраўлялі,– сказаў Валянцін.

– Было такое, – Сцяпан усміхнуўся. – Мне начальнік расказваў, што давёў ён былое кіраўніцтва камбіната да белай гарачкі са сваімі праектамі і прапановамі. Думалі-гадалі, куды б сплавіць такога надакучлівага кадра. А тут, як старацелі кажуць, ім падфарціла: прыйшла папера з Масквы, каб адправілі спецыяліста экстра-класа па россыпах у адну з краін такой далёкай і спякотнай Афрыкі. Былы дырэктар камбіната задаволена паціраў рукі: “Няхай пагрэе свае костачкі пасля Чукоткі, а там мо леў які з галадухі злопае”.

І як толькі прыехаў туды наш выгнаннік, то выдзелілі яму двухпавярховы катэдж, шыкоўны аўтамабіль і асабістага шафёра, які быў заадно і служкам: чаравікі чысціў, мяняў бялізну, ну і ўсё астатняе.

І так працаваў там наш Сызганаў, што прэзыдэнт той краіны не адпускаў яго дадому, а пасля заканчэння кантракту прасіў наша пасольства пакінуць яго яшчэ, але ўжо на пасадзе міністра горнай прамысловасці. Вось так!

Але ж Масква не дазволіла. Вярнуўся ён зноў на Чукотку, але з павышэннем – на пасаду галоўнага інжынера, але ходзяць чуткі, што хутка будзе дырэктарам камбіната.

– А цяпер, – Сцяпан падняўся з лавы, – уладкоўвайцеся на бакавую, дый я адпачну, бо дасць Бог, ужо нікога чорт не прынясе.

Толькі праз тыдзень прабіліся да іх два трактары з санямі. На адных быў кампрэсар, абстаўлены з усіх бакоў бочкамі з саляркай, а на другіх: вугаль і бярвенне для ўмацавання шурфоў. Старшыня арцелі прыслаў ім на некалькі дзён і свайго кампрэсаршчыка, каб паказаў, як апарат абслугоўваць. Але назаўтра ж той з'ехаў, бо інакш прасядзеў бы тут тыдні два.

Кампрэсар быў новенькі. Праўда, перад запускам давялося яго падагрэць, але затое пасля ён працаваў спраўна.

Першым узяўся за адбойны малаток былы шахцёр Міхаіл Пятровіч. За якую палову гадзіны прабурыў у Валянцінавым валуне дзве буркі на добрыя сорак сантыметраў.

Пасля ўзрыву ад валуна засталіся адны асколкі. І адразу ж павесялелі шурфоўшчыкі. Дый было ад чаго. За першы дзень кожны паглыбіў свой шурф на паўтара метра.

А праз які тыдзень ужо без асаблівых намаганняў перакрывалі дзённую норму ў два разы. Сцяпан не паспяваў апісваць у палявую кніжку пароду ў шурфах. Яны спяшаліся, бо заканчваўся студзень, а тут яшчэ атрымалі загад прайсці шурфы і на ручаі "Каварны". Бо там, па прагнозах геолагаў, павінен быць асноўны вынас рассыпнога касітэрыту ў даліну.

Сцяпан пабываў на тым ручаі. Калывешкі былі ў парадку: стаялі, быццам тыя вартаўнікі, ля

сваіх шурфоў. Справа пагрозліва падступалася да ручая вялізная сопка, у якой былі уранавыя штольні.

Але спачатку трэба было прашурфаваць даліну. Сцяпан не толькі сам прымаў шурфы, але і закрываў нарады на заробак. Справа гэта была мутарная, памыляцца было нельга, але ж затое ў канцы месяца кожны ведаў, колькі зарабіў грошай. Іх пераводзілі на ашчадную кніжку, толькі вылічвалі на базе за харчаванне.

Люты выдаўся на здзіў ціхі і марозны. Сама прырода, быццам злітаваўшыся над людзьмі, якія не вылазілі з шурфоў па дванаццаць гадзін у суткі, давала ім магчымасць урэшце па-сапраўднаму разбагацець. Яны паступова перасоўваліся ў вярхоўе даліны. І хаця там валуны пачалі сустракацца часцей, але ж затое паменшала і колькасць шурфоў. У канцы месяца запуржыла на пяць дзён, але настрой быў, бо план перакрылі ўдвая, дый урэшце скончылася доўгая палярная ноч.

Праўда, сонейка выглянула спачатку на якія паўгадзіны, але ж пасля з кожным днём усё больш і больш заставалася на небасхіле. Уранку пачало віднець значна раней. Хаця і без асаблівай ахвоты, але цемра адступала, хавалася ў распадках за грабяні сопак. Надакучвалі толькі вятрыскі, якія нават пры невялікім марозіку праціналі наскрозь. Але ў шурфе, асабліва на дзесяціметровай глыбіні, было ціха і нават утульна. У кожнага шурфоўшчыка гарэла свечка – іх завозілі з базы цэлымі скрынкамі.

Кожны раз, калі Сцяпан спускаўся ў шурф з горным компасам, каб апісаць заляганне карэнных парод, то з замілаваннем глядзеў, як ціха гарыць, толькі зрэдку патрэскваючы, свечка. Ён заўсёды ў такія хвіліны ўспамінаў сваю царкву ў вёсцы. Стаяла тая на самым ускрайку: белакаменная, пад цынкавым дахам. Ён любаваўся ёю з самага дзяцінства, у любую пару года. А якім меладычным і задушэўным звонам яна валодала!

У святы – ці то з самага ранку, а то і пад вечар, велічна плыў ён па-над вёскаю, садамі, агародамі і паміраў дзесьці за Вяллёй, над лесам, высока ў нябёсах...

І гэты святы звон заўсёды вярэдзіў ягоную душу і сэрца, прымушаў спыніцца, забыць на хвіліну пра свае турботы і няўдачы. Сцяпан на сабе не адзін раз адчуваў яго лекавую і ачышчальную сілу. Нездарма ж усюдыісныя навукоўцы даўно даказалі, што ад царкоўнага звону гінуць нават мікробы. З гэтым цяжка не пагадзіцца.

І нават тут, у векавой мерзлаце, за Палярным кругам, яму рабілася раптоўна цяплей на душы і радасней на сэрцы ад адных толькі ўспамінаў пра сваю царкву, у якой калісьці вянчаліся ягоная бабуля і маці. Дый яго, зусім малечу, хрысцілі ў гэтай жа царкве. Бацюшка скупануў у халоднай вадзіцы, а ён нават і не заплакаў, чым вельмі здзівіў прысутных.

Яны чакалі трактара з харчаваннем да восьмага сакавіка, але на базе сёмыя суткі гуляла пурга. А ў іх, на дзіва, было цудоўнае надвор'е. І толькі праз тыдзень прабіліся да іх праз заснежаныя перавалы два трактары з санямі. На свята падкінулі ўрэшце сапраўдных ласункаў: была тут і чырвоная рыба, апельсіны, яблыкі, шампанскае і скрынка каньяку, бо з гарэлкай здарыўся перабой. І, да неабмежаванай радасці шурфоўшчыкаў, ажно чатыры скрынкі піва. Раней яны лёталі па яго ажно ў Магадан, бо свайго піўзавода ў Певеку не было. І вось урэшце яго пабудавалі.

Начальнік сам хуценька праверыў усе шурфы, застаўся задаволены, і адразу ж зазбіраўся ў былую брыгаду Каваленкі, бо там ужо цэлы месяц працаваў новы горны майстар і падрыўнік.

Перад самым ад'ездам пацiснуў Сцяпану руку і сказаў:

– У камбінаце прэмію табе выпісалі, амаль на палову "Жыгулёў". А як паспяхова здасі даліну, то галоўны абяцаў яшчэ падкінуць. А на мяне не крыўдуй, бо самога таксама шкамутаюць за такі перарасход выбухоўкі.

– Ды я і не крыўдую. Служба ў вас такая, што тут паробіш...

Начальнік паехаў, Сцяпан на гэты раз рызыкнуў і пакінуў скрынку каньяку ў шурфоўшчыкаў, а сабе ўзяў толькі некалькі бутэлек піва і шампанскае. Тыя далі слова, што больш за два дні гудзець не будуць, бо каньяк не вельмі паважаюць. Дауно ўзялі сабе ў галаву, што аддае той клапамі.

Але ім пашчасціла: ноччу такая ўсчалася пурга, што ў першы дзень Сцяпан не змог да іх дабрацца. З такою сілаю накідвалася яна на балок, што той жаласліва парыпваў, быццам скардзіўся на сваё гаротнае жыццё. А як высвіствала ў трубе грубкі – немагчыма нават апісаць. Вельмі хацелася ёй трапіць цераз тую трубу ў грубку.

І калі ёй гэта ўдавалася, то вугаль да таго разгараўся, што даводзілася адчыняць у грубцы дзверцы.

Толькі на другі дзень, дзесьці так пад вечар, крыху ўсцішылася ўрэшце пурга. І хаця яна яшчэ і не думала заканчваць сваё шалёнае вяселле, але ўжо адчувалася – паслабела паненка.

Сцяпан апрануўся, выбраў зручны момант, і выскачыў з балка. Галоўнае было, каб не згубіць кірунак да балка шурфоўшчыкаў, бо калі што якое, то пасля можаш гадзіну кружыць побач з ім ды так і не дабярэшся да выратавальнай клямкі ў дзвярах. Бывалі выпадкі, што шурфоўшчыкі пасля падпітку замярзалі ў пургу літаральна за некалькі метраў ад свайго балка.

Сцяпан быў цвярозы. І хаця да балка было метраў сорак, ён прабег гэты адрэзак на адным дыханні. Добра яшчэ, што кручок ад дзвярэй у іхнім тамбуры можна было праз шчыліну адкінуць адным пальцам.

Спачатку падумаў, што зноў будуць усе ў поўным адкідоне, але на гэты раз памыліўся. Калі адчыніў дзверы, то ў балку было цёпла, ярка гарэлі дзве лямпы, шурфоўшчыкі гулялі ў карты. Толькі Міхаіл Пятровіч чытаў кнігу.

– Прывітанне! – з радасцю ў голасе прамовіў ён. – Як вы тут?

– Што, спалохаўся? – прамовіў Валянцін. – Напэўна ж падумаў, што як і ў мінулы раз – усе ў аўце!

Было такое! – смеючыся, адказаў Сцяпан, страсаючы снег з шапкі.

На гэты раз мы ў поўным парадку, – сказаў Міхаіл Пятровіч, адкладваючы кніжку на ложак. – Каньячок у нас не ў пашане, бо калі яго перап'еш, то галава баліць – спасу няма, быццам хтосьці сціскае яе жалезнымі абцугамі. Праўда, у першы дзень ледзь не перабралі з галадухі. Добра, што піўка падкінулі, яно нас і ўратавала. Мажа, сам цяпнеш шклянку, яно ў нас халоднае, стаіць ля парога.

– А што? Давай бутэльку, – згадзіўся Сцяпан. – Я ўжо сваё даўно асушыў.

– Бо мала ўзяў, – прамовіў Валянцін і, пад агульны рогат, павесіў вальтовыя пагоны на плечы падрыўніку Віцю. Той пачырванеў, падняўся з-за стала і пачаў выстаўляць бутэлькі з півам. Кузьма іх тут жа порстка адкаркоўваў.

Усе выпілі. Сцяпан таксама перакуліў дзве шклянкі.

– Ну, што там начальнік сказаў, бо вельмі ж хутка даў ад нас дзёру? – спытаў Аляксей.

– Нічога асаблівага. Тэмпамі праходкі задаволены. Падаўся на другі ўчастак, а нам загадаў яшчэ і ручай "Каварны" прашурфаваць.

– Сцёпа! Калі толькі тэхніка не падвядзе, то пройдзем і яго, – з упэўненасцю ў голасе адказаў Валянцін. – Я так прыкінуў, што валуноў там не павінна быць.

– Але заплыў ён грунтам, – працягваў Сцяпан. – Думаю, што асабліва ў вусці ручая глыбіня шурфоў можа быць да пятнаццаці метраў.

– Ну і што, – прамовіў Кузьма. – Памятаеш, на Ергувейме глыбіня даходзіла да дваццаці метраў, але прайшлі на ўсе сто.

– Што вы ўсё пра шурфы, – урэшце падаў голас падрыўнік Віця. – Я тут вычытаў, што на востраве Врангеля жывых мамантаў знайшлі.

– Сам ты мамант! – са смехам адказаў Валянцін. – Яны з мільён гадоў як вымерлі. Вось толькі калі-нікалі іхнія біўні знаходзім.

– Так, – у задуменні прамовіў Сцяпан. – І сапраўды, калісьці тут выгульваліся маманты, раслі пальмы, была цяплынь... А на востраў Врангеля прывезлі з Канады авечкабыкоў. Бачыў я іх на здымку – вельмі падобныя на нашых зуброў з Белавежскай пушчы, але крыху большыя па памерах. Поўсць у іх даўжэзная, а падшэрстак да таго густы, што вятрыску з марозам да іх не дабрацца. Капытамі здабываюць сабе ягельнік не горш за тундровых аленяў. І ваўка з мядзведзем не баяцца. Пры нападзе на іх увесь статак становіцца ў круг, і паспрабуй узяць.

– Барон Врангель ваяваў у Крыме, чаму ж яго імя носіць востраў у Ледавітым акіяне? – спытаў Кузьма.

– Гэта не той Врангель, – адказаў Спяпан. – Тут у свой час гойсаў па ўзбярэжжы палярны даследчык Врангель: навуковец, акадэмік... Дарэчы, на тым востраве яму так і не ўдалося пабываць, хаця ён не адзін раз рабіў такія спробы. Бо калі тут быў, то чукчы яму расказвалі, што ў ясную пагоду, калі на сваіх байдарках адплывалі далёка ад берага па нерпаў, то калі-нікалі бачылі зямлю.

Да 1930 года англічане прэтэндавалі на гэты востраў. Яны трубілі ва ўсіх газетах, што яго ўпершыню адкрыў кітабойны капітан Лонг. Цяпер яго імя носіць праліў, што аддзяляе востраў Врангеля ад узбярэжжа Чукоткі. І да таго надакучыла ўсім такая хлусня, што Сталін аддаў загад адправіць да вострава ледакол з палярнікамі. Тыя ўмацавалі на адной з вяршынь сцяг нашай краіны, а пасля кінуліся вылоўліваць па ўсім узбярэжжы замежных паляўнічых. Яны адчувалі сябе там як дома: палявалі на белых мядзведзяў, пасткамі вылоўлівалі пясцоў, дый марскім промыслам займаліся. Вось іх саміх адлавілі ды пасадзілі ў кутузку.

А на востраве з цягам часу пачалі працаваць навукоўцы, пабудавалі метэастанцыю, а цяпер там ёсць некалькі паселішчаў. Белыя мядзведзі любяць там праводзіць доўгую палярную ноч.

– Мне чукчы расказвалі, што яшчэ да вайны да іх патаемна наведваліся амерыканцы, – сказаў Валянцін. – Прывозілі ім муку, порах, вінчэстэры, адзенне, віскі, ды яшчэ якую драбязу, а забіралі пясцовыя шкуркі. Гэта цяпер тут зверасаўхозы, пасуць аленяў а па ўсім узбярэжжы ў іх свае паляўнічыя. У кожнага дваццацікіламетровы ўчастак. Але абдурваюць іх да немагчымага! І паляўнічыя больш пясцоў збываюць налева, бо ў дзяржавы проста смешныя цэны. Самі лічыце: ад сарака і да сямідзесяці рублёў ім плацяць у залежнасці ад гатунку, так? А ў Маскве, я бачыў у краме, прадаюць за чатырыста рублікаў, а калі блакітны, то і ўсе семсот трэба выкінуць!

– Але, – Сцяпан зірнуў на гадзіннік, – засядзеўся я ў вас. Трымайцеся, а галоўнае – не напівайцеся!

– Вазьмі піўка ў дарогу! – прапанаваў Валянцін.

– Гэта можна! – Сцяпан узяў дзве бутэлькі, уключыў у сенцах ліхтарык і выскачыў з балка.

## Частка сёмая

У красавіку зіма на Чукотцы ў поўным разгары. Праўда, сонейка ўсё вышэй і вышэй узнімаецца на небе, ужо ваўсю пануе сапраўдны дзень. Пурга яшчэ наведваецца, але не такая злосная, спадае ў ёй ранейшы імпэт. І цяпер яна больш двух-трох дзён не гойсае па далінах і распадках. Хаця бывалі і такія гады, што на цэлы тыдзень заганяла паляўнічых, рыбакоў і геолагаў у свае балкі і старожкі.

Дый мароз пачынае паволі адступаць. Вось толькі вятрыскі надакучваюць. Але бываюць такія дзянёчкі, што проста цуд нябесны: навокал цішыня, прыпякае сонейка, а на снег без чорных акуляраў глядзець немагчыма.

Якраз у другой палове красавіка скончылі ўрэшце праходку шурфоў у даліне і перабраліся на ручай "Каварны". Хто і калі даў такую назву гэтаму ручаю – аднаму Богу вядома. Але, напэўна ж, не здарма. Сцяпан уважліва агледзеў яго яшчэ раз, бо як толькі сюды перабраліся, то незразумелая трывога пасялілася ў ягонай душы.

Было такое прадчуванне – штосьці павінна здарыцца. Але што? І валуноў, дзякуй Богу, пакуль не было. Яны да таго надакучылі, што ў канцы сезона кожны марыў пра тое, каб з імі больш не сустракацца. Сцяпан нават ноччу не мог нармальна заснуць.

Ён нікому нічога не расказваў, але ўзмацніў кантроль за падрыўнымі работамі. Тут усё можа быць. Загінуць у шурфе зусім проста: то добры асколак адваліцца з бакавіны шурфа і ўпадзе на шурфоўшчыка, які шчыруе ломікам на дзесяціметровай глыбіні, або адарвецца вялізная бодня з грунтам пры адкачцы, ды мала яшчэ што можа здарыцца.

Можна запраста і падарваць сябе, калі пры забурванні адбойным малатком нечакана трапіш у старую бурку, дзе амаль заўсёды застаецца крыху аманіту ад папярэдняга ўзрыву. Тут паратунку можа і не быць, а калі толькі падраніць, то можаш не паспець выбрацца па лесвіцы, бо задыхнешся ад атрутных газаў.

І яму часам думалася, што ўвесь гэты неспакой ідзе ад вялізнай уранавай сопкі, з яе штольнямі, дзе калісьці працавалі зняволеныя.

Але праходзілі дні, нічога такога не здаралася, усё было будзённым, як і заўсёды, але прадчуванне бяды не праходзіла.

А ў канцы красавіка, якраз напярэдадні майскіх святаў, прайшлі ўсе шурфы на першай лініі ручая. Як і прыкідваў Сцяпан, так яно і аказалася: глыбіня шурфоў даходзіла да семнаццаці метраў.

Праўда, і камянёў амаль не было. А сонейка спраўна рабіла сваё – паднімалася ўсё вышэй, ды так прыгравала ў асобныя дні, што можна было

распрануцца да пояса і з якую гадзіну пазагараць. І хаця яшчэ скрозь ляжаў снег, але ў паветры ўжо адчуваўся ледзь прыкметны подых вясны.

Сцяпан нават ля сцяны свайго балка змайстраваў палок, на якім і прыладзіўся загараць на кажушку. Пацiху абуджаўся і жывёльны свет. Першымі нагадалі пра надыход вясны пуначкі. Прылятали яны з поўдня ў сярэдзіне мая. Калі, бывала, крыху паспяшаюць, а тут нечакана прыцісне марозік, то гэтыя малыя істоты замярзалі проста ў паветры і падалі на снег. Сцяпан кожную вясну знаходзіў такіх небарак, прыносіў у балок, і яны ажывалі. Весела шчабяталі, паглядвалі на яго сваімі маленькімі чорнымі вочкамі і жылі ў балку да прыходу сапраўднага цяпла.

У такія дні ён прымацоўваў кармушку на сцяне балка і насыпаў туды розных крошак. Чукчы не адзін раз яму расказвалі, што гэтыя пуначкі зімуюць тут, нікуды не адлятаюць, а хаваюцца ў пясчаных норах ля берагоў рэк і азёраў. Калі яны іх адтуль даставалі, то тыя былі быццам замерзлыя, але ў сапраўднасці спалі.

Павесялеўшымі адчувалі сябе і курапаткі. Раней іх было на Чукотцы вельмі многа, бо чукчы на іх не палявалі, і тыя вякамі да таго ўвайшлі ў давер да чалавека, што нават калі хтосьці і цяпер бабахне са стрэльбы, то яны адлятуць з дзесятак метраў і зноў садзяцца на зямлю. І да таго іх пазнішчалі, што могуць запраста трапіць у Чырвоную кнігу.

Абуджаюцца ў майскія дні ад спячкі і еўражкі. Норкі робяць на пясчаных пагорках, там заўсёды ў першую чаргу растае снег, а яны вылазяць на сонейка і пільна, быццам тыя вартавыя, падоўгу стаяць на задніх лапках ды пазіраюць навокал. І калі адчуваюць небяспеку, то гучна так верашчаць ды порстка сігаюць у сваю выратавальную норку.

А дзесьці к канцу мая вялізнымі чародамі ляцяць па ўзбярэжжы акіяна канадскія гусі. Кожны год яны прылятаюць сюды, каб вывесці сваіх гусянятак. Тут іх ворагамі становяцца пясцы і

гарнастаі. Пясцы падкрадваюцца, як сапраўдныя злодзеі, між скал, нізка апусціўшы галаву, быццам саромеючыся свайго ўчынку, зганяюць гуску з гнязда ды крадуць яйкі. Праўда, гусак налятае на такога нахабніка і дзяўбе што ёсць моцы. І вельмі часта Сцяпан бачыў, што пясец дае драла.

Палюе на гусей і зусім маленькі, але даволі спрытны палярны гарнастай. Той таксама падкрадваецца, але зрабіць яму гэта значна лацвей, ён нечакана ўскоквае зверху нават на самога гусака і пачынае перакусваць сваімі вострымі зубамі ягоную шыю.

Той, як правіла, уздымаецца ў паветра, але нахабны гарнастай і не думае саскокваць на зямлю, а працягвае сваю крывавую справу. Знясілены гусак з цягам часу паволі апускаецца на зямлю. Тут і святкуе сваю перамогу малы разбойнік. Кажуць, калі б ён быў памерамі хаця бы з ката, то на Чукотцы ад яго ніхто б не ўратаваўся.

Але найбольш дастаецца бедным гусям ад чалавека. У асноўным мясцовае кіраўніцтва, чыноўнікі розных масцей і рангаў катаюцца па тундры на магутных усюдыходах, трактарах, нават верталёты заказваюць.

І хаця ў гусей ёсць свая служба бяспекі, гэта іх не ўратоўвае. Бо калі вялікая чарада адпачывае, то з розных бакоў стаяць, высока падняўшы галаву, гусакі-вартаўнікі. І калі набліжаюцца пешшу людзі, яны крыкам узнімаюць усіх у паветра. Але калі пад'язджае трактар з санямі або ўсюдыход, то яны чамусьці сігналу небяспекі не падаюць. І бессардэчныя людзі расстрэльваюць іх ва ўпор, з зусім невялікай адлегласці. Ідзе звычайнае браканьерскае забойства.

Інспектара ў тундры не знойдзеце. Бо сядзіць у раённым цэнтры, ва ўтульным кабінеце і займаецца папяровай справай. Што яму да тых гусей?

Нават простае гойсанне на гусенічных усюдыходах прыносіць тундры непапраўную шкоду, бо асноўны корм аленяў – ягельнік, вельмі доўгі тэрмін пасля не адрастае.

Сцяпан ніколі не паляваў на гусей, хаця ў яго і была стрэльба. Аднойчы схадзіў на ўзбярэжжа, упаляваў некалькі качак, але тыя да таго аддавалі марской рыбай, што ён падарыў іх шурфоўшчыкам. А яны, добра астаграміўшыся, умялі іх за мілую душу – адны костачкі засталіся. А былі б тут, як у старажытныя гады, маманты, то і ім бы дасталося на арэхі. Бо з-за біўняў знішчылі б усіх да аднаго.

Тут нават белым мядзведзям дастаецца, хаця кожны на Чукотцы ведае, што паляваць на іх нельга – штраф да тысячы рублёў, але гэта не спыняе аматараў паўночных прыгод.

Упаляваць мядзведзя – гэта яшчэ не галоўнае, пасля ж трэба ўхітрыцца перавезці вырабленае шыкоўнае футра на мацярык, проста ў шасціпакаёвую кватэру якому-небудзь высокаму маскоўскаму чыноўніку.

Але як бы там ні было, а вясна ёсць вясна! Сцяпан любіў яе ўсюды і заўсёды, асабліва тут, на Чукотцы. Вось і цяпер ён з нецярпеннем чакаў, што праз якія тыдні два пачне ўрэшце раставаць снег, пабягуць ручаі з вяршынь сопак у даліну, а ўжо ў ёй, проста на вачах, узнікне сапраўдная рака.

А які шум ад вады будзе стаяць навокал! Бо з сопак, днём і ноччу, па серпантыне, будзе збягаць у даліну талая вада. Снегу многа, растае той не так хутка, а ля вяршынь сопак нават застаецца да пачатку новай зімы.

У адзін такі сонечны і зацішны дзень, калі Сцяпан, распрануты да пояса, корпаўся ля балка, бо толькі збіраўся насячы дроў, ён раптам убачыў, што з ручая, які быў адсюль добра бачны, шпарка, адзін за адным – цугам, амаль подбегам, шыбавалі шурфоўшчыкі. Абедаць было яшчэ рана, і ён адразу ж сцяміў – штосьці там урэшце здарылася. Ён хуценька апрануўся і пайшоў ім насустрач.

– Сцёпа! – яшчэ здалёку, як толькі яго ўбачыў, закрычаў Валянцін. – Я дабраўся да ўранавай смолкі! Прападзем усе ад радыяцыі!

– Якой смолкі? – са здзіўленнем спытаў Сцяпан, абводзячы ўсіх насмешлівым позіркам.

– Да сапраўднай уранавай руды! – працягваў Валянцін, – бо адзін геолаг мне расказаў, як тая выглядае. Не верыш, то сам спусціся ў шурф, ён ля самай сопкі, а мы пап'ем чайку, а то і паабедаем.

– Добра. Абедайце, а я да вас пасля зайду.

Сцяпан вярнуўся ў свой балок, узяў геалагічны малаток з доўгай ручкай, компас, перакінуў цераз плячо ў скураным футарале дазіметр, які пакінуў яму ў мінулы раз прадбачлівы начальнік. Ён нікому гэты прыбор не паказваў. Але аднойчы вырашыў яго праверыць – ці спраўны, бо той быў новенькі, а стрэлка нават і не думала рухацца, стаяла, быццам прыклееная да цыферблата.

І вось калі ўсе былі на шурфах, ён настроіў дазіметр па інструкцыі, падышоў па даліне да сопкі і пачаў паволі падымацца да адной са штольняў, увесь час пазіраючы на стрэлку. Тая і не думалала рухацца. Тады ён асмялеў і вырашыў зазірнуць у штольню. Але ля самага ўваходу стрэлка раптоўна ажыла і, быццам спрасонку, так рванула, што адразу ж зашкаліла. Сцяпан тут жа спыніўся, а пасля хуценька збег уніз. Крокаў праз дзесяць зірнуў на прыбор: стрэлка зноў мірна драмала на нулі.

І вось цяпер, падышоўшы да Валянцінавага шурфа, ён уключыў дазіметр і пачаў спускацца па лесвіцы, а сам увесь час пазіраў на стрэлку, але тая паводзіла сябе спакойна.

Шурф быў праведзены на метраў сем. На самым ягоным дне яшчэ гарэла свечка, але каб усё лепш разгледзець, ён уключыў ліхтарык. Адразу ж распазнаў, што Валянцін натыкнуўся на карэнныя пароды – пясчана-глiністыя сланцы, але тут яны былі крыху іншага колеру: светла-карычневыя, ды яшчэ з бялютка-жаўтаватымі ўкрапінамі.

Сцяпан хутка наадбіваў іх малатком і паклаў у кішэню. Больш тут яго нічога не цікавіла. Зірнуў яшчэ раз на стрэлку, але тая і не думала рухацца. Адразу ж падняўся на паверхню і накіраваўся да шурфоўшчыкаў.

Калі зайшоў да іх у балок, тыя паспелі ўжо паабедаць, бо ў такія сонечныя дні яны спяшаліся на працу, каб падзарабіць у канцы сезона.

– Ну, чым парадуеш, Сцёпа? – спытаў Кузьма.

– Працуйце спакойна. Валянцін дабраўся да звычайных сланцаў, толькі яны тут іншага колеру. Стрэлка прыбора нават і не зварухнулася.

– А якая ж тады па колеры ў гэтай сопцы уранавая руда? – спытаў Валянцін.

– Яна прадстаўлена тут у выглядзе слюдзяных пласцінак яркага жоўта-зялёнага колеру. Вось калі на такую натрапіце, завіце мяне.

– А каб злазіць з тваім прыборчыкам у штольню! – прапанаваў Міхаіл Пятровіч.

– А я ўжо там быў, – адказаў Сцяпан.

– А нам ні гу-гу! Вось табе і Сцёпа! – ускрыкнуў Аляксей.

– Дык вы ж і не пыталіся! – Сцяпан засмяяўся.

– Бо і прыбор гэты ў цябе ўпершыню бачым, – дадаў Валянцін.

– Ну і што ён паказаў? – спытаў Віця.

– Імгненна зашкаліў ля самага ўваходу ў штольню. Але баяцца нам няма чаго.

– Яно так, – пачухаў патыліцу Кузьма, – але ж усё-ткі прэць з гэтых штольняў уранавы дух...

– Тут мы нічога прыдумаць не зможам, – прамовіў Сцяпан, – да нас тут працавалі і яшчэ будуць. Старацелі тут так перакапыцяць, што пакінуць пасля сябе толькі горы камянёў. А цяпер за працу, бо май распячаталі, хутка лета.

– Штосьці не падкідваюць гарэлкі з базы? – спытаў Аляксей.

– Начальнік абяцаў прыслаць да дня Перамогі. А вы паднажміце, бо калі дасць ранняя вясна, то змые праходкі на рэчышчавых шурфах, вось... Іх будуць прамываць у першую чаргу. Дый пурга яшчэ можа адабраць з пяток дзён.

На гэтым і скончыўся іхні кароткі сход. Сцяпан падаўся ў свой балок рыхтаваць абед, а шурфоўшчыкі на “Каварны”, які іх крыху спудзіў. Хаця ручай быў і без валуноў, але Сцяпан чамусьці яго недалюбліваў, бо трывога працягвала сядзець у ягонай душы.

Не, нездарма хтосьці з геолагаў даў такую назву ручаю. Сцяпан адчуваў – штосьці на “закусь” гэты

ручай ім яшчэ падкіне. Невялікі сполах з уранавай рудой – гэта так, дзеля праверкі нервовай сістэмы, а там – адзін Бог ведае, які фортэль ён ім выкіне.

Але пакуль, як бы там ні было, яны паціху прасоўваліся ў вярхоўе ручая – распачалі другую лінію.

А тут, дзесьці так пад вечар, калі сонейка пачало хавацца за вяршыні сопак, прымчаў да іх гокаўскі ўсюдыход. Сцяпан спачатку не на жарт спалохаўся, бо па рацыі наконт начальства нічога не перадалі.

Але дарэмнымі былі ягоныя хваляванні. Проста галоўны інжынер даў у тундру свой усюдыход, каб той да святаў развёз харчаванне і гарэлку.

З усюдыходчыкам быў толькі іхні начальнік. Яны спяшаліся. Толькі выгрузілі харчы, выпілі ў Сцяпана чайку і адразу ж падаліся на суседні ўчастак.

Піва прывезлі навалам – дзесяць скрынак, а вось гарэлкі толькі адну, бо старацелі перад святамі расхапалі, але начальнік абяцаў праз тыдзень-другі падкінуць яшчэ.

Хаця і стаялі сонечныя дзянёчкі, але шурфоўшчыкі прагудзелі два дні. І гэта яшчэ добра, бо выхадныя давала ім толькі пурга. Гарэлку яны паважалі. За два дні скрынка імгненна апусцела, а на пахмелле пайшло халоднае піўко. Так што настрой у іх быў.

У першы дзень завіхаліся не вельмі, але пасля справа пайшла, бо пачалі часцяком трапляць у ледзяныя лінзы, гэта калі грунту няма, а адзін лёд.

З кожным днём сонейка ўсё больш прыпякала. Дзесьці так праз тыдзень з'явіліся ўрэшце пуначкі, а пасля і еўражкі павылазілі са сваіх норак.

Вясна ўбіралася ў сілу. У самы поўдзень да таго прыпякала, што пачаў паціху падтайваць снег. Дзе-нідзе пачалі нават з'яўляцца першыя невялікія ручаі. Праўда, яны к вечару перахопліваліся марозцам, які ноччу яшчэ прыціскаў на добрых дзесяць градусаў.

А ягоныя шурфоўшчыкі выйшлі ўрэшце ў самае вярхоўе ручая, там былі толькі чатыры шурфы.

У адзін з такіх дзён, толькі хацеў Сцяпан крыху здрамнуць пасля смачнага абеду, куляй уварваўся ў ягоны балок перапалоханы Кузьма. Твар у яго быў збялелы, рукі дрыжалі...

– Сцёпа, бяда! Чалавек у шурфе!

– Няўжо падарвалі каго?!

– Ды не!

– А што ж тады здарылася? – спытаў Сцяпан і адчуў, як сполах пачаў праходзіць.

– На глыбіні чатырох метраў трапіў я ў прамарозку – адзіны лёд. Узрадаваўся, дый забурыўся, як мае быць – на ўсю катушку! Пасля адпалкі пачалі адкачваць у мяне лёд. А пасля бачу – з бакавіны шурфа выпаў вялізны асколак ільду. Прыгледзеўся, а з яго на мяне чалавек пазірае... Ну і драпануў, што ёсць моцы на паверхню. Боязна цяпер туды спускацца. Мо там тых мерцвякоў з добры дзесятак збярэцца.

– Зараз разбярэмся, – супакоіў яго Сцяпан. – Думаецца мне, што ты адкапаў былога зэка. Яны тут працавалі калісьці, маглі і шурфаваць. Вось і скінулі небараку ў шурф, каб магілку не дзяўбсці ў векавой мерзлаце.

Ён апрануўся, і яны хуценька падаліся да шурфа Кузьмы. Сцяпан узяў кайло, уключыў ліхтарык і пачаў спускацпа ў шурф.

І сапраўды, з левай бакавіны вывалілася даволі вялізная ледзяная камлыга, у якой, быццам у ледзяной труне, ляжаў чалавек. Адпачываў той на правым баку, адна нага была падкурчана, а другая выпрастана. Сцяпану стала крыху жуткавата, бо чалавек і сапраўды, хаця і быў у пашкамутаным адзенні, але пазіраў проста на яго...

Ён крыху пастаяў, а пасля пачаў з асцярогаю адбіваць кайлом ад глыбы невялічкія асколкі ільду, бо трэба ж было падняць бедалагу на паверхню. Кузьма пазіраў на яго зверху, але ў шурф не спускаўся.

– Стаўляй на шурф вараток і спускай адзін тросік без бодні,– падаў каманду Сцяпан.

– Зараз зробім, – адазваўся зверху Кузьма і ўсцягнуў вараток на дзве лагі, што ляжалі на шурфе.

Праз якую хвіліну Сцяпан трымаў у сваіх руках тросік, на канцы якога быў спецыяльны карабін, каб зашчоўкваць на дужку бодні. Ён асцярожна засунуў тросік пад ледзянога нябожчыка і ўзяў таго на пятлю-ўдаўку.

– Нацягні тросік! – гукнуў Сцяпан.

І ў той жа момант зварухнулася ледзяная труна, крыху прыўзнялася, ледзь не прыціснуўшы Сцяпана да процілеглай сценкі шурфа.

– Хопіць! – ён хуценька выбраўся з шурфа.

З вялікай перасцярогаю яны ўдвух выцягнулі незнаёмца на паверхню.

– Дзякуй Богу! – прамовіў Сцяпан. – Цяпер мы з ім управімся. Тут да іх падышоў Валянцін, які паспеў ужо забурыцца, а пасля і Аляксей з Міхаілам Пятровічам.

– Ого! – ускрыкнуў Валянцін. – Ну і знаходачка ў вас!

З якую хвіліну ўсе моўчкі стаялі ля нябожчыка. Пасля Сцяпан зняў шапку і ціха прамовіў:

– Вечная табе памяць, дарагі чалавеча. Прабач, што давялося цябе патрывожыць, але цяпер пахаваем па-людску.

Тым часам пачало цямнець.

– Раз такая справа, то на сёння ўсё – шабаш! – сказаў Валянцін.

– А цяпер бярыце рыдлёўкі, бо трэба прыхаваць яго ў снезе, каб расамахі з пясцамі не накінуліся.

Надзейна прыхаваўшы ледзяную труну, яны адправіліся да сваіх балкоў.

Сцяпан павячэраў, пагаварыў з базай, а пасля накіраваўся да шурфоўшчыкаў.

– Заўтра спакойна працуйце, а я буду капаць магілку, – сказаў Сцяпан.

– Вось табе і ручай "Каварны", – сцішаным голасам прамовіў Міхаіл Пятровіч. – Пачаў падкідваць нам нябожчыкаў.

– Тут тысячы зняволеных загінулі ў свой час, – прамовіў Сцяпан.

– Іхнія душы дзесьці далёка, – сказаў Кузьма.

– А мо ягоная якраз і вярнулася да свайго цела, каб пабыць крыху побач, – выдаў сваё прадказанне Валянцін.

– Такога не можа быць, – адказаў Сцяпан.

– Чаму? – спытаў Віця.

– У царкоўным паданні я чытаў, што ў першыя два дні душа нябожчыка знаходзіцца на зямлі, і ў суправаджэнні анёла блукае па розных мясцінах. Асабліва бывае там, дзе пры зямным жыцці той рабіў добрыя і дрэнныя справы і ўчынкі. Але пасля хуценька вяртаецца да свайго цела. І толькі на трэці дзень душа ўзносіцца да Прастола Госпада, каб пакланіцца яму. Пачынаючы з трэцяга і па дзевяты дзень душа знаёміцца з раем і бачыць, якой прыгажосці сябе пазбавіла, бо вяла грахоўнае зямное жыццё.

У канцы дзевятага дня душа зноў з паклонам у Прастола Госпада. А з дзевятага і па саракавы дзень яна знаёміцца з пеклам і добра разумее, што ўсе гэтыя мучэнні яна заслужыла па сваіх зямных справах. На саракавы дзень душа зноў узносіцца да Прастола Усявышняга, дзе і адбываецца над ёй Суд. Тут адразу ж вырашаецца, дзе будзе знаходзіцца душа да Страшнага Суда. Вось чаму так неабходны малітвы па нябожчыку ў першыя сорак дзён. Наша малітва згладжвае яго грахі і палягчае замагільную долю. Вось так! Пытанні будуць?

– І адкуль ты ўсё ведаеш, Сцёпа? – спытаў Міхаіл Пятровіч.

– Чытаў у свой час патаемна ў інстытуце царкоўныя кнігі. Нам усім гэта трэба ведаць і старацца пры зямным жыцці зрабіць пабольш добрых спраў, каб не атрымалася пасля, як у той Акуліны...

– А што з ёй здарылася? – спытаў Віця.

– Памерла яна. Узнялася яе душа да Усявышняга, а там апостал Пётр адкрыў кнігу і прачытаў: "Дала суседцы Груні дзве цыбуліны". І гэта за ўсё жыццё! Вось і будзе пакутаваць яе душа ў гарачай смале, а то яшчэ і ў горшым месцы...

– Устрашыў ты нас, Сцёпа, да немагчымага, – ціха прамовіў Кузьма.

– Нічога, гэта вам толькі на карысць пойдзе, – адказаў Сцяпан. – Нам усім не баяцца трэба, а пакаяцца. Толькі пакаянне выратуе нашы грэшныя душы. І тут няма нічога асаблівага – толькі кожны павінен жыць сумленна. Я разумею – гэта цяжка, бо д'ябал расстаўляе такія спакусныя сілкі, што не трапіць у іх вельмі цяжка... Але ж трэба змагацца і маліцца. Бо малітва – гэта размова з Усявышнім.

– Яно так, – пачухаў патыліцу Валянцін, – але ж няхай бы з неба хоць раз з'явіўся хто са святых ды стварыў які цуд, вось тады – іншая справа, нават нявернікі ў царкву падаліся б.

– Такіх прыкладаў, як казаў калісьці дзед Мажуль, колькі хочаш, яшчэ і больш. Так і быць – раскажу вам, грэшнікам, адну гісторыю.

Дык вось, здарылася гэта ў Францыі, у горадзе Гаўры. У адной сям'і паміраў ад белакроўя хлопчык. Урачы казалі, што праз два тыдні ён памрэ. Бацька з маці таго хлопчыка былі веруючымі і маліліся за сына днём і ноччу. І вось аднойчы ўранку бацька хацеў зрабіць на памяць некалькі здымкаў свайго сына. Калі падыходзіў да ягонага пакоя, то выразна пачуў чыйсьці голас...

Голас быў нізкі, глыбокі, праніклівы. Муж хуценька паклікаў жонку, і яны зайшлі ў пакой, дзе ляжаў іх Патрык. Там яны ўбачылі высокага сівавалосага старца ў белым убранні. Ягоная постаць была як бы нерэальнай, паўпразрыстай, выпраменьвала цёплае святло. Бацькі застылі ў ашаламленні. А старац павярнуўся да іх і сказаў: “Я прыйшоў з дапамогай, ваш сын не памрэ”.

Стары стаяў ля Патрыка, пасля ўзняў над ім рукі. І адразу ж хлопчык расплюшчыў вочы і пачаў усміхацца. Пасля стары прамовіў: “Маліцеся і дзякуйце Богу, што мяне прыслаў. Раскажыце ўсяму свету, што божы анёл выратаваў ваша дзіця”.

І тут постаць знікла, як бы растварылася ў паветры. Пасля яе ў пакоі засталося фосфарнае святло і пах палявых кветак. Хлопчык папраўіўся. Ад

белакроўя не засталося і следу. Доктар, які лячыў хлопчыка, пасля казаў, што медыцына не можа растлумачыць такой раптоўнай змены ў арганізме чалавека.

– То пра гэта, мабыць, французы маглі і прыдумаць, – падаў голас Аляксей. – Вось каб штосьці такое ў нас магло здарыцца.

– Што ж, – Сцяпан уздыхнуў, – раз вы такія няверуючыя, як той біблейскі Фама, то раскажу вам пра выпадак, які здарыўся ў Брэсцкай вобласці, у вёсцы Ражноўка, у далёкім 1942 годзе.

Нашы парашутысты непадалёку ад той вёскі забілі з дзесятак немцаў. Нямецкае камандаванне вырашыла, што гэта ўчынілі партызаны, і загадала за кожнага нямецкага салдата расстраляць па дваццаць мясцовых жыхароў. І вось калі ўсе былі ля ямы, над імі нечакана закружыў лёгкі нямецкі самалёт, а пасля апусціўся непадалёку на палянцы.

З самалёта выйшаў нямецкі генерал і адмяніў пакаранне – усіх загадаў адпусціць па хатах. А дзесьці так праз два тыдні ён зноў завітаў у іхнюю вёску і прывёз абраз Божай Маці з немаўляткам на руках і сказаў вяскоўцам: “Беражыце гэты абраз – ён ваш выратавальнік”. Пасля малебну ў царкве той генерал пры развітанні сказаў: “Калі мой самалёт ляцеў над полем, то на небе з’явілася Боская Маці і паказала рукою ўніз, вось чаму Яна ваша выратавальніца, а я толькі выканаў яе загад”.

Сведкі тых падзей і цяпер жывуць у той вёсцы. Што на гэта скажаце?

– А калі ўсё гэта робяць пад маркай Усявышняга іншапланецяне, якія апярэдзілі нас на тысячу гадоў у сваім развіцці, – сказаў падрыўнік Віця, які захапляўся фантастычнымі раманамі.

– Дый хто паверыць, што душа пасля смерці чалавека ўзносіцца на нябёсы да Усявышняга, – дадаў Аляксей.

– І на гэта магу вам прывесці пераканаўчы прыклад. У Мінску і цяпер жыве адна мастачка, душа якой пабывала на тым свеце. А здарылася з ёй вось што: у бальніцы яна памірала ад заражэння

крыві. Медсястра ёй сказала, што жыць засталося менш за тры гадзіны. І яна не апусціла рукі, пачала маліцца, бо вельмі было шкада сваіх дзетак: малодшай дачушцы ішоў усяго другі годзік. І яна расказвала, што пасля празмерна цяжкіх пакут ёй раптоўна стала лёгка. Невядомая сіла панесла яе па даўжэзным і цёмным тунэлі, па баках якога стаялі статуі незнаёмых людзей.

І раптам здалёку ярка засвяціў прамень, які біў у паднябессе. І тут яна, быццам тая пушынка, пачала паднімацца да таго промня, адчуваючы вялікую палёгку і радасць...

Раптам – штуршок, боль і ранейшае недамаганне. Урачы ёй пасля сказалі, што клінічная смерць працягвалася больш за дзве хвіліны. Праз тыдзень мастачка паправілася і адразу ж пачала сваёй працай дзячыць Усявышняму за выратаванне. А занялася яна аб'ёмнай вышыўкай з прымяненнем аплікацый, дывановага і габеленавага ткацтва.

Яна стварыла абразы Божай Маці, Ісуса Хрыста, а таксама Еўфрасінні Полацкай, гэта святая з нашай Беларусі. Людзі кажуць, што калі стаяць ля яе абразоў на выставах, то лёгка і светла становіцца на душы, а многія нават і пазбаўляюцца ад розных хвароб.

І калі вы не стаміліся, то паслухайце яшчэ адну гісторыю, якая здарылася на маёй Смаргоншчыне, у раённай бальніцы.

Чатыры гады таму, калі я вучыўся на апошнім курсе інстытута, прыехаў на канікулы ў сваю вёску. І вось за тыдзень да Каляд, на другім паверсе бальніцы, дзесьці так апоўначы, з'явіўся на шыбе акна выразны вобраз Ісуса Хрыста з кнігаю ў руках.

Усе, хто мог, кінуліся ў тую вялікую залу, дзе звычайна глядзелі тэлевізар, і сталі на калені. Расказвалі, што нават урачы з медсёстрамі стаялі. Дзве гадзіны быў яскрава бачны вобраз Ісуса Хрыста, а пасля ён знік і з'явілася Божая Маці са сваім сыночкам. Яна трымала яго на руках, а Ён увесь час паварочваўся. І толькі а палове пятай раніцы знік яе вобраз...

Цікава яшчэ тое, што шафёр, які ў тую ноч дзяжурыў на "хуткай дапамозе" ды быў якраз у кабіне, бо збіраўся здрамнуць, раптам убачыў – яркі прамень з аблокаў падаў проста на тое бальнічнае акно.

– Што ж тое відовішча магло азначаць? – спытаў Валянцін.

– Загадка для ўсіх, – адказаў Сцяпан. – Але я думаю, што Ісус Хрыстос з Божай Маці прызывалі нас да пакаяння. Бо людзі ў сваіх грахах пераступілі мяжу дазволенага. Настае пара, як той казаў, не раскідваць, а збіраць камяні.

– Колькі Храмаў загублена толькі ў нашай Беларусі – не злічыць! Я бачыў аднойчы фотакартку Віцебска на пачатку нашага стагоддзя, то ўвесь горад быў у пазалочаных купалах – люба-дорага зірнуць! А цяпер апошнія Храмы ўзрываюць ды будуюць панельныя дамы-блізняты: няма ў тых ні выгляду, ні прыгажосці.

– Усё гэта так, але што кажуць навукоўцы наконт душы, стварэння зорак, зямлі, сусвету... Ці яны ўсе вераць у Бога? – спытаў Міхаіл Пятровіч.

– Адкажу вам і на гэтае, бадай, самае складанае пытанне. Але спачатку пра навукоўцаў. Сярод іх было многа веруючых. Напрыклад, знакаміты фізік Энштэйн, Ісак Н'ютан, чые законы мы зубрылі ў школе. А калі ўзяць бліжэй да нас, то вельмі веруючым быў акадэмік Паўлаў. Ён жыў і працаваў у Ленінградзе і, не хаваючыся, хадзіў у царкву. Сталіну не раз пра гэта дакладвалі, але нават "бацька ўсіх народаў" не асмеліўся ў той час пасадзіць навукоўца за краты, бо той быў вядомы ўсяму свету.

І вось якую тэорыю ўзнікнення Сусвету прыдумалі тыя навукоўцы, якія не вераць у Бога. Яны сцвярджаюць, што ўсё ў Сусвеце пастаянна кантралюецца з боку энергаплазматычнага мегарозуму, або так званай "Нулявой Кропкі". Гэтая "Нулявая Кропка" пасылае ў прастору вельмі многа розных хваляў, якія пранікаюць праз усё. Яны двух відаў: пасіўныя – "альфа", і актыўныя – "бэта". Хвалі "альфы" звязаныя з

кожнай часцінкай Сусвету. Гэтыя хвалі маюць такую асаблівасць, што ўзбуджаюць энергію ў тым, праз што праходзяць.

І вось гэтыя хвалі, збіраючы энергію і прыдаючы ёй вялізную хуткасць, ствараюць будаўнічы матэрыял Сусвету. Пранікаючы праз усё, яны нясуць інфармацыю і загады ад “Нулявой Кропкі”.

Актыўныя хвалі “бэта” складаюцца з многіх элементаў, з так званых палос, якія плаўна пераходзяць адна ў адну, як колеры ў вясёлцы. А ў кожным з нас знаходзіцца энергетычнае ядро, якое называюць трансмісерам. Гэта своеасаблівы прыёмнік актыўных хваляў “бэта”. Звязаны са свядомасцю “Нулявой Кропкі”, ён з’яўляецца тым, што мы называем душой.

У гэтым трансмісеры і хаваецца загадка нашай бессмяротнасці. Але ён недасканалы і можа падвяргацца пашкоджанням, якія і выклікаюць у чалавека розныя хваробы. І калі наш трансмісер, а гэта значыць, душа, пачынае дрэнна прымаць хвалі “альфы”, то хварэе наша цела.

Наш трансмісер не гіне пасля нашай смерці, а застаецца на адлегласці некалькіх метраў ад месца пагібелі і знаходзіцца там некалькі тысяч гадоў, працягваючы прымаць хвалі “бэта”.

І калі б чалавецтва навучылася карыстацца ведамі “Нулявой Кропкі”, то паўсюдна ўзнік бы неймаверны хаос. Магло б здарыцца самагубства ва ўсім Сусвеце, а за гэтым загінула б і сама “Нулявая Кропка”.

Цяпер вы бачыце, што вывады няверуючых навукоўцаў ідуць як бы паралельна кірунку тых, хто верыць у Бога. Адна толькі розніца ў назвах: у нявернікаў душа – трансмісер, а Усявышні – “Нулявая Кропка”. Усяклі што-небудзь? – Сцяпан усміхнуўся.

– Ну, Сцёпа, у цябе і галава, – працягнуў Валянцін. – Была б мая воля, то прысвоіў бы табе акадэміка.

– Маёй заслугі тут няма, гэта навукоўцам трэба сказаць дзякуй. Але пара развітвацца, бо заўтра ў мяне цяжкі дзень – магілку буду капаць.

## Частка восьмая

Наступным днём Сцяпан падняўся раней звычайнага, хуценька паснедаў, выдаў падрыўніку дзённую норму аманіту і толькі пасля стаў рыхтавацца ў дарогу.

Узяў два шурфовачныя ломікі, кайло, лапату і падаўся на ручай "Каварны", дзе ўжо ваўсю ішла праца. Праз якую гадзіну яму на дапамогу павінен быў падысці Віця, які пакуль быў заняты гатаваннем абеду.

Месца для магілкі Сцяпан выбраў яшчэ ў той дзень, калі дасталі з шурфа нябожчыка. Трэба было толькі падняцца крыху на сопку, што была з правага берага ручая, там Сцяпан прыкмеціў невялікую пляцоўку. У самой даліне хаваць было нельга, тут у наступны сезон пачнецца прамыўка пяскоў. Даліна валуністая, то будуць увесь палігон забурваць і ўзрываць.

Хаця і з цяжкасцю, але ён урэшце ўскараскаўся на тую пляцоўку. Зверху ўсё было выдатна бачна, як на далоні.

Сонейка пачало прыграваць, бялюткі снег зіхацеў у яго промнях, але Спяпана надзейна ўратоўвалі ад горнай слепаты чорныя акуляры. Пляцоўка была да таго раўнюткай, што на яе мог запраста прызямліцца нават верталёт.

Нядоўга раздумваючы, ён пачаў рыдлёўкай расчышчаць снег. На шчасце, яго тут было не больш за палову метра. Пасля намеціў будучую магілку і пачаў рукамі адкідваць кавалкі серпанціну.

Сцяпан з непрывычкі ажно ўспацеў, але праз якую гадзіну яму ўдалося ўглыбіцца амаль па калена. А тут і Віця падаспеў. Прынёс падрыўную машынку, катушку са званковым провадам і некалькі пачак аманіту. Моўчкі ўзяліся за ломікі і пачалі дзяўбсці буркі. За дзень зрабілі тры адпалкі, і глыбіня магілкі дасягнула аднаго метра.

Гэтага было малавата. І толькі праз два дні магілка была гатова. У Сцяпана на руках нават

з'явіліся мазалі. А ў Віці яшчэ горш – уся далонь правай рукі была ў вадзяных пухірах. Але ён іх адразу ж пракалоў, а пасля перабінтаваў.

Цяпер Сцяпан узяўся майстраваць дамавіну. Ніколі гэтым не даводзілася займацца, але ж не класці нябожчыка проста так, гэта было б не пахрысціянску.

Дошкі былі. Праўда, не габляваныя, у асноўным гарбылі, але сярод іх можна было сёе-тое выбраць. За цвікамі таксама затрымкі не было – цэлая скрынка стаяла ў тамбуры Сцяпанавага балка.

Здавалася – нічога складанага, а цэлы дзень давялося яму правалэндацца над дамавінаю. І што цікава – даволі зграбная атрымалася. А яшчэ ж трэба было і сваёй працай займацца: апісваць і прымаць шурфы, весці ўлік выбухоўкі. Але ён спраўляўся, бо вясна, хаця і нясмела, але грукала ў дзверы.

А яна ж, гэтая ганарыстая прыгажуня, несла Спяпану двайную радасць: доўгачаканую цяплынь і вольніцу. Пройдзе колькі часу і ён убачыць урэшце сваю старэнькую маці і родныя мясціны. Адзіная думка пра ўсё гэта ўзнімала яго настрой, прыдавала сілы, ён працаваў без перадыху.

Урэшце на наступны дзень прыцягнуў ён на санках дамавіну да таго месца, дзе быў прыкапаны ў снезе нябожчык.

Сцяпан не адразу пачаў яго адкопваць, а спачатку прысеў на сані і вырашыў крыху адпачыць, бо адчуваў сябе ніякавата... Не, вялікага страху не было, але ўсё-такі нябожчык. Напэўна ж, быў зняволеным і загінуў ад хваробы, а мо і суседзі па нарах забілі за які сухарык.

Сцяпану было шкада гэтага незнаёмца. Але ён адчуваў, што Усявышні паслаў таго нездарма. Інтуіцыя падказвала, што павінен быць працяг у гэтай трагічнай гісторыі, але які?

Сонейка між тым падымалася ўсё вышэй і прыпякала як мае быць. Каб не гэтае пахаванне, то Сцяпан абавязкова пазагараў бы, такі дзянёк грэх было ўпускаць, але ж трэба было давесці гэтую справу да канца.

Ён падняўся з санак, узяў у рукі рыдлёўку, зірнуў на зіхацеўшыя ад сонечных промняў вяршыні сопак і пачаў паволі адкідваць снег, які паспеў ужо даволі добра схапіцца марозцам.

Неўзабаве рыдлёўка шарганула па краі ледзяной труны. Тады ён з вялікай асцярогаю працягваў адкідваць снег. І тут Сцяпан убачыў, што замнога льду вакол цела нябожчыка. Нават на вока было відаць, што ў ягоную дамавіну той не ўлезе. Тады ён узяў у рукі кайло і пачаў адбіваць лёд з абодвух бакоў.

Асабліва многа льду было на ягоным жываце. Тады Сцяпан прыцэліўся і даволі ўдала, з аднаго ўдару знёс вялікую ледзяную глыбу. Яму нават падалося, што мерцвяку стала намнога лягчэй.

Сцяпан хацеў яшчэ ўдарыць ля самых ног, але заўважыў бліскучую металічную спражку, якая была пад той ледзяной глыбай. Дзяга на штанах спарахнела, а вось спражка была як новенькая. Ён зняў акуляры і, нахіліўшыся, убачыў, што на ёй штосьці напісана, толькі цяжка было разабраць.

Гэтая акалічнасць яго зацікавіла, і ён пачаў акуратна вызваляць спражку з ледзянога палону. І праз якую хвіліну ўжо трымаў у сваіх руках. Яна была падобна на трохвугольнік, два бакі якога мелі зубрыстую форму і нагадвалі крылы арла. А ў кожнай такой хвалепадобнай зазубрынцы былі ўмела ўстаўленыя чырвоныя слюдзяныя кружочкі. Пасярэдзіне спражкі было надзейна прымацавана сэрца з белай слюды, якое пранізвала страла, прачэрчаная па нержавейнай сталі, з якой і была зроблена спражка.

Ён не стаў далей разглядваць надпіс, а хуценька паклаў спражку ў кішэню, бо ўбачыў, што да яго шыбуе падрыўнік Віця. Калі той падышоў, Сцяпан сказаў:

– Добра, што ты якраз падаспеў. Аднаму мне не пакласці яго ў дамавіну.

Пасля Сцяпан яшчэ крыху паадбіваў лёд, змераў рыдлёўкаю шырыню нябожчыка, даўжыню, прыкінуў на дамавіне – тая павінна была яго прыняць. І яны тут жа асцярожна паклалі яго ў

дамавіну. Спяпан зрабіў яе шырокай, так што падкурчаная нага ніколечкі не перашкаджала закрыць зверху века.

Тут ім адразу ж палягчэла на душы, Сцяпан дастаў з торбачкі цвікі, малаток і пачаў прыбіваць века. Пасля яны прывязалі дамавіну вяроўкамі да санак. Цяпер заставалася толькі зацягнуць яе да магілкі.

– Думаю, што ўдвух нам не падняцца на такую верхатуру, – пачэсваючы патыліцу, сказаў Віця.

– Яно так, – згадзіўся Сцяпан. Але, зірнуўшы ў вярхоўе ручая, з радасцю ўскрыкнуў:

– Вось і дапамога да нас спяшае.

І сапраўды, праз якую хвіліну да іх падышлі Валянцін і Міхаіл Пятровіч, бо паспелі забурыцца ды ішлі на абед.

– А хто адпяваць будзе? – спытаў Валянцін. – Без бацюшкі хаваць нельга, – ён усміхнуўся.

– Я буду, – адказаў Сцяпан. – А пакуль давайце зацягнем дамавіну на месца.

Яны з Віцем упрагліся спераду, ухапіўшыся за вяроўку, а Валянцін з Міхаілам Пятровічам узяліся падпіхваць ззаду.

Санкі лёгка скрануліся з месца і паехалі па добра ўтрамбаваным снезе. Яны хутка дабраліся да выступу скалы, за якой давялося ім павалтузіцца, бо пад'ём стаў крутаватым, ногі слізгалі, але выручалі пачарнелыя выступы серпанціну, які да таго ўмёрз у снег, што можна было смела станавіцца на яго нагою ды прасоўвацца далей. На гэтых скальных выступах яны адпачывалі, а пасля зноў вышэй падымаліся з дамавінаю.

Урэшце выехалі на пляцоўку і пад'ехалі да магілкі. Замарыліся ўсе, асабліва спацеў Міхаіл Пятровіч. Але яны не сталі адпачываць, а хуценька знялі дамавіну з санак. Пасля падсунулі пад яе дзве вяроўкі, прыпаднялі дамавіну і асцярожна апусцілі ў магілу.

Сцяпан першы кінуў на яе добрую жменю серпанцінавага пяску.

– Спі спакойна, шаноўны незнаёмец. Няхай пературорыцца для цябе гэтая векавая мерзлата ў пух, – ціха прамовіў Сцяпан.

Пасля гэтага ўсе пачалі закапваць магілку. Зямліцы тут не было, давялося засыпаць серпанцінавымі асколкамі. Спыніліся толькі тады, калі над пляцоўкаю ўзняўся магільны пагорак.

Крыху моўчкі пастаялі, а пасля паклалі інструмент на санкі, увязалі вяроўкай і адправіліся да сваіх балкоў.

Сцяпан, не спяшаючыся, паабедаў, пасля дастаў з кішэні спражку, прамыў яе ў бензіне і пачаў уважліва разглядаць. На спражцы дробнымі літарамі было напісана: "Кіеў. Дарафееў Іван Антонавіч. 1900 г."

Больш надпісаў не было. Ён паклаў спражку ў стол і заняўся запаўненнем палявых кніжак. Пасля вячэры ўлёгся ў ложак і пагасіў лямпу.

Сцяпан часта любіў вось так паляжаць у цемры і падумаць пра што-небудзь. Але так было раней. Цяпер яго думкі лунал вакол Івана Дарафеева, які мог жыць нават цяпер, бо яму споўнілася б толькі семдзесят тры гады. А ў яго ж, напэўна, і родзічы засталіся. І дзеці, калі толькі былі, то даўно павырасталі. Магчыма, што ёсць і ўнукі. І не ведаюць яны, дзе магілка іхняга дзеда. І колькі гадоў ён праляжаў у гэтым шурфе?

І кім ён быў да зняволення? Мо ўрачом, настаўнікам, калгаснікам. Урэшце – гэта не так і важна. Але за што трапіў за краты?

Сцяпан ведаў, што лагеры зняволеных існавалі на Чукотцы да 1960 года. А з'явіліся яны тут упершыню ў самым пачатку вайны.

Працы ім хапала: будавалі дарогі ад марскога порта да кар'ераў і капальняў, удзельнічалі ў здабычы карысных выкапняў, працавалі нават у геолагаў. Умовы былі тут страшэннымі: у кароткае лета заядалі іх камары, а ў доўгую палярную ноч наскрозь пранізвалі вятрыскі з марозцам. А харчаванне было такое, што і маладыя не ўсе выжывалі.

І тут у Сцяпана мільганула думка: паспрабаваць знайсці ў далёкім Кіеве родзічаў Івана Дарафеева. А што? Магчыма, нават і ў адрасным бюро падкажуць дом і кватэру, дзе ён раней пражываў. Бо не магло такога быць, каб нікога ў яго не было.

Гэтая думка ўзрадавала Сцяпана, і ён моцна заснуў. Назаўтра, як толькі паснедаў, адразу ж узяўся майстраваць крыж на магілку. І матэрыял добры знайшоўся – былі завезеныя брусы з сібірскай лістоўніцы для ўмацавання вусця шурфоў пры сушанцах.

Справа на дзіва пайшла хутка, і дзесьці праз дзве гадзіны крыж быў гатовы. Праўда, атрымаўся крыху цяжкаваты, але ж затое і пастаяць павінен не адзін дзесятак гадоў. Захацелася яму зрабіць і невялічкі надпіс. Якраз знайшоў запасную фортку ад акенца ў балку. Выразаў па яе памерах кусок фанеры са скрынкі з-пад сухой бульбы і напісаў: "Тут пахаваны Дарафееў Іван Антонавіч. Год нар. 1900".

Давялося яшчэ зрабіць урэзку ў крыжы, куды надзейна змясцілася зашклёная фортка з фанерай.

Паабедаўшы, Сцяпан з Віцем адвезлі крыж на магілку. І як толькі яго ўстанавілі, то адразу ж яна папрыгажэла, а сам крыж быў бачны здалёк, нават ад парога Сцяпанавага балка. Асабліва прыкметна ён выглядаў пад самы вечар, пры заходзе сонца. А калі насоўваліся прыцемкі, то часам здавалася, што ён завіс над вяршынямі сопак.

Цяпер толькі пра адно шкадаваў Сцяпан: што не было ў яго фарбы, каб пафарбаваць крыж, тады ён прастаяў бы ўдвая больш. І нездарма ён так спяшаўся з пахаваннем, бо праз дзень прыбылі два трактары, якія прыцягнулі прамывалку. Прыехаў і сам начальнік, ды яшчэ так падгадаў, што ў той дзень скончылі яны праходку шурфоў на ручаі. За вячэрай Андрэй Іванавіч сказаў:

– Апошняя да цябе просьба, Сцёпа. Дапамажы прамыць шурфы на ручаі, бо калі ўдарыць цяплынь, то змые ўвесь грунт.

– А куды падзеліся нашы прамывальшчыкі?

– Яны заўтра павінны прыехаць з суседняга ўчастка і будуць працаваць у тваёй даліне, а вось твой “Каварны” прамыць не паспеюць. Прамывалку я ў геолагаў узяў, яна новенькая, люба працаваць. Даводчыкам у цябе будзе Кузьма, ён з латком абыходзіцца ўмее.

– Так я ніколі не выберуся з Чукоткі, – сказаў Сцяпан і ўздыхнуў.

– Слова даю – у пачатку ліпеня будзеш вольны як птаха. А з шурфоўшчыкамі я дамовіўся – будуць атрымліваць заробак па зімовых расцэнках. Трэба толькі паспець, бо ручай вынасны, тут багата павінна быць касітэрыту. Заўтра і пачынайце. Харчы я прывёз, а гарэлку пасля, як скончыце прамыўку.

З самага ранку, калі яшчэ прыцемкі і не думалі саступаць месца чарговаму сонечнаму дню, начальнік з'ехаў на базу. Прамыўку пачалі ў той жа дзень. Тут шурфоўшчыкам была лафа, бо значна лягчэй стала працаваць. Але ж затое Сцяпану турбот прыбавілася – трэба было пастаянна знаходзіцца на прамывалцы, кантраляваць, колькі грунту браць з той ці іншай праходкі, падпісваць пакецікі, у якіх былі пробы з металам.

Ручай “Каварны” і сапраўды аказаўся багацеем: столькі касітэрыту з адной праходкі Сцяпану яшчэ не даводзілася бачыць. Ён прыкінуў на вока – атрымлівалася дзесьці па шэсцьсот грамаў з аднаго кубічнага метра грунту. Старацелі тут змогуць адным прашывачным прыборам выканаць гадавы план.

Непрыкметна ўсе ўцягнуліся ў новую працу, і справа пайшла да таго хутка, што Сцяпан ледзь паспяваў афармляць дакументацыю.

А тут яшчэ ў другой палове мая ўдарыла ўрэшце сапраўдная цяплынь. Працавалі без перадыху па пятнаццаць гадзін, бо ўсе разумелі – вось-вось можа так адпусціць, што пабягуць сапраўдныя ручаі з сопак.

Пачынаюць непрыкметна збірацца з малюсенькіх ручаінак і паціху прасочваюцца між

серпанціну, збягаючы ў даліну. Але так вольна яны сябе адчуваюць толькі ў самы поўдзень, калі добра прыпякае сонейка. Пад вечар запавольваюць свой бег, а пасля і зусім заміраюць, бо марозік яшчэ прыціскае і ноччу ваўсю гаспадарыць у тундры. Але ў паветры ўжо лунае вясна. Кожны дзень былі чутны крыкі канадскіх гусей, якія спяшаліся заняць найлепшыя месцы ды пачаць адкладваць яйкі.

Начальнік цяпер тры разы на дзень выходзіў на сувязь і цікавіўся, як ідзе прамыўка. Сцяпан добра разумеў, што да сапраўднай паводкі яны запраста "Каварны" прамыюць, але ж душою адчуваў, што давядзецца яшчэ і ў даліне папрацаваць.

Так яно і здарылася: начальнік па рацыі аддаў загад працягваць прамыўку ў даліне. Дый сам Сцяпан разумеў, што трэба дапамагчы сваім прамывальшчыкам, якія толькі ўчора пачалі працаваць у іхняй даліне.

Сцяпанава брыгада пачала прамыўку рэчышчавых шурфоў з самага вярхоўя даліны. Урэшце і сам начальнік прыімчаў на ўсюдыходзе. Прывёз дзве скрынкі гарэлкі і дзесяць піва. Гарэлку адразу ж прыхавалі, а піва выдалі па тры скрынкі на кожную брыгаду. Узрадавала Сцяпана яшчэ і тое, што начальнік прывёз на ягоную просьбу і фарбу чырвонага колеру.

Цяпер Андрэй Іванавіч з тундры не выязджаў, а сноўдаў ад адной прамывалкі да іншай, бо вельмі хваляваўся, каб паспець усё прамыць да вялікай вады.

Да таго ж ён быў яшчэ заўзятым фотааматарам. Здымкі ў яго атрымліваліся як у сапраўднага майстра. Меў дзве асабістыя выставы сваіх работ, адна з якіх была ў самім Магадане. Ягоныя здымкі даволі часта змяшчаў на сваіх старонках часопіс "Вакол свету". Грэх было не скарыстаць такі выпадак.

І аднойчы, калі перацягвалі прамывалку на іншае месца, Сцяпан пабываў з начальнікам ля магілкі.

Крыж быў пафарбаваны і ажно зіхацеў на сонейку. Андрэй Іванавіч спачатку зняў адну палку на фоне вяршынь двух сопак, а пасля шчоўкнуў і Сцяпана, які стаяў побач з крыжом.

Тым часам непрыкметна, як гэта заўсёды бывае ў прыродзе, насоўваўся ў тундру палярны дзень. Бо раз тут такое кароткае і халоднае лета, то прырода вырашыла ноч ліквідаваць, каб людзі, расліны і жывёльны свет маглі нацешыцца сонечнымі промнямі.

Летам, асабліва ў ліпені, тут здараліся даволі спякотныя дзянёчкі, але ж распрануцца было нельга, бо заядалі камары. Праўда, ля самага ўзбярэжжа акіяна камары трымаліся ўсяго з які месяц, бо тут іх адганяў прахалодны вецярок, якога яны не пераносяць. А вось калі ад'ехаць кіламетраў на пяцьдзесят, то там яны надакучваюць месяцы два, а то і больш.

Урэшце наступіў той доўгачаканы дзень, калі дзве прамывалкі стаялі побач – прамыўка руславых шурфоў была скончана. Адразу ж кожная брыгада атрымала сваю долю гарэлкі, піва, і ўсе пачалі замачваць заканчэнне шурфовачнага сезона.

Сам начальнік крыху дзербалызнуў, а пасля падаўся на ўсюдыходзе на базу, бо трэба было тэрмінова высылаць у тундру два трактары: адзін з санямі, для перавозкі рэшткаў аманіту, а другі з невялічкім балком – для перавозкі людзей.

Брыгада прамывальшчыкаў заставалася тут на ўсё лета, а Сцяпанавы шурфоўшчыкі выязджалі на базу.

Міхаіл Пятровіч збіраўся звальняцца, Валянцін з Аляксеем адпраўляліся па пуцёўцы ў Сочы, а Кузьма з Віцем заставаліся для рамонту балкоў, бо летась сваё адгулялі.

Два дні прагудзелі, а на трэці апахмяляліся халодным піўком. А тут якраз і паводка пачалася. Даліну было не пазнаць – імгненна ператварылася ў сапраўдную раку, перайсці якую было немагчыма. Навокал круглыя суткі стаяў, з кожнай гадзінай узмацняючыся, пастаянны гул ад збягаючай па серпанціне вады.

Свой балок з рацыяй Сцяпан перадаў майстру з прамывалкі. Цяпер ён упакоўваў папкі з дакументацыяй, а рукзак быў ужо даўно падрыхтаваны ў дарогу.

Толькі на чацвёрты дзень дабраліся да іх трактары з базы. Спачатку пагрузілі скрынкі з выбухоўкай. Сцяпан сам іх акуратна ўхутаў брызентам і надзейна замацаваў вяроўкамі. Гэты трактар ён вырашыў пусціць першым, а сам сеў у кабіну да Генкі, які павінен быў везці шурфоўшчыкаў.

Генка быў, як і заўсёды, вясёлы і пад “мухай”. Прывёз ён і па бутэльцы шурфоўшчыкам. Тыя да таго ўзрадаваліся, што ледзь яго не расцалавалі, бо піва даўно выпілі.

Добра яшчэ, што ў балку былі матрацы. Шурфоўшчыкі ледзь ногі перастаўлялі, і Сцяпан з Генкам дапамаглі ім пазаносіць свае клункі, а пасля і саміх з цяжкасцю пазапіхвалі ў балок ды закрылі дзверы на замок, каб не павывальваліся на перавале.

Перад самым ад’ездам Сцяпан зняў з галавы шапку, зірнуў у апошні раз на вяршыні сопак, на крыж, бо ўсё-ткі чагосьці зашчымела сэрца, а пасля махнуў рукою – і першы трактар рушыў у дарогу. Ён хутка ўзабраўся ў кабіну, і Генка тут жа рвануў трактар з месца.

Да акіяна дабраліся без асаблівых прыгод, а першы прыпынак зрабілі праз пяць гадзін. Сцяпан адкрыў дзверы балка, але шурфоўшчыкі ляжалі пластом, і толькі ў другі раз, калі да базы заставалася не больш за пяцьдзесят кіламетраў, яны як ачмурэлыя павыскаквалі з балка, ды не адразу ўцямілі, дзе знаходзяцца.

Дабраліся хутка. Галава ў Сцяпана раскалвалася ад надакучлівага гулу рухавіка і вельмі хацелася спаць, але давялося адразу ж адвезці выбухоўку на склад, які быў за тры кіламетры ад базы.

Пасля ўдалося крыху здрамнуць у інтэрнаце, але сон не вельмі і браў, бо хацелася хутчэй адсюль з’ехаць. У аддзеле кадраў атрымаў бегунок, усіх абышоў, атрымаў працоўную кніжку, і раніцай

наступнага дня начальнік кар'ера падкінуў яго на сваім "бобіку" ў Певек. Тут давялося цэлы тыдзень прагуляць, бо зняцца з пашпартнага ўліку не так проста – усё-ткі прыгранічная зона.

Дый з білетам на самалёт у пачатку чэрвеня на Чукотцы вялікая праблема. Каб не галоўны інжынер камбіната, то давялося б Сцяпану тут яшчэ тыдні тры пазагараць, бо чарга па білеты вялікая – за месяц трэба рабіць заяўку.

Супакоіўся Сцяпан толькі ў мяккім крэсле самалёта. Праз дзевяць гадзін ён быў ужо ў Маскве, а тут і да Мінска рукою падаць. У Маскве купіў маці вялікую каляровую хустку, каробку цукерак, арэхаў і яблыкаў.

Цягніком дабраўся да Мінска, пасля электрычкай да Маладзечна, а там на прыгарадны – і праз сорак хвілін ён убачыў знаёмыя высачэзныя таполі на іхняй станцыі. Тут калісьці гуляў у футбол з аднакласнікамі, бегаў у клуб на танцы.

Знаёмай сцяжынкаю шыбаваў ён у сваю вёсачку. Бярозкі даўно ўбраліся ў зялёнае лісце і з цікавасцю пазіралі на барадатага незнаёмца з рукзаком. Адна з іх, смялейшая за іншыя, нават дакранулася сваёй маладой і гнуткай рукою-галінкаю да ягонай шчакі. Ён спыніўся, нават пачырванеў, бо яму падалося, быццам бярозка першая падаравала яму свой пацалунак.

Сосны ўперамежку з дубамі і бярозкамі падступалі да самай рэчкі. І калі Сцяпан выскачыў на пагорак, то адразу ж убачыў царкву. Спыніўся, зняў з плячэй рукзак і перахрысціўся. Пазалочаны купал царквы пабліскваў у нябеснай сіні...

Вось і старэнькая кладачка цераз рэчку, яшчэ спраўна служыць людзям, не згніла. Прыбавіў крыху ходу і ўбачыў у агародчыку сваю маці. Яна палола грады, але калі падалі голас веснічкі, паднялася з каленяў, зірнула ў ягоны бок і заспяшалася насустрач.

– Сыночак мой залаты! – яна падбегла да Сцяпана і моцна прыціснулася да ягоных грудзей. – Я так рада, што ты вярнуўся! Тут дзень і ноч за цябе

малілася, ставіла свечкі ў царкве за тваё здароўе. Дзякуй Богу высокаму, што збярог цябе! Больш не паедзеш?

– Нікуды не паеду. Адпачынак у мяне шасцімесячны з наступным звальненнем. Пазагараю, накашу сена, а там і працу буду шукаць.

– Вось і добра. Пойдзем у хату, буду цябе частаваць.

Смачнымі падаліся Сцяпану матуліны стравы. Быў тут ягоны любімы гарохавы булён, аладкі з катлетамі, марынаваныя рыжыкі. Гадзіны дзве яны размаўлялі, а пасля маці заслала ягоны ложак ля акна, і ён адразу ж заснуў.

Прачнуўся толькі калі ўжо добра звечарэла. Хуценька апрануўся, выйшаў на двор і ўбачыў маці, якая несла дровы да пліты.

– Праспаў, – з расчараваннем у голасе прамовіў Сцяпан, – а хацеў дапамагчы табе.

– Або! – маці ўсміхнулася. – Я ўжо даўно ўсё парабіла. А з дарогі трэба добра адаспацца. І заўтра адпачывай, бо якраз святая нядзелька, маліцца будуць у царкве.

– Вось і добра! Сходзім з табою, – адказаў Сцяпан.

– Абавязкова. У такой ледзяной пустэчы цябе Бог уратаваў, што проста ў мяне няма слоў, каб Яму аддзячыць, – адказала маці.

І пацяклі-пабеглі цёплыя чэрвеньскія адпускныя Сцяпанавы дзянёчкі. Спраў у яго хапала: рамантаваў плот, навёў парадак у хлеўчуку і падпаветцы. Шкадаваў толькі, што прадала маці летась кароўку, але ж адной з ёй было не ўправіцца. Трымала бязрогую казу. Тая давала ўлетку да пяці літраў малака.

Амаль кожны дзень Сцяпан знаходзіў вольную гадзіну і ездзіў на ровары да Вяллі. Там можна было ўдосталь паплаваць, бо побач было возера, якое ўтварылі земснарады сілікатнага камбіната.

Вада была халаднаватая, але ён не звяртаў на гэта ўвагі, бо на Чукотцы тры гады не плаваў.

Так мінуў тыдзень, пачаўся другі, і Сцяпан усё часцей думаў пра тое, каб пад'ехаць у Кіеў. Усё абдумваў вечарамі, як там пачаць пошукі. Маці першая ўлавіла змену ў ягоным настроі і аднойчы пасля вячэры спытала:

– Ці не хочаш ты куды з'ездзіць? Мо дзяўчыну займеў, то кажы, не саромся...

– Якая там дзяўчына! – Сцяпан усміхнуўся. – А вось у Кіеў і сапраўды трэба пад'ехаць.

Ён з якую хвіліну моўчкі глядзеў на маці, а пасля расказаў пра Івана Дарафеева, паказаў спражку і тры фотакарткі.

– Абавязкова пабывай у Кіеве. Бог не здарма даручыў табе гэтую святую справу. Думаю, што хтосьці з ягонай радні абавязкова адгукнецца. Вось толькі жыць яны могуць і не ў Кіеве, – прамовіла маці і ўздыхнула.

– Але ж пошукі трэба пачынаць з Кіева, так? А пасля ўжо буду прыдумваць розныя варыянты.

– Няхай бы ўжо і вуліца была напісана на гэтай спражцы.

– Тады знайсці было б лёгка! – ускрыкнуў Сцяпан. – Але і гэтых звестак дастаткова.

Размаўлялі яны яшчэ доўга і ўрэшце сышліся на тым, што адкладваць такую справу нельга – трэба заўтра ж збірацца ў дарогу.

Сцяпана ўзрадавала тое, што маці адразу ж падтрымала яго ў пошуках сваякоў Івана Дарафеева. А гэта быў добры знак.

## Частка дзевятая

У сем раніцы наступнага дня ён прыгарадным прыехаў у Маладзечна, а там без праблем купіў білет на цягнік "Рыга-Сімферопаль".

Калі прыехаў у Кіеў, то яго страшыла адзіная думка: ці знойдзецца месца ў гасцініцы, бо ўсё-такі першы летні месяц быў на зыходзе. На знакамітым Крашчаціку ўбачыў урэшце шматпавярховую гасцініцу і вырашыў зайсці.

І, на ягонае шчасце, жанчына-адміністратар, размаляваная, быццам тая лялька, з усмешкай прамовіла:

– Магу прапанаваць толькі аднамесны люкс.

Сцяпан адразу ж згадзіўся. Вырашыў пакуль спыніцца на тыдзень, а там будзе відаць. Праўда, і цана была кусачая, але пакуль Сцяпан лічыў сябе багацеем: зарабіў на Чукотцы на легкавушку, хаця і купляць яе не збіраўся.

Уладкаваўшыся ў нумары, ён не стаў адпачываць, а адразу ж падаўся на вакзал, дзе прыкмеціў яшчэ з раніцы адраснае бюро даведак. Там заказ прынялі, але прапанавалі з гадзінку пагуляць. У прывакзальным буфеце ён паабедаў, пасля купіў некалькі мясцовых газет і прысеў на лаўку ў скверыку. Гадзіна праляцела непрыкметна.

І калі ён з хваляваннем падаў у маленькае акенца квіток, то жанчына ў акулярах доўга корпалася ў стосе паперак, пасля падала яму адну і сказала:

– Такі ў нас не пражывае.

– Ён і не можа пражываць, бо памёр, але я хачу родзічаў ягоных знайсці, – скарагаворкай прамовіў Сцяпан.

– Памерлых выдаем хатнія адрасы толькі на працягу пяці гадоў з дня смерці.

Што тут скажаш? Сцяпан уздыхнуў і адправіўся ў гасцініцу. Пакуль прыняў душ, тое ды сёе, то і вечар наступіў. Ён улёгся ў ложак і пачаў абдумваць план дзеянняў на заўтрашні дзень.

Звяртацца ў камітэт дзяржаўнай бяспекі яму не хацелася. Дый што там маглі сказаць? Ён яшчэ добра памятаў, як яго самога дапытвалі ў Ленінградзе коратка падстрыжаныя малайцы.

Вырашыў перад сном пачытаць купленыя газеты. Разгарнуў “Вячэрні Кіеў”, а там аб’яў больш за палову старонкі. Чаго тут толькі не было! Адзін віншаваў сваю маці з днём нараджэння, другі згубіў нямецкую аўчарку, трэці прапаноўваў свае паслугі ў якасці рэпетытара па французскай мове. Былі сярод аб’яў і такія, што адразу ж кідаліся ў вочы, бо надрукаваны вялікімі літарамі.

Ён адразу ж пачаў складваць сваю аб'яву. Урэшце спыніўся на такім варыянце: "Прашу адгукнуцца родзічаў Дарафеева Івана Антонавіча, 1900 года нараджэння. Звяртацца ў гасцініцу "Дняпро", пакой нумар семдзесят пяць. Спытаць Сцяпана Артамонава".

І адразу ж адчуў на душы палёгку. Бо гэта быў шанц, ды яшчэ які. Вось толькі надрукавалі б аб'яву больш выразна, а грошай ён не пашкадуе. Са спадзяваннем на ўдачу ён і заснуў сном праведніка.

Прачнуўся а сёмай гадзіне, адразу ж пагаліўся ды адправіўся ў горад. Паабедаў у звычайнай сталоўцы і кінуўся на пошукі рэдакцыі газеты. Добрыя дзве гадзіны патраціў, але дарэмна спяшаўся – супрацоўнікі збіраліся толькі ў адзінаццаць, давялося нават крыху пачакаць.

У аддзеле рэкламы працаваў малады і даволі сімпатычны хлопец. Сцяпан павітаўся і паклаў яму на стол сваю паперку з аб'явай. Той моўчкі прачытаў, а пасля прамовіў:

– Ну што ж, дзесьці так праз тыдзень надрукуем.

– А хутчэй нельга? Я прыезджы, так доўга чакаць...

– Можам і ў заўтрашні нумар даць, але ж кошт аплаты ўзрасце, – адказаў хлопец і ўсміхнуўся.

– Я заплачу. Але каб большымі літарамі, як вось тут... – ён спехам разгарнуў учарашнюю газету і паклаў на стол.

– Можам даць яшчэ выразней, але гэта абыдзецца вам... – тут хлопец хуценька падлічыў словы ў аб'яве, а пасля дадаў: – Семдзесят пяць рублёў, згодны?

– А дзе плаціць?

– У касу. Яна ў канцы калідора, – адказаў хлопец.

Ля самых дзвярэй Сцяпан на хвіліну затрымаўся, а пасля спытаў:

– Значыць, у заўтрашнім нумары аб'ява з'явіцца?

– Абавязкова! Дадзім у найлепшым выглядзе, не сумнявайцеся, я сам рыхтую гэтую старонку.

Сцяпан развітаўся і выйшаў з кабінета. Заплаціў грошы ў касе і адправіўся ў горад. Паблукаў крыху па крамах, схадзіў у кіно, а пасля вырашыў, як у той тундры, запасціся харчам на дзень-другі, каб пасля ўвесь час знаходзіцца ў нумары.

Пад вечар купіў хлеба, каўбасы, напітку, пяць бляшанак печані траскі і кілаграм сушак. Цяпер трэба было набрацца цярпення і чакаць.

У наступны дзень ён купіў "Вячорку" толькі дзесьці пасля поўдня. Адразу ж з хваляваннем зірнуў на апошнюю старонку, але там сваёй аб'явы не знайшоў. Ён яшчэ раз больш уважліва прачытаў – дарэмныя клопаты. Ад хвалявання ў Сцяпана нават лоб спацеў. Вось табе і на! Тады мельгам зірнуў на першую старонку і аслупянеў: ягоная аб'ява была там!

Праўда, надрукавана ў другой палове старонкі, але ж затое якімі выразнымі літарамі. Словы адразу кідаліся ў вочы чытачу. І да таго ж сама аб'ява была ў фігурнай рамцы з мудрагелістымі завіткамі. Лепш і прыдумаць было немагчыма. Не падвёў хлопец – малайчына!

На ўсялякі выпадак Сцяпан купіў яшчэ адну газету, а пасля адразу ж падаўся ў свой нумар. Вечар вялікі, мо хтосьці і заявіцца.

Хаця, калі чэсна прызнацца, то дзесьці ў глыбіні душы ён адчуваў, што на сёння марныя ягоныя спадзяванні на сустрэчу. А вось заўтра...

Ноччу некалькі разоў прачынаўся, а пасля не вытрымаў і падхапіўся а шостай гадзіне раніцы. Адразу ж пагаліўся, а пасля ўзяўся за ўборку, бо прыбіральшчыца прыходзіла толькі ў гадзін адзінаццаць, а то і пазней. За якую гадзіну Сцяпан навёў у нумары ідэальны марафет. Пасля прыняў душ, апрануў бялюткую новую тэніску і пачаў чакаць.

Але мінула гадзіна, другая, а да яго так ніхто і не завітаў, нават прыбіральшчыца кудысьці знікла.

Добра яшчэ, што ў яго быў з сабою нумар “Вожыка”, які прыдбаў у Маладзечне. Пакуль прачытаў, то і абед падаспеў.

Як ні мацаваўся Сцяпан, але дзесьці а палове трэцяй так захацелася есці, што ён не вытрымаў і адкрыў бляшанку траскі, бо каўбаса надакучыла. Уплёў тую ў адно імгненне, хацеў нават узяцца за другую, але стрымаўся, бо яго яшчэ чакалі сушкі з напіткам.

Што ні кажы, а настрой у яго ўзняўся. Нядрэнна было б цяпер здрамнуць, але ж ён на пасту, як той салдат.

Так Сцяпан нікога і не дачакаўся. У дзесяць вечара падсілкаваўся двума скрылёчкамі каўбасы і адразу ж заваліўся ў ложак.

Падняўся раніцай з неахвотаю, бо не было настрою. Дый адкуль яму ўзяцца? Сцяпан пачаў разумець, што шанцы ягоныя з кожным днём змяншаюцца. Гэта і не дзіўна, бо Іван Дарафееў мог у свой час толькі вучыцца ў Кіеве, а ўсе родзічы жывуць дзесьці на Урале або ў такой глухамані, што век не знойдзеш.

Дый ці былі яны ў яго? Але ён вырашыў прабыць тыдзень да канца. Паабедаць вырашыў у рэстаране, каб урэшце падсілкавацца як след. Каўбаса надакучыла, а на печань траскі не мог нават і глядзець.

І толькі скончыў пералічваць грошы ў кашальку, як у дзверы ледзь чутна пастукалі. Ён яшчэ падумаў, што гэта не да яго, але тут забарабанілі гучней.

– Заходзьце! – голасна прамовіў ён і падняўся з крэсла.

Дзверы адчыніліся, і Спяпан убачыў на парозе маладую дзяўчыну. Яе чорныя валасы былі перахопленыя блакітнай стужкаю і хаваліся дзесьці за плячыма. Была яна ў лёгкай бялюткай сукенцы, уся такая загарэлая і да таго прыгожая, што Сцяпан глядзеў на незнаёмку, як на якое цуда.

Шчокі дзяўчыны пачырванелі, лёгкі сполах быў на яе твары, а вочы запытальна пазіралі на Сцяпана.

– Дзень добры! – урэшце прамовіла яна.

– Вітаю вас! – адказаў Сцяпан.

– Я па аб'яве, – ціха прамовіла дзяўчына, – а вы Сцёпа Артамонаў?

– Так, гэта я! – з весялосцю ў голасе адказаў ён, бо толькі цяпер да яго дайшло, што ўрэшце ягоныя пошукі далі вынік.

– Вы праходзьце, сядайце, – запрасіў ён яе да стала. Але дзяўчына не адыходзіла ад дзвярэй.

– Іван Дарафееў мой дзед. Вы штосьці пра яго ведаеце? – яе вочы з надзеяй пазіралі на Сцяпана.

– Так. Ды вы не бойцеся, прысаджвайцеся, я зараз вам усё раскажу.

– Ведаеце... Там, у нашай кватэры, засталася мая бабуля, ягоная жонка. Яна загадала, каб я прывезла вас да яе. Яна вельмі хвалюецца. Я яшчэ ўчора прыехала б, але здавала вельмі цяжкі апошні экзамен.

– З вамі я згодзен хоць на бязлюдны востраў, – з весялосцю ў голасе прамовіў Сцяпан. Але ўбачыўшы, што дзяўчыне не да жартаў, адразу ж змоўк. Ён кінуў на яе вінаваты позірк, а пасля ціха прамовіў:

– Прабачце. Проста я доўга быў у тундры, а там дзяўчат не было...

– Што вы?! – са здзіўленнем прамовіла дзяўчына, і лёгкая ўсмешка з'явілася на яе твары.

Тут Сцяпан крыху асмялеў і спытаў:

– А як вас завуць?

– Галя, – адказала дзяўчына і сарамліва ўсміхнулася.

– Тады паехалі.

Яны выйшлі з нумара. Сцяпан замкнуў дзверы.

– І далёка нам ехаць?

– Калі аўтобусам, то хвілін сорак,

– Махнём на таксі, – прапанаваў Сцяпан. – Тым больш, што машын навалам.

Галя адразу ж згадзілася. Яны селі ў чорную "Волгу". Галя назвала адрас, і хударлявы таксіст з пасівелымі скронямі моўчкі плаўна крануў машыну з месца.

Даехалі хвілін за дваццаць, дом быў вялізны, са шматлікімі пад'ездамі. Падняліся ў ліфце на сёмы паверх.

Галя хуценька адчыніла дзверы, і яны зайшлі ў кватэру. Не паспеў Сцяпан у прыхожай зняць басаножкі, як з суседняга пакоя ўвайшла бабуля ў шаўковым карычневым халаціку, з пышнымі, добра пасівелымі валасамі.

Сцяпан павітаўся і адчуў, як чырванню пакрываюцца ягоныя шчокі.

– Гэта Сцёпа Артамонаў, – прамовіла Галя. – А гэта мая бабуля – Марыя Іосіфаўна.

– Зойдзем у залу, – запрасіла бабуля.

Яны зайшлі ў даволі прасторны пакой, пасярод якога стаяў стол з крэсламі, а крыху воддаль, ля самай сцяны, была канапа, у самым кутку стаяў тэлевізар.

Як толькі яны прыселі за стол, то бабуля, якая ўвесь час пільна разглядвала Сцяпана, адразу ж спытала:

– Няўжо вы штосьці ведаеце пра майго Ванюшу, бо Іван Дарафееў – мой муж. Вам, напэўна, хтосьці пра яго расказваў? – Яна пазірала на яго з надзеяй і спадзяваннем.

– Не зусім так, – Сцяпан уздыхнуў. – Справа ў тым, што мы знайшлі яго ў шурфе... Гэта было з месяц таму на Чукотцы.

І тут ён расказаў, як усё адбылося, паклаў на стол спражку і фотакарткі.

Марыя Іосіфаўна асцярожна ўзяла ў рукі спражку, ласкава пагладзіла яе і нечакана заплакала.

– Гэта ягоная спражка, – ціха прамовіла яна. – Ён паказваў яе мне пры нашай апошняй сустрэчы ў лагеры. Было гэта летам 1940 года. Ванюша тады шкадаваў, што не хапіла месца, каб напісаць яшчэ і вуліцу, дзе стаяў наш дом.

– А кім ён быў?

– Кадравы афіцэр Чырвонай Арміі. Пазнаёмілася я з ім тут, у Кіеве, дзе ў свой час скончыла гімназію з залатым медалём і паступіла ў медыцынскі інстытут у 1923 годзе.

– Але ж у той час няпроста было вучыцца? – спытаў Сцяпан.

– Амаль немагчыма. Голад, разруха. На заняткі басанож хадзілі, вось... І толькі на танцы шылі сабе з ручнікоў такія басаножкі. Але ж мы не сумавалі, хаця і галодныя былі гадочкі, але самыя шчаслівыя... На чацвёртым курсе пазнаёмілася я са сваім Дарафеевым. Камандаваў ён у той час эскадронам. Аднойчы праводзіў мяне. Падышлі да нашага дома, дзе мы з сяброўкаю пакой здымалі, а на вуліцы халадэча – зіма. Запрасіла яго чайку выпіць, ды як на тое зло – дровы скончыліся. Пайшоў ён. А назаўтра, дзесьці так пад вечар, заязджае ў наш двор чырвонаармеец на тачанцы, а ў ёй дровы бярозавыя: пашчапаныя, сухенькія... Спыніў каня і пытае, дзе тут пражывае Карыкава Марыя. Я стаю аслупянеўшы, а суседка да мяне: "Марыя! Ён жа цябе шукае!" Раздзялілі мы тыя дровы на ўсіх.

– А што ж далей было?

– Пажаніліся мы. А праз які месяц перавялі яго ў Мінск. Праз год і я да яго паехала. Разам з Жукавым ён служыў, вось... Пасля пераводзілі яго з месца на месца. І вось тады мы ўпершыню стварылі вячэрнія школы для камандзіраў Чырвонай Арміі. Дайшла пра гэта вестка да Масквы. Сам Сталін ухваліў наш пачын. А ў той час праводзіліся з'езды жонак камсаставу нашай арміі. Пабывала і я на адным з такіх з'ездаў. Было гэта ў 1935 годзе. Хвалявалася, як ніколі ў жыцці!

– А чаго ж так? Вас жа там многа было.

– Мне ж яшчэ і выступаць давялося – расказвала пра нашу вячэрнюю школу. А ў прэзідыуме Сталін, Варашылаў, Будзённы... Пасля некаторым дэлегатам уручалі залатыя наручныя гадзіннікі. Тут жа гравёр іх падпісваў. І так здарылася, што

мне якраз і не хапіла. Стаю счырванеўшы, ажно самой няёмка. Тут падышоў да мяне Будзённы і ўручыў мужчынскі гадзіннік, таксама залаты. А Сталін падазваў мяне і кажа: "Не крыўдуйце. Да вашай камплекцыі такі гадзіннік у самы раз". Гэта ён к таму, што была я ў той час паўнаватай, дый ростам Бог не пакрыўдзіў. Шчаслівая вярталася дадому. Тут якраз і муж павышэнне атрымаў – пачаў дывізіяй камандаваць. Але нядоўга я радавалася. У трыццаць восьмым мужа арыштавалі.

– За што?

– Хто ж яго ведае. Тады такая чыстка была ў арміі, што капітаны палкамі камандавалі. І засталася я адна з дзвюма дачушкамі на руках. Падтрымаў мяне ў той час толькі блізкі сябар мужа Канстанцін Ракасоўскі.

– Наш знакаміты маршал? – здзівіўся Сцяпан.

– Ну, у той час ён не быў яшчэ маршалам. Да вайны яго мала хто і ведаў. Але пасля ён і сам быў арыштаваны, і толькі перад вайной яго выпусцілі.

– І вы больш так і не ўбачылі мужа?

– Адзін раз давялося сустрэцца. Працаваў ён у Сібіры, на лесанарыхтоўках. Прыехала, а яго ледзь пазнала: да таго схуднелы – адны вочы... Заплакала, а ён мяне суцяшае: "Усё хутка праясніцца, тут нейкая памылка. Мы ліст Сталіну напісалі. Нас хутка выпусцяць, вось убачыш!" Так ужо ён спадзяваўся на вызваленне, што нават я супакоілася: можа, і сапраўды – разбяруцца і выпуспяць. Ажно не. Пасля лісты перасталі прыходзіць, а тут вайна... Адвезла я дачок да маці ў вёску, а сама ў дзейную армію. Я ж хірург. Працавала ў палявым шпіталі. Дзесяткі аперацый у дзень. З ног валілася ад стомы. Скончылася вайна, прыехала ў вёску, а дочкі мяне не прызнаюць: і смех, і грэх. А што? Было ім ад чаго здзівіцца: стаіць перад імі жанчына з пагонамі падпадкоўніка на плячах, з медалямі на грудзях і кажа, што яна іхняя маці.

– І вы засталіся жыць у вёсцы?

– Ды не. Прыехала ў Кіеў, пачала працаваць у бальніцы. Доўгі час кватэру не магла атрымаць. Вось тады і напісала Ракасоўскаму ў Маскву. І ён дапамог. Праз які месяц атрымала двухпакаёўку, забрала маці з вёскі, бо старэнькая была. А ў пяцьдзесят шостым мужа рэабілітавалі, як і многіх іншых. Чытала той ліст ды плакала начамі, бо яшчэ цяжэй на душы стала. Добра яшчэ, што зяці ў мяне цудоўныя. Адна дачка ў Ялце жыве, а я тут з малодшай. Цяпер вось з унучкай засталіся, бо нашы з'ехалі на мора.

Яна на хвіліну змоўкла, узяла ў рукі фотакарткі і пачала разглядаць.

– У такую далячынь саслалі. Ляжыць, бедачок, у мерзлаце, у такім холадзе...

– Прабачце, Марыя Іосіфаўна, што прывёз вам такія сумныя весткі.

– Што вы, Сцёпа, я вельмі ўдзячная вам! Цяпер хоць ведаю, дзе ягоная магілка. Шкада, што далёка, а то б злятала.

– Яно так, – ціха прамовіў Сцяпан, – да Чукоткі дзевяць гадзін лёту, ды яшчэ пропуск спецыяльны трэба мець, бо прыгранічная зона.

– Загаварылі мы госця, Галінка, трэба пачаставаць, – яна паднялася з крэсла. – Пайду на кухню, а вы тут паразмаўляйце.

Марыя Іосіфаўна выйшла. Тут Сцяпан зірнуў на Галю і яму падалося, што пасля ягонага аповеду яна змянілася. З такой цікавасцю слухала, ды разпораз паглядвала на яго сваімі чорнымі вачыма. А без бабулі яна і зусім асмялела.

– Учора здала апошні экзамен. Цяпер я вольная птаха. Яшчэ год вучобы – і буду ўрачом, – прамовіла яна і пільна зірнула на Сцяпана.

– Няўжо будзеш хірургам, як і бабуля?

– Не. Я буду дзетак лячыць, як мая маці. Праз дзень-другі і мы з бабуляй адправімся ў Ялту. Запрашаю і цябе, Сцёпа. Бачыш, як хутка перавяла на "ты".

– Не ведаю. Вялікі табе дзякуй, але што твае скажуць?

– Узрадуюцца. Бо ты прывёз звесткі пра бацьку маёй маці, гэта першае. А па-другое, пасля Чукоткі табе карысна будзе паплаваць і пазагараць.

– Гэта праўда. Трэба падумаць, бо адпачынак у мяне шасцімесячны,

– Нічога сабе! – здзівілася Галя.

– Усё па законе – два з паловай гады правёў у тундры...

Тут Галя ўзяла ў рукі фотакарткі.

– Цябе тут не пазнаць, такая бародка шыкоўная.

– Там без барады не абысціся. Узімку сагравае, а ўлетку выратоўвае ад камароў. Іх там столькі – света божага не бачна.

– Бедненькі мой дзядуля, – ціха прамовіла Галя. – Без віны загінуў у такой далечы. Я абавязкова пакажу гэтыя здымкі маці.

Тут з'явілася бабуля.

– Ну, давайце, маладыя людзі, стол накрываць.

– Лепш на кухні, – прапанаваў Сцяпан. – Навошта лішнія клопаты.

– Калі так, – згадзілася бабуля, – то заходзьце, у мяне ўсё гатова.

Зайшлі на кухню. На стале паблісквала сваім пазалочаным коркам бутэлька сухога віна, а побач стаялі талеркі з салатам і катлетамі. Сцяпан адкаркаваў бутэльку і напоўніў чаркі. Усе паднялі іх і моўчкі сталі ля стала.

– Ну, – сцішаным голасам прамовіла бабуля, – найперш давайце памянём майго Ванюшу. Няхай яму пухам будзе зямелька ў чужой старане.

Усе выпілі, селі і пачалі закусваць. Пасля другой чаркі шчокі ў бабулі паружавелі, і яна сказала:

– Гляджу я на цябе,Сцёпа, і зайздрошчу тваёй будучай жонцы, ці яна ёсць у цябе?

– Няма. У тундры дзяўчат не знойдзеш...

– Я гэта к таму кажу – спадабаўся ты мне, бо на твары ў цябе напісана, што ты добры, але залішне сарамлівы. А як табе мая Галінка, мо прыглянулася?

– Бабуля! Гэта ўжо занадта! – ускрыкнула Галя. – Вось як віно дзейнічае.

Сцяпан таксама асмялеў, бо і яму крыху ўдарыў хмель у галаву.

– Вельмі прыгожая. Я нават і не думаў, што такія ёсць на свеце..

– Чуеш, унучка? А раз так, то дадому цябе мы так проста не адпусцім, а запрашаем у Ялту. Пагрэешся на сонейку, а там будзе відаць, што і да чаго.

– А я ўжо яго запрасіла, ды ён не згаджаецца, – з усмешкай прамовіла Галя.

– Прыедзе! Разлівай, Спёпа! – захмялелым голасам загадала бабуля.

Але пасля трэцяй чаркі, спаслаўшыся на галаву, яна адправілася ў спальню. Сцяпан дапамог Галі прыбраць са стала, а пасля яны зайшлі ў залу і прыселі на канапу.

– Што скажаш наконт паездкі ў Ялту? – спытала Галя.

Яна сядзела так блізка, што Сцяпан ледзь стрымліваў сябе, бо вельмі хацелася абняць яе...

– Каб я ведаў, што гэта цябе ўзрадуе, то пешам дабраўся б да Ялты.

– Лепш самалётам, – яна з якую хвіліну моўчкі пазірала на яго, а пасля нечакана спытала:

– А як завуць тваю маці?

– Таццяна Іванаўна.

Галя паднялася з канапы, падышла да кніжнай паліцы, узяла альбом і прысела за столік крыху воддаль ад Сцяпана. Доўга яго перагортвала, потым дастала фотакартку і пачала штосьці на ёй пісаць. Пасля паклала яе ў канверт і надзейна заклеіла.

– Вось, гэта для тваёй маці.

– А мне зірнуць можна?

– Толькі не цяпер, а як будзеш на верхняй паліцы ў цягніку.

Час ляцеў непрыкметна. І толькі пад вечар Сцяпан адправіўся ў сваю гасцініцу.

А праз два дні ён праводзіў на вакзале Галю з бабуляй у Ялту. Калі да адпраўкі цягніка заста-

валася адна хвіліна, Галя нечакана ледзь чутна дакранулася губамі да ягонай шчакі і адразу ж кінулася да свайго вагона.

Калі цягнік мякка крануўся з месца, то яна крыкнула:

– Абавязкова прыязджай! Я буду цябе чакаць!

У наступны дзень Сцяпан самалётам вылецеў у Мінск, бо яму хацелася як мага хутчэй расказаць пра ўсё сваёй маці.

Калі самалёт набраў вышыню, ён распячатаў канверт. Там была толькі Галіна фотакартка. Яму падалося, што яна пазірала на Сцяпана з дакорам і расчараваннем. Яму да таго зрабілася шкада яе, што ён ледзь не заплакаў.

На зваротным баку фотакарткі было напісана: "Шаноўная Таццяна Іванаўна! Вельмі прашу адпусціць вашага сына ў Ялту дзён на дзесяць, а калі можна, то і на ўвесь месяц. Галя".

Далей быў дробным почыркам напісаны Галін адрас у Ялце.

Як толькі нрыляцеў Сцяпан у Мінск, то адразу ж заказаў білет да Сімферопаля. Вылятаў ён туды толькі праз дзесяць дзён – бліжэй білетаў не было.

Калі прыехаў дадому і пра ўсё расказаў сваёй маці, то тая да таго ўзрадавалася, што нават заплакала.

– Я ж прадчувала, дарагі мой сынок, што так яно і будзе. Вось і паслаў табе Бог узнагароду за твае клопаты, турботы і гаротнае жыццё. А ў Ялце пабудзь колькі трэба. Я тут упраўлюся, дасць Бог шчэ і ўнука буду няньчыць.

Спяпан толькі пасміхнуўся і нічога не адказаў. Пасля выйшаў на падворышча і падышоў да веснічак.

Летняя ноч павісла над вёскаю. Адпачывала зямля, убірала ў расу травы. Раптам дзесьці там, за рэчкай, зайграў гармонік, але праз якую хвіліну змоўк, быццам зразумеў гарманіст, што не трэба парушаць спакою гэтай цудоўнай і такой кароткай летняй ночкі.

# Фіктыўны шлюб

*Наташы Цвятаевай*

## Раздзел першы

Да пачатку кінасеанса заставалася добрая гадзіна. І, каб неяк збавіць час, Сяргей падаўся на вакзал, які быў побач, за невялічкім скверыкам. Можна было і так куды пайсці, але зранку церусіў нудны дожджык. І хаця яшчэ не закончыўся жнівень, у горад няпрошанай госцяй падкрадвалася восень.

На лянівы дожджык ён не звярнуў увагі, бо ў апошнія дні ў яго быў прыўзняты настрой. З які месяц назад ён урэшце атрымаў аднапакаёвую кватэру. Амаль дзесяць гадоў прастаяў у чарзе. Каб быў жанаты, то намнога раней выбраўся б з інтэрната. Але не шэнціла яму з дзяўчатамі яшчэ з маладых гадоў, а цяпер ён на іх і не аглядаўся, бо меў сорак два гадочкі за плячыма.

Праўда, калі сумленна прызнацца, то да Новага года павінна быць урэшце пакончана і з яго халасцяцтвам. У мінулым годзе выпадкова пазнаёміўся з Галінай Мікалаеўнай, якая жыла ў Мінску і выкладала ў музычнай школе. Гэта далекавата ад ягонага Віцебска, у які яна так і не згадзілася пераехаць, але такой бяды – можна жыць і ў Мінску.

Яму толькі было шкада сваёй маці – жыла ў невялічкай вёсачцы непадалёку ад Віцебска. Але тая была згодна на ўсё, абы ён урэшце ачалавечыўся ды распачаў жыццё, бо даўно выбалела па ім сэрца. А колькі слёз яна выплакала, калі прыязджала да яго ў інтэрнат!

Сяргей падняўся на другі паверх, зайшоў у залу і сеў у першым радзе, амаль ля самага акна. Непадалёку сядзела старэнькая бабулька са сваімі клункамі, а за ёй весела шчабяталі ў стракатым адзенні маладыя дзяўчаты, быццам тыя ластаўкі пасля цёплага дожджыку.

Па радыё аб'явілі аб прыбыцці чарговага цягніка. Адразу ж заварушыліся людзі ў зале і няспешна пачалі выходзіць на пасадачную пляцоўку цераз перакідны мосцік.

Бабулька, што сядзела побач з ім, таксама спехам увязала свае клункі і хуценька падалася на перон.

І тут у залу ўвайшла маладая жанчына. Яна вяла за ручку маленькую чарнявую дзяўчынку. Сяргей зірнуў на дзяўчынку, і тая нечакана ўсміхнулася яму, быццам старому знаёмаму, нават крок запаволіла.

Жанчына тузанула яе за ручку, акінула позіркам залу і накіравалася да яго.

– Прабачце, – прамовіла яна, – ці не маглі б вы пабыць з ёй хвілінак пяць, пакуль я па чамаданы збегаю? А то ад цягніка можам адстаць.

– Канечне, пабуду з такой прыгажуняй, – адказаў ён і ўзяў дзяўчынку за ручку.

Жанчына адразу ж заспяшалася да выхаду.

– Ну, давай знаёміцца, – Сяргей усадзіў дзяўчынку побач з сабой. – Як цябе зваць?

– Ася, – дзяўчынка ўважліва разглядвала яго.

– А я дзядзька Сяргей, – ён дакрануўся да яе маленькай ручкі. – Напэўна ж, хутка ў школу пойдзеш? Колькі табе гадзікаў?

– Вот колькі! – дзяўчынка паказала тры пальчыкі.

– А ў садзік ходзіш? – працягваў дапытвацца ён.

– Не. Я з бабай Насцяй жыла, – дзяўчынка ўздыхнула. – Але аднаго разу яна так моцна заснула, што ніхто не змог разбудзіць...

– Так... – Сяргей моўчкі пагладзіў яе па галоўцы. – А цяпер з кім жывеш?

– З мамай. А таткі ў нас ніколі не было, вот...

– А куды вы ехалі з мамай?

– Не ведаю. Мама казала, што паедзем да самага мора. Там караблікі плаваюць... А ты быў на моры? – у сваю чаргу спытала дзяўчынка.

– Быў. Нават не адзін раз.

Дзяўчынка змоўкла. Па ўсім было відаць, што яна прытамілася.

Толькі цяпер Сяргей угледзеў, што на ёй даволі-такі зношаныя сандалікі, кароценькая, блакітнага колеру сукеначка, паверх якой быў зялёны світэрок.

Ён зірнуў на гадзіннік. Больш за дзесяць хвілін прайшло, а жанчыны ўсё не было.

І тут у яго галаве мільганула думка: “А што, калі яна зусім не прыйдзе?” На якое імгненне ён нават спалохаўся. Але адразу ж супакоіў сябе тым, што такога не можа быць.

Магчыма, з ёй што-небудзь там здарылася? Сардэчны прыступ ці яшчэ што. Трэба чакаць. Вось толькі ў кіно ён ужо не паспявае. “Адзінокая жанчына жадае пазнаёміцца”. У галоўнай ролі яго любімая акторка Ірына Купчанка.

Але такой бяды. Можна будзе і заўтра схадзіць. Наперадзе пяць вольных дзён: два выхадныя з трыма адгуламі.

– Мне піць хочацца, – урэшце прамовіла дзяўчынка і ўзяла яго за руку.

Буфет быў побач, якраз насупраць лесвіцы. Калі што, то маці Асі яны не павінны прапусціць.

– Ну што ж – хадзем!

Яны падняліся і накіраваліся да буфета. Чарга была невялікая. Ён узяў бутэльку напітку і маленькую шакаладку. Ася выпіла амаль цэлую шклянку. Вярнуліся назад.

Прайшла амаль гадзіна, а жанчына быццам скрозь зямлю правалілася. Ён зірнуў на Асю. Дзяўчынка сядзела спакойна, быццам нічога такога і не здарылася.

А ён думаў пра тое, што рабіць далей. Не сядзець жа ўсю ноч на вакзале. Можна было б пайсці ў

міліцыю ды ўсё там расказаць. Але ж яны забяруць Асю, а яму чамусьці не хацелася з ёй развітвацца. Рашыў яшчэ з ёй паразмаўляць.

– Можа, адправімся на пошукі тваёй мамы? Штосьці доўга яе няма, – звярнуўся ён да Асі.

– Я не хачу да мамы! – адразу ж адказала дзяўчынка.

– Чаму?! – здзівіўся ён.

– Яна мяне б'е.

– За што?

– Не ведаю. Я гуляць хачу на вуліцы, а яна замыкае на цэлы дзень. Аднаго разу я нават усю ноч адна прасядзела. Так страшна было, бо я ваўкоў баюся.

– Ваўкі ў лесе жывуць, далёка, – супакоіў яе Сяргей.

– А як сцямнее, то ў хату прыходзяць...

– Так-так... – ён прытуліў яе да сябе. – А дзе ж мы будзем начаваць?

– А ў цябе ёсць свая хатка?

– У мяне ёсць, – усміхаючыся, адказаў ён.

– Тады пойдзем да цябе.

– А калі мама прыедзе, а нас няма?

– Я лепш з табой застануся! – яна дакранулася да яго рукі.

Вось табе і паразмаўляў! У яго ажно дыханне перахапіла ад такой прапановы. І хаця ўжо добра-такі ўцямнела, ён рашыў крыху пачакаць.

А тут яшчэ краем вока прыкмеціў, што дзяўчаты ўсё часцей і часцей з усмешкай пазіраюць на яго. "Напэўна ж, усё бачылі", – падумаў ён. І хоць бы куды пайшлі, дык як хто прывязаў да крэслаў.

– Дзядзька Сярожа, – ледзь чутна прамовіла Ася, – я пісаць хачу.

– Складаная справа, – ён усміхнуўся. – Хадзем, – ён узяў яе за ручку, і яны пайшлі.

Хвілін пяць давялося пастаяць ля жаночага туалета, бо, як на тое ліха, ніхто туды не заходзіў. Урэшце давялося падкараўуліць адну жанчыну.

Пасля яны хадзілі туды-сюды, выйшлі на прывакзальную плошчу. Дожджык урэшце суняўся.

Ціха было навокал. Гарэлі ліхтары, блішчэлі лужыны на асфальце. Бесперапынна снавалі аўтобусы.

Сяргей хацеў ужо ехаць з Асяй на сваю кватэру, але каб канчаткова заспакоіць сваю душу, яны зноў падняліся на другі паверх. Дзяўчат ужо не было.

– Пасядзім яшчэ трошкі, добра?

– А мне ўжо спаць хочацца. – Ася нават пазяхнула.

Яны хуценька спусціліся ўніз, узялі таксі і праз дзесяць хвілін былі на вуліцы Гагарына. Падняліся на трэці паверх, ён адамкнуў дзверы, і яны ўвайшлі ў прыхожую.

– Вось і мая хатка! – Сяргей зняў чаравікі. Ася таксама зняла сандалікі. Яны зайшлі ў залу. Ён пстрыкнуў выключальнікам.

– Якая ў цябе чысціня! – усклікнула Ася і села на канапу. – А ты адзін жывеш?

– Адзін, – Сяргей прысеў побач.

– А дзе ж твая цётка?

– Няма ў мяне цёткі, – ён усміхнуўся і ўскудлаціў яе валасы. – Есці хочаш?

– Хачу.

– Я зараз што-небудзь прыдумаю, але спачатку скупанемся ў ванне, дамовіліся?

– Толькі не рабі гарачую вадзічку!

Пасля ванны яны выпілі чаю на кухне, і Сяргей адразу ж уладкаваў Асю на канапе, а сабе паслаў на раскладушцы. Пасля памыў посуд на кухні і, асцярожна ступаючы, зайшоў у залу. Ася ўжо спала. Ручкі ляжалі на коўдры, валасы рассыпаліся на падушцы. Напэўна ж, прытамілася ў цягніку. І адкуль яны ехалі? Ён яшчэ крыху пастаяў ля канапы, а пасля пагасіў святло і ўлёгся на раскладушцы.

Сон не браў. Дый як тут можна было заснуць, калі трэба было думаць, што рабіць заўтра. Пайсці ў міліцыю ды ўсё расказаць? А што будзе далей? Асю забяруць у дзіцячы дом.

І няўжо тая жанчына спецыяльна падкінула яму сваю родную дачку?

Не верылася ў такое, ды яшчэ ў наш час. Пасля вайны здараліся такія выпадкі. І не адзін раз. Узяць хаця бы іхняга дзеда Сымона. Каб быў жывы, то расказаў бы, як сядзеў у сорак шостым на вакзале ў Полацку, а тут нейкая жанчына папрасіла патрымаць груднoe дзіця. А саму толькі і бачылі! Так і прыехаў з ім у сваю вёску. А ў ягонай Ганулі было ўжо трое. Ды ўсе дочкі. А тут разгарнулі пялёнкі – хлопчык!

І хаця цяжка было – пакінулі хлопчыка ў сябе. Дочкі пасля замуж паразляталіся, а той хлопчык даўно вырас, скончыў інстытут і які ўжо год старшынём калгаса ў іхнім раёне працуе.

Ведаў Сяргей, што цяпер дзіцячыя дамы не пустуюць. Бо многа разводаў, а бывае, што і сап'юцца бацька з маці, саміх забіраюць на лячэнне. Або зацяжарыць маладая дзяўчына, вырваўшыся з вёскі ў горад, дамоў сорамна паказвацца, вось і адмаўляецца ў радзільным доме ад свайго дзіцяці. Нават карміць не хоча.

А тут – жанчына як жанчына: маладая, чарнявая, даволі прывабная. Вось толькі яе вочы не спадабаліся Сяргею: трывога ў іх была, неспакой... Але ў той момант ён не звярнуў на гэта ўвагі, бо думаў, што і сапраўды тая спяшаецца на цягнік.

Урэшце вырашыў, што назаўтра зноў з Асяй пад'едзе на вакзал, а там будзе відаць. З тым і заснуў.

Раніцай усхапіўся ў сем гадзін. Хуценька памыўся ды на кухню. Рашыў напячы аладак, бо смятана яшчэ была ў халадзільніку. Пакуль тое ды сёе – паўтары гадзіны праляцела. Пасля зазірнуў у залу. Ася яшчэ спала. Ён падышоў бліжэй, толькі хацеў папрaвіць коўдру, як яна тут жа расплюшчыла вочы.

– Добрай раніцы! – ён прысеў на ложак. – Хто гэта так доўга спіць?

– А што – ужо дзень? – яна ўсміхнулася.

– Бачыш, нават сонечны зайчык да цябе забраўся, запрашае на вуліцу. – Сяргей пагладзіў яе па галоўцы.

– А дзе ж мая лялька? – Ася села і азірнулася навокал.

– Якая лялька? – здзівіўся ён.

– З белымі валасамі, у якой вочкі самі адкрываюцца! – на яе тварыку была разгубленасць. Ася нават зазірнула пад падушку.

– Яна табе, напэўна, прысніласся, – супакоіў яе Сяргей. – Сёння мы пойдзем у магазін і купім табе такую ляльку.

– Праўда?! – з радасцю ўскрыкнула Ася.

– Праўда. А цяпер хуценька ўставай, памыем з табой ручкі, тварык – ды за стол. Я вельмі смачных аладак напёк.

Пасля снедання яны выйшлі на вуліцу. На небе ні аблачынкі – адно сонейка. Адразу ж паехалі на аўтобусе ва універмаг. Лялек было – вочы разбягаюцца. Ася ўсе перабрала. Урэшце ўпадабала адну – зусім невялічкую, з блакітнымі вачыма. Заадно купілі ёй новыя сандалікі і бялюткія шкарпэткі.

Выйшлі з універмага, пастаялі крыху ля тэатра, паглядзелі з высокага берага на Дзвіну, а пасля перайшлі цераз мост і накіраваліся да вакзала.

– А куды мы ідзем? – Ася спынілася.

– На вакзал. Будзем шукаць тваю маму.

– А мне ўжо ножкі баляць.

– Мы зараз на аўтобус сядзем.

Людзей на вакзале было мала. Яны зноў падняліся на другі паверх і ўселіся на тыя ж самыя крэслы ў першым радзе. Ася адразу ж пачала разглядваць малюнкі ў невялічкай дзіцячай кніжцы, якую яны купілі ў кіёску, а ён пачаў углядвацца ў твары жанчын, што зрэдку ўваходзілі ў залу.

Яго здзіўляла тое, што Ася зусім не хвалявалася за маці: знойдзецца тая ці не. Магчыма, яна доўгі час жыла са сваёй бабуляй, дзе-небудзь у вёсцы, а маці зрэдку да іх прыязджала.

І ўсё адно ён не мог зразумець аднаго: як гэта можна было пакінуць сярод белага дня сваю родную дачку, ды яшчэ такую прыгожую?

Ён сам з Асяй усяго другі дзень, а ўжо адчуў, што пачаў прывыкаць да яе. У яго і раней была цяга да дзяцей, магчыма, таму, што сваіх не было. Колькі разоў, бывала, падыходзіў да дзіцячага садзіка, што быў непадалёку ад ягонага інтэрната і цікаваў, як хлопчыкі і дзяўчаткі гушкаліся на арэлях або корпаліся ў пяску.

У іх ужо там былі свае клопаты. А каб ён ажаніўся ў пару, то сам бы меў такую ўнучку. Праляцелі гадочкі, як ластаўкі прамільгнулі. Яго нават будучая жаніцьба не радавала. І якая гэта жаніцьба – адны слёзы. Галіна Мікалаеўна хаця і дала згоду, але адчуваў ён – не падабаецца ёй. І яе маці касавурылася на Сяргея, бо не даспадобы было ёй ягонае шафёрства. Сяргей ужо з добры дзесятак гадоў працаваў на аўтобусе. Машыны падабаліся яму з дзяцінства. Завочна і тэхнікум скончыў. Папрацаваў тры месяцы механікам ды зноў на аўтобус папрасіўся. І заробак не той, дый працу не параўнаць: там прастор, новыя людзі, прырода, а ў гаражы адна лаянка са слесарамі.

– Душна тут, – Ася паднялася з крэсла. – хадзем на вуліцу.

Яны спусціліся ўніз, выпілі квасу, узялі марожанага і селі на лавачку ў прывакзальным скверы.

Ася была ў захапленні ад марожанага. Можа, нават і каштавала ўпершыню ў жыцці. Яна час ад часу кідала загадкавы позірк на Сяргея, а пасля сказала:

– Будзь маім таткам, добра? – і, убачыўшы ягоны здзіўлены позірк, хуценька дадала: – У мяне ж ніколі таткі не было. А ты добры, мне падабаешся.

І столькі было чакання ў яе вачах, што ён, ні хвіліны не раздумваючы, адказаў:

– Добра. Я згодзен.

Вось так! Ужо і таткам стаў. А што ж далей будзе? Не! Трэба штосьці рабіць. А рашэнне было

адно: Асю трэба адвесці ў дзіцячы пакой. Павінен такі быць у міліцыі. Адкуль адправяць у дом дзіцяці або маці будуць шукаць. Ім там відней, што і як рабіць.

І ён рашыў назаўтра ж адвезці туды Асю. А ноччу ў яго нечакана ўзнікла адна думка: а што, калі назаўсёды пакінуць Асю ў сябе? Канечне, не адразу. Пабудзе спачатку ў доме дзіцяці, а ён папросіць дырэктара, каб нікому яе не аддавалі, а сам за гэты час ажэніцца ды ўгаворыць Галіну Мікалаеўну, каб забраць Асю. Гэтая думка яго ўзрадвала, ён ажно павесялеў.

Запала дзяўчынка ў ягоную душу, і ці будуць у яго свае дзеці? Галіне Мікалаеўне даўно за трыццаць. А ў такім узросце радзіць не проста. Вось толькі ці згодзіцца яна ўзяць Асю?

Увесь наступны дзень яны з Асяй зноў правялі ў горадзе, бо была якраз нядзеля. Пабывалі нават у парку, дзе ён пакатаў яе на поні, а пасля зайшлі ў фатаграфію. Зрабілі здымкі на памяць. Спачатку адну Асю, а пасля іх удваіх.

У панядзелак, адразу ж пасля снядання, ён прысеў з Асяй на канапу, і яны пачалі глядзець па тэлевізары мульцікі. Як толькі скончылася перадача і ён выключыў тэлевізар, Ася спытала:

– А куды мы сёння пойдзем?

– Паедзем з табой да адной цёткі, якая адвязе цябе ў вялікі дзіцячы садзік. Там жывуць такія хлопчыкі і дзяўчаткі, у якіх згубіліся таты і мамы.

– А я з табой хачу жыць! – яна прытулілася да яго пляча.

– Я буду да цябе прыязджаць, а пасля назаўсёды забяру да сябе. Я цябе не пакіну, – Сяргей пагладзіў яе па галоўцы.

У невялічкім кабінеце сядзела даволі-такі маладая жанчына ў міліцэйскай форме. Тры зоркі налічыў Сяргей на яе пінжаку, які вісеў на вешалцы ў самым куце. Тут жа, ля самай сцяны, стаялі два старэнькія ровары.

Ён павітаўся. Жанчына ўважліва зірнула на Асю і прапанавала ім сесці.

– Слухаю вас! – сказала яна, але тут жа зазвінеў тэлефон.

– Так... – яна ўзяла аловак, штосьці запісала ў блакнот. – Добра. Чакаю вас у семнаццаць гадзін! – яна паклала трубку і зноў зірнула на Асю. – Што ў нас здарылася?

Сяргей расказаў пра здарэнне на вакзале.

– І колькі дзён дзяўчынка з вамі?

– Тры дні прайшло.

– А чаму адразу сюды не прывезлі? – у голасе жанчыны пачуліся недаверлівыя ноткі.

– Усё ж думалася, што знойдзецца яе маці. Мы кожны дзень на вакзал ездзілі, – адказаў Сяргей.

– А як завуць нашу прыгажуню? – жанчына ўсміхнулася.

– Ася, – адказаў Сяргей. – А вось прозвішча не ведае.

– Ася, – звярнулася жанчына да дзяўчынкі, – цягніком вы з мамай ехалі ці аўтобусам?

– Мы ў вагоне ехалі, – адказала Ася.

– Не густа звестак, – жанчына ўздыхнула.

Пасля яна запісала адрас Сяргея, праверыла ягоны пашпарт.

– Ну што ж, – яна адкінулася на спінку крэсла, – пакуль усё.

– А што будзе з Асяй? – спытаў ён.

– Сёння адправім у абласную бальніцу. Там урачы яе праверацъ, і калі будзе здаровенькая, то адправім у дом дзіцяці.

– Далёка куда?

– Дзе месца будзе. Хутчэй за ўсё ў Оршу.

– А колькі яна ў бальніцы прабудзе?

– Месяцы два, а то і больш.

– Так доўга?! – здзівіўся Сяргей.

– А як вы думалі?! Пакуль праверацъ, а пасля юрыст зоймецца рознымі паперамі. А чаму гэта вас цікавіць?

– Ды так... – Сяргей змоўк і зірнуў на Асю.

– Дзядзя Сярожа будзе маім таткам, – урэшце падала голас Ася.

– Вось як?! – усклікнула жанчына. – Гэта праўда?

– Праўда! – ён прыхінуў яе да сябе. – Як толькі ажанюся, то адразу ж паеду па яе. А можна і мне пад'ехаць у бальніцу, каб ведаць, дзе будзе Ася?

– Добра. Зараз выклічу машыну, і паедзем.

Ася прабыла ў бальніцы больш за месяц. І гэта яшчэ добра ўсё атрымалася. Бо тут былі такія хлопчыкі і дзяўчаткі, што жылі тут гадамі. Праўда, некаторыя з іх лячыліся, але ж былі і здаровыя, якіх можна было даўно адпраўляць у дом дзіцяці. Ды вось бяда – не было каму заняцца афармленнем неабходных даведак і дакументаў.

Загадчыца аддзяленнем расказала яму, што за тры гады "асірацелі" ў бальніцы 72 дзіцяці. Адны маці адмовіліся ад іх, іншыя збеглі...

У Сяргея ажно зашчыпала ў вачах, калі ён убачыў пакой для гульняў. Бетонная падлога, пустыя сцены... Праўда, загадчыца супакоіла, што ў хуткім часе тут засцелюць дываны, маляўніча распішуць сцены. А пакуль...

Скрануць такую справу было цяжка. Сяргею давялося некалькі разоў пабываць у аддзеле народнай асветы, але ўсё дарэмна.

Урэшце трапіў на другога сакратара абкома. І адразу ж знайшоўся чалавек, які пачаў займацца афармленнем неабходных дакументаў.

Асю накіравалі ў Оршу. Разам з жанчынай, якая яе суправаджала, паехаў і ён.

Дом дзіцяці быў у самым цэнтры горада. Ён не пуставаў. І неяк шчымліва стала на душы, калі глядзеў на зусім маленькіх карапузаў, якія ніколі не ўбачаць сваіх бацькоў.

Загадчыцы гэтага сумнага дома было за пяцьдзесят. Хударлявая, з коратка падстрыжанымі валасамі, яна халодным позіркам акінула Сяргея, бо, напэўна, адразу прыняла яго за бацьку, які прывёз сваю дачку.

Але, даведаўшыся, у чым справа, твар у яе пасвятлеў, нават у голасе стала больш цеплыні і пяшчоты.

– Вы толькі яе нікому не аддавайце, – Сяргей прытуліў да сябе Асю, бо пакуль я ўсё ўладжу, пройдзе не адзін месяц.

– А я да анікога і не пайду, – прамовіла Ася. – Я цябе буду чакаць.

– Мы нават паказваць яе нікому не будзем, – загадчыца ўсміхнулася.

– А якія трэба дакументы, каб удачарыць Асю? – спытаў ён.

– Даведак многа. Я зараз вам напішу, – яна ўзяла са стала чысты ліст паперы і пачала пісаць. – Вось, здаецца, усё напісала, – яна падала Сяргею лісток. Ён мелькам зірнуў на яго і схаваў у запісную кніжку.

Калі прыйшла пара развітвацца, Сяргей узяў Асю на рукі.

– Не сумуй тут, добра? Я буду да цябе прыязджаць. А як толькі дастану ўсе паперы, то адразу ж па цябе прыеду.

– А ты хутчэй даставай! – Ася ўсміхнулася.

– Я пастараюся, – ён пацалаваў яе ў шчочку і апусціў на падлогу.

## Раздзел другі

Прыгарадны цягнік марудна поўз да Віцебска. І ўвесь гэты час Сяргей у задуменні глядзеў у акно і думаў пра Асю. Ён і сам здзіўляўся: мінуў месяц, як з ёй пазнаёміўся, а ў душы было такое пачуццё, нібыта ведаў яе даўно. Да Оршы не так і далёка, у думках суцяшаў ён сябе, трэба будзе часцей да яе наведвацца.

Пасля дастаў лісток з запісной кніжкі. З усіх дзесяці даведак, што былі там напісаны, толькі адну ён не мог узяць: копію аб шлюбе. З яе трэба і пачынаць. Праз два месяцы ён будзе жанаты. Можа, пакуль не гаварыць Галіне Мікалаеўне пра Асю? Распісацца, а пасля ўжо і расказаць.

Але ён адразу ж адхіліў такі варыянт. А калі яна не дасць згоды? Тады што? Развод?! Не, трэба сказаць ёй адразу, так будзе лепш. Паслязаўтра ў яго чарговы рэйс на Мінск. Трэба абавязкова пабываць у яе.

Так то ён не вельмі часта бываў у сваёй будучай жонкі, бо жыла яна з бацькамі, а тыя халаднавата да яго ставіліся. Лепшага жаніха хацелі для сваёй Галіны, гэта ён у першую ж сустрэчу зразумеў. Яе маці працавала ў гарвыканкаме, а бацька таксама быў шышка: генеральны дырэктар аб'яднання. І каб ні Галіны гады, яны б і размаўляць з ім не сталі. Але як той сказаў: "На бязрыб'е і рак рыба!" З болем у душы згадзіліся на яго кандыдатуру. А што паробіш: не чакаць жа, пакуль дачцэ споўніцца сорак!

Урэшце цягнік прыбыў у Віцебск. Ён купіў у кіёску газет, а пасля чагосьці пацягнула на другі паверх вакзала. Падняўся, зазірнуў у залу. Людна было тут: ні аднаго свабоднага месца. Крыху пастаяў у задумненні ды падаўся дадому. Спаласнуўся ў ванне, выпіў чаю, бо гатаваць сапраўдную вячэру не было настрою, ды прылёг на канапу.

Праз акно, хаваючыся па кутах, запаўзаў у пакой змрок. Стаяла цішыня. Раней яна яму падабалася, а цяпер маркотна было на душы. Так і стаяў у вушах звонкі Асін галасок.

І чым яна цяпер займаецца? Дзесьці знаёміцца з такімі ж няшчаснымі і пакінутымі сяброўкамі. Можа, і пакрыўдзіць хто паспеў. Плача бедненькая, а заступіцца і няма каму.

А тут яшчэ адна думка не давала спакою: як угаварыць Галіну Мікалаеўну? Было ў яго такое прадчуванне, што не дасць яна згоды, каб Ася жыла з імі. І што ж тады рабіць? Ён жа і маці даўно расказаў пра сваю жаніцьбу. Тая ўзрадвалася, нават на болі ў грудзях перастала скардзіцца. Трэба паказаць Галі фотакартку Асі.

Ён падхапіўся з канапы, уключыў святло і пачаў шукаць канверт з фотакарткамі. Урэшце знайшоў яго ў шкатулцы, што стаяла на тэлевізары.

Ася выйшла – лепш і не трэба! На яе тварыку была такая сціплая, крыху здзіўлена-вінаватая ўсмешка, што ў яго нават вочы набрынялі слязьмі.

Больш за пяць гадзін ідзе аўтобус да Мінска. Там начоўка, а ранічкай зноў у Віцебск. Палову дарогі ён за рулём, другую – яго напарнік Ігар Пятровіч. Яму даўно за пяцьдзесят. Маўклівы і пільны на трасе. Хутка будзе ўнучку замуж выдаваць, бо сам ажаніўся ў семнаццаць. Вось так! Бацька нават адлупцаваў сынка, калі даведаўся пра яго намеры.

"Такое каханне навалілася, што думаў, не вытрымаю!" – аднаго разу, смеючыся, прызнаўся ён.

Вось так пашчасціла чалавеку! Першы і апошні раз пакахаў – і на ўсё жыццё.

Сяргей усе гэтыя пяць гадзін абдумваў сваю будучую размову з Галяй. Прыехаўшы ў Мінск, ён купіў за пяць рублёў тры чырвоныя ружы, якія яна вельмі любіла, ды паехаў на вуліцу Чарвякова. Вось і знаёмы прыпынак.

Выйшаў з трамвая і нетаропка пашыбаваў да вялізных гмахаў, што стаялі воддаль ад вуліцы. Зірнуў на гадзіннік. Была палова сёмай – павінна быць дома. Ліфт імгненна ўзнёс на восьмы паверх. Дзверы адчыніла сама Галя.

– Прывітанне! – з усмешкай прамовіла яна, забіраючы ў яго ружы. – Зусім прапаў! Хоць бы пазваніў!

– Не выпадала, – замест прывітання адказаў ён. – Ты адна?

– Адна. Нашы другі тыдзень на моры адпачываюць.

Ад такой навіны ён адразу ж павесялеў. Хуценька зняў куртачку, скінуў чаравікі, і яны зайшлі ў залу.

– Зараз павячэраем. Толькі катлеты падагрэю, – Галя выйшла на кухню, а ён адразу ж у ванную. Спаласнуўся пад душам – адразу ж лягчэй стала. Пасля вячэры зноў зайшлі ў залу. Сяргей сеў на канапу, а Галя ўключыла тэлевізар. Якраз ішла праграма "Час".

– Ты можаш сёння пераначаваць у нас, – сказала яна, – а заўтра ранічкай паедзеш.

У яе чамусьці быў прыўзняты настрой. Ён пазіраў на яе і ўсміхаўся. Усё-такі яна яму падабалася. Чысты твар ды коратка падстрыжаныя валасы намнога маладзілі яе. І калі разабрацца, то і яе лёсу не пазайздросціш. У маладыя гады марылася ёй стаць знакамітай піяністкай. І ўсё спачатку добра ішло: яе хвалілі, асабліва на першых курсах, а пасля быццам надламілася штосьці ў душы. Дайшла да сваёй мяжы, а далей ні паўкрока.

Сама ўсё разумела, ды сэрцам не магла змірыцца. Начамі плакала. А тут яшчэ і асабістае жыццё не склалася, як таго хацелася. А з гадамі і нервы пачалі здаваць.

Сяргею і раней даводзілася сустракацца з дзяўчатамі і жанчынамі, якім далёка за трыццаць. І амаль усе неслі ў сваёй душы такое нервовае напружанне, што зрываліся нават з-за дробязі, імгнення. І ён іх разумеў. Сам і то не мог да адзіноты прывыкнуць. А што ж пра іх гаварыць?

Яму хацелася як мага хутчэй пачаць размову пра Асю, але па тэлевізары пачалася кінакамедыя. Прыйшлося чакаць. Як толькі яна скончылася, Галя выключыла тэлевізар і сказала:

– Кавы не хочаш?

– Пасля віп'ем. Мне трэба з табой пагаварыць.

Яна прысела на канапу, але крыху воддаль ад яго.

– Тут такая справа... Нават не ведаю, з чаго пачынаць.

Ён пачухаў патыліцу.

– Сустрэў жанчыну?! – з усмешкай прамовіла Галя.

– Што ты?! – ён адчуваў, як чырванню заліваецца твар. – Але доля праўды ёсць: дзяўчынку сустрэў, зусім маленькую. Ёй тры годзікі.

І ён расказаў пра Асю.

– Ну што ж, – Галя ўздыхнула, – добрую справу зрабіў. Магчыма, яе мама знойдзецца, а калі не, то і ў доме дзіцяці не прападзе.

– Яно так... – Сяргей уздыхнуў, а пасля зірнуў ёй у вочы і дадаў: – Давай яе да сябе возьмем!

– Як гэта?! – здзівілся Галя.

– Распішамся з табой, а пасля і яе ўдачарым. Яна такая прыгожая – вачэй не адвесці!

– Сярожа! Ты што! Ды ў нас свае будуць дзеці! Я табе колькі хочаш нараджаю! Мне ўрач сказаў, што тэрмінова трэба радзіць.

– Ну і добра! Раджай на здароўе! Будуць у Асі брацікі і сястрычкі.

– Ну і ну! – яна ўсміхнулася. – Не чакала ад цябе такога...

– У мяне фотакартка Асі ёсць, – ён хуценька дастаў з пінжака канверт. – Ты толькі зірні разочак – адразу ж табе спадабаецца!

Галя ўзяла картачку, доўга яе разглядала.

– Сімпатычная. Але ж, можа, хварэе на што?

– Яе правяралі ў абласной бальніцы. Доктар сказаў, што з яе здароўем – хоць у космас!

– І як ты да такога дадумаўся? – яна паклала фотакартку на столік.

– Разумееш... У яе ніколі не было бацькі. Жыла з бабуляй, пасля тая памерла, а маці – Бог ведае якая... І так усё здарылася, што я і сябе не разумею: увайшла ў сэрца, як першае каханне. Дні і ночы аб ёй думаю. Дзесьці чакае мяне, нават таткам называе...

– Вось як?! – Галя зноў узяла ў рукі фотакартку. – Дык ці не твая гэта дачушка, галубок?! Так бы адразу і сказаў! А то вешаеш лапшу на вушы! Гэта ж трэба – не паспеў ажаніцца, а ўжо дачку ў хату прыводзіць!

– Ды не дачка яна мне! Ты ж у пашпарт зірні!

– Дзяцей без пашпарта робяць! – ускрыкнула Галя і шпурлянула ў яго фотакарткай, якая тут жа ўпала на падлогу.

Ён асцярожна падняў яе і схаваў у кішэню. Галя порстка падхапілася з канапы і падышла да акна. Хвілін з пяць моўчкі прастаяла там, пасля азірнулася і ціха прамовіла:

– Толькі не думай, што я зусім бессардэчная. Я люблю дзяцей не менш, чым ты. Але ж Ася чужая... І што я сваім скажу? Вось каб мы пражылі не адзін год ды ў нас не было дзяцей –

іншая справа. А так... Гэта ж трэба – спадабалася дзяўчынка. А калі пасля збрыдае, тады што? Павязеш назад?

Сяргей маўчаў. Што ён мог сказаць? З самага пачатку ведаў – нічога не атрымаецца. І ў той жа час адчуваў, што і яго губляць яна не хоча.

– Ты вось мне скажы, – урэшце прамовіў ён, – чаму так атрымліваецца: з кожным годам людзі лепш жывуць, а ў душы чарсцвеюць? Знікае з сэрцаў дабрыня. Суседзяў не ведаюць па лесвічнай пляцоўцы. Толькі разлік, пасада, прэстыж! Вось прызнайся: не аб такім ты мужы марыла, праўда?! Маўчыш? Вось так! Бо не з твайго я асяроддзя!

– Пры чым тут гэта? – Галя паволі прайшлася па пакоі і зноў села на канапу.

– Пры тым... – Сяргей уздыхнуў.

– Гэта ж дзіцё, – працягвала яна. – Твая Ася дзесьці ўжо забылася пра цябе.

– А ты была калі ў доме дзіцяці? – Сяргей зірнуў ёй проста ў вочы.

– Не была. А што?

– Шкада. Бачыла б ты, якімі вачыма яны глядзяць на кожнага незнаёмца! Бо ўвесь час, кожную хвілінку думаюць, што гэта іх татка ўрэшце знайшоўся.

– Мне іх таксама шкада, – яна на хвіліну змоўкла, а пасля спытала: – А каб я перад самай нашай жаніцьбай прывяла незнаёмага хлопчыка? Ты б згадзіўся яго ўсынавіць?

– Згадзіўся б! Раз ён табе спадабаўся.

– Сказаць лёгка. А на самай справе такую б істэрыку закаціў – толькі трымайся! Дый сам урэшце падумай: мы ў такія познія гады пачынаем жыццё, а тут адразу ж дадатковыя клопаты. Пасля свае народзіцца, дзе ж я спраўлюся?

– Я дапамагу! Ася ў садзіку будзе.

– А людзі што скажуць? Будуць смяяцца, быццам з тых дурняў!

– Карацей кажучы, – перабіў яе Сяргей, – ты супраць Асі, так?

– Сярожа! Зразумей мяне: я проста не змагу! Не змагу прывыкнуць да чужога дзіцяці!

– Што ж рабіць? – ціха прамовіў ён.

– Не ведаю. Мне толькі здаецца, што на цябе навалілася нейкае кароткачасовае насланнё. Я разумею: стала шкада дзяўчынкі, ды яшчэ такой прыгожай. Але дзе ж ты ўсіх пашкадуеш?

– А трэба шкадаваць! У вайну апошнім кавалкам дзяліліся. Чужых дзяцей кармілі, а самі на адной бульбе сядзелі.

– Што ты параўноўваеш?! Тады час такі быў! А цяпер кожны аб сабе дбае. Бо хоча лепш пражыць, што ж тут дрэннага?

– Вось як! Не думаў, што і ты такая!

– Пры чым тут я! Ты зірні навокал, прыслухайся, пра што людзі гавораць!

– Ну што ж, – пасля нядоўгага маўчання прамовіў ён, – пайду, заўтра рана ў рэйс.

– Пераначаваў бы...

– Ад цябе далёка дабірацца. Яшчэ спазнюся. І настрою няма. Такі камень на душы – хоць вешайся! Праўду мая бабуля казала: "Усё ў пару трэба рабіць". А так...

Наступіла цішыня. Абое моўчкі сядзелі на канапе. Сяргею хацелася як мага хутчэй выйсці на вуліцу, але ён працягваў сядзець. Ні аб чым такім і не думаў. Ён толькі баяўся, што Галя можа спытаць пра іх далейшы лёс. А што ён мог адказаць? І сам не ведаў. Але, на ягонае шчасце, яна ні аб чым і не спытала.

Моўчкі праводзіла яго ў прыхожую. Ён хуценька абуў чаравікі, апрануў куртачку.

– Спакойнай ночы! – ціха прамовіў на развітанне.

– Бывай! – Яе твар кранула ледзь прыкметная ўсмешка. Ні болю, ні адчаю не было ў яе вачах.

Сяргей спусціўся на ліфце і выскачыў на вуліцу. Не азіраючыся, пашыбаваў да трамвайнага прыпынку.

Назаўтра Ігар Пятровіч першым сеў за руль. Сяргей сядзеў побач, глядзеў на дарогу, на пажоўклыя

бярозкі і думаў пра сваё недарэчнае жыццё. Да Галі вырашыў пакуль не прыязджаць, нават лістоў не слаць. Добра ведаў, што тая будзе чакаць яго з пакаяннем. Але ён таксама не лыкам шыты!

І калі спакойна ва ўсім разабрацца, то і яе можна зразумець. Што яна нервовая – гэта факт. І тут ён нават верыў ёй. З яе характарам нават на сваё дзіцё можа не хапіць ні сілы, ні цярпення. А чужое будзе яшчэ больш выводзіць з раўнавагі. А калі яшчэ і вучоба не заладзіцца ў Асі, тады што? Не ўсе ж вучацца на пяцёркі. Ён сам у школе мучыўся.

Што ж тады рабіць? Можа, і сапраўды пакінуць Асю? Ад такой думкі ажно жар ударыў яму ў галаву. Ён успомніў, як яна моцна абдымала яго ручкамі за шыю. А колькі даверу і спадзявання было ў яе вачах! Да гэтай пары стаяў у вушах яе пяшчотны галасок: "Я буду цябе чакаць!"

Маленькі чалавек спадзяецца на яго, чакае, а ён...

"Здраднік – вось хто ты!" – у думках аблаяў ён сябе. І Сяргей вырашыў у наступны ж дзень наведаць Асю.

## Раздзел трэці

Як толькі прыехалі ў Віцебск, Сяргей хуценька здаў дарожны ліст у дыспетчарскую і накіраваўся ў горад, па гасцінцы для Асі. Бо заўтра цягнік адпраўляўся на Оршу а палове дзевятай – нічога не паспееш купіць.

У дзіцячым магазіне яму спадабалася невялікая зялёная сумачка, на якой была намалявана вясёлая вавёрачка. Пасля купіў белага мядзведзя. Трэба было і аб ласунках падумаць. Купіў яблыкаў, арэхаў і тры кілаграмы цукерак. Бо яму хацелася пачаставаць усіх хлопчыкаў і дзяўчатак з яе групы. У Оршы дарога была яму знаёмая. Толькі ўваліўся са сваімі клункамі ў калідор дома дзяцей, як сустрэўся з загадчыцай. Ён павітаўся.

– А вы да каго? – бліснуўшы шкельцамі акуляраў, спытала яна.

– Да Асі. Я нядаўна прывозіў яе да вас, памятаеце?

– А-а... Прыгожанькая такая, – яна ўсміхнулася.

– Як яна тут у вас?

– Прывыкае. Спачатку сумавала, нават плакала. Але хутка пасябравала з дзяўчаткамі. Зойдзем у кабінет, – прапанавала яна.

Яны прайшлі ў канец калідора і падняліся на другі паверх.

– Ну, як вашы справы? – загадчыца села за стол.

– Рыхтую паперы. Вось толькі з жаніцьбай не ўсё атрымліваецца.

– Гаварылі нявесце пра Асю?

– Больш за тры гадзіны ўгаворваў, – Сяргей уздыхнуў.

– Разумею...

– Але вы не падумайце чаго! – перабіў яе Сяргей. – Я абавязкова забяру Асю! Тут вось прывёз сёе-тое, – ён дастаў маленькую сумачку, цукеркі і яблыкі.

– Ну і цукерак вы набралі! – здзівілася загадчыца.

– Дык жа на ўсю групу! Няўжо нельга?

– Па адной можна раздаць. Хадзем, я правяду вас, – жанчына паднялася з-за стала, і яны выйшлі з кабінета.

Калі ўвайшлі ў даволі вялікі пакой, дзе малыя дзяўчаткі і хлопчыкі гулялі з рознымі цацкамі, Сяргей адразу ж спыніўся ля парога. Усе заціхлі і зірнулі на іх.

– Мой татка прыехаў! – радасна ўскрыкнула Ася і кінулася да яго. Ён падхапіў яе на рукі і пацалаваў у шчаку.

– А што ты мне прывёз? – адразу ж спытала яна.

– Зараз пакажу, – ён апусціў яе на падлогу.

– Давайце зробім так, – загадчыца ўзяла ў яго мяшочак з цукеркамі: – я кожнаму раздам па адной, а пасля вы з Асяй пагаворыце ў нашам прыёмным пакойчыку.

Яна хуценька раздала цукеркі, а што засталіся, працягнула Сяргею.

– Я ж назад не павязу! Раздайце яшчэ каму.

– Тады хадзем!

Загадчыца завяла яго з Асяй у невялічкі пакой.

– Вось тут і пагаварыце, – яна выйшла.

Сяргей сеў на крэсла і ўзяў Асю на калені.

– Ну, расказвай, як тут жывеш?

– Так сабе. А што ты мне яшчэ прывёз?

– Зараз убачыш! – ён пасадзіў яе на крэсла, а сам дастаў з сумкі мядзведзя, а пасля надзеў ёй цераз плячо маленькую сумачку.

– Якая прыгожая! – ускрыкнула Ася. – Давай туды пакладзем арэшкаў і цукерак.

– І яблыкаў прывёз! – ён перадаў ёй гасцінцы.

– Як многа! – Ася зазірнула ў сумку.

– Пачастуеш імі сваіх сябровак у групе, добра?

– Добра. Толькі ў маю сумачку яшчэ пакладзем, – яна з'ела цукерку і ўзялася за яблык.

– Цябе тут ніхто не крыўдзіць? – ён пагладзіў яе па галоўцы.

– Не-а... А калі ты мяне забярэш дамоў? – Ася зірнула яму ў вочы, нават яблык есці перастала.

– Хутка забяру.

– Доўга чакаць?

– Як табе сказаць... Аднаму цябе не аддаюць. Спачатку трэба знайсці другую маму.

Ася задумалася, а пасля сказала:

– Дык ты хутчэй шукай!

– Якая ты шустрая! – ён прыціснуў яе да сябе. – Не так проста знайсці! Я ж хачу, каб яна добрая была. Цябе любіла, нам смачную вячэру гатавала.

Каля дзвюх гадзін прабыў Сяргей з Асяй. Неўзабаве прыйшлося развітвацца, бо ў Асінай групе быў абед, а пасля сон.

Вяртаючыся прыгарадным цягнікам у Віцебск, ён усю дарогу думаў пра тое, што ж рабіць далей. І як ні стараўся – нічога не прыдумаў. Адно рашыў цвёрда: да Галі пакуль не ехаць. Але што сказаць сваёй маці? Праз які тыдзень паедзе дамоў, каб дапамагчы выкінуць гной ды заараць на зіму агарод.

Так чакала яна ягонай жаніцьбы, а тут... Не, пакуль і маці нічога гаварыць не трэба. Можа, і Галя яшчэ адумаецца. А што? Усякае бывае. А калі не, то такой бяды. Хаця і падабалася яна, але адчуваў ён – жыць з ёй было б нялёгка. І не таму, што яна нервовая ці яшчэ там якая... У кожнага ёсць свае недахопы. Тут другое: прыйшлося б падстройвацца пад яе. А ў яго ўзросце зрабіць такое няпроста. І чагосьці не хапала ў іх адносінах. Заўсёды адчувалася нейкая мяжа...

Прыехаўшы дамоў, ён хуценька прыбраў у кватэры, наварыў бульбы ў лупінах і пачаў упісваць з селядцом. А пасля ўлёгся на канапе, хацеў падрамаць, але ад думак было не адчапіцца.

Вось табе і аднапакаёвая кватэра! Як жыў у інтэрнаце, то не так адчуваў адзіноту. А тут цішыня пачынала дзейнічаць на нервы. І хаця ў думках суцяшаў сябе, што з Галяй жылося б не соладка, усё-ткі ў глыбіні душы было шкада з ёй развітвацца. Але нічога не паробіш – трэба пакуль што чакаць.

Праз два дні пабываў у маці. Вывез з хлева гной, узараў агарод. Стараўся быць вясёлым, бо калі б маці даведалася пра ўсё, то адразу ж злягла б у ложак. Яна ні аб чым такім і не пыталася. Праўда, вечарам, якраз перад самым ад'ездам, сказала:

– Прывёз бы ты калі сваю Галю. Я б паглядзела, і суседзі перасталі б языкамі часаць. Уся ж вёска чакае тваёй жаніцьбы.

– Ім што – няма чым больш заняцца?

– Чаму ж няма. У кожнага свае клопаты.

– Я не раз гаварыў ёй. Ды дзе ж ты яе з Мінска выцягнеш!

– А калі ж распісвацца намецілі?

– Думалі на Кастрычніцкія святы, а цяпер перанеслі на Новы год. Якія паўтара месяца нічога не рашаюць.

– Ну што ж – няхай і на Каляды, таксама някепска.

– Трэба збірацца, – ён зірнуў на гадзіннік. – На апошні аўтобус магу спазніцца.

Хуценька выбраўся з-за стала, паклаў у вялізную сумку яблыкаў, некалькі слоікаў перацертых з цукрам журавін ды, пацалаваўшы маці ў шчаку, падаўся на аўтобусны прыпынак.

Праз якіх сорак хвілін быў ужо ля свайго дома. Зайшоў у пад'езд, выцягнуў з паштовай скрынкі газету, а з яе выпала паштоўка.

На чыстым баку было напісана: “Сярожа! Як будзеш у Мінску, то пазвані. Трэба пагаварыць. Галя”.

Ён подбегам кінуўся на свой трэці паверх. Адамкнуў дзверы, аднёс сумку на кухню і зноў перачытаў паштоўку.

Адумалася ўсё-ткі! Ён адчуваў, як шуганула ў грудзях гарачая хваля радасці.

Зноў узяў у рукі паштоўку. Доўга разглядваў, а пасля весела падміргнуў Асі, якая з надзеяй пазірала на яго з фотакарткі ў невялічкай рамачцы, якую прымацаваў на сцяне. Заўтра ў яго чарговы рэйс. Там усё і вырашыцца.

Як толькі назаўтра прыехаліў Мінск, ён адразу ж пазваніў Галі на работу. На яго здзіўленне, на кватэру да сябе яна не запрасіла, а прызначыла спатканне ў падземным пераходзе на плошчы Перамогі ў васемнаццаць гадзін.

Ён прыехаў крыху раней і паволі прагульваўся там, а пасля спыніўся каля тэлефона-аўтамата і стаў чакаць. І да таго задумаўся, што нават не прыкмеціў, як перад ім нечанака з'явілася Галя. У кароценькім белым плашчыку, з новай прычоскай, уся такая ўзнёсла-радасная, яна пазірала на яго з весялосцю, хаця ён прыкмеціў нейкую разгубленасць у яе вачах.

Яны павіталіся.

– Прабач, што не запрасіла на кватэру, але там нашы прыехалі з Крыма. Ды не ў гэтым справа... – яна на хвіліну змоўкла, а пасля акінула яго збянтэжаным позіркам і дадала: – Так атрымліваецца, што не змагу я выйсці за цябе замуж...

– З-за Асі? – ціха спытаў ён.

– Не, – яна ўздахнула. – Тут зусім іншае. Прыехаў чалавек, якога я не бачыла амаль дзесяць

гадоў. Мы разам вучыліся ў кансерваторыі. Пасля ён з'ехаў у Ленінград, ажаніўся, развёўся... У Хабараўску працаваў, а цяпер будзе выкладаць у нашай кансерваторыі.

– І ты кахала яго?

– Як табе сказаць... Кахала калісьці, – апусціўшы галаву, адказала яна. – Ён на кожны Новы год прысылаў мне віншавальную паштоўку, – яна зірнула на яго і вінавата ўсміхнулася. – Старалася яго забыць, але нічога не атрымлівалася. А тут з'явіўся нечакана ды ледзь не ў ногі... Ты не паверыш – нават заплакаў... Пакалашмаціла яго жыццё. Я ледзь пазнала. Старэй за цябе выглядае, а ён жа мой аднагодак.

– Дык, можа, у чарку заглядвае? – з весялосцю ў голасе спытаў ён.

– Не ведаю... – разгублена адказала яна. – А чаго ты адразу ж павесялеў? Рад, што ад мяне пазбавіўся?

– А ты хочаш, каб і заплакаў.

– Ды не! З чаго ты ўзяў?

– Успомніліся словы адной песні. Веліканава раней спявала.

Ён змоўк, бо адчуваў сябе ніякавата, хацелася хутчэй з ёй развітацца.

– Апошняя да цябе просьба, – ён пачухаў патыліцу.

– Гавары. Усё зраблю! Што-небудзь Асі дастаць?

– Ды не! Напішы мне ліст.

– Навошта?! – здзівілася яна. – І што я там напішу?

– Напішаш, што адмаўляешся выйсці за мяне замуж. А я твой ліст маці пакажу, каб не дакарала мяне ў кожны прыезд, што я ва ўсім вінаваты, зразумела?

– Добра. Я заўтра ж напішу! – яна змоўкла, а пасля амаль шэптам спытала: – Да Асі ездзіў?

– Быў нядаўна.

– І як яна там?

– Прывыкае да новых абставін ды ўсё пытаецца, калі яе забяру.

– Я разумею, што прынесла табе адны непрыемнасці, але ўсё так склалася... Прабач мне за ўсё! Калі што якое, то пішы! – яна хуценька павярнулася і пайшла.

Ён крыху пастаяў, а пасля няспешна пасунуўся ў метро. На яго здзіўленне, на душы было лёгка і светла. Застаўся, праўда, невялікі гаркаваты асадак, але ён супакойваў сябе тым, што ўрэшце ўсё вырашылася само сабой. Даўняя думка тачыла яго: з Галяй яму было б не соладка. Ён адчуваў гэта, але абставіны так складваліся, што прыходзілася прымушаць сябе на такую жаніцьбу.

Вось толькі за маці хваляваўся. Рашыў чакаць ліста ад Галі, а пасля ўжо ехаць з ім у вёску. Але цяпер яго даймала другая думка: што рабіць з Асяй? Думаў аб ёй у кожнай паездцы. Думаў вечарамі і ноччу, але ўсё ўпіралася ў жаніцьбу. Здрадзіць дзяўчынцы не мог, бо разумеў, што будзе пасля ўсё жыццё дакараць сябе.

Толькі праз тыдзень атрымаў ліст ад Галі. Адразу ж адправіўся з ім да маці. Прыехаў якраз пад вечар. Нялёгка было пачынаць размову, але нічога не паробіш – прыйшлося выкласці ўсё, як ёсць.

Маці спачатку не паверыла, але калі сама перачытала пісьмо, то адразу ж заплакала. І як ні суцяшаў яе, як ні даказваў, што і ў Віцебск Галя не давала згоды пераехаць, і не кахала яго – нічога не дапамагло. Супакоілася толькі тады, калі даў ёй слова, што абавязкова ажэніцца ў наступным годзе.

Ранічкай выехаў у Віцебск. І тут яму пашчасціла. Сядзеў, пазіраў у акно і ні аб чым такім не думаў. Перад ім сядзелі дзве жанчыны і размаўлялі. Ён не прыслухоўваўся да іх гутаркі, але калі адна з іх спытала: “Як жа яму ўдалося ў Мінску без прапіскі кватэру атрымаць?”, то адразу ж настрыў вушы.

“Распісаўся з адной фіктыўна. А пасля размянялі трохпакаёўку. Вядома ж – выкінуў не адну тысячу!” – адказала другая.

І тут у яго галаве мільганула думка: “А што, калі б і мне з якой жанчынай заключыць фіктыўны шлюб? Адразу ж і Асю забраў бы. А пасля спакойненька шукаў бы сабе жонку”.

Ён ажно павесялеў. Прыехаў у Віцебск, забег у магазін, купіў таго-сяго з харчу, а сам перабіраў у памяці знаёмых жанчын. Пасля вячэры прылёг на канапе і пачаў думаць.

Адразу ж успомніў Нінку Канапацкую. Прыкмеціў яе даўно, калі яшчэ вучыўся ў дзесятым класе, а яна ў восьмым была. Перад арміяй крыху загульваў з ёй. Аднаго разу нават дахаты яго праводзіла.

А сама ж у суседняй вёсцы жыла. Не так, праўда, і далёка, але ж праз сасновы барок трэба было прайсці. Памкнуўся назад праводзіць, а яна ані блізка! З характарам была дзяўчына!

Бацька ў яе рана памёр, жыла з маці. Пасля універсытэт у Гомелі скончыла, адразу ж замуж выскачыла, неўзабаве і дзяўчынка нарадзілася. Пасля кватэру ў Маладзечне атрымала, а тут бяда – памёр муж. Малады хлопец, працаваў галоўным інжынерам на заводзе. Сяргей бачыў яго некалькі разоў.

Пасля Нінка з маці і дачкой перабраліся ў Салігорск. Але амаль кожнае лета прыязджаюць у сваю вёсачку. Цягне ў родныя мясціны. І ў кожны свой прыезд распытвае яна ў суседзяў пра яго. А што тыя могуць сказаць? Халасцякуе ў Віцебску. Вось і ўвесь адказ.

І сама Нінка чамусьці другі раз замуж так і не выйшла. Вось толькі адраса яе не ведаў. Можна было б пад’ехаць у вёску і спытаць у старой Сымоніхі, але пачнуцца размовы, яшчэ да ягонай маці дойдзе.

Салігорск не такі ўжо вялікі горад. Не больш за дзесяць школ будзе, паспее ўсе абысці.

Паездку рашыў не адкладваць. Праз два дні ў яго выхадныя, якія прыпадалі якраз на сераду і чацвер.

## Раздзел чацвёрты

У Салігорск Сяргей дабіраўся аўтобусам. Той, праўда, ішоў далей, ажно да самых Мікашэвічаў, а пасля вяртаўся зноў у Мінск. Выходзіла, што ён меў на ўсе свае справы больш за тры гадзіны часу.

Гарадок і сапраўды быў невялічкі. Крыху пастаяў ля гасцініцы, а пасля няспешна пасунуўся далей, бо непадалёку ўбачыў школу. І тут успомніў, што не ведае прозвішча Нінкі. І якая там Нінка?! Так цяпер яе ніхто і не кліча. Даўно Нінай Паўлаўнай стала. У школе была Канапацкая. А ў замужжы, напэўна ж, змяніла прозвішча.

У настаўніцкую заходзіць не хацелася. І ён спыніўся ў калідоры ля акна. І тут ўбачыў, як па лесвіцы спускалася з другога паверха маладая дзяўчына ў чырвоным гальштуку. "Піянерважатая, – мільганула думка, – трэба спытаць!"

Нясмела зрабіў некалькі крокаў насустрач.

– Прабачце! Ці працуе ў вас Ніна Паўлаўна?

– Працуе, – спакойна адказала дзяўчына і зірнула на гадзіннік.

– Вы крыху пачакайце, хвілін праз сем скончыцца ўрок, і яна будзе ў настаўніцкай.

– А вы б не змаглі яе паклікаць сюды?

– Добра, – дзяўчына загадкава ўсміхнулася і пайшла.

Хвіліны цягнуліся марудна. Урэшце празвінеў званок. І адразу ж пачуўся тупат ног і той своеасаблівы гул, які нагадваў яму далёкія школьныя гады.

Малыя бегалі па калідоры, выбягалі на вуліцу. Сяргей стаяў спінаю да акна, паглядваў туды-сюды, бо вельмі хацелася ўбачыць Ніну здалёк. Зноў празвінеў званок. Вось табе і на! Хацеў ужо выйсці на вуліцу, як убачыў Ніну. Яна ішла па калідоры. У карычневай вязанай сукенцы і з журналам у руках.

Убачыўшы яго, заўсміхалася і, падыходзячы, сказала:

– Ну і госць! Дзень добры, Сярожа!

Ён адказаў на прывітанне і не мог адвесці ад яе вачэй.

– Ты так цудоўна выглядаеш, – урэшце сказаў ён, – што хоць заўтра жаніцца з табою!

– За цябе згодна хоць сёння!

Яны засмяяліся.

– Ты тут праездам, ці як? – працягвала яна.

– Да цябе прыехаў. Ёсць адна справа... А праз тры гадзіны мой аўтобус на Мінск.

– Тады хадзем да мяне. Ты пачакай хвілінку, я толькі пакладу журнал і апрануся.

Яна хуценька адправілася ў другі канец калідора. Калі выйшлі на вуліцу, ён спытаў:

– А ўрокаў у цябе больш няма?

– Не хвалюйся – няма. – Яна зірнула на яго і ўсміхнулася.

– Можа, дзе так пагаворым? – ён запаволіў крок. – У цябе там маці, дачка...

– Нікога няма! – яна ўзяла яго пад руку. – Баязлівец! Якім быў, такім і застаўся!

– А дзе ж яны?

– Мая Света даўно замужам. А я больш за год у бабулях хаджу!

– Няўжо?! – здзівіўся ён. – Я ж думаў – яна дзесяты заканчвае.

– На другім курсе ва універсітэце займаецца... А вось і мой дом.

Яны падняліся на другі паверх. У прыхожай распрануліся.

– Значыць, так: я зараз што-небудзь згатую, а пасля пагаворым.

– Не, не! – ён дакрануўся да яе пляча. – Нічога не хачу, дый часу няма! Пастаў лепш чаю.

– Добра, – яна падалася на кухню, а ён зайшоў у залу.

Утульна было тут, прыбрана... Кожна рэч займала сваё месца. Не тое што ў яго.

Чай быў духмяны, ды яшчэ з малінавым варэннем.

– Колькі ж гэта мы з табой не бачыліся? – спытала Ніна.

– Гадоў дзесяць, калі не больш. З'ехала з нашай Віцебшчыны ў такую далячынь, дзе ж тут сустрэнешся?

– Так атрымалася... – Яна ўздыхнула, а пасля спытала: – Чаму ты ўсё халасцякуеш?

– Ніхто замуж не ідзе.

– Бо не прапаноўваў!

– А чаму сама ў другі раз не выйшла? Ці яшчэ збіраешся?

– З дзіцём не так проста было выйсці. А пасля і хвароба прыбілася.

– А што ў цябе?

– Хранічны бранхіт. Так што цяпер аб замужжы і не думаю.

– Чаму? Табе ж яшчэ і сарака няма.

– Якраз у гэтым годзе споўнілася.

– А выглядаеш на трыццаць.

– Не ў гэтым справа... Сваталіся тут да мяне, і не адзін раз. Але што з таго?

– Не падабаліся жаніхі? – працягваў дапытвацца ён.

– Па-рознаму было. Гадоў з пяць таму ледзь за ўрача аднаго не выйшла. На моры пазнаёміліся. Усё халасцяком прыкідваўся. А на самай справе – даўно жанаты. Як даведалася, што збіраецца кідаць дзвюх маленькіх дачок, то адразу ж выкінула яго з галавы. На чужым горы сваё шчасце не збудуеш. І прывыклі мы з маці жыць удзвюх. Яна цяпер у Светы за няньку.

– Ну што ж, – Сяргей паставіў пустую шклянку на стол, – прыйдзецца табе за мяне выходзіць.

– Хопіць шуткаваць, – Ніна ўсміхнулася. – Лепш раскажы – чаго прыехаў?

– Я не шуткую! – з якое імгненне ён загадкава пазіраў на яе, а пасля расказаў пра Асю.

– І што ж ты хочаш рабіць далей?

– Хачу забраць яе да сябе, ды толькі нічога не атрымліваецца – аднаму не аддаюць.

– Бо трэба спачатку ажаніцца, а пасля Асю забіраць!

– Так і было задумана. Хацеў распісацца тут з адной, ды ў апошні момант яна адмовіла.

– З-за Асі?

– Ды не. Вярнуўся да яе былы ўхажор, якога ў маладосці кахала.

– Вось як?! – здзівілася Ніна і рассмяялася. – Чым жа я табе дапамагу?

– Давай заключым з табой фіктыўны шлюб.

– Як гэта?! – У Ніны раптоўна прапаў смех.

– Аднясем заяву ў загс, праз месяц распішамся. Ты будзеш тут жыць, я ў Віцебску. Буду жанаты – мне і Асю аддадуць. Вось і ўсё. Ты ж усё адно замуж не збіраешся, так?

– Ну, Сярожа! Такога ад цябе не чакала!

– Ты што – пакрыўдзілася?

– З чаго ты ўзяў? Я і сапраўды не збіраюся замуж. А ты пра сябе падумаў?!

– А што тут думаць?

– А як сам надумаеш жаніцца, тады што? Заява ў суд, развод. А ты ведаеш, што за фіктыўны шлюб можаш і ў турму загрымець!

– Хто пра гэта даведаецца?

– Нават калі і не даведаюцца – я на такое не пайду! Стаяць у судзе ды штосьці там плесці, што ў такім узросце не сышліся характарам – гэта не для мяне. Дый маці сваёй што скажаш?! І з Асяй адзін не ўправішся! Тут жаночыя рукі патрэбны: і абмыць, і адзенне купіць...

– Ася ў садзік хадзіла б, – ціха прамовіў ён.

– Ты яшчэ сваіх дзяцей можаш мець. Малады, здаровы... Давай я цябе з адной настаўніцай пазнаёмлю, га? Трыццаць два гады – якраз для цябе.

– Пачынаецца... – Сяргей уздыхнуў.

– А што тут такога! Ды ад яе вачэй не адвесці! Калі б разок убачыў – адразу ж закахаўся б!

– Няўжо?! – ён з усмешкай зірнуў на Ніну.

– Праўду табе кажу! Яна ўсім падабаецца: такая добрая, сціплая... Я не раз пра яе думала: такая дзяўчына прападае.

– Ніна! Каб ты толькі ведала, да чаго мне надакучылі такія прапановы! Такія знаёмствы

нічога не даюць! Быў я аднойчы ў разглёдах. Адчуваў сябе, як той бычок на кірмашы. Толькі рукамі не абмацвалі, а ўсё разглядвалі, ды на пытанні не паспяваў адказваць.

– Сам ва ўсім вінаваты. Каб ажаніўся ў пару – такога б не было!

– Каб жа ведаў, дзе ўпадзеш, то саломкі падаслаў бы!

– І пра Асю хачу сказаць. Шкада такіх дзяўчатак. Але ўсё-ткі гэта чужое дзіця. І чым яна табе прыглянулася?

– Не ведаю. Ды ты сама зірні! – ён дастаў з кішэні картку.

Ніна ўзяла яе ў рукі і доўга разглядвала.

– Якая прыгожая дзяўчынка!

– Дзесьці чакае мяне, – ён узяў у яе картку і схаваў у кішэню. – Хутка паеду да яе, а парадаваць і не будзе чым...

– У другой справе дапамагла б табе, а тут... Праз які месяц-другі Ася пра цябе і не ўспомніць! Яна ж маленькая. Новыя абставіны, сяброўкі.

– Пра што ты гаворыш! Да іх незнаёмая жанчына зойдзе, дык кожная дзяўчынка думае, што гэта яе маці знайшлася!

З якую хвіліну сядзелі моўчкі, пасля ён зірнуў на гадзіннік.

– Ого! Магу спазніцца! Як тут у вас з білетамі?

– Летам цяжэй, а цяпер аніякай чаргі, – Ніна паднялася з канапы, прыбрала са стала. – Можа, праводзіць цябе?

– Не трэба! Адпачывай, – яны выйшлі ў прыхожую. Ён апрануўся.

– Ну, папраўляйся! Галоўнае – на мёд налягай! Ад усіх хвароб дапамагае.

– Ты толькі не крыўдуй на мяне, добра? – яна дакранулася да яго пляча. – Праз які час сам зразумееш, што я мела рацыю.

– Не хвалюйся, бабуля Ніна.

Яны засмяяліся.

– Усяго табе найлепшага!

Ён узяўся за ручку дзвярэй.

– Шчаслівай дарогі!

Сяргей выйшаў на лесвічную пляцоўку.

Толькі купіў білет, як прыбыў аўтобус з Мікашэвічаў. І зноў ад думак было не абараніцца.

На Ніну не крыўдаваў. І сапраўды – навошта ёй такія клопаты?

Можа, толькі пакрыўдзілася, што не прапанаваў ёй па-сапраўднаму выйсці за яго замуж? І такое магчыма. Але ж між імі нічога такога ніколі не было. І калі ўжо на тое пайшло, то застарая яна для яго.

Не, не! Аб маладых дзяўчатах ён і не думаў. З маладой яму ўжо не ўправіцца. Хацелася б знайсці жанчыну, якой крыху за трыццаць, каб яшчэ нарадзіла яму сына альбо дачку. А ў сорак гадоў не кожная згодзіцца на такое.

Пакінуць Асю?! Пакінуць малога чалавечка, які паверыў у яго? Не! Нізашто! Ён заўсёды любіў дзяцей, асабліва малых. Колькі разоў любіў цікавацъ за малымі карапузамі. Корпаецца такі ў пясочку альбо гушкаецца на арэлях, а пройдзе час – і павядзе той атамаход у акіянскія прасторы або зойме крэсла першага пілота.

А дзяўчаткі? Тыя яшчэ хутчэй уступаюць у жыццё. Але цяпер у яго ўсё так складвалася самосабой, што як бы ён ні хацеў забраць Асю, яна ўсёткі можа назаўсёды застацца ў доме дзіцяці.

З Мінска да Віцебска дабіраўся цягніком, інакш прыйшлося б усю ноч сядзець на вакзале. Той марудна поўз, быццам чарапаха, спыняўся амаль ля кожнага слупа. Але а палове восьмай усё ж дачапаў да Віцебска.

Настрою ў Сяргея не было. І адкуль было яму ўзяцца? Як толькі ўваліўся ў кватэру, папіў чаю ды заваліўся спаць.

## Раздзел пяты

Кастрычнік выдаўся на дзіва цёплым і сонечным. Зранку, праўда, там-сям браўся нават невялікі марозік, але пасля, праз якую гадзіну-другую, сонца ўбіралася ў сілу, і такая была цяплынь – хоць распранайся і загарай.

Здавалася, што прырода задобрыла людзей за даждлівае і халоднае лета. Упершыню за сваё жыццё Сяргей так і не скупануўся ў Дзвіне. А з якімі цяжкасцямі даводзілася ўбіраць ураджай! Камбайны буксавалі, асабліва ў нізкіх месцах.

У адзін з такіх дзён Сяргей вяртаўся з магазіна. І тут убачыў хлапчука, які сядзеў на лавачцы ўглыбіні двара і моўчкі плакаў. Непадалёку бегалі дзеці, бо толькі што іх прывялі з дзіцячага садзіка. Хто гушкаўся на арэлях, хто ганяў мячык, а дзяўчаткі завіхаліся ля пясочніцы. Хлапчуку было гады тры, а то і менш. Кідаліся ў вочы яго бялюткія валасы. Сяргей падышоў да яго, моўчкі прысеў побач на лавачку і, асцярожна дакрануўшыся да пляча, ціха спытаў:

– Пакрыўдзіў хто?

Той ускінуў на яго заплаканыя вочы, а пасля сказаў:

– Ды не. Сашка на ровары не дае пакатацца.

– Было б з-за чаго плакаць! – працягваў Сяргей.

– Я ж даваў яму на сваім катацца! Але пасля ён зламаўся. А Сашку нядаўна новенькі купілі. Каб быў у мяне татка, то таксама купіў бы, а ў мамы грошай няма.

І столькі адчаю і болю было ў ягоных вачах, што Сяргей не вытрымаў і сказаў:

– Я куплю табе ровар!

– Калі?! – хлапчук запытальна зірнуў на яго і выцер слёзы.

– Заўтра. Прыходзь пасля садзіка на гэтую ж лавачку. А цяпер пакажы, як выглядае твой ровар.

– Хадзем, – хлапчук узяў яго за руку. – Вунь Сашка носіцца!

Яны падышлі да арэляў. Неўзабаве побач праімчаўся на ровары чарнявы хлапчук.

– Два колы, бачыце!

– Бачу. А цябе як зваць? – ён прысеў ля яго на кукішкі.

– Ігар.

– А я дзядзя Сярожа, – ён пацiснуў хлапчуку ручку. – Бывай! Да заўтра!

Тут да Iгара падышоў другi хлапчук, i яны пабеглi па дарожцы ля вялiзнага цаглянага гмаха, якi цягнуўся на добрую сотню метраў уздоўж вулiцы.

Сяргей крыху пастаяў, а пасля накiраваўся да свайго дома, якi стаяў побач.

Грошы ў яго вадзiлiся, бо зарабляў няблага – да трохсот выходзiла, а ў якiя месяцы набягала i больш. Нiколi не курыў, а ў чарку нават i не заглядваў. I не таму, што стрымлiваў сябе, а проста не хацелася... Мог у якое свята прыняць крыху, але нiколi не напiваўся. Бо яшчэ са школы пасябраваў са спортам. Някепска бегаў, а пасля захапiўся футболам. Каманда iхняга калгаса, за якую ён выступаў, нават заваявала бронзавыя медалi – першынство рэспублiкi па "Ураджаi". Праводзiлiся ў той час такiя спаборнiцтвы.

Дый колькi ўжо там будзе каштаваць дзiцячы ровар? Не больш за трыццаць рублёў. Адна смехата. А колькi радасцi для хлапчука!

Успомнiлася яму, як у дзяцiнстве самому хацелася прыдбаць канькi-снегуры. Але ж хто купiць. Бацькi не было, бо той памёр, калi Сяргею i двух не было. Дачакалася яго мацi з вайны. Хаця i пакалечаны, але ўсё-ткi вярнуўся. Вельмi сына хацеў, быццам прадчуваў, што нядоўга самому жыць засталося. Праз якi год з лёгкiмi нелады пачалiся. Так i не ўратавалi яго ўрачы.

Мацi ў калгасе, не да канькоў было. Што там гаварыць – галадалi. Добра яшчэ, што яна ў дзявоцтве на швачку вывучылася. Шыла вечарамi. Так i жылi – ледзь канцы стачвалi.

А канькi яму падарыла iхняя суседка – цётка Сарафiна. Дзяцей у яе сваiх не было, а жылi спраўна, больш за дваццаць калодаў пчол мелi. Яе бацька, стары Вiнцук, часцяком частаваў Сяргея мядком.

Якраз перад самым Новым годам гэта было. Ён тады ў другi клас хадзiў. Упершыню яны з

маці рашылі паставіць ёлку. Праўда, цацак у іх не было. Але маці рабіла іх з паперы і размалёўвала алоўкамі. У той вечар і завітала да іх цётка Сарафіна. Прынесла тры бліскучыя шарыкі і, загадкава ўсміхаючыся, паставіла на лаву невялічкую каробачку.

Шарыкі яны тут жа павесілі на ёлку. Забрала яна ў маці сукенку і ўжо ля самага парога сказала: “А ў каробцы падарунак для Сярожкі”. Развіталася і выйшла.

Спачатку ён падумаў, што ў каробцы новыя бацінкі. Але ж у яго яшчэ свае спраўныя. Зняў крышку і аслупянеў. Там ляжалі, пабліскваючы нікеліроўкай, новенькія снегуры.

Ад радасці ноччу не мог заснуць. Канькі ляжалі побач, на невялічкім зэдліку. Ледзь раніцы дачакаўся. Прыкруціў іх вяровачкамі да старых валёнак і падаўся на рэчку.

Цяпер, праўда, не тыя часы. Людзі спраўней пачалі жыць, але ж не ўсе. У наступны дзень Сяргей у дзесяць гадзін быў ужо ва універмагу. Дзіцячых ровараў было розных фасонаў, але такога, які паказаў яму Ігарок, якраз не было. Былі крыху большыя. І ён купіў блакітнага прыгажуна за трыццаць два рублі. Прывёз яго ў кватэру і пачаў даводзіць да парадку. Прымацаваў два невялічкія люстэркі, фару, падцягнуў ключыкамі ўсе гайкі.

Пасля ўзяўся за бялізну. Калі са сняданнем або вячэрай ён вялікіх клопатаў не меў, то бялізну мыць так і не навучыўся. Такая дурная праца – ворагу не пажадаеш. У інтэрнаце бялізну мянялі, а з сарочкамі сам упраўляўся. А тут усе пасцельныя прычандалы даводзілася абнаўляць.

Усё-ткі да вечара ўправіўся. Зірнуў на гадзіннік, а там палова шостай. Даўно дзяцей з садзіка папрыводзілі. Падбег да акна. Так і ёсць! Ігарок сядзеў на тым жа месцы. Ён схапіў ровар і падаўся на двор.

– Даўно чакаеш?

– Ды не, – Ігарок падняўся з лаўкі.

– Толькі такія былі, – Сяргей апусціў ровар на зямлю. – Пракаціся. Можа, сядло давядзецца апусціць.

– Гэты лепшы за Сашкаў! – ускрыкнуў хлапчук. Ён асцярожна вывеў ровар на асфальтавую дарожку, усеўся на яго, спрытна разы са два адштурхнуўся нагой і паехаў.

Завярнуў па дарожцы ўлева і паімчаўся ўздоўж свайго дома, пасля развярнуўся і пад'ехаў да яго.

– Як машына? – спытаў Сяргей.

– Добрая! І ззаду ў люстэрка ўсё відаць!

– Вось і цудоўна. Катайся! Толькі на вуліцу не выязджай, бо пад машыну трапіш!

– Я ведаю, дзядзя Сярожа! Гэта ўжо мой ровар?

– Твой. Як пойдзеш дамоў – забірай з сабой.

– А што я маме скажу?

– Скажаш – дзядзя Сярожа падарыў. Бывай! – ён накіраваўся да свайго пад'езда.

Зайшоў у кватэру і ўзяўся гатаваць вячэру. Пасля адразу ж заваліўся спаць, бо заўтра раніцой чарговы рэйс на Мінск.

Дні так праз тры, была якраз нядзеля, толькі ён выйшаў з пад'езда, як пачуўся голас Ігарка.

– Дзядзя Сярожа, пачакайце!

Ён спыніўся. Хлапчук імчаўся да яго на ровары.

– Як справы? – замест прывітання спытаў ён. – Ровар не зламаўся?

– Не. Мая мама хоча з табой пагаварыць.

Тут да іх падышла маладая жанчына ў белай куртачцы і джынсах.

– Дзень добры!

Ён адказаў на прывітанне і зірнуў на Ігарка.

– Скажыце, гэта вы – дзядзя Сярожа?

– Я, а што?

– Навошта ж вы такое зрабілі? Я так напалохалася ў той вечар. Прыходзіць мой шалапут з новенькім роварам. Спачатку падумала, што так чыйсьці ўзяў. А ён у адказ: “Дзядзя Сярожа падарыў!”

– Правільна, – Сяргей пагладзіў хлапчука па галоўцы. – Нядаўна ён тут сядзеў на лавачцы і плакаў, бо Сашка на сваім не даваў пракаціцца. Я сам без бацькі вырас.

– І пра гэта расказаў?! – здзівілася жанчына. – Ну, Ігарок?

– А што тут такога? У нас жа і праўда таткі няма, – адказаў той.

– Дык кожнаму сустрэчнаму аб гэтым трэба расказваць?! – накінулася на яго маці.

– Ды не крычыце вы на яго, – заступіўся ён за Ігарка.

– Папрашайнічае, а маці разлічвайся! А на якія шышы?!

– Ды вы што?! Гэта ж падарунак! – адказаў Сяргей.

– Вы такі багаты? – яна зірнула на яго і ўсміхнулася.

– Думаю, што багацейшага за мяне ў Віцебску няма, – з сур'ёзнай мінай на твары адказаў ён.

– Вось як! Ну што ж – вялікі вам дзякуй. Давайце знаёміцца: Валя, – яна працягнула яму руку.

Ён асцярожна дакрануўся да яе маленькай далонькі.

– Заходзьце калі да нас. Мы ў дваццаць першай кватэры жывем.

– Як зломіцца ровар, тады і завітаю, – з усмешкай адказаў ён.

– Гэта ён можа, – яна з дакорам зірнула на сына. – Вы думаеце, у яго цацак няма?

– Старыя ўсе, – сцішаным голасам адказаў Ігарок. – У Сашкі яшчэ і баскетбол ёсць.

– Ну, ведаеш! – яна ўзяла яго за ручку. – Знайшоў з кім раўняцца! Ягоны бацька на легкавушцы раз'язджае!

– Паеду я. Вунь ужо Сашка на сваім носіцца.

– На вуліцу не выязджай! Вушы абарву! – яна паправіла на ім шапачку.

– А вы, напэўна ж, з новага дома? – звярнулася яна да Сяргея.

– З новага. Трыццаць пятая кватэра. Уважылі ўрэшце старога халасцяка.

– Цяпер ад нявест адбою не будзе!

– Якое там... – ён махнуў рукой.

– Мама! – пачуўся голас Ігарка.

– Пайду. Бывайце! – яна подбегам кінулася да сына.

Сяргей зірнуў ёй услед, а пасля накіраваўся да трамвайнага прыпынку. Вось дык маці ў Ігарка! А муж? Напэўна ж – разышліся ці зусім не было? Ды не. Тут штосьці іншае.

Ён сеў у трамвай, даехаў да Смаленскага рынка, а пасля паволі дайшоў да кінатэатра "Мір". Паказвалі "Вяселле ў Малінаўцы". Бачыў не раз, але рашыў схадзіць. Пасля кіно пешкі вяртаўся дамоў.

Кастрычнік даўно гаспадарыў у горадзе. Здаецца ж, нядаўна вясна была, а праз які месяц і зіма завітае. Але ў яго чамусьці радасна было на душы. Што там гаварыць – спадабалася яму маці Ігарка. І да сябе ж яна запрашала. Няўжо і ён ёй прыглянуўся? Не, такога не можа быць! Скінуць бы з дзесятак гадоў – іншая справа. А так...

А калі б сёння вечарам завітаць да яе на чай? Сам ведаў – няёмка. Дый прычына патрэбна. Але ж да таго захацелася яе ўбачыць, што ён ажно раззлаваўся на сябе. Спрабаваў у думках супакоіцца, ды нічога не атрымлівалася.

Зайсці то можна было б. А калі хто іншы будзе? Вось каб дамовіўся з ёй – іншая справа. Але ж не дапетрыў пра гэта сказаць у час размовы.

Між тым ён і сам не прыкмеціў, як апынуўся ля свайго дома. І тут убачыў Ігарка. Той гушкаўся на арэлях, а ровар ляжаў на траве. Ён падышоў да яго.

– Не баішся?

– Не-а! – крыкнуў ён і яшчэ мацней пачаў разгойдвацца. Праз якую хвіліну-другую прытаміўся і на хаду спрытна саскочыў з арэляў.

– Так і нос можаш расквасіць! – Сяргей падхапіў яго на рукі і падкінуў угору. Пасля злавіў і асцярожна апусціў на зямлю.

– Што я ў цябе хацеў спытаць, – ён пачухаў патыліцу. – А-а... Успомніў! Пра баскетбол. Гэта што – мячык такі ёсць у Сашкі?

– Ды не! Гульня такая! Націскаеш, а маленькі мячык падскоквае – і ў кошычак. Хто хутчэй націсне – той выйграе! Там прадаецца, дзе і ровары, у жоўтых каробках.

– Ігарок, абедаць! – пачуўся з форткі голас Валі.

– Мама кліча, пабягу! – ён падняў ровар і паімчаўся да свайго пад'езда.

І толькі тут Сяргей успомніў, што ён і сам забыўся паабедаць у сталоўцы. Самому гатаваць марудна, ды і не было з чаго. Прыйшлося вяртацца.

Пасля абеду рашыў падысці да універмага. У нядзелю там выхадны, але ж канец месяца, магчыма, і працуе. Яму пашчасціла: універмаг быў адкрыты.

Адразу ж зайшоў у аддзел цацак. І амаль ля самага ўвахода ўбачыў складзеныя адна на адну жоўтыя каробкі. На іх было напісана: "БАСКЕТБОЛ".

Грошы ў яго заўсёды былі з сабою. І не рубель-два, як у гэтых шчаслівых жанацікаў, якім выдавалі жонкі толькі на абед, а больш за сто рублёў. Баскетбол каштаваў дванаццаць з паловай.

Маладая прадаўшчыца адкрыла каробку, і ён убачыў мініяцюрную баскетбольную пляцоўку. Дзяўчына спрытна націснула на адну клавішу. І адразу ж угору весела падскочыў маленькі мячык. Тады і ён націснуў на такую ж клавішу, толькі з другога канца. Мячык зноў падскочыў. Не паспеў убачыць нумар лункі, у якой апынуўся мячык, як той зноў падскочыў і ўпаў у карзіну.

– Адзін нуль у вашу карысць! – усклікнуў ён.

– Што, так і будзем гуляць? – яна зірнула на яго і ўсміхнулася. – Спраўны! Забірайце!

Прыехаў на кватэру і пачаў чакаць, пакуль крыху пацямнее, бо неяк няёмка было адразу ж перціся з такой каробкай цераз увесь двор.

Паспрабаваў падрамаць на канапе, але які там сон, калі ў грудзях гарачай хваляй шугала, як і ў маладыя гады, незразумелая радасць. Урэшце пачало шарэць. Запальваліся агні ў вокнах. І тут яго апанаваў страх. І гэта ў такія гады?!

З якую гадзіну яшчэ пратрымаўся, а пасля схапіў каробку і падаўся на двор. Дваццаць першая кватэра была на трэцім паверсе. Адразу ж націснуў на кнопку званка. За дзвярыма ледзь чутна цілікнула, а пасля пачуўся знаёмы голас: "Заходзьце! Там адчынена".

Толькі ўвайшоў у прыхожую, як з пакоя выбег Ігарок.

– Дзядзя Сярожа! Ух ты! Новенькі баскетбол!

І тут з кухні выйшла Валя.

– Навошта ж вы купілі?! – яна падышла да яго і ўзяла каробку ў рукі.

– Мама! Давай адкрыем!

– Паспееш яшчэ! Вячэра на стале. І дзядзю Сярожу запрашай, – яна аднесла каробку ў пакой.

– Хадзем, дзядзя Сярожа! – хлапчук узяў яго за руку.

– Пачакай! – ён зняў красоўкі.

Тут зноў з'явілася Валя. Яна зашчоўкнула дзверы і сказала:

– Мыйце рукі і за стол!

– Ды я ні кропелькі не хачу! Ужо вячэраў! – зманіў ён.

– Ведаю, якая бывае вячэра ў халасцякоў! Нават слухаць нічога не жадаю.

Яны з Ігарком памылі рукі і зайшлі на кухню. На вячэру былі сырнікі са смятанай. І да таго ж смачныя, што Сяргей не вытрымаў і сказаў:

– Ніколі такіх не каштаваў! Цудоўная ў цябе мама, – ён зірнуў на Ігарка.

– Яна яшчэ і аладкі ўмее, і зацірку! – адказаў той.

– Хопіць расхвальваць! – яна злёгку кранула сына за вуха. – Сырнікі стынуць.

Пасля чаю яны з Ігарком зайшлі ў залу. Сяргей дастаў са скрынкі баскетбол, і пачалося

спаборніцтва. Аказалася, што Ігарок нядрэнна гуляе. Так спрытна націскаў на клавішы, што Сяргей ледзь паспяваў за ім. Яны да таго захапіліся гульнёй, што і не прыкмецілі Валю, якая даўно стаяла ля дзвярэй і з усмешкай назірала за імі.

Урэшце Ігарок выйграў.

– Мама! Я абыграў дзядзю Сярожу! – з радасцю выкрыкнуў ён.

– А цяпер давай са мной!

І з такім імпэтам яны ўзяліся, што Сяргей ажно рассмяяўся. Перамагла Валя. Ігарок не стрымаўся і заплакаў.

– Чаго нюні распусціў?! – накінулася на яго маці. – Мужчына называецца!

Сяргей пагладзіў Ігарка па галоўцы і прытуліў да сябе.

– Не плач. Яшчэ разок згуляй.

І зноў пачалося спаборнітва. Слёзы ў Ігарка высахлі імгненна. Сяргей непрыкметна дакрануўся да пляча Валянціны. Тая кінула на яго запытальны позірк, а ён падмігнуў ёй і паказаў вачыма на Ігарка. Паддайся, маўляў, малому. Яна зразумела і са смехам коратка кінула:

– І не падумаю!

І ўсё-ткі перамог Ігарок. Ад радасці ажно запляскаў у далоні.

Пасля вячэрняй казкі Валя паклала яго спаць. Хвілін праз пяць выйшла са спальні ў залу.

– Заснуў? – шэптам спытаў Сяргей.

– Ён у мяне адразу ж засынае.

– Магла б першы раз і паддацца, а то давяла малога да слёз! – з дакорам прамовіў ён.

– Яшчэ чаго! Я і ў другі раз гуляла ўсур'ёз. Абаронца мне знайшоўся, – яна ўсміхнулася і дадала: – Ужо і на "ты" перайшла, во даю!

– Я не супраць. Вось толькі баюся, што хтосьці зараз зойдзе, а я так і не паспею ўсё сказаць.

– Ніхто да нас не заходзіць. Сяброўка, бывае, заляціць, а так...

– Да такой маладой і прыгожай?! Нізашто не паверу!

– Была маладая, а цяпер... Мне хутка дваццаць сем споўніцца!

– Валя, я адразу ж хачу табе сказаць... Адным словам, каб ты не падумала чаго такога. Я знікну і больш надакучваць не буду. Я б і сёння не зайшоў, баскетбол і на вуліцы перадаў бы Ігарку, але да таго захацелася зірнуць на цябе, што ледзь вечара дачакаўся. Напэўна ж, цяпер падумала, што стары халасцяк не ў сваім розуме?

– Ды не, – яна з усмешкай пазірала на яго.

– І яшчэ: праз які тыдзень-другі раскажу табе аб адной просьбе.

– А чаму не сёння?

– Ранавата яшчэ, – ён уздыхнуў. – Ты лепш пра сябе раскажы: чаму адна, дзе працуеш?

– Працую медсястрой у паліклініцы. А мужа няма. Разбіўся на матацыкле.

– Даўно?

– Два гады летам споўнілася. Ён на будоўлі працаваў. Спачатку майстрам, пасля прарабам. А пазнаёмілася я з ім, калі ён яшчэ ў тэхнікуме вучыўся. Два гады з войска чакала. З які год добра жылі, а пасля пачаў выпіваць. Спачатку патроху, а пасля суткамі дзесьці прападаў. На лячэнне яго здавала. З якога паўгода ў рот не браў. Усё матацыкл хацелася яму купіць. Я і не супраць была, бо думала, што той дапаможа ад чаркі засцерагчыся. Правы ж могуць адабраць. Вясной купілі "Яву", а летам ён разбіўся. Ноччу на павароце ў машыну ўрэзаўся. Ігарку годзік быў, нічога не памятае. А як падрос, то пытаўся не раз: "Чаму ў нас таткі няма?" Ягоныя родзічы мяне ўвесь час папракаюць, што я ва ўсім вінавата. А што я магла зрабіць?!

Яна змоўкла, а праз якую хвіліну дадала:

– Адным словам, не склалася ў мяне жыццё. Адна радасць з сына.

– У такія гады бедаваць рана, – сказаў Сяргей. – Трэба замуж выходзіць.

– Лёгка сказаць... Мне з самага дзяцінства не шчасціла ў жыцці.

– Здарылася што?

– Маці мая рана памерла. Мне і трох годзікаў не было. Цётка, маміна сятра, да сябе забрала. А бацька з'ехаў у Сібір на лесанарыхтоўкі. Грошы спачатку высылаў, а праз год загінуў у тайзе. Пасля чацвёртага класа завезлі мяне ў інтэрнат. Бо ў цёткі свае дзеці пайшлі, а кватэра малая. Там і дзесяцігодку скончыла, а пасля ў медвучылішча паступіла. Вось і расце ў мяне Ігарок без бацькі і дзядулі. А яму ж так хочацца, каб побач мужчына быў! Вось і сёння ўкладваю ў ложак, а ён гаворыць: "Перадай дзядзю Сярожу, каб заўтра прыйшоў".

– Праўда?! – здзівіўся Сяргей.

– Некалькі разоў паўтарыў.

– Гэта добра, – ён з хітрынкай у вачах зірнуў на Валю і дадаў: – Вось каб яшчэ і маці ягоная запрасіла...

– Ну і хітрун! – яна засмяялася. – Заходзь, я не супраць. Будзем на высадку ў баскетбол гуляць.

– Заўтра не змагу. Чарговы рэйс на Мінск.

– На якой машыне працуеш?

– На аўтобусе, – Сяргей зірнуў на гадзіннік. – Пайду. Пасля выхадных магу і праспаць.

– І пра сябе не расказаў, і пра сваю просьбу, – у голасе Валі пачуліся крыўдлівыя ноткі.

– Яшчэ раскажу, часу хопіць. Можа, што з Мінска прывезці?

– Пад Новы год што-небудзь папрашу, а цяпер нічога не трэба.

– Ну што ж – дабранач! – ён падняўся з крэсла.

Яна праводзіла яго да дзвярэй. З якую хвіліну ён моўчкі пазіраў на яе, а пасля імгнення абняў і пацалаваў. І адразу ж выскачыў за дзверы.

## Раздзел шосты

"І навошта той быў пацалунак?" – у думках дакараў ён сябе, варочаючыся на канапе. Можна было б і без яго абысціся. Што цяпер пра яго падумае? Нахабнік! Інакш і не назаве. Можа, на-

ват дзесьці і пакрыўдзілася. І справа не ў тым, што Валя яму спадабалася. Ён быў упэўнены, што любы хлопец, убачыўшы яе на вуліцы, будзе доўга пазіраць услед.

Тонкая. З бялюткімі валасамі і шэрымі вачыма, якія пазіралі на суразмоўцу з такім даверам і надзеяй, што нельга было ў чым ім адмовіць.

І чамусьці проста і спакойна было з ёй. І ўвесь час прыцягвала да сябе яе ўсмешка, яе вабны стан. Так і хацелася абняць і не адпускаць. Адно было дрэнна – замаладая для яго. Але каб яна згадзілася, то ён адразу ж узяў бы яе за жонку. Ні адной хвілінкі не раздумваў бы.

А што? Трэба прапанаваць! Праўда, не адразу, а праз які час. Але ж яшчэ невядома, як яна паставіцца да Асі. Пра яе вырашыў пакуль Валі не гаварыць. Ды і што тут наперад загадваць?! Як будзе, так і будзе! Колькі ўжо разоў планаваў адно – атрымлівалася другое.

І ў Асі даўно не быў. Можа, і сапраўды дзесьці не ўспамінае пра яго. Прыехаць можна. А што ёй скажа? Не знайшоў другую маму? Пра гэта яна ўжо чула.

А калі яе хто іншы ўдачарыць? Праўда, загадчыца абяцала, што нікому Асю паказваць не будзе. Але ж як яе схаваеш, калі тым, хто хоча прыдбаць сабе хлопчыка або дзяўчынку, абавязкова дзесьці паказваюць усю групу, бо дзеці там аднолькавага ўзросту. А яна адразу кінецца ў вочы.

А ёсць жа такія настырныя цёткі, ад якіх і не абаронішся. Спадабаецца дзяўчынка – пішы прапала. І што за правілы такія ў гэтых дзіцячых дамах?! Толькі з дзесяці гадоў патрабуецца згода дзіцяці на ўдачарэнне. Цікава, а што ж робяць тады, калі, напрыклад, пяцігадовая дзяўчынка не захоча пайсці жыць да незнаёмых людзей. Няўжо аддаюць сілком? Не можа быць! Трэба абавязкова спытаць пра гэта ў загадчыцы.

І аб чым думае! Ён ажно раззлаваўся на сябе. Галоўнае ж не вырашана. Валя, хутчэй за ўсё, замуж за яго не пойдзе. Гэта ён адчуваў. І не таму,

што мала з ёй знаёмы. З яе дадзенымі можна лёгка маладога хлопца акруціць. І не якога-небудзь выпівоху, а ўрача або інжынера. Самастойнага, з пасадай, які не паглядзіць, што яна з сынам і была замужам.

І двухпакаёвую кватэру мае з усімі выгодамі. А гэта таксама справа не апошняя.

Адчуваючы, што ў сваіх думках зайшоў у тупік, з якога няма выйсця, ён вырашыў пакуль да Валі не заходзіць. З тым і заснуў.

А тут і абставіны якраз так склаліся, што прыйшлося яму выехаць з горада. Праз які тыдзень пазванілі яму з вёскі ў дыспетчарскую, што ягоная маці захварэла. Яе хваробу ён ведаў: як знервуецца залішне або пацягае кошыкаў з бульбай, так і пачынае назаўтра сціскаць у грудзях.

У той жа вечар выехаў у вёску. Маці ляжала на сваім ложку. Толькі ўбачыла яго, адразу ж прыўзнялася і сказала:

– А мне ўжо нічога не баліць! Дарма табе толькі пазванілі.

Ён прысеў на табурэтку побач з ложкам.

– Мяне не падманеш! Я ўсё бачыў. Зноў у агародчык цягала. А навошта?! У гэтыя выхадныя якраз збіраўся прыехаць.

– Дык я ж маленькім кошыкам насіла!

– Маленькім! Ведаю цябе! Забылася, што ўрач гаварыў!

– Што ж мне – зусім без работы сядзець!

– Корпайся паціхеньку. І цяпер не спрабуй уставаць! Я ўсё сам параблю. Бо з заўтрашняга дня ў мяне адпачынак.

– Ты ж, здаецца, у снежні збіраўся.

– Начальнік цяпер адпусціў.

– Ну і добра! Агародчык якраз ускапаеш, ды і яблыні трэба абрэзаць. І брыкету не шкодзіла б якую машыну выпісаць.

– Усё зраблю, не хвалюйся. Я тут слоік мёду прывёз і пылок з кветак. Будзеш перамешваць яго з мёдам і піць з чаем. Дзве лыжачкі раніцай і ве-

чарам. Так урач мне сказаў. У пчаліным мёдзе да шасцідзесяці кампанентаў. Ён сардэчную мышцу ўмацоўвае.

– Мой ты сынок! Як нямашака здароўя, то і мёд не дапаможа. Матку маю вазьмі, тваю бабулю, дзевяноста восем гадоў пражыла. Яшчэ ў тую вайну царскія казакі здзіўляліся, як яна ўзімку басанож хадзіла па снезе да студні, а то і да рэчкі бялізну паласкаць.

– Няўжо на ногі не было чаго ўсчапіць?

– Чаму ж не было! Клумбы былі, ды і буркі шылі. У лапцях не хадзілі. Але ж ленавалася абувацца. Маладая была, фарсістая! А елі што? Я ж памятаю: натаўчэ яна кашы, наробіць саладухі і ўплятаем вечарам. Булкі пяклі толькі на Вялікдзень і Каляды. І здаровыя былі.

– Што параўноўваць! Цяпер іншы час!

– Во-во, іншы! Нервовы нейкі! А ад нерваў і ўсе хваробы. Загаварыла цябе, а ты нябось галодны?

– Толькі не ўставай. Я сам усё зраблю і падагрэю!

– Катлеты ў халадзільніку. Яйка да іх ускінь!

– Усё зраблю, – ён падняўся з табурэткі. – Не першы год замужам!

Маці ўсміхнулася і дадала:

– Колькі гадочкаў сабе сам гатуеш! А была б жонка...

– Закруціла старую пласцінку, – перабіў ён маці. – Сказаў жа табе: ажанюся! На першай сустрэчнай. І каб пасля аніякіх размоў!

– І слова не скажу! Буду толькі радавацца.

Раніцай яго пабудзіў прыемны пах бліноў. Маці завіхалася ля пліты. Бліны з мачанкай ён любіў з дзяцінства, яна ведала аб гэтым.

І пачалося ў яго вясковае жыццё. Спачатку перакапаў агародчык, пасля ўзяўся за яблыні. Работы хапала на кожны дзень. Трэба было і на гарышчы парадак навесці, і за дровы ўзяцца, і сечкі нарэзаць.

Маці ўсё яшчэ трымала карову. Цяжкавата было адной з ёй упраўляцца, але збываць не хацела. Ён,

праўда, улетку займаўся сенам, бо калгас выдзяляў маці дзялянку як пенсіянерцы і за здадзенае малако. Але ж работы было з тым сенам! І скасіць, і высушыць, і прывезці з поля. Гэтым летам ён ледзь управіўся.

"Без кароўкі ж хлеў апусцее", – любіла паўтараць маці.

Вечарам глядзеў тэлевізар, а пасля крыху чытаў перад сном. Дзесьці так праз тыдзень толькі яны павячэралі, як маці сказала:

– Ты б з'ездзіў куды, Сярожа. Амаль жа ўсё парабіў!

– А што – ужо надакучыў? – ён усміхнуўся. – Вось сечкі ўрэжам, тады і паеду. Але куды?

– Мора ўжо дзесьці халоднае, – у задуменні прамовіла яна. – Хаця б у які дом адпачынку. Новыя людзі. Глядзіш – і пазнаёміўся б з якой...

– Так... – ён насупіўся.

– Ведаю, што надакучыла табе такімі размовамі, але паслухай у апошні раз! Я тут вось што ўдумала: можа, ты на маладых там заглядваешся, то гэта дарма!

– Хто табе сказаў? Ды я на іх глядзець не хачу! Патрэбны мне, як зайцу стоп-сігнал!

– Ды не злуйся, я ж дабра табе жадаю. Ты можаш нават з дзіцем якую ўзяць. Абы добрая была ды гаспадыня дбайная. Не трэба баяцца разведных. Бо многія разводзяцца, каб ад сваіх п'яніц пазбавіцца.

– Буду наглядаць, не хвалюйся! Навяду чужых унукаў – малака не хопіць!

– Я буду толькі рада! Абы ты ўрэшце ачалавечыўся.

Калі ўляглiся і патушылі святло, яму адразу ж успомнілася Валя. "Вось табе і маці, – усміхаючыся, думаў ён, – быццам у ваду глядзіць, усё наперад прадчувае".

Пад'ехаць куды і сапраўды было б добра, каб крыху развеяцца і ні аб чым не думаць. Але ж восень на двары. Дый настрою не было.

А ноччу яму прыснілася Валя. Быццам ішоў ён па вуліцы, а насустрач яна з незнаёмым хлопцам. Убачыла яго, заўсміхалася, задаволеная – ажно свеціцца ўся.

І да таго балюча і прыкра стала на душы, што ён адразу ж прачнуўся. Пасля, праўда, крыху задрамаў пад самую ранічку, але ж які гэта быў сон?! Так, адны ўспаміны.

І да таго захацелася ў Віцебск – ратунку няма! Мог бы маці наплесці што-небудзь ды падскочыць на які дзень-другі, але ж дамовіўся з Лявонам Казакевічам сечкі нарэзаць. Калісьці разам з ім вучыліся да сёмага класа. Пасля доўгі час Лявон на будоўлі працаваў, распіўся. А гадоў пяць таму ўпаў з рыштаванняў, бо з пахмелля быў. Пакалечыла – не пазнаць. Без вока застаўся і з галавой нелады пачаліся. Інваліднасць далі. Жонка даўно кінула. І жыў ён са сваёй старэнькай маці.

Летась Сяргей дапамог ёй пасадзіць бульбу, бо Лявон якраз у бальніцы ляжаў. І вось цяпер той рашыў яму аддзячыць.

Два дні рэзалі. Лявон падаваў, а ён круціў. Сячкарня была невялічкая, з кароценькім дронкам – толькі аднаму ўзяцца. Даўно ў іх была. Нарэзалі на паўзімы. Маці як убачыла вялізныя мяшкі – за галаву схапілася.

А тут якраз раптоўна пацяплела, і ўзяўся сыпаць нудны дождж.

І Сяргей застаўся дома. Чаго ўжо ляцець у той Віцебск. Валя пра яго дзесьці ні разу і не ўспомніла. І няма чаго пра яе думаць. Падумаеш – прыснілася! Думаў аб ёй цэлы вечар, чаго ж тут здзіўляцца.

І з маці трэба пабыць. Неяк раптоўна яна пастарэла. Перажывае з-за ягонага няўдалага жыцця. Але ж што зробіш? Ці лёс ягоны такі, ці яшчэ што? Як бы там ні было, а з сябе віны не здымаў.

У Віцебск прыехаў за тыдзень да заканчэння адпачынку. Прыбраў у кватэры, а пасля падаўся ў магазін. І тут ледзь не сутыкнуўся з Валяй.

– Сярожа?! Дзе ж ты прападаў? – замест прывітання спытала яна.

– Маці нечакана прыхварэла. Прыйшлося брацъ адпачынак.

– А мы з Ігарком хацелі на пошукі падацца!

– Няўжо?!! – здзівіўся ён.

– А як ты думаў! Пацалаваў – і ў кусты?!

І так проста было аб гэтым сказана, што ён нават не зразумеў – жартуе яна ці гаворыць усур'ёз.

– А як Ігарок пажывае?

– Нічога. Так у твой баскетбол навучыўся – нават у мяне выйграе. Заходзь праз гадзінку. Сёння карпаў жывых удалося купіць. Падсмажу ў смятанцы ды з гарачай бульбай.

– Я зараз прыйду, добра? – і ён кінуўся ў магазін.

Купіў хлеба, кефіру і тры пліткі шакаладу. Хуценька ўсё аднёс дамоў, пасля набраў у сумку антонавак, дастаў з рукзака бутэльку шампанскага, палажыў шакалад і падаўся да Валі.

Толькі зайшоў у прыхожую, як адразу ж убачыў Ігарка.

– Дзядзя Сярожа?! – з радасцю ўсклікнуў ён. – Як добра, што ты прыйшоў! Зараз у баскетбол згуляем!!

– Канечне. Я табе яблыкаў прывёз.

Яны зайшлі на кухню. Валя рыхтавалася чысціць карпаў.

– Давай лепш я, – ён дакрануўся да яе пляча. – А ты бульбай займíся.

– А баскетбол?! – Ігарок узяў яго за руку. – Хадзем! Дзядзя Андрэй не гуляў са мной, і ты не хочаш!

– Рыбку пачышчу – адразу ж згуляем! Я ўмомант! Трэба ж маме дапамагчы. А пакуль ідзі і патрэніруйся.

Незадаволены Ігарок адправіўся ў залу.

– Так, – ён прыхінуў да сябе Валю. – Расказвай пра дзядзьку Андрэя!

Яна гарэзліва ўсміхнулася, а пасля імгнення пацалавала яго ў шчаку і прашаптала:

– Пасля вячэры раскажу. Бярыся лепш за рыбу!

З карпамі ён управіўся хутка. Пасля пайшоў да Ігарка. Гулялі ў баскетбол і ў жмуркі.

Вячэра атрымалася – лепш не трэба! Гатавала Валя цудоўна. Пасля мульцікаў Ігарок лёг спаць. Пакуль Валя мыла посуд на кухні, ён, седзячы на канапе ў зале, абдумваў сваё становішча. І хаця крыўдна крыху было, што тут паспеў пабываць незнаёмы дзядзька Андрэй, але ж і пацалунак на кухні штосьці азначаў.

І тут ён успомніў пра шампанскае. Хуценька дастаў з сумкі бутэльку і паставіў на стол. Побач паклаў шакалад і ўсё накрыў газетай. Неўзабаве з'явілася Валя.

– Чаму ў прыцемках сядзіш? – яна пстрыкнула выключальнікам. – Ого! А што на стале?

Ён паспеў перахапіць яе руку.

– Сядай! Убачыш яшчэ! Лепш пра дзядзьку Андрэя раскажы.

Валя прысела на канапу.

– Знаёмы ўрач з абласной бальніцы. Я ж сама там раней працавала.

– І гэта ўсё?

– Трыццаць пяць гадоў. Халасцяк. Мае "Запарожца".

– І ён у цябе часта бывае?

– Ды не! Як ты з'ехаў у вёску, пайшла я на Смаленскі рынак бульбы купіць. Набрала вялізную сумку, а тут ён насустрач. Падвёз мяне. Прыйшлося запрасіць на каву. А другі раз сам у нядзелю прыпёрся. Але таксама доўга не быў, бо мы з Ігарком у кіно збіраліся.

– І што ж яму трэба? – ён не спускаў з яе вачэй.

– Прапанову мне зрабіў.

– Няўжо?! А як жа я?! – з роспаччу ў голасе ўскрыкнуў ён.

І да таго, напэўна ж, быў у яго разгублены выгляд, што Валя не стрымалася і зарагатала.

І толькі тут зразумеў усё... Няёмка стала, хоць з кватэры ўцякай.

Урэшце яна супакоілася і сказала:

– Ты быў падобны на хлапчука, якога маці не бярэ з сабой у кіно.

– Прабач мне! – ён уздыхнуў, а пасля спытаў: – Пойдзеш за яго?

– Не ведаю. Так-то ён нічога, але ж вельмі складаны для жыцця.

– Як гэта?! – здзівіўся ён.

– Усё па пальцах раскладвае: гэта сёння, тое заўтра... Прастаты ў ім няма ці яшчэ чаго – сама не ведаю. Ён нават з Ігарком ні разу ў баскетбол не згуляў. А той так яго ўпрошваў!

– А я кожны дзень буду гуляць!

– Маніш, галубок! – яна засмяялася.

А ў яго чамусьці прапаў настрой.

– Чаго ты насупіўся?

– Ды так... – у задуменні прмовіў ён. – Ведаю, чым гэта ўсё скончыцца.

– Чым?

– Замуж выйдзеш.

– Абавязкова выйду! Не векаваць жа адной, – з весялосцю ў голасе прамовіла яна.

– Вось за гэта вып'ем! – ён падняўся з канапы, падышоў да стала і падняў газету.

– Шампанскае?! – яна пляснула ў далоні, пасля падхапілася з канапы і падалася на кухню.

А ён перанёс невялічкі столік да канапы. Тут жа з'явілася Валя з двума бакаламі. Ён асцярожна адкаркаваў бутэльку і напоўніў бакалы.

– За цябе, – ціха прамовіў ён. – За тваё шчаслівае замужжа!!

Яны выпілі.

Пасля зняў абгортку з шакаладкі.

– Каштуй!

– Такая весялосць наляцела, быццам смяшынку з'ела, – сказала Валя.

– Ведаеш што, – ён даліў у бакалы шампанскага, – будзе да цябе апошняя просьба.

– Якая?

– Давай з табой сустрэнем Новы год. Толькі больш нікога: ты, я і Ігарок, добра?

– Трэба падумаць! – яна з хітрынкай у вачах пазірала на яго.

– Усё смяешся...

– Ты вельмі пацешны, калі не ў гуморы! – яна палажыла яму руку на плячо. – Абавязкова сустрэнем. І ёлку паставім. Ты толькі не знікай.

Тут ён не стрымаўся, моцна абняў яе і пацалаваў. І ў тую ж хвіліну нечакана пачаўся грукат у прыхожай. Яна порстка адхінулася ад яго, падхапілася з канапы і выйшла. З'явілася хвілін праз пяць.

– Што там? – шэптам спытаў ён.

– Ігарок піць захацеў, – яна прысела побач.

– Ты купі яму яблычны сок, у маленькіх такіх слоічках. Ён разведзены, спецыяльна для малых.

– Куплю. І сокі розныя, і малако. Сёння ўкладваю спаць, а ён гаворыць: "Давай дзядзю Сярожу за тату возьмем". А я пытаюся: "А што, спадабаўся табе?" – "Вельмі, – адказвае, – ён такі добры..."

– Я згодзен! – хуценька адказаў Сяргей. – Але ж што ягоная маці скажа?

– Маці падумае, – Валя ўсміхнулася.

Ён хацеў тут жа зрабіць ёй прапанову і расказаць пра Асю, але не паспеў, бо Валя зірнула на гадзіннік і з жахам ускрыкнула:

– Замежная эстрада? Італьянцы выступаюць!

Яна паднялася з канапы і ўключыла тэлевізар.

Італьянцы і сапраўды добра выступалі, але ж сапсавалі, як той казаў, усю абедню.

Канцэрт скончыўся далёка за поўнач – тут было не да размоў.

Прыйшоў у кватэру, улёгся ў ложак, а ад думак было не адчапіцца. Не проста ж так перадала яму Валя словы Ігарка. Тут быў, як калісці казаў стары дзед Сымон, тонкі намёк на тоўстыя абставіны. Валя, магчыма, і пайшла б за яго. Але ён адчуваў, што яе стрымлівае ягоны ўзрост. А калі яшчэ і пра Асю даведаецца – пішы прапала – знікне апошні шанц. Вырашыў пра ўсё расказаць на Новы год.

Снежань выдаўся, як у даўнія гады, калі ён яшчэ хадзіў у школу. Адразу ж прыціснуў добры марозік, наваліла снегу – сапраўдная зіма. А то, бывала, асабліва ў апошнія гады, лупцавалі дажджы да самых Каляд.

І зноў так атрымалася, што ён амаль два тыдні не бачыў Валю. Бо ў яго якраз пачаліся такія змены, што вяртаўся з работы позна. А ў выхадныя ездзіў да маці, бо чамусьці пасяліўся ў душы страх за яе здароўе.

У гэту суботу прыехаў з вёскі крыху раней. Адразу ж уключыў тэлевізар. Паспеў якраз на спартыўныя навіны. Заканчвалася праграма "Час". Толькі спаласнуўся, як у прыгожай падаў голас званок. Ён ажно прысеў ад нечаканасці, бо яшчэ ніхто яму ні разу не званіў. Стрымгалоў кінуўся да дзвярэй і адразу ж адкрыў. На лесвічнай пляцоўцы ўбачыў Валю. У карычневым футрыку і такога ж колеру шапцы, з пачырванелымі ад марозу шчокамі, яна стаяла і ўсміхалася.. Яны павіталіся.

– Праходзь, распранайся.

Ён дапамог ёй зняць футра, а пасля адразу ж абняў.

– Такі пах ад тваіх валасоў, – прашаптаў ён, – здурнець можна!

– А куды ты зноў прапаў? – яна выслабанілася з яго рук.

– Зараз раскажу, – яны зайшлі ў залу. – А Ігарок з кім?

– Спіць. Ды я на хвілінку! Убачыла святло ў тваім акне – рашыла зазірнуць.

– Да мне яшчэ ніхто не заходзіў, нават не званіў. Ты самая першая.

– Праўда?! – здзівілася Валя.

– Я ж зусім нядаўна тут.

– А што – файная кватэра, – яна прайшлася туды-сюды. – І грукату трамваяў амаль не чутно. Дык што здарылася? – яна прысела на крэсла ля стала. – Я падумала – ці не захварэў?

– Ды не, – ён прысеў побач. – Позна з работы вяртаюся, а ў выхадныя да маці ездзіў. Са здароўем у яе нелады.

– Хварэе на нешта?

– Неўроз. Расхвалюецца – сціскае ў грудзях. А ўсё з-за мяне. Узяла ў галаву, што застануся адзін ды буду дажываць у доме састарэлых.

– Бо трэба жаніцца! – Валя засмяялася. – А хто гэта такая? – Яна паказала на фотакартку.

– Ася, – ён уздыхнуў.

– Твая дачка?

– Бадай што так.

– А гаварыў, што не быў жанаты.

– Жанаты не быў, – ён змоўк, а пасля расказаў пра сустрэчу на вакзале.

– Дай зірнуць на яе.

– Ён падаў ёй фотакартку.

– Сімпатычная. Няйначай артысткай будзе.

Сяргей узяў у яе фотакартку і павесіў на сцяну. Пасля моўчкі апусціўся на крэсла і амаль шэптам прамовіў:

– Вось такія ў мяне справы: маці хварэе, Асю аднаму не аддаюць, замуж ахвотніц за мяне няма.

– Так ужо і няма?! А я? – усмешка не сыходзіла з яе твару.

– Ты, магчыма, і пайшла б за мяне, каб быў маладзейшы ды без Асі. А так...

– Што так?! Рабі прапанову, пакуль не перадумала! Бо самой няёмка ў жонкі набівацца!

Але ён толькі пазіраў на яе і ўсміхаўся, бо добра ведаў, што яна жартуе.

А Валю было ўжо не стрымаць.

– Вось толькі дзе мы жыць будзем? У мяне ўсе не змесцімся.

– Разменяем дзве кватэры на чатырохпакаёвую! – урэшце не стрымаўся ён.

– Тры пакоі на чатыры?! – здзівілася яна. – Які ж дурань згодзіцца?

– Даплоцім! – ён пачаў ёй падыгрываць. А што заставалася рабіць.

– Так-так... Я ж зусім забылася, што маю справу з самым багатым чалавекам Віцебска! – яна пляснула ў далоні.

– Багаты не багаты, а ў будучым годзе бяру новенькія "Жыгулі".

– Ну! Тады заўтра ж падаем заяву! А то яшчэ якая нахабніца перахопіць жаніха з машынай!

Пасля чаю ён праводзіў яе, бо Валя хвалявалася за Ігарка. Але той моцна спаў на сваім ложку.

Заяву яны падалі перад Новым годам. Даўно ў яго не было так радасна на душы, як у той памятны дзень. Пасля паехалі да ягонай маці. Вось толькі Ігарка Валя не згадзілася ўзяць з сабой. І як яе ні ўпрошваў – нічога не атрымалася. Саромелася. А чаго? Засталася з ім яе сяброўка.

Валя спадабался ягонай маці. А калі яна даведалася пра заяву, то адразу ж заплакала. Дый, па праўдзе кажучы, яму і самому не верылася, што ў яго будзе такая жонка.

Пабывалі яны і ў Асі. Тая спачатку насцярожана пазірала на незнаёмую цётку, а пасля ўсміхнулася і сказала: “Няхай будзе нашай мамай”.

# Грэшнік

*Таццяне Канстанцінаўне*

*"Если говорим,*
*что не имеем греха –*
*обманываем самих себя,*
*и истины нет в нас".*

**/Евангелие от Иоанна, гл. 1, стих 8/**

## Частка першая

Упершыню ў сваім жыцці Сцяпан убачыў у сне немаўлятка. Яму чамусьці падалося, што гэта быў менавіта хлопчык. Ён уважліва пазіраў на Сцяпана і ўсміхаўся.

Здавалася б, нічога такога, але Сцяпану адразу ж стала ніякавата. Хлопчык між тым перастаў усміхацца, ягоны тварык крыху пасуровеў, урэшце ён насупіўся, а пасля прамовіў: "Я твой сынок, якога ты калісьці загубіў. Памятаеш?"

Сцяпана ахапіў такі жах, што ён не мог і слова вымавіць. Пасля, крыху ачомаўшыся, ціха прамовіў са слязьмі на вачах: "Прабач, калі можаш. Я быў тады маладым першакурснікам, жыў надгаладзь толькі на стыпендыю і не змог бы пракарміць цябе і маці..."

Ён хацеў яшчэ штосьці сказаць, але хлопчык імгненна знік і... Сцяпан прачнуўся. Адразу ж уключыў настольную лямпу і прыўзняўся з ложка. Дзве слязінкі паволі спаўзлі па ягоных шчоках і капнулі на падушку. Гадзіннік паказваў палову чацвёртага. Сцяпан не спяшаючыся выцер насоўкаю вочы, крыху пасядзеў, пасля патушыў святло і з асцярогай прылёг, падклаўшы рукі пад галаву.

І адразу ж усплылі ў ягонай памяці падзеі трыццацігадовай даўніцы. Пасля службы ў войску ён падаўся паступаць у Магнітагорскі горнаметалургічны інстытут. Выправіўся ў такую далячынь таму, што туды заманілі хлопцы, з якімі Сцяпан гуляў за зборную арміі па валейболе. Экзамены здаў пасняхова і стаў шчаслівым уладальнікам студэнцкага білета.

І вось тут ён пазнаёміўся з Галяй Галдобінай, прыгожай чарнявай дзяўчынай, якая працавала лабаранткай на кафедры мінералогіі. Калі прыносіла шуфляду з узорамі мінералаў, то заўсёды адорвала ўсіх абяцальна-прыцягальнай усмешкай і, выходзячы з аўдыторыі, да таго заманліва віхляла азадкам, што ва ўсіх хлопцаў ад хвалявання перахоплівала дыханне.

А якія ўяе былі ножкі! Такіх Сцяпан пасля не сустракаў ні ў адной з жанчын.

Іхні выкладчык, прафесар Махно, якому было ўжо за семдзесят, як толькі за Галяй зачыняліся дзверы, заўсёды, усміхаючыся, казаў: “Хороша Маша, да не ваша!”

Сцяпану так спадабалася Галя, што ён пачаў бачыць яе ў сне. Але каб падысці і загаварыць з ёй, такога яму і ў галаву не магло прыйсці – баяўся яе асляпляльнай прыгажосці. І да таго ж трэба было вучыцца, бегаць на трэніроўкі, ды яшчэ начамі разгружаць вагоны, бо на адну стыпендыю не пратрымацца.

А з дому дапамагаць не было каму: бацька загінуў у Берліне, а маці надарвалася ў калгасе і памерла зусім маладой, калі Сцяпану не было і дзесяці гадоў. Выхоўваўся ён у бабулі, але і яна адышла ў іншы свет, якраз пасля яго прыходу з войска.

Былі, праўда, у Сцяпана два дзядзькі, але абодва да таго няўдала ў свой час ажаніліся, што на іхнюю дапамогу ён ніколі не спадзяваўся.

Тым часам нечакана прамільгнула першая сесія, непрыкметна скончылася зіма, і сонейка пачало прыграваць усё мацней – прыспешваючы паненку вясну.

У адзін з такіх дзён, якраз перад майскімі святамі, калі ўсе рыхтаваліся да дэманстрацыі, Галя сама падышла да яго, з усмешкай уважліва зірнула ў вочы. І прымацавала да ягонага старэнькага пінжака невялікую чырвоную стужку. "Каб не згубіўся! – з усмешкай прамовіла яна. – А то я буду сумаваць".

Вось з таго ўсё і пачалося. Чаму яна выбрала менавіта яго, ён і сам не ведаў. Магчыма, што ў аўдыторыі сядзеў на першай парце, і калі яна ўваходзіла, то ягоны твар заўсёды заліваўся чырванню – ён глядзеў на яе як на грэчаскую багіню.

А пасля летняй сесіі ў іх пачалася геадэзічная практыка ў гарах. Разам з выкладчыкам ехала і Галя, што вельмі ўзрадвала Сцяпана. Усе хлопцы з групы былі разбітыя на брыгады. І хто першы выконваў заданне – адразу ж адпраўляліся на летнія канікулы.

Ля падножжа Уральскіх гор былі пабудаваныя невялікія домікі. І калі праз тры тыдні практыка скончылася, то Галя папрасіла Сцяпана застацца, каб дапамагчы вартаваць маёмасць да прыезду новай групы.

Няёмка сябе адчуваў Сцяпан пад насмешлівымі позіркамі аднакурснікаў, але такі ўжо шчаслівы лёс яму выпаў...

У першы вечар яны смачна павячэралі, пагаварылі пра ўсё і ўся, а дзесьці а дванаццатай гадзіне ночы Сцяпан падняўся і пачаў развітвацца. Але Галя яго не пусціла.

– Ты што?! Ды я адна тут здубянею ад страху! Спусціцца з гор які ваўкалака, або снежны чалавек зацягне ў сваю пячору! Хіба ты не чытаў, што яго не раз тут бачылі?!

Ён нічога на гэта не адказаў, а толькі сарамліва ўсміхнуўся і застаўся. І хаця Галя яму падабалася, але ён і пабойваўся яе ў той час. Бо смех цяпер прызнацца, але ў свае дваццаць чатыры гады яшчэ не быў ні з адной з жанчын...

Між тым Галя патушыла святло і пачала распранацца, бо шырокі ложак быў даўно падрыхтаваны. Пасля хуценька дала нырца пад коўдру, а ён усё яшчэ працягваў сядзець за сталом.

– Чаго ты баішся? – спытала Галя. – Хадзі да мяне!

Ён падняўся, падышоў да ложка і прысеў побач. Цяпер Сцяпан бачыў яе твар, вялікія вочы, якія паблісквалі ў змроку летняй ночы і з насмешкай і нецярпеннем пазіралі на яго.

– А-а, разумею... У цябе яшчэ нікога не было, так? – яна прыўзнялася, абняла яго і прашаптала: – А я хачу быць тваёй...

Пасля спехам пачала расшпільваць гузікі на яго-най сарочцы. А ў яго і сапраўды нікога не было. І вось надышоў момант, калі гэтае патаемнае павінна здарыцца. Ён марыў пра такое даўно, як і ўсе хлопцы, але вось цяпер апанаваў страх...

Тая кароткая летняя ночка ля падножжа гары Белай стала самай шчаслівай у ягоным жыцці.

А раніцай Галя з радаснай усмешкай на твары прашаптала, пакрываючы яго пацалункамі:

– Нястомны мой працаўнік! Такога нават я і не чакала. Дзесяць заходаў – гэта суперклас...

А калі прыехалі ў горад, ён праз два дні развітаўся з Галяй і адправіўся на канікулы ў родныя мясціны. Там чакала яго бабуліна хаціна, якая мясцілася непадалёку ад рачулкі, на самым ускрайку іхняга Зарэчча.

За ёй на працягу многіх гадоў наглядала суседка, бабуля Агата. Летнія канікулы праляцелі хутка. Цяжка было развітвацца з роднымі мясцінамі. З вялікай неахвотаю адпраўляўся ў далёкі ўральскі горад. Але ж іншага выйсця не было.

На пероне яго сустракала Галя. Яна ўсміхалася, але Сцяпан заўважыў патаемную трывогу ў яе вачах. Ён хацеў пра гэта спытаць, але Галя сама апярэдзіла яго. Хуценька цмокнула ў шчаку, прытулілася і прашаптала:

– Сцёпа! Я зацяжарыла!

Ён спачатку не паверыў, але тут жа зразумеў, што яна не жартуе. І адразу ж да таго разгубіўся, што не знаходзіў слоў, а толькі пазіраў на яе спалоханымі вачыма. Галя, убачыўшы ягоны разгублены выгляд, не вытрымала і, смеючыся, прамовіла:

– Зайка ты мой шэранькі! Ды чаго ж спалохаўся! Не бойся, навязвацца не буду. Але спачатку паедзем да мяне, пакармлю з дарогі, а там пагаворым.

З такім настроем яму не хацелася да яе ехаць, каб не сустракацца з маці, якая, напэўна ж, усё ведае. Але Галя, быццам згадаўшы ягоныя думкі, сказала:

– Маці няма. Яна паехала ў Сочы да сваёй франтавой сяброўкі. Прыедзе толькі ў канцы верасня.

Гэтая навіна яго ўзрадавала, і яны паехалі да яе на кватэру. Памыўшыся, ён пасвяжэў, а пасля смачнага абеду нават крыху супакоіўся. Галя хуценька памыла посуд, і яны прыселі на канапу.

Ён маўчаў, збіраючыся з думкамі, не ведаючы, з чаго пачаць. Галя акінула яго ласкавым позіркам і сказала:

– Ты можаш мне не паверыць, Сцёпа, але я пакахала цябе з першага позірку, як толькі ўбачыла. Такога са мною ніколі не было. Ты здолеў распаліць агеньчык надзеі ў маім сэрцы. Стаў тым праменьчыкам, які пачаў асвятляць маю дарогу ў будучыню. Толькі не ўсміхайся, бо пра мяне нічога не ведаеш. Я працяглы час працавала ў геалагічных партыях і сустракалася з рознымі мужчынамі. Жудасна і неахвота пра тое жыццё ўспамінаць. Чаму так атрымалася, і сама не ведаю. Але ўсе яны былі для мяне на адзіны твар, разумееш? Я іх не кахала, яны нават мне не падабаліся. Напэўна, ад гэтага ні разу не зацяжарыла, павер мне. І абортаў не рабіла, бо пасля іх можаш не мець дзяцей, а то і памерці. Мне дваццаць чатыры – самая пара стаць маці. Я і цябе разумею: хочаш скончыць інстытут, прыдбаць кватэру, машыну, а пасля і пра жаніцьбу падумаць. Усё гэта правільна, але спачатку падумай, каб пасля не давялося шкадаваць, што зрабіў памылку ў свой час.

І тут Галя апярэдзіла яго, бо і сапраўды былі такія планы. Гэта другія хлопцы могуць дазволіць сабе ажаніцца на першым курсе, бо калі што – бацькі падтрымаюць.

– Ведаеш, – урэшце прамовіў ён, – толькі не думай чаго такога, вось... Ты мне падабаешся, але мець дзіця на пачатку вучобы... Мо ўсё-ткі пазбавіцца ад яго...

– А пасля што? – спытала Галя.

– Там будзе відаць, а гады праз два-тры штосьці прыдумаем...

І цяпер, праз трыццаць гадоў, успамінаючы тую размову, калі ўпрошваў забіць іхняга сыночка, яму было да таго сорамна, што не знаходзіў сабе месца.

Дзве ночы раздумваў, не спаў, а пасля з цяжкасцю ўзяў акадэмічную даведку з адзнакамі і цішком збег, як той злодзей ці нашкодзіўшы кот. Праўда, Галя пра ўсё даведалася, але не бегала за ім, не ўпрошвала. І хаця ён не хацеў, але яна прыйшла праводзіць яго на вакзал. Ніколі ў жыцці не было яму так цяжка і маркотна, як у тыя развітальныя хвіліны.

Цягнік мякка крануўся, а Галя стаяла на пероне ў блакітнай сукенцы, лёгкі ветрык развяваў яе доўгія чорныя валасы. Яна з сумам у вачах пазірала на яго.

І няхай бы ў той момант сам Усявышні ці ягоны Анёл наставіў на розум Сцяпана, не даў здзейсніць такі вялікі грэх...

Але ў той момант ён толькі баяўся, што Галя вырашыць стаць маці, і яму давядзецца плаціць аліменты. І каб такое здарылася, то гэта б было на той час адзіным выратаваннем для ягонай грэшнай душы.

Сцяпан паспеў уладкавацца на другі курс Ленінградскага горнага інстытута. А праз тры месяцы, якраз перад Новым годам, ягоны сябра даслаў ліст з Магнітагорска. З яго Сцяпан пра ўсё і даведаўся...

Гэтая навіна яго ўзрадвала, і ён перастаў думаць пра Галю. Але ў жыцці за здзейснены грэх трэба калісьці трымаць адказ перад Усявышнім і прымаць пакаранне.

Так у яго атрымалася, што, скончыўшы інстытут, ён бадзяжнічаў з рукзаком не адзін дзеся-

так гадоў. Пачынаў з Чукоткі, працаваў у Сібіры, Казахстане і Латвіі. Пабываў нават на востраве Шпіцберген.

Але пасля пацягнула ў родныя мясціны, і ён правёў апошнія гады ў Віцебску. Пабудаваў тут двухпакаёвую кватэру. Праўда, да ягонага Зарэчча было далекавата. Тады махнуў на ўсё рукой і перабраўся ў сталіцу. Крыху прагадаў, бо памяняўся на аднапакаёўку, але гэта яго не засмуціла.

Кватэра была ў Малінаўцы. З акна чацвёртага паверха было бачна поле, удалечы зелянеў лес. А злева, крыху воддаль, нават віднеўся калгасны кароўнік, пасвіліся коні. Такое відовішча хвалявала Сцяпанава сэрца.

І ўсе гэтыя гады ён марыў пра шчаслівае каханне. Сустракаліся на ягоным шляху і дзяўчаты, і жанчыны... Але ўсё так складвалася, што да жаніцьбы справа не даходзіла. А гадочкі не драмалі – непрыкметна міналі. І, каб трымаць сябе ў форме, ён актыўна займаўся спортам: бегаў, плаваў, працягваў гуляць у валейбол. На ровары, а ў яго быў "Турыст", з лёгкасцю даязджаў да свайго Зарэчча. А гэта, як ні кажы, сто шэсць кіламетраў. Сёлета нават устанавіў асабісты рэкорд, праімчаўшы гэтую адлегласць за тры гадзіны і дваццаць пяць хвілін.

Не кожны малады здольны на такое, а Сцяпану ўжо было пяцьдзесят пяць гадоў. І ўсё спадзяваўся, не разумеючы таго, што ўжо даўно нясе пакаранне за здзейснены грэх у маладосці.

А тут яшчэ і з працай нелады пачаліся, бо перабраўся Сцяпан у Мінск у самы разгар перабудовы. Беларусь стала незалежнай, нясмела спрабавала сунуцца ў рынак са сваім прэзідэнтам і нечаканым беспрацоўем.

Ён адразу ж кінуўся шукаць працу, але дарэмнымі былі намаганні. Бо калі кадравікі бралі ў рукі ягоную працоўную кніжку, то толькі цяжка ўздыхалі ды адмоўна пакачвалі галовамі.

І было ад чаго здзівіцца – сорак чатыры запісы! Тут, як той казаў, – ні даць, ні ўзяць. А што

паробіш?! У свой час прыйшліся яму да спадобы вялікія вандроўкі. Малады быў, дужы, цягнула пабываць у розных мясцінах. А пасля і не прыкмеціў, як паціху пачала падкрадвацца старасць...

І хаця сваіх гадоў не адчуваў, але іншым разам самотна станавілася на душы... І тут яму пашчасціла: фірма набірала рабочых на прамыўку золата ў Сібіры.Тут была вялікая рызыка, але іншага выйсця ў яго не было. Справа яму знаёмая, бо ў арцелях і раней працаваў.

Больш за год правёў у таёжнай глухамані. А зарабіў не так і многа – дзесьці каля трохсот пяцідзесяці мільёнаў нашых "зайцоў". І гэта яшчэ добра атрымалася, бо былі ў Сцяпана такія прамывачныя сезоны, што прагаралі ўшчэнт, нават на зваротны білет грошай не хапала. Так што да восені ён вырашыў адпачыць, а там заняцца пошукамі працы.

Была якраз сярэдзіна чэрвеня – макаўка лета. У вёску Сцяпан пакуль не збіраўся, бо дзве дзялкі сенакосу для бабулі Агаты даўно скасіў і высушыў. Вечарамі, калі не было дажджу, прападаў на валейбольных пляцоўках у парку Чэлюскінцаў.

Але ў гэты вечар ён вырашыў застацца дома. З ягонай галавы не выходзіў учарашні сон. Што б гэта магло азначаць? На такое пытанне пакуль не знаходзіў адказу. І тут успомніў, што ў яго павінна дзесьці быць кніжка, у якой давалася тлумачэнне сноў. Хуценька яе знайшоў і, крыху пагартаўшы, прачытаў: "Хто ўбачыць у сне немаўлятка, таго чакае дабрабыт, вялікі дастатак, а то і нечаканае шчасце можа прываліць".

Магчыма, што так яно і ёсць для іншых людзей, але ж не для яго, бо ўбачанае ім немаўлятка – ягоны сыночак, які сказаў яму, хто ёсць Сцяпан на самай справе...

Так што думкі пра дастатак і шчасце трэба адкінуць, а рыхтавацца да найгоршых падзей.

І тут Сцяпан спыніў свой позірк на іконе з выявай Ісуса Хрыста. Невялікая памерам іконка

ў цёмна-карычневай драўлянай рамцы вісела ў пакоі ў самым куце. Было ёй больш за сотню гадоў. Бабуля расказвала, што яе прывёз дзед з Першай сусветнай вайны. Раней не звяртаў на яе ўвагі, але вось цяпер уважліва разглядваў лік нашага Збаўцы. Сцяпан нават падняўся з канапы, бо пад Ягоным позіркам пачаў адчуваць сябе няёмка, нават крыху разгубіўся.

Ці не з далёкіх нябёсаў нагадвае яму Усявышні пра ягоны грэх? Але чаму цяпер? Каб неяк перабіць думкі, прайшоўся туды-сюды па пакоі, а пасля ўключыў тэлевізар. І хаця да праграмы "Час" заставалася добрая палова гадзіны, ён вырашыў паглядзець хоць што.

А тут якраз пачалася перадача пра здароўе, прысвечаная цяжарным жанчынам. Сцяпан хацеў пераключыць на іншы канал, але ў гэты момант вядучая прамовіла: "А зараз мы пакажам, што робіць немаўлятка ў жываце сваёй маці".

Пасля гэтых слоў Сцяпан здранцвеў і тут жа адчуў, як непрыемны халадок прабег па спіне.

Ён не зводзіў вачэй з экрана, а там пачалі паказваць бальнічную палату, а пасля ў цьмянаватым водбліску святла з'явілася немаўлятка. Яно пазірала вялікімі спалоханымі вачыма туды-сюды, нават паварочвала сваю галоўку, пасля пачало штурхаць ножкамі і ручкамі ў жывот сваёй маці.

І тут данесліся словы вядучай: "Штосьці не падабаецца немаўляці. Вось так яно выказвае свой пратэст".

Сцяпан адчуў, як горача зрабілася ў грудзях. Праз якую хвіліну немаўлятка суцішылася, пачало прыслухоўвацца, а пасля нечакана ўсміхнулася і тут жа закрыла вочы.

Пасля ўрач пачала расказваць, як павінна сябе паводзіць цяжарная жанчына, але Сцяпана гэта ўжо не цікавіла. Ён выключыў тэлевізар і паволі сеў на канапу. Самы звычайны страх ахапіў яго, бо ў сне ён бачыў амаль тое ж самае, толькі там немаўлятка размаўляла з ім.

Ягонаму сыночку тады было амаль тры месяцы. Ён быў жывы, калі на Сцяпанаў загад урачы забілі яго...

Ён падняўся з канапы і пачаў паволі хадзіць па пакоі, зрэдку кідаючы вінаваты позірк на ікону. Збаўца пазіраў на яго сурова, Ён быццам дакараў Сцяпана, што за мінулыя трыццаць гадоў ён так і не пакаяўся на споведзі за свой цяжкі грэх...

І тут успомніў, што, пераехаўшы ў Мінск, ні разу не быў у царкве. А тут жа ёсць нават Сабор, дзе вялікія святы служыць сам мітрапаліт, уладыка Філарэт, якога Сцяпан не раз бачыў па тэлевізары.

У вёсцы, калі няма вялікага свята, то толькі ў нядзельку праходзіць маленне. А як у горадзе? Бо ў гэтую хвіліну ён вырашыў, што абавязкова сходзіць не ў царкву, а менавіта ў Сабор. Яму падалося, што толькі там зможа адмаліць свой грэх. Ад такой думкі адразу ж адчуў палёгку, знайшоў у даведніку патрэбны нумар і патэлефанаваў. Пры гэтым быў упэўнены, што яму ніхто не адкажа ў такі позні час, але памыліўся, бо адразу ж пачуў: "Слухаю вас!"

Ад нечаканасці ён нават разгубіўся, але пасля спытаў:

– Ці не падкажаце, калі праходзіць служба ў Саборы?

– Кожны дзень з дзевяці раніцы і з шасці гадзін увечары. Прыходзьце. Блаславі вас Гасподзь!

Сцяпан падзякаваў і паклаў трубку. У ягоных вушах усё яшчэ працягваў гучаць мяккі, запрашальны голас. Напэўна ж яму адказваў сам святар.

– Вось так, шаноўны мой, самы вялікі грэшнік у гэтым горадзе, – чамусьці ўслых прамовіў Сцяпан, – два разы на дзень праходзіць служба.

І ён вырашыў назаўтра ж наведаць Сабор, каб там даведацца, калі можна прыйсці да споведзі.

Ужо ў ложку пачаў успамінаць – калі апошні раз спавядаўся. Доўга думаў. Толькі пасля прыпомніў, што спавядаўся ў далёкія школьныя гады, калі

вучыўся ў пятым класе. І прыводзіла тады яго ў царкву бабуля. Яна была вельмі набожная, малілася да самых апошніх дзён свайго жыцця. І хаця ў тыя часы школьнікам забаранялася хадзіць у Храм, бабулю і Сцяпана гэта не палохала.

“Калі з-за гэтага цябе не прымуць у той чортаў камсамол, – не раз казала яна, – то не сумуй, а радуйся! Будзеш з Богам – не прападзеш. Уратуе ў цяжкія хвіліны твайго жыцця!”

Гэтыя бабуліны словы чамусьці цяпер усплылі ў ягонай памяці. А ў той час многія цэрквы былі закрытыя, а то і разбураныя. Іхняя цудам уцалела, бо была вельмі прыгожая: белакаменная, пад цынкавым дахам. Разбураць яе не збіраліся, але мясцоваму брыгадзіру вельмі карцела зрабіць там склад пад зерне. З вернікаў ён насміхаўся: “Будзеце скардзіцца, то не склад будзе ў царкве, а авечак туды пазаганяю!”

Але не паспеў здзейсніць сваю чорную справу. Праз які тыдзень схапіла яго запаленне лёгкіх, і памёр імгненна.

Пасля такога здарэння царква была ўратавана, толькі на які час забаранілі званіць.

Сцяпан яшчэ доўга варочаўся, думаў, бо неяк боязна было засынаць...

Пасля не вытрымаў, падняўся з ложка, падышоў да іконы, перахрысціўся і прашаптаў: “Дапамажы, Божа, вялікаму грэшніку спакойна ночку пераспаць!”

Моўчкі крыху пастаяў, углядваючыся ў святы лік Збаўцы, пасля вярнуўся у ложак. Павярнуўся да сцяны, заплюшчыў вочы і непрыкметна сон адолеў яго...

## Частка другая

Прачнуўся Сцяпан а дзесятай гадзіне, калі сонечныя промні ваўсю гаспадарылі ў пакоі. Такое з ім здарылася ўпершыню. Адчуваў сябе цудоўна. На зарадку бегчы было сорамна, і ён вырашыў зрабіць уборку ў кватэры і памыць бялізну.

За доўгія халасцяцкія гады да таго набіў руку на такіх справах, што не кожная жанчына магла б з ім спаборнічаць.

Спачатку замачыў бялізну ў ванне, а пасля ўзяўся за ўборку. І тут успомніў, што сёння вечарам павінен быць у Сабора. Гэта яго крыху збянтэжыла. Палезлі ў галаву розныя думкі. Яму нават падалося, быццам хтосьці зверху нашэптваў у самае вуха: "Чаго туды паедзеш? Ты ж страшэнны грэшнік – забойца. Такога сам Усявышні не даруе".

У роспачы прысеў на канапу і выпусціў з рук анучу.

Праз дзве гадзіны кватэру было не пазнаць – ніводнай пылінкі. А вось з бялізнай давялося павалэндацца.

Пасля вырашыў крыху адпачыць. Прылёг на канапе і ўключыў радыё. А там прагучала: "Перадачу вядзе выкладчык нядзельнай школы Барыс Аляксандравіч Ганага".

Невядомы прамоўца з лёгкім смуткам расказваў пра жыццё і пакутніцкую смерць Ісуса Хрыста. Запалі Сцяпану ў душу ягоныя словы: "Вера, калі не падмацавана добрымі справамі, – мёртвая, ад яе аніякай карысці". Спадабаліся і дзве прытчы, якія калісьці Хрыстос расказваў сваім вучням.

Асабліва адна з іх узрадавала Сцяпана, бо ў ёй прагучаў адказ на пытанне, якое мучыла яго доўгія гады. Апавядалася там пра фарысеяў, якія аднойчы спыталі ў Ісуса Хрыста: "Сёння субота, святы дзень, а ты дзяўчынку ўратаваў ад смерці". А Хрыстос ім у адказ: "А калі ў вас асёл у суботу ўпадзе ў калодзеж, то будзеце чакаць панядзелка, ці адразу ж кінецеся ратаваць? Вядома – будзеце выцягваць".

Гэтым наш Збаўца даў зразумець, што працаваць можна і ў святочныя дні, калі ёсць тэрміновая патрэба: сена перад навальніцай у копны скласці або штосьці іншае...

Цікавая была перадача. І тут Сцяпан пачаў здагадвацца, што нездарма апошнімі днямі адбы-

ваюцца з ім гэтыя падзеі: убачыў немаўлятка ў сне, пасля ў тэлевізары, і вось цяпер гэтая перадача.

Калі пачаць іх складваць – звяно да звяна, то ў хуткім часе і невялікі ланцужок можа атрымацца.

Ён падняўся з канапы і вырашыў адпрасаваць штаны, бо час было збірацца ў Сабор. І тут з радыё дыктар прамовіў: "Паслухайце кароткае паведамленне".

Сцяпан паспеў падумаць – зноўку будуць распавядаць, што хтосьці загадкава знік, але памыліўся. З якую хвіліну прыёмнік маўчаў, а пасля мужчынскі голас прамовіў: "Шаноўныя вернікі! Да вас звяртаецца айцец Сергій. Буду вельмі ўдзячны ўсім, хто дапаможа ў рамонце памяшкання, дзе будзе часова Свята-Праабражэнская царква. Тэлефануйце ў Епархію".

Сцяпан ледзь паспеў запісаць нумар тэлефона. І адразу ж патэлефанаваў. У Епархіі падзякавалі і папярэдзілі, што праз дзень-другі скажуць, куды пад'ехаць.

Ён хуценька адпрасаваў штаны і выйшаў на вуліцу. Часу яшчэ хапала, але яму хацелася прыехаць да Сабора крыху раней. Цяпер ён быў канчаткова перакананы, што гэтыя загадкавыя падзеі будуць працягвацца, вось толькі да чаго яны прывядуць?

Мо сам нябесны Анёл пасылае іх на загад Усявышняга, каб ўратаваць грэшную Сцяпанаву душу. А калі гэта толькі выпадковы збег акалічнасцей, тады што?

Як бы там ні было, а тут ён нічога не можа зрабіць. Заставалася толькі чакаць і дзейнічаць па сумленні, як падказвае душа і сэрца.

Выйшаў з аўтобуса і ўбачыў перад сабою Кафедральны Сабор, які велічна ўзвышаўся над горадам. Сцяпан крыху адышоў ад аўтобуснага прыпынку і спыніўся. Усё-ткі было чамусьці крыху боязна. Ён пазіраў навокал і зайздросціў у душы гэтым людзям, якія, напэўна ж, не былі такімі грэшнікамі.

Урэшце, не спяшаючыся, пачаў падымацца на пагорак. І калі ўжо быў побач з Храмам, нечакана ўдарылі званы. Ён уздрыгнуў, зірнуў на званіцу і ўбачыў там двух маладых хлопцаў у навушніках, якія тузалі за шматлікія вяроўкі.

Перад самым уваходам у Сабор ён тры разы перахрысціўся і нізка пакланіўся. Пасля гэтага з хваляваннем у душы падняўся на прыступкі і зайшоў у Храм.

Тут адразу ж асмялеў, бо ўбачыў людзей, якія сноўдалі туды-сюды, пісалі запіскі, куплялі свечкі, крыжыкі і нават кнігі пра жыццё святых.

Ён таксама купіў тры свечкі, яшчэ раз перахрысціўся і зайшоў у малельную залу Сабора. Адну свечку паставіў перад іконай Ісуса Хрыста, другую перад Багародзіцай, а трэцюю запаліў перад лікам Мікалая Цудатворца. Гэта Ён па малітвах ягонай бабулі ўратоўваў Сцяпана ў далёкіх вандроўках, дзе можна было загінуць у любы момант.

Сцяпан ведаў, што мужчынам трэба стаяць у Храме на правай палавіне. Знайшоў вольнае месца амаль ля самых дзвярэй і спыніўся.

Тым часам выйшаў з-за Царскіх дзвярэй святар, і служба пачалася. Сцяпан стаяў, нізка апусціўшы галаву, але пасля, калі дзесьці на верхатуры заспяваў хор, ён асмялеў і зірнуў на абраз Божай Маці. Яму падалося, што Яна са спачуваннем і жалем у вачах пазірае на яго. І тады ледзь чутна прашаптаў: “Заступніца наша! Закінь слоўца перад Усявышнім і за мяне – грэшніка, бо не разумеў, што тварыў у маладосці”.

Пасля, улучыўшы зручны момант, кінуў кароткі пакаянны позірк і на самога Збаўцу – Ісуса Хрыста. Сорам праціnaў ягоны розум, але ж трэба было трымацца да канца службы, раз прыйшоў у Храм.

Людзі паціху то заходзілі, то выходзілі. Некаторыя ставілі свечку, а пасля падыходзілі ледзь не да кожнай іконы, хрысціліся і цалавалі іх. У самым канцы службы Сцяпан даведаўся, што да споведзі можна трапіць у сераду і ў пятніцу, а таксама ў нядзелю, калі няма вялікага свята.

Выйшаў з Сабора з невялікай палёгкай на душы. Яшчэ свяціла сонейка, але ў паветры ўжо адчувалася ледзь прыкметная вечаровая прахалода.

Прыехаў у сваю Малінаўку і прылёг на канапу. Пачало шарэць. Сцяпан любіў такія хвіліны, бо на вачах пакой станавіўся загадкавым і таямнічным.

Думкі віталі дзесьці далёка, думалася пра лепшае, але зноўку ўсплываў у памяці ягоны сыночак. І няўжо такое адбываецца толькі з ім? Колькі абортаў робяць урачы ў Мінску толькі за адзін дзень – не злічыць! Але што ківаць на іншых? Трэба з сабою разабрацца. Тут было над чым падумаць, тым больш, часу ў яго хапала.

І што аборты – звычайнае забойства, разумеюць усе, але ж і забараніць іх немагчыма. Пабягуць тады маладыя дзяўчаты дый замужнія жанчыны да розных бабулек, якія могуць нарабіць яшчэ большай бяды. А мафія пачне на гэтым адразу ж зарабляць шалёныя грошы.

Вось калі б людзі былі больш набожнымі, як у мінулыя гады, баяліся такога граху перад Усявышнім, то ўсё было б інакш.

Раней аднаго-двух дзяцей у сям'і амаль і не было, сама меней пяцёра, а то і ўсе дзесяць. І хаця жылі ў галечы, але ж хапала сілы падняць усіх на ногі, калі не было якога пamoру.

Думкі, думкі... Не давалі яны спакою Сцяпану апошнімі днямі. Але колькі ні думай, а ўсё адно будзе так, як наканавана чалавеку лёсам, які не абмінеш і не аб'едзеш...

І зноўку Сцяпану прысніўся ягоны сыночак... Але было яму ўжо гады тры, а мо і больш. Быў ён у бялюткай сарочцы з кароткімі рукаўцамі і ў карычневых штоніках на шлейках. Такія сам калісьці насіў у маленстве. Басанож, бо было лета, стаяў той пад вялікай ліпай ля ягонай хаты, быццам чакаючы Сцяпана.

І калі падышоў да хлапчука і прысеў перад ім на кукішкі, той моцна абняў яго сваімі малымі ручкамі і прамовіў: "Бачыш, я ўжо крыху падрос.

У мінулы раз пакрыўдзіў цябе, але ты не сумуй, мы хутка сустрэнемся і назаўжды будзем разам. Я цябе ўсё адно люблю, а цяпер бывай!"

Тут хлопчык разняў ручкі і на вачах здзіўленага Сцяпана стаў паволі падымацца над зямлёю. Вось ужо ўзняўся над хатай, а праз хвіліну быў над верхавінай старой ліпы, затрымаўся там і пракрычаў: "Да сустрэчы! Бывай!"

Сцяпан не паспеў адказаць, як раптоўна знікла сонейка, па небе пранесліся чорныя хмары, мільганула адна маланка, другая, а пасля ляснуў пярун з такой сілаю, што ён аглух. Памкнуўся было сігануць у хату, але не змог зрабіць і крока, толькі адчуў, як цёплы дождж прамочвае да ніткі.

А на нябёсах хтосьці пагрозліва грукацеў, быццам каціў па брукаваным гасцінцы вялізную жалезную бочку. Тады Сцяпан не вытрымаў, апусціўся на калені і прашаптаў: "Прабач, Госпадзі, мяне, грэшніка!"

Пасля ўсё знікла. Ён зноўку хацеў кудысьці бегчы, але ўпаў на зямлю і... прачнуўся.

І тут выразна пачуў, як дождж барабаніць па аконным шкле. Ён падхапіўся з ложка і зірнуў на вуліцу. А там і сапраўды была навальніца, якой Сцяпан гэтым летам яшчэ не бачыў. Вада ручаямі бегла па асфальце. Легкавушкі ледзь прарываліся праз такую залеву. Аблокі зусім нізка і нерухома павіслі над горадам. Здавалася, што ім хочацца найхутчэй вызваліцца ад вады, каб прамыць горад і з палёгкай працягваць сваю вандроўку.

Што ж, добры дождж для горада ў летнюю спёку вельмі карысны.

Але ў яго з галавы не выходзіў начны сон. Бо калі ў першы раз ягоны сынок назваў яго забойцам, то яму было толькі сорамна і балюча за свой учынак, а вось цяпер пачаў працінаць страх...

Кожны ведае, што калі цябе кліча да сябе нябожчык, то трэба рыхтавацца ў апошнюю дарогу...

І хаця наўпрост да сябе ягоны сынок не клікаў, а казаў пра сустрэчу, тут няма вялікай розніцы, бо ўсё гэта можа здарыцца толькі на тым свеце...

Паснедаўшы, Сцяпан прысеў на крэсла ля акна. Ён пазіраў на поле, лес і дождждык, які не пераставаў, але ўжо адчувалася, што сілы яго на зыходзе.

Тут прыгадалася яму загадкавая смерць саракагадовага Ігара Бабкова з іхняй вёскі. Толькі ранняй вясной пахаваў ён бацьку, а праз два месяцы і самога не стала. І дзіўна тое, што калі былі саракавіны, то Ігар расказаў Сцяпану пра сон, у якім бацька клікаў яго да сябе вазіць салому. "Я пачаў адмаўляцца, – смеючыся, расказваў ён далей, – і прапаноўваў яму ў памочнікі Івана Платончыка, які без працы цэлымі днямі аціраецца ля вясковай крамы. Але бацька сказаў, што той не работнік – слабы і спіты, а ты намнога дужэйшы".

І праз які час Ігар памёр. Урачы сказалі, што тромб спыніў ягонае сэрца. Вось і паспрабуй пасля гэтага не верыць такім прарочым снам.

А бываюць яшчэ і папераджальныя сны, у якіх сам Усявышні наўпрост падказвае чалавеку пра небяспеку. Тут патрэбна да іх прыслухоўвацца, інакш бяды не мінаваць. Сцяпан успомніў, як адна жанчына расказвала ў электрычцы пра бортправадніцу з іхняга дома.

Тая перад чарговым рэйсам сказала сяброўцы: "Апошні мой вылет, пасля звальняюся, бо сёння ў трэці раз бачыла, як наш самалёт яшчэ ў паветры пачаў развальвацца на кускі, людзі крычалі, пасля страшэнны выбух... І вось ужо я адна лячу ў цёмным тунелі, а наперадзе гарацць яркія агні. Толькі да іх падляцела і... прачнулася".

І тут яна зрабіла памылку – выйшла на працу. Іхні самалёт і сапраўды разбіўся ў Сібіры, упаў у тайгу.

Калі знайшлі і праслухалі запісы чорных скрынак, то з іх даведаліся, што вінаваты ва ўсім шэфпілот, які ўзяў з сабой трынаццацігадовага сына. Узяў – гэта яшчэ што, але ж пачаў паказваць, як трэба пілатаваць. Націскаў розныя кнопкі, а самалёт быў замежны. І вось сын даў каманду бартавому камп'ютэру на зніжэнне, самалёт пачаў губляць вышыню, а вывесці яго зноўку на патрэбны курс экіпаж так і не змог.

Падобнае можа здарыцца з кожным чалавекам. Дый каму хочацца паміраць? Зразумела – нікому. Тым больш яму, Сцяпану, які ўпотайкі яшчэ марыў пра сямейнае жыццё.

Але як той казаў: “Чалавек думае, а Бог смяецца!” Марыць, канечне, нікому не забаронена. Але калі на тое пайшло, то дзе ж Божая справядлівасць? Так, Сцяпан вінаваты, гэта факт. Але калі капнуць глыбей, то і пакаранне сваё, лічы, адбыў – самыя лепшыя гадочкі правёў ў адзіноце. Гэта замест таго, каб цешыцца і мілавацца з маладой жонкай, ён гойсаў з рукзаком па тайзе і тундры, а вольнае жыцце ўсё мацней зацягвала ў дрыгвяністае балота адзіноты...

Няўжо цяпер Усявышні вырашыў забраць яго да сябе... Напэўна, так яно і ёсць. І крыўдна, што больш ён у сваім жыцці не грашыў. Хаця, калі шчыра прызнацца, то і пасля былі ў яго жанчыны, і не адна, але ж да нараджэння дзіцяці справа не даходзіла.

А калі браць з жыцця штосьці іншае, то тут ён быў чысты, як тая кропля расы на ружы. За ўсё жыццё нікога не пакрыўдзіў, а толькі стараўся дапамагчы, чым мог. Колькі грошай заробленых ён параздаваў – не злічыць.

І зноўку, у які ўжо раз, прабралася ў ягонаю душу самота. Ад яе ўчэпістых абдымкаў цяжка было абараніцца. Заставалася толькі марыць, што і ў яго калісьці наладзіцца асабістае жыццё, а пакуль трэба чакаць.

Так, зямны час бяжыць да таго імкліва, што калі іншым разам Сцяпан раздумваў пра гэта ў сваёй пакутніцкай адзіноце, то яму рабілася проста страшна...

Гэта ж вось так непрыкметна падкрадзецца і той апошні дзень, калі трэба будзе памерці. Паміраюць, праўда, усе, але гэты факт мала суцяшальны. Каб хоць давялося пражыць год дзевяноста, а то і ўсе сто, тады іншая справа.

І ён падумаў, каб у якога разумнага чалавека пракансультавацца наконт ягоных сноў. Канеч-

не, лепш за ўсё дапасці да навукоўца, які зубы з'еў на снах. Павінна ж быць нейкае навуковае абгрунтаванне гэтай загадкавай з'яве. Не ўсе ж сны спраўджваюцца, калі ўжо на тое пайшло. Узяць тыя ж сонні́кі. У адных пішуць, што свіней бачыць дрэнна, у другіх – добра. А ў трэціх – парасяты, якіх ты пасвіш на лузе, прынясуць у хуткім часе вялікую радасць у хату.

Але зноўку быццам хтосьці нашэптваў Сцяпану ў самае вуха: "Што тычыцца нябожчыкаў, то гэты факт неаспрэчны, і ў народзе правераны. Так што сябе не суцяшай, а лепш рыхтуйся ў апошнюю дарогу..."

Сцяпан ад такой думкі ажно скамянеў, пасля падняўся з табурэткі і пачаў паволі хадзіць па пакоі. Ён вырашыў на гэтым тыдні схадзіць да споведзі. Бо калі давядзецца нечакана памерці, то будзе паспавяданым. Усё ж, магчыма, на тым свеце будзе ягонай душы хаця б невялікая палёгка.

Нажытага скарбу і багацця ў яго не было, але ж трэба падумаць і пра маёмасць – кватэру і хату ў вёсцы. І вырашыў Сцяпан так: калі што здарыцца, то кватэру няхай дзяржава забірае, а хату надумаў апісаць на дачку свайго хроснага бацькі, які яшчэ дзесьці жыве ў вёсцы Каты. Яму далёка за восемдзесят, але бадзёры, трымаецца. Трэба тэрмінова яго наведаць, вырашыў Сцяпан і нават крыху супакоіўся.

Ён любіў жыць і дзейнічаць па загадзя намечаным плане, тады не так хваляваўся і быў нават у настроі, калі ўдаваліся ягоныя халасцяцкія задумкі.

Каб крыху развеяцца, ён вырашыў схадзіць у гастраном, бо хлеба амаль не было, толькі акраец застаўся. І толькі падышоў да дзвярэй, як зазваніў тэлефон. З Епархіі паведамілі, што калі ён зможа, то каб у дзве гадзіны быў на праспекце газеты "Известия". Там яго сустрэне айцец Сергій. А чакаць яго павінен Сцянан на прыступках мясцовай пошты.

Ён хуценька пераапрануўся і выйшаў. Пошта была на самым рагу праспекта. Сцяпан паволі

пачаў шпацыраваць па ўнушальных памераў пляцоўцы, якую назваць ганкам і язык не паварочваўся. Не сумняваўся, што адразу ж пазнае святара нават у мірскім адзенні. Сцяпан уяўляў яго ў гадах, з сівой бародкай, паўнаватага і з ціхім ласкавым голасам.

Але памыліўся. Не прайшло і дзесяці хвілін, як да яго падышоў малады чарнявы хлопец у блакітнай тэнісцы, светлых штанах, з невялікай, але акуратна падстрыжанай бародкай, якія носяць цяпер нават студэнты. У правай руцэ ён трымаў партфель жоўтага колеру. Гэта і быў айцец Сергій.

Павітаўшыся са Сцяпанам, святар хуценька павёў яго ў будынак, што стаяў побач. Тут была даволі вялікая зала і некалькі пакояў. Усюды на падлозе валяліся ашмоткі старых газет, а ля акна ўзвышалася гара з бітых чырвоных цаглін.

– Вось тут і будзе наша часовая царква, – прамовіў айцец Сергій. – А праз які час, з Божай дапамогай, пабудуем сапраўдны Храм, месца ўжо ёсць, нават фундамент паспелі заліць. Зараз яшчэ павінны падысці вернікі, а пакуль трэба выносіць усё смецце на вуліцу.

Айцец Сергій паехаў па справах у Епархію, а Сцяпан узяўся за працу. Пасля падышлі дзве жанчыны, малады хлопец і дзядок, якому было дзесьці за семдзесят. Працавалі да змяркання. У сваю кватэру Сцянан прыехаў стомлены, запылены, але шчаслівы. Памыўшыся, ён не спяшаючыся піў гарбату з мёдам.

І калі, вярнуўшыся з Сабора, ён толькі крыху супакоіўся, то цяпер спявала душа і сэрца, Сцяпан адчуваў, што далучыўся да чагосьці святога і робіць патрэбную справу.

Прыгадаўся яму тут выпадак з адным падарожнікам. Убачыў той будаўнікоў на ўскрайку вёскі, падышоў да аднаго і пытае: “І што ты робіш?”

А той у адказ: “Сам не бачыш?! Камяні варочаю!” А другі змахнуў з ілба пот і са шчаслівай усмешкай прамовіў: “Будую Храм Божы!”

Так і ў Сцяпана выйшла, бо радасць не пакідала яго на працягу цэлага тыдня. Праўда, памяшканне яны падрыхтавалі за чатыры дні, але ж пасля перавозілі з цеснага склепа, дзе раней ішло маленне, усю царкоўную маёмасць. І на ягоных вачах зала ператварылася ў сапраўдную царкву.

У апошні дзень айцец Сергій прывёз з Епархіі шмат хрысціянскай літаратуры і іконак. Падзякаваў Сцяпану за працу і падарыў яму іконку Божай Маці, Ісуса Хрыста і Мікалая Цудатворца. Пасля яшчэ ўручыў ладны стос кніжак, былі там і дзіцячыя.

Сцяпан у той дзень вяртаўся ў сваю кватэру ўзрушаны і шчаслівы. Адразу ж адну іконку прымацаваў на кухні, а дзве іншыя ў зале. Яму нават падалося, што сама Божая Маці ласкава пазірае на яго, абяцаючы сваю падтрымку і заступніцтва.

## Частка трэцяя

І адразу ж узяўся разглядваць кнігі. Спачатку перагортваў дзіцячыя. Тут было многа малюнкаў і апавядалася пра нараджэнне і дзіцячыя гады Ісуса Хрыста. Цікавай была і “Біблія для дзяцей”. Сцяпан з добрую гадзіну ўсё не мог адарвацца ад гэтых святых старонак. Але ж вельмі карцела і іншыя кніжкі пагартаць.

Асабліва адна ўразіла яго, пад назваю: “Пра веру, маральнасць і вучэнне Праваслаўнай царквы”. Ён адразу ж знайшоў старонку, дзе апавядалася пра пакаянне, бо яму, грэшніку, трэба было рыхтавацца да споведзі.

Аказалася, што Ісус Хрыстос даў апосталам, а праз іх і святарам уладу дараваць грахі: “Дзьмухнуў і кажа ім: прыміце Духа Святога: каму даруеце грахі, з таго здымуцца, на кім пакінеце – застануцца”.

Яшчэ прачытаў, што Усявышні не жадае смерці грэшніка, а наадварот, калі хто чыстасардэчна пакаецца, то які б вялікі ні быў грэх, Бог яму даруе.

Гэтыя словы ўзрадавалі Сцяпана, але яму зноўку, у які ўжо раз, было адно незразумела – чаму менавіта цяпер, праз трыццаць гадоў, Усявышні нагадаў пра ягоны грэх? Што Ён гэтым хоча сказаць?

Асабліва ўразілі Сцяпана ў кніжцы словы прападобнага Антонія Вялікага, які калісьці сказаў: “Не думай пастаянна пра свае грахі, старайся выкінуць іх са сваёй галавы, інакш зноўку можаш награшыць. Будзь упэўнены, што яны дараваны табе ў той час, калі ты поўнасцю аддаў сябе Усявышняму, і ніколькі ў гэтым не сумнявайся”.

Чытаў Сцяпан яшчэ доўга, пакуль трывалі вочы. Пасля, лежачы ў ложку, калі ўзяліся прыцемкі, пачаў думаць...

Гэта ж нездарма ён пачуў па радыё тую аб’яву. Ён пачаў разумець, што Усявышні дае шанц, працягвае грэшніку святую руку, хоча выцягнуць з грахоўнай багны...

І яму трэба не ўпарціцца, а скарыстаць такія абставіны ды з Божай дапамогай пачаць новае жыццё. Цяпер Сцяпан быў упэўнены, што і гэтыя кнігі перадаў яму праз святара сам Хрыстос, каб ён набраўся больш ведаў і падрыхтаваўся да споведзі.

А тут і заснуць не мог. Упершыню захацелася, каб хутчэй наступіла раніца, ды зноўку ўзяцца за кніжкі. Ён нават усміхнуўся, бо ўсплыла ў галаве прымаўка: “Хутчэй бы раніца ды на працу!”

Во! Трэба ж яму і сапраўды падумаць пра працу. Грошы пакуль ёсць, бо жыве ён ашчадна, як той манах-пустэльнік, але ж і яны некалі скончацца. Што ж, калі на тое пайшло, то ён і грузчыкам можа папрацаваць. Здароўем, дзякуй Богу, пакуль не пакрыўджаны.

І вось так ён сябе супакойваў да тае пары, пакуль не заснуў. І прысніўся яму цудоўны сон. Быццам паволі ідзе ён шырокім лугам, навокал шчабечуць птушкі, павявае ветрык, ад шматлікіх кветак ідзе адурманьвальны мядовы пах. На небе адна сінеча, сонейка лагоднымі промнямі саграває наваколле. Побач цячэ іхняя Вялля, ад якой цягне

выратавальнай прахалодай. Па яе берагах стаяць, быццам тыя вартаўнікі, волаты-дубы, а за імі, на ўзвышшы, ледзь чутна гамоніць сасновы бор.

Вось і невялікі пагорак. Сцяпан разбягаецца, моцна адштурхоўваецца нагамі, ускідвае ўгору рукі і... цуда – паволі ўзнімаецца ў паветра. Ягоныя рукі быццам тыя чароўныя рулі: падніме – узлятае ў нябесную сінечу, а крыху апусціць – зніжаецца.

Палятаў так над рэчкай, верхавінамі дубоў і сасновага бору. Пасля мякка прызямліўся на лузе. І яму было вельмі радасна, што вынайшаў такі лёгкі спосаб паднімацца ў паветра. Для гэтага патрабавалася толькі знайсці невялікі пагорак, разбегчыся – і ты становішся вольнай Божай птушкай.

Якое ж расчараванне чакала яго, калі ён толькі расплюшчыў вочы, бо зразумеў, што лятаў у сне. Пра такія сны кажуць, што чалавек у іх падрастае. Але ж Сцяпану было за пяцьдзесят.

З раніцы ў добрым настроі зноўку ўзяўся за кніжкі. Перабраў усе ўважліва і знайшоў там малітоўнік. Як гэта яго ўчора не прыкмеціў? З усіх малітваў Сцяпан ведаў на памяць толькі “Ойча наш”. А ў малітоўніку былі малітвы на ўсе выпадкі нашага грахоўнага жыцця.

Але гэта яшчэ што? Аказалася, што маліцца трэба адразу ж раніцай, як паднімешся з ложка, і абавязкова перад пачаткам якой-небудзь сур’ёзнай справы.

Былі тут малітвы свайму Анёлу-Выратавальніку, Божай Маці, святому Мікалаю Цудатворцу, які аберагае ўсіх падарожнікаў, а таксама святому Панцеляймону, які ратуе ад хваробаў.

Сцяпану стала сорамна, што ён пражыў столькі гадоў без малітвы. Колькі разоў у сваіх вандроўках ён трапляў у такія абставіны, што здавалася, няма выйсця, але заўжды хтосьці нябачны ў самы апошні момант яго ўратоўваў. У той час яму думалася, што зноўку пашчасціла. Але цяпер зразумеў, што толькі малітвы бабулі і матулі падтрымлівалі яго ў час вандровак.

Магчыма, нават і цяпер, калі яны на тым свеце, то ўсё яшчэ працягваюць маліцца за яго.

Але ж і ён павінен прасіць за іх у Ісуса Хрыста і Божай Маці, каб іхнім душам была палёгка на нябёсах.

Малітваў было многа, але Сцяпан вырашыў паступова вывучыць на памяць асноўныя, без якіх немагчыма пражыць і дня.

Дзесьці праз тыдзень, калі вывучыў пяць малітваў, ён адправіўся ў Сабор да споведзі. І хаця была серада, звычайны дзень, але спавядальнікаў сабралася даволі шмат. Недзе а палове дзевятай яны запоўнілі амаль усё невялікае паўпадвальнае памяшканне.

Неўзабаве выйшаў малады бацюшка з густой чорнай барадой і пачаў чытаць спавядальныя малітвы. Пасля звярнуўся да прысутных са словам Божым. Ён сказаў, што сёння ў спавядальнікаў самы адказны момант у іх жыцці. Сябе святар назваў толькі пасярэднікам паміж людзьмі і Усявышнім.

Пасля пачалося само спавяданне. Тут з'явіўся яшчэ адзін бацюшка, ужо ў гадах, з кароткай бародкай.

Кожны расказваў цішком пра свае грахі, пасля святар пакрываў спавядальніка краем расы, хрысціў і адпускаў. Чарга паволі пасоўвалася. Сцяпан трапіў якраз да таго святара, што прыйшоў пазней. У яго чамусьці надоўга затрымліваліся, і гэта наганяла на Сцяпанаву душу яшчэ большага страху.

Калі ён апынуўся зусім блізка ад бацюшкі, то пачуў, як ён многа задаваў пытанняў маладой дзяўчыне. Урэшце Сцяпан як мог супакоіў сябе, рашуча ступіў і прамовіў:

– Спавядаецца вялікі грэшнік, раб Божы Сцяпан.

– Слухаю вас, – ласкава-суцяшальным голасам прамовіў святар.

І тут Сцяпан расказаў пра свайго сыночка і пра свой сон. Ён нават не прыкмеціў, як пасля сказанага ў яго на вачах з'явіліся слёзы.

– Гэта добры знак з нябёсаў, – супакойвальным голасам прамовіў бацюшка. – І вельмі добра, што вы ўрэшце каецеся перад Усявышнім, каб Ён дараваў вам гэты цяжкі грэх. Адчуваю ваша чыстасардэчнае пакаянне, а таму, – тут ён ахінуў Сцяпанаву галаву расай, – даруюцца рабу Божаму Сцяпану яго грахі.

Пасля Сцяпан перахрысціўся, пацалаваў вокладку ў Бібліі і выйшаў праз дзверы ў вялікую залу Сабора, дзе ішло маленне. Дзесьці праз гадзіну ўсе спавядальнікі прычасціліся, і на гэтым служба ў Саборы скончылася. Але яму не хацелася выходзіць на вуліцу. Сцянан паклаў грошы ў адну скарбонку, пасля яшчэ на рамонт Храма, пастаяў моўчкі перад іконай Божай Маці і Ісуса Хрыста. Сонечныя промні праз вокны траплялі у Сабор, і Сцяпан адчуў такую ўзнёсла-радасную палёгку, што нават сам здзівіўся.

Едучы дадому ў аутобусе, ён толькі пра адно шкадаваў – не расказаў святару, што ягоны сынок абяцаў яму хуткую сустрэчу. Але што святар мог бы на гэта сказаць? Сцяпан супакоіў сябе тым, што яшчэ паспее пра гэта спытаць, бо на споведзі трэба хадзіць як мага часцей.

Па дарозе ў сваю кватэру вырашыў зазірнуць у газетны кіёск. Купіў праязных талонаў, хацеў адыходзіць, як у вочы кінулася назва: “Царкоўнае слова”. Адразу ж набыў. Ён і не ведаў, што ўжо трэці год выходзіць такое цікавае выданне для вернікаў. На адным дыханні прачытаў артыкул акадэміка Віктара Вейніка.

Вось бы з кім пагутарыць яму пра ягоны сон! Сцяпан падняўся з-за стала і пачаў паволі праходжвацца па пакоі.

І хаця ўжо заканчваўся ліпень і трэба было ехаць у вёску, бо там праца заўсёды знойдзецца, Сцяпану захацелася да ад’езду сустрэцца з акадэмікам. Яму здавалася, што хтосьці нябачны раіў яму неадкладна зрабіць гэта.

Без усялякай надзеі патэлефанаваў у Акадэмію навук. На ягонае шчасце, жаночы голас паведаміў

яму службовы тэлефон акадэміка. Сцяпан узрадаваўся, але адначасова і спалохаўся, бо не ведаў, як упрасіць акадэміка на сустрэчу. Такія людзі нават журналістам адмаўляюць, а пра Сцяпана і казаць няма чаго.

З добрую гадзіну рыхтаваўся да размовы. Некалькі разоў браў у рукі тэлефонную трубку, але страх перамагаў, паволі клаў яе на месца і працягваў моўчкі хадзіць па пакоі.

Пасля спыніўся перад абразамі, перахрысціўся і прашаптаў: "Дапамажы мне, Божа, у гэтай справе". Хуценька набраў патрэбны нумар і пачаў чакаць. Доўга ніхто не падыходзіў, хацеў пакласці трубку, як раптам пачуў:

– Слухаю вас!

– Шаноўны Віктар Іосіфавіч! – дрыготкім голасам пачаў ён. – З вамі размаўляе Сцянан Дуброўскі – самы вялікі грэшнік нашай Беларусі. Ці не змаглі б вы прыняць мяне. Маю такое пытанне, што ночы не сплю. Я вас не затрымаю – хвілін дзесяць, не больш, вельмі прашу...

Ён змоўк, чакаючы адказу, быццам прыгавору ў судзе.

– Ну што ж, – пачулася ў трубцы. – І хаця ў мяне сёння апошні працоўны дзень – іду ў адпачынак, але раз такая справа, то прыязджайце. Чакаю вас у дзве гадзіны, ля цэнтральнага ўваходу, дзе калоны.

– Дзякую вам! Я прыеду! – не хаваючы радасці ўскрыкнуў Сцяпан і паклаў трубку.

Пасля зірнуў у люстэрка і схамянуўся – шчэць на твары давала пра сябе знаць. Часу хапала, ён няспешна пагаліўся і адпрасаваў штаны.

Прыехаў Сцяпан за добрую гадзіну да сустрэчы. Каб неяк збавіць час, падаўся да кінатэатра "Кастрычнік". Крыху пашпацыраваў, а пасля прысеў на лаўку ў скверыку і пачаў абдумваць размову з акадэмікам. Ён павінен быў лёгка яго пазнаць, бо ў "Царкоўным слове" быў невялікі фотаздымак навукоўца, дзе той быў у чорным швэ-

дэры, трымаў у руках акуляры і пазіраў на чытача з даверлівай усмешкай на твары. Была ў яго і сіваватая бародка.

Дзень выдаўся быццам на заказ – сонечны, цёплы, нават пачала даймаць спякота. Сцяпан зірнуў на гадзіннік, падняўся з лаўкі і паволі пасунуўся да падземнага пераходу. На тым баку праспекта добра былі відаць вялізныя калоны акадэміі. Калісьці ў гэтым будынку працаваў сам Якуб Колас, вершы якога Сцяпан вучыў у школе.

Не спяшаючыся, перайшоў на другі бок праспекта і накіраваўся да акадэміі. І толькі падняўся па прыступках да першай калоны, як уваходныя дзверы адчыніліся, і ён убачыў акадэміка. Той адразу ж накіраваўся да яго.

– Гэта я вам тэлефанаваў, Віктар Іосіфавіч, – прамовіў Сцяпан і адчуў, як гарачая хваля сполаху шуганула па грудзях.

– А я раней выскачыў, падумалася, мо даўно чакаеце. Прашу ў мой кабінет.

Падняліся на другі паверх і пашыбавалі па шырокім калідоры, зварочвалі то ўправа, то ўлева. Урэшце трапілі ў невялікі пакой, але з густам абстаўлены. Сцяпана ўразілі шматлікія паліцы з кнігамі і папкамі. Акадэмік усеўся за свой стол, а Сцяпан працягваў стаяць ля дзвярэй.

– Сядайце, не саромцеся, – запрасіў акадэмік, складваючы ў блакітную папку розныя паперы.

Сцяпан прысеў на адно з крэслаў, што стаялі ўздоўж сцяны.

– Слухаю ваша складанае пытанне, – прамовіў акадэмік, уважліва зірнуўшы на Сцянана.

– Прабачце, што адымаю ў вас час, – Сцяпан на хвіліну змоўк, а пасля расказаў пра свой сон,

– Пытанне і сапраўды складанае, – акадэмік уздыхнуў і пагладзіў сваю бародку. – А наконт сноў можна размаўляць да позняга вечара.

– Хаця б скажыце, ці бываюць прарочыя сны? – спытаў Сцяпан.

– На вялікі жаль – бываюць, – адказаў акадэмік і ўздыхнуў. Сцяпан адчуваў, што навукоўцу чамусьці не вельмі хочацца размаўляць на гэтую тэму.

– І бываюць прарочыя сны ад таго, – працягваў акадэмік, – што наша будучае наканавана мінулымі ўчынкамі. Бывае, што ў сне чалавек выходзіць у астрал, а там душа можа рухацца не толькі ў прасторы, але і ў часе. У такіх выпадках сняцца вельмі дакладныя прарочыя сны.

– А я вось ужо некалькі разоў бачыў у сне мною загубленага сыночка. Што б гэта магло азначаць?

– Калі сон паўтараецца, то ўсё можа здарыцца і ў рэальным жыцці,– адказаў акадэмік.

– Як жа так? – з роспаччу ў голасе прамовіў Сцяпан. – Калі ўзяць канкрэтна мой выпадак, то як я магу сустрэцца, калі сынок быў забіты ва ўлонні сваёй маці яшчэ да нараджэння.

Акадэмік на хвіліну задумаўся, пасля зірнуў на Сцяпана і сказаў:

– Можаце сустрэцца і з ненароджаным немаўляткам.

– Але гэта магчыма толькі ў адзіным выпадку, – амаль шэптам прамовіў Сцяпан, – калі мая душа сустрэнецца з ягонай на тым свеце, так?

– Ды не! – акадэмік усміхнуўся. – Магу вас супакоіць на гэты конт. Скажу больш: бачыць у сне сваіх памерлых родзічаў можна, галоўнае – каб яны не паклікалі вас да сябе. Так што жыць вы будзеце. Ваш сынок толькі паведаміў пра хуткую сустрэчу тут, на нашай зямлі!

– Няўжо такое магчыма?

– Ды як вам сказаць... У навукоўцаў існуе думка, што розум чалавека пасля смерці працягвае сваё існаванне і можа ўвасобіцца ў розных целах. І вось гэтая бесперапыннасць розуму і называецца рэінкарнацыяй. Пра гэта ўпершыню заявілі прадстаўнікі тыбецкага будызму.

– Калі я вас правільна зразумеў, то гэта азначае, што пасля смерці чалавека ягоны розум можа праз які час увайсці ў яшчэ ненароджанае немаўлятка.

– Вось іменна! – усклікнуў акадэмік.

– Але ж тады розум дзіцяці можа захаваць успаміны пра жыццё памерлага чалавека, ад якога ён выйшаў, – выказаў сваю здагадку Сцяпан.

– Так яно і ёсць на самай справе! – акадэмік быў задаволены Сцяпанавым адказам. – Існуе мноства прыкладаў, – працягваў ён. – Вось сынок маёй добрай знаёмай дзесьці ў пяць гадоў сказаў: "Мамачка! Я памятаю, што я доўга-доўга лятаў у паветры і шукаў цябе. А потым знайшоў і нарадзіўся". А ягоная сястрычка дабавіла: "А я памятаю, што была вавёркай, ляжала ў дупле, і мне было вельмі цёпла і ўтульна!"

– А ці магчыма навукова даказаць тэорыю перанараджэння? – спытаў Сцяпан.

– Нашы навукоўцы гэтым не займаюцца. А вось бураты, дзе мне давялося пражыць некалькі гадоў, праводзяць такі дослед: калі чалавек памірае, то яго цела ў пэўных месцах прыпальваюць спецыяльнымі палачкамі. Потым дзесьці паблізу абавязкова нараджаецца немаўлятка з радзімкамі на тых месцах.

– А вось тут, у нашай Беларусі, вам ніхто не расказваў аб перанараджэнні?

– 3 год таму мне давялося размаўляць з адной жанчынай, маці-адзіночкай. Дык вось, яна ўбачыла сябе ў сне сямігадовым хлопчыкам, які стаяў са сваёй маці ў чарзе. Пасля яны зайшлі ў памяшканне, дзе мужчыны кідалі людзей у агонь. Праз якую хвіліну туды ж кінулі і хлопчыка. Дый многія і цяпер расказваюць, як іх спальвалі жывымі.

– Але ж за мяжой павінны праводзіць доследы, звязаныя з рэінкарнацыяй? – спытаў Сцяпан.

– Праводзяць. І нават займаюцца лячэннем такіх "перароджанных" людзей. Мне аднойчы пашчасціла трапіць на лекцыю знакамітага ўрача Хэйзіх Дзенінг, якая расказвала пра розныя цікавыя выпадкі. Яна лечыць сваіх пацыентаў, злучаючы тэрапію і рэгрэсію ў мінулае жыццё. Дык вось, завітаў да яе на прыём дзевяцігадовы хлопчык, каб даведацца, чаму ён баіцца крыві. І калі яна ўвяла яго ў зменлівы стан, то хлопчык адразу ж убачыў сябе паміраючым дзядулем і прамовіў:

“Я паміраю ад вялікага гора”. І пачаў распавядаць, што ў мінулым жыцці ён павёў сваю жонку ў рэстаран. Раптам у залу нехта ўварваўся і застрэліў некалькі чалавек, у тым ліку і ягоную жонку. Яна памерла ў вялікай лужыне крыві. І вось гэты перажыты ім жах стары перанёс у новае жыццё, але з пачуццём віны, што не змог у мінулым уратаваць сваю жонку.

А аднойчы мужчына ў час сеансу напісаў ёй некалькі слоў на незямной мове, а потым іх пераклаў і сказаў, што раней жыў на другой планеце і яму зразумелы прынцып “адначасовасці”, які заключаецца ў тым, што мінулае, сучаснае і будучае адбываецца ў цяперашні час.

– А як ставяцца да перанараджэння чалавечай душы сучасныя багасловы?

– Адмоўна. Усім добра вядома, што пасля смерці душа трапляе ў рай або пекла і там чакае Страшнага суда.

– А што пра гэта думаеце асабіста вы? – задаўшы такое пытанне, Сцяпан нават крыху спалохаўся, бо вельмі баяўся пакрыўдзіць акадэміка.

Але той толькі ўсміхнуўся і адказаў:

– Асабіста я думаю, што перанараджэнне усё-ткі адбываецца. Справа ў тым, што яшчэ ў раннім хрысціянстве прысутнічала вучэнне аб перанараджэнні. Існавала яно да 533 года нашай эры. І быццам гэтаму нават вучыў сам Ісус Хрыстос. Звесткі пра рэінкарнацыю былі ў старажытных пісаннях. Але потым іх выкінулі з хрысціянскага вучэння.

– А ці існуе які прамежак часу паміж смерцю і вяртаннем?

– Тут ёсць розныя меркаванні. Бывае, што некаторыя людзі вяртаюцца праз некалькі гадзін. Згінулыя воіны не могуць доўгі час быць па-за целам. Думаю, што з гэтай прычыны пасля вайны колькасць насельніцтва рэзка ўзрастае. А вось розум іншых памерлых людзей сыходзіць на сотні гадоў, а то і больш.

– У сваім апошнім сне я размаўляў са сваім сыночкам, якому было ўжо гады чатыры. Але ж ён памёр яшчэ не нарадзіўшыся.

– Ну і што? Ён жыў ва ўлонні сваёй маці. У яго працавалі ўсе органы: білася сэрца і функцыянавала ўсё іншае... А праз год трыццаць ён мог перанарадзіцца ў іншае цела і папярэджвае ў сне вас, свайго першага бацьку, пра хуткую сустрэчу ўжо тут, на зямлі, а не на нябёсах.

– У гэта цяжка паверыць, – прамовіў Сцяпан.

– Такое можа здарыцца з кожным, – адказаў акадэмік і зірнуў на гадзіннік.

– Прабачце, што адымаю столькі часу, але апошняе пытанне, можна?

– Нічога. Калі змагу, то адкажу, – прамовіў акадэмік і ўсміхнуўся,

– Я вось у мінулую ноч лятаў у сне. Гэта ж толькі дзеці лятаюць, бо растуць, а мне за пяцьдзесят...

– Тут іншая справа. Калі чалавек лятае, быццам тая птушка, то вельмі добра. Гэта азначае, што ягоныя энергетычныя каналы чыстыя. Ён знаходзіцца ў добрым псіхалагічным, фізічным і эмацыйным стане.

– А як бы вы растлумачылі, што Усявышні дапускае нараджэнне дзетак-калек, або яшчэ горш – забірае іх у малечым узросце на нябёсы. Іхнія ж душы бязгрэшныя?

– Пытанне ваша яшчэ больш мудрагелістае, чым папярэдняе. Але паспрабую і на яго адказаць. Праваслаўная царква лічыць, што чалавеказабойства – самы цяжкі смяротны грэх, які кладзецца на ўвесь род забойцы, калі ён не пакаецца або нашчадкі не замоляць яго. А навукоўцы на доследах даказалі, што ў час забойства адбываецца моцны энергетычны выбух – ад чалавека аддзяляецца нейкі фантом яго генетычнага апарату, які валодае вялікай біялагічнай актыўнасцю. Ён разбурае генетычны апарат забойцы, а гэта вызывае розныя хваробы. Той можа здурэць або пайсці на самагубства.

Нават вялікі рускі пісьменнік Дастаеўскі пісаў, што забойца пачынае атрымліваць пакаранне ў момант злачынства.

Такі ж фантом выдзяляецца і ў час аборту, калі вакуумны насос разрывае на часткі цела плода. І ён застаецца ў матцы, як бы старанна ні вычышчалі яе ўрачы. І вось гэты фантом разбурае генетычны апарат жанчыны, а пасля і мужчын, якія будуць мець з ёй сувязь. Больш за тое – калі ў такой жанчыны пасля народзіцца яшчэ дзіця, то яно будзе калекам, а то і памрэ. І той фантом ад першага немаўляці будзе ўсё жыццё скардзіцца сваім малодшым братам і сястрычкам пра сваю няшчасную долю.

– Што ж атрымліваецца, Віктар Іосіфавіч? Выходзіць, што навукоўцы сваімі працамі як бы пацвярджаюць, што адзіны тварэц Сусвету – Усявышні. І за кожны грэх чалавек нясе пакаранне.

– Так яно і ёсць на самай справе, – адказаў акадэмік. – Я даўно прапаноўваў, каб у аснову ўсёй навукі былі ўзятыя тэксты з Бібліі. Я адкрыў у свой час хранальныя і метрычныя з'явы і ўпэўнены, што Усявышні стварыў Сусвет за сем дзён. Біблію пісалі на працягу 1660 гадоў, з перапынкам у 400 гадоў, паміж Старым і Новым Запаветамі. У ёй немагчыма нават слова пераставіць або дабавіць штосьці сваё.

Тут Сцяпан зірнуў на гадзіннік і схамянуўся – амаль дзве гадзіны праляцела ў размове. Ён падняўся з крэсла.

– Вялікі вам дзякуй, Віктар Іосіфавіч. А то пасля сваіх сноў я месца сабе не знаходзіў. Я ж і на споведзі быў. Сорамна прызнацца, але ў маладосці не маліўся, дый у царкве бываў не часта. Падарожнічаў, а гадочкі і праляцелі...

– Нічога, – акадэмік таксама падняўся з-за стала. – Думаю, што цяпер у вас усё пойдзе на лад. Толькі памятайце – малітва мае вялікую ачышчальную сілу. Жадаю вам усяго найлепшага!

Ён падышоў да Сцяпана і моцна паціснуў на развітанне яму руку.

## Частка чацвёртая

Праз якую гадзіну Сцяпан быў у сваёй кватэры. Хуценька пераапрануўся і прылёг на канапу. З галавы не выходзіла размова з акадэмікам. Колькі цікавага і павучальнага ён расказаў. Сцяпанава душа канчаткова супакоілася. Цяпер сустрэча са сваім сынком яго не палохала. Дый ці адбудзецца яна на самай справе? Яго ранейшыя сны амаль ніколі не спраўджваліся. Вось летась прыснілася, што сам кіраўнік нашай дзяржавы падарыў яму чорную "Волгу", на якой Сцяпан раз'язджаў усю ночку. Нават прыехаў у сваю вёску, дзе вельмі здзівіў суседзяў. А пасля дзве ночы запар яго ўзнагароджвалі ў Маскве залатой зоркай героя былога Саюза. Ён да таго быў узрадаваны, што месца сабе не знаходзіў – штохвілінна пазіраў на сваю зорку і днямі шпацыраваў па вуліцах Мінска.

Праўда, калі прачынаўся пасля такіх сноў, то адчуваў сябе ніякавата. А бывала, што ўсю ноч рыбу лавіў, ды такіх шчупакоў выцягваў – па метры, а то і больш. Ва ўсіх сонніках напісана, што гэта вельмі файны сон. Але праходзіў дзень-другі, а нічога такога не здаралася. І Сцяпан, калі шчыра прызнацца, то не вельмі снам і верыў, але спадзяваўся, што і да яго завітае сапраўднае шчасце, бо без надзеі жыць немагчыма.

Але тое, што пры дапамозе гэтых сноў яму працягвае сваю руку сам Усявышні, Сцяпан не сумняваўся. На нябёсах чакаюць ягонага чыстасардэчнага пакаяння, а пасля – хто ведае, мо і да яго прыблукае ўдача. А што? Вось возьме Збаўца ды пашле Сцяпану, як узнагароду за пакаянныя малітвы, прыгожую і добрую жанчыну, якая і народзіць яму сыночка. Тады і спраўдзіцца ягоны сон, адбудзецца сустрэча на ўсё жыццё.

Але ж маладая за яго не пойдзе, а аднагодка-пенсіянерка толькі пасміхнецца з такой прапановы. Ад такой думкі ў Сцяпана адразу ж спаў ранішні настрой.

Вось толькі дажываць аднаму да старасці было страшна. Наступяць некалі такія дзянёчкі, што на-

ват з ложка ўстаць не зможа. Што тады? І грошай цяперашнім часам на чорны дзень не наскладаеш, бо змены кожны дзень, нават дзяржаўныя банкі пачалі ашукваць сваіх укладчыкаў. А пра дом для састарэлых і думаць не хацеў. Лепш у поўнай адзіноце памерці або ў манастыры. Чамусьці апошнімі днямі такая думка ўсё часцей наведвалася да Сцяпана. Што ж, магчыма, і на гэта ёсць Божая воля.

Але пакуль трэба маліцца штодня – і з ранку, і вечарам, як калісьці рабіла ягоная бабуля.

Многа яшчэ пра што передумаў Сцяпан у той цёплы летні вечар. Спачатку хацеў пад'ехаць на ровары ў парк і пагуляць у валейбол, але другая думка настойліва прапаноўвала яму заўтра зранку выехаць у сваё Зарэчча. І сапраўды: паласавацца парэчкамі, агрэстам і смародзінамі справа добрая. А там і белы наліў на падыходзе.

І тут імгненна ўзнікла пытанне: хто ўсё-ткі дасылае кожнаму чалавеку ў галаву розныя думкі-прапановы? Вось ён толькі што хацеў падацца ў парк, але передумаў. Выходзіць – хтосьці з нябёсаў аддае загады – што рабіць, калі і куды ехаць. Цікава, што б на гэта адказаў акадэмік Вейнік?

Сцяпан падняўся з канапы, выйшаў на балкон і пачаў рыхтаваць ровар у дарогу. Восьмы год служыў яму ягоны "Турыст". Праўда, сякія-такія дэталі ён мяняў на новыя, бо толькі летась праехаў на ім тры з паловай тысячы кіламетраў. Ён не спяшаючыся праверыў спіцы ў колах, падцягнуў гайкі на педалях і крыху змазаў ланцуг. Выглядаў ровар цудоўна, быццам толькі з магазіна.

Ехаць улетку на электрычцы – адна маркота. Спякота, людзей бітком, дый часцяком даводзіцца стаяць у тамбуры амаль да Маладзечна. А на ровары, ды яшчэ са спадарожным ветрыкам, ехаць адна асалода: побач то рэчка, то лес, то сенажаць з кветкамі, ад якіх падымаецца настрой і думкі лунаюць дзесьці высока, у нябёсах. Хочацца жыць і радавацца гэтай святой прыгажосці нашай зямелькі.

Пасля, як ровар быў падрыхтаваны, успомніў пра ежу. Так то ён у дарозе не палуднаваў, але пра ссабойку не забываўся, бо ўсё можа здарыцца. Вось і на гэты раз узяў ладны акраец хлеба, пачку пячэння, сервелатнай каўбасы і тры гуркі. Заўсёды браў з сабою літровы слоік гарбаты, настоенай на шыпшыне, бо ў спякоту хацелася піць.

Ваду прывозіў з Вяснянкі, там многія мінчукі бяруць святую крынічную ваду, бо з крана піць – сябе загубіць.

Падхапіўся раніцай а пятай гадзіне, зірнуў у акно, а там лупцуе цёплы дожджык. Што ж, няхай асвяжыць дарогу і паветра, гэта яшчэ лепш, вось толькі каб хутчэй скончыўся.

Сцяпан прывык выязджаць уранку, каб не пячыся на сонейку. Бывала, а восьмай гадзіне быў у Маладзечне, а там заставалася нішто – трыццаць кіламетраў. Але сёння нябесная канцылярыя вырашыла чамусьці затрымаць Сцяпанаў выезд. Ён выпіў гарбаты з мёдам, пасля ўзяўся за салат з памідораў, а напаследак ўплёў патэльню яечні з каўбасой. Вось цяпер можна было круціць педалі да самага вечара.

Тым часам і дожджык уціхаміраўся. Аблокі няспешна рассоўваліся, і вось ужо першыя промні сонейка ласкава пачалі асушваць наваколле. Сцяпан вырашыў яшчэ крыху пачакаць, каб падсохла дарога, бо сустрэчныя машыны могуць вымачыць да ніткі.

Ён прылёг на канапу. І зноўку думкі не давалі яму спакою. Душа адчувала незразумелую трывогу.

З чаго б гэта? Мо якая машына шваркне сёння яго ў кювет? А што? Усё можа здарыцца. Вунь колькі за адзін дзень ловяць супрацоўнікі ДАІ п'яных хлопцаў за рулём "Опеляў" і "Мерседэсаў" – за сотню. А іх жа на самай справе яшчэ больш раз'язджае ў такім выглядзе, але ўсіх не праверыш.

Праўда, пакуль Усявышні яго падтрымліваў. Тут Сцяпан порстка падхапіўся з канапы, бо забыўся

памаліцца пасля сняданку. Да вялікай сваёй радасці, упершыню пераказаў і малітву Мікалаю-Цудатворцу.

Цяпер можна было адпраўляцца ў дарогу. Праверыў напаследак ключы ад хаты ў вёсцы, перахрысціўся і са словамі: “Благаславі, Божа, даехаць у сваё Зарэчча”, узяў ровар і выйшаў на вуліцу.

Дарога Сцяпану была добра знаёмая: дзесяць кіламетраў па кальцавой, а там, пачынаючы са Ждановічаў, напрамкі да Маладзечна. Пакуль навокал стаяла цішыня, Сцяпан адразу ж узяў высокі тэмп, бо калі нечакана наляціць ветрык, то гэты жартаўнік можа да таго выматаць – дзесятаму закажаш.

Сонейка між тым паднімалася ўсё вышэй, і ранішняя прахалода з неахвотаю адступала. Непрыкметна праехаў Ждановічы, Мінскае мора, з разгону ўзабраўся на невялікі пагорак, і перад ім раскінулася Ратамка. Кожны раз, калі Сцяпан яе праязджаў, то ўспамінаў сваю бабулю.

У чатырнаццатым годзе, калі пачалася вайна, была яна тут са сваёй сям’ёй у бежанцах. Маладая зусім, але мела на той час два класы царскай школы, вось і пісала на фронт мясцовым сялянам лісты. Почырк у яе быў цудоўны, кожную літару выпісвала як мае быць. Яна не раз расказвала Сцяпану, што хоць сяляне казалі, пра што напісаць свайму сыночку, але ж яна яшчэ і сама дабаўляла. Пасля перачытвала ім увесь ліст, і тыя былі вельмі задаволеныя. І тут заўсёды з гонарам распавядала, што ёй было вельмі дзівосна, калі пры выпадковай сустрэчы на вуліцы тыя спыняліся, здымалі з галавы шапку і кланяліся, бо вельмі яе паважалі.

І калі толькі мінуў Радашковічы, то адчуў ледзь прыкметны подых ветрыку, які з цягам часу пачаў узмацняцца, але на ягонае шчасце не быў сустрэчным, а нават спрабаваў дапамагаць Сцяпану хутчэй дабрацца да свайго Зарэчча.

У вёсцы суседзі здзіўляліся, што ён у такія гады прыязджае на ровары з самога Мінска. А

што здзіўляцца? Яму бабуля расказвала, што яшчэ нядаўна, ці не за палякамі, хадзілі яны пешшу хрэсным ходам з мясцовым святаром на маленне ажно ў саму Вільню. А гэта ж таксама сотня кіламетраў ад Зарэчча. Нават старэнькія бабулі адважваліся на такое падарожжа. Рабілі прыпынкі, але прайсці такую адлегласць – сапраўдны святы подзвіг.

І калі за Радашковічамі ён з цяжкасцю ўзабраўся на даволі высачэзны пагорак, то далей ровар каціў амаль сам, бо быў невялікі ўхіл ажно да Краснага. На чатыры кіламетры ўздоўж гасцінца расцягнулася гэтая вёска. Праязджаючы каля мясцовай царквы, Сцяпан перахрысціўся. А за вёскай раскінулася невялікае азярцо, дзе амаль заўсёды плавалі прыгажуны лебедзі.

Адсюль рукою падаць да Маладзечна. Было ўжо а палове дванаццатай дня, сонейка ўбіралася ў сілу, прыгравала, але пакуль піць не хацелася, і Сцяпан вырашыў імчаць без перапынку да самога горада.

Тут ехаць было зацішней, бо з абодвух бакоў да гасцінца падступаў сасновы бор. Сцяпан паволі круціў педалі, з прыемнасцю ўдыхаў смаляністае паветра, як раптам пачуў дзіцячы крык:

– Мамачка! Не забівай мяне! Я хачу жыць! Пусці!

Сцяпан азірнуўся і ўбачыў справа добра ўтаптаную сцяжынку, якая вяла ад гасцінца ў сасновы бор. Менавіта адтуль даносіўся дзіцячы крык. Ён хуценька звярнуў на яе, крыху праехаў і ўбачыў хлапчука, які з усяе моцы бег да яго. Сцяпан саскочыў з ровара, прыставіў да сасны і пабег яму насустрач. Той, заўважыўшы Сцяпана, яшчэ шпарчэй рвануў да яго. І тут убачыў крыху воддаль жанчыну ў блакітнай сукенцы, што стаяла ля маладой бярозкі.

Хлапчук набліжаўся. Толькі цяпер Сцяпан прыкмеціў, што да ягонай шыі прывязаны нейкі матуз, ён цягнуўся нават па зямлі і перашкаджаў яму бегчы. Сцяпан крыху нахіліўся і падхапіў хлапчука на рукі.

– Не плач. Што здарылася?

– Там мамка мая. Яна мяне лупцавала, а пасля хацела павесіць на бярозцы, – прамовіў хлапчук і заплакаў.

– Не бойся. Я цябе абараню, – ён апусціў хлапчука на зямлю. Пасля пачаў адвязваць з шыі вузкі шаўкавісты жаночы пояс, завязаны на пятлю-ўдаўку. Дастаў насоўку, выцер яму вочы і пагладзіў па бялюткіх ускудлачаных валасах.

– Дзядзечка! Вы толькі не аддавайце мяне маці, бо дома яна ўтопіць мяне ў рэчцы, – сказаў хлапчук і зноў заплакаў.

– Не аддам! Ты толькі не плач! – ён зноўку выцер яму слёзы.

– Яна вунь ідзе па мяне! – хлапчук схаваўся за Сцяпана.

І сапраўды, да іх набліжалася жанчына з невялікай карычневай торбай у руцэ. Калі яна яшчэ толькі падыходзіла, то Сцяпан прыкмеціў, што гэта была зусім яшчэ маладая дзяўчына з бялюткімі, як і ў сына, валасамі, якія рассыпаліся па яе плячах.

Метраў за пяць ад Сцяпана яна спынілася і, нават не павітаўшыся, выкрыкнула:

– Андрэйка! Марш дадому!

– Не пайду з табой! – адказаў хлапчук.

І толькі тут Сцяпан прыкмеціў, што яна на добрым падпітку.

– Можа, урэшце свайго татку знайшоў, га?! – яна сплюнула і засмяялася.

– Знайшоў, а з табою жыць не буду! – тут Андрэйка асмялеў і стаў побач са Сцяпанам.

– Няўжо вы сапраўды хацелі павесіць свайго сыночка? – спытаў Сцяпан.

– Ён мой! Што захачу – тое і зраблю! Указчык мне знайшоўся!

– Але што здарылася? – больш спакойным голасам спытаў ён, каб вызваць жанчыну на даверлівую размову.

– Што здарылася? – яна са злосцю ў вачах зірнула на Сцяпана. – Нам жраць няма чаго! Вазіла свайго байструка, каб здаць у дзетдом, то не

ўзялі, сабачыя морды! Адной паперыны не хапіла. А ў калгасе трэці месяц грошы не плацяць, хлеба няма за што купіць. Прыехала ў райвыканкам, а там сядзяць накрашаныя лялі, ды яшчэ пасміхаюцца, прахадзімкі, толькі і глядзяць, каб кінула на лапу! А што я магу даць?! Сама два дні не жраўшы! А яго, – яна кіўнула на Андрэйку, – можаш забіраць, калі свайго няма. Бо раз нікуды не бяруць, то ўсё адно прыдушу, дый сама павешуся. Навошта такія мукі цярпець! Давялі народ да галечы са сваім рынкам!

– Дык яго ж з лёгкасцю прымуць без аніякіх папер, – узрадаваўшыся, прамовіў Сцяпан, што ўдалося ўступіць з ёй у гутарку.

– Я ж прыводзіла – за вароты выставілі!

– Бо трэба было схітрыць: напісаць у кішэню запіску ды адправіць аднаго ў міліцыю – прыёмны дзіцячы пакой, або адразу ў дзіцячы дом. А то такі смяротны грэх хочаце на душу ўзяць – стаць забойцай свайго сыночка. Вось вырасце ён, стане капітанам карабля, а мо і лётчыкам...

– Ты мне лапшу на вушы не вешай! А кажы наўпрост – забіраеш яго ці не?

– Забіраю! – Сцяпан прытуліў Андрэйку да сябе.

– Вось і ладушкі. Мне гара з плеч. Пайду, а то яшчэ перадумаеш. А гэта вазьмі, мо спатрэбіцца, – яна шпурлянула вялікі канверт, з якога выпала некалькі аркушыкаў.

Потым павярнулася і, хістаючыся, нетаропка пайшла па лясной сцяжыне. Сцяпан стаяў з Андрэйкам да тае пары, пакуль яе постаць не знікла ў густым ельніку.

– А куды яна пайшла? – спытаў Сцяпан.

– Ды ў нашу вёску, у Загор’е. Тут трэба лесам доўга ісці, – быццам дарослы, адказаў ён. – А мне ножкі забалелі, бо есці захацелася, сказаў маці, а тая і накінулася з кулакамі... А пасля хацела прыдушыць.

Сцяпан пагладзіў Андрэйку па галоўцы і прытуліў да сябе.

– Цяпер яе не бойся. У цябе пачнецца новае жыццё.

Толькі тут ён прыкмеціў, што на хлопчыку былі залатаныя ў многіх месцах спартыўныя штонікі блакітнага колеру і жоўтая брудноватая сарочка з кароткімі рукаўцамі. Сцяпан узяў Андрэйку за руку, і яны падышлі да ровара.

– Які прыгожы велік! – усклікнуў ён. – Ніколі такога не бачыў. А куды мы паедзем?

– Да мяне, у вёску. Я за Маладзечнам жыву.

– А ў тваёй сумцы яды няма?

– Ёсць. Толькі давай крыху праедзем да ручая, памыем рукі і будзем палуднаваць, – адказаў Сцяпан.

Ён дастаў з сумкі турысцкую штармоўку, абкруціў яе вакол рамы і прывязаў шнурком.

– Вось цяпер можна ехаць! – ён разварнуў ровар, а Андрэйка сам усеўся на раме.

– Толькі мацней трымайся ручкамі і сачы, каб ножка ў спіцы не трапіла, – папярэдзіў Сцяпан.

Выехалі на гасцінец, і Сцяпан націснуў на педалі.

– Як мы хутка імчымся! – выкрыкнуў Андрэйка.

Хвілін праз дзесяць яны пад'ехалі да невялікага ручая і спыніліся. Прайшлі крыху ад гасцінца да адзінокай бярозы, што стаяла ў задуменні на самым беражку ручая.

– Вось тут у цянёчку і перакусім з табой! – з весялосцю ў голасе прамовіў Сцяпан. Ён прыставіў ровар да бярозы, і яны пачалі мыць рукі.

Пасля Сцяпан рассцяліў белую хусцінку, хуценька нарэзаў скрылёчкамі каўбасу, гуркі і хлеб. Пасля дастаў слоік з гарбатай, пячэнне і два вараныя яйкі.

Андрэйка ўплятаў за абедзве шчакі. Напэўна ж, сёння і не снедаў.

– Не спяшайся. Калі адразу многа з'ясі, то можа жывоцік забалець. Бяры яйка, паглядзім, у каго мацак.

Андрэйка ўдарыў і разбіў Сцяпанава.

– У мяне! – з радасцю ўскрыкнуў ён.

Не пакінуў Андрэйка без увагі і пячэнне – амаль усю пачку ўмалаціў. Пасля Сцяпан сабраў рэшткі ежы ў сумку, перахрысціўся і памаліўся.

– Што ты робіш? – спытаў Андрэйка.

– Падзякаваў Божаньку, што накарміў нас зямнымі пладамі.

– А дзе ён жыве?

– Там, высока, на нябёсах. Вось прыедзем у вёску, я пра Яго табе многа чаго раскажу. А цяпер паехалі, каб нас дожджык не застаў, штосьці хмаркі напаўзаюць.

У Маладзечне Сцяпан купіў Андрэйку бутэльку напітку і марожанае, якое яму вельмі спадабалася. Ён прызнаўся, што ніколі не каштаваў такой смакаты.

Прыгарадным цягнікам яны без асаблівых прыгод даехалі да Сцяпанавай станцыі. А там праехалі крыху лесам і неўзабаве за рэчкай убачылі ягонае Зарэчча. Сцяпанава хата стаяла на самым ускрайку вёскі, побач з царквой.

Толькі заехалі на падворышча, як у весніцах паказалася бабуля Агата.

– Дзень добры, Сцёпа! Я ўжо тут чаго не перадумала, бо штосьці ты загуляў у горадзе. А мне яшчэ далі дзялку сенакосу на цялушку.

– Скосім! – з весялосцю ў голасе прамовіў Сцяпан.

– А што ж гэта за хлопчык з табой?

– Пазнаёмцеся, бабуля Агата.

Яна падышла да Андрэйкі і працягнула яму руку. Той адразу ж падаў сваю і прамовіў:

– Андрэйка.

– А я бабуля Агата. А чый ты будзеш?

– Вось мой татка, – тут Андрэйка падышоў да Сцяпана і ўзяў яго за руку.

– Вось як! – здзівілася бабуля. – А што, – працягвала яна, – вельмі падобны. А дзе ж твая маці?

Андрэйка апусціў галаву і нічога не адказаў.

– Я пасля ўсё раскажу, – прамовіў Сцяпан. – А пакуль ёсць час, то мы затопім лазню і памыемся з дарогі.

– То можа перакусіце чаго? Я зараз таго-сяго прынясу...

– Гэта можна,– адказаў Сцяпан.

Бабуля пайшла, а Сцяпан з Андрэйкам зайшлі ў хату.

– Вось тут і будзем з табою жыць, – прамовіў ён. – Спаць будзеш на канапе, а я на ложку.

Толькі яны прыгатавалі пасцелі, як з'явілася бабуля Агата. Прынесла сыр, малако і смятану. Крыху падмацаваўшыся, яны выйшлі на падворышча.

– Бачыш, колькі ў агародзе парэчак. Вось табе вялікі кубак, ідзі і збірай, толькі не еш, бо іх трэба памыць у вадзіцы. А я лазню затаплю, – прамовіў Сцяпан.

Носячы ваду, ён вырашыў памыць усё Андрэйкава адзенне. Але ж у што пасля пераапрануць? Успомніў, што ў бабулі гадаваліся калісьці двое ўнукаў, то можа і засталася якая адзежына. Яна якраз завіхалася ля газавай пліты. Давялося расказаць ёй пра сустрэчу з Андрэйкам.

– І што цяпер будзеш з ім рабіць? – спытала яна.

– Пакуль пажыве ў мяне, а пасля давядзецца перадаць у дзіцячы дом.

Ён не хацеў расказваць пра свае прарочыя сны.

– Адзення ў мяне многа, знойдзем і на яго. Я асобна дзіцячае складвала, то шукаць не давядзецца.

Яны зайшлі ў залу, і бабуля пачала ўсё выкладваць з ніжняй шуфляды. Чаго тут толькі не было: штонікі розных фасонаў, сарочкі, спартыўнае трыко, майкі з малюнкамі ваўка і зайца, сандалікі і дзве бялюткія шапачкі ад сонца.

Сцяпан пачаў выбіраць, але бабуля запярэчыла:

– Бяры ўсё і прымярай! А што не падыдзе, то прынясеш, мо сам калі ажэнішся, га? – яна засмяялася.

– Што гэта вы ўдумалі? Хутка на пенсію, – з усмешкай адказаў ён.

– Да пенсіі табе яшчэ тарабаніць, як таму меднаму кацялку. Ты ж і не выглядаеш на свае гады.

– Ну, я пабег. Як памыемся, то і вы прыходзьце, добра?

– Прыйду з Войціхай. Яна даўно пытала пра лазню. А заўтра з раніцы да мяне і на бліны. Я мачанку зраблю з маладога пеўніка.

Сцяпан аднёс адзенне ў хату, а адтуль у лазню. Падкінуў дроў, а тут і Андрэйка падышоў з поўным кубкам чырвоных парэчак. – Вось, татка, колькі назбіраў.

– Малайчына! – Сцяпан іх памыў, адсыпаў у міску і падаў Андрэйку. Яны прыселі на лаўку пад хатай. Андрэйка адразу ж узяўся ўплятаць ягады.

Праз гадзіну лазня была гатова. Сцяпан не стаў яе моцна качагарыць, бо Андрэйка можа і на падлозе не вытрымаць. Узялі бялізну, венік і пайшлі мыцца. Сцяпан наліў цёплай вадзіцы ў вялізныя начоўкі, усадзіў туды Андрэйку, а сам пачаў парыцца. Пасля і Андрэйка залез на палок, і Сцяпан крыху яго пахвастаў.

Памыўшыся, яны пілі гарбату з варэннем. А неўзабаве бабуля прынесла трохлітровы слоік яблычнага соку і патэльню амлету.

Андрэйку ў новай майцы і спартыўных штанах было не пазнаць. Пасля вячэры ён ўмасціўся Сцяпану на калені, абняў ручкамі і прашаптаў:

– Як добра з табой. Давай разам жыць. Я буду дапамагаць табе. У мяне ж ніколі таткі не было. Дзеці заўсёды смяяліся, як толькі выходзіў на вуліцу, а то і лупцавалі. А хто абароніць? Маці штодня п'яная, есці не было чаго. Цяпер ты мяне абароніш, праўда?

– Абараню. У нашай вёсцы цябе дзеці крыўдзіць не будуць. Заўтра паедзем з табою на сенажаць. Скосім дзялку для бабы Агаты і будзем сена сушыць. А ты будзеш ягады збіраць. Суніцы павінны яшчэ быць, а мо і маліны прыспелі.

Пасля Сцяпан уключыў тэлевізар, бо якраз пачалася "Калыханка". Яны сядзелі на канапе,

прытуліўшыся адзін да аднаго і накрыўшыся коўдрай. Мульцік спадабаўся Андрэйку, бо быў пра ваўка, які ў каторы раз не мог злавіць кемлівага зайку. Паглядзелі яшчэ невялікі канцэрт, але Андрэйка пачаў пазяхаць, і Сцяпан выключыў тэлевізар.

Хлопчык сам распрануўся і ўлёгся на канапе. Сцяпан накрыў яго і пачаў занавешваць вокны. Пасля заслаў свой ложак, ціхенька падышоў да канапы і прысеў на табурэтку.

Андрэйка паспеў заснуць. Ён ляжаў на спіне, яго загарэлыя ручкі ляжалі паверх коўдры. Шчокі крыху пачырванелі, а тварык быў чысты і прыгожы, быццам у таго Анёла, якога Сцяпан бачыў на абразах. Колькі яму давялося перажыць за свае дзіцячыя гады – аднаму Богу вядома. А яму ж, як прыкмеціў Сцяпан, было не больш за пяць гадоў. Бедны і гаротны хлопчык! Ён адразу ж назваў яго сваім таткам. Сцяпан ведаў, што калі адна маці выхоўвае хлопчыка і нават ні ў чым не адмаўляе, то ўсё адно той сумуе па бацьку. Андрэйка, напэўна ж, жыў у самых жахлівых умовах. А сённяшні дзень ледзь не стаў для яго апошнім...

Тым часам пачало шарэць, а Сцяпан усё сядзеў ля Андрэйкі. Няўжо і сапраўды спраўдзіліся яго-ныя прарочыя сны? Гэта ж каму раскажы – ніхто не паверыць. Ён нават і сам цяпер сумняваўся, што душа, ці, як казаў яму акадэмік, розум ягонага калісьці забітага сыночка перайшоў да Андрэйкі. Але ўсё можа быць на гэтым свеце. Колькі яшчэ неразгаданых таямніц у прыродзе – не злічыць. Сцяпан сам нядаўна чытаў, што ў джунглях ракі Амазонкі ўбачылі вялізнага змея, які поўз і пакідаў пасля сябе такі след, быццам танк праехаў.

Але што рабіць з Андрэйкам далей? Вядома, што давядзецца адвесці ў міліцыю, а тыя адправяць у дзіцячы дом. Дый маці ў яго ёсць...

Ён яшчэ раз зірнуў на Андрэйку, падняўся з табурэткі, перахрысціў яго і выйшаў на падворышча. Ціха было навокал, толькі дзесьці за рэчкай грукацеў трактар. Летняя ночка апускалася на За-

рэчча. Сцяпан зірнуў на царкву, перахрысціўся, крыху пастаяў, а пасля зайшоў у хату. Накінуў у калідоры на дзверы кручок, яшчэ раз зірнуў на Андрэйку, распрануўся і з асцярогаю прылёг на свой ложак.

Але дзе ж тут было заснуць пасля такога дня! Адразу ж вырашыў пакуль Андрэйку нікуды не здаваць. Няхай пажыве ў яго, ачомаецца, лета якраз, а там будзе відаць. Калі дасць Бог Сцяпану здароўя, то паспее яшчэ і вывучыць Андрэйку. А што? Праз пятнаццаць гадоў Сцяпану будзе толькі семдзесят, а яму дваццаць. А калі пашчасціць, то і ўнука дачакаецца. І кватэру на яго сваю апіша.

Але пра гэта думаць яшчэ рана. А калі браць бліжэй, то трэба пад'ехаць у Загор'е ды распытаць пра Андрэйкаву маці. Не ўзялі хлопчыка ў дзіцячы дом, то яна раззлавалася, выпіла, хацела нават у роспачы пайсці на злачынства, а цяпер мо дзесьці адумалася і плача па сваім сыночку. І дзе шукаць, не ведае, бо не спытала Сцяпанаў адрас.

Але ж трэба і дзялку скасіць для бабулі Агаты. Ён дапамагаў ёй даўно, калі яшчэ вучыўся ў інстытуце. А цяпер яна прыглядала за ягонай хатай і ўсімі пабудовамі, бо ўсё прадаваць Сцяпан не думаў – шкада было свайго роднага куточка, дзе нарадзіўся, вырас, хадзіў у школу.

Вырашыў так: скасіць дзялку, высушыць сена, а пасля пад'ехаць на ровары ў Загор'е.

## Частка пятая

Разбудзіў Спяпана ўранку гарлапаністы певень бабулі Агаты, пра якога ведалі ўсе вяскоўцы, бо не любіў ён падвыпіўшых жанчын. Адразу ж кідаўся на такую і што ёсць моцы дзяўбаў за лыткі. І як распазнаваў, што тыя нападпітку, нават калгасны ветэрынар не мог растлумачыць. А вось мясцовых выпівох-мужчын певень чамусьці не чапаў. Усе ў вёсцы пра гэта ведалі і пры сустрэчы прасілі бабулю Агату не пускаць пад нож такога разборлівага прыгажуна.

А стаў певень такім ад таго, што аднойчы старая Кліманіха, якая любіла зазірнуць у чарку, памачыла хлеба ў гарэлку ды пачаставала Агацінага разбойніка. Той надзюбаўся і акасеў. Спрабаваў, хістаючыся, дайсці да свайго падворышча, але забурыўся ў крапіву ля плота, толькі моцна крылламі лопаў. Дзеці расказалі пра гэта бабулі Агаце, і тая ўратавала свайго забіяку.

Сцяпан падняўся з ложка і падышоў да акна. Певень стаяў на іхнім падворку ля студні і раз-пораз кукарэкаў, быццам быў незадаволены, што ніхто не выходзіць з хаты.

Сцяпан адвесіў шторы на вокнах і праз фортку пагрозліва патрос пеўню кулаком. Але той зрабіў некалькі крокаў ды так звонка заспяваў, што нават Андрэйка павярнуўся на канапе, расплюшчыў вочкі і, пазіраючы на Сцяпана, прамовіў:

– Што там робіш?

– Пеўня праганяю, – адказаў Сцяпан і, падышоўшы да канапы, хуценька залез пад коўдру.

– Паляжым, яшчэ рана, і бліны ў бабулі не гатовыя.

– А што певень хацеў?

– Цябе разбудзіць. Чуў, як ён выводзіў: “Ку-ка-рэ-ку! Андрэйка, уставай, пойдзем на раку!”

– Адкуль ён пра мяне ведае?

– Бабуля Агата пра цябе расказала. У яе певень забіяка, б’ецца. Але я дам табе ячменю, ты пасыплеш яму з куркамі, то ён будзе з табой дружыць.

З якую хвіліну яны ляжалі моўчкі, а пасля Сцяпан спытаў:

– Андрэйка, а колькі табе годзікаў?

– Пяць вясною было.

– Так... Гэта добра. А ці ведаеш ты сваё прозвішча?

– А то як жа! Я ж раней крыху хадзіў у садзік. А прозвішча маё Вайца.

Тут ён уважліва зірнуў Сцяпану ў вочы і ціха дадаў:

– Ты толькі мяне да мамы Галі не адпраўляй, бо я яе баюся. Дый есці ў яе няма чаго...

– Нікому цябе не аддам! – Сцяпан прытуліў яго да сябе.

– А што мы будзем сёння рабіць?

– Паснедаем, а пасля на сенажаць. Я буду касіць, а ты ягады збіраць.

Пасля Сцяпан падняўся, бо трэба было пакляпаць касу. Андрэйка выпіў яблычнага соку і зноўку заснуў.

Паснедаўшы, яны паехалі на ровары ў Руччо. Дзялку знайшлі хутка. Андрэйка дапамог Сцяпану абазначыць яе межы, бо аднаму з гэтым было б не ўправіцца.

Пасля адвёў Андрэйку на ўскраіну сасонніка, дзе было калісьці многа малінаў. І толькі падышлі, як Андрэйка закрычаў:

– Татка! Зірні сюды! Колькі тут ягадаў! Ды ўсе чырвоныя!

Добра, што яны здагадаліся ўзяць з сабою маленькі кошык. Добрую палову гадзіны яны ласаваліся сакавітымі малінамі. Пасля Сцяпан адправіўся касіць, а Андрэйка застаўся ў малінніку.

І хаця сонейка даўно злізала кроплі расы, касілася на ўздзіў вельмі лёгка. Трава была пругкая, ледзь не да каленяў. Было тут добрых пятнаццаць сотак, а мо і больш. Але Сцяпана гэта не палохала. Калі сёння добра пастарацца, то заўтра з расой ён павінен дзялку скончыць.

Ён праходзіў пракос за пракосам, а сам усё пазіраў у бок малінніку, дзе мільгала белая Андрэйкава шапачка. Сонейка паднімалася ўсё вышэй і так пачало прыпякаць, што Сцяпан вырашыў зрабіць перадышку і адправіўся да Андрэйкі. Калі ж зірнуў у ягоны кошык, то вельмі здзівіўся, бо ён быў амаль напалову запоўнены спелымі малінамі.

– Малайчына! – пахваліў ён хлопчыка. – Зараз табе дапамагу, і да вечара будзе поўны кошык.

Пасля яны памыліся ў ручаі і селі палуднаваць. Уладкаваліся ў цяньку маладых бярозак, што раслі тут уперамежку з соснамі і асінкамі. Бабуля Агата столькі ўсяго нагатавала, што хапіла б на два дні. Тут былі і свежыя гуркі з градкі, і хатняя каўбаса, бруснічнае варэнне, смятана і булкі з макам.

Вельмі ўразіла Сцяпана, як Андрэйка еў, стараючыся, каб ніводная крошка не ўпала на зямлю. Вось бедачок.

Пасля Сцяпан разаслаў на зямлі посцілку, і яны прылеглі адпачыць. Ціха шапацелі над імі маладыя бярозкі. Раптам зусім нізка праляцеў бусел. Андрэйка адразу ж падхапіўся на ногі і сказаў:

– Які прыгожы і вялікі!

– Прыляцеў нас адведаць, – прамовіў Сцяпан. Андрэйка зноўку ўлёгся з ім побач і спытаў:

– А хто са звяроў жыве ў лесе?

– Вожык, зайцы, лісіцы, а за Вяллёй і ваўкі ёсць, – адказаў Сцяпан.

Ён глядзеў у бязмежную сінечу неба, і ў яго было такое прадчуванне, што Андрэйка і сапраўды ягоны сынок, а яму не больш за трыццаць гадоў. І прыедуць яны вечарам з пакосу, а іх сустрэне маладая Сцяпанава жонка, штосьці ў іх спытае і пахваліць за маліны. Але пра такое можна было толькі марыць.

Цяпер адзіная думка суцяшала Сцяпана: што ён ніколі не пакіне Андрэйку, нават калі і давядзецца на які час здаць яго ў дзіцячы дом. Ён быў упэўнены, што яму паслаў яго сам Усявышні. Бо як растлумачыць, што ў іх такая ўзаемная цяга адно да другога. І таткам Сцяпана адразу ж назваў. Штосьці адзінае пульсуе ў іхніх сэрцах.

Сцяпан зірнуў на Андрэйку. Хлопчык соладка спаў, падклаўшы ручкі пад правую шчаку. Ён і сам вырашыў крыху здрамнуць, бо баяўся пакідаць яго тут аднаго.

Прачнуліся яны дзесьці гадзіны праз дзве. Пачало ўжо вечарэць.

– Ну і храпанулі мы з табой, – сказаў Сцяпан.

Яны хуценька падняліся. Андрэйка выпіў яблычнага соку, узяў цэлафанавы пакет і зноўку адправіўся па маліны. Сцяпан вырашыў крыху пакасіць, каб заўтра менш валэндацца.

Вярнуліся дадому, калі браліся добрыя прыцемкі. Бабуля Агата вельмі здзівілася, калі ўбачыла, колькі малінаў назбіраў Андрэйка.

Раніцай наступнага дня, калі Андрэйка яшчэ спаў, Сцяпан дакончыў дзялку. Дні стаялі сонечныя, і яны высушылі сена за тры дні і прывезлі ў падпаветку.

А ў нядзелю схадзіў з Андрэйкам у царкву. Людзей было мала. Купілі па свечцы і паставілі перад іконай Ісуса Хрыста і Божай Маці. Андрэйка з цікаўнасцю пазіраў на лікі святых і нават некалькі разоў перахрысціўся. Праз якую гадзіну Сцяпан хацеў пакінуць царкву, бо падумаў, што Андрэйка не вытрымае столькі стаяць. Але, на яго здзіўленне, той адмовіўся выйсці на вуліцу.

Пасля малення яны пераапрануліся, паабедалі і паехалі на ровары на возера. Узялі на ўсялякі выпадак і вудачку. Выбралі зацішнае месца, распрануліся і пачалі загараць. Пасля Сцяпан крыху паплаваў, а Андрэйка цікаваў за чародамі маленькіх рыбак, якія падплывалі пагрэцца на сонейку амаль да самага берага. Нагуляўшыся, ён прысеў побач са Сцяпанам і пачаў есці пячэнне.

І тут да іх прыляцеў прыгожы матылёк. Ён апусціўся зусім блізка і пачаў ласавацца крошкамі ад пячэння.

– Як бы гэта яго злавіць? – спытаў Андрэйка. – Я хачу паглядзець, якія ў яго крылцы.

– Не трэба! – запярэчыў Сцяпан. – Ты іх пашкодзіш, і ён загіне. Папрасі матылька, каб ён іх распусціў.

– Як гэта? – здзівіўся хлопчык.

– Ты не думай, матылёк чуе нашу размову і ўсё разумее.

І толькі Андрэйка хацеў штосьці сказаць, як матылёк і сапраўды распусціў свае крылцы. Яны былі чырвонага колеру з чорнымі ўкрапінкамі.

– Вось бачыш! – ускрыкнуў Сцяпан.

Андрэйка быў у захапленні ад матылька. А той яшчэ крыху пасядзеў, а пасля ўзняўся ў паветра і закружыў над возерам.

– Шкада, што ён так хутка паляцеў.

– Ён яшчэ вернецца, – супакоіў яго Сцяпан. – Толькі раскажа сваім сябрам, дзе можна смачна паласавацца.

І сапраўды, дзесьці праз некалькі хвілін матылёк апусціўся на ранейшае месца.

– Вось, ён ведае, што маленькі хлопчык яго не пакрыўдзіць і зноўку прыляцеў да цябе, – Сцяпан пагладзіў Андрэйку па галоўцы. – Кожны хоча жыць на гэтым свеце.

А калі яны выязджалі на лясную паляну, то матылёк вельмі доўга кружыў над імі.

– Што ён хоча? – спытаў Андрэйка.

– Развітваецца з намі і запрашае, каб мы яшчэ прыязджалі да яго ў госці.

– Мы прыедзем! Бывай, матылёк! – гучна выкрыкнуў Андрэйка.

І толькі Сцяпан хацеў сесці на ровар, як Андрэйка спалоханым голасам ледзь чутна прамовіў:

– Татка! Паглядзі, хто стаіць ля бярозкі пры дарозе...

– Дзе? Я нікога не бачу, – адказаў Сцяпан, пільна ўглядаючыся.

– Вось перад намі бярозка, а побач стаіць цётка. Яна падобная на ікону ў царкве...

– А што яна робіць? – шэптам спытаў Сцяпан.

– Нічога. А вось цяпер перахрысціла нас і ... знікла.

З якую хвіліну яны стаялі моўчкі, пасля Андрэйка злез з ровара, падбег да бярозкі і прамовіў:

– Вось тут Яна стаяла...

– А чаму я не бачыў? – спытаў Сцяпан. – Мо табе падалося?

– Ды не! – запярэчыў Андрэйка. – Я добра яе разгледзеў, пазірала на нас, а сама захінутая з галавы да пят карычневай посцілкай.

– Гэта сама Божая Маці з'явілася табе, а мне, грэшніку, не дадзена ўбачыць Яе...

– А чаму ты грэшнік?

– Бо не маліўся ў маладыя гады... Вось калі ты крыху падрасцеш, то ўсё табе раскажу. А цяпер паедзем, бо спознімся на вячэру.

Ноччу Сцяпана мучыла адзінае пытанне: для чаго Андрэйку з'явілася сама Божая Маці? Магчыма, што гэта папярэджанне з нябёсаў яму, Сцяпану, што Андрэйка сапраўды ягоны сынок...

Знак-папярэджанне, а што ж яшчэ? Ягоны Андрэйка – быццам той Анёл, ён нават з царквы не хацеў раней выходзіць, а чакаў, калі скончыцца служба. Яму да Андрэйкі далёка, як да тых нябёсаў...

Непрыкметна праляцеў тыдзень, як Андрэйка жыў у Сцяпана. Спраў у вёсцы хапала, гэта не ў горадзе, дзе можна днямі прападаць у парку. Сцяпану вельмі хацелася пад'ехаць у Загор'е, каб пагутарыць з Андрэйкавай маці.

Урэшце выбраў зручны дзень і пачаў збірацца ў дарогу. Андрэйка застаўся з бабуляй Агатай. Яму Сцяпан сказаў, што паедзе ў Маладзечна па пакупкі.

Андрэйка праводзіў яго да царквы.

– Слухай бабулю і не сумуй, дамовіліся? – ён пацiснуў яго маленькую далоньку.

– Дамовіліся, – ціха адказаў хлопчык. – Ты толькі хутчэй прыязджай.

Сцяпан ускочыў у сядло і адразу ж націснуў на педалі. Але праз якую хвіліну не вытрымаў, азірнуўся. Андрэйка ўсё стаяў ля дарогі і махаў яму ручкай.

Сцяпану зрабілася да таго шкада яго, што ён ледзь не заплакаў. Здавалася б, чужое дзіцё, да якога іншыя людзі, пасля ўсынаўлення, прывыкаюць гадамі. А тут такое душэўнае прыцягненне, што сам Сцяпан не мог зразумець – адкуль яно ў яго?

Ледзь прыкметны бакавы ветрык не вельмі яму і дакучаў, галоўнае – каб дожджык не пераняў. Але пакуль надвор'е было цудоўнае, ровар каціў лёгка. І праз гадзіну Сцяпан быў ужо ў горадзе.

Цяпер яго бянтэжыла адзіная думка – што ён скажа пры сустрэчы Андрэйкавай маці? Дый ці будзе яна з ім размаўляць? Але ж без яе нельга здаваць Андрэйку нават у міліцыю, бо там яшчэ скажуць, што скраў чужое дзіцё. А такая маці можа нават і ў суд на яго падаць. І не дакажаш пасля, што ён уратаваў хлопчыка ад пагібелі.

Дый да слоў Андрэйкі, калі ён пачне расказваць пра свае пакуты, не вельмі прыслухаюцца. Яшчэ скажуць – падвучыў малога.

Урэшце ён выбраўся за горад і прыбавіў хуткасці – стрэлка на спідометры паказвала пад сорак кіламетраў у гадзіну. Сцяпан уважліва ўглядаўся ў шыльды з надпісамі вёсак, каб не праехаць Загор'е. Неўзабаве з левага боку гасцінца паказаўся сасновы бор. Тут ён паехаў больш павольна і праз хвілін дзесяць, якраз за паваротам, убачыў жаданы ўказальнік.

Ажно сэрца скаланулася, калі звярнуў на знаёмую сцяжыну і пад'ехаў да той бярозкі...

Сцяжынка вывела Сцяпана на даволі добрую гравійку, па якой сноўдалі легкавушкі. Ён яшчэ крыху праехаў, сасновы бор нечакана расступіўся, і паказаліся першыя хаты Загор'я.

І толькі ўехаў у вёску, як сустрэў жанчыну сярэдніх гадоў, даволі прывабную, якая пераходзіла вуліцу з поўным вядром вады.

Добры знак, падумалася яму, і адразу ж вырашыў распытаць у яе пра Андрэйкаву маці.

– Прабачце, але ці падкажаце, дзе жыве Вайца Галіна? Жанчына спынілася, паставіла вядро на зямлю і спытала:

– А хто вы ёй будзеце?

Ён адразу ж разгубіўся, бо не ведаў, што адказаць.

– Бабулька адна прасіла даведацца, як яна тут жыве? Я праездам з Маладзечна, то згадзіўся заехаць... – адказаў ён першае, што прыйшло ў галаву.

– Скончылася яе жыццё, – прамовіла жанчына і ўздыхнула.

– А што здарылася?

– Тры дні таму як пахавалі...

– Хварэла на што?

– Ды не. Напілася аднойчы, а ноччу ўспыхнула яе хаціна, быццам тая свечка. Магчыма, і ад цыгарэты. Яна ж курыла...

– А муж, дзеці...

– Які там муж?! Родзічаў у яе ні душы, бо ў інтэрнаце вырасла. Да нас прыехала з гадавалым

хлопчыкам, узялі даяркай на ферму. Спачатку добра працавала, а пасля распілася. На працу тыднямі не выходзіла. І вось тут прыехала на днях з Маладзечна і заявіла, што ўрэшце здала свайго Андрэйку ў дзіцячы дом. Выпіла яшчэ з тае радасці, а ноччу і аддала Богу душу...

– Вось дык гора... – Сцяпан спачувальна ўздыхнуў.

– Тут рознае пра яе кажуць, – працягвала жанчына. – А мне яе шкада. Сіратою вырасла, ды Бог долі не даў. І дзе цяпер яе Андрэйка? Я часта яго карміла. Харошы хлопчык, дай Бог яму здароўя.

Пасля такіх слоў Сцяпану стала шкада гэтай жанчыны. Ён хацеў ёй усё расказаць, але ў апошні момант стрымаўся.

– Што ж, паеду, – ціха прамовіў ён. – Прабачце, што затрымаў вас.

– Нічога, – жанчына ўзяла вядро ў руку. – Шчаслівай вам дарогі!

Паволі Сцяпан ехаў дадому, бо ўсё думаў пра Андрэйкаву маці. Ён па-сапраўднаму яе шкадаваў. Бо наша гаротнае жыццё давяло гэтую маладую жанчыну да краю бездані...

Колькі гадоў усе марылі пра светлае будучае, а цяпер надумалі адным махам скокнуць у капіталістычны рай. Ды не ўсё так проста. Але ж і ёй самой, як бы цяжка ні жылося, трэба было не губляць чалавечай годнасці, не паддавацца спакусам д'ябла.

Сцяпан не сумняваўся, што за намер загубіць свайго сыночка Усявышні пакараў саму маці... Магчыма, гэта суровы прысуд, але ж не яму, грэшніку, разважаць наконт гэтага.

Урэшце прыехаў у Маладзечна. Купіў два боханы хлеба, мятных цукерак, пячэння і мячык для Андрэйкі. Пасля ўзяў яшчэ дзве пліткі шакаладу і "Кіндэр-сюрпрыз". Вельмі хацелася парадаваць Андрэйку, тым больш, што вёз для яго трагічную навіну.

Напэўна ж і ён, калі даведаецца пра смерць сваёй маці, будзе таксама яе шкадаваць, бо хлопчык дарослы, усё разумее.

Прыехаў дзесьці а пятай гадзіне вечара. Яшчэ як толькі спускаўся з пагорка да маста, то ўбачыў, як ад царквы шпарка бег да яго Андрэйка. Сцяпан спыніўся і ўсадзіў яго на раму.

– Ну, як ты, не сumaваў? Слухаў бабулю? – спытаў ён.

– Бабулю слухаў, дапамагаў ёй буракі палоць. Але чаму ты так доўга быў у горадзе?

– Дарога няблізкая, дый па крамах давялося пахадзіць.

Толькі ўехалі на падворышча, як з агарода прыйшла бабуля Агата.

– Сцёпа! Ну і задурыў мне твой Андрэйка галаву! І паўгадзіны не міне, а ён усё пытае: "Калі ўжо мой татка прыедзе!" А пасля абеду гадзіны дзве сядзеў ля царквы і пазіраў на дарогу.

– Нічога! – Сцяпан узяў Андрэйку на рукі і прыхінуў да сябе. – Больш развітвацца не будзем.

Пасля Сцяпан апусціў яго на зямлю, памыўся, і яны зайшлі ў хату. Ён выпіў з Андрэйкам гарбаты з дарогі і пачаў распакоўваць сваю сумку. "Кіндэр-сюрпрыз" прывёў хлопчыка ў захапленне, спадабаўся яму і мячык.

Палову цукерак Андрэйка занёс бабулі, а калі вярнуўся, то Сцяпан пасадзіў яго на калені і ціха прамовіў:

– Я хачу табе штосьці сказаць... – ён уздыхнуў і моўчкі пазіраў на Андрэйку.

Той таксама не зводзіў позірку са Сцяпана, а пасля спытаў:

– Ты быў у нашым Загор'і?

– Так, бо хацеў убачыць тваю маці...

Тут хлопчык спахмурнеў, апусціў галаву, а пасля ціха спытаў:

– І што яна сказала?

– Яе няма... Ноччу згарэла ваша хата, і яна не паспела выскачыць, – адказаў Сцяпан і сцяўся ўвесь, бо не ведаў, як павядзе сябе Андрэйка пасля такой жудаснай навіны.

Але ён не закрычаў, нават не заплакаў, толькі доўга прыціхлы сядзеў, а пасля ледзь чутна прамовіў:

– Мне шкада мамкі. Хаця і лупцавала мяне, але... Гэта Божанька яе пакараў, праўда?

Сцяпан пагладзіў яго па галоўцы. Яны сцішыліся і даволі доўга сядзелі моўчкі і пазіралі ў акно.

– Цяпер акрамя цябе ў мяне нікога няма, – урэшце прамовіў Андрэйка. – Ты мой татка і не пакінеш мяне?

– Не пакіну. Вось хутка паедзем у Мінск. Я там працу буду шукаць, а ты ў садзік хадзіць. А пакуль пойдзем і накосім травы для бабулінай кароўкі.

Андрэйка за дзень так стаміўся, што не захацеў нават паглядзець вечарам казку па тэлевізары. Сцяпан улажыў яго на канапе, і той адразу ж заснуў. Ён крыху пасядзеў ля яго, а пасля адправіўся да бабулі Агаты, бо тая абяцала халоднага квасу. Толькі зайшоў у хату, як тая сустрэла пытаннем:

– Штосьці доўга ты прападаў у горадзе. Мо гасцяваў у якой маладухі? – яна ўсміхнулася і наліла яму кубак квасу. – Пакаштуй, мне здаецца – у самы раз.

Сцяпан узяў кубак і, смакуючы, выпіў.

– Лепш не трэба! – адказаў ён. – Ажно дух займае і дзярэ ў горле. Вось бы мне калі навучыцца такі рабіць. Трэба запісаць рэцэпт.

– Ён прасцецкі: трэба ажаніцца, пакуль пры сіле, вось і будзе частаваць жонка яшчэ лепшым...

– Цяпер ужо запозна, – адказаў Сцяпан і ўздыхнуў. – А быў я ў Загор'і, хацеў пабачыць Андрэйкаву маці, але не паспеў...

І ён расказаў, як тая загінула.

– Бедны хлопчык, – бабуля ўздыхнула і расправіла фартух на каленях. – Круглаю сіратою застаўся. Але я думаю, што Бог не здарма табе яго паслаў. Тут штосьці такое ёсць. І таткам называе, і так цягнецца да цябе, што я проста дзіву даюся.

– Бо рос без бацькі паўгалодны, а маці толькі крыўдзіла, – адказаў Сцяпан.

– Яно так... Але я прыкмеціла, што ён нават падобны на цябе.

– Такога не можа быць! – запярэчыў Сцяпан.

– А ты зірні на свае дзіцячыя карткі ў альбоме і параўнай з Андрэйкам! Я то цябе ведаю з малечых гадоў. Памятаю нават, як ты басанож бегаў у адных штоніках са шлейкамі, ды яшчэ ў кожнай лужыне любіў плюхацца.

Пасля Сцяпан узяў слоік квасу і падаўся ў сваю хаціну. Баяўся, што Андрэйка можа прачнуцца ды будзе плакаць у адзіноце і цемры.

Але той соладка спаў і нават чагосьці ўсміхаўся ў сне. Сцяпан яго перахрысціў і адправіўся да свайго ложка. Крыху пачытаў, а пасля дастаў з тумбачкі фотаальбом і пачаў разглядваць свае дзіцячыя фотакарткі. Іх засталося не так і многа. На адной з іх ён стаяў басанож, узяўшыся за брыль сваёй шапачкі. Хтосьці яго толькі што пакрыўдзіў, бо было бачна – ён плакаў. Было яму тут годзікі тры, а мо і больш.

І калі ён прыгледзеўся, то і сапраўды – было падабенства з Андрэйкам. Але ў такім узросце гэта і не дзіва.

Урэшце ён паклаў альбом і патушыў святло. Трэба было вырашаць, што рабіць далей. Як ні круціў, а выходзіла, што трэба ехаць у Мінск, перадаць Андрэйку часова ў дзіцячы дом, а самому шукаць працу. Развітвацца з ім назаўсёды – пра такое ён нават і не думаў. Вось толькі ўсынавіць яго будзе не проста.

Але чамусьці ў глыбіні душы ён адчуваў, што ягоныя жыццёвыя цяжкасці часовыя, і ўсё будзе

добра. Для чаго ж тады Усявышні ўручыў яму Андрэйку? Не для таго, каб зноўку забраць. І ён вырашыў неадкладна ехаць у Мінск.

Раніцай яны хутка паснедалі і падаліся на станцыю. Прыгарадным дабраліся да Маладзечна, а там электрычкаю і да Мінска.

Сцяпанава аднапакаёўка спадабалася Андрэйку. Ён адразу ж захацеў памыцца ў ванне.

Пасля вячэры яны ўладкаваліся на канапе, і Сцяпан паказваў яму дзіцячыя кніжкі пра жыццё Ісуса Хрыста. Спачатку разглядвалі малюнкі, а пасля ён пачаў чытаць пра Збаўцу. Андрэйка слухаў уважліва.

У той вечар Сцяпан не думаў заводзіць з ім гутарку пра яго далейшы лёс.

Але калі Андрэйка быў пад коўдрай, то нечакана спытаў:

– А што мы будзем рабіць заўтра?

– Паедзем з табой у горад. Тут вось якая справа... Мне трэба шукаць працу, а ты пакуль пажывеш у дзіцячым доме, добра? Бо каб ты назаўсёды жыў са мной, трэба сабраць многа розных даведак.

– А ты будзеш да мяне прыходзіць?

– Абавязкова. А на выхадныя і забіраць буду да сябе. Ты ж хадзіў крыху ў садзік, так? Ну, вось... А дзіцячы дом – гэта той жа садзік, толькі хлопчыкі і дзяўчаткі там начуюць.

– А чаму іх тата з мамай не забіраюць?

– Бо іх няма. У каго маці памерла, у каго татка ў турме... Яны сіроты. Заўтра паедзем да адной цёткі, і яна нам усё раскажа. І памятай: у цябе ёсць татка, які цябе ніколі не пакіне. А цяпер давай спаць. Заўтра ў нас многа спраў.

## Частка шостая

Ноччу Сцяпану прыснілася, што яны з Андрэйкам сеткай-таптухай лавілі ў рэчцы рыбу. І кожны раз, як толькі ён вымаў сетку з вады, у ёй пялёхаліся, пабліскваючы срэбнымі бакамі, шчупакі і плоткі. Гэта быў файны і шматабяцальны сон.

Паснедаўшы, яны паехалі ў райвыканкам. Сцяпан ведаў, дзе знаходзіцца гэтая ўстанова, але бываць там не даводзілася.

І як толькі туды ўвайшлі, то амаль ля кожных дзвярэй убачылі многа наведвальнікаў. Гэта крыху занепакоіла Сцяпана, бо не любіў ён пакутаваць у чэргах. Але калі спытаў, ягоны сполах імгненна знік, бо тут стаялі наконт пенсій. А яму параілі падняцца на чацвёрты паверх. Аказваецца, што ўсынаўленнем і адпраўкай у дзіцячы дом займаецца інспектар школ Ксенія Васільеўна Антонава. Ім пашанцавала, бо трапілі якраз у прыёмны дзень.

Ля дзвярэй кабінета чаргі не было, сядзела толькі адна маладая жанчына, якая раз-пораз паглядвала на гадзіннік. Сцяпан з Андрэйкам прыселі на крэслы і пачалі чакаць. Тут з кабінета выйшаў паўнаваты мужчына, і туды адразу ж зайшла жанчына.

– Зробім так, – амаль шэптам прамовіў Сцяпан, злёгку прытуліўшы да сябе Андрэйку, – я спачатку зайду адзін, а ты мяне пачакай. Калі што, то цябе пазаву.

Жанчына доўга не выходзіла, але Сцяпана гэта не хвалявала. Ён абдумваў у галаве ўсе пытанні, каб чаго не прапусціць ды зноў сюды не вяртацца.

Урэшце і жанчына выйшла. Сцяпан крыху пачакаў, а пасля пастукаў у дзверы і зайшоў у кабінет.

За сталом сядзела маладая жанчына ў прыгожай каляровай сукенцы і штосьці пісала. Пасля паклала ручку, усміхнулася і прамовіла:

– Сядайце. Расказвайце, што ў вас здарылася?

І ён расказаў пра Андрэйку. Калі скончыў, то жанчына ўздыхнула і сказала:

– На вялікі жаль, такіх выпадкаў многа. Нават толькі народжаных немаўлятак маці кідаюць у пад'ездах, на сметніках... Але чаму між вамі

ўзнікла такое прыцягненне? Бо калі разабрацца – гэта чужы для вас хлопчык. Я разумею: вам стала шкада сірату, вы яго ўратавалі, але ўсё-такі...

– Яно так, – адказаў Сцяпан, – і каб вы канчаткова мяне зразумелі, то раскажу яшчэ адну гісторыю.

І пачаў распавядаць Ксеніі Васільеўне пра свой былы цяжкі грэх, прарочы сон і перасяленне душ, успомніўшы тут і акадэміка Вейніка.

– Няўжо такое магчыма?! – са здзіўленнем спытала яна, калі Сцяпан змоўк.

– Хто ж яго ведае, – сцішаным голасам адказаў ён. – У прыродзе многа таямніц.

– Цяпер наконт усынаўлення, – тут Ксенія Васільеўна на хвіліну змоўкла, знайшла ў папцы патрэбную паперчыну і працягвала: – Справа гэта доўгая і марудная. Бо спачатку трэба Андрэйку перадаць у дзетдом, а пасля збіраць даведкі на ўсынаўленне. Але ёсць іншы варыянт – вы можаце стаць ягоным апекуном.

– Як гэта?

– Хлопчык застанецца жыць у вас, а вы збіраеце даведкі на апякунства. Гэта нават выгадней, бо дзяржава будзе даплачваць на ўтрыманне дзіцяці.

– Няўжо такое магчыма?!

– Так. У калідоры на сцяне перапішыце назвы даведак, а пасля прыходзьце сюды. А дзе цяпер Андрэйка?

– Сядзіць у калідоры.

– Або... Давайце яго сюды!

Сцяпан падняўся і паклікаў Андрэйку. Той увайшоў са сполахам у вачах і ціха прамовіў:

– Дзень добры!

– Дзень добры, Андрэйка! – з вясёласцю ў голасе адказала Ксенія Васільеўна. – Адразу магу цябе ўзрадаваць: будзеш жыць са сваім таткам і ў дзетдом не паедзеш!

– Гэта праўда?! – ускрыкнуў ён і абняў сваімі малымі ручкамі Сцяпана.

– Праўда! Дарагі мой сынок! – адказаў Сцяпан і нават не прыкмеціў, як на вачах з'явіліся слёзы.

Пасля хуценька выцер насоўкаю слёзы і, кінуўшы вінавата-сарамлівы позірк на Ксенію Васільеўну, ціха дадаў:

– Прабачце, але вось не стрымаўся...

– Нічога, – адказала яна. – Такія слёзы мяне суцяшаюць і радуюць.

Сцяпан падняўся і ўзяў Андрэйку за руку.

– Скажыце, а ці возьмуць яго ў дзіцячы садзік?

– Абавязкова возьмуць, вы толькі з даведкамі не марудзьце. А калі што, то вось вам мой тэлефон, – яна напісала на паперцы нумар і перадала Сцяпану.

– Вялікі вам дзякуй! – сказаў Сцяпан. – Сёння ў нас з Андрэйкам самы шчаслівы дзень.

Яны развіталіся і выйшлі з кабінета. Сцяпан перапісаў даведкі на апякунства, і яны выбраліся на вуліцу.

– Вось бачыш, як усё цудоўна атрымалася! – пасля нечакана падхапіў Андрэйку пад пахі і закружыў вакол сябе.

Апусціў на зямлю і дадаў:

– Будзем жыць разам!

А познім вечарам, калі Андрэйка моцна заснуў, Сцяпан зайшоў на кухню, дастаў з пакета даведкі, якія кінула яму пад ногі ягоная маці, і пачаў разглядваць. З іх на апякунства спатрэбілася толькі пасведчанне аб нараджэнні Андрэйкі, а яшчэ не хапала васьмі даведак.

А з панядзелка ў іх пачаліся прыемныя клопаты. Купілі Андрэйку ў садзік новы карычневы касцюм, сандалікі, спартыўныя штаны і нават джынсы з красоўкамі.

Такіх абновак ён за ўсё жыццё не бачыў. Бедны хлопчык кожны вечар заглядваў у шафу і не мог паверыць, што ўсё гэта для яго. Адначасова Сцяпан збіраў у Мінску неабходныя даведкі. Асаблівa

хваляваўся, калі Андрэйка праходзіў камісію ў паліклініцы. За тры дні пабывалі ва ўсіх урачоў. Андрэйка прайшоў усё на выдатна.

Вельмі ўражвала Сцяпана, што Андрэйка быў не па гадах разумны і кемлівы. Калі аднойчы Сцяпан завіхаўся ля газавай пліты, то Андрэйка доўга пазіраў, а пасля сказаў:

– Каб у нас была мамка, то ўсяго б напякла, праўда?

Сцяпан зірнуў на яго, усміхнуўся і адказаў:

– Давай будзем шукаць другую маму, бо без яе мне не дазволяць цябе ўсынавіць.

– А дзе яе шукаць? – з сур'ёзным выразам на твары спытаў Андрэйка.

– Усюды. На вуліцы, у краме, у парку. Галоўнае – каб яна была добрая, прыгожая і табе падабалася.

– Дзе ж такую знойдзеш, – зусім па-даросламу адказаў Андрэйка. Тут Сцяпан не вытрымаў і нават рассмяяўся.

Дзесьці так дзён праз дзесяць сабраў Сцяпан усе даведкі. Праўда, для гэтага давялося яшчэ раз пад'ехаць у Загор'е. Нават не думаў, што за дзень управіцца, але, мабыць, сам Усявышні дапамагаў яму ў гэтай пачэснай справе. Цяпер трэба было чакаць рашэння райвыканкама.

Сцяпан купіў Андрэйку некалькі дзіцячых кніжак, разразную азбуку і каляровыя алоўкі. Той адразу ж узяўся маляваць. Акрамя таго яны кожны вечар займаліся вывучэннем літар у азбуцы.

І вось аднойчы яны паехалі ў парк Чэлюскінцаў. Сцяпан вырашыў пагуляць у валейбол, а Андрэйку загадаў, каб далёка не адыходзіў, бо парк вялікі, можна і заблукаць.

Час ад часу ён азіраўся на яго, але пасля так загуляўся, што і не прыкмеціў, як той знік з вачэй. І калі ягоная каманда прайграла, то кінуўся на пошукі. Зазірнуў на тэнісныя корты, але там

яго не знайшоў. Пасля выбег да палянкі, дзе была невялікая сцэнічная пляцоўка пад адкрытым небам і лаўкі для гледачоў.

І вось тут ён убачыў Андрэйку, які размаўляў з маладой незнаёмай жанчынай, і калі падышоў да іх, то Андрэйка сказаў:

– Вось мой татка. Ён і ў валейбол гуляе, і на ровары шпарка ездзіць.

Жанчына кінула позірк на Сцяпана і ўсміхнулася. Была яна ў блакітнай сукенцы, а доўгія каштанавыя валасы перахоплівала жоўтая стужка.

– Дзень добры! – павітаўся Сцяпан. – Ён тут, напэўна ж, наплёў вам небыліц з два карабы...

– Ды не. Вельмі цудоўны ў вас сынок. Я тут чытала, а ён усё хадзіў навокал і ўважліва мяне разглядваў. А пасля падышоў і кажа: “Не згадзіліся б вы стаць маёй маці?”

– Ну, Андрэйка! – перабіў жанчыну Сцяпан і, прысеўшы перад ім, зазірнуў у вочы.

– А што? – не саромеючыся адказаў той. – Гэтая цётка мне спадабалася. Яна добрая, прыгожая, нават “Снікерс” мне дала. Ты ж сам казаў такую шукаць.

– Вы на яго не крычыце, – заступілася за Андрэйку незнаёмка. – Ён мне пра вас усё расказаў, запрасіў у госці і нават падарыў сваю візітную картку.

Сцяпан аднойчы надрукаваў на машынцы свой адрас і тэлефон ды паклаў у кожную кішэню з Андрэйкавага адзення на ўсялякі выпадак.

Ён моўчкі абняў Андрэйку, прытуліў да сябе і адчуў, як раптоўна зашчыпала ў вачах. Пасля яшчэ мацней прыціснуў і прашаптаў:

– Сыночак мой дарагі! Такая маладая і прыгожая цёця не згодзіцца стаць тваёй маці.

Ён падняўся і ўзяў Андрэйку за руку.

– Прабачце, – прамовіў ён, кінуўшы вінаваты позірк на жанчыну.

– А вы не адбірайце мару ў свайго сына, – сказала незнаёмка, спрабуючы надаць іхняй размове

жартаўлівы тон. – Я табе, Андрэйка, абавязкова патэлефаную. А калі, не дай Бог, захварэеш, то і вылечу, бо працую ў паліклініцы. А цяпер будзем развітвацца, бо мне пара.

– Да пабачэння! – чамусьці з радасцю ўскрыкнуў Андрэйка.

А Сцяпан да таго разгубіўся – слова не вымавіў. Жанчына пайшла, а яны адправіліся да валейбольных пляцовак. Сцяпан апрануўся, і яны паехалі дадому.

Вечарам, перад сном, Сцяпан кінуўся ў роспыты. Яму хацелася даведацца, як Андрэйка асмеліўся падысці да незнаёмай жанчыны ды яшчэ з такой прапановай. Доўга пазіраў на яго, а пасля спытаў:

– Як гэта ты надумаў прапанаваць такой цёці стаць тваёй маці?

– А што? Яна добрая, адна была ў парку, бо дзетак сваіх не мае.

– Адкуль ты ведаеш?

– Сама мне сказала – жыве толькі з маці, а завуць Марына Сяргееўна.

– Не пайдзе яна да нас... – Сцяпан уздыхнуў і пагладзіў яго па галоўцы.

– Чаму?

– Бо замаладая. А я хутка састарэю...

– Калі тое будзе, – працягваў Андрэйка і соладка пазяхнуў. – Вось пабачыш, яна мне пазвоніць.

– Добра. Давай спаць, – сказаў Сцяпан і патушыў святло.

Памаліўшыся, ён таксама сігануў пад коўдру. І хаця прытаміўся, але спаць не хацелася. Думкі міжволі вярталіся да Марыны Сяргееўны. Было ёй каля трыццаці гадоў. Каб Сцяпан меў хаця б сорак, то не ўпусціў бы шанс, а так...

Але ж і ягоны Андрэйка не промах – такую маці сабе выбраў. Хаця, у такія гады ўсе дзеці смелыя і рашучыя, бо паводзяць сябе без хітрыкаў і кажуць у вочы, што бачаць і адчуваюць.

А пра Марыну Сяргееўну вырашыў больш не думаць, бо зацікавіў яе толькі Андрэйка. І ўсё ад таго, што ў яе добрае і чуллівае сэрца, стала шкада хлопчыка. Дый наўрад яна патэлефануе!

Сцяпану ад такіх думак стала нават радасней на душы. А пошукамі працы надумаў заняцца, калі Андрэйка пойдзе ў садзік і ў Сцяпана будзе больш вольнага часу.

А пакуль у горадзе ім не было чаго рабіць, то ён з Андрэйкам вырашыў падацца ў вёску. Там павінен ужо саспець белы наліў – смачнейшых яблыкаў не бывае.

Якраз цэлы тыдзень там прабылі, напаследак нават загарэлі. У Мінск іх прывёз на службовым мікрааўтобусе сусед Ігар, які працаваў у швейным атэлье. Прывезлі яны мяшок яблыкаў, бульбы. Не забыліся пра гуркі, вішні і моркву. А бабуля Агата напякла ў дарогу смачных булак, дала смятаны і варэння. І праз дзве гадзіны яны былі ў Мінску.

Толькі памыліся ў ванне, як падаў голас тэлефон.

– Гэта мне! – ускрыкнуў Андрэйка. Хуценька падбег і схапіў у рукі трубку.

– Андрэйка слухае!

З добрую хвіліну маўчаў, а пасля сказаў:

– А мы былі ў вёсцы! Прывезлі многа яблыкаў і гуркоў.

Пасля зноўку змоўк і ўрэшце прамовіў:

– Абавязкова прыязджайце! Пачастуем, а татка будзе вельмі рады, ён пытаў пра вас.

Пасля паклаў трубку і з радасцю ў голасе прамовіў:

– Што я табе казаў! Марына Сяргееўна не толькі пазваніла, але праз гадзіну прыедзе на вячэру!

Такая заява канчаткова збіла Сцяпана з панталыку. Вось дык Марына Сяргееўна!

– Мо яна пажартавала? – спытаў Сцяпан.

– Ды не! – запярэчыў той. – Прыедзе. Давай хутчэй распальваць пліту.

Сцяпан мог згатаваць любую страву, але лепш за ўсё ў яго атрымліваўся амлет. Удвух узяліся за працу. Спачатку Сцяпан начысціў маладой бульбы-паспешкі. Пасля ўзяўся за мясны салат, бо цудам уцалела банка зялёнага гарошку.

Амлет прыгатаваў у самы апошні момант. Была ў Сцяпана і бутэлька сухога віна, але пакуль вырашыў не ставіць яе на стол.

І толькі з Андрэйкам заслалі абрус, як у прыхожай заспяваў знаёмую мелодыю званок.

Андрэйка першым кінуўся да дзвярэй, шчоўкнуў замок, і на парозе з'явілася Марына Сяргееўна ў чорнай спадніцы і бялюткай блузцы з невялікай сумачкай у руцэ.

– Дзень добры! – з усмешкай на твары прамовіла яна. – Напэўна ж, не чакалі такую няпрошаную госцю?

– Чакалі! – выкрыкнуў Андрэйка, нават не даўшы павітацца Сцяпану.

– Мы нават з таткам вячэру згатавалі!

– Праходзьце, Марына Сяргееўна, – урэшце падаў голас Сцяпан.

– Я толькі на хвілінку, – яна спехам адкрыла сумачку і працягнула Андрэйку плітку шакаладу.

– Дзякую вам, – прамовіў Андрэйка і, на здзіўленне Сцяпана, хуценька пацалаваў яе ў руку.

– А вось гэтага не трэба, – яна крыху разгубілася.

– Астыне вячэра. Мы стараліся з Андрэйкам, пакаштуйце маладой бульбачкі, – сказаў Сцяпан.

– Ну што ж, раз такая смачная вячэра, то не адмоўлюся, – яна спаласнула рукі ў ваннай і зайшла ў залу.

– Я працую ў вашай паліклініцы, сёння якраз наведвала хворых. Так што ў вашым доме была не раз.

Урэшце ўсе ўселіся за столік на кухні. Сцяпан адкаркаваў бутэльку віна і разліў у чаркі. Андрэйку наліў напітку.

– Ну, давайце вып’ем за нашу сустрэчу, – прамовіў Сцяпан. Усе чокнуліся і выпілі.

– Цяпер я дадому не дабяруся! – смеючыся, сказала Марына Сяргееўна, прынімаючыся за мясны салат.

– Ля нашага дома ажно тры аўтобусы ездзяць, даберацеся без праблем,– адказаў Сцяпан.

Пасля вячэры крыху паразмаўлялі, і Марына Сяргееўна пачала збірацца дадому.

– Без вясковых падарункаў мы вас не адпусцім, – сказаў Сцяпан. У адну торбу ён паклаў грапштэйнаў і белага наліву, а ў другую маладой бульбы.

– Не занесці мне! – запярэчыла Марына Сяргееўна.

– А мы правядзем вас да аўтобуса. Яны сабраліся і выйшлі на вуліцу.

– Пачакаем сорак другога, той давязе да самага дома,– сказала Марына Сяргееўна.

Сцяпану хацелася яшчэ з ёй паразмаўляць, але тут падкаціў аўтобус.

Яна хуценька ўвайшла ў заднія дзверы, а Сцяпан падаў ёй дзве торбы. Толькі аўтобус крануўся з месца, як Андрэйка не вытрымаў, пабег побач і крыкнуў наўздагон:

– Да пабачэння!

Пасля вярнуўся да Сцяпана, узяў яго за руку, і яны моўчкі працягвалі стаяць, пазіраючы на чырвоны аўтобус, які паволі зварочваў з іхняй вуліцы і неўзабаве знік.

І адразу ж абодвум стала сумна і маркотна на душы. Яны вярнуліся ў сваю кватэру. Сцяпан прыбраў са стала, пачаў мыць посуд, а Андрэйка стаяў у задуменні ля акна і пазіраў на аўтобусны прыпынак.

Перад сном глядзелі вячэрнюю казку, і Сцяпан расказваў розныя цікавыя гісторыі. Але сёння Андрэйка быў не ў гуморы. Калі Сцяпан змоўк, то ён сказаў:

– Няхай бы Марына Сяргееўна пераехала жыць да нас.

Сцяпан усміхнуўся і ўскудлаціў рукою ягоныя валасы.

– Ну і хітрун ты ў мяне!

– А што?! Ёй і на працу было б хадзіць блізка.

– Яно так, – у задуменні адказаў Сцяпан. – Вось калі яна толькі яшчэ да нас завітае, то мы ёй гэта і прапануем. А цяпер давай спаць.

Андрэйка з неахвотаю павярнуўся да сцяны і заплюшчыў вочы. Сцяпан таксама прылёг. Не мог ён зразумець Марыну Сяргееўну. Канечне, каб яна даведалася пра ягоныя гады, то наўрад ці завітала да іх.

І хаця не лічыў сябе старым, але ўжо адчуваў, што паціху прападае ранейшы імпэт, цяга да жаночага цела... А ў маладосці, бывала, толькі кіне позірк на прыгажуню, як успыхне ўвесь, запульсуе кроў, а думка адна – абняць, пацалаваць... А цяпер не тое. Гэта яго крыху супакоіла, загадваць наперад не любіў, з тым і заснуў.

А тут і першае верасня падаспела. Сцяпан купіў Андрэйку тры чырвоныя ружы і яны адправіліся ў дзіцячы садзік. Іх сустрэла маладая чарнявая выхавацелька. Яна ўзяла Андрэйку за руку і павяла знаёміцца з хлопчыкамі і дзяўчаткамі ягонай групы.

Сцяпан не адыходзіў і ўсё стаяў ля дзвярэй. Заўважыўшы гэта, выхавацелька вярнулася да яго.

– Не хвалюйцеся. Усё будзе добра.

– Можна мне яго ў абед забраць?

– Не трэба. Ён ужо дарослы. Гэта трохгадовым у першыя дні цяжка.

– Калі што, то тэлефануйце. Я буду цэлы дзень дома.

Сцяпан вярнуўся ў кватэру і не ведаў, чым заняцца. Пасля схадзіў у краму, прыгатаваў абед і заняўся бялізнай. А палове пятай пашыбаваў у садзік.

Дзеці гулялі на вуліцы. Андрэйка бегаў за нейкай дзяўчынкай. І адразу ж у Сцяпана адлягло ад сэрца. Тут і Андрэйка яго прыкмеціў.

– Татка прыйшоў! – і падбег да яго.

– Як прайшоў дзень? – спытаў Сцяпан, калі Андрэйка, задыхаўшыся, стаў побач.

– Усё добра. Я спаў разам з усімі.

Тут і выхавацелька падышла да іх.

– Цудоўны ў вас сынок, паслухмяны, – пахваліла яна Андрэйку.

Яны зайшлі ў садзік, узялі торбу з адзеннем і адправіліся дадому. Цяпер у Сцяпана пачаліся вольныя дні, але працу шукаць не збіраўся, бо трэба было дапамагчы бабулі Агаце выкапаць бульбу.

А праз які тыдзень, калі яны сабраліся ехаць у вёску, нечакана палілі дажджы – пачалася сапраўдная восень. І адразу ж пахаладала, а ўсе чакалі цёплага бабінага лета.

На вуліцу было не выйсці. І яны амаль цэлымі днямі сядзелі ля акна і пазіралі на прамоклыя елкі, што раслі ля кальцавой дарогі, на поле і далёкі лес. Кожны з іх раз-пораз кідаў позірк на тэлефон, але той маўчаў.

І яны зноўку пазіралі ў акно. Думкі ў кожнага былі свае, але галоўнае ў іхнім жыцці здзейснілася– яны сустрэліся. А як складзецца далейшы лёс – аднаму Усявышняму вядома, бо ўсе мы – ягоныя дзеці, і жывем часова на нашай зямлі.

# АПАВЯДАННІ

# Тэлеграма

Пасля вячэры Алесь Міхайлавіч любіў паляжаць на канапе. Што ні гавары, а яму нядаўна стукнула сорак гадоў. І хаця знаёмыя давалі заўсёды менш, бо ён быў падцягнуты, хударлявы, гуляў у валейбол, а ўлетку не злазіў са свайго "Турыста", – гады бяруць сваё. Ды і на рабоце за дзень так стамляўся, што свет не мілы. Ён працаваў у аддзеле галоўнага механіка аднаго завода, які размяшчаўся ў былым абласным цэнтры.

Сёння ў яго быў цудоўны настрой – пятніца, наперадзе два выхадныя, а на двары гаспадарыў май. Ды і панядзелка ён не баяўся – на тым тыдні ішоў у адпачынак. Праўда, мінулы дзень ён правёў у чаканні непрыемнасці. Раніцай, выходзячы з пад'езда, адразу ж сустрэў жанчыну з пустым вядром. Гэта ўжо была нядобрая прыкмета. А калі падыходзіў да аўтобуснага прыпынку, яму перабег дарогу вялікі чорны кот, пранёсся перад самым носам, быццам толькі і чакаў яго ўсю раніцу. Кот неяк лянів, доўга пазіраў на яго зялёнымі вачамі, як бы папярэджваў: "Трымайся сёння. Я ведаю, каму дарогу перабягаць".

І вось цяпер ляжаў і ўсміхаўся: можа, і ў прыкметы не заўсёды трэба верыць. Жонка на кухні мыла посуд, а ён раз-пораз паглядваў на гадзіннік. Хвілін праз дзесяць па тэлевізары павінны паказваць кінакамедыю. Але непрыемнае адчуванне ўсё ж засталося ў ягонай душы. Алесь Міхайлавіч прыпомніў, як у пачатку мінулага лета – яны толькі тады пажаніліся са Светай, хаця правільней будзе сказаць – са Святланай Паўлаўнай, бо ёй ужо было трыццаць пяць, – да іх ноччу пачалі стукаць

у дзверы два мужчыны. Ён хацеў адчыніць, але ў апошні момант чамусьці стрымаўся. Паклікаў шэптам жонку: “Зірні, можа, зноў тваe?”

У першы месяц пасля жаніцьбы ён не паспяваў адчыняць дзверы незнаёмым мужчынам.

Яна сыкнула на яго, але падышла да дзвярэй, зірнула ў вочка. “Не ведаю іх, не адчыняй”.

Мужчыны тым часам перасталі грукацець, а пачалі адмыкаць дзверы сваімі ключамі. Добра яшчэ, што ў іх былі тры замкі. Спалохаўся ён тады, да абароны падрыхтаваўся, а жонка не разгубілася – хуценька пазваніла ў міліцыю. Праз пяць хвілін мужчын не было...

Ён толькі хацеў уключыць тэлевізар, як пачуўся званок. “Каго ж там нясе?” На лесвічнай пляцоўцы хтосьці націскаў і націскаў на кнопку. Урэшце з кухні выйшла жонка, тузанула яго за нагу.

– Разлёгся! Мог бы і адчыніць! – сказала яна і накіравалася да дзвярэй.

Бразнуў ланцужок, шчоўкнуў замок. Алесь Міхайлавіч пачуў незнаёмы жаночы голас. Потым стала ціха, а праз хвіліну ў залу ўвайшла жонка. Злы агеньчык блукаў у яе вачах. Яна гідліва выцерла губы і падала яму тэлеграму.

– На, чытай! Тэрміновая!

У тэлеграме было тры словы: “Хварэем прыязджай Люда”. Жонка не адыходзіла. Стаяла побач і глядзела на яго знішчальным позіркам.

– Што маўчыш?! – урэшце не вытрымала яна. – Расказвай, што за Люда.

Але ён толькі глядзеў на апошняе слова тэлеграмы і маўчаў.

– Што, мову адняло?

Ён падняў на яе вочы, разгублена ўсміхнуўся і ціха прамовіў:

– Не адняло. Толькі доўга расказваць давядзецца.

– А ў мяне час ёсць! – яна ўзяла крэсла і села насупраць.

І тут ён адчуў, як лёгка і радасна становіцца на душы. Быццам пачаў звальвацца з плячэй ней-

маверны цяжар. Гледзячы на яго спакойны твар, жонка насцярожылася, а ён смела зірнуў ёй у вочы і сказаў:

– Перад Людай я ў вечным даўгу.

– Вось як! Чаму ж не ашчаслівіў?

– Не атрымалася.

– Так-так... Казала ж мне маці...

– Што яна магла табе казаць? – перапыніў яе Алесь Міхайлавіч. – Сышліся нікому не патрэбныя людзі.

– Гэта я нікому не патрэбная?! За мной такія хлопцы ўвіхаліся, а Ігар Камінскі за руку ў загс цягнуў.

– Хутчэй у кусты... Чаму ж не пайшла?

– Бо дурная была! Спалохалася, што маладзейшы за мяне на пяць гадоў. А іншыя не глядзяць на гэта – ідуць!

Яна змоўкла, потым устала з крэсла, прайшлася туды-сюды па пакоі.

– Што ж думаеш рабіць?

– Трэба ехаць, – ціха адказаў ён.

– Тады збірай свой чамадан і вымятайся!

– Люда ляжыць хворая разам з сынам, там няма каму і вады падаць.

– Можа, з тваім сынам?

– Не з маім.

– Але ж ты і жук! Як мяне дык дапякаў: палюбоўнікі, палюбоўнікі. А сам?!

– Тут зусім іншае. Зразумей ты мяне хоць адзін раз! Хварэе чалавек, можа памерці. Я ведаю яе хваробу...

– Усе вы аднолькавыя! Можаш ехаць, я лепшага знайду.

– Вось як загаварыла!

– А што ж ты думаў – на табе свет клінам сышоўся?! Мужчына называецца – сто дваццаць рублёў у дом прыносіць! Каб не я, так і валяўся б усё жыццё па інтэрнатах!

Алесь Міхайлавіч зірнуў на гадзіннік, пачаў збірацца. Жонка пайшла ў спальню, доўга там грукацела, потым вынесла вялікі абшарпаны чамадан і кінула яму пад ногі:

– Збірай свае манаткі!

– Ты што?! Я на апошнюю электрычку магу спазніцца. Потым забяру.

– Не потым, а зараз! – ускрыкнула яна. – А не забярэш – праз балкон выкіну!

– Не думаў, што ты такая.

– Якая?! Да палюбоўніцы едзе, а я павінна свяціцца ад радасці? Знайшоў дурніцу! А яшчэ прасіў, каб сыночка яму нарадзіла, – дрыготкім голасам сказала яна.

І тут, чаго ўжо не чакаў Алесь Міхайлавіч, жонка заплакала. Хуценька выйшла на кухню, зачыніла дзверы. Ён моўчкі сеў на канапу, камечыў у руках гальштук, не ведаючы, што рабіць далей. Ехаць трэба было – гэта ён добра ведаў, але ж і тут адчуваў сябе вінаватым. А расказаць усё жонцы – не хопіць часу, ды яна і слухаць не захоча. І чаму так атрымлівалася ў яго жыцці? Другія жывуць без турбот і хваляванняў. А тут... Колькі разоў ён памыляўся – не злічыць. І так дажыў да сарака гадоў.

Алесь Міхайлавіч падняўся з канапы, асцярожна ступаючы, зайшоў на кухню. Жонка сядзела і піла каву. Ён прысеў насупраць.

– Я прыеду і ўсё табе раскажу, а потым зробім так, як ты захочаш, – прымірэнча сказаў ён.

– Не хачу цябе бачыць, – ціха адказала яна. – І толькі не думай, што па табе плакала. Мне сябе шкада. Даўно магла быць замужам, ды не шанціла мне.

Бачачы, што жонка крыху супакоілася, ён сказаў:

– Я заўтра ж прыеду. За дзень усё паспею зрабіць: выклічу ўрача, пазваню яе сябрам, дам тэлеграму ў Наваполацк, там у яе сястра замужам.

– Што ты мне малюешся: тое зраблю, гэта... Рабі што хочаш, жыві як знаеш. Цяпер можаш аб'язджаць усіх сваіх палюбоўніц. Ты ж раней так і жыў: месяц у той, два ў іншай. Памаўзлівы кот – вось хто ты! Згінь з вачэй!

Ён ледзь паспеў на апошнюю электрычку. У вагоне людзей было мала. Зірнуў на гадзіннік. Да

Мінска ехаць амаль дзве гадзіны, потым яшчэ на трамваі мінут трыццаць. Атрымлівалася, што а дванаццатай гадзіне ночы ён павінен убачыць Люду. І ўжо пяпер адчуваў, што хвалюецца, а што ж будзе далей, калі на лесвічнай пляцоўцы націсне на кнопку званка?

Больш як год не бачыў Люду, а знаёмы з ёй усе восем. І ўвесь гэты час цяжкім каменем ляжала на душы віна перад ёю. Яна ніколі не пакідала яго, быццам прырасла да ягонага сэрца. І нічога нельга было зрабіць.

І ўспомніў, як упершыню ўбачыў Люду. Ён тады рабіў перасадку ў Мінску, ехаў у Віцебск, каб уладкавацца на станкабудаўнічы завод. Стаяў душны чэрвеньскі вечар. Разам з ім сядзелі ў купэ дзве пажылыя вясковыя жанчыны, яны прыязджалі па пакупкі і цяпер хваліліся адна перад адною, што ўдалося прыдбаць, а ён сядзеў і глядзеў у акно. Па пероне снаўдалі туды-сюды людзі, купкамі стаялі ля вагонаў і крыху воддаль, размаўлялі, смяяліся.

І вось тут убачыў дзяўчыну ў блакітных штанах і белай кофтачцы. На яе плечы густымі хвалямі падалі каштанавыя валасы, Высокая, тонкая, яна весела, нават неяк крыху па-дзіцячы смяялася, разглядваючы фотакарткі, якія ёй паказваў малады хлопец. “Напэўна, студэнты”,– падумаў ён.

Яна адразу ж яму спадабалася. І ён адчуў, як забілася сэрца, як заныла ў грудзях. Так, ён ужо раўнаваў яе да гэтага белабрысага хлопца. Чаго гэта ён аблізвае вусны? Можа, рыхтуецца да пацалунка? Бо па ўсім было відаць, што дзяўчына ад’язджае, а хлопец застаецца. Калі пацалуе, нават у шчаку, тады ўсё! І сцяўся ўвесь, і ніякая сіла не магла ў гэты момант адарваць яго ад акна. Хлопец быў ніжэйшы за дзяўчыну, і гэта супакойвала. Бо дзяўчатам падабаюцца высокія хлопцы, гэта ён добра ведаў. Ён нават аднойчы чуў, як даволі прыгожая дзяўчына казала сваёй маці: “Ён жа малы! А калі я яшчэ туфлі на шпільках абую, тады што?”

Зірнуў на гадзіннік. Да адпраўкі цягніка заставалася менш за дзве хвіліны. Пасажыры пачалі

садзіцца ў вагоны. Дзяўчына азірнулася, спехам сунула фотакарткі хлопцу і, нават не падаўшы яму рукі, кінулася да вагона. Праз імгненне ён зноў убачыў яе. Яна паволі ішла па вагоне, шукаючы сваё месца. Каля яго дзяўчына спынілася. Вось дык удача! Аказалася, што яны едуць у адным купэ. Толькі ў яго было ніжняе бакавое месца. Дзяўчына павіталася з жанчынамі, абыякава зірнула на яго, памахала рукой хлопцу, бо толькі што крануўся цягнік, і пайшла да правадніцы. "Трэба пазнаёміцца, – мільганула думка, – такі выпадак бывае раз у жыцці!"

Дзяўчыны доўга не было. Урэшце яна з'явілася з шахматнай дошкай у руках і маладым чарнявым хлопцам, які ішоў услед за ёю і расказваў, як цудоўна адпачываў у Ялце. Уселіся за столік, пачалі расстаўляць фігуры. Вось табе і на – пазнаёміўся! Ну і моладзь пайшла! Не паспеў падумаць, як з-пад самага носа дзяўчыну ўкралі. Хаця сябе ён не лічыў зусім старым, яму толькі споўнілася трыццаць два гады, але ўжо не мог вось так проста жартаваць з незнаёмымі дзяўчатамі, як гэта рабіў пасля арміі. Яны амаль не цікавіліся ім.

Яны гулялі моўчкі. Тады ён набраўся смеласці і, перасеўшы да дзяўчыны, пачаў назіраць за гульнёй. Як бы там ні было, а меў першы разрад па шахматах. Дзяўчына гуляла добра, але ўсё ж першую партыю прайграла. А ў сярэдзіне другой, калі яна надоўга задумалася, ён разлічыў цікавую камбінацыю. Белым трэба было аддаць каня, потым ладдзю, і чорны кароль атрымліваў мат праз два хады. І калі дзяўчына ўзялася за пешку, ён не вытрымаў, асцярожна дакрануўся да яе рукі і ціха сказаў:

– Пачакайце! Аддайце лепш каня.

– Навошта?! – са здзіўленнем спытала яна і ўскінула на яго свае вялікія чорныя вочы.

– Зараз убачыце! – і сам зрабіў ход канём.

Хлопец задумаўся, схіліўшы над дошкаю сваю кучаравую галаву, а потым пабіў каня і весела сказаў:

– Можа, яшчэ што падорыце?

– Можна і яшчэ, – задуменна прамовіў ён і збіў ладдзёй пешку.

– Тады самі і гуляйце! – абурылася дзяўчына. – Дзве фігуры аддалі нізашто! – яна зрабіла выгляд, што пакрыўдзілася, але ў гэтае імгненне ён адчуў, што між імі працягнулася нябачная тонкая нітачка, быццам электрычны разрад прабег па ёй, пакінуўшы ў душы малюсенькую іскрынку надзеі.

Хлопец адразу ж забраў ладдзю, а праз два хады яго каралю не было куды хадзіць.

– Цудоўна! – ускрыкнула дзяўчына і пляснула ў далоні. – Сама нізавошта да такога не дадумалася б! А вы яшчэ згуляйце, – сказала яна, звяртаючыся да яго.

Ён прапанаваў дзяўчыне перасесці, каб самому зручней было гуляць, але яна не згадзілася.

– Лепш вы сядайце бліжэй да мяне, месца хопіць, а я хачу паглядзець.

І яна прыхінулася да акна.

Хлопец насупіўся. Ён не чакаў, што ўсё так атрымаецца, і цяпер гуляў уважліва, доўга абдумваючы кожны ход. Ён таксама разумеў, што справа тут не толькі ў шахматах. Цяпер Алесь адчуваў цёплае плячо дзяўчыны, з асалодаю ўдыхаў хваёвы пах яе валасоў, і яму было так прыемна, што ён згодзен быў гуляць хоць усю ноч.

Ён выйграў і гэтую партыю, а потым яшчэ адну. А пасля яны пілі чай, расказвалі розныя цікавыя гісторыі, бо кожны хацеў прывабіць дзяўчыну. Гаварылі аб музыцы, літаратуры, пачалі ціхенька чытаць вершы. А калі на невялічкай станцыі выйшлі з іхняга купэ дзве жанчыны са сваімі клункамі – тут усё і пачалося! Дзяўчына толькі гарэзліва ўсміхалася, і яны разумелі, што ўсё будзе залежаць ад яе. Алесь адчуваў, што перамагае, бо дзяўчына часта звярталася да яго, некалькі разоў перабівала хлопца. Калі гаворка зайшла пра Васілія Шукшына, то карты былі ў руках Алеся. Ён расказваў урыўкі з кінафільма “Каліна чырвоная”, мяняў голас, гаварыў за дзеда, бабулю, амаль за

ўсіх дзейных асоб. І так спрытна ў яго выходзіла, што хлопец змоўк, а потым і зусім пайшоў, спаслаўшыся, што заўтра трэба рана ўставаць.

Так ён пазнаёміўся з Людаю. Яна толькі што скончыла універсітэт і ехала адпачываць у Лётцы, дзе быў санаторый. У Віцебск ён так і не паехаў. А што там было рабіць, калі Люду пасля размеркавання пакінулі працаваць у Мінску!

Пяць дзён прабыў у Лётцах. Начаваў у лодцы, нацягаўшы туды духмянага сена. Раніцай купаўся ў возеры, абапал якога цягнуліся да сонца магутныя сосны. Ціха было тут, пахла смалою, і нікуды не хацелася ехаць. Прыходзіла Люда, і яны каталіся на лодцы, гулялі ў шахматы, валейбол.

На другі дзень, калі яны, распрануўшыся, загаралі, знайшоўшы зручнае месца ля самай вады, Люда абняла яго, доўга глядзела ў вочы, а пасля прашаптала:

– Позна мы з табою сустрэліся.

– Чаму?

Але Люда маўчала. Потым лягла на спіну і доўга глядзела ў блакітнае неба. І толькі перад самым ад'ездам яна сказала:

– Алесь, я замужам.

Спачатку ён не паверыў, думаў, жартуе, бо выглядала дзяўчынкаю, якая толькі што скончыла школу.

– Даўно?

– Тры гады.

– А муж...

– І муж ёсць, і сын, – перабіла яна. – Сын у мяне малайчына, трэці годзік пайшоў. Вось так!

– А дзе ты пазнаёмілася з мужам?

– Ва універсітэце. Мы вучыліся на матэматычным факультэце. Ніколі яго не кахала, шчыра табе кажу, і замуж не пайшла б, але на другім курсе я доўга хварэла, дык ён ад мяне не адыходзіў. Нават прывёз з інтэрната да сваіх бацькоў. У іх трохпакаёвая кватэра, а ён адзіны сын. Я вельмі спадабалася ягонай маці. Валодзя добры, вельмі здольны, ён далёка пойдзе. Праз месяц адпраўляюць

у Маскву, у аспірантуру. Ды і маім бацькам ён спадабаўся. Вось і пачалі наступаць на мяне з трох бакоў.

– І калі ж ты здалася?

– На трэцім курсе. Я многа думала. Мне і маці гаварыла, ды часам, ты добра ведаеш, каханне прыходзіць не да ўсіх. Спадабаюцца людзі адзін аднаму, прывыкнуць і жывуць. Вось і я так думала – прывыкну, а мо і пакахаю. Месяц назад Валодзю далі двухпакаёвую кватэру.

– Так хутка? – здзівіўся Алесь.

– Ён вельмі таленавіты, а іхні дырэктар паважае такіх людзей. Здавалася б, жыві і радуйся, а душа баліць, просіць чагосьці, бо адчувае, што сапраўднага шчасця няма. Валодзя закаханы толькі ў матэматыку. У тэатр не зацягнеш, пра танцы і гаварыць няма чаго. А мне ж усяго дваццаць другі год пайшоў.

Ён хацеў спытаць пра сябе, што яна аб ім думае, а Люда, быццам адгадаўшы ягоныя думкі, сказала:

– А вось пра цябе нічога не ведаю: хто ты і што, дзе працуеш, чым займаешся, але з табой так спакойна, проста адпачывае душа, бо адчувае побач сапраўднага мужчыну. Зайздрошчу тваёй будучай жонцы. А можа, яна ў цябе ўжо ёсць?

– Няма, – з усмешкаю адказаў ён.

– Ашуканец! Яшчэ і смяешся! – яна хацела схапіць яго за руку, але ён порстка падхапіўся і кінуўся ў ваду. Доўга плыў. Вада была цёплая, ласкавая. Потым лёг на спіну, азірнуўся. Ён быў амаль на сярэдзіне возера. Убачыў на беразе Люду, якая штосьці крычала і махала рукой. Адразу ж павярнуў назад. А калі, стомлены, лёг з ёй побач на коўдру, яна асцярожна прыгладзіла яго валасы і прашаптала:

– Ніколі не заплывай так далёка, я баюся.

Ён узяў яе рукі ў свае і пачаў цалаваць кожны пальчык.

– Алесь, ты што...

– І нікуды не паеду, – прашаптаў ён, – пабудую шалаш і буду тут жыць!

– А я да цябе ў госці прыходзіць.

І тады ён прыўзняўся, абняў яе і прыпаў да цёплых губ... Люда прашаптала:

– Алеська, міленькі, толькo не сёння, прашу цябе...

У яе вачах быў боль, страх, яны малілі і прасілі яго. І ў тое ж імгненне ён зразумеў – калі штосьці цяпер здарыцца, то Люда ніколі не даруе яму гэтага. І ён упаў на спіну, заплюшчыў вочы і моўчкі ляжаў, цяжка дыхаючы. І тут адчуў на сваіх грудзях маленькую далоньку. Спачатку пальчыкі ляжалі нерухома, а потым пачалі ласкава гладзіць яго. Перабіраліся з грудзей усё вышэй і вышэй, прайшліся па падбародку, вакол вуснаў.

Алесь расплюшчыў вочы.

– Давай скупанемся, адразу ж астынеш, – з усмешкай сказала яна.

І тады ён ускочыў на ногі, падхапіў яе на рукі і панёс у возера. Яны доўга плавалі, ганяліся адно за адным, пырскаліся, нібы дзеці, а калі стаміліся – выйшлі на бераг.

Вечарам Алесь ад'язджаў. Яны дамовіліся, што ён пастараецца ўладкавацца на работу дзе-небудзь непадалёку ад Мінска, каб можна было сустракацца ў выхадныя дні.

І тыя пяць дзён, якія тады правеў у Лётцах, запомніліся яму на ўсё жыццё. Яму здавалася, што толькі-толькі закончыў школу, упершыню прыйшоў на спатканне, упершыню пацалаваў дзяўчыну.

І пачаліся сустрэчы з Людай, якія расцягнуліся на цэлых сем гадоў. Хто б мог падумаць, што так здарыцца? А тады, у першае іхняе шчаслівае лета, яны сустракаліся праз тыдзень на вакзале і ехалі за горад. А потым, калі муж Люды паехаў вучыцца ў Маскву, ён прыязджаў да яе кожную пятніцу, а ў панядзелак першаю электрычкаю ехаў на работу. Яны кінуліся ў сваё каханне, як кідаюцца з высокага берага ракі ў самы глыбокі вір, дзе так круціць, што шанцаў на паратунак няма.

Пад Новы год Люда напісала мужу ў Маскву, каб той даў згоду на развод. Але ад яго доўга не

было ніякіх звестак. Аднойчы ў суботу, калі яны, толькі паснедаўшы, збіраліся на каток, хтосьці пачаў адмыкаць іхнія дзверы сваім ключом.

– Татка прыехаў! – маленькі Жэня пабег да дзвярэй. Алесь кінуў збянтэжаны позірк на Люду. Тая таксама захвалявалася, пачырванела. Потым падышла да яго і ціха сказала:

– Не бойся, усё будзе добра.

Алесь сядзеў на канапе як на гарачым вуголлі. А з пярэдняй чуўся шчаслівы звонкі голас Жэні. Потым ён прыбег ў залу і кінуўся да маці. У руках трымаў вялікую прыгожую каробку цукерак і маленькі бліскучы пісталет.

– Мама! Паглядзі, што мне татка прывёз! Пісталет страляе, ты не думай! Вось пістоны.

– Вельмі добра, – яна пагладзіла яго па галоўцы. – А каробку давай схаваем.

І тут увайшоў Валодзя. Алесь убачыў высокага маладога хлопца з доўгімі рыжымі валасамі. Ён павітаўся, усміхнуўся і весела сказаў:

– Ну, як жывяце? Што новенькага?

– Усё добра, – сказала Люда. – Хадзем на кухню, паснедаеш, чаю вып'еш.

Яны папілі чаю. Потым Валодзя гуляў з сынам, а па абедзе яны паехалі да ягоных бацькоў. Люда пайшла іх праводзіць, а Алесь застаўся на кухні і глядзеў у акно. Трывожна і самотна было на душы. Ён адчуваў, што робіць штосьці нядобрае. Дый паводзіны Валодзі здзівілі яго. Здавалася, што той толькі і чакаў разводу. А мо прыкідваецца? Такі прыгожы хлопец, будучы навуковец, і чаму Люда яго не любіць? Ён так задумаўся, што нават не пачуў, як на кухню ўвайшла Люда.

– Чаго зажурыўся?

– Так... Думкі розныя ў галаву лезуць.

– На Валодзю не звяртай увагі: бачыш, які ён вясёлы.

– Чаму?

– Як табе сказаць... Мне здаецца, што і ён мяне ніколі не кахаў. Падабалася яму, вось і ўсё. Такім людзям, як ён, трэба жаніцца ў трыццаць гадоў.

– Пазнавата.

– Ніколечкі! Да гэтага часу большасць з іх дактары навук. Маюць свае машыны, дачы, кафедры. Потым можна і пра сямейнае жыццё падумаць. А пакуль гэтага дабіваюцца, ніхто не павінен ім замінаць.

– Не ўсе ж такія! – запярэчыў Алесь.

– Не ўсе. А Валодзя такі. Ведаю яго не першы год. І хопіць аб ім гаварыць!

Алесь падняўся, хацеў абняць яе.

– Адстань! – яна порстка кінулася ў бок. – Пра нас трэба думаць, а не пра Валодзю! Дык пачынае выпытваць, што ды як?! Не люблю людзей, якія корпаюцца ў чужым жыцці! Ці ўжо апанаваў страх перед жаніцьбай?

– Не апанаваў. Але што з табою?

– Нічога! – яна хуценька выйшла з кухні і зачынілася ў спальні.

Ён пасядзеў крыху, а потым пачаў збірацца. І калі ўжо надзеў паліто, нечакана ўбачыў Люду. Яна стаяла ля дзвярэй спальні і з усмешкаю пазірала на яго.

– Уцякаеш?

– Так будзе лепш. Вам жа трэба пагаварыць, а я толькі буду замінаць.

– Табе відней. Бывай!

Люда нават не падышла да яго, а яму і не хацелася гэтага. Выскачыў на вуліцу і падаўся да трамвайнага прыпынку. І вось тады ўпершыню зразумеў, што пачынае сумнявацца.

Валодзя адразу ж згадзіўся на развод. Падалі з Людаю заяву, але суд прызначылі толькі праз месяц. А тут, з лёгкай Валодзевай рукі, пачаліся візіты. Ды яшчэ якія! Праз два тыдні прыехала да Люды яе цётка, якая жыла ў Бабруйску. Жанчына бальзакаўскага ўзросту, з каратка пастрыжанымі валасамі, у прыгожым белым світэры, яна выглядала гадоў на сорак, хаця на самай справе ёй было значна больш.

Пацалавала Люду ў шчаку і адразу ж засыпала яе пытаннямі, не звяртаючы ніякай увагі на Алеся, быццам таго і не было ў кватэры.

– Цяпер пра твой развод. Ты што – зусім розум страціла?! Такога мужа кідаеш!

– Няхай сабе, шчасце такое.

– Шчасце, мая любая, ды яшчэ якое. Да трыццаці гадоў будзе доктарам навук, вось пабачыш! А там – можа, і ў акадэмікі трапіць. І ты мяняеш такога чалавека на нейкага слесара! – і толькі тут яна зірнула на Алеся, які ўвесь гэты час разглядваў малюнкі ў "Вожыку" на адной і той жа старонцы.

– Алесь закончыў інстытут, працуе механікам.

– Не вялікая розніца. Чацвёрты дзесятак размяняў, а сваёй кватэры не мае.

– Адкуль вы ўсё ведаеце?

– Валодзя вашым ліст прыслаў. Твая маці сама б прыехала, ды бацьку аднаго не пакінеш. Вось і выправіла мяне.

– І што сказала?

– Каб гнала гэтага нахабніка!

– Вы ж мяне не ведаеце! – ускочыў з канапы Алесь.

– І не хачу ведаць! Накінуўся на чужую жонку з кватэрай! Сваю трэба даўно мець! А то на ўсё гатовенькае прыпхнуўся!

Алесь кінуўся да вешалкі, пачаў збірацца.

– Цётка Лена, навошта ж вы так?! – прамовіла Люда.

– А як? Няхай збіраецца і ўматвае!

Праз месяц Люда атрымала развод. Адразу ж несці заяву на новы шлюб было неяк няёмка, і яны рашылі крыху пачакаць. І чым больш праходзіла пятніц, у якія ён па-ранейшаму прыязджаў да яе, тым усё трывожней станавілася ў яго на душы. Ці ён раней не прыкмячаў, ці яшчэ што, але ж калі што – Люда зрывалася на крык. Потым, праўда, хутка адыходзіла, але ад такіх шматлікіх уколаў у Алеся надоўга псаваўся настрой.

Аднойчы ўпершыню яны моцна пасварыліся. Выбраліся неяк у тэатр. У аўтобусе людзей бітком. Спачатку яны разам стаялі, але яго натоўп адціснуў ад яе і панёс ледзь не да самых дзвярэй. Люда так

раззлавалася, што, калі яны выйшлі з аўтобуса, перастала з ім гаварыць. Моўчкі ўвайшлі ў тэатр, распрануліся. І калі падышлі да кантралёркі, Люда штосьці затрымалася ў дзвярах. Білеты ў іх былі праверапыя ўжо, за імі імгненна сабралася чарга.

І тады ён злёгку дакрануўся рукой да яе пляча і сказаў:

– Праходзь, за намі ж людзі!

Яна рэзка азірнулася, збялела і ўскрыкнула:

– Дык ты яшчэ і хам!

Усе глядзелі на яго: хто з усмешкаю, хто са спачуваннем, а ён не ведаў, куды дзецца ад сораму. Ледзь стрымаўся – не хацелася сварыцца на людзях. Але на гэтым ягоныя пакуты не скончыліся. Калі прабраліся да сваіх месцаў, Алесь адразу ж сеў у мяккае крэсла, але Люда не садзілася. Яна стаяла побач і са з’едлівою ўсмешкаю глядзела на яго.

– Сядай! – урэшце не стрымаўся ён.

– Першы і апошні раз я з табою ў тэатры, – сказала яна і села.

Ён запытальна зірнуў на яе.

– Спачатку жанчын саджаюць, зразумеў?

– Дзе ж мне зразумець, я ж з вёскі, – паспрабаваў аджартавацца ён.

– І не прыкідвайся! Не ведаеш правіл этыкету – дык вучыся! Толькі і чуеш ад цябе: “Я з вёскі!” Знайшоў чым выхваляцца!

І толькі прыехаўшы дадому, яны адвялі душу. Сварыліся дзве гадзіны. Потым Люда пайшла ў ванну. Выйшла памаладзелая, усміхнулася і, як ні ў чым не бывала, сказала:

– Давай лепш чай піць.

І яны сядзелі на кухні і пілі чай.

– Сварыцца калі-нікалі карысна, – працягвала яна.

– Чаму? – здзівіўся Алесь.

– Узбуджае. Прымушае заўсёды быць на вастрыні пачуццяў. Ды і чалавек пры гэтым раскрывае сваю душу.

Пасля яе было не пазнаць: ласкавая, пяшчотная, яна разумела яго, як ні адна з жанчын. Кудысьці

знікла крыўда з душы, прападаў той пякучы боль, які не даваў яму спакою ні днём, ні ноччу. Ён і сябе не разумеў. Толькі ж учора цвёрда рашыў, што жыць з Людай не зможа, а сёння ўжо і не думаў пра тое.

У пачатку сакавіка нечакана памёр Людзін бацька. Алесь не ездзіў на пахаванне. Люда паехала адна, а ён застаўся з Жэнем. І зноў самотна і цяжка стала на душы. Ноччу часта прачынаўся. Яму ўсё думалася – можа, і ён вінаваты, што здарылася такое гора... Бо бацька ведаў, што Люда разышлася з Валодзем. Мо і перажываў, расхваляваўся. А тут яшчэ Людзіна цётка... Напэўна ж, расказала яму пра Алеся.

І пачалося як бы раздваенне яго душы: то ён запэўніваў сябе, што кахае Люду, не зможа без яе жыць, то думаў аб тым, што не вытрымае такой нервовай нагрузкі, калі па некалькі разоў на дзень яны спрачаліся з-за якой-небудзь дробязі. А яму ж так хацелася душэўнага спакою, хатняй цішыні. Інтэрнаты так надакучылі, што ён іх баяўся.

І тут, зусім выпадкова, ён пазнаёміўся з хлопцамі, якія збіраліся ехаць на заробкі ў Нарыльск. Двое з іх былі там летась і цяпер выхваляліся, што нямала зарабілі. Алеся яны бралі, бо ён мог працаваць на бульдозеры, на кране, меў правы на машыну. І ён згадзіўся. Праўда, Люда не адпускала, нават плакала, але ён упрасіў яе. Усё адно распісвацца было нельга – насілі жалобу па бацьку, а грошы ніколі не бываюць лішнімі. Яму і самому хацелася куды-небудзь з'ехаць на два-тры месяцы. З той першай паездкі і пачаліся ягоныя вандраванні. З Нарыльска ён прыехаў у канцы лістапада. Люда хварэла. Ляжала ў ложку, а ўся тумбачка была завалена лекамі. Яна так узрадавалася, што на яе вачах з'явіліся слёзы.

– Што здарылася?

– Нічога, прастудзілася. Такая восень – дажджы ды вецер. І ў калгас ездзілі ўсім аддзелам.

Вечарам, спехам апранаючы паліто, участковы ўрач, маладая паўнаватая жанчына, сказала яму:

– Кожную вясну ёй неабходна выязджаць на мора – выгравацца. І на ўколы да нас прыходзіць.

– А што ў яе? – спалохана спытаў ён.

– Рэўматызм. З маленства хварае. Нічога страшнага няма, але ж лячыць трэба.

Люда хутка паправілася. Здавалася, што цяпер ім толькі жыць ды дабро нажываць, як у той казцы гаворыцца. Але прайшоў месяц, потым другі, і зноў, у каторы ўжо раз, пачаўся разлад. Даходзілі да нейкай нябачнай мяжы – і ўсё! Быццам жылі ў зачараваным коле – толькі спрабавалі выйсці, як усё ляцела ў бездань. Яны нават не сварыліся, бо пачыналі разумець, што чагосьці ім не хапае.

І ён паехаў з тымі ж хлопцамі ў тайгу валіць лес. І пачаліся яго прыезды і ад'езды, якія расцягнуліся на сем гадоў. Здаралася, што прыязджаў праз год, а то і больш... Сустракаліся, як даўнія знаёмыя, расказвалі адно аднаму пра навіны. Люда яму пра сваіх знаёмых, а ён пра свае вандраванні. Алесь вельмі хацеў, каб яна выйшла замуж. Яму здавалася, што тады стане крыху лягчэй на душы, спадзе частка ягонай віны. Ды і Людзе надакучыла быць адной. Але ўвесь час траплялiся такія жаніхі, з якімі трэба было кудысьці выязджаць. А яна не хацела пакідаць Мінск. Гады ішлі. Ужо Жэня пачаў хадзіць у школу. Валодзя, былы яе муж, заканчваў доктарскую дысертацыю. Калі-нікалі ён прыязджаў да іх. Жартавалі, гулялі ў шахматы, а на душы ў кожнага радасці не было. Валодзя з Жэнем амаль штолета куды-небудзь ездзілі: то ў Гродна, да сваякоў, то на мора. Жэня быў выліты бацька. Вучыўся добра, асабліва любіў маляваць. Люда нават часцяком крычала на яго, адбірала алоўкі, выганяла на вуліцу, каб дыхаў свежым паветрам.

Але ўсяму, што мае пачатак, прыходзіць і канец. Аднойчы ў пачатку снежня – тады была ў Мінску такая мяцеліца, што занесла ўсе тратуары ў горадзе, – ён прыехаў да Люды. І адразу ж, толькі ўбачыў яе, проста ля парога адчуў – штосьці здарылася. Яна стаяла крыху воддаль ад яго і вінавата

ўсміхалася. Ён хацеў яе абняць, бо яшчэ не паверыў да канца ў сваё прадчуванне, але яна ступіла крок назад і сказала:

– Толькі без гэтага!

– Чаму?

– Таму! Распранайся.

Ён памыўся ды адразу ж за стол. А там ужо стаяла бутэлька піва, сквірчэла на патэльні яечня. Ён быў галодны. Адразу ж накінуўся на ежу, а яна доўга моўчкі глядзела на яго.

– Люда, што здарылася?

– Я выходжу замуж.

– За каго?

– Якая табе розніца? Ты ж хацеў, каб я выйшла.

Ён маўчаў.

– Хацеў, яшчэ як хацеў! Сем гадоў была тваёй – хопіць!

– Хто ж ён усе-ткі?

– Мастак.

– Малады, прыгожы, барадаты? Будучы геній. Але пакуль яго не прызнаюць, так?!

– Чаго ты заводзішся? Яму пяцьдзесят гадоў, вядомы наш мастак. Яго карціны нават у замежных музеях вісяць.

– Дзе ты з ім пазнаёмілася?

– У тралейбусе. Гэтым летам ехала да сяброўкі, а тут нейкі дзядзька так ужо ўглядаўся, проста вачэй не спускаў. Потым падсеў да мяне і кажа: “Вельмі трэба з вамі пагаварыць”. Выйшлі. Селі на лаўку ў скверыку, што ля кінатэатра. І ён тут жа працягнуў мне сваю візітную картачку. Сказаў мне, што хоча напісаць мой партрэт.

– Ты адразу ж згадзілася, прывяла яго да сябе?

– Я магу нічога табе не расказваць! Швэндаецца дзесьці па белым свеце, а тут яшчэ допыт учыняе!

– Прабач мне...

Люда наліла сабе кавы.

– Я сказала, што ў мяне вельмі раўнівы муж і пазіраваць ні за што не адпусціць.

– А ён што?

– Сказаў – сам упросіць мужа. А калі што – то няхай разам са мною прыязджае ў майстэрню. Я паабяцала, што падумаю, пагавару з мужам і дала яму службовы тэлефон. Вось і ўсё.

– Што ж далей было?

– Званіў па пяць разоў на дзень. Нашы супрацоўнікі пачалі ўжо смяяцца з мяне. Аднаго разу выходжу пасля работы з інстытута, а ён чакае з букетам чырвоных ружаў. Побач белая “Волга”. Што тут паробіш – прыйшлося ехаць. Паглядзела на яго майстэрню, тое ды сёе, а потым і падумала: “А што тут такога? Няхай піша той партрэт, калі ўжо так яму спадабалася”.

– У яго ж, напэўна, і жонка ёсць?

– Ён разышоўся. Сын у арміі служыць. Вось з гэтага ўсё і пачалося.

– І ты кахаеш яго?

– Даражэнькі ты мой! Кахаеш – не кахаеш... Для жанчыны галоўнае, каб яе кахалі. За сем гадоў так душа выбалела, што свет не мілы. Адна і адна. Цвік у доме няма каму забіць. І хоць з выгляду ён не прыгажун, але вельмі добры. Такі ўжо чулы, што проста дзіву даюся! Толькі аб чым падумаю, а ён ужо робіць. І ніякіх табе сварак! Нават бывае, што хочацца накінуцца на яго ні з таго ні з сяго, бо раздражняе ягоны спакой. Але няма за што. Кахае ён мяне, вельмі кахае! Аднойчы так і сказаў: “Ты ў мяне апошняе каханне. Пакінеш – жыць не буду!” А калі куды-небудзь паедзем – у госці там ці да ягоных сяброў, то ён нікога не заўважае. Быццам і няма навокал людзей. Для яго я – гэта ўсё! І такі прасцецкі – што хочаш можа зрабіць.

– А дзе ж партрэт?

– Вісіць у зале.

– Можна зірнуць?

Яны выйшлі з кухні. Люда пстрыкнула выключальнікам. І са сцяны, з пазалочанай рамкі, проста на Алеся глядзела Люда. У блакітнай кофтачцы, з крыху растрапанымі валасамі, быццам толькі што прыйшла з вуліцы, яна была такая прыгожая, што ў яго перахапіла дыханне. А ў вачах

быў неспакой, чаканне і яшчэ штосьці такое, што прыцягвала гледача і абуджала ў ягоным сэрцы надзею, а ў душу пранікала светлая радасць.

– Ён сапраўдны мастак, – прашаптаў Алесь. – Ніколі не думаў, што ў нас ёсць такія.

– Хутка на выставу забяруць, – уздыхнула Люда, – а я не хачу аддаваць.

Яны зноў вярнуліся на кухню. Люда прыгатавала каву.

– І ён прыходзіць сюды?

– Амаль кожны вечар. І сёння павінен быць. Мы і заяву падалі, але там чарга.

– Дык, можа, я пайду?

– Сядзі. Амаль год не бачыліся, а ўжо ўцякаеш. Я вось толькі аднаго баюся: здаецца, выпівае ён.

Алесь маўчаў. Не было настрою ні каву піць, ні гаварыць. І калі раней ён сам хацеў, каб Люда выйшла замуж, то цяпер не мог сабе ўявіць, што больш не зможа сюды прыязджаць.

– Ты толькі не губляйся, добра? – Люда дакранулася да яго рукі.

– Як гэта? – не зразумеў ён.

– Я заўсёды павінна ведаць, дзе ты знаходзішся.

– Навошта?

– Так, на ўсялякі выпадак. У жыцці ўсё можа быць.

І тут пачуўся званок.

– Гэта ён! – Люда кінулася да дзвярэй.

А праз хвіліну Алесь убачыў невялічкага паўнаватага мужчыну з рэдкімі рыжаватымі валасамі і жвавымі чорнымі вачамі. Ён зірнуў на Алеся, усміхнуўся і сказаў:

– Пятро Мікалаевіч.

Алесь назваў сябе. Яны парукаліся.

– Амаль усё пра цябе ведаю, – сказаў мастак, сядаючы на табурэтку. – Люда часта расказвала.

Алесь адчуваў, што трэба ісці. Пятро Мікалаевіч адраз ж размякчэў, бо прыйшоў нападпітку. Твар зрабіўся чырвоны, вочы заблішчэлі. Доўга глядзеў на яго асалавелымі вачамі, а потым закрычаў:

– Бадзяга! Вымятайся адсюль!

– Пеця! Перастань! Ідзі прыляж на канапе. – Люда ўзяла яго за руку.

Алесь моўчкі ўстаў, выйшаў з кухні і пачаў збірацца. Пятро Мікалаевіч таксама выйшаў, хістаючыся, ў залу.

– Людачка! Сонейка маё! Ён мучаў цябе сем гадоў. Гані яго к чортавай матары!

Алесь апранаўся. Словы мастака балюча сцябалі яго. Хацелася як мага хутчэй выскачыць на вуліцу. Калі ён выходзіў, Люда падышла да дзвярэй.

– Сам ва ўсім вінаваты! Пішы! – шапнула яна.

Усю ноч давялося сядзець на вакзале. Аб усім перадумаў. І як ні суцяшаў сябе – балела душа, ныла сэрца. Так, віна яго цяжкая. Але чаму так атрымалася? Другія жэняцца, разводзяцца – калі ўжо на тое пайшло. І нічога – жывуць. Яму пад сорак, а сябе яшчэ не ведаў. Адно разумеў – чагосьці не хапае ў ягоным характары. А вось чаго? Можа, нейкай рашучасці. Другі б на ягоным месцы мо і прыкрыкнуў бы калі на Люду, а ён так не мог. Ды і выходзіла б Люда за больш маладзейшага – не так бы перажываў. А тут! Божа ж ты мой!

Раніцай прыехаў на электрычцы да свайго дзядзькі. Той адразу ж прачытаў яму лекцыю аб жаніцьбе, пажурыў за бадзянне па свеце і памог уладкавацца на завод. Але на гэтым не супакоіўся – пачаў шукаць Алесю жонку. І ў хуткім часе знайшоў Святлану Паўлаўну. Яна працавала буфетчыцай, мела сваю кватэру. Ды і з выгляду нічога сабе. Пазнаёміўся, тое ды сёе... Тут якраз ліст ад Люды атрымаў. Яна пісала, што ў яе ўсё добра, жадала яму шчаслівай жаніцьбы. І гады падганялі, і дзядзька не адступаўся, і інтэрнат надакучыў, ды і сам думаў – калі ажэніцца, то пачне жыць інačай.

Непрыкметна праляцеў год, як быў жанаты, а радасці не было. Жонка раджаць адмовілася, чым яго вельмі здзівіла. Можа, баялася ці не хацела, а чагосьці чакала – хто яе разбярэ? З дзядзькам сваім ён, праўда, вітаўся, нават бываў у яго.

І вось цяпер ён зноў ехаў да Люды. Электрычка мінула Масюкоўшчыну хутка Мінск. І чым бліжэй пад'язджаў, тым усё больш хваляваўся. Трамвай ішоў амаль пусты. Колькі разоў ён ездзіў на ім – не злічыць! Спачатку рашыў зірнуць на вокны. Люда жыла на пятым паверсе. Вось і знаёмы балкон.

На лесвічнай пляцоўцы доўга таптаўся ля дзвярэй. Потым даў два кароткія званкі. Так ён заўсёды званіў. Урэшце шчоўкнуў замок, дзверы адчыніліся. На парозе ўбачыў Жэню. У паласатай піжамцы, з пабялелым тварам, да таго схуднелы, што ён ледзь яго пазнаў.

– Дзядзя Алесь! – узрадвана ўскрыкнуў ён. – Як добра, што вы прыехалі! Мы так захварэлі, а мама ледзь не памерла.

Алесь хуценька распрануўся, зняў туфлі, і яны пайшлі ў спальню. Люда ляжала на ложку. Потым убачыла яго, усміхнулася і паспрабавала прыўзняцца.

– Алесь...

Ён імгненна апусціўся на адно калена і пачаў цалаваць яе рукі.

– Я ведала, што ты прыедзеш, – прашаптала яна. Потым зірнула яму ў вочы і сказала: – Калі што якое – пахаваеш у нашай вёсцы, разам з татам...

– Аб чым ты гаворыш!

– У мяне такі прыступ быў! Спачатку ногі адняліся, а потым сэрца забалела. Але пачала ўжо хадзіць. А тут і Жэня захварэў. Вось і жыві як хочаш.

– А дзе ж Пятро Мікалаевіч?

– Хто ж яго ведае.

– Ты ж пісала...

– Калі тое было, – перабіла яна Алеся. – Месяцы праз два, як ты ад нас паехаў, толькі хацелі распісвацца – нечакана вярнулася да яго жонка. Даведалася, што ён хоча жаніцца. А ў яго ж "Волга", трохпакаёвая кватэра. Праз тыдзень сын

вярнуўся з арміі. Што там у іх было – не ведаю. Толькі аднойчы прыехаў ён да мяне, сеў на канапе, вінавата апусціў галаву і маўчыць. Я адразу ж усё зразумела... Пачаў гаварыць, што трэба пачакаць, бо сын хоча ажаніцца, жонка кожны дзень плача і ўсё такое. Больш яго не бачыла. Потым ты напісаў, што ажаніўся.

– Якая там жаніцьба. Яшчэ раскажу табе аб ёй, часу хопіць.

– Калі ты паедзеш?

– Не ведаю. Буду чакаць, пакуль ты паправішся.

– Не жартуй, ты ж працуеш.

– У панядзелак, першаю электрычкаю.

– Цэлыя два дні будзеш з намі!

І такая мілая, да болю ў душы знаёмая ўсмешка з'явілася на яе твары, што ў яго зашчыпала ў вачах.

– Я хутка папраўлюся, ты не думай, што зусім хворая. Летась не пабывала на моры, вось і прыхапіла.

– Ведаеш што, – ён пагладзіў яе руку, – я на тым тыдні ў адпачынак іду. Як толькі паправішся – адразу ж на мора махнем.

– Праўда?! І Жэню возьмем, у яго якраз канікулы пачнуцца. Цудоўна!

Яе твар свяціўся ад радасці і шчасця.

– А ў цябе калі адпачынак?

– Магу ісці ў любы момант. Я ж на ўліку ў паліклініцы. Алеська ты мой! – яна хуценька пацалавала яго ў шчаку. – Я ўвесь год думала аб табе, хацела нават напісаць, але баялася, што жонка твая прачытае.

– І я аб табе думаў, а колькі разоў у сне бачыў...

– Ой, загаварыліся мы, а ты ж галодны! Падсмаж там сабе што-небудзь, добра? А я буду спаць.

Ён пацалаваў яе, патушыў начнічок і выйшаў са спальні ў святліцу. Уладкаваўся на канапе. Але сон

не браў. Тады падняўся і выйшаў на балкон. Ціха было навокал. Нават не верылася, што ён у горадзе. Дом стаяў воддаль ад вуліцы. Адразу ж за ім пачынаўся невялічкі сад. І хаця Алесь добра ведаў, што чакае яго наперадзе, упершыню за апошнія гады адчуў, як ціхая светлая радасць распускаецца ў душы.

## Мой сябар Венька

Венька быў старэйшы за мяне на тры гады. У дзяцінстве гэта многа значыць. А пазнаёміўся з ім на рэчцы. У тыя пасляваенныя гады цяжка жылося ўсім. Не салодка прыходзілася і мне з маці. Бацьку я не памятаю: ён загінуў у Берліне, за некалькі дзён да заканчэння вайны.

І я з ранняй вясны бегаў на раку кожны дзень – вудзіў рыбу. І калі мне ўдавалася злавіць з дзесятак пузатых тлустых келбаў, так называлі ў нас невялічкіх шэрых рыбак, якія цэлымі чародамі збіраліся ў ямках і грэліся на сонейку, то я без памяці ад радасці бег дадому. Маці падсмажвала рыбу на патэльні, і мы мурцавалі яе з бульбай за абедзве шчакі.

У той вечар я вудзіў рыбу ля вялікай, нахіленай над рэчкай вярбы. Тут была даволі глыбокая ямка, ды і шанцавала мне заўсёды у гэтым месцы. Рыба добра бралася: за якую гадзіну я злавіў з дзесятак келбаў, а мог бы значна больш, але, на жаль, у мяне быў вялікі кручок – келбы зрываліся, як ні стараўся я найспрытней падсячы. Толькі схаваецца паплавок, падсяку – голы кручок! Хітрыя рыбкі, быццам згаварыўшыся, пацяшаліся з мяне – спрытна сцягвалі чарвяка з кручка.

І тут я адчуў, як хтосьці асцярожна дакрануўся да майго пляча.

– Як бярэцца?

Я ўздрыгнуў, хутка азірнуўся. Побач стаяў рыжы хлапчук. Лёгкая ўсмешка разагнала рабацінкі

па яго твары. Быў ён крыху вышэйшы за мяне, тоўсценькі такі, у блакітнай кашулі і картовых штанах.

“Зарачанскі! – мільганула думка, – усё, прапаў! Зараз адбярэ вудачку, кручок, рыбу”. За рэчкай жылі хлопцы благія, я іх баяўся. Як зловяць, бывала, то дамоў з сінякамі пляцешся. У нашай вёсцы, Сукневічы, дамоў значна больш, чым у іх, але не спраўляліся мы з імі. Нам бы сябраваць, а не бойкі весці, але так было спакон веку. І чаму тады так біліся?

Мне ўцякаць не было куды. Я маўчаў. А хлопец тым часам зазірнуў у мой кацялок, які стаяў прыкапаны вільготным пяском.

– Тут на патэльню ёсць! – усклікнуў ён.

– Зрываюцца, – адказаў я, – кручок вялікі.

– Пакажы.

Я падаў яму вудачку.

– Ну і ну! Як жа ты ловіш на такі кручок?

І не паспеў я адкрыць рот, як ён спрытна перакусіў шоўкавую нітку.

– Трымай!

Я ўзяў кручок і палажыў у маленькую баначку з-пад вазеліну. А хлопец прывязаў да маёй вудачкі другі – зусім маленькі. Я нават не прыкмеціў, адкуль ён яго дастаў. Потым адзеў на кручок чарвяка і закінуў. І адразу ж неспакойна загойдаўся паплавок, а потым нырнуў на дно. Ён падсёк. І пузатая келба, бліснуўшы на сонцы срабрыстымі бакамі, плюхнулася ў траву.

Я зняў рыбу з кручка і палажыў у кацялок.

– Ну і кручок! Дзе такі здабыў?

– Дзядзька з Ленінграда прыслаў. Ён на моры рыбу ловіць. А гэты бяры сабе, у мяне іх многа. Як цябе зваць?

– Міша.

– А я Венька. Прыходзь заўтра да мяне, га? Махнем на Вілію. Я ведаю месца, дзе акуні ды плоткі так бяруцца – толькі паспявай цягаць. А келба – хіба ж гэта рыба?! Ды і жылкі табе на вудачку дам.

– Добра. Я прыйду, калі маці адпусціць. Дзе ты жывеш?

– За рэчкай, вунь ля вялізнай чаромхі мой дом, нават адгэтуль відаць.

– А чаму я раней цябе не бачыў?

– Я два гады ў цёткі жыў. Цяпер буду вучыцца ў вашай школе.

– У які клас перайшоў?

– У сёмы.

– А я ў шосты.

Раніцай наступнага дня я быў ужо ў Венькі. У яго таксама не было бацькі, а маці працавала ў калгасе. Адразу ж узяліся за маю вудачку. Начапілі жылку, ды такую празрыстую, тонкую, як конскі волас. Венька даў мне новы паплавок. Хуценька накапалі чарвякоў і падаліся на Вілію.

Вось гэта была рыбалка! Акуні ды плоткі. А якія! Адзін такі вялікі акунь мне трапіўся, што нават не змясціўся ў кацялку.

Дадому вярнуўся позна вечарам. Прынёс поўны кацялок рыбы, а найбольш вялікіх рыбінаў прыйшлося начапіць на дубец. Маці крыху пакрычала на мяне, але калі я расказаў, з кім быў – супакоілася.

Венька амаль кожны дзень хадзіў у калгас. Я зайздросціў яму. Часта бачыў, як ён раніцай ішоў з хлопцамі і дарослымі мужчынамі на выган лавіць коней. У той час машын у калгасе было мала. Амаль усё рабілі на конях.

Аднаго разу я не вытрымаў – пайшоў у поле. Там Венька разам з іншымі хлопцамі абганяў бульбу.

– На, паспрабуй сам праехаць туды-сюды, – сказаў мне Венька, – тут няма нічога складанага, глядзі толькі, каб бульбоўнік конь не хапаў.

Я з хваляваннем узяўся за ручкі сошкі. Конь паслухмяна пайшоў між градак, а лёгкая сошка акуратна рассоўвала зямлю на два бакі. "І сапраўды, – падумаў я, – нічога складанага. Мог бы і я працаваць разам з імі". У канцы поля, калі я паварочваў каня, каб пачаць новую градку, убачыў калгаснага брыгадзіра Анатоля Пятровіча.

– Я і не ведаў, што ў нас новы работнік з'явіўся. А што, – працягваў ён, уважліва аглядаючы маю баразну, – нядрэнна атрымліваецца. Прыходзь заўтра раніцай – будзеш працаваць разам з хлопцамі.

– А якога каня мне браць? – хуценька спытаў я.

– Знойдзем. Дэраша возьмеш. Конь спакойны, нават аваднёў не баіцца.

Вечарам я сказаў маці:

– Заўтра пайду ў калгас.

– Яшчэ што прыдумаў?! – здзівілася яна.

– Сам Анатоль Пятровіч запрасіў.

– І што ж будзеш рабіць?

– Бульбу абганяць з хлопцамі.

– Яны ж усе старэйшыя за цябе! Так што сядзі дома, лепш свірэпкі нарві мяшкі са два.

– Пайду і ўсё! – абурыўся я. – Ён мне нават каня выдзеліў! Працадні зарабляць буду. Я ж бачу – цяжка табе адной!

– Добра, – яна ўздыхнула. – Схадзі. Намучышся дзянёк з канём – сам кінеш!

Раніцай я быў самы першы на калгасным двары. Аброці выдаваў Радзікевіч Валодзя. Яго я добра ведаў. Зусім маладым хлопцам ён паспеў захапіць год вайны. Вярнуўся дадому без правай нагі. У яго быў пратэз. І ён даволі добра хадзіў, злёгку абапіраючыся на палачку. Нават на танцах бываў. А мы – вясковыя падшыванцы, хоць праз акно, але любілі глядзець, як танцуюць дарослыя. Бо ні тэлевізара, ні нават радыё тады яшчэ не было. А там жа музыка! Цікава паслухаць, паглядзець, хто з кім танцуе. Валодзя, крыху выпіўшы, заўсёды сядзеў ля музыкаў. І кожны раз ён што-небудзь вытвараў: то ўсе лямпы паб'е сваёй палкай, то гармонік парэжа...

Тады я нічога не разумеў, мне проста было пацешна глядзець на ўсё гэта. І толькі потым зразумеў, як балела Валодзю душа, што ён такі малады не можа выйсці ў круг, а для дзяўчат ён быццам не існаваў – не прыкмячалі яго.

Валодзя даў мне новую аброць з раменнымі павадамі. Калі я разам з усімі ішоў на выган лавіць коней і сказаў пра Дэраша, то хлопцы пачалі смяяцца.

– Чаго гэта яны? – спытаў я ў Венькі.

– Не слухай гэтых баламутаў! Дэраш выдатны конь, толькі задняя нага крываватая.

– Дык ён кульгае?! – усклікнуў я.

– Не. Сам убачыш.

Коні, хоць і былі спутаныя, але не даваліся. Яны добра ведалі, што зноў цэлы дзень давядзецца цягаць плуг на полі, а там спякота, авадні...

Хлопцы лавілі коней лейцамі, а то і вяроўкамі. У Венькі лейцаў не было.

– Зараз зловім твайго Дэраша, вунь ён, бачыш, белы такі, а потым майго Барыська.

Дэраш не ўцякаў. Ён толькі падняў галаву і са здзіўленнем глядзеў на мяне сваімі вялікімі чорнымі вачамі. Ён сапраўды не кульгаў, але капыт правай задняй нагі быў павернуты крыху ўбок.

Я дастаў з кішэні кавалачак хлеба. Конь асцярожна ўзяў яго сваімі мяккімі цёплымі губамі.

Прыехалі на калгасны двор, пачалі запрагаць. Хамут Дэрашу знайшоўся, а вось сошкі не было. Хлопцы выязджалі ў поле, засталіся мы з Венькам.

– Не хвалюйся, – сказаў мне Валодзя, – я дам табе такую сошку – сама араць будзе. Прыхаваў тут адну, свае соткі ёй абраблялі.

Сошка сапраўды была выдатная: доўгія ручкі, араць было лёгка. Ды і Дэраш хадзіў добра. Яго не трэба было падганяць. Калі што-небудзь у мяне не ладзілася з пастронкамі ці яшчэ што, ён паварочваў галаву і глядзеў на мяне, быццам пытаў: "Ну, што ты капаешся?"

Пад вечар прыехаў на ровары брыгадзір. Перапісаў усіх, хто працаваў.

– Як справы? – звярнуўся ён да мяне.

– Добра, – адказаў я.

– Не стаміўся?

– Ніколечкі.

Мне было неяк няёмка перад хлопцамі, што брыгадзір размаўляе са мной, як з малым. Баяўся, што яны будуць смяяцца, але ўсё абышлося.

– І каб ніякіх скачак пасля работы! Коні і так замучаныя.

Брыгадзір сеў на ровар і паехаў.

Маці прыйшла з работы раней за мяне. Бо пакуль мы адвялі коней на луг, аж да Прорвы, вярнуліся пешкі назад – прайшло ладна часу. Памыўся – і адразу ж за вячэру, бо вельмі прагаладаўся. Маці сасмажыла яечню, прынесла са склепа халоднага квасу.

– А заўтра пойдзеш? – спытала яна.

– Пайду! У мяне такі цудоўны конь! Хлеб так любіць.

Маці доўга глядзела, як я апетытна ем, а потым нечакана заплакала.

– Што з табой?

– Нічога. Я так... – яна хуценька выцерла слёзы. – Бацька твой таксама яечню любіў. Каб вярнуўся з вайны – жылі б цяпер і гора не ведалі! А так...

– У Венькі ж таксама бацькі няма – і жывуць.

– Ім дзядзька з Ленінграда памагае.

– І мы не прападзем! Я за лета нешта зараблю, у цябе працадзён многа, за бацьку грошы прыносяць, ды і шыць зімой будзеш.

Маці мая шыла добра, а грошай брала – хто колькі дасць. Заказаў у яе хапала. Амаль кожны вечар пасля работы стракатала яе машынка далёка за поўнач.

Калі скончылі абганяць бульбу, брыгадзір паслаў мяне з Венькам у райцэнтр Смаргонь па салярку. Гэта цяпер у калгасе свая запраўчная, а тады – смех успамінаць, мы вазілі бочкі з салляркай і маслам на конях. Лажылі на воз па дзве вялікія бочкі, запрагалі пару коней. Ехаць трэба было дзесяць кіламетраў. Брыгадзір запісваў нам за гэта па два працадні. Цяжка было толькі ўскочваць поўныя

бочкі па лежнях на воз. Мы з Венькам заўсёды прасілі на дапамогу якога-небудзь дзядзьку. Туды і з іншых калгасаў прыязджалі.

А потым непрыкметна пачалося жніво. У той час у калгасе быў адзін камбайн. Яму хапала работы ў другіх брыгадах, а ў нас жалі жанчыны сярпамі. А мы вазілі снапы ў гумно. Памятаю, як складваў свой першы ў жыцці воз. Жанкі кідалі снапы з усіх бакоў, я ледзь паспяваў іх лавіць. Потым падалі жэрдку, начапілі на яе перадню, а ззаду я ўжо сам уціскаў воз як мог. А яны ішлі падаваць снапы на іншыя вазы. І толькі пачаў выязджаць з поля на дарогу, як задняе кола трапіла ў калдобіну, воз нахіліўся, снапы паляцелі на зямлю.

Я не ведаў, што рабіць. Нават заплакаў ад роспачы. На маё шчасце, пад'ехаў Венька.

– Было б аб чым плакаць! Зараз усё зробім.

Ён хуценька скінуў жэрдку, потым выехаў з возам на роўнае месца.

– Падавай! – крыкнуў ён.

Я пачаў кідаць снапы, а ён так хутка іх укладваў, што хвілін праз дзесяць воз быў складзены. Моцна ўсціснулі яго жэрдкай.

– Другі раз старайся снапы вузей лажыць ды папрасі цётак, каб воз памаглі ўсціснуць.

У гумне даводзілася кожны сноп падаваць вілкамі высока на тарпу. За дзень я так стаміўся, што вечарам ледзь прыплёўся дамоў. Добра, што заўтра была нядзеля, можна было адаспацца, пасядзець з вудачкай ля ракі.

Хутка праляцела лета. Надышоў час збірацца ў школу. Я вельмі пасябраваў з Венькам, хоць і вучыліся мы з ім у розных класах.

У той год у нашым класе з'явілася новая вучаніца. Гэта была Яна Паўлюкевіч. Чарнявая, тонкая, з коратка падстрыжанымі валасамі, яна адразу ж усім спадабалася. Яе бацьку перавялі да нас ляснічым. Вучылася яна добра, а так цудоўна спявала, што яе часта запрашалі выступіць у нашым вясковым клубе.

Вось тут усё і пачалося. Цяпер, калі прайшло з той пары многа гадоў, я думаю: няўжо на свеце ёсць лёс, ад якога нікуды не дзенешся? Перавялі б бацьку Янькі ў другое месца, не сустрэлася б яна з Венькам – і ён бы застаўся жыць. Венька, Венька... Але што я тады мог зрабіць? Наадварот – я быў рады, што яны пасябравалі, а потым і пакахалі адно аднаго. Памятаю, як на школьных вечарах ёй пісалі запіскі. Тады ў нас была вельмі модная гульня "ў пошту". Як усе хлопцы стараліся запрасіць яе на танец. Яна і мне падабалася, але я нікому аб гэтым не гаварыў. Нават аднойчы пацалаваў яе. А было гэта так. Мы рыхтавалі да школьнага вечара пастаноўку па аповесці Аляксандра Пушкіна "Капітанская дачка". Мне даручылі ролю Грынёва, Веньку – Пугачова, Яні – Машу. І там па ходзе дзеяння мне і давялося пацалаваць яе ў шчаку. Ды і які гэта быў пацалунак на вачах усёй школы? І хто я быў у той час для яе? Так – хлапчук, а ёй падабаліся, як і ўсім дзяўчатам, больш дарослыя хлопцы.

Я і не прыкмеціў, як Янька пасябравала з Венькам. Ды гэта і не дзіўна. Веньку любілі ўсе, бо ён быў чулы і добры. Яму ўсіх было шкада.

Аднойчы Янька ўвязалася з намі пайсці вудзіць рыбу. Але нечакана ўзняўся вецер. Я ўпершыню бачыў такія вялізныя хвалі на нашай Віліі. Скруціўшы вудачкі, мы ішлі па высокім абрывістым беразе. Калі-нікалі амаль з-пад самых нашых ног вылятаалі ластаўкі-берагулькі. У гэтым беразе было многа іх гнёздаў. І раптам убачылі, як адна ластаўка неяк няўмела, вельмі нізка, ляцела над хвалямі. Мы моўчкі спыніліся і пачалі назіраць. Якраз пасярэдзіне ракі ластаўка ўпала ў ваду.

– Міша! – Янька схапіла мяне за руку. – Ты ж добра плаваеш, выратуй яе!

– Дык яна ж, напэўна, загінула, такія хвалі...

Я ў разгубленасці глядзеў то на Веньку, то на раку. Папраўдзе кажучы, я спалохаўся. Нават і цяпер памятаю страх, які тады апанаваў мяне. Выручыў Венька.

– Я паспрабую, – сказаў ён і пачаў распранацца.

Венька хоць і быў старэйшы за мяне, але плаваў горш. І ўсё-такі ён паплыў.

– І дзе ён знойдзе тую ў такіх хвалях?! – сказаў я.

– Венька знойдзе! – усклікнула Янька і так зірнула на мяне, што я адразу ж змоўк. А Венька тым часам ужо плыў пасярэдзіне ракі, азіраўся туды-сюды, гойдаўся на хвалях, а потым памахаў нам рукой і пачаў плысці да берага. Яго зносіла. Мы пайшлі па беразе. Веньку прынесла да пясчанай выспы. Хістаючыся, ён выйшаў на бераг. Шчаслівая ўсмешка блукала па яго твары. У левай руцэ ён трымаў ледзь жывую ластаўку.

Мы хуценька развялі вогнішча, балазе было побач многа сухіх хваёвых галін, або, як у нас кажуць, ласу. Абсушылі ластаўку, а потым Венька асцярожна засунуў яе ў гняздо-нару.

– Маладая яшчэ. Крыллі слабенькія, вось і ўпала, – сказаў ён.

У школе мы з Венькам гулялі ў валейбол, нават ездзілі на раённыя спаборніцтвы. Кожнае лета працавалі ў калгасе. Не адзін раз Янька была ў нашым доме. Маці шыла ёй сукенкі. Была яна і ў Венькі. Памагала аднойчы Венькавай маці чысціць рыбу. Успамінаю цяпер, як яна сказала:

– Каб мне такую нявестку, нічога б у жыцці не хацела.

Янька сарамліва апусціла вочы, а потым адказала:

– У вас лепшая будзе.

А гады не стрымаць! Бягуць як тая вада ў рэчцы. Мы з Янькай і азірнуцца не паспелі, як закончылі дзевяць класаў, а Венька атрымаў атэстат сталасці. Увосень яго забіралі ў армію. Сабраліся суседзі ў невялічкай Венькавай хатцы. Янька сядзела разам з Венькам у самым куце. Збоку зірнуць – жаніх і нявеста! Янька за гэтае лета стала сапраўднай прыгажуняй. Яна крыху папаўнела,

а доўгія чорныя валасы, якія густымі хвалямі падалі на плечы, прыдавалі ёй выгляд дарослай дзяўчыны.

Венька служыў далёка – на Сахаліне. Ён пісаў мне кароткія лісты, цікавіўся, што новага ў школе, у калгасе. Яньцы пісаў ён часцей, яно і зразумела, бо я быў проста яго сябар, а Янька...

Сумна і адзінока было мне без Венькі ў дзесятым класе. Я адчуваў, што кудысьці ў невядомае знікае маё дзяцінства. Ды і навука пачала давацца ўсё цяжэй і цяжэй. Многія мае аднакласнікі рыхтаваліся ў інстытут. Я аб ім нават і не думаў. Мне хацелася як мага хутчэй самому зарабляць грошы. Яшчэ зімой вырашыў – буду экскаватаршчыкам. Даведаўся ад нашага суседа, што яны добра зарабляюць, ды і вучыцца трэба было ўсяго адзін год.

У канцы вясны, якраз перад самымі экзаменамі ў школе, адбылася ў нашай вёсцы падзея, якой я радаваўся больш за ўсіх. Адразу ж аб ёй напісаў Веньку. А здарылася вось што: ажаніўся Радзікевіч Валодзя, той самы хлапец у гадах, які выдаваў вупраж на калгасным двары. Пайшла за яго даволі-такі прыгожая дзяўчына з Сівіцы. Пазней я даведаўся, што яна расла сіратой, многа гаравала ў дзяцінстве, а сама была вельмі добрай. Усе жанчыны ў нашай вёсцы вельмі здзівіліся. Два вечары стаялі пад вокнамі – глядзелі на маладую. Запрагалі найлепшых калгасных коней, нават мой Дэраш трапіў у вясельную кавалькаду, бо па маладую трэба было ехаць добрых дзесяць кіламетраў. Я таксама крыху пастаяў пад акном, глядзеў на шчаслівы твар Валодзі, і мне на імгненне здалося, што ён сам не верыць ва ўсё, што адбываецца навокал.

Венька ў адпачынак так і не прыехаў. Пасля школы я закончыў тэхнічнае вучылішча, пачаў працаваць на экскаватары. А Янька ўвесь гэты час вучылася ў Маскве на ўрача.

І вось як бывае ў жыцці! Дзесятага лістапада я адыходзіў у армію, і ў гэты ж дзень вярнуўся

Венька. Яго было не пазнаць: у вайсковым адзенні, увесь такі падцягнуты, з узмужнелым тварам. Але гэта быў Венька! Той самы Венька, з якім прайшлі самыя светлыя гады майго дзяцінства.

Мы пагаварылі гадзіны дзве – на больш не было часу. Маці паклала тое-сёе ў маю невялічкую спартыўную сумку, а Венька праводзіў мяне на станцыю. У нас з маці была дамова: ніколі нікога не праводзіць, тады будзе ўсё добра.

Я глядзеў на Веньку, і ў мяне было такое адчуванне, што больш яго не ўбачу. Я нават ледзь не заплакаў. А ён прыняў мой смутак зусім за іншае. Мне сапраўды было цяжка расставацца з маці, сваёй вёскай, рэчкай. Але ў тую хвіліну ў маім сэрцы пасялілася нядобрае прадчуванне... Ужо крануўся цягнік, а я, высунуўшыся з акна, усё глядзеў на Веньку. Ён стаяў на пероне, шырока ўсміхаўся і махаў мне рукой. Такім і запомніўся ён мне на ўсё жыццё.

Асабліва часта пісаў лісты Венька ў першы год маёй вайсковай службы. Ён па сабе ведаў, што гэта самы цяжкі год у жыцці салдата. І абавязкова я знаходзіў у канверце то прыгожую паштоўку, то фатаграфію. А пасля Новага года ён прыслаў мне цэлы пачак фотаздымкаў. На адным з іх я ўбачыў Веньку з Янькай. Яны сядзелі за навагоднім сталом, а побач стаяла ўпрыгожаная ёлка. На другім былі знятыя танцы ў нашым клубе. Кружыліся ў вальсе пары, а на пярэднім плане Венька з Янькай глядзелі проста на мяне: Янька смяялася, а Венька махаў мне рукой, як бы запрашаючы да сябе ў клуб.

Ён пісаў, што працуе шафёрам, завочна паступіў у Мінскі політэхнічны інстытут, а Янька ў будучым годзе будзе пераводзіцца ў Мінск. Праўда, пра вяселле ён нічога не пісаў, а я і не пытаўся – ім там лепш відаць, калі і што рабіць.

Час ляцеў. На трэцім годзе службы, тады яшчэ служылі па тры гады, я пачаў рыхтавацца ў інстытут. Пры нашым Доме афіцэраў адкрылі падрыхтоўчыя курсы. Бралі не ўсіх, але мне пашанцавала.

І вось урэшце наступіла такая доўгачаканая мая апошняя вайсковая вясна! Я напісаў Веньку, што буду ў Мінску ў канцы ліпеня, а мо яшчэ і раней. Але праляцеў чэрвень, пачаўся ліпень, а ад Венькі не было ніякіх звестак. Гэта было на яго не падобна. Аднак я думаў, што ён чакае мяне з дня на дзень, вось і не піша. А мо ў якую далёкую камандзіроўку паехаў. Ды мала што магло здарыцца.

Я ехаў паступаць у політэхнічны інстытут на той факультэт, дзе вучыўся Венька. Па дарозе рашыў заехаць на дзянёк дамоў, бо вельмі хацелася ўбачыць маці, пагаварыць з Венькам.

Вечарам цягнік спыніўся на нашай невялічкай станцыі. Знаёмай сцяжынкай, якая вілася ў сасновым бары, ледзь не подбегам я шыбаваў у сваю вёску. Вось ужо паказаліся зарачанскія хаты, а там за невялікай рачулкай і нашы Сукневічы.

І тут убачыў Венькаву хату. “Забягу на хвілінку, – вырашыў я, – а потым дамоў”. Венькава маці сустрэла мяне на падворышчы. У першае імгненне я ледзь яе пазнаў. “Як яна пастарэла за тры гады, – падумаў я, – ні адной цёмнай валасінкі на галаве”.

– Міша?! – са здзіўленнем сказала яна і паволі апусціла вядро на зямлю.

Ласкава глядзелі на мяне яе засмучаныя вочы. Мы павіталіся.

– Вось маці твая ўзрадуецца! Адслужыў?

– Не зусім яшчэ. Паступаю ў інстытут. Вось калі здам экзамены, то застануся.

– Што ж мы стаім? Хадзем у хату.

– Не, не! Я толькі на хвілінку! Заўтра раніцай павінен быць у Мінску. А дзе Венька? Апошнія месяцы нічога мне не пісаў.

– Няма Венькі, – ціха сказала яна і села за невялічкі столік пад маладой вішняй.

– У камандзіроўцы?

– Пахавалі яго дзесятага чэрвеня, а табе не пісалі, бо ведалі, што ў інстытут рыхтуешся.

– Ён што – разбіўся на машыне? – шэптам спытаў я і прысеў за столік насупраць яе.

– Не, – яна ўздыхнула. – Веня акуратна ездзіў. Застрэліўся з ружжа...

Яна гаварыла ціха, нават не плакала, бо ўжо даўно не было слёз, а вочы глядзелі неяк абыякава, бяздумна.

– Яны ж збіраліся пажаніцца. Нават заяву падалі, мы пачалі думаць пра вяселле, а тут Янька прыслала пісьмо. Веня прачытаў і ...

– Што было ў пісьме?

– Янька пісала, што перадумала, за Веньку не пойдзе, бо кахала яго толькі ў школе, ну і яшчэ там... Два лісты было спісана.

– У яе быў хлопец у Маскве?

– Быў. Мы так нічога б і не ведалі, але якраз у адным доме, разам з цёткай Янькі, жывуць Быкоўскія. Яны тутэйшыя, але ў Маскве жывуць даўно. Вось яны мне і расказалі, што Янька пазнаёмілася з унукам вядомага акадэміка. Яны не раз бачылі, як ён падвозіў Яньку дамоў на “Волзе”. Але замуж не браў. Тады Янька сказала таму хлопцу, што будзе выходзіць за Веньку, заява ляжыць у загсе. Гэта ўсё і рашыла. Іх адразу ж распісалі. Янька ў пісьме так і напісала: я выйшла замуж за Вадзіка. А Веня, сынок мой... – яна змахнула дзве слязінкі са шчок. – Хоць бы мяне пашкадаваў! Ці ж дзяўчат мала на свеце?!

– Ах, Янька! – усклікнуў я. – Думаеце, яна шчаслівa будзе? Вось пабачыце? Пажыве ў Маскве ад Куцці да Каляд!

Я падняўся з-за століка.

– Міша, заходзь калі-нікалі, добра? Усё ж мне лягчэй будзе. Такі цяжар на душы – свет нямілы.

Я ішоў дамоў, а радасці на душы не адчуваў. Вось і знаёмыя кладка праз рэчку, тыя ж дошкі... Крыху далей убачыў нахіленую вярбу. Пад ёй пазнаёміўся з Венькам. Яна стаіць і цяпер, а яго ўжо няма...

Прагаварылі з маці да поўначы, а раніцай я паехаў у Мінск. Цяжка было здаваць экзамены. Выцягнуў білет, рыхтуюся, а з ліста паперы глядзіць на мяне Венька...

Але здаў. Год правучыўся на стацыянары, а потым перавёўся на завочнае. Жыў у вёсцы з маці, працаваў механікам на кар'еры. Побач з нашай вёскай, ля самай Віліі, пабудавалі цагельны завод.

У першыя гады Янька не прыязджала нават да бацькоў, а мне тады вельмі хацелася зірнуць у яе вочы. Я так яе ўзненавідзеў, што нават сам спалохаўся. І вось цяпер, калі прайшло столькі гадоў, яна зачасціла ў нашу вёску. Амаль кожную пятніцу прязджала з Мінска, бо даўно памяняла маскоўскую кватэру, каб быць бліжэй да бацькоў. Мне здалося, што ў апошні час яна наўмысна стараецца як мага часцей трапляць мне на вочы.

У гэтую суботу я застаўся адзін у доме. Учора адправіў маці ў санаторый. Яна хоць і была на пенсіі, але яшчэ працавала ў калгасе, і ёй далі пуцёўку ў Лётцы, гэта ля Віцебска.

А на двары гаспадарыў ліпень – макаўка лета. Стаяла цяплынь. Вечарам я сядзеў дома, перабіраў вуды, рыхтаваўся раніцай на рыбалку, як раптам пачуўся грукат у сенцах, потым пастукалі.

– Заходзьце!

Дзверы адчыніліся. На парозе ўбачыў Яньку.

– Добры вечар!

Ад здзіўлення я аслупянеў, нават не адказаў на прывітанне, а ўсё глядзеў на яе і не верыў сваім вачам.

Янька моўчкі стаяла ля парога.

– Праходзь, – ціха сказаў я.

Мы прайшлі з кухні ў другі пакой. Янька села на канапу, а я стаў ля печкі.

– Прабач, што заявілася няпрошанай госцяй. Я даўно хацела пагаварыць з табой, але ты абыходзіш мяне...

– Быццам ты не ведаеш, за што! – перабіў я яе.

– Ведаю, але ж я не думала, што так здарыцца. У цяперашні час, калі ўсе такія...

– А Венька быў не такі! Ён кахаў цябе, разумееш? Кахаў! І хаця пражыў мала, але быў шчаслівы,

бо да яго прыйшло гэтае святое пачуццё. Але чаго ты ад мяне хочаш?! Прыйшлі прасіць прабачэння за Веньку?

– Не ведаю, – ціха адказала яна. – Так цяжка стала на душы, асабліва ў апошнія гады. Месца сабе не знаходжу.

– Я табе не поп, каб адпускаць твае грахі. Пакутуй цяпер! І не выпрасіць табе прабачэння ні ў Венькавай маці, ні ў самога Бога! Будзеш несці гэты цяжкі крыж да самай магілы.

– Міша, у жыцці ўсё можа быць. А як кідаюць хлопцы цяжарных дзяўчат? І нічога – жывуць жа неяк, родзяць, не вешаюцца.

– Жывуць! Толькі не прыкідвайся святой! Ты ж ведала, што Венька на мурашку ў лесе баяўся наступіць! Шкадаваў кожную травінку, кожную кветачку! Ледзь што – у яго слёзы на вачах!

– Што ж мне было рабіць, калі я пакахала Вадзіка?

– Прыехаць да Венькі, паглядзець яму ў вочы і ўсё расказаць. Але ж Вадзік цябе не браў, вось ты і рашыла раззлаваць яго – падала заяву з Венькам!

– Няпраўда!

– Праўда! Табе ж хацелася на чорнай "Волзе" катацца!

– Каб жа я ведала, што Венька на такое можа рашыцца, я б пешшу з Масквы прыйшла да яго! Чаму ты мне не верыш?!

На вачах у Янькі паказаліся слёзы. Яна дастала з сумачкі насоўку.

– Што ж мне цяпер рабіць? – скрозь слёзы спыталася яна.

– Не ведаю, – ціха адказаў я.

Мы замоўклі. За расчыненым акном апускалася на стомленую зямлю кароткая летняя ноч. Непрыкметна, быццам крадучыся, запаўзаў у пакой змрок.

– Вось і пагаварылі, – узнімаючыся з канапы, сказала Янька. – Думала, хоць ты зразумееш мяне. Мы ж вучыліся разам... – І ўжо ля веснічак спытала:

– Міша, чаму ты не жэнішся?

– Не ведаю. Так усё складваецца...

– Ну што ж – пайду. Дабранач табе!

– Дабранач!

Ужо даўно яе постаць растала ў змроку летняй ночы, а я ўсё стаяў, глядзеў на апусцелую вуліцу, удыхаў настоенае на духмяных травах паветра і думаў пра наша жыццё, такое кароткае і складанае.

## Бабуліна нявеста

– Божа ж мой, Божа, дарагі мой унучак, ты так пастарэў на той Чукотцы! Табе ўсяго трыццаць сем гадкоў, а выглядаеш на ўсе сорак з гакам.

– Нічога, папраўлюся, – адказаў я, беручыся за сёмы блін. – Пап'ю з тыдзень малачка, паем смятанкі, адразу памаладзею.

– Даў бы Бог! Ты зусім там звольніўся, ці як?

– Адпачынак узяў са звальненнем.

– Або, дык што ж гэта?! І зноў паедзеш?

– Нікуды не паеду. Адгуляю адпачынак, а потым буду працаваць.

– Я ў гэты год надта занядужала. Дзевяты дзесятак пайшоў, час і паміраць.

– Аб гэтым і не думай. Я табе жэньшэнь прывёз. Будзеш яго піць ды сіл набірацца.

Я дастаў з рукзака бутэльку з настоем і перадаў бабулі.

– Мне адзін таварыш перадаў. Вялікую сілу мае гэты корань.

– У маіх гадах ніякі корань не паможа. Няхай будзе, калі прывёз.

– Бліны надта смачныя, даўно такіх не каштаваў.

– Ты еш, у мяне іх шмат.

– Не, больш не магу. Шчыра дзякую.

– Чайку папі. На рамонку завараны, – яна памкнулася падняцца, каб наліць з чайніка, але я апярэдзіў яе.

– Сядай, сядай! Усё сам вазьму. Яшчэ не хапала, каб у восемдзесят два гады скакала каля мяне.

Чай быў цудоўны. Я смакаваў яго маленькімі глыточкамі і глядзеў на бабулю. За два апошнія гады яна вельмі схуднела, зрабілася маленькая, як бы ўсохлася, і рухалася павольна – так ходзяць пасля хваробы. Бабуля сядзела ля акна, паклаўшы рукі на фартух, і няспешна апавядала мне вясковыя навіны.

– Я вось тут думала: чаму ты такі гаротны і няшчасны? Вандруеш па белым свеце: ні жонкі ў цябе, ні дзетак, ні кватэры.

Я цяжка ўздыхнуў і маўчаў. Сам пра гэта не раз думаў, чаму маё жыццё ідзе неяк не так. І, галоўнае, усё разумеў, як яно павінна быць, ды нічога не мог зрабіць.

– А ў нас, – працягвала яна, – людзі так жывуць – машыны купляюць. І без тваіх заробкаў. У цябе ж немаведама куды грошы дзяюцца. І, здаецца, не п'еш, а раскідваеш то туды, то сюды. Наша Залессе, як казаў адзін чалавек, – залатое дно. І лес табе, і рэчка, і дзяўчаты – як кветкі.

Я адчуваў, што зараз яна завядзе гутарку пра жаніцьбу, і, каб неяк перайначыць размову, спытаў:

– Дык, гаворыш, машыны купляюць?

– Але, вось гэтай вясной Загонскія купілі. Хто б мог падумць, што іх Толя, такі малы, крываногі, будзе на машыне ездзіць і капялюш насіць?

– А дзе ж ён робіць?

– На камбінаце, што каля ракі пабудавалі. У начальніках ходзіць. На нейкіх курсах пабыў і на табе – пры гальштуку. А ты пяць гадкоў у Петраградзе галаву сушыў, і загналі на край свету. Знаеш, што я тут усё думала? Можа, і табе легкавушку купіць, га? Ці хопіць у цябе грошай?

– Хопіць, і застанецца. Але ты раней мне забараняла.

– Яно так, карысці з яе мала, адзін клопат, але ж завідкі бяруць: недалыгі купляюць, а ў цябе няма. Ды і ажаніцца табе дапамагла б.

“Вось табе і на, – падумаў я, – ніяк не адкруцішся, ну і бабуля”.

– Але ж цяпер чарга на іх, няўжо нельга, каб усім хапала?

– Можна, але дарог добрых няма, ды і станцый абслугоўвання не хапае. Мне выдзелілі на рабоце, дзён праз дзесяць прыганю.

– Вось і добра! – узрадаваўшыся, сказала яна. – Што ж ты маўчаў?

– Боязна было. І зноў думаў – будзеш на мяне сварыцца, што грошы не на карысць пускаю. Але мы з табою зробім так: няхай пабудзе гадок-другі, а там пабачым – калі што, то прададзім, ды ўсё.

– А я тут малілася за цябе. Пакуль хапала сіл, кожную нядзелю ў царкву хадзіла. Пастаўлю свечачку і прашу ў Бога, каб даў табе моцнае здароўе ды паслаў добрую нявесту.

Бедная мая бабулька! Мне так стала шкада яе, што я ледзь стрымаў слёзы.

– Ну, ці пачуў Бог твае малітвы?

– А як жа! Ты вось здаровы, так?

– Што праўда то праўда, не магу паскардзіцца.

– Ну вось, а цяпер слухай, што табе скажу. Я ж табе нявесту маю, ды такую прыгожую, што тая царэўна-лебедзь.

– Так-так, гэта ўжо цікава. Як жа табе пашанцавала знайсці?

– Ты вось паслухай, мне самой проста дзіва. Летась увосень гэта здарылася. Нядзелька якраз была. Схадзіла я ў царкву, памалілася, а ноччу прыснілася мне, што вельмі прыгожая птушка разпораз стукаецца ў маё акно. На паўліна падобная, такіх я і ў кніжках не бачыла. А гэта такі знак, што хтосьці ў хату прыб’ецца, вось... Пра гэта ўсе ведаюць. Стала я чакаць. І што ж ты думаеш? Дзесьці так праз тыдзень раптам чую – пастукалі ў дзверы. Не паспела я запрасіць, як на парозе з’явілася маладая дзяўчына, ды так прыветліва зірнула на мяне і гаворыць: “Добры вечар! Бабулька, я новая настаўніца. Ці можна да вас на кватэру?” А я гляджу на яе і слова не магу вымавіць.

“Чаму ж не можна, – гавару ей, – адна жыву, а хата на два канцы, выбірай любую палавіну”. Пасялілася яна ў мяне. Сама з Ленінграда, ды такая прыгожая, добрая і дзецям у школе падабаецца. А пра цябе сама спытала. Убачыла на сценцы тваю картачку, а пасля альбом папрасіла. Праўда, ты наказваў нікому не даваць, але ж як тут не дасі?! І ведаеш, што я прыкмеціла? Яна надта табой зацікавілася.

– Чым жа я мог яе зацікавіць? – з усмешкай спытаў я.

– Не ведаю. Толькі не думай, што пачала цябе расхвальваць ды ёй падсоўваць. Аб жаніцьбе я ні слова не вымавіла. Не такая я дурная. Праўда, аднойчы яна спытала, чаму ты не жанаты.

– І што ты сказала?

– Выклала ўсё як ёсць. Не сустрэў ён сваё шчасце, а абы з кім жыць не хоча.

– А яна што?

– Што ж яна? Усміхнулася, ды гаворыць: “Тут штосьці не так, бабулька”. А як тваё пісьмо прыходзіць, то абавязкова спытае, што ты пішаш. Мне чытаць надта цяжка. Нават праз акуляры літары ледзьве бачу. Аднойчы яна папрасіла: “Давайце я вам буду чытаць”. А пасля адпісваць пачала. Я дыктую, а яна піша.

– Вось яно што-о-о, – працягнуў я. – Раней жа магазіншчыца Зоська пісала, а тут бачу – апошнія месяцы зусім другі почырк. А чаму ж ты пра яе не напісала?

– Баялася, што не прыедзеш. Ты ж дзяўчат цураешся як полымя. Клічуць яе Наташа. Яшчэ яна вершы складае. У газетах друкуюць. А хлопцы за ёй гужам! З усіх вёсак пруцца да нас на танцы, нават са Смаргоні прыязджаюць, каб на яе паглядзець.

– І каго ж яна выбрала? Пэўна, хтосьці праводзіць да дому?

– Ніхто! Ніводны з іх ёй не падабаецца. Тут Карнееў сын, Сашка, ты не ведаеш яго, ён малы

быў, як ты на танцы бегаў, зараз у інстытуце вучыцца апошні год. Так за ёй улягаў! І бацькі яго, вось ужо хітрыя, дужа налягалі на яе. А яна яго так адвадзіла, што больш не прыязджае. Цяпер глядзі сам. Гэтую дзяўчыну страціць грэх, вось што я табе скажу. Няхай ты пакрыўдзішся на мяне, але ж сам разважай – жаніцца трэба. Я вось тут загаварыла цябе, можа, спаць хочаш, га?

– Высплюся яшчэ, часу хопіць.

– І ў каго ты ўдаўся? Проста не ведаю. Дзед твой, мой Міхась, царства яму нябеснае, такі ўжо быў сарвігалава... Як успомню яго выбрыкі, аж цяпер дзіўлюся. Я за яго ніколі б не пайшла. Папершае, што ён маладзейшы быў за мяне, а падругое – расточкам, бядак, не выйшаў. Але голас меў... Як завядзе – куды там цяперашнім спевакам! На танцах, бывала, просяць яго, каб заспяваў. Старыя і малыя прыходзілі слухаць. А ён усё на мяне паглядаў. Я ж прыгожая была. Праўда, што ты ўсміхаешся? Тут прыехаў якраз у адпачынак адзін наш хлопец, у гусарах служыў. З пяром ды з шабляй. Праводзіць аднойчы мяне дадому... Як цяпер помню: ночка ясная, месяц аж заходзіцца... Толькі падышлі да могільніка, як глядзь – нейкая здань на нас ідзе: уся ў белым. Як далі мы драпака! Гусар спачатку мяне за руку трымаў, а потым глядзіць, што я збегчыся з ім не магу, кінуў мяне, а сам наўцёкі, толькі шабля брынчыць. А ў мяне ногі адняліся, не магу больш і кроку ступіць, прысела ля дарогі, галаву рукамі абхапіла і ўся калачуся, як асінавы лісток... Чую – нехта падышоў да мяне і гаворыць: "Наташка, гэта ж я, не бойся". Ледзь павярнула галаву, а побач Мішка стаіць і прасціну ў руках трымае. Бадай ты праваліўся! Так раззлавалася, а ён смяецца. "Хадзем, – кажа мне, – можа, шаблю з пяром знойдзем". Вось, які ён быў!

– Ну а пасля што?

– Потым яшчэ цікавей было. Праз год сваты да мяне заявіліся. Бацька мой строгі быў. Як пачуў,

што яны зямлю мне даюць, то напусціўся: “Ідзі ды ідзі!” А жанішок нейкі дробненькі, сядзіць у куточку: ні лой ні масла... Губы такія ўжо тоўстыя, Божа ж мой, божа, як падумаю, што цалаваць яго прыйдзецца, аж мурашкі па спіне бегаюць. Сядзім мы гэта, гаворым, вокны адчыненыя, вечар такі ціхі, цёплы... І раптам чуем спеў. Я адразу пазнала – Мішкаў голас. Пэўна, даведаўся пра сватоў. Пад ліпамі стаў і спявае:

На зелёном ковре мы сидели,
Целовала Наташа меня...

І так мне шкада яго стала. Круцілася я круцілася, пасля выйшла на кухню, быццам вады папіць, а сама – раз ды ў акно. А праз два месяцы памерлі ў яго бацька і маці. Халера касіла тады людзей. Застаўся ён дома за гаспадара, ды дзве малыя сястрычкі на руках. Восень падышла. Вярталася я неяк з лесу праз поле, а ён арэ, бедненькі, больш ні душы. Так ён узрадаваўся, а ў мяне слёзы на вачах. У тую ж восень мы і ажаніліся. Бойкі быў твой дзед. А да цябе само шчасце ідзе, варта толькі рукі развесці.

– А дзе яна зараз?

– У Смаргонях, злёт нейкі ў іх, дні праз два прыедзе.

– Любая мая бабуля, – з горкай усмешкай сказаў я, – нічога з гэтага не будзе. Кланяцца не буду, ды і не пойдзе яна за мяне.

– Чаму гэта не пойдзе?! Што ж ты – крывы, сляпы ці гарбаты?!

– Застары для такой дзяўчыны.

– І як думаеш жыць?

– Вось адпачну крыху, а там будзе бачна, працаваць пачну. Карацей кажучы, па цячэнні буду плыць, прыб’е куды-небудзь. Вось такія планы.

– Ну і чакай! – са злосцю сказала яна, папраўляючы акуляры, – пакуль не прыб’ецца якая лахудра. Гарэлку будзе піць, курыць...

– Такога не будзе, не бойся.

– Ты бойся! Цяпер такія дзяўчаты пайшлі, асабліва па гарадах, што і п'юць, і курацць, і чорт ведае што вытвараюць. А каго такая можа нарадзіць, калі ўсё нутро пракурана? Толькі калеку!

– Дык Наташа таксама з горада, – хуценька сказаў я.

– Але з Ленінграда, а там людзі надта добрыя, хто ні з'ездзіць, проста дзіву даюцца. Бедныя людцы, такога гора хапілі ў вайну. Яна не курыць, не п'е і нават не фарбуецца.

Я ўсміхнуўся і нічога не адказаў.

– Дарэмна смяешся.

– Ну і ну! – працягнуў я, – поўная інфармацыя.

– А што?! – здзівілася бабуля, – праўду табе кажу. Я няхай і аслепла трохі, але яшчэ бачу, вось так... Добра, што ўспомніла. Тут Сымоніхі ўнук, Саша, месяц як з арміі прыйшоў, і адразу жаніцца. Божа ж мой, Божа, як забегалі ўсе сваякі!

– Што, маладая дрэнная?

– Не, так сабе, зграбная дзяўчына, але яму ўсяго дваццаць гадкоў. Хацелі, каб пагуляў яшчэ. А ён як заўпарціўся – хоць ты што! Ажно млее, бядак. Яны яму і так і сяк, папрацуй, адпачні, разгледзься, а ён ім кажа: "Хочаце, каб застаўся без жонкі, як Міхайліхі ўнук?!" Бачыш, што прыдумаў!

– А адкуль ён мяне знае? – здзівіўся я.

– Або, ты ж у гэтага валейбола даваў: і ў раёне, і ў вобласці, і тут каля клуба. А малыя ж глядзяць на такіх, запамінаюць.

– Ну, а бацькі што?

– Крыху падумалі ды згадзіліся. А што ж зробіш? Такога козыра ім падкінуў, што і біць няма чым.

– Вось бачыш, бабуля: я хоць і стары халасцяк, а карысць прыношу людзям.

– Але, – усміхнулася яна, – памог ім ажаніцца. Яны і цяпер цябе спамінаюць, – бабуля зірнула на гадзіннік. – Няўжо дванаццаць? Ці я не бачу?

– За дзесяць хвілін.

– Ідзі адпачні крыху. З такой далечы прыехаў. А я на агарод гляну. На днях з Наташкай палолі. Вось дзяўчына, за што ні возьмецца – усё гарыць у руках. Проста не магу надзівіцца.

Няхай я і стаміўся з дарогі, але чамусьці доўга не мог заснуць. Знаёмы з далёкага дзяцінства пах падушкі ўсхваляваў да глыбіні душы. Не верылася, што зноў дома, у сваёй бабулі.

"Што ж я ляжу, вось дурань, на дварэ ліпень месяц", – падумаў я. Хуценька ўстаў і накіраваўся на раку. Ішоў ледзь прыкметнай сцяжынкай, якая вілася паміж маладымі бярозкамі. Яшчэ здалёку адчуў дурманлівы пах: сухога аеру, сена, змешанага са смалянiстым духам соснаў. Даўно я не ўдыхаў такога смачнага паветра.

А вось і Вялля! Недарэмна так калісьці празвалі яе нашы далёкія продкі. Як гарэза-дзяўчына, яна любіць падшуткаваць і давесці да роспачы незнаёмага падарожніка. То забяжыць наперад, то тут жа вяртаецца назад, схаваўшыся ў сасновым бары. А потым павольна цячэ праз лугі, дзе стаяць, як вартавыя, моцныя дубы. Глядзяць яны на гарэзлівасць сваёй прыгажуні і не налюбуюцца ёю ўжо колькі гадоў.

У мяне было сваё месца пад адным з такіх дубоў. Я распрануўся, паспрабаваў ваду і паплыў. І адразу ж адчуў на сабе чэпкія абдымкі. Доўга яна не выпускала мяне, а потым, нагуляўшыся ўдосталь, прынесла да пясчанай выспы, акацiла напаследак раз-другі хваляй і адхлынула: "Ох і стамілася я!"

Я ляжаў на гарачым пяску і глядзеў у неба. Самотна было на душы, неспакойна. Кожны раз, калі я глядзеў на такія рухавыя хмаркі, мне ўспаміналася маё дзяцінства, наша школа. Як хутка бягуць гады! Здаецца, толькі ўчора хадзіў у школу, а ўжо прайшло дваццаць гадоў. Падумаць – і то жахліва. А тут яшчэ пажар адзіноцтва. Усё кагосьці шукаў, спадзяваўся... Вышукваў розныя прычыны і знаходзіў іх. Праўду гаворыць мая бабуля: "Як чалавек дурны, дык няшчасны".

Самы большы жах наганялі на мяне мае гады. Каб быў жанаты, былі дзеці, то не так востра іх адчуваў бы.

Вечарам прыйшоў дадому. Бабулі не было, напэўна, падалася да Сымоніхі. Я сеў ля расчыненага акна і глядзеў на сад. Якраз насупраць расла вялікая груша-дзічка. У дзяцінстве, зусім малечы, мне падабалася пад ёй збіраць грушы. Яна амаль што не змянілася за трыццаць гадоў. Ціха рыпнулі дзверы. Я павярнуў галаву і ўбачыў дзяўчыну ў белай сукенцы, з сумачкай у руках.

– Добры вечар! – прывіталася яна.

– Добры вечар! А бабулі няма, дзесьці на сяло сышла.

Яна ўсміхнулася і падышла бліжэй. Белыя валасы рассыпаліся па плячах. І адразу ж спякота разлілася ў маіх грудзях.

– Я тут жыву, – прамовіла яна, – а вы, напэўна, прыляцелі з Чукоткі, бабулін унук?

Я глядзеў на яе і не мог вымавіць ні слова.

– Што вы так угледзеліся? – проста спытала яна.

– Першы раз у жыцці бачу такую дзяўчыну. Такія вочы, як васількі, нават не верыцца, што такія бываюць.

– І вы ўсім так гаворыце?

Я не паспеў адказаць, як у дзвярах паказалася бабуля.

– Вось як зрабіла, – адразу ж з парога пачала яна, – дома поўна гасцей, а я на сяло зляцела. Калі ты прыехала, Наташа?

– Толькі што зайшла.

– Вось пазнаёмся, гэта мой гаротны ўнук Сярожа, якому мы пісьмы пісалі.

Дзяўчына падала мне руку і сказала:

– Наташа.

Я моўчкі асцярожна пацiснуў яе маленькую далонь.

– Зараз зробім госці, – весела прамовіла бабуля, – пайду згатую што-небудзь.

– Мы самі, – запярэчыла Наташа.

– Ну хоць крыху памагу, – не здавалася бабуля.

Праз некалькі хвілін стол быў гатовы. Я дастаў бутэльку шампанскага і бутэльку “Бальзаму”. З трэскам вылецеў корак. Я напоўніў фужэры.

– Ну, бабуля, – звярнулася Наташа, – вам слова.

– Божа ж мой, Божа, дарагія мае дзеці, – бабуля хуценька выцерла фартухом слёзы. – Будзьце здаровыя ды шчаслівыя.

Мы выпілі.

– Але ж нейкае кіслае, напэўна, слабое? – запытала бабуля.

– Ёсць крыху мацнейшае, – сказаў я, адкаркоўваючы бутэльку. – “Бальзам”, на многіх травах настоены.

– Пэўна, дарагі?! – устрывожана спытала бабуля.

– Мы таксама не бедныя, давайце паспытаем.

Мы зноў выпілі.

– Мацнейшы за гарэлку, аж галава кругам пайшла, – бабуля адмахнулася хустачкай.

Наташа амаль не піла. Толькі паспытала крыху. Бабуля гэта прыкмеціла.

– Выпі, Наташа, ён жа на травах зроблены.

– Я ж зусім не п’ю, а раніцай у Гродна ехаць, канферэнцыя ў нас. Ды і даклад трэба закончыць. Сярожа, – працягвала яна, – друкарская машынка ў мяне, можа, патрэбна?

– Сёння – не, а вось заўтра... – мне не хацелася гаварыць, але было позна. Бабуля была тут як тут.

– Ён жа нешта ўсё піша, – прамовіла яна, звяртаючыся да Наташы. – Але ж толку няма.

– Апавяданні ці вершы? – спытала Наташа.

– Нічога я не пішу, гэта ўсё бабуля выдумала.

– А Наташыны вершы друкуюць, нават грошы прысылаюць. Я яму колькі разоў гаварыла: не губляй марна час, бо пісьменнікам трэба нарадзіцца. Што ні дашле – усё назад вяртаюць, бо сваіх пісак многа.

– Ці можна што-небудзь прачытаць з рукапісаў? – настойліва дапытвалася Наташа.

Бабуля і тут апярэдзіла мяне.

– Або, у яго поўны чамадан, за месяц не прачытаеш. Але надта галава штосьці павяла. Пайду я прылягу.

Выходзячы, яна непрыкметна штурханула мяне ў бок.

Я наліў шампанскага.

– Ой, болей не буду, а то зусім ап'янею, ды і працаваць яшчэ трэба.

– Што ж, не буду затрымліваць, – заўважыў я...

– Я машынку зараз прынясу, – прамовіла Наташа.

– Я памагу.

Яна ўсміхнулася, і мы пайшлі ў яе пакой.

Старанна прыбраны ложак, на якім красаваліся тры падушкі. Паліца з кнігамі, а на стале стаяла фатаграфія ў драўлянай рамачцы, з якой глядзела маладая жанчына ў старадаўнім капелюшы. Я адразу ж пазнаў яе.

– Вось, Наташа, гэтую жанчыну я ведаю.

– І хто ж яна?

– Акторка, Елізавета Іванаўна Цімэ. Яе бацька быў прафесарам горнага інстытута ў Петраградзе. З-за яе нават дуэль была.

– Няўжо? І хто з кім біўся?

– Барон Урангель, у тыя гады студэнт, біўся на шпагах з нейкім паручнікам. Абодва параніліся, а Лізанька выйшла замуж зусім за іншага. Муж яе ў далейшым стаў вядомым навукоўцам, вынаходнікам аптычнага шкла. На Літаратурных мастках у Ленінградзе іх могілкі побач.

Наташа слухала мяне і, хітравата паглядваючы, усміхалася.

– Штосьці не так кажу?

– Усё так. Проста гэта мая бабуля.

– Вось табе і на! А я тут распінаюся. Адразу б казала!

– А навошта? Прыемна паслухаць пра сваю бабулю.

Тут пайшлі ўспаміны пра Ленінград – гэты цудоўны горад на зямлі. Так непрыкметна прагаварылі мы далёка за поўнач.

Нялёгка мне было пасля Чукоткі ў доме. Я ўсё варочаўся з боку на бок і ніяк не мог заснуць. Нават раззлаваўся на сябе. "Яшчэ падумае, што пачаў заляцацца да яе. Усё! Хопіць! А то пасля будзе цяжка забыць. Але ж якая яна прыгожая".

Раніцай Наташа паехала ў Гродна, а я праз колькі дзён адправіўся па машыну. Праз тры дні блакітная "Лада" стаяла на нашым двары, а я ўзяўся за будаўніцтва гаража. Пачаліся клопаты.

Наташы яшчэ не было. Прыслала бабулі паштоўку, што заехала да сваёй знаёмай. "Вось і добра, – думаў я, – пакуль яна прыедзе, што-небудзь прыдумаю". Мне хацелася з'ехаць на тыдзень-другі, але я не паспеў. Наташа з'явілася апоўдні. Я толькі хацеў пракаціцца да ракі і сустрэў яе на падворышчы.

– Сярожа, добры дзень! Чыя гэта такая цудоўная машына?

– Нават не пытайся. Купілі з бабуляй, а ездзіць ніхто не ўмее, – пажартаваў я.

– Я ўмею, нават правы ёсць! – весела прамовіла яна і некалькі разоў абышла машыну. – Ну і ну! Вось дык прыгажуня! Пракацімся калі-небудзь, толькі не сёння. Так стамілася – з ног падаю.

Яна пайшла ў хату, а я падаўся на Вяллю. Захацелася пабыць аднаму, каб вырашыць, як быць далей. Ведаў я адно патаемнае месца. Там, дзе некалі працякала рака, засталося невялікае возера, якое празвалі Калодаўкай. Адзін бераг быў высокі і круты: магутныя сосны цягнулі да сонца свае галіны. З самай вяршыні ўзгорка вельмі добра праглядвалася ўсё возера. Неяк вольна думалася тут, у гэтай цішыні, запоўненай смаляністым духам. Нават самому было боязна прызнацца, што ў апошні час усё болей пачалі лезці ў галаву думкі пра Наташу. Злаваўна сябе, добра ведаючы, што ў такіх гадах... Эх, што там казаць!

Раптам трэснула галінка, я павярнуў галаву і не паверыў сваім вачам. Перада мной стаяла Наташа ў спартыўным касцюме з кошыкам у руках.

– А мяне бабуля па шчаўе паслала, – весела прамовіла яна.

– Хто ж гэтаму паверыць? – усміхаючыся, адказаў я. – Кожны скажа – згаварыліся.

Наташа гарэзліва зірнула на мяне і села побач.

– Прыгожа тут, неяк таямнічна. Я і раней сюды прыходзіла.

– А я, бывала, як двоек у школе нахапаю, то адразу ж сюды. У самыя цяжкія хвіліны свайго жыцця бываю тут.

– Няўжо і цяпер двойку атрымаў? – спытала яна і зазірнула проста ў вочы.

– Бадай што так: жыццёвую двойку атрымаў.

– Непрыемнасць якая, ці што?

– "Каліну чырвоную" бачыла?

– Некалькі разоў, а што?

– Помніш, як у лазні Ягор, якога іграў Шукшын, казаў: "Сорак гадоў пражыў, а сказаць няма чаго". Так вось і я.

– Ну, можа, не сорак, а ўсяго трыццаць сем.

– Невялікая розніца.

Мы замоўклі.

– І бабуля мая пастарэла, хоць бы пажыла яшчэ крыху.

– Сярожа, а чаму ты не жанаты?

– Ні адной дзяўчыне не спадабаўся, – горка ўсміхнуўшыся, адказаў я.

– Няпраўда. Ні за што не паверу. Ты ж вучыўся ў Ленінградзе, пяць гадоў...

– Быў малады, кругом студэнткі... – перапыніў я яе.

"І чаго я злую, вось дурань!" Крыху памаўчаўшы, сказаў:

– Не ведаю. Пяць гадоў праляцелі як адзін дзень. Вучоба, трэніроўкі па валейболе. На чацвёртым курсе, пасля шасцімесячнай практыкі, сабраліся ўсёй групай. Многія нашы хлопцы пажаніліся: прыйшлі хто з жонкай, хто з нявестай. Як напрыводзілі

дзяўчат, ды такіх прыгожых, што я сядзеў знямелы. Ды што пра мяне казаць, – я махнуў рукой. – Правільна гаворыць мая бабуля: "Кончаны чалавек..." Лепш пра сябе раскажы. Як трапіла з такого горада ў нашу глухмень, ды яшчэ адна.

– Так атрымалася, – ціха прамовіла яна.

– Цяжка паверыць.

– Чаму? – яна зірнула на мяне і на імгненне затрымала свой позірк.

Я нават крыху збянтэжыўся.

– Такія прыгожыя, як ты, на першым курсе замуж выходзяць.

– Выйсці я магла...

Яна змоўкла і, схіліўшы галаву, аб чымсьці задумалася. Я таксама маўчаў, баючыся быць надакучлівым.

– Сярожа, можна мне хоць кропельку на машыне праехаць? Я зусім ціхенька, да шашы і назад.

Я дастаў ключы і падаў ёй.

– Яна твая. Толькі першы раз паедзем удваіх. Хачу пераканацца, што ты добры яздок.

– Мы заўсёды будзем удваіх, толькі я за рулём!

– Не, што ты?! Тут людзі пачнуць гаварыць, што стары пень заманьвае такую прыгажуню машынай. Катайся колькі захочаш, можаш нават на спатканне ездзіць.

– А я думала, мы на Нарач махнем, – пакрыўджана сказала яна.

– У любы час, хоць заўтра!

– Вось і цудоўна! – Наташа пляснула ў далоні. – А потым на Чорнае мора, га?!

– І на Чорнае мора, – сказаў я.

Наташа сапраўды добра кіравала машынай. Мы аб'ехалі з ёй усе навакольныя вёскі, а потым яна пачала ездзіць адна. Наташа нічога больш не расказвала пра сябе, але я душой адчуваў, што нездарма яна прыехала адна ў нашу вёску. Усё высветлілася перад нашым ад'ездам на Нарач.

Аднойчы вечарам я вяртаўся ад ракі. Яшчэ здалёку прыкмеціў чорную "Волгу", якая стаяла

каля нашай хаты. Сэрца закалацілася ў незразумелай трывозе. Не паспеў падысці, як з падворышча выйшлі двое і, сеўшы ў машыну, паехалі. Бабуля зачыняла браму.

– Што за госці, бабуля?

– І не пытайся. Па Наташу прыехалі. Вось так, мой ты ўнук дарагі.

Яна села на лаўку пад маладой вішняй і заплакала.

– Ну што за слёзы?! Лепш раскажы, хто прыязджаў.

– Бацька з сынам, з самага Ленінграда. Аказваецца, год назад мелася ў іх быць вяселле, ды нешта разляцелася, ці што – не ведаю. Адным словам – Наташа ўцякла ад іх.

– А дзе яна?

– Апоўдні села ў машыну і паехала. Я ж думала да Вяллі, цябе шукаць.

– Трэба было іх ў хату запрасіць. Хай бы Наташу пачакалі, пачаставала б з дарогі.

– Яшчэ чаго! Я іх адпэндзіла, ды ўсё! Хай самі яе шукаюць. Забіраюць яго нявесту, а ён, во як – пачаставала!

– Якую нявесту?! Хоць людзям не гавары, бо засмяюць.

– А я ім сказала, – бабуля ўсміхнулася.

– Што?

– Наташу не аддадзім, бо яна за майго ўнука замуж выходзіць.

– Ну, бабуля, такога ад цябе не чакаў. Куды яны паехалі?

– Да Вяллі, будуць рыбу лавіць.

Наташы доўга не было. Бабуля лягла спаць, а я ўсё сядзеў на лавачцы. “Толькі б у аварыю не трапіла”, – думаў я. Урэшце яна прыехала.

– Прабач, Сярожа, што так запазнілася. З адной настаўніцай па суніцы ездзілі. Паглядзі, колькі назбіралі, – яна дастала з багажніка кошык. – Ты нейкі сам не свой: машына цэлая, ні драпінкі, – з абурэннем прамовіла яна.

– Што машына, мне за цябе боязна. Тут вось якая справа, – сказаў я і цяжка ўздыхнуў. Мы селі на лаўку.

Наташа ўсхвалявана пазірала на мяне.

– Што-небудзь здарылася?

– Прыехалі тут па цябе.

– Хто?

– Твой жаніх с бацькам.

– Які жаніх?

– Ну, табе лепш ведаць. З Ленінграда прыехалі на "Волзе".

– А-а... – працягнула яна, – цяпер ведаю. І дзе яны?

– На Вяллі. Я іх не бачыў, бабуля з імі гутарыла, ты прабач ёй.

– А што?

– Так, не дужа ласкава іх сустрэла.

Наташ ўсміхнулася і нічога не адказала.

– Абавязкова схадзі да іх.

– Яшчэ чаго! Стамілася я, увесь дзень на сонцы.

Вечарам я яе не бачыў. "Вось і ўсё", – думаў я, лежачы на сене ў паветцы. І як сабе ні даказваў, што я і такі, і сякі, нічога не атрымлівалася. Уявіў сабе толькі на міг, што заўтра Наташы не будзе, і такая пустэча зрабілася на душы, як бы абарвалася штось.

Раніцай я сам гатаваў снеданне. У бабулі крыху разбалелася галава, але яна ўстала з ложка і сядзела ля акна, даючы мне парады, што і як рабіць. Я пёк бліны, якія мне вельмі падабаліся.

– І чаму ты такі баязлівы, мне так дзіўна, што проста не ведаю.

Я са здзіўленнем паглядзеў на бабулю.

– Наташу забіраюць, а табе хоць бы што.

– А-а, вось ты аб чым. Што зробіш?

– Яна б пайшла за цябе, каб ты пасватаўся. Вось паспрабуй.

– Бабуля, зразумей раз і назаўсёды: Наташа маладая, прыгожая, жаніх з "Волгай". Куды мне тут! Стаць на калені і прасіць, каб выйшла за мяне?!

– Ну, жыві як знаеш! Каяцца будзеш, ды позна будзе.

– Я б хоць сёння пад вянец, ды не па Сеньку шапка.

У гэты момант на кухню ўвайшла Наташа, у квяцістым халаціку, з распушчанымі валасамі.

– Добрай раніцы! Чаму мяне не разбудзілі. Сама напякла б бліноў.

Я адказаў вершамі:

Услон заняў сваё ўжо места,
На ім стаяла ражка цеста,
А апалонік то і дзела
У дзежцы боўтаў жвава-смела...

– Сярожа, а ў цябе спрытна атрымліваецца.

– Ён жа ўсё ўмее, сіратою вырас...

– Бабуля! Пабойся Бога, мне ж сорамна, бачыш: счырванеў.

Толькі пачалі снедаць, як праз акно ўбачылі чорную “Волгу”.

– Сустракай гасцей, Наташа, – сказаў я.

Яна выйшла на падворышча. Праз некалькі хвілін ужо клікала мяне. Я не крануўся з месца.

– Што ты сядзіш, як мяшок? – накінулася на мяне бабуля.

– Няхай самі разбіраюцца, што я ім – суддзя?

У гэты момант у дзвярах з’явілася Наташа.

– Бабуля, што ж гэта ў вас за ўнук, мяне забіраюць, а ён не абараняе?

– Або, – махнула рукой бабуля, – трасецца, як той заяц.

– Хадзем, Сярожа, я хачу, каб ты быў побач, – і так зірнула на мяне сваімі блакітнымі вачыма, што я адразу ж падняўся.

Каля машыны стаялі двое: хударлявы хлопец у джынсах і акулярах, а побач маленькі мужчына з салідным жыватом.

– Знаёмся, Сярожа. Гэта Ігар.

Хлопец моўчкі падаў мне руку.

– Яго бацька...

– Сан Саныч, – перабіў яе мужчына і моцна пацiснуў маю руку. – Давайце пад’едзем на раку, там і пагутарым. – Ён адчыніў дзверцы “Волгі”.

– У нас свая машына, – усміхнулася Наташа.

– Я не паеду...

– Чаму?! – са здзіўленнем спытала яна.

– Буду толькі замінаць, яны ж да цябе прыехалі.

– Ну і што?! Сядай.

– І не падумаю. Ты яго нявеста, а я хто?

– А ты дурань! – са злосцю сказала яна і накіравался да “Волгі”. Перад тым як сесці, яшчэ раз зірнула на мяне, потым дзверцы бразнулі, і машына рванула з месца.

Я стаяў як аглушаны. Было такое адчуванне, быццам толькі што адхапіў важкую поўху.

Тут і бабуля выйшла на ганак.

– Чаму ты не паехаў?

Я моўчкі глядзеў на яе.

– Што яна табе казала? – дапытвалася яна.

– Сказала, што я дурань.

– Правільна. Трэба было ехаць.

– Навошта?! Тут жа дурню відавочна, што я быў бы за падсадную качку.

– Ну, глядзі! – бабуля махнула рукой і пайшла ў хату.

Я круціўся туды-сюды, не знаходзячы сабе месца. Потым пайшоў да Вяллі. Цягнула мяне туды невядомая сіла. Апусціўшы галаву, ішоў, задумаўшыся, па беразе ракі, як раптам пачуў воклік:

– Вось добра, што сустрэў вас. Як гэта гаворыцца: на лаўца і звер бяжыць.

Я падняў галаву. Прада мной стаяў Сан Саныч.

– Хачу пагутарыць з вамі, – сказаў ён. – Размаўляў тут з вашай бабуляй, і яна паведаміла мне, што Наташа выходзіць за вас замуж.

– Які там замуж?! Тры тыдні як з Чукоткі прыехаў.

– Ну, на жаніцьбу, бывае, і трох дзён хапае. Я ў чужое жыццё ўлазіць не маю права, але Наташа нявеста Ігара, майго сына. Яны вучыліся разам, кватэру для іх пабудаваў у Ленінградзе, і вось – на табе, перад самым вяселлем уцякла ў вёску. Настаўніцай працуе. А яна журналістка.

Кнігу вершаў збіралася выпусціць. Мне што, ды Ігара шкада. Не можа без Наташы жыць, усё з рук валіцца. Маўклівы стаў, мы з жонкай спалохаліся: часам і рукі на сябе наложыць. Нейкі несучасны ён. У другіх па дзесяць дзяўчат, а ён – чорт яго знае.

– Я яму не перашкода, самі бачыце. Калі табе пад сорак, вельмі цяжка змагацца з маладымі, вось так...

– Ну, дзякуй вам, – сказаў Сан Саныч, – а то я спачатку крыху спужаўся – пасля бабуліных слоў.

– Няма за што, а бабулі прабачце.

– Можа, павячэраем разам? У нас французскі "Напалеон", не каштавалі?

– Не даводзілася, – холадна адказаў я.

– Ну што ж, не буду затрымліваць, – Сан Саныч працягнуў мне руку.

Я, не азіраючыся, пайшоў ад ракі ў Калодаўку.

Сядзеў на сваім любімым месцы і глядзеў на ваду, дзе плавалі жоўтыя і белыя ліліі. І так раптоўна пачаў адчуваць нейкую душэўную пустэчу, што стала жахліва. Добра ведаў, што Наташа скора можа выйсці замуж ці паехаць дадому, і ўсе ж з ёй было добра і спакойна. Калі яна побач, то я забываўся пра сваю адзіноту і жыццёвыя няўдачы. Дзесьці ў глыбіні душы свяцілася маленькім агеньчыкам надзея. Ужо пачало вечарэць, а мне не хацелася дадому. Пачуліся крокі. Я азірнуўся. Каля маладой бярозкі стаяла Наташа. Падышла моўчкі і села побач.

– Прабач, Сярожа, такога нагаварыла сёння.

– Усё правільна. Я сапраўды вялікі дурань. Ну, і як пагаварыла з Ігарам?

– Мы што, а вось вы з Сан Санычам аб чым гутарылі?

– Усе больш пра жыццё.

– А яшчэ?

– Яшчэ пра адну прыгожую дзяўчыну, якая ўцякла ад свайго жаніха.

– Так-так, гэта ўжо нават цікава, – яна падсела бліжэй да мяне.

– Нічога цікавага, забяруць цябе, і паедзеш на Чорнае мора, а потым у Ленінград, двухпакаёвая кватэра. Вось...

Наташа доўга моўчкі глядзела на мяне.

– Хадзем, а то бабуля турбавацца будзе.

"Ну што я такі за чалавек?! – думаў я, варочаючыся з боку на бок. – Можа, заўтра яе не будзе, а я як той баран: ні бэ, ні мэ. Дурню так і трэба. Эх, было не было!"

Я хуценька падняўся і выйшаў на двор. Ноч стаяла цёплая, ласкавая... Наташына акно выходзіла ў сад. Я зазірнуў. Гарэў начнічок. Наташа сядзела на ложку, укрыўшы ногі коўдрай, і штосьці пісала.

– Наташа, гэта я, не палохайся. Толькі некалькі слоў..

Яна падняла галаву і ўсміхнулася

– Ну-ну! Як у старых раманах – праз акно.

Праз хвіліну я ўжо быў ля яе ложка і, прыпаўшы на адно калена, прамовіў з адчаем:

– Не выходзь за Ігара! Прашу цябе і малю! Можаш за каго іншага, толькі не за яго!

– Не пайду, – прашаптала яна і пагладзіла, як дзіця, мяне па галаве.

– Толькі не думай, што я пра сябе дбаю. Проста...

– Проста ты нічога не разумееш, – перабіла яна мяне і нечакана пацалавала ў шчаку...

Амаль да самай раніцы размаўлялі мы з Наташай. Якая цудоўная была гэта ноч!

Бабуля захварэла пад вечар. Стала раптоўна ціснуць у грудзях, балела галава. Мы з Наташай не адыходзілі ад яе. Выклікалі доктара. Ён нічога сур'ёзнага не знайшоў, выпісаў лекі.

А раніцай прынеслі тэлеграму: "Мама захварэла. Прыязджай. Тата". Наташа хуценька сабралася і вечарам выехала ў Мінск, каб адтуль ляцець на самалёце ў Ленінград. Я праводзіў яе да аўтобуснага прыпынку.

На другі дзень бабуля ўжо пякла бліны.

– Што ж ты так?! Я і сам усё згатую, табе трэба вылежацца, – накінуўся я на яе.

– Ужо крыху адпусціла, толькі галава шуміць. А табе я вось што скажу: адпраўляйся ты ў Ленінград.

– Навошта?

– Да Наташы з'ездзіш, маці яе адведаеш. Я тут малінавае варэнне маю, журавіны, ды і корань гэты адвязі.

– Жэньшэнь?! Я табе яго прывёз.

– Нашто ён мне? Усе адно памру. А ў Наташы маці маладая, ёй жыць ды жыць! Вось убачыш, як яна ўзрадуецца.

– Дык я ж адраса не ведаю.

– У мяне ёсць.

Бабуля прынесла старадаўнюю шкатулку і стала перабіраць розныя паперы. Нарэшце адрас знайшоўся, і я перапісаў яго ў запісную кніжку.

Наташа жыла на праспекце Гагарына, недалёка ад парку Перамогі. Я доўга стаяў перад дзвярыма, а потым нясмела пазваніў. Пачуліся крокі, шчоўкнуў замок, дзверы адчыніліся. На парозе стаяла Наташа.

– Сярожа! Як добра, што ты прыехаў!

– Я жэньшэнь прыёз, бабуля прасіла перадаць.

– А маме ўжо лепш. Заходзь, я цябе пазнаёмлю.

## Лета ў Макаце

– Канчай дрыхнуць, прыехалі!

Сяргей пазяхае, расплюшчвае вочы і пазірае на Сашу: "Дзіўны ён без акуляраў, зусім на сябе не падобны".

– Дзе мы?

Саша надзеў акуляры і стаў звычайным.

– Дзе-дзе! У Макаце. Увесь атрад ужо выйшаў, – працягваў Сяргей, завязваючы рукзак.

– А тут што за соннае царства?! А ну, хутчэй! Ну і работнічкамі Бог надзяліў!

Гэта Таня Калмыкова – камісар нашага невялічкага студэцкага атрада “Гарняк”, накіраванага на будаўніцтва насоснай станцыі і газаправода “Бухара-Цэнтр”, прыкрыкнула так, для парадку. А наогул – прывабная, добрая, чымсьці падобная на артыстку Наталлю Варлей.

Студэнты выйшлі з вагона. Непадалёку – маленькі абшарпаны будынак вакзала, крыху далей ціснуцца адзін да аднаго домікі. Абапал ні кусціка, ні ўзгорка. Мёртвая, на першы погляд, зямля, як скура вярблюда, ляжала пад бязлітасным сонцам. Той-сёй азіраецца са здзіўленнем: як жа тут працаваць?

– Сапраўдная пустыня! – гаворыць Саша. – А яшчэ ж ехаць ды ехаць да месца!

Неўзабаве прыйшлі тры машыны, і студэнтаў павезлі на месца будучай работы. Там, ля баракаў, у месцы яшчэ больш бязлюдным і пустым, іх сустрэў прараб, чалавек з загарэлым маршчыністым тварам.

– Прыехалі, хлопцы! Даўненька чакаем вас. Хто ў вас за старшага?

Падышоў камандзір – Сцяпан Чарненка, пяцікурснік, ветэран будоўляў. Ажаніўся ў мінулым годзе, вяселле гулялі ўсім атрадам.

– Значыцца, так, – працягваў прараб, – жыллё для вас падрыхтавана, сталовую, праўда, крыху не закончылі. Ваша задача – закончыць земляныя работы і заліць фундамент. Работа цяжкая, але не капеечная. Сёння ўладкоўвайцеся, а заўтра і пачнеце.

Сяргею і Сашу дастаўся маленькі, але вельмі ўтульны пакойчык. І ўсё ж ажно да вечара давялося валэндацца: то распакоўваць няхітрыя прылады для кухні, то майстраваць у самім пакойчыку тумбачку, крыху падламанае крэсла.

Дзяўчаты тым часам гатавалі абед і вячэру. Іх было чацвёра, але хлопцы найбольш цікавіліся Таняй і Анэтай, бо Света і Зіна мелі жаніхоў і збіраліся замуж.

Увечары Сяргей ляжаў на ложку і глядзеў у зорнае неба. Хтосьці перабіраў струны гітары. Чуўся голас Тані ля вялікай мачты, якую яны днём устанавілі. "Сцяг, напэўна, умацоўвае", – падумаў ён.

Пазнаёміўся з ёй у гэтым годзе. І як раней не прыкмеціў? Тры гады правучыўся на горным факультэце. Яна займалася на факультэце радыёэлектронікі. Хаця дзе там убачыш! Вучоба ды трэніроўкі па футболе забіралі ўвесь час. Ды і ў шахматы хацелася згуляць: толькі што выканаў норму кандыдата ў майстры спорту. Нават сам не ведаў, што больш любіў – футбол ці шахматы. У дэканаце горнага факультэта паліцы трашчалі ад шматлікіх кубкаў, але па шахматах узнагарод не было. Увесь час перамагалі радыёэлектронікі. І вось у гэтым годзе дэкан даручыў Сяргею камплектаваць каманду.

– Каб кубак быў, зразумеў?!

У фінале сустрэліся з даўнімі сапернікамі. Гулялі на сямі дошках. Шэсць партый закончыліся ўнічыю. Цяпер усё залежала ад першай дошкі, на якой гуляў Сяргей. Яго праціўнік Салавейчык, выкладчык, сіваваты дзяцька, быў у маладосці майстрам спорту. Навокал сабралася многа балельшчыкаў. Вось тут Сяргей і ўбачыў Таню. Яго праціўнік надоўга задумаўся, а ён адкінуўся на спінку крэсла і падміргнуў гэтай прыгожай дзяўчыне. Яна паказала яму язык. Сяргею ўдалося выйграць партыю, а з ёю і кубак інстытута.

Потым Таня наладзіла разнос сваёй камандзе:

– Як вы змаглі прайграць. Гарнякі – гэта ж дубы...

А калі ўбачыла, як важна прайшоўся непадалёк Сяргей, дадала:

– Ходзяць задраўшы нос, аж глядзець прыкра!

Калі на спартыўным вечары капітанам уручалі кубкі, Сяргей падышоў да Тані.

– Дык хто ўсё-такі дубы?

– Пашэнціла дурням, яны і рады!

Тут яе запрасіў на танец нейкі хлопец, і яна пайшла з ім. З таго часу Сяргей шмат думаў пра яе, але шукаць, каб пазнаёміцца, не асмельваўся. І вось – разам трапілі ў адзін атрад!

Раніцай наступнага дня Сцяпан з Таняй размяркоўвалі ўсіх каго куды. Сяргея з Сашам адправілі грузіць цэмент на станцыю. Вазіў толькі адзін самазвал, таму больш хлопцаў не далі. Прыехалі, думалі, што цэмент у мяшках, а той уроссып. Накідвалі ў машыну шуфлямі. Пыл лез у вочы, вушы, не даваў дыхаць. Нават марлевыя павязкі не памагалі. Калі самазвал ад'язджаў, Саша доўга пляваўся.

– Гэта яна спецыльна за шахматы нас сюды накіравала...

– Трымайся, стары, каму ж, як не будучым гарнякам, грузіць?! – падбадзёрваў яго Сяргей.

– Падхопім сілікозік, вось пабачыш, – працягваў Саша.

Яны грузілі тры дні. Другія хлопцы з атрада капалі канавы, рабілі і ўстанаўлівалі арматуру. Катлаваны пад фундамент былі ўжо гатовыя. Капалі толькі там, дзе экскаватар не змог узяць. І ўсё ж дзяўбсці зямлю было лягчэй, чым грузіць цэмент, – не так пыльна. Праўда, пясок з глінай, ракушкамі і глеем таксама даваўся цяжка. Па ўсім было відаць – калісьці тут было мора. Вельмі паліла сонца. Прыйшла Анэта.Аказваецца, яна займалася ў медыцынскім і была ў атрадзе як урач, але памагала на кухні. Непрыкметная, з насцярожанымі сумнымі вачамі... Загадала ўсім апрануцца, асабліва ахоўваць галовы.

Ці здалося Сяргею, ці сапраўды, звяртаючыся да ўсіх, яна гаварыла як бы толькі для яго аднаго?

Пасля вячэры да Сяргея падышоў камандзір атрада.

– Сярожа, гавораць, што раней ты на экскаватары працаваў, праўда?

– Яшчэ да арміі. І на бульдозеры магу, а што, ёсць?

– Вунь там, бачыш, стаіць амаль ля самай дарогі. Прараб сказаў, што яго ў рамонт здаваць будуць, але яшчэ працаваць можна. Падыдзі заўтра і паглядзі. Сам бачыш, як хлопцы стамляюцца.

Паснедаўшы раней за ўсіх, Сяргей адправіўся да экскаватара. Маркотна ўткнуўшыся каўшом у зямлю, той нагадаў велізарнага жураўля. Сяргей абышоў навокал і рашыў пачаць з рухавіка. Праверыў масла, салярку, толькі вады было малавата. Пускач завёўся адразу. За ім неахвотна, як бы прачынаючыся ад сну, запрацаваў галоўны рухавік. Сяргей сеў за рычагі. З вялікай цяжкасцю ўдалося адарваць коўш ад зямлі. "Не хапае паветра, кампрэсар барахліць", – прыкінуў Сяргей. Крутануўся некалькі разоў і заглушыў, бо тэмпература вады адразу ж паднялася. Разабраў кампрэсар – так і ёсць, паляцелі пракладкі. Прысеў у цяньку ля каўша і нечакана... задрамаў. Праз сон адчуў, як нехта асцрожна дакрануўся да вуха губамі.

"Гадзюка!" – прамільгнула ў галаве. Здрыгануўся і ўбачыў вярблюда. "Вось чорт, як напужаў!" Вярблюд быў вялікі, аблезлы, двухгорбы, са званочкам на шыі. Ён абыякава глядзеў на Сяргея. І тут Сяргей убачыў Анэту.

– Так і ведала, – з вярблюдам бавішся. Нават пра абед забыў.

– Анэта, няўжо вадзічкі прынесла?

– Ну і вымазаўся: на каго ты падобны?!

– Праўда? А я думаю, чаго гэта вярблюд дзёру даў?

Анэта разаслала газету, дастала з сумкі хлеб, яйкі, соль, зялёныя стрэлкі цыбулі, каўбасу.

У тэрмасе быў халодны кампот. Сяргей піў доўга, прагна.

– Пачакай, адразу нельга.

Ён пачаў есці, а Анэта адкрыла фотаапарат.

– Вярблюдзік хаця і не прыгажун, але няхай будзе на памяць, – шчоўкнула некалькі разоў.

– Ты лепш мяне, Анэта!

– Давай, але ты брудннаваты! Экскаватар будзе працаваць? – яна прысела побач.

– Паспрабую наладзіць.

– Хлопцаў шкада. Усё рукамі давядзецца рабіць. Сёння ў праекце яшчэ семдзесят метраў траншэі знайшлі.

– Ты вось што, перадай, каб мне вады прынеслі, вядры тры.

– Добра, – яна сабрала рэшткі ежы і пайшла.

Да вечара Сяргей зрабіў кампрэсар, але засталося шмат работы па драбязе. І толькі праз два дні пад'ехаў да будаўнічай пляцоўкі. Усе хлопцы пакідалі рыдлёўкі і прагучала дружнае “Ура!”. Абступілі з усіх бакоў. Сяргей скочыў на зямлю.

– Чаго крычыце? Яшчэ невядома, ці запрацуе.

Але работа кранулася. За першы дзень прайшоў усяго метраў дзесяць. Спачатку цягавы канат лопнуў, потым рэдуктар загрукацеў – скончылася масла. Затое на наступны дзень трыццаць метраў былі за спінай. Хлопцы адразу рабілі апалубку і ўстанаўлівалі арматуру. Пусцілі бетонамяшалку.

Міналі дні, як дзве кроплі вады падобныя адзін на адзін: ні дожджыка, ні ветрыка. У нядзелю з'ездзілі на станцыю, там быў клуб – далі маленькі канцэрт і згулялі з мясцовымі хлопцамі ў валейбол.

Даймала спякота, асабліва ў кабіне экскаватара. Пасля работы балела галава, і Сяргей доўга не мог заснуць. Наступала ноч, але жаданага халадка не было. Густыя цёплыя масы паветра нерухома віселі над распаленымі за дзень пяскамі. І толькі ў канцы ліпеня, асабліва адвячоркамі, пачаў прабягаць вецярок. Амаль кожны вечар збіраліся ля вогнішча, спявалі пад гітару. Сяргей праз расчыненае акно чуў звонкі голас Тані, абрыўкі песень. Ён ляжаў на ложку і глядзеў у неба, дзе цэлымі суквеццямі спелых вішняў нерухома віселі зоркі.

Так, яму ўжо дваццаць шэсць – другім па дваццаць і меней. Не цягнула ўжо да вогнішча, да песень. Ён даўно адчуў, што жыве неяк не так. Імкнуўся пасля арміі ў інстытут і паступіў, а радасці на душы не было. Вучоба, трэніроўкі. Тры гады ў Ленінградзе – і ўсё адзін. Часам бывала страшна. Асабліва пакутліва праходзілі святы: не ведаў, куды сябе падзець. І дзяўчат сімпатычных процьма. “Не падабаюся я ім, ці што?” – думаў ён. Узяць хаця б Таню, усё жартуе...

Быццам згадаўшы яго думкі, Саша сказаў:

– Чуеш, Таня спявае? Дарэмна ты да яе заляцаешся.

– З чаго ты ўзяў?

– Ды бачыў я. Але ведай: ёсць у яе хлопец, фізік, кандыдат навук.

– Ну і што?

– Праўда, праўда. Дваццаць чатыры яму. Таня ад яго без памяці.

Больш яны не гаварылі пра Таню, але чамусьці ўвесь вечар Сяргею было прыкра на душы.

У першую нядзелю вырашылі зрабіць выхадны. Як віхор у пакой уварвалася Таня.

– Сяргей! Трэба вакол вогнішча пясочны вал зрабіць. Вецер увесь час дзьме, пясок нясе, і вогнішча гасне.

– Таня, не даеду я туды, далёка ўсё-такі.

– Скажы, што не хочаш!

– Хаця, – працягваў Сяргей, па-філасофску ўставіўшыся на столь, – можна паспрабаваць.

– Дык што ж трэба?

– Пацалуй мяне ў шчочку.

– А зробіш?

– Аб чым гаворка!

Яна хутка нахілілася і пацалавала яго, укусіўшы напаследак.

– Ты што?! – Сяргей аж падскочыў на ложку.

– Гэта на памяць, – яна ў момант двойчы сплюнула. – У салярцы ўвесь, мыцца трэба!

І хуценька выскачыла з пакоя.

У канцы дня вогнішча было абнесена двухметровым валам.

А калі Сяргей прыгнаў экскаватар назад і пачаў адчэпліваць тоўсты трос, той спружыніў, вырваўся, сцебануўшы па левай руцэ. Удар быў не моцны, але канцы сталёвых нітак паласнулі ад кісці да локця. "Толькі гэтага не хапала", – ён прыклаў насоўку, але яна праз хвіліну стала вільготнай. Пабег да барака, памыўся, пазваў са сталоўкі Сашу і з яго дапамогай наклаў павязку.

Позна вечарам з песнямі вярнуліся ад ракі хлопцы. Саша пайшоў да Анэты. Сяргей ляжаў на ложку. Рука не балела, але здранцвела: Саша перастараўся...

Барак напоўніўся шумам, смехам. Прыбегла Таня.

– Сяргей, так добра зрабіў! Не пойдзеш, стаміўся?

– Стаміўся, Таня, толькі што памыўся.

– Ну, адпачывай, я пабегла.

І зноў знікла. Адзінота ўсё болей апаноўвала яго. А пасля з'явілася Анэта. Паставіла на стол маленькі чамаданчык.

– Што ў цябе, ударыў?

– Ды не, драпануў тросам.

Яна асцярожна зняла павязку.

– Нічога сабе, "драпануў". Трэба прамыць.

Анэта апрацавала рану ёдам, які шчыпаў да слёз. Потым пачала перабінтоўваць. "І як гэта я раней да яе не прыгледзеўся?.. Ад яе патыхае жаноцкасцю і спакоем. Толькі вочы сумныя. Чаму?"

– Ну вось, цяпер хутка загоіцца. Тэмпературы няма?

– Наогул, халодзіць, – схлусіў Сяргей. Яму хацелася, каб яна яшчэ пабыла.

Анэта дастала маленькі градуснік, страсянула, паглядзела на гадзіннік і працягнула градуснік Сяргею. Потым прыклала руку да яго ілба.

– Патрымай яшчэ крыху, рука такая халодная.

Наступіла маўчанне.

– Анэта, а ці праўда, што ты была замужам?

Яна моўчкі паглядзела на яго і ціха прамовіла:

– Збіралася летась, ды разбіўся ён на матацыкле...

– Як?!

– Ноччу на павароце ў лася ўрэзаўся. Цяпер іх развялося, да самага горада падыходзяць.

– Прабач, я не ведаў.

Яна моўчкі сабрала ўсё ў чамаданчык і ўжо ля дзвярэй сказала:

– Не кажы пра гэта нікому.

...Зоркі спусціліся ніжэй. Крокі Анэты згубіліся ў цішыні, а Сяргей ляжаў і ўсё думаў – і пра Анэту, і пра сваё жыццё. Дзіўна, але менавіта гэтая ціхая, непрыкметная дзяўчына як бы абуджала ў ім ўсё найлепшае...

Думкі роіліся ў галаве, набягалі, быццам хвалі, адна за адной. Надакучыла падрабляцца пад маладых. Ды зноў жа – не хацелася пакідаць Ленінград. Сяргей не любіў гарадоў. А вось Ленінград запаў у яго сэрца. Ён ніяк не мог сабе ўявіць, што тут калісьці хадзіў вялікі Пушкін. Вось так жа, як і Сяргей, стаяў на Стрэлцы Васільеўскага вострава, глядзеў на Зімні, у мяцеліцу, калі з-за рваных аблокаў праглядваўся бліскучы дыск месяца. А колькі гадзін Сяргей правёў на набярэжнай Мойкі! Здавалася, вось-вось прамільгне за акном прыгожая і чароўная постаць Наталлі...

Спякота спала толькі ў канцы жніўня. Атрад канчаў заліўку фундамента. Звыш плана ўзяліся за ўзвядзенне сцен двух падсобных памяшканняў. Сяргей заканчваў апошні катлаван. Падышоў праб, махнуў рукой.

– Фінішуеш?

– Гадзіны праз дзве скончу.

– Памог вам гэты стары,– ён кіўнуў на экскаватар.

– Ёсць крыху, Мікалаевіч. Мы ж студэнты...

– Разумею. Тут такая справа: патрэбна адвезці яго на станцыю. Я бачыў, як ты цягаў яго на тралеры.

– Паспрабую.

– Я вашаму камандзіру гаварыў, ён згодзен. Трэба і нам крыху памагчы. Толькі замацуй яго добра.

Вечарам Сяргей загнаў экскаватар на тралер, аблажыў з двух бакоў тоўстымі бярвёнамі і замацаваў скобамі. Заправіў трактар і пад'ехаў да самай кухні.

– Куды сабраўся? – на ганку стаяла Анэта з чайнікам у руцэ.

– Раніцай на станцыю павязу.

– А мы да закрыцця рыхтуемся.

– Галава крыху разбалелася.

– Знаю я тваю хваробу, – яна ўсміхнулася.

Экскаватар давёз без асаблівых прыгод. Купіў у буфеце кулёчак цукерак ды пяць бутэлек напітку. Прыехаў раніцай наступнага дня. Адразу ж зайшоў у сталовую. Навокал усё прыбрана, памыта. Усе дзяўчаты працавалі на кухні.

– Анэта! Твой работнічак з'явіўся – не запыліўся.

Яна выйшла з ручніком у руках.

"А наогул, яна самая-самая..." Сяргей глядзеў на яе і ўсміхаўся.

– Змарыўся?

– Спаць хочацца. Усю ноч ехаў.

– Забылася табе сказаць, каб напітку купіў.

Сяргей моўчкі пайшоў да трактара, прынёс цукеркі і напітак.

– Прывёз! Здагадаўся! Малайчына! Дзяўчаты, сюды!

Яны разлівалі напітак у шклянкі, гаварылі тосты...

Праз тыдзень была развітальная вячэра. "Сухі закон" быў у сіле, таму пілі толькі моцны чай. Да поўначы сядзелі ля вогнішча, спявалі. Сяргей з Анэтай пайшлі гуляць і ледзь не заблудзіліся. Ночы наступілі цёмныя, асеннія.

Раніцай прыехалі на станцыю. Падышоў спецыяльны цягнік. Па дарозе прычаплялі да яго ўсё новыя вагоны з іншымі атрадамі. І да Ленінграда каціў ужо цэлы студэнцкі састаў. На Маскоўскім вакзале – натоўп. Кветкі, смех...

Таня першая выскачыла з вагона.

– Сярожа, глядзі, вунь той фізік.

Сяргей убачыў маладога, з пасівелымі валасамі, хлопца. Ён няўмела, галоўкамі ўніз, трымаў тры чырвоныя ружы. Таню было не пазнаць. Куды падзелася яе весялосць?! Яна так глядзела на яго, так глядзела, што ў Сяргея нават зашчыпала ў вачах.

Пасля кароткага мітынгу аднекуль з'явіліся бутэлькі з шампанскім. "Сухі закон" быў урачыста скасаваны. Саша паехаў дадому. Сяргей з Анэтай выйшлі на Неўскі, купілі газеты.

– Анэта, у Горкаўскім тэатры новая пастаноўка: “Шчаслівыя дні нешчаслівага чалавека”. Пойдзем?

Яна моўчкі глядзела на рознакаляровыя агні праспекта, потым уздыхнула і ціха сказала:

– Добра, Сярожа, мы абавязкова сходзім.

## Здарэнне ў Бярозаўцы

Сход у тэхнікуме заканчваўся. Многія студэнты паўставалі са сваіх месцаў, але ў апошнюю хвіліну ўсіх затрымаў выкладчык фізкультуры Ігар Іванавіч.

– Вельмі цікавая кароткая аб’ява!

– На цягнік спазняемся! – пачуліся галасы.

Была субота, і хто жыў у навакольных вёсках, выязджалі дамоў.

– Значыць, так, – працягваў Ігар Іванавіч, – хтосьці ў нашым тэхнікуме выйграў “Волгу” па білеце грашова-рэчавай латарэі. Але прайшоў амаль месяц, як была надрукавана табліца ў газетах, а пра “Волгу” ніякіх чутак. Я чаму пра гэта кажу, бо калі прынеслі на наш тэхнікум тры пачкі тых білетаў, я запісаў нумар і серыю першага білета кожнай пачкі. Некалькі дзён назад зірнуў у табліцу – у адной з пачак павінна быць “Волга”. З выкладчыкаў ніхто не выйграў, выходзіць, шчаслівчык сярод вас. Усе правяралі білеты?

– Правяралі! Нічога няма! У мяне на пяць нумароў не сышлося! А ў мяне на два! – выкрыкнулі з апошніх радоў.

– Вось бачыце! З якой вы групы? – спытаў Ігар Іванавіч.

– З дзесятай! Планавікі!

У зале загаманілі. Аб’ява зацікавіла ўсіх, нават пра цягнік забыліся.

– Правяраць білеты трэба ўважліва, – працягваў Ігар Іванавіч. – У мінулым годзе была ў Мінску такая гісторыя. Прыйшоў у ашчадную касу дзядзька, падае білет і кажа: “Рубель выйграў”. Там паглядзелі – сапраўды рубель. Заплацілі. А по-

тым кантралёры правяралі ўсе латарэйныя білеты, так заўсёды робяць, і ўбачылі, што адзін білет выйграў аўтамабіль "Масквіч", а заплацілі некаму ўсяго адзін рубель. І той дзядзька, і кантралёрка ў ашчаднай касе не заўважылі, што не толькі серыя ў білеце сышлася, але і нумар таксама.

– А ці знайшлі таго дзядзьку?

– Знайшлі. Бо той білет яму падпісала на дзень нараджэння яго дачка. Далі аб'яву ў газеце, зверылі ў міліцыі почырк дачкі, і дзядзька атрымаў свой "Масквіч". Вось як бывае! Таму просьба да вас такая: прынясіце ў панядзелак свае білеты. Хто ўжо праверыў і выкінуў, што ж – такой бяды, а ў каго яшчэ захаваліся – прынясіце. Асабліва прашу дзесятую групу.

У панядзелак, пасля заняткаў, Ігар Іванавіч зайшоў у дзесятую групу.

– Ну, прынеслі білеты?

– А што рабіць тым, хто даўно іх выкінуў?

– У каго няма – можаце ісці ў інтэрнат.

Ігар Іванавіч сеў за стол. Амаль палова групы пакінула аўдыторыю.

– У каго на два нумары "Волга" не сышлася? – спытаў ён і разлажыў перад сабою газетку з табліцай.

– У мяне! – да стала падышоў Мурылёў Віктар.

– Зараз паглядзім. Сапраўды, нумар білета супадае. Ну, ён ва ўсёй пачцы аднолькавы, а серыя... Так, у цябе апошнія лічбы восемдзесят чатыры, а патрэбна восемдзесят шэсць. Бачыце, як блізка да "Волгі".

Пачалі правяраць у іншых хлопцаў і дзяўчат, але беспаспяхова.

– А ў мяне дык зусім на адзінку не сышоўся! – усклікнула Камінская Лена.

– Колькі ў цябе білетаў? – спытаў Ігар Іванавіч.

– Тры, – Лена падышла да стала.

– Так... У адным білеце апошняя лічба восемдзесят пяць, у другім адразу ідзе восемдзесят сем.

А трэці зусім не з гэтай пачкі. Як жа так? А дзе ж білет з лічбай восемдзесят шэсць, на які выпала “Волга”?

– Не ведаю, – разгублена адказала Лена.

– Можаце разыходзіцца, – звярнуўся да ўсіх Ігар Іванавіч, – а ты, Лена, застанься.

Усе выйшлі. У аўдыторыі стала ціха. Ігар Іванавіч доўга моўчкі глядзеў на Лену. Ён ведаў яе яшчэ зусім маленькай дзяўчынкай. Яны былі з адной вёскі. Калі ён хадзіў у дзесяты клас, здарылася ў яе сям’і вялікае гора: у адзін дзень у рацэ ўтапіліся яе бацька і маці. Да гэтай пары памятаў, як па вуліцы плылі на людскіх руках дзве труны. А ззаду заплаканая бабка Дар’я вяла за ручку маленькую дзяўчынку. Яна нічога не разумела і нават весела падскоквала. Жудасна было глядзець!

А потым ён паступіў у фізкультурны інстытут, ездзіў на спаборніцтвы, стаў майстрам спорту па барацьбе. Закончыў інстытут, працаваў трэнерам, а потым пацягнула бліжэй дадому. Уладкаваўся выкладчыкам фізкультуры ў тэхнікуме. А Лена ўвесь гэты час жыла з бабкай Дар’яй. Гады ляцяць! Вось ужо і Лена заканчвае тэхнікум, зусім дарослая дзяўчына.

– Ну што, суседка? Ледзь “Волгу” не выйграла. Значыць, ты больш нідзе латарэйныя білеты не купляла?

– Нідзе. Вось гэтыя тры далі ў тэхнікуме.

– А можа, абмянялася з якой-небудзь сяброўкай?

– Не. Навошта? Я адразу ж палажыла іх у кнігу за вокладку, каб не згубіліся. Яны там увесь час і ляжалі. Потым праверыла, нічога няма. Вось і ўсё.

– Добра, – Ігар Іванавіч дастаў з кішэні запісную кніжку. – Вось сама паглядзі: я запісаў нумар і серыю кожнай пачкі білетаў, якія распаўсюджвалі ў тэхнікуме. Твой трэці білет не з гэтых пачак. Зразумела? Калі ты нідзе больш білетаў не купляла, не абменьвалася, то тады гэты білет табе падсунулі, а той, каторы выйграў “Волгу”, забралі. Ты сама правярала білеты?

– Сама.

– Калі?

– Не памятаю. Тыдні два таму назад. – Яна змоўкла, а потым ціха прамовіла:

– Ой, прыпомніла! Я ў старога Юстына білеты правярала!

– У Юстына? – здзівіўся Ігар Іванавіч.– Што ля гасцінца жыве? Нічога не разумею.

– Аднойчы ён пазычаў у нас бязмен. І доўга не адносіў. Бабуля і паслала мяне па яго. Я прыйшла, а Юстын сядзіць і свае білеты правярае. Я, як тая дурніца, пабегла дадому і свае прынесла, бо мы ж адну "раёнку" выпісваем, а ў ёй табліцы не друкуюць. Толькі на стол білеты палажыла, як ягоная цялушка ў агарод залезла. Пабегла яе выганяць, а ён за гэты момант і паспеў мае білеты праверыць. Убачыў, што на адзін "Волга" выпадае, згроб яго, а мне свой падсунуў. Вось адкуль гэты білет!

– А можа, проста выпадкова білеты пераблыталіся на стале?

– Як жа?! Мае тры на ўскрайку стала ляжалі адзін на адным. Ды і ў агародзе я была доўга. Ніяк цялушку не магла выгнаць.

– Эх, Лена, Лена... – Ігар Іванавіч уздыхнуў. – Зробім так: я сёння пад'еду прыгарадным цягніком дадому, маці адведаю, даўно ўжо не быў, і зайду адвячоркам да нашага ўчастковага Мікалая Пятровіча. Пагавару з ім. А ты заяву напішы ў міліцыю.

– Што там пісаць?

– Што мне расказала, так усё і апішы.

– Проста і не ведаю, як аддзякаваць вам, Ігар Іванавіч. Гэта ж каб не вы, то так бы ўсё і засталося.

– Дзякаваць будзеш, як білет знойдзем. Не так лёгка яго адабраць у Юстына. Такі жміндзіна – свет не бачыў! Але ты не хвалюйся, нешта прыдумаем! Калі пашанцуе, то пад вянец на "Волзе" паедзеш.

– Вы толькі бабулі нічога не кажыце, а то перажываць пачне. І так часта хварэе.

– Я не скажу, але яна ўсё адно даведаецца.

“Вось дык задачка!” – думаў Ігар Іванавіч, крочачы ад станцыі дадому. Дзед, вядома, прыхаваў білет, а мо ўжо прадаў якому-небудзь грузіну. За “Волгу” яны нічога не пашкадуюць. Перабіраў у думках розныя варыянты, але нічога не атрымлівалася. “Эх, Шэрлака Холмса няма!” – з усмешкай падумаў ён. Такая справа толькі яму па плячы.

Дома хуценька павячэраў, пагаварыў з маці і адправіўся да ўчастковага. Мікалая Пятровіча ён ведаў даўно, яшчэ са школы. Ён быў ужо на пенсіі, але працягваў яшчэ працаваць. Жыў ля самай станцыі, але на ўсякі выпадак Ігар Іванавіч зазірнуў у яго кабінет, што размяшчаўся ў сельсавеце.

Мікалай Пятровіч сядзеў за сталом і штосьці пісаў.

– Можна?

– Ігар?! – здзівіўся ўчастковы. – Праходзь.

Яны павіталіся.

– Даўненька цябе не бачыў! Ну, як жывеш?

– Паціхеньку. Нядаўна другі сын нарадзіўся.

– Віншую!

– Дзякую!

– А з кватэрай як?

– Пасля Новага года абяцаюць. У мяне тут справа да вас, Мікалай Пятровіч.

– Давай, выкладвай.

Ігар расказаў пра латарэйны білет.

– Ну і Ленка! А можа, ёй так хто падмяніў?

– Я пытаўся. Сказала, што адразу ж палажыла іх у кнігу за вокладку.

– Знайшла да каго ісці правяраць!

– А змог бы Юстын такое зрабіць? – спытаў Ігар Іванавіч.

– Чаму ж не! – усклікнуў Мікалай Пятровіч.– Ведаю яго як аблупленага! Не чалавек, а нейкі вырадак! Пры немцах амаль два гады ў паліцыі служыў.

– Няўжо?! – здзівіўся Ігар.– Але ж у турме не сядзеў.

– Бо хітры, як той ліс. Калі нашы прыйшлі ў сорак чацвёртым, дык ён хуценька ў армію і на фронт. А тут сказаў, што немцы сілком прымусілі ўступіць у паліцыю. А на фронце – думаеш, дзе быў? Кашу гатаваў. Бо паранілі ў першым баі, дык ён пасля пры кухні туляўся. Цяпер яшчэ чырвоную зорку на доме прымацаваў.

– Чаму ён не ажаніўся?

– Каму ён патрэбен! Адзін жыве, як мядзведзь. Нават хату пабудаваў воддаль ад людзей. Цяжка будзе адабраць у яго білет! Ох, як цяжка! Надзеі ў нас мала, але будзем думаць. А дзе тыя білеты?

– У мяне, – Ігар Іванавіч хуценька дастаў білеты, газету з табліцай і заяву ад Лены.

Мікалай Пятровіч узяў іх, пачаў шукаць нумары ў газеце.

– Усё ясна: білет падмянілі, бо ў Лены ўсе тры ішлі адзін за адным. І вось жа валацуга! Сірату не пашкадаваў! Калі Лена тэхнікум заканчвае?

– У гэтым годзе.

– А колькі "Волга" цяпер каштуе?

– Пятнаццаць тысяч.

– Во! Хапіла б Лене і на вяселле, і на ўсё іншае. Заўтра ж раніцай пойдзем да яго. Ці ты сёння вяртаешся ў тэхнікум?

– Не. Заўтра паеду.

– Тады дамовіліся. Чакаю цябе ў дзевяць гадзін. Бывай!

Раніцай былі ў Юстына. Калі зайшлі ў хату, ён таптаўся ля пліты, гатаваў сняданне.

– Добрай раніцы! – павітаўся Мікалай Пятровіч. Юстын моўчкі кіўнуў галавой.

– Праходзьце, – сказаў ён, насцярожана зыркнуўшы вачамі з-пад сівых броваў.

Мікалай Пятровіч і Ігар селі на лаўку, а Юстын працягваў стаяць ля пліты.

– Прысядзь на хвілінку, – сказаў участковы, звяртаючыся да Юстына, – пагаварыць трэба.

Той неахвотна сеў на табурэтку ля акна.

– Справа такая: ты падмяніў Камінскай Лене латарэйны білет, што выйграў "Волгу". Патрэбна яго вярнуць.

– Які білет?! – здзівіўся Юстын.

– Вось такі! – участковы дастаў з кішэні тры білеты і палажыў іх на стол. – Прыходзіла да цябе Лена правяраць білеты?

– Прыходзіла, – з цяжкасцю прамовіў Юстын.

Ігару Іванавічу нават здалося, што стары крыху змяніўся ў твары.

– Ну вось! – працягваў Мікалай Пятровіч павесялеўшым голасам, – яна зайшла, а ты свае білеты правяраў, так?

– Так...

– А тут твая цялушка ў агарод залезла. Пакуль Лена яе выганяла, ты паспеў яе білеты праверыць. Убачыў, што на адзін "Волга" выпадае, тут жа замяніў яго сваім.

– Ну і справу ты мне падшываеш! Я за акулярамі ледзь загалоўкі ў газеце чытаю. Мне ж семдзесят пяць гадоў! У магазіне рэшты няма, дык мне тых білетаў напхалі, а цяперака во – білет падмяніў! Ды Ленка і мае білеты правярала!

– А дзе яны? – спытаў Мікалай Пятровіч.

– Зараз гляну, можа, засталіся.

Юстын падняўся, адчыніў шуфляду ў стале. Доўга там корпаўся.

– Няма. Мусіць, выкінуў.

– Не шукай. Ты іх не выкінуў, а спаліў у той жа дзень! – Мікалай Пятровіч усміхнуўся. – А ведаеш чаму?

Юстын моўчкі глядзеў на ўчастковага.

– Бо ў нас ёсць адзін твой білет, каб ты паказаў тыя, што засталіся, то выкрыў бы сам сябе.

– Адкуль вы ўзялі, што Ленка павінна "Волгу" выйграць? – спытаў Юстын.

– А-а... Цікавіць, як нам пашанцавала за нітачку ўхапіцца, якая да цябе прывяла!

– Ды чаму да мяне?! Вы што – звар'яцелі?! – Юстын са злосцю сплюнуў. – Навошта мне грошы?

– Ну дык слухай, чаму менавіта да цябе, – з націскам на апошняе слова прамовіў Мікалай Пятровіч. – Ігар Іванавіч усё раскапаў.

І ён расказаў, што адбылося ў тэхнікуме.

– Дык можа Ленцы так хто білет падмяніў? – ажывіўся Юстын. – А вы адразу мяне за бараду хапаеце!

– Як ёй хто мог падмяніць, калі білеты ўвесь час у кнізе за вокладкай ляжалі! – усклікнуў Мікалай Пятровіч.– Лена вось тут усё ў заяве напісала. Сёння ж павязу яе ў раён, а там не выкруцішся! Лепш сам аддай!

– Няма ў мяне білета! Можаце шукаць!

– Ну што ж, хадзем Ігар, – участковы падняўся, падышоў да дзвярэй, азірнуўся і дадаў: – Хапіла сумлення сірату абабраць, хоць бы абразоў пасаромеўся! Увесь куток імі абчапляў!

Назад вярталіся моўчкі.

– Не бачыць ён! Паганец! – не стрымаўся Мікалай Пятровіч. – Гэтым летам сам бачыў, як ён гусей пасвіў і газету без акуляраў чытаў. Але нічога – прыціснем! Як думаеш, Ігар?

– Не ведаю. Тут бы прыдумаць такое, каб перагарадзіць Юстыну ўсе выхады, – адказаў Ігар Іванавіч.

– Абложым, як ваўка, нікуды не дзенецца! Прыязджай у гэтую суботу разам з Ленай, – сказаў на развітанне Мікалай Пятровіч.

– Абавязкова, – адказаў Ігар.

Справа з білетам вельмі зацікавіла Ігара Іванавіча. Яму было вельмі шкада Лену. Цяжка ёй жылося з бабкай Дар'яй на яе невялічкую пенсію. Але неяк выкручваліся. А тут так пашанцавала! Ды на табе – чорт дарогу перабег. Ледзь дачакаўся наступнай суботы. Усё здавалася, што, можа, за тыдзень Мікалай Пятровіч што-небудзь там прыдумаў. Мо Юстын ужо аддаў білет?

Дадому ехаў разам з Ленай. Яна была засмучаная, не размаўляла.

– Не перажывай, – падбадзёрваў яе Ігар Іванавіч, – аддасць ён білет, нікуды не дзенецца!

– Сама ва ўсім вінавата, – ціха адказала яна. – Такая дурніца! Няхай бы я з білетамі ў руцэ пабегла цялушку выганяць!

– Каб ведаў, дзе ўпадзеш, дык саломкі падсцяліў бы!

Калі на станцыі выйшлі з вагона, Ігар Іванавіч сказаў:

– Я зараз наведаюся да нашага ўчастковага, а заўтра зайду да вас, раскажу пра навіны.

Мікалая Пятровіча ён сустрэў на вуліцы. Сышліся, парукаліся.

– Што новага? – хуценька пацікавіўся Ігар.

– Быў я ў раёне, адвёз заяву. Прыязджаў сюды капітан Сакалоў, ён будзе займацца білетам. Хадзілі з ім да Юстына.

– Ну і што?

– Як і тады – адмаўляецца!

– Ну, а капітан што?

– Заўтра прыедзе да мяне а дзесятай гадзіне. Прасіў, каб ты з Ленай падышоў.

– Добра. Мы будзем.

Ноччу Ігар Іванавіч доўга не мог заснуць. Усё думаў, варочаўся... І як зямля носіць такіх людзей? Ну і Юстын! Сярод белага дня адабраў у сіраты "Волгу", і нічога зрабіць нельга! Быў бы ён не такі стары, то даў бы па рэбрах – адразу прызнаўся б. А мо прыпужаць як-небудзь? А што? Залезці ноччу з маскай на твары. Але пад каго падрабіцца? Пад чорта. Во! Рогі, хвост ды яшчэ каб якія-небудзь лямпачкі мільгацелі. Схапіць за горла ды прахрыпець вар'яцкім голасам: "Куды білет падзяваў?!" Можа, і аддаў бы са страху. Толькі не даваць яму спакою, заўтра так і скажу капітану.

Невялічкая хатка бабкі Дар'і стаяла амаль у канцы вуліцы, прытуліўшыся да двух высозных клёнаў. А між імі нявесціліся маладыя вішні. Зірнуў на маленькія акенцы, і сэрца сціснулася ад жалю і болю...

– Добрай раніцы ў хату!

– Дзень добры, Ігарок! Праходзь, сядай, – бабка Дар'я выцерла ручніком табурэтку.

З другога пакоя выйшла Лена. Павіталася.

– Тут да мяне чалавек з міліцыі прыходзіў, усё пра білет расказаў. Пра гэтага ірада, Юстына, пытаўся. І чаму ж мы такія няшчасныя?

Бабка Дар’я заплакала.

– Бабулька! – Лена падышла да яе і абняла за плечы. – Не плач, усё добра будзе.

– Як сіраце, дык і шчасця няма... – яна выцерла фартухом слёзы.

– Аддасць ён білет, – сказаў Ігар, – вось пабачыце.

– Бог пасаг паслаў маёй сіраціначчы, ды мы ўзяць не здолелі.

– Нічога, бабуля, такую прыгажуню і без пасагу возьмуць. Лена, падойдзем зараз да Мікалая Пятровіча. Да яго з раёна следчы прыедзе, хоча з табой пагаварыць.

У кабінеце ўчастковага сядзеў незнаёмы Ігару малады капітан. Павіталіся.

– А вось і наша пацярпелая! – сказаў Мікалай Пятровіч. – Сядайце.

Капітан адкрыў папку, дастаў заяву Лены.

– У мяне будзе некалькі пытанняў. Як распаўсюджвалі ў вашай групе латарэйныя білеты? Кожны выцягваў з пачкі якія хацеў, ці бралі па парадку?

– Па парадку. Я ж добра памятаю. Хто два браў, хто тры.

– А які гэта быў дзень?

– Субота. Бо я тады вельмі спяшалася, каб на цягнік не спазніцца.

– Куды адразу паклала білеты?

– У запісную кніжку, якую потым схавала ў сумачку. Прыехала дадому, павячэрала з бабуляй, і пераклала іх за вокладку ў томік вершаў Ахматавай.

– А можа калі брала томік у інтэрнат?

– Не, што вы! Такую кнігу толькі прывязі – потым са свечкай не знойдзеш!

– І білеты ўвесь час там ляжалі?

– Так. А як убачыла ў Юстына газету з табліцай, вось тады і дастала.

– Цяпер хацеў бы зірнуць на вашу запісную кніжку, – сказаў капітан, звяртаючыся да Ігара Іванавіча.

– Так... Нумар, серыя. Нумар, серыя. Усіх трох пачак. А навошта вы запісвалі?

– Цікава было прасачыць – ці выйграе хто што-небудзь. Усё-ткі трыста білетаў! У мяне і ў самога чатыры былі.

– Што ж, Камінская Лена, можаш ісці,– капітан падняўся. – Не хвалюйся, знойдзем твой білет. Так і бабулі перадай. А мы тут яшчэ пагаворым. Усяго табе добрага!

Лена выйшла.

– Як бы ў дадзеным выпадку паступіў Шэрлак Холмс? – весела спытаў капітан.

– Імітаваў бы пажар у доме Юстына, – адказаў Ігар.

– Але ж гэта быў першы выпадак у жыцці вялікага сышчыка, калі жанчына абвяла яго вакол пальца! – сказаў Мікалай Пятровіч.

– Гэта так. Памыліўся там Холмс, а нам памыляцца нельга. – Капітан сеў за стол. – Многа чым даводзілася займацца, а з такім выпадкам сустрэўся ўпершыню. Але бліжэй да справы. Я наводзіў даведкі. Усе латарэйныя білеты, асабліва тыя, што выйгралі аўтамабілі, адпраўляюцца на праверку ў Маскву. Мы выслалі туды нумар нашага білета, серыю і разрад. І калі хто прад'явіць гэты білет, каб атрымаць “Волгу” або грошы, мы будзем ведаць гэтага чалавека. Але каб вы, Мікалай Пятровіч, не пайшлі адразу да Юстына, а прыехалі б да нас, то білет праз нейкі час быў бы ў нашых руках. Можа, Юстын сам бы яго здаў, каб грошы атрымаць. А калі не, то мы б таксама не спалі ў шапку. Падаслалі б да яго свайго чалавека. У мяне сябра ў Магілёве працуе, капітан Давід Кіквісквіры. Спачатку паслалі б яго на кірмаш апельсіны прадаваць, а заадно пусцілі б чутку, што гэты грузін вельмі хоча “Волгу” купіць. Юстын сам бы на яго выйшаў. А цяпер яго спужалі. Што ён зробіць з білетам? Цяпер прадаваць не адважыцца. А калі спаліць?

– Вось і я аб гэтым думаў! – усклікнуў Ігар Іванавіч.– Ён жа можа спаліць, зараза! Каб нікому “Волга” не дасталася!

– Даў я тут прамашку, – Мікалай Пятровіч пачухаў патыліцу. – Але ж я думаў, раз так удачна яго раскрылі, то сам аддасць білет, куды яму дзявацца?

– А можа, у доме Юстына вобыск зрабіць? – прапанаваў Ігар.

– Вобыск нічога не дасць, – адказаў капітан. – Білет можна так захаваць, што год шукаць будзеш і не знойдзеш.

– Тады ў раён яго выклікаць, патрымаць там на хлебе і вадзіцы ў якім-небудзь пастарунку! Пабольш тармасіць старога – падніме лапы ўгору!

– Ну, Ігар! Табе б у міліцыі працаваць, а не ў тэхнікуме, – сказаў Мікалай Пятровіч.

– Дык жа злосць бярэ! Выхапіў амаль што з рук у дзяўчыны “Волгу”, а мы нічога зрабіць не можам! Ды яшчэ каб ён спакойна жыў! Не, дудкі! Я сам у суботы да яго хадзіць буду і за бараду трэсці!

– Шэрлак Холмс у гэтым выпадку сказау бы: “Толькі без рук!” – капітан засмяяўся. – Тут трэба штосьці прыдумаць. А вось што – я і сам не ведаю. Але аб адным прашу: калі ў каго ўзнікне добрая думка, то паведамляйце мне, бо вельмі баюся, каб нам яшчэ больш памылак не нарабіць.

– Дык выходзіць, што Юстын абуў нас у лапці! – не сунімаўся Ігар.

– На білеце напісана, што выйгрышы будуць выплачвацца да першага жніўня наступнага года. Так што часу ў нас хапае,– сказаў капітан.

– А што б вы зрабілі на месцы Юстына? – спытаў Ігар у капітана.

– Я не хачу нават на імгненне быць на месцы гэтага паганца! – рэзка адказаў капітан.

– Ну, а ўсё-ткі, што б зрабілі? – дапытваўся Ігар.

– Затаіўся б на некаторы час, мо на паўгода, а то і больш.

– А потым?

– Не ведаю.

– Вось і я так думаю, што Юстын пакуль што білет прадаваць не будзе, – працягваў Ігар.

– І знішчыць не павінен, – дадаў Мікалай Пятровіч, – я то ведаю, які ён скнара!

Разыходзіліся моўчкі. Прыкра было ў Ігара Іванавіча на душы, бо не было яснага плана, як адабраць білет у Юстына.

Мінуў адзін месяц, потым другі. Цяпер Ігар прыязджаў дадому кожную суботу, але ніякіх навін не было. Праўда, Юстына выклікалі некалькі разоў у раён, да начальніка міліцыі, але і гэта нічога не дало.

І тут, калі ўжо не было ніякай надзеі, Ігару пашанцавала. Аднойчы ў суботу, калі ён прыехаў дадому, да іх зайшла Кліманіха, аднагодка яго маці. Ігар якраз чытаў кніжку ў суседнім пакоі.

– Ну, Наталля, – з парога пачала яна, – учора такое здарылася, што проста не ведаю. Напэўна, паміраць скора давядзецца.

– Яшчэ што прыдумала,– сказала маці, сядаючы ля акна. – Расказвай.

– На днях хадзілі з Гарэлічыхай да варажбіткі, што ў Гануце жыве. Яна пра сваю дачку даведацца – ці выйдзе замуж, а я пра Іванку майго, што ў гэтую вайну прапаў. Сэрцам чую – жывець ён і ўсё! Узяла дзесятак яек ды малінавага варэння. Грошай у мяне няма – сама ведаеш, якая пенсія. Але тры рубельчыкі выкраіла. Ідзем мы гэта з ёй, а дарога ўсё лесам, вось і пытаю: “Што ты ёй нясеш?” А яна і кажа: “Літар варэння ды два рублі”. А яны ж спраўней за мяне жывуць. Вось і парашыла я варэнне прыхаваць. Засунула слоік у мох пад вялікай сасной. Метку зрабіла. Прыйшлі пасля абеду. Сустрэла нас старэнькая бабулька, валасы сівыя, глядзіць ласкава... І ніякіх табе картаў. Гарэлічысе сказала, што дачка ў гэтым годзе замуж пойдзе. Потым зірнула на мяне, усміхнулася, і кажа: “Слоік варэння, што схавала пад сасной, забяры, але аддай таму, хто ў цябе папросіць. Мужа не чакай. Загінуў ён у першы год вайны”. Нічога ад мяне браць не хацела, але яйкі я ўсё ж паклала ў сенцах. І вось усё думаю: як даведалася, што я варэнне прыхавала? Каб якой бяды на мяне не наклікала. Ноччу заснуць не магу.

– Вот, не бяры ў галаву, – маці махнула рукой.

Гэтая размова моцна засела ў Ігара ў галаве."А што, калі б у той варажбіткі спытаць, дзе білет дзед схаваў?" – думаў Ігар, лежачы на ложку. Ужо далёка было за поўнач, а ён усё думаў... Дзеда да яе не зацягнеш, факт. І ён вырашыў сам пабываць у яе. Добра было б на машыне пад'ехаць, ды дзе возьмеш?

І тут успомніў, што ў Мікалая Пятровіча ёсць старэнькі "Масквіч".

Раніцай быў у яго на кватэры.

– А, Ігар, праходзь, – Мікалай Пятровіч моцна пацiснуў яму руку. – Можа, парадуеш чым?

– А ў вас ёсць навіны?

– Навіны ёсць, а білета няма.

– Можа, з Масквы што прыслалі?

– Не. Старая Дар'я да Юстына хадзіла. Ледзь там не пабіліся. Ён яе выштурхнуў на вуліцу, а яна яму кіёчкам па вокнах...

– Малайчына бабулька! – усклікнуў Ігар.

– Чаго радуешся?

– Бо добра зрабіла! Яму б яшчэ морду набіць! Але крыху пачакаем, бо ёсць цікавая задумка.

Ігар расказаў пра варажбітку.

– Можна паспрабаваць, – Мікалай Пятровіч пагладзіў вусы, – але наўрад ці што атрымаецца. Не веру я ім. Пасля вайны колькі іх было!

– Мікалай Пятровіч! Я аднойчы чытаў у "Нядзелі", што ў Грузіі жыве хлопец, які чытае думкі на адлегласці. Тэлепатыяй валодае. А на днях прачытаў у часопісе "Беларусь" нарыс "Біяполе ўзаралі". Там пра адну жанчыну. Да яе прывялі двух карэспандэнтаў, якія хацелі пра яе напісаць. А яна правяла недалёка ад іх рукой і сказала, хто з іх на што хварэе. Ды з такой дакладнасцю, што тыя ад здзіўлення нават пра свае пытанні забыліся. Можа, і гэтая бабулька такая.

На другі дзень яны выехалі. Даехалі хутка. Мікалай Пятровіч, пераапрануты ў цывільнае, застаўся ў машыне на ўскрайку лесу, а Ігар накіраваўся да бабулі. "Толькі б дома была ды прыняла, – падумаў ён, – а там упрашу яе!"

Яму пашанцавала. Калі зайшоў, бабулька піла чай. Павітаўся.

– Ну, – пяшчотна сказала яна, – з чым прыйшоў?

– Такая справа... Проста не ведаю, што і будзе, калі не паможаце.

Ігар расказаў пра білет. Бабулька слухала моўчкі.

– Я не за сябе прашу, Лену шкада – круглая сірата. Можа, хоць прыстрашыце яго? Заплачу колькі трэба, грошай не пашкадую, – ён дастаў пяцьдзесят рублёў і паклаў на стол.

– Цяжкая справа, – бабулька задумалася. – А грошы вазьмі, платы наперад я не бяру. Мне патрэбна яго бачыць, а сюды ён не паедзе...

– Я таксама пра гэта думаў, – перабіў ён бабулю, – таму прыехаў на машыне з адным таварышам. Мы б вас і назад хутка адвезлі.

І ўжо ўнутрана падрыхтаваўся, што бабулька будзе пярэчыць, але, на яго здзіўленне, яна адразу ж згадзілася.

– Толькі апрануся.

– Добра. А я зараз машыну падганю.

– Ну як? – спытаў Мікалай Пятровіч, калі Ігар падышоў да яго.

– Павязем бабулю проста да Юстына. Яна сказала, што павінна яго бачыць.

Утраіх зайшлі ў хату. Дзед на прывітанне нічога не адказаў, а толькі злосна зірнуў і закрычаў:

– А-а!.. Ганунцкую ведзьму прывезлі! Білета не браў! І бачыць вас не жадаю!

Мікалай Пятровіч хацеў штосьці сказаць, але бабулька апярэдзіла яго.

– Сірату крыўдзіш, грэх вялікі на душу ўзяў, а сумленне дакарае: рад бы загладзіць сваю віну, ды сорамна перад людзьмі! Я ведаю, дзе білет схаваў, але хачу аблегчыць твае пакуты: сам пакажы тое месца, здымі грэх з душы.

Бабулька гаварыла ціха, але ў Ігара нават мурашкі па спіне забегалі. Ён чакаў, што дзед зноў пачне сварыцца, але той раптоўна абмяк.

Апусціўшы сівую галаву, сядзеў ля акна і маўчаў. Бабулька пільна глядзела на яго. Ігару на імгненне нават стала шкада дзеда.

Наступіла цішыня. Толькі чутны былі ходзікі. І тут дзед цяжка ўздыхнуў, і, прамармытаўшы сам сабе штось незразумелае, неакрэслена махнуў рукой на кут, дзе віселі тры абразы.

Бабуля ўсміхнулася.

– Я так і знала. Здымі, сынок, Мікалая Цудатворцу.

Ігар падышоў у кут, асцярожна зняў невялічкі абразок, але білета не было. Падышоў Мікалай Пятровіч, узяў у рукі рамачку і стаў уважліва яе разглядаць. Потым дастаў ножык і з самага куточка асцярожна выцягнуў паперку. Гэта і быў латарэйны білет.

– Вось як бывае... – працягнуў участковы, выціраючы спацелы лоб.

Яны адвезлі бабульку дахаты. Грошай яна не ўзяла. Ігару вельмі хацелася спытаць: ведала яна, дзе схаваны білет, ці потым здагадалася, калі Юстын махнуў рукой на абразы. Але не спытаў. Ды ўрэшце яно і не важна.

Калі ехалі назад, Мікалай Пятровіч разважліва прамовіў:

– Каб мне хто расказаў гэткую гісторыю, ні за што не паверыў бы! А тут... Калі білет панясеш?

– Сёння. Лена якраз дома.

– Давай. А я заўтра ў раён паеду, парадую начальства.

Больш за ўсіх радавалася бабка Дар'я. Яна плакала, жадала Ігару здароўя і шчасця. Лена сядзела збянтэжаная, сарамліва ўсміхалася, ад чаго здавалася яшчэ прыгажэйшай.

У панядзелак Ігар з Ленай адвезлі білет у ашчадную касу.

# Двухтомнік

Аб ім Сцянан ведаў усё: дзе нарадзіўся, вырас, калі пачаў пісаць апавяданні. Выразаў іх з газет і часопісаў, акуратна складваў у папку. Потым з'явіліся Яго кнігі. Купіць іх было амаль немагчыма. Але ўсякімі праўдамі і няпраўдамі Сцяпан іх здабываў. Нават двухтомнік купіў, за які прыйшлося заплаціць пяцьдзесят рублёў. Грошы ў яго былі. Не так, праўда, і шмат, але былі. Сцяпан працаваў кавалём у калгасе. Зарабляў як калі – хапала. Праўда, яго жонка Насця прыносіла нярэдка намнога больш. Яна даглядала цялят. І ёй плацілі ад прывагі. Корму было не тое што раней, вось яна і старалася.

А двухтомнік здабыў у абласным горадзе. Паехалі аднойчы з механікам па запчасткі. Пакуль той афармляў паперы, Сцяпан зматаўся ў кніжны магазін. Кніжак было шмат. Але калі ён назваў маладой прадаўшчыцы прозвішча аўтара, яна здзіўлена ўскрыкнула:

– Што вы?! Яго ў нас на базе расхопліваюць!

І тут Сцяпана спыніў нейкі зграбны малады хлопец з вусікамі і сумкай у руцэ.

– Што шукаем, бацька?

– Двухтомнік.

– Ну, ведаеш! Яго нават на базе няма, а ён у магазіне пытае.

– А дзе ж шукаць?

– Ёсць месцы. Бяры крыху вышэй, – хлопец усміхнуўся. – Вось мне знаёмы сябра проста з друкарні прынёс.

– Глядзі ж ты... – здзывіўся Сцяпан.

– Адкуль будзеш? З вёскі?

– Але. Каваль я. Сцяпанам завуць.

– Вось што, – сказаў хлопец, азіраючыся туды сюды, – давай выйдзем.

Яны выйшлі на вуліцу.

– Значыць, так: паўсотню на бочку – двухтомнік твой. Усёк?!

– А дзе ж ён? – збянтэжана спытаў Сцяпан, адчуваючы, як горача зрабілася ў грудзях.

– Тут, – хлопец адкрыў сумку. Сцяпан асцярожна дастаў кнігі.

– Праўда, – прашаптаў ён. Пагладзіў чырвоныя вокладкі.

– Вось сялянская душа: не памацае – не паверыць. Ну дык як? Бярэш?

– Бяру!

Сцяпан забыўся пра ўсё на свеце. Ён толькі баяўся, што хлопец перадумае. І толькі седзячы ў кабіне разам з механікам, які сам быў за рулём, Сцяпан шкадаваў, што вось так, з гарачкі, адваліў пяцьдзесят рублёў."Патаргавацца трэба было. Напэўна, уступіў бы рублёў дзесяць, а то і ўсе дваццаць пяць. Вось дык дурань!" – лаяў ён сябе, гледзячы на дарогу.

Якраз перад самай паездкай у горад у калгаснай касе яму выплацілі дзвесце пяць рублёў за цялушку, якую яны здалі месяц назад. І цяпер ён прыдумваў, што б такое сказаць Насці аб гэтай паўсотні.

– Што зажурыўся? – спытаў механік.

– Ды так, задумаўся, Паўлавіч, – і тут мільганула думка: "А што, калі..." Механіка ён паважаў. Хоць і малады, але справу сваю ведаў, ды і з людзьмі ўмеў ладкаваць.

– Тут просьба к табе, – асцярожна пачаў Сцянан, – праўда, не зусім звычайная, але, думаю, выручыш, га?

– Давай, выкладвай.

– Калі мая Насця спытае ў цябе пра грошы, то скажаш ёй, што я пазычыў табе пяцьдзесят рублёў. Быццам спатрэбіліся табе. Добра?

– Скажу, – механік паціснуў плячамі. – А куды столькі патраціў, няўжо прапіў?

– Ты што?! На другое пусціў.

– Можа, на абаранкі? – механік кіўнуў на поўную сумку.

– Дзве кніжкі купіў сёння.

– За пяцьдзесят рублёў?! – механік так здзівіўся, што на імгненне выпусціў руль з рук.

– Дык жа двухтомнік! Усё жыццё марыў купіць. А грошы што – заробім. А вось Насця, калі даведаецца, перажываць пачне...

Пасля вячэры Сцяпан паклаў на стол сто сорак пяць рублёў.

– Адкуль гэта? – спытала жонка.

– За нашу цялушку заплацілі сёння.

– Дык яна ж цягнула рублёў на трыста. Дзе астатнія?

– Якія трыста?! Забылася, ці што? Дзвесце пяць рублёў. У нас жа квітанцыя ёсць, зірні. Дзесятка разляцелася: абаранкі, тое ды сёе. А пяцьдзесят рублёў механіку пазычыў. На канапу там ці на што, не ведаю.

– А чаго ты злуешся? – з усмешкай спытала жонка, уважліва гледзячы на Сцяпана.

– Нічога я не злуюся, – ён мелькам глянуў на Насцю, пачырванеў і змахнуў крошкі са стала.

Не, ашукваць ён не навучыўся. Ды яшчэ каго – сваю Насцю, якую з такой цяжкасцю заваяваў у маладосці. Сцяпан маўчаў, апусціўшы галаву, а яна ціха сказала:

– Нікому ты не пазычаў, мяне не ашукаеш. А вось на што столькі грошай патраціў – розуму не прыкладу.

Яна гаварыла ласкава. Сцяпан крыху пасмялеў. Яму шкада было Насці, але і прызнавацца не хацелася. Хваляваўся за яе здароўе.

– Не прапіў жа, сама бачыш, – ён падняў вочы на жонку.

– Гэта праўда, не прапіў, а куды ж падзеў? Можа, якой-небудзь артыстцы духі французскія купіў?

– Вось дык прыдумала! – Сцяпан усміхнуўся.

– Тады згубіў.

І тут Сцяпан не вытрымаў – рашыў прызнацца.

– Я кнігі купіў, – ціха сказаў ён і зазірнуў жонцы ў вочы.

– На пяцьдзесят рублёў?! Гэта ж колькі кніг выйшла?

– Дзве кнігі купіў, але я іх на ўсю бібліятэку ў нашым клубе не прамяняю.

– Так... – жонка, пакусваючы губы, глядзела Сцяпану ў вочы. – А гэтыя, – яна ўзяла ў рукі грошы, – таксама на вецер пушчу! Паглядзім, да чаго дажывемся!

– Насця! Я сам перажываю, зразумей мяне! Але ў гэтым двухтомніку сабрана ўсё, што Ён напісаў. Мне больш у жыцці нічога не патрэбна: ні касцюма, ні плашча... у нас жа ўсё ёсць, жывем, дзякуй Богу, не горш, чым другія.

– А ты забыўся, што ў нас дзве дачкі? Таня ў дзесятым – нявеста! Ды і Галя ў сёмым – у што папала не апранеш. Кожнай патрэбна па тысячы дзве на вяселле.

– Мы больш збярэм, вось пабачыш! А гэтую паўсотню, бадай на яе паляруш, я табе прынясу. У Казаковых печ заканчваю, ды і Сымоніха прасіла ў новым доме пліту зрабіць. Мне больш ніякіх абновак: усё табе і дочкам.

Ён яшчэ хацеў сказаць што-небудзь добрае, каб супакоіць яе, але не знайшоў слоў.

– Ну добра, – Насця ўстала і, цяжка ўздыхнуўшы, выйшла ў сенцы. "Не, што ні гавары, – думаў Сцяпан, – а жонка мая – золата. Другая б заела зусім. Але перажывае, факт".

Калі леглі спаць, Насця сказала:

– Ты не думай, Сцёпа, я не скнара, але баліць душа і ўсё! Пяцьдзесят рублёў – паўмесяца працаваць! Патаргавацца патрэбна было, напэўна, уступіў бы!

– Я і сам аб гэтым думаў, але як убачыў кнігі, проста дух захапіла, а ў галаве адно: "Толькі б прадаў!" Ты ўяві сабе, што мы за гэтыя грошы світэр мне купілі. Можа, лягчэй стане.

– Выдумшчык ты мой! Дай хоць паглядзець, што за кнігі.

– Зараз! – ён імгненна ўскочыў з ложка і кінуўся да паліцы.

– Вось, глядзі! Я сёння не стаў чытаць, каб цябе не хвалявацъ. Ён ведаеш як піша! Проста ў душу зазірае, як бы з табой гаворыць. А адно апавяданне пра нас з табой напісана.

Ён спехам пачаў гартаць кнігу.

– Няўжо пра нас?

– Сапраўды. “Светлыя душы” называецца.

– Дык тут жа пра шафёра, а ты каваль.

– У гэтым уся розніца, а іншае ўсё сходзіцца. У Яго і пра каваля ёсць. Эх ты, акварэль! – і Сцяпан пацалаваў яе ў шчаку.

– Сцёпа, а калі ён праз годзік-другі яшчэ кніжку напіша? Ізноў купляць будзеш?

– У тым і бяда, што не напіша. Памёр Ён. Усяго і пражыў сорак пяць гадкоў.

– Чаму ж так мала?

– Такія людзі доўга не жывуць. Згараюць, быццам порах. Душа ў Яго была добрая, светлая. Вось прачытаю Яго апавяданне – слёзы набягаюць. Аб людзях клапаціўся, а сябе не збярог.

– Няхай бы ягоных кніжак больш выпусцілі, каб усім хапала. Няўжо не ведаюць, што яны нарасхват?

– Яшчэ як ведаюць. Але ж і іншых пісьменнікаў друкаваць трэба.

Увосень Сцяпану было самотна на душы, тужліва. Асабліва пасля той страшэннай восені, калі, раскрыўшы газету, убачыў яго партрэт у чорнай рамцы. Сядзеў здранцвелы, радкі так і скакалі перад вачамі...

Як ён раней чакаў яго новага апавядання, аповесці! А даведаўшыся пра толькі што выдадзеную Ім новую кнігу, цешыўся, нібы малое дзіця. Ён запісваў яе назву ў асобны сшытак, каб потым пачаць пошукі. Часам Сцяпан шкадаваў, што Ён займаецца, акрамя літаратуры, яшчэ і іншымі, як яму здавалася, пабочнымі справамі.

“А каб толькі пісаў, – думаў Сцяпан доўгімі зімнімі начамі, – колькі кніг паспеў бы выпусціць, нават за гэткае кароткае жыццё, што было адведзена Яму лёсам”.

Прагледзеўшы ўважліва двухтомнік, Сцяпан зразумеў, што многіх апавяданняў ён не чытаў. Гэта ўзрадавала яго. Цяпер кожны вечар прачытваў зусім мала, як бы жадаючы расцягнуць сваю радасць на наступныя дні.І кожны раз, загарнуўшы кнігу, доўга не мог заснуць. “Чаму так атрымліваецца ў жыцці, – думаў ён, – што такія таленавітыя людзі так мала жывуць? За што такая несправядлівасць?!”

І тут заўсёды з’яўляўся перад вачыма Сцяпана Яго твар. Ён аднойчы ўбачыў Яго па тэлевізары. Да таго сумны, змораны, відаць было – хварэе Ён. А побач былі сябры, знаёмыя па рабоце, жонка. Але найбольш вінаваціў Сцяпан сябе. Бо ўсё збіраўся Яму напісаць, хацеў нават паслаць мёду, але не ведаў адраса.

Калі ўжо быць праўдзівым да канца – то была ў Сцяпана адна задумка. Але ён нікому нічога не гаварыў, нават думаў аб гэтым з жахам у душы. Як жа, толькі раскажы – засмяюць! Сораму не абярэшся!

Перш чым прыступіць да задуманай справы, яму патрэбна было пракансультавацца ў юрыста. У раён Сцяпан не хацеў ехаць. Там сваіх поўна. Як піць даць – даведаюцца. А ў вобласць так проста не паедзеш – прычына патрэбна. І ён стаў яе шукаць, але нічога не атрымлівалася. А прызнацца жонцы – не хапала храбрасці. І тут яму пашанцавала. Аднойчы прыйшоў вечарам з работы, а старэйшая дачка ўся ў слязах.

– Таня, што здарылася? Мама пакрыўдзіла?

– Не, – яна выцерла слёзы.

Увайшла Насця.

– Сказала ж табе – купім! Дык не – адразу ў слёзы!

– Іх жа расхапаюць, як ты гэтага не зразумееш! – сказала Таня і выйшла з кухні.

– Што здарылася, Насця?

– Сымоніха сваёй дачцэ футра купіла. Мы хадзілі з Таняй: прыгожае, таннае, нават прымералі.

– Ну і што? Пайсці ды ўзяць, раз ёй так спадабалася. Мы ж збіраліся ёй нешта да зімы купіць.

– Які ты шустры! У вобласць патрэбна ехаць. У нас такіх і ў паміне не было.

Сцянан ледзь не ўскрыкнуў: "Давай я з'езджу!" Але загадзя стрымаўся, нават насупіўся.

– Ну, не ведаю, сама рашай.

– Што тут думаць: збірайся, заўтра паедзеш.

– Ты толькі з раніцы механіка папярэдзь. Спешнай работы ў кузні няма, але ўсе-ткі скажы....

У горад Сцяпан выехаў у сем гадзін раніцы, самым першым аўтобусам. Пакуль дабраўся, універмаг быў ужо адчынены. Футра купіў адразу – ніякай табе чаргі. "Расхапаюць, – усміхаючыся, думаў ён, крочачы па вуліцы і зыркаючы вачамі па шыльдах, – так і правісяць да вясны, хоць бы ў наш раён адправілі".

Ён доўга таптаўся вакол юрыдычнай кансультацыі, усё не асмельваўся зайсці. Не любіў ён гэтых спраў. Аж ў грудзях непрыемна засмактала. Хацеў пайсці выпіць піва, але перадумаў: яшчэ скажуць, што выпіўшы. А людзі зрэдку спакойна заходзілі туды і выходзілі.

"Дык што ж гэта я? Бы дурань які!" – раззлаваўся ён і рашуча накіраваўся да дзвярэй.

У прыёмнай нікога не было. Толькі ля акна друкавала на машынцы маладая дзяўчына. Убачыўшы Сцяпана, яна спрытна дастала цыгарэту, шчоўкнула запальніцай і, разы са два зацягнуўшыся, спытала:

– Вы па якой справе?

– Так... Спытаць хачу.

– Вось і я хачу даведацца – якая ў вас справа: грамадзянская або крымінальная?

Пытанне канчаткова збіла Сцяпана з панталыку.

– Хоць да каго накіруйце, – ціха прамовіў ён. Дзяўчына глянула ў спіс.

– Ідзіце ў дзесяты кабінет. Проста, потым налева.

"Хоць бы толькі да жанчыны не трапіць", – думаў ён, ідучы па калідоры.

Дзверы былі абабітыя, не пастукаеш. Сцяпан крыху пастаяў, потым асцярожна прыадчыніў іх.

За сталом сядзела жанчына і штосьці хутка пісала. “Так і знаў! Ёлкі-палкі!” – хацеў зачыніць дзверы, але было позна.

– Заходзьце-заходзьце...

– Добры дзень!

– Добры дзень! Вы да мяне? – яе вялікія, крыху падфарбаваныя вочы так і ўпіліся ў Сцяпана.

– Да вас, – Сцяпан уздыхнуў.

– Сядайце, а клуначак на табурэтку палажыце.

Ён сеў насупраць, ля самага стала.

– Слухаю вас.

Сцяпану не хацелася ўсё расказваць гэтай жанчыне. І ён маўчаў, не ведаючы, што рабіць: ці пайсці, ці застацца. Жанчына чакала. Па яе твары прамільгнула ўсмешка.

– Ну, доўга будзем маўчаць?

Сцяпан пачухаў патыліцу.

– Такая справа, што нават не ведаю, з якога боку падступіцца.

– А вы пачынайце, зараз разбярэмся.

– Значыцца так: памёр адзін пісьменнік, ужо даўно. А мне Яго смерць спакою не дае. Баліць душа і ўсё! Што ужо не рабіў, як ні суцяшаў сябе – нічога не памагае. Гады праходзяць, а боль узмацняецца.

– І што ж вы рашылі?

– Хачу ў суд падаць на Яго жонку, урача, можа, яшчэ на каго.

– Так... – жанчына дастала цыгарэту. – Аб кім ідзе гутарка?

Яна ўзяла запалкі, збіраючыся прыкурыць. Сцяпан сказаў.

– Вось як! – усклікнула жанчына і рэзка адкінулася назад, так і не паспеўшы прыкурыць. – Цікава, – працягвала яна, пільна гледзячы на Сцяпана. – Пачнем з жонкі: у чым вы яе вінаваціце? – у голасе жанчыны пачуліся суровыя ноткі.

Але Сцяпан не спалохаўся, наадварот – адчуў у гэта імгненне, што можа сказаць усё.

– Я дакладна ведаю, – спакойным голасам пачаў Сцяпан, – што ў апошнія гады Ён хацеў паехаць у вёску, каб там пісаць. Вось жонцы патрэбна было

не ўпусціць такі момант. Пазвала б доктара – прафесара, каб той прыстрашыў трохі: стан крытычны, ніякіх хваляванняў. Толькі ў вясковай цішыні зможа паправіцца.

– А ці ведаеце, што Ён быў яшчэ артыстам, здымаў фільмы? – перабіла яго жанчына.

– Ведаю.

– Дык вы думаеце, што такога чалавека можна саслаць у вёску, адарваць ад любімай працы?! Ён бы з нудоты памёр!

– Але ж Ён сам гаварыў, – не стрымаўся Сцяпан, – што задумак шмат, хоча толькі пісаць. У вёсачку б махнуць. Я разумею, не такі ўжо дурны, – увесь час Ён там бы не быў, але хоць пару месяцаў. Свежае паветра, мёд, малачко... Потым, можа, і зусім застаўся б. А жонка замест гэтага на здымкі фільма адпусціла, адкуль Ён не вярнуўся.

– Як жа вы блага пра нас думаеце! – жанчына прыкурыла, з прагнасцю зацягнулася. – Ды, магчыма, яна Яго на каленях прасіла, каб не ехаў здымацца?! Мы ж з вамі не ведаем. А ўрачы? Яны ўсё для яго зрабілі, я ўпэўнена. Калі ўжо хочаце ведаць, – яна паднялася, прайшлася туды-сюды па кабінеце, – то былі людзі, якія сапраўды адымалі ў яго здароўе.

– Хто ж гэта?

– Многія, – яна стрэсла попел з цыгарэты. – таленавітым людзям заўсёды цяжка жывецца.

– Чаму?

– Зайздроснікаў у нас хапае... Вось і яго першыя апавяданні друкавалі з аглядкай. А “тоўстыя” часопісы зусім не хацелі прызнаваць. Гэта ўжо потым схамянуліся. Я таксама Яго люблю не менш, чым вы.

Жанчына ўсміхнулася, глянула на Сцяпана, села за стол.

– Дык іх жа можна знайсці?

– Каго?

– Ну, гэтых, каторыя душу яму вярэдзілі. Адной кампаніяй і засудзіць.

– Няможна!

– Чаму?

– Дзе матыў злачынства? Вось так, мой шаноўны! Усе яны, магчыма, і вінаватыя, але не забілі, не атруцілі і так далей. Дапусцім, жонка была дрэннай, няўважлівай і яшчэ Бог ведае якой. Ну і што? Дрэнных жонак – тысячы! Ды і наогул... які суд? Навошта?

– А каб іншыя на вус маталі! Колькі яшчэ жыве таленавітых людзей, якіх берагчы трэба. Ды не толькі іх – усіх! А мы іншы раз з-за якой-небудзь драбязы гатовыя адзін аднаму такога нарабіць! Чаму?! Я вось у вёсцы жыву, дык у нас хоць няма такой бегатні ды мітусні. А ў гарадах? Мне адзін казаў: “Вясну празяваў! Не прыкмеціў!” Вось так.

Сцяпан падняўся.

– У такі час жывем, нічога не зробіш. Рада б вам дапамагчы, але.. Самі разумееце.

– Я разумею, ды вось тут баліць, – ён дакрануўся рукой да грудзей. – Вы прабачце, калі што не так сказаў. Мне гаварылі – тут плаціць трэба. Колькі?

– Нічога. Мы не з усіх бярэм, ды і гледзячы якое пытанне.

– То тады – вялікі вам дзякуй!

– Няма за што.

Сцяпан падышоў да дзвярэй, забраў свой клунак.

– А ўсё-ткі шкада Яго і ўсё! Я вось не прыпомню, аб кім Ён сказаў: “Жыццё пражыў, як песню спеў”. А сам не дапеў сваю песню, не паспеў...

Сцяпану чамусьці не хацелася выходзіць. Ён прыадчыніў дзверы, азірнуўся на жанчыну:

– А можа, усё ж... Хоць – не, разумею. Да пабачэння!

– Усяго вам добрага!

Ён выйшаў на вуліцу, паволі паплёўся да аўтобуснага прыпынку. І хоць у яго трохі пасвятлела на душы, непрыемны асадак застаўся. І Сцяпан ведаў, што ніколі ад яго не пазбавіцца.

Дадому вярнуўся позна вечарам, калі вёска ўкладвалася спаць. У хатах свяціліся вокны. Сярод іх Сцяпан хутка знайшоў сваё.

# Шабашнікі

У брыгаду шабашнікаў Алесь трапіў выпадкова. Дагэтуль працаваў на Чукотцы, у старацельскай арцелі. Але вялікія надзеі на першы ў яго жыцці сезон рухнулі, быццам картачны домік. "А ўсё праз Сцёпку – згары ён ясным агнём! Паслухаў гэтага баламута, развесіў вушы! Так табе і трэба!" – дакараў ён сябе.

Сцёпку ведаў з дзяцінства. Раслі ў адной вёсцы. Матаўся той па белым свеце, як перакаці-поле. І на рыбных промыслах паспеў пабываць, і на БАМе. Куды толькі яго не насіла! Апошнія гады аціраўся на Чукотцы. Летась заманіў туды і Алеся. І ён бы ні за што не паехаў, але начальнік аўтакалоны, дзе Алесь працаваў на старэнькім "Зіле", кожны год абяцаў новую машыну. У апошні раз, калі прыгналі пяць новенькіх "Камазаў", і яму, як і заўсёды, не дасталося, не вытрымаў, звольніўся.

У той жа вечар сустрэў Сцёпку ў закусачнай.

– І правільна зрабіў, – дастаючы цыгарэту, гундосіў захмялелы Сцёпка. – Даўно трэба было кінуць гэтую лайбу! Паедзем, Алесь, за сезон тысяч сем хапнеш, а то і больш. Новенькія "Жыгулі" за якіх восем месяцаў!

Машыну Алесь не збіраўся купляць, нават каб і былі грошы. Але ж і пра жаніцьбу трэба было думаць. Як-ніяк, а дваццаць сем гадкоў стукнула – самая пара, а то і ў старых халасцяках можна апынуцца.

І ён згадзіўся. Колькі яны зямліцы перавярнулі бульдозерамі – страшна падумаць. А золата няма – хоць ты плач. І пачалі разбягацца хлопцы, як тыя зайцы. Сцёпка паехаў шукаць шчасця ў іншую арцель, а Алесь рашыў вяртацца дадому. Прыляцеў у Хабараўск з адной дзесяткай у кішэні. Адразу ж падаўся на чыгуначны вакзал. Спачатку хацеў папрацаваць на разгрузцы вагонаў, каб цягніком дабрацца да Мінска, але як на тое зло – ніводнага вагона.

– Ну і чорт з вамі! – вылаяўся ён і, падышоўшы да касы, падаў дзесятку.

– Дайце білет на маскоўскі. Дакуль хопіць?

– Зараз паглядзім, – жанчына разгарнула тоўсты даведнік. – Да станцыі Чаны.

– А дзе яны?

– За Новасібірскам.

– Чаны дык Чаны – давайце.

Жанчына падала яму білет і рэшту.

– Яшчэ і на чай засталося! – з усмешкай прамовіў ён.

Яму хацелася як мага хутчэй пакінуць гэты край. Успомніў сваю вёсачку, раку, а за ёй сасновы бор. І нечакана стала радасна на душы. Радасна ад таго, што зноў убачыць усё гэта: скупанецца ў халаднаватым Нёмане, а вечарамі будзе ўдыхаць смаляністы дух, змешаны з пахам скошанай травы, аеру...

Як толькі крануўся цягнік, Алесь пайшоў у канец вагона, дзе былі вывешаныя назвы ўсіх прыпынкаў. Знайшоў і "свае" Чаны. Цягнік прыбываў туды ў дзве гадзіны ночы. Гэта ўзрадавала яго. Рашыў не казаць праваднiцы, мо пашанцуе праехаць да раніцы "зайцам". А там будзе відаць, можа, яшчэ і дня прыхопіць! Шэсць сутак ідзе цягнік да Масквы. А былі б грошы – накупіў бы піва, і глядзі праз акно на Сібір-матухну! Але праўду кажуць: "Чалавек думае, а Бог смяецца". Яшчэ за гадзіну да Чанаў праваднiца разбудзіла яго і падала білет. Ён паспрабаваў яшчэ заснуць, але дзе там!

– Уставайце! – трэсла яна Алеся за плячо. – Праспіце свае Чаны. Мо там сустракаць будуць, хвалююцца, чакаюць!

– Як жа – чакаюць! – пазяхаючы, бурчэў ён, – двое з насілкамі, а адзін з даўбежкаю. Патрэбны мне гэтыя Чаны як зайцу стоп-сігнал.

Але прыйшлося падняцца. Выскачыў з цёплага вагона, а там калатун, цемра.... Ні адна жывая душа не выйшла з цягніка. Яно і зразумела – хто тут што забыўся? А вось у цягнік садзіліся. І ён зайздросціў гэтым незнаёмым людзям, якія ехалі ў Маскву, а то і далей, да цёплага мора.

Людзей на вакзале было мала. Амаль усе спалі, улёгшыся на лаўках. Толькі ў самым кутку сядзелі ля сваіх клункаў дзве бабулі і ціхенька размаўлялі. Ён знайшоў сабе месца ля самага акна. Падлажыў пад галаву рукзак і адразу ж заснуў.

Прачнуўся а дзесятай гадзіне раніцы. Сядзеў на лаўцы і думаў, што рабіць далей. Нядрэнна было б і пагаліцца, бо шчэць на шчоках непрыемна казытала, але брытву ён згубіў яшчэ ў арцелі.

І тут да яго падышоў невялічкі мужчына з цёплай і добрай усмешкай на твары. Цяжка было сказаць, колькі яму гадоў: мо пяцьдзесят, а то і ўсе шэсцьдзесят.

– Падзарабіць не хочаш? – спытаў ён і прысеў побач.

Алесь навастрыў вушы.

– А што рабіць?

– Дамы будуем у калгасе, ды вось аднаго чалавека не хапае.

– Дык вы ад якой арганізацыі, ці як?

– Ты што! – мужчына махнуў рукой. – Шабашнікі мы.

– А-а... – працягнуў Алесь. – Я не супраць, але ж вы тут надоўга, а мне б толькі на білет якую сотню – і ўсё.

– Далёка табе ехаць?

– Да Мінска, а там яшчэ аўтобусам.

– Зямляк, значыць! – мужчына паляпаў яго па плячы. – А мы ўсе трое мінчане. Цябе як зваць?

– Алесь.

– А я Кузьма. Куды табе спяшацца? Папрацуй з намі месяцы тры, то не толькі сотню, а тысячы чатыры будзеш мець!

– Мне адзін сем абяцаў. З'ехаў з ім на Чукотку, а там нават на білет не зарабіў. Мо і ў вас такія заробкі?

– Не ведаю, як зарабляюць на Чукотцы, а я тут не першы год. Менш чым тры тысячы за лета ніколі не было. Паедзем – не прагадаеш!

– Эх, была не была! Згодзен! Толькі давай спачатку перакусім, а то я суткі не еў – кішкі марш іграюць.

Яны падняліся і накіраваліся да буфета. Падсілкаваўшыся, зноў прыселі на лаўку.

– Праз гадзіну будзе аўтобус, – сказаў Кузьма.

– Далёка ехаць?

– Каля сотні кіламетраў.

– Ого! Далекавата забраліся.

– А бліжэй работы няма. Развялося нашага брата. Тут брыгады па калгасах шастаюць і днём і ноччу. Жанаты?

– Не. А што?

– Сібірачку табе знойдзем! Я і сам на старасці гадоў прыляпіўся тут да адной. Агонь, а не жанчына! Не тое, што мая...

– Нервовая ці сварлівая?

– Ды як табе сказаць... Дваццаць сем гадкоў пражыў, а радасці не бачыў. Што ні зраблю – усё не так. Двое дачок нарадзіла, а як была чужой, так і засталася.

– А дзе яна цяпер?

– У Мінску, жыве ў трохпакаёўцы. Я ж пасля вайны ўвесь час на будоўлі працаваў.

– Дык ты і ваяваў?! – здзівіўся Алесь.

– А як жа! У сорак чацвёртым прызвалі, а так партызаніў. Вось дзе ўжо нацярпеўся!

– Хадзіў у разведку?

– Дзе там! Было ў мяне заданне паскладаней. Камандзір адпраўляў на кірмаш, я там выменьваў на яйкі і сала махорку. І хаця чатырнаццаць гадоў меў, але баяўся. Заловяць паліцаі – адразу ж сцямяць, куды махорка. Гэта добра яшчэ, што расточкам не выйшаў. Потым два разы ў танку гарэў, а так страшна не было, як тады.

– Даўно шабашнічаеш?

– Трэці год. Думаеш, мне гэтыя грошы патрэбныя? Праз два гады на пенсію. Кватэра ёсць, адзеты, абуты.

– Можа, “Запарожца” на рыбалку не хапае?

– Не. Дзеля дачок стараюся, старэйшая ўжо паспела разысціся. А вось каб было тады ў мяне з тысяча рублёў, то, далібог, жылі б яны і цяпер.

А так... Пачалі сварыцца, потым ён запіў, прапала сям'я. Цяпер малодшая інстытут заканчвае, замуж збіраецца. Вось ёй тры тысячы маю.

– Дык не ў грашах справа! – запярэчыў Алесь. – Ты можаш ім і тэлевізар купіць, і машыну, а не сойдуцца характарамі – і ўсё!

– Яно так. Цяпер такая моладзь пайшла, што і сама не ведае, чаго хоча. Але на першых парах дапамога патрэбна. Чаму ж цяпер страхуюць дзяцей? Каб к таму часу, як будзе жаніцца, назбіралася крыху грошай. А ты гаворыш... Сам чаго на Чукотку падаўся?

– Угаварыў адзін. Паабяцаў залатыя горы.

– Таксама ж на нешта хацеў зарабіць? – дапытваўся Кузьма.

– Так, на ўсякі выпадак. Жаніцьба там, ці што...

– Вось-вось, сам і прагаварыўся.

Ён зірнуў на гадзіннік.

– Аднак хадзем. Каб нам аўтобус не празяваць.

Ехалі гадзіны тры. Алесь нават паспеў задрамаць.

– Выходзім, – Кузьма злёгку штурхануў яго ў плячо.

Алесь расплюшчыў вочы. Ехалі па шырокай вуліцы. Каля магазіна аўтобус спыніўся.

– Вось гэта наша Арлоўка, – сказаў Кузьма, як толькі яны выйшлі з аўтобуса. Потым зірнуў на гадзіннік. – Якраз на абед паспеем. Тут нам адна бабуля гатуе.

Калі зайшлі ў хату, двое хлопцаў ужо абедалі.

– Знаёмцеся. Гэта Алесь, наш зямляк з-пад Мінска, – сказаў Кузьма.

– Валера, – назваў сябе высокі малады хлопец і падаў руку Алесю. Другога звалі Лявонам. Было яму гадоў трыццаць пяць, а то і больш.

Пасля абеду адправіліся да старшыні калгаса.

– Чаго ён нас выклікае? – спытаў Алесь.

– Мы ж тут чатыры домікі падрадзіліся пабудаваць. Толькі залілі фундамент, як распалася брыгада. Восем чалавек было, а засталося трое.

Вось ён і хоча пагутарыць з намі, не давярае. Усяго па сто рублёў авансу выпісаў, а ўсё праз нашых абармотаў, – Кузьма са злосцю сплюнуў.

– А куды вашы хлопцы падаліся?

– У Петрапаўлаўцы працуюць. Кіламетраў дваццаць адгэтуль будзе. Думаеш, там больш заробяць?

– Калі ім далі рамонт кароўніка, то заробяць, – уступіў у гутарку Лявон.

– Хто ім дасць кароўнік? – усклікнуў Кузьма. – Там тры брыгады армян! Такія ж домікі будуюць, а матэрыялу ў іх няма, быў я там.

Старшыня з першага погляду не спадабаўся Алесю. За сталом сядзеў даволі малады мужчына з коратка падстрыжанымі вусікамі і напамаджанымі валасамі. Нават здалёк было відаць, што чымсьці яны намазаныя. Старанна паголены, у белай кашулі, з вялкім залатым пярсцёнкам, у якім загадкава паблісквау камень блакітнага колеру, ён зусім не быў падобны на старшыню калгаса. Штосьці пісаў, а ўся брыгада моўчкі стаяла ля парога. Алесю нават на момант падалося, што яны прыйшлі наймацца на заробкі да нейкага пана.

Старшыня між тым усё яшчэ пісаў, не звяртаючы на іх ніякай увагі. Алесь хацеў тут жа выйсці, бо неяк агідна і прыкра стала на душы, але ўспомніўшы, што ў кішэні ні капейкі, таксама стаяў, апусціўшы галаву.

Урэшце старшыня кінуў ручку, зірнуў на іх.

– Садзіцеся, хлопцы. Колькі ж вас засталося?

Кузьма, як брыгадзір, падняўся і, камечачы ў руках шапку, быццам той школьнік, адказаў:

– Чатыры чалавекі. Пяцёра з'ехалі, а мы тут аднаго знайшлі, – кіўнуў ён на Алеся, – так што два домікі зробім.

Старшыня падняўся, падышоў да акна, доўга глядзеў на раку, думаў.

– Проста не ведаю, што з вамі рабіць. Спачатку так спадзяваўся на вас. Беларусы – працавіты народ, дабрадушны, без усялякіх там хітрыкаў. Мне ж людзей няма куды сяліць. Апошнія спецыялісты

разбягуцца! Паверу вам у апошні раз. Але глядзіце! Два домікі каб зрабілі пад ключ, зразумелі? Падпісвайце дамову. Усе чыталі?

– Чыталі! – за ўсіх адказаў Кузьма.

Тут зазвінеў тэлефон. Пакуль старшыня размаўляў, Алесь пачаў чытаць змест дамовы. Адзін пункт асабліва яго ўразіў. Там было напісана, што калі брыгада не пабудуе дамы поўнасцю, то ёй будзе заплачана толькі семдзесят працэнтаў ад заробленага.

Усе падпісалі. Алесь таксама, але ў апошнюю хвіліну не вытрымаў, спытаў:

– Тут вось напісана, што вокны, дзверы, дошкі на падлогу мы атрымаем з калгаса. Патрэбна яшчэ дапісаць, што калі іх не будзе, то грошы атрымаем поўнасцю.

Старшыня сеў за стол.

– За гэта не бойцеся. Ваша задача – пабудаваць домікі, а за матэрыялам у нас ніколі затрымкі не было.

– Але чаму не дапісаць некалькі слоў? – працягваў настойваць на сваім Алесь.

– Дзе вы знайшлі такога ўпартага земляка? – старшыня ўсміхнуўся.

– Што ты ўпёрся, як той баран, – накінуўся на Алеся брыгадзір. – Табе ж сказалі: усё будзе! А не – дык заплацяць!

Старшыня маўчаў, потым сказаў:

– Вы не крыўдуйце, хлопцы, але была б мая воля, я шабашнікаў у турму саджаў бы.

– За што ж гэта? – не стрымаўся Алесь.

– Ёсць за што, – ён уважліва агледзеў прысутных. – Хто такі шабашнік? Гэта чалавек, які наЖываецца на цяжкасцях дзяржавы. Былі б у мяне людзі – самі б будавалі, і не за такія грошы! А дзе іх узяць? Вунь Мітрафанаўка стаіць, вёска наша, ні адной жывой душы не знойдзеце. Хто з вайны не вярнуўся, хто памёр. А маладыя? Дзесяцігодку скончыў – толькі яго і бачылі!

– А я ведаю, – сказаў Алесь, – што ёсць калгасы, дзе нават з горада не бяруць, бо сваіх хапае.

– Які ж ты шустры! А вось тут паспрабуй развярнуцца! Ад нас да раёна – больш за сто кіламетраў. Летам ні кроплі дажджу. Новыя трактары атрымліваем, а садзіць на іх няма каго. Вось так!

У кабінеце стала ціха. Старшыня зірнуў на гадзіннік.

– Разгаварыліся мы тут, а мне ў райкам трэба. Пытанні будуць?

– Няма, – хуценька за ўсіх адказаў Кузьма, якому такая размова была не па нутры.

– Тады за працу. Бывайце!

Калі выйшлі на вуліцу, то Кузьма сказаў:

– Навошта ты з ім у спрэчку кінуўся? Мы і так тут на валасіне вісім. Мог бы выгнаць – і шукай ветру ў полі! А ўжо сярэдзіна мая. Дзе яшчэ работу знойдзем? Два домікі зробім, будуць стаяць як лялькі! Не раз успомняць сібіракі беларусаў.

– Што ж яму і слова нельга вымавіць! – абурыўся Алесь. – Шабашнікаў у турму! Мы што – крадзем ці лішняе бярэм? Сваім гарбом зарабляем. Ён сам тут як князёк які!

Жылі ў вялікім доме, дзе раней была пачатковая школа, а калісьці тут жыў адзін з мясцовых сібірскіх багацеяў. Уставалі ў пяць гадзін раніцы. Па праўдзе кажучы, Алесь так рана ніколі не падымаўся. Бывала, улетку – на выхадныя, любіў пасядзець з вудачкай ля ракі. Але ж затое пасля адсыпаўся. А тут не было яшчэ і шасці, а яны ўжо стукалі сякерамі. К канцу мая пачало цяплець, а ў поўдзень дык добра прыпякала.

– Праз тыдзень такая спякота пачнецца, што і ў рацэ спасу не будзе, – сказаў Кузьма, – так што трэба хутчэй сцены выгнаць.

Бярвёны былі падрыхтаваныя: абпіленыя з двух бакоў, але ўсе з лістоўніцы. А яна ж цяжкая – быццам з жалеза. Учацвярых ледзь паднімалі адзін канец. Гэта толькі лічылася, што яны будавалі два домікі. На самай жа справе атрымлівалася – чатыры. Бо кожны дом быў разлічаны на дзве сям'і: для

кожнай па чатыры пакоі. Глухая сцяна раздзяляла дом на дзве палавіны. А яшчэ ж трэба было выкапаць склеп ды зладзіць хлеўчукі.

Сцены выгналі хутка. І адразу ж узяліся за кроквы. І калі яны занялі сваё месца, домікі прынялі велічны выгляд.

– Наладзім дах – палову справы, лічы, зроблена, – выціраючы пот з твару, сказаў Кузьма.

Алесь працаваў з ім на пару і бачыў, што цяжкавата прыходзіцца брыгадзіру, ды гэта і не дзіўна ў яго гады... У суботу працавалі да абеду. Потым наладжавалі лазню. Тут яна ў кожнага свая, сібіракі без яе жыць не могуць. Парыліся, пілі чай, а Кузьма, адкуль толькі і сіла бралася, вечарам бег да аўтобуснага прыпынку, каб паспець да сваёй Кацярыны, якая жыла ў Петрапаўлаўцы. Вёскі былі тут далёка – пешкі не дабрацца. Не тое, што ў нашай Беларусі – лепяцца адна ля другой. Тут размах, прастор!

І гэтым карысталіся мясцовыя жыхары. Алесь здзівіўся, калі ўбачыў, колькі жыўнасці трымалі тут у кожным доме. Па пяць-шэсць свіней, карову, цялушку, а гусей ды качак – не злічыць. Свіней вясной выганялі да ракі, адзін бераг якой быў забалочаны: там і з касой не ступіш, і карову не загоніш. А свінням раздолле! Так і жывуць там усё лета. Зрэдку Алесь бачыў, як гаспадыні падкормлівалі іх сырой бульбай. І калі ён расказаў адной бабулі, што ў Беларусі для свіней бульбу вараць, абмешваюць мукой і дабаўляюць яшчэ таго-сяго, яна вельмі здзівілася.

Чэрвень быў душны, спякотны. Месцамі зямля патрэскалася, пачынала выгараць трава. Паабедаўшы, гадзіны дзве адпачывалі, бо працаваць у такую спякоту было немагчыма.

– Калі ж гэта дожджык будзе? – спытаў Алесь, калі яны, павячэраўшы, ляжалі на ложках.

– Летась зусім не было, – адказаў Кузьма.

– Як гэта? – здзівіўся Алесь.

– А вось так! Не было і ўсё!

– Дык уся збажына згарыць!

– Тут паліваюць. Спецыяльная брыгада толькі гэтым і займаецца.

Лявон чытаў нейкі часопіс, але ўбачыўшы, што Валерка піша новы ліст сваёй маладой жонцы, не стрымаўся:

– Што ты ўсё пішаш?! Думаеш, ёй патрэбныя твае пасланні?

Валерка моўчкі пісаў, а Лявона ўжо было не стрымаць:

– Я таксама раней пісаў, калі шабашнічаў першы год. Дурань быў – свет такіх не бачыў!

– А цяпер паразумнеў? – спытаў Алесь.

– А як жа! – усміхаючыся, адказаў за яго Кузьма. – Два сезоны шабашнічаў, прыадзеў сваю птаху, а на трэці яе і след прастыў.

– Такое ж і яго чакае, – сказаў Лявон, хітнуўшы галавой у бок Валеркі.

А той падпісаў канверт і палажыў яго ў кнігу.

– Мая не ўцячэ, – урэшце прамовіў Валерка, – ды і шабашнічаю першы і апошні раз. Крыху абстаўлю кватэру, а там з Мінска ні на дзень не выеду.

– Эх, Валерка! – Лявон падышоў да яго і паляпаў па плячы. – Чакае цябе мая доля!

Домікі накрылі шыферам у пачатку ліпеня. Цяпер здалёк яны былі добра відаць. Нават аднойчы надвячоркам старшыня калгаса прытармазіў сваю “Ніву”, выйшаў з машыны, і некалькі разоў абышоў вакол іх. Застаўся задаволены, паабяцаў выпісаць па трыста рублёў авансу.

Алесь ніколі не будаваў дамоў. Яму здавалася, што і сапраўды яны паспеюць усё зрабіць. Але пачаліся перабоі з матэрыяламі. Вокны і дзверы прывезлі, а дошак на падлогу і шалёўку не было. Каб дарэмна не марнаваць часу, узяліся за тынкоўку. Пачалі абіваць сцены лучынай. На першы погляд – нічога складанага, а за два тыдні ледзь управіліся.

Непрыкметна пачаўся жнівень, а яны ўсё цягалі вёдрамі раствор. І хаця была маленькая бетонамяшалка, усё патрэбна было самім падвезці: пясок, цэ-

мент, алебастру, вапну. Пясок яшчэ прасявалі праз сіта. Добра, што рэчка была побач. Кузьма з Лявонам так хутка кідалі кельмамі раствор на сцены, што Алесь з Валеркам ледзь паспявалі яго падносіць. Вёдры цяжкія – гэта не сякерай махаць. Пасля работы балелі рукі, на далонях пачалі з'яўляцца мазалі. А сцен, перагародак у двух дамах – не злічыць.

І тут Алесь зразумеў, што зрабіць домікі поўнасцю яны не змогуць, нават каб і завезлі ўсе неабходныя матэрыялы. Вечарамі маўчалі. Не было настрою. У Алеся было ўжо адкладзена дзве сотні рублёў. І ён не раз падумваў аб тым, каб плюнуць на ўсё ды даць цягу. І не таму, што цяжка было працаваць. Не! Ён працаваў з маленства. Але тут, ідучы вечарам з работы па вуліцы, ён за спінай адчуваў асуджальныя позіркі сібіракоў. У такія хвіліны цяжка станавілася на душы. Яму здавалася, што ходзіць тут, як той жабрак. Прыехаў пабірацца ў гэтую пустэчу, дзе нават яблыні не раслі. І хаця ўсцешваў сябе, што робяць добрую справу, зарабляюць грошы сваімі рукамі – нічога не памагала. Ды і хлопцаў было шкада. Усе ж свае – беларусы.

І толькі ў канцы жніўня, калі спала спякота, закончылі тынкоўку. Адразу ж узяліся за хлявы. Але не было дошак. Давялося цягаць трактарам бярвёны ад ракі, дзе стаялі калгасныя плыты. Вазілі на пілараму, распускалі на дошкі. А тут палілі вераснёўскія дажджы. Холадна стала, золка.

– Учора хадзіў да армян, – сказаў Лявон.

– Ну і як яны? – спытаў Кузьма.

– Дамоў збіраюцца. Кароўнік адрамантавалі. Па восем тысяч на нос.

– Вось дык хапнулі! – здзівіўся Алесь.

– Што на іх раўняцца! – Кузьма падняўся з ложка, дастаў з пачкі цыгарэту. – Яны тут пяты год працуюць. Дываны старшыню прывозяць. А летась мне сам адзін армяшка прызнаўся, калі старшыня ў адпачынак вылятаў – пяць тысяч яму адвалілі. Вось так! А кароўнік і мы б адрамантавалі, ды яшчэ за такія грошы. Трыццаць дзве тысячы ўзялі, а што зрабілі? Новыя кроквы паставілі, накрылі і кармушак нарабілі.

– Нас таксама няхай разлічвае, – сказаў Лявон.

– Рана яшчэ! – запярэчыў Кузьма.

– Чаму рана?!– усклікнуў Лявон. – Дошак няма і не будзе! А нам сядзі і чакай з мора пагоды! Хоць бы халтуру якую падкінулі.

Раніцай усё ж Кузьма пайшоў да старшыні. Вярнуўся толькі пад абед. Моўчкі дастаў з-за пазухі дзве бутэлькі "Экстры".

– Дошак не будзе, – сказаў ён, сядаючы пад сцяной дома. – Заўтра будуць прымаць домікі. Трэба навесці марафет ды замачыць іх як след.

– А чаго так доўга быў? – спытаў Валерка.

– Хадзілі са старшынём на раку. Невялічкі масток хочуць зрабіць. За вёскай, у самым вузкім месцы.

– І колькі ён дае?

– Тысячу рублёў.

– Няхай сам робіць за тысячу!

– Я і не згадзіўся – дзве запрасіў.

– А ён што?

– Армянам аддаў.

– Думаеш, яны за тысячу зробяць?! – усклікнуў Лявон.

– Не такія яны дурні, – дадаў Алесь.

– Яны і за дзве не возьмуцца! – Кузьма вылаяўся. – Я іх ведаю не першы год.

Прыбіралі да цямна. Усюды валяліся аскабалкі дошак, трэскі, лучына. За вячэрай выпілі дзве бутэлькі. Валерку паказалася мала, і ён адправіўся на пошукі яшчэ адной. Праз якую гадзіну хтосьці пастукаў ім у акно.

Алесь першы ўсхапіўся з ложка, адкрыў фортку.

– Ці не вашага там хлопца армяне лупяць! – прагучаў усхваляваны голас цёткі Галі, у якой яны бралі малако.

– Дзе?

– Ля клуба, мне бабы сказалі.

– Збегайце, хлопцы, забярыце, – Кузьма з цяжкасцю падняў галаву з падушкі.

Алесь з Лявонам хутка апрануліся і выбеглі на вуліцу. Валерку знайшлі за клубам, ля самага плота.

У парванай акрываўленай кашулі ён ляжаў і штосьці мармытаў. Відаць, дзесьці добра яшчэ дабавіў, бо калі яны паднялі яго, ён ледзь трымаўся на нагах. З цяжкасцю прывялі дадому. Знялі кашулю, абмылі, палажылі на ложак.

Праспалі амаль да абеду. Валерка першы падняўся, сядзеў на ложку і разглядваў у люстэрку свае сінякі.

– Ну і фінгалы! – здзівіўся Кузьма. – Хто ж цябе так размаляваў?

– Армяшкі. Учора зайшоў да іх – каньячком пачаставалі. А потым адзін, такі гарбаносы, падпіў і кажа: вам за масток старшыня тысячу абяцаў, а нам за чатыры аддаў. А чаму? Бо беларусы – дурні з дурняў! Ну, я не стрымаўся – урэзаў яму па носе... А тут яшчэ трое наляцелі. Цяпер так бакі баляць, мо рабрыну якую паламалі. А галава гудзе – спасу няма!

Ён зноў улёгся на ложак. Падняўся адзін Кузьма. Хуценька памыўся, выпіў шклянку малака і, ужо ля парога, сказаў:

– Так і быць – адпачывайце. Пайду домікі здаваць.

Вярнуўся ён пад вечар. Моўчкі паставіў на стол тры бутэлькі гарэлкі. Адразу ж, як па камандзе, узняліся над падушкамі ўскалмачаныя галовы.

– Ну і бугор у нас! – усклікнуў Лявон. – Толькі падумаў, як бы апахмяліцца, а бутэлькі тут як тут!

– Тэлепат! – дадаў Валерка.

– Прынялі домікі? – спытаў Алесь.

– Прынялі, – Кузьма ўздыхнуў. – Заўтра можна атрымліваць грошы.

– Колькі на нос?

– Па тысячы рублёў.

– Усяго?!– здзівіўся Лявон.

– Вы ж спіце, а што я там адзін зраблю! Паўдня ў канторы лічылі – больш не выходзіць. Як пачалі пералічваць усё нязробленае – спіс на ўсю старонку!

– Судзіцца будзем! – не ўнімаўся Лявон. – Што зроблена вось гэтымі рукамі – заплаці!

Валерка тым часам напоўніў чаркі, дастаў агуркоў, нарэзаў тонкімі скрылькамі сала.

– Давайце прапусцім, як у песні пяецца – па адной, а раніцай рушым да старшыні.

Усе моўчкі выпілі.

– Толькі не напівацца, – Кузьма ўзяў бутэлыку, схаваў у рукзак. – А то заўтра зноў не паднімецеся.

– А чаго паднімацца? Я па такую палучку не пайду, – сказаў Лявон, разліваючы рэшту гарэлкі ў шклянкі.

– Пагаварыць жа трэба! Што я адзін – усёй брыгадай пойдзем.

Раніцай старшыню ледзь засталі.

– Так, хлопцы, – сказаў ён, збіраючы паперы на стале, – пакуль ёсць грошы – палучайце, бо потым чакаць будзеце.

– Мы не згодны з такой палучкай, – сказаў Лявон.

– Чаму?

– Домікі амаль гатовыя – і па тысячы рублёў? Мы судзіцца будзем!

– Судзіцеся, я не супраць. Але глядзіце, каб яшчэ менш не высудзілі.

– Былі б дошкі – мы б іх закончылі, так? І атрымалі б па чатыры тысячы.

– А колькі ў вас па мелачоўцы не зроблена?! – перабіў яго старшыня. – Вось ваш брыгадзір ведае. І яшчэ: хто мне за тыя расцэнкі возьмецца вясною слаць падлогу, рабіць шалёўку, фарбаваць? Вы ж усе аднолькавыя – пабольш бы ўрваць, а калгас не дойная карова!

– Не вам бы пра гэта гаварыць, – сказаў Лявон.

– Ах вось яно што! Вымятайцеся! Пужаць надумалі! Смаркачы!

Дадому ішлі моўчкі. І толькі калі селі за стол і Кузьма дастаў учарашнюю бутэльку гарэлкі, Алесь сказаў:

– Ну і чаго мы дабіліся? У старшыні моцныя сувязі ў раёне, мне іхні бухгалтар гаварыў. А хто мы для іх?

– Што прапануеш? – спытаў Кузьма.

– Давайце атрымаем па тысячы рублёў, а там і судзіцца можна. Пакуль у суд, туды-сюды – зіма застане! Ды і грошай ужо няма. За што жыць будзем?

– Табе што, – прамовіў Лявон, – хаця б на білет хапіла, а дзе справядлівасць! Нас жа як авечак абдурылі!

– Цяпер ён не разлічыць, – сказаў Валерка.

– Нікуды не дзенецца! Я заўтра пайду і ўсё ўладжу, – сказаў Кузьма. – Валерка, разлівай.

Грошы атрымалі на наступны дзень. А праз гадзіну Алесь сядзеў ужо ў аўтобусе. Хлопцы засталіся. Валерка хацеў спачатку ехаць з ім, але ў апошнюю хвіліну перадумаў.

"Толькі б да вакзала дабрацца, – думаў Алесь, – толькі б дабрацца!"

Білет купіў без цяжкасцей. І толькі ўладкаваўся на верхняй паліцы, як адразу ж моцна заснуў.

## Партрэт

Старшыню сельсавета Сароку Мікалая Пятровіча тэрмінова выклікалі ў вобласць. "І чаго б гэта?" – думаў ён, седзячы ў сваім кабінеце на другім паверсе. Бо з тыдзень таму ён быў там на нарадзе, выступаў і нават меў асабістую размову з кіраўніком вобласці Іванам Іванавічам. Таму быў яшчэ на памяці ягоны артыкул у рэспубліканскай газеце, дзе ён якраз напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў расчахвосціў у хвост і ў грыву кіраўніцтва Беларускага народнага фронту. Асабліва дасталося іхняму лідэру, якога ён прапясочыў як мае быць, сабраўшы на таго вялізны кампрамат, у якім, калі шчыра прызнацца, было нямала фактаў са столі.

І хаця Мікалаю Пятровічу ў той час было ўсяго дваццаць пяць гадоў і ён толькі другі месяц працаваў старшынём сельсавета, але палітычны нюх яму падказваў, што на БНФаўцаў стаўкі рабіць нельга – пралятуць яны, як той тазік па асфальце. І мясцовую іхнюю філію яму ўдалося праўдамі і няпраўдамі спачатку раскалоць, а пасля амаль цалкам і ліквідаваць.

Давялося дзеля гэтага пайсці і на пагрозы, шантаж, нявыдачу зямлі пад будаўніцтва, і на звычайныя хітрыкі. Адчуваў, што такія дзеянні калісьці залічацца яму ў паслуговы спіс, толькі трэба набрацца цярпення і чакаць. Не працаваць жа да пенсіі ў сельсавеце! Жыццё людзей пагаршалася з кожным днём, а тут шустрыя БНФаўскія мазурыкі прапаноўвалі адным махам скочыць у капіталістычны рай. А ў людзей яшчэ нават і цяпер сядзіць каменем у душы настальгія па былым жыцці. Зусім яшчэ нядаўна, якраз перад выбарамі ў парламент, прыперліся два БНФаўскія лідэры на сустрэчу з выбаршчыкамі. Але і тут Мікалай Пятровіч быў на вышыні – спрацаваў на ўсе сто з гакам: імгненна імітаваў рамонт у мясцовым клубе, і тым нічога не засталося, як з'ехаць у іншае месца. Праўда, тут ужо ён дзейнічаў смела, амаль у адкрытую, бо меў афіцыйна-патаемнае распараджэнне з раёна, як дзейнічаць з тымі або ішымі кандыдатамі ў дэпутаты. На той нарадзе, у час перапынку, Іван Іванавіч сам падышоў да яго, паціснуў руку і коратка распытаў пра жыццёбыццё ў іхнім Зарэччы. Пасля нагадаў пра яго былыя артыкулы ў друку і ў жартаўлівай форме папярэдзіў, што і цяпер спаць у шапку яшчэ рана, бо апазіцыянеры розных масцей, хаця і загналі іх у норы, але пакуль пацІху шкодзяць сапраўдным барацьбітам за народнае шчасце. А прыканцы іхняй кароткай сустрэчы загадкава і шматабяцальна зірнуў на яго і па-сяброўску паляпаў па плячы. Гэта быў яўны намёк на нешта. Мікалаю Пятровічу падалося, што кіраўнік

вобласці чагосьці не дагаворвае, і падумалася, што той хоча зноўку даручыць яму нейкую патаемную акцыю.

І вось гэты нечаканы выклік. Ён не на жарт усхваляваў яго. Але, прыкінуўшы, што і да чаго, Мікалай Пятровіч супакоіўся, і ў яго нават нечакана ўзняўся настрой.

А чаго баяцца? Вялікіх промахаў на рабоце не было нават у самыя першыя дні працы механікам у калгасе пасля інстытута. А пасля ўжо, дзесьці праз два гады, яму прапанавалі ўзначаліць сельсавет. І ён згадзіўся: як-ніяк, а першая прыступка па кіроўнай службовай лесвіцы. Ступіў на адну, замацаваўся, а потым і на другую можна ўскарабкацца.

Жонцы, якая працавала ў мясцовай школе, вырашыў пра свае думкі пакуль не расказваць. Вечарам ён толькі папярэдзіў яе, што едзе ў камандзіроўку. Яна не стала ў яго дапытвацца, а толькі папрасіла, каб сёе-тое купіў у горадзе.

Ехаць было няблізка – рэйсавы аўтобус шпарка імчаў яго амаль усю ноч, але затое з самага ранку ён першы трапіў у прыёмную кіраўніка вобласці.

Той а палове восьмай быў ужо на працы, пра што Мікалай Пятровіч пачуў ад сакратаркі, маладой і даволі прывабнай дзяўчыны, з пунцоваружовымі шчочкамі і гарэзлівымі ямачкамі на іх, якія на імгненне з'яўляліся падчас усмешкі.

Мікалай Пятровіч неўзабаве быў у кабінеце. Іван Іванавіч паднўся з-за стала і, выходзячы насустрач яму, прамовіў:

– Рад бачыць цябе, Мікалай Пятровіч! Самы ранні наведвальнік.

– Проста з аўтобуса...

Яны парукаліся.

– Праходзь, прысаджвайся. Я вось таксама амаль з сямі раніцы на працы.Такі, браце, час, што трэба працаваць, інакш – грош нам цана.

Ён зноўку ўсеўся ў сваё мяккае паваротнае крэсла, а Мікалай Пятровіч прысеў непадалёку, за даўжэзны стол.

А выклікаў я цябе вось па якой справе, – Іван Іванавіч на хвіліну змоўк, пасля адкрыў папку чырвонага колеру і працягваў: – Мы тут параіліся і вырашылі прапанаваць табе пасаду кіраўніка суседняга з вамі раёна. Што на гэта скажаш?

– Проста і не ведаю... Такая нечаканая прапанова, – Мікалай Пятровіч на імгненне разгубіўся, адчуўшы, як прыемная гарачыня шуганула па грудзях.

– Не буду ад цябе хаваць, што наконт тваёй кандыдатуры была ў мяне кароткая размова з самім, – Іван Іванавіч крутануўся ў сваім крэсле і паказаў рукою на партрэт.

– Ці пацягну я на такой пасадзе? Мо ёсць больш дасведчаныя кандыдаты?

– А то як жа! Кандыдатаў хапае. Яны ёсць, былі і будуць. А ты што – спалохаўся?

– Ды не... А што з былым кіраўніком?

– З ім здарылася бяда – знайшлі павешаным у лесе. Яшчэ ідзе следства, але вырысоўваецца вельмі непрыглядны малюнак: звязаўся з мафіяй, паграз у карупцыі, вось і фінал... Кіраўніцтва рэспублікі робіць стаўку на маладых, таленавітых і ўжо заявіўшых пра сябе людзей. Так што – прымай раён і працуй. А досвед – справа нажыўная. З чаго пачынаць – я табе падкажу, а пасля і ў госці пад'еду. Хачу цябе парадаваць – вырашана пытанне і наконт кватэры. Выехаў тут на зямлю абяцаную адзін гора-прадпрымальнік, вось ягоная трохпакаёўка і будзе тваёй. Так што – здавай справы ды прыступай да працы.

– А мой намеснік...

– За яго не хвалюйся, яму паўгода да пенсіі засталося, капаць пад цябе не будзе. І запомні – з гэтай хвіліны ты вертыкальшчык, і гэтым усё сказана. Улада – неабмежаваная, але ў рамках Канстытуцыі. Праўда, у жыцці бываюць сітуацыі, калі дзеля поспеху справы можна тое-сёе і парушыць. Усёк?! Нягледзячы на тое, што мы заключылі доўгачаканую дамову з Расіяй, абставіны ў рэспубліцы даволі складаныя. Мы

павінны палепшыць жыццё народа любымі сродкамі. Падкрэсліваю – любымі! Сам, – ён са сполахам хітнуў галавою на партрэт, – казаў нам пра гэта на вузкім паседжанні.

– Але ж пасада мая выбарная...

– Выберуць, нікуды не дзенуцца. А пачынай са скарачэння сваіх упраўленцаў. Іх там развялося – не злічыць. Рыба, як сам ведаеш, загнівае з галавы, яе і трэба ў першую чаргу аздаравіць. І з катэджамі разбярыся – растуць у тваім раёне як грыбы... І яшчэ хачу папярэдзіць, наконт патаемнага кантролю за ўсім і ўсімі. Тут у адным з раёнаў быў выпадак, калі міліцыя затрымала звычайнага жабрака-бомжа. Той дзе трэба і не трэба тыцкаў свой нос, ды ўсё падслухоўваў і запісваў. Затрымалі, давай дапытваць, а той ні слова, ды яшчэ пасміхаецца. А ў міліцыі на такое свая метода – давай дубасіць. Але і жабрак трапіўся не лыкам шыты – пачаў размазваць іх па сценцы. Гукнулі падмогу, а ён – плясь на стол пасведчанне капітана КДБ. Усёк?! Вось так. Яго вока, – ён зноўку крутануўся і паказаў рукою на партрэт, – не спіць ні днём ні ноччу! Але ты не хвалюйся: галоўнае – не загрымець бы нам над фанфары! І колькі слоў пра мафію. Пры рыначных адносінах яна была, ёсць і будзе. Праводзім і мы з ёю барацьбу. Але трэба ведаць, што і там людзі працуюць з галовамі і дыпломамі. І пагрозы будуць, і подкуп, і шантаж, і ўсё іншае. Тут – не мне цябе вучыць, тым больш, што раён твой прыгранічны. Я нядаўна чытаў успаміны былога мэра Парыжа. Дык той піша – у свой час яму ўдалося так паставіць справу ў горадзе, што сама мафія працавала на яго.

– Няўжо падаткі з яе браў у гарадскую казну?

– Хто яго ведае. Праз які годзік наладзім табе паездку ў Францыю, знойдзеш яго і выпытаеш. А што? Нам цяпер у капіталістаў трэба вучыцца. І наконт твайго працоўнага дня скажу: калі-нікалі папрацуй, на карысць справы,

да трэціх пеўняў. Я гэта к таму, што аднойчы затрымаўся, а дзесьці так а першай гадзіне ночы званок ад самога... Карацей кажучы: намотвай на вус – спатрэбіцца. Узрост твой спрыяльны для кар'еры. Вось і ўсё, – Іван Іванавіч падняўся з-за стала.

– Поспеху табе і ўдачы!

Дадому прыехаў познім вечарам. Калі расказаў сваёй Валянціне пра новую пасаду, тая спачатку здзівілася, а потым сказала:

– Дзе ж ты ўправішся з цэлым раёнам, ды яшчэ ў такі нялёгкі час!

– Людзі ж працуюць...

– У цябе досведу – кот наплакаў. А ты зірні навокал: калгасы развальваюцца, заводы стаяць...

– А дамова з Расіяй? Гэта табе што?

– Дамова на паперы. Колькі ўжо было падпісана дамоў, а што толку?

– Дык мне што – адмаўляцца?

– Не ведаю. Хаця б намеснікам папрацаваў, уведаў раён і людзей. А так... Паспрабуй, – яна ўздыхнула, – але будзь асцярожным, бо могуць так падставіць, што пасля не адмыешся.

Але калі пачула пра трагічны лёс папярэдніка, жонка не на жарт спалохалася.

– І ты сам лезеш у такую пятлю? Мафія цяпер такую сілу мае, што з ёй ніхто не справіцца, бо ўсюды ў яе свае людзі.

– А трохпакаёвая кватэра? – ляснуў ён апошнім козырам з жыццёвай калоды. – Няўжо табе не надакучыла выграбаць попел з грубкі?

– Паабяцалі даць праз годзік-другі, а зняць цябе могуць і праз паўгода.

– Тут ты праляцела. Трохпакаёўка ўжо чакае!

Парашылі: жонка дапрацуе ў школе да летніх канікулаў, а ён пакуль пажыве адзін. Нядоўга засталося – канчаўся прахалодны, са снегам, красавік.

Праз тыдзень Мікалай Пятровіч пераступіў парог свайго новага кабінета. Ён быў прасторны, утульны і светлы. Адразу ж кінуўся ў вочы партрэт самога, які, здавалася, наскрозь свідраваў яго сваімі

пранізлівымі вачыма... Мікалай Пятровіч, як зачараваны, некалькі хвілін моўчкі глядзеў на знаёмы твар і не мог зварухнуцца з месца. І тут, у дадатак да ўсяго, ён выразна пачуў: “Я тебе не икона. Садись и работай!”

Мікалая Пятровіча кінула ў дрыжыкі, у яго імгненна ўспацеў лоб, і ён на паўсагнутых нагах, утуліўшы галаву ў плечы, нясмела пасунуўся да свайго крэсла.

Праз які час ён ачомаўся і супакоіў сябе тым, што ўсё гэта яму падалося. Такое бывае, штосьці падобнае на галюцынацыю, пра гэтую з’яву ён аднойчы прачытаў у часопісе.

Пачаў перабіраць добры стос папер, падрыхтаваных сакратаркай, але на душы было трывожна і мутарна.

Новая ягоная кватэра прыйшлася яму даспадобы. Ён пабываў там разам са сваім намеснікам – Сяргеем Паўлавічам. Гэта быў паўнаваты мужчына ў вялікіх чорных акулярах і з добра пасівелымі скронямі. Пасля гаворкі з ім Мікалай Пятровіч з жахам зразумеў, што сельсавецкія турботы і яго новыя клопаты – гэта неба і зямля. Але ж трэба было з чагосьці пачынаць.

На наступны дзень ён сабраў у актавай зале ўсіх сваіх упраўленцаў – пачынаючы з прыбіральшчыц і заканчваючы першым намеснікам, пазнаёміўся з усімі і адразу ж заявіў пра будучае скарачэнне. Па зале пракаціўся прыглушаны незадаволены гул, але Мікалай Пятровіч тут жа ўсіх папярэдзіў, што на вуліцы ніхто не апынецца – усе будуць працаўладкаваныя. Ды гэта мала каго супакоіла. Асабліва нерваваліся жанчыны: ведалі, якое беспрацоўе пануе ў іх невялічкім гарадку.

Мікалай Пятровіч зразумеў, што калі ён цяпер чымсьці такім незвычайным не асадзіць сваіх супрацоўнікаў, то пасля цяжка будзе з імі працаваць. Мільганула ў галаве адна цікавая задумка. Ён усміхнуўся і сказаў:

– Калі не жадаеце скарачацца па добра вядомых вам правілах, то давайце правядзем лёсаванне.

– Дык гэта што – выцягнуў кароткую саломінку і на вуліцу? – усклікнула паўнагрудая, чырвонашчокая кабета. – Горш не прыдумаеш!

– Чаму ж гэта кароткую? – Мікалай Пятровіч зноў усміхнуўся – толькі ёй. – Якраз наадварот – доўгую! Згодны?!

– Ага! Не кіем дык палкай! – гэтым разам адазвалася мілавідная бландзінка з першага раду. – Асабіста я згодна на ўсё, толькі не на такія жахлівыя ўмовы!

У зале зарагаталі.

– Ну што ж, калі два варыянты не падыходзяць, то ў мяне ёсць трэці, але, папярэджваю – апошні. Ён патаемны. Заўтра ж апрабуем яго на жанчынах, а пасля – калі будзе станоўчы вынік, то і на мужчынах.

– А ўжо сёння нельга? – спытала ўсё тая ж нецярплівая бландзінка.

– Чаму ж не – можна. Прашу жанчын сабрацца тут жа пасля працы.

Такая заява азадачыла і заінтрыгавала ўсіх. Жанчыны ледзь дачакаліся заканчэння працоўнага дня. Калі пасля шасці гадзін вечара Мікалай Пятровіч зайшоў у залу, усё былі ў зборы.

– Я вас не затрымаю, – прамовіў ён, – праз хвіліну-другую будзе вядома, хто з вас трапіў пад скарачэнне, – ён на хвіліну змоўк, акінуў быццам вінаватым позіркам спалохана-зацікаўленыя твары жанчын, і сказаў: – У каго з вас бюстгалтары і трусікі блакітнага колеру – тыя пад скарачэнне не падпадаюць.

На імгненне ў зале ўсталявалася мёртвая ціша. Твары жанчын не здолеў бы апісаць нават вялікі іх знаўца – знакаміты Мапасан. Здзіўленне, страх, разгубленасць і яшчэ Бог ведае што панавала на іх.

– У мяне! – парушыў урэшце цішу чыйсьці голас.

– І ў мяне! – пачуліся насмешлівыя выкрыкі.

– А дзе будзем правярацца? – спытала прыгожая бландзінка, калі пацішэла ў зале.

– У маім кабінеце, – адказаў Мікалай Пятровіч. – Чакаю прэтэндэнтак праз пяць хвілін.

І выйшаў, пакінуўшы ашаломлена-разгубленых жанчын у зале.

У добрым настроі зайшоў ён у кабінет і, зірнуўшы на партрэт, ажно падміргнуў яму, з весялосцю ў голасе прамовіўшы: "Здорава я іх ачмурыў!" Ды сталёвы позірк вачэй з партрэта ў адно імгненне сагнаў з твару ўсмешку. І не паспеў Мікалай Пятровіч зрабіць некалькі крокаў, як зноў пачуў знаёмы голас: "Ты что – обалдел, или в Новинки захотел?"

Толькі на гэты раз яму падалося, што голас зыходзіў з яго самога, а потым ужо рэхам каціўся па кабінеце. І ён спахмурнеў. У кабінет да яго так ніхто і не зайшоў. "Вось і добра, – падумаў, – пажартавалі і досыць, хай ведаюць, што цацкацца з імі не буду".

Нейкую гадзіну ён яшчэ працаваў, а потым пешшу пабрыў дадому. Пасля вячэры прылёг на раскладанцы і пачаў думаць пра заўтрашні дзень. Задумаў са сваім намеснікам пачынаць знаёмства з раёнам. Парадаваўся, што ягоны папярэднік паспеў прыдбаць цуда-аўтамабіль – новенькі джып з двума вядучымі мастамі. Для іхніх дарог – ідэальны транспарт. Але думкі зноў вярталі яго да партрэта. Калі так і далей будзе, то можна і напраўду розум страціць ды загрымець у тыя Навінкі. Хоць ты да псіхіятра ідзі...

Назаўтра выехалі а восьмай гадзіне раніцы. Вырашылі з намеснікам пабываць у самым адсталым калгасе, які быў далекавата, за ракой, у глухім забалочаным месцы.

Шафёру было гадоў сорак, той усю дарогу маўчаў і толькі зрэдку адказваў на пытанні Сяргея Паўлавіча.

Адразу ж за горадам, быццам сярэднявечныя замкі, паўсталі катэджы. Яны, розных фасонаў і памераў, ганарліва пазіралі навокал і быццам хваліліся адзін перад адным: "Бачыш, які ў мяне дах?" – "Польская чарапіца васемнаццатага стагоддзя". – "Падумаеш – здзівіў! Мой дах з ацынкаванага ліста, вечны!" – "А мае чатыры вежыбайніцы – з пазалочанымі купаламі! Гэта вам

што-небудзь гаворыць? А зірнулі б вы на маю ўнутраную аздобу і ўбранства – адразу лопулі б ад зайздрасці: паркет, мармуровыя залы, басейн, саўна, два патаемныя бары, шыкоўная спальня ва ўсходнім стылі і пяць туалетаў. А які запас замежнага дэлікатэснага харчу – на пяць гадоў хопіць. Прасвідраваная скважына падае мінеральную ваду ў адну з вежаў ды прыносіць немалы даход гаспадару...”

“Вось і імі трэба будзе заняцца”, – падумаў Мікалай Пятровіч, пазяхаючы ў руку.

З шашы машына збочыла на калдобістую гравійку. Хаця і падкідвала, але можна было яшчэ трымацца. А калі ўзбіліся на лясную дарогу, то тут давялося нацярпецца. Але джып выпаўзаў з такіх ямін, дзе звычайная легкавушка даўно б сядзела па фары ў гразі.

Урэшце паказалася невялічкая вёсачка. Калгас “Светлы шлях” – паспеў прачытаць Мікалай Пятровіч на запэцканай гразёю нахіленай шыльдзе.

– Святлей за шлях, якім ідзе гэты калгас, не бывае, – прамовіў Сяргей Паўлавіч і ўздыхнуў.

У аднапавярховай будыніне канторы калгаса ў нехлямяжым кабінеціку ім пашчасціла застаць старшыню калгаса. Мікалая Пятровіча непрыемна ўразіў выгляд старшыні: той быў няголены, спахмурнелы, у добра паношаным карычневым пінжаку.

“Можа, з пахмелля”, – падумалася яму. Але дарма – старшыня быў цвярозы.

– Што такі спахмурнелы, Глеб Іванавіч? – спытаў Сяргей Паўлавіч. – Вось новы кіраўнік раёна да цябе прыехаў. Чым парадуеш, якія праблемы?

– Праблем мора. Адзін трактар на хаду, а пасяўная – на носе...

– Што ж так? – спытаў Мікалай Пятровіч.

– А як вы думалі? Што было – сваё адпрацавала... А за тое, што здалі летась дзяржаве па смешных цэнах, да гэтай пары не атрымалі.

– А падсобнымі промысламі не думалі заняцца?

– Чым тут узбагацееш? – пачухаў патыліцу старшыня. – Хіба што лапці плесці? Але ж дзед Кузьма не пойдзе да нас – сваю адкрыў фірму.

– А ён што – пляце лапці? – здзівіўся Мікалай Пятровіч.

– Другі год. Тут амерыканец адзін прыязджаў, сам з мясцовых, то купіў у яго ажно дзесяць пар. Па сто долараў адваліў за пару. І дзед Кузьма імгненна стаў мільянерам. Самі прыкіньце: на нашы – дваццаць мільёнаў адхапіў. Паклаў іх у банк і кожны месяц мае больш за паўмільёна чыстага прыбытку, ды яшчэ пенсія.

– Можна яго ўбачыць?

– А то як жа! За вёскай жыве, хата пры лесе. Я вам пакажу.

Дзеда Кузьму яны якраз засталі за працай, але плёў той не лапці, а кошыкі. Высокі, паўнаваты, з сівой бародкай і жвавымі чорнымі вачыма.

– Дзед Кузьма, – з весялосцю ў голасе прамовіў старшыня, – прымай гасцей – новага кіраўніка раёна з намеснікам.

Дзед Кузьма з кожным павітаўся за руку і прамовіў:

– Прысаджвайцеся, людзі добрыя. З якой нагоды да мяне заехалі?

– Цікавімся наконт лапцей, – пачаў Мікалай Пятровіч, – кажуць, што ў вас яны добра атрымліваюцца. Вось і хочам параіцца – можа, у калгасе невялікі цэх адкрыць, як думаеце?

Дзед Кузьма хітравата ўсміхнуўся.

– Ведаю, куды хіліце. Я ж даўно старшыні казаў – самая пара лапці плесці, бо падыдзе час – будуць яны нарасхват. Да гэтага ідзем, асабліва пасля падпісання такой шкоднай дамовы з Расіяй.

– Чаму ж шкоднай? Запрацуюць заводы, будзем гандляваць з вялікай суседкай.

– Яно так... Але ж маскалі найперш сваю выгаду шукаюць у гаротнай Беларусі. Абдзяруць нас як ліпку, вось убачыце. У мяне пяць класаў

і восемдзесят пяць гадоў за плячыма і то разумею – у сваю хату чужынца пускаць нельга. Мой прапрадзед расказваў, што калі расійскія войскі ў дванаццатым годзе гналі французаў, то так здзекаваліся з мясцовых сялян – проста жах. Праўда, цяпер не тыя часы, бо рабаваць нас будуць расійскія кампаніі на сучасным узроўні. І з зямлёю нелады – гаспадар ёй патрэбен. А тут яшчэ парційцы з высокіх чыноў раскралі дзяржаўную маёмасць. Вось і крыўдна, што кіраўніцтва рэспублікі не разумее аднаго – нас ужо абуваюць у лапці.

– Не загаворвайся, дзед Кузьма! – перабіў яго старшыня калгаса. – У былыя часы за такія словы загрымеў бы пад фанфары на ўсю катушку.

– А ты не пужай. Я сваё адбыў – дзесяць гадоў пляжыў лес у Сібіры.

– За што? – пацікавіўся Мікалай Пятровіч.

– У сакавіку сорак пятага адхапіў гэты тэрмін, што хваліў нямецкіх кароў, бо вельмі ж тыя мне прыгляннуліся: сытыя, гладкія, па чатыры вядры малака давалі. Супрацоўнікі Смершу мяне і арыштавалі. У мяне два ордэны і дзесяць медалёў, але і яны не ўратавалі.

– На лапці зірнуць можна?

– Зараз пакажу, – дзед Кузьма зайшоў у запечак і прынёс дзве пары.

– Вось гэтыя можна нават і ў макрэчу насіць – падшытыя, а гэтыя ўлетку.

Новенькія бялюткія лапці выглядалі даволі эфектна.

– У іх хадзіць адно задавальненне, – працягнуў дзед Кузьма. – Адпачываюць ногі, дыхаюць. Не тое, што кірзачы цягаць, або гумовікі – ад іх адна хвароба. Падабаюцца?

– Ды ад іх жа вачэй не адвесці! – шчыра сказаў Мікалай Пятровіч.

– Тады бярыце летнія ў падарунак.

– Вялікі дзякуй, дзед Кузьма.

– Можа, чайку? Ён у мяне на травах, з мядком.

– Не, не! Часу – каб надтачыць!

Паспелі яны пабываць яшчэ ў адным калгасе, і толькі а сёмай гадзіне вечара былі ў райцэнтры. Мікалай Пятровіч рашыў зазірнуць у кабінет – узяць сёе-тое з папер, каб паглядзець іх у дарозе: заўтра – субота, таму меркаваў пад'ехаць дахаты.

Да кабінета падыходзіў спакойна. Пераконваў сябе, што больш страшных слоў не пачуе. Але не паспеў за сабою дзверы зачыніць, як прагрымеў знаёмы бас: "Что?! Навесил лапши на уши старый пройдоха-БНФовец? Да ещё лапти подарил! Вот сам и будешь в них топать! Про меня вшивые оппозиционеры говорят, что я сем лет быкам хвосты накручивал. Да, было такое. Но я не только накручивал, а и вправлял мозги разгильдяям и проходимцам, ослиная твоя голова!"

Мікалай Пятровіч хацеў штосьці сказаць, ды не змог – голас грымеў далей: "А ты прогноз Павла Глобы читал? Нет?! Он сказал, что мне памятник через три года будет стоять на площади Независимости. И поставлен будет по воле народа. Читать нужно прессу, голубок! Подписан исторический договор, теперь можно подумать и о кабинете в Кремле. А ты с районом управиться не можешь!"

Мікалай Пятровіч стаяў, нізка апусціўшы галаву, быццам школьнік, які адхапіў чарговую двойку. Раптоўна наступіла цішыня. Ён хуценька паклаў неабходныя паперы ў дыпламат і кінуўся на вуліцу.

Ранічкай, калі шафёр прыгнаў машыну з гаража, Мікалай Пятровіч сам сеў за руль: правы меў – у сельсавеце быў старэнькі "Масквіч".

Вечарам расказаў жонцы пра дзіўны партрэт.

– Ведаю, што такога не можа быць, а вось жа голас чую.

– А можа, той партрэт зачараваны?

– Як гэта?

– Як, як! Я чытала, што хлопец прывёз з Афрыкі маску ды павесіў у пакоі. А праз нейкі час пачалі ўсе хварэць. Аказалася, афрыканскія чараўнікі перадалі праз маску хваробу сваіх гаспадароў на чужынцаў.

– Я ж не хварэю, але ўжо ачмурэў ад ягоных размоў!

– А ты пакліч вечарам бацюшку і няхай той пасвенціць партрэт. Мо і зойме яму... І да псіхіятра схадзі, мо ён што параіць. А то, не дай Бог, звіхнешся. Казала ж – не па табе пасада!

– Накаркаеш, што і сапраўды звар'яцею.

– І яшчэ зрабі вось што, – лагодней сказала жонка, – здымі партрэт і агледзь уважліва. Мо там ёсць жучкі-слухаўкі? Мо ў вочы тэлекамеры ўстаўленыя? А што? Сёння ўсё можа быць...

Падужэлы пасля жончыных бліноў і пацалункаў вярнуўся Мікалай Пятровіч на працу. Без боязні зайшоў у кабінет, распрануўся і пачаў працаваць. І толькі ў канцы дня, калі пачаў складваць паперы на стале, зноўку: "Скажи своей благоверной, что она дура дерибасовская!"

Мікалай Пятровіч ашпарана выскачыў з крэсла і са злосцю зірнуў на партрэт. Страху не было. "Зараз мы ўсё высветлім!" – закрычаў ён і, не доўга думаючы, рашуча накіраваўся да партрэта. Ды тут нечакана прарэзліва падаў голас тэлефон. Мікалай Пятровіч схапіў трубку, а там прагучала: "А вот этого делать не следует, будут большие неприятности!"

Ён адчуў, як халадзеюць ягоныя ногі і робіцца цёмна ў вачах. Паволі асунуўся ён на стол, а пасля і на падлогу. У раённай бальніцы, апрытомнеўшы, закрычаў:

– Здыміце партрэт! Здыміце партрэт! – заціхаў, трацячы прытомнасць. Прыходзячы да памяці, зноў прасіў: – Здыміце партрэт! Здыміце партрэт! І чарговы раз ачомаўшыся, пытаўся: – Ці знялі партрэт? Ці знялі?

– Даўно знялі, – адказвалі яму і хуценька пакідалі палату. Але ён зноўку і зноўку паўтараў сваё пытанне.

Праз тры дні, калі ён давёў усіх урачоў і медсясцёр да адчаю, яго адправілі ў Навінкі.

# Матрос з яхты “Штандарт”

*“Истинно, истинно говорю вам: верующий в меня имеет жизнь вечную”.*

**/Евангелие от Иоанна, гл. 6, стих 48/**

Пазнаёміўся я з ім у лазні, якая месцілася на адной з ліній Васільеўскага вострава. Быў я ў тыя далёкія гады студэнтам, вучыўся ў горным інстытуце. Парыцца любіў з дзяцінства. Дзед, царства яму нябеснае, прывучыў. Браў мяне зусім маленькага ў вясковую лазню. Там я з вялікай ахвотаю падкідваў гарачай вадзіцы на камяні, а ён толькі паспяваў паварочвацца на палочку.

Вось і на гэты раз, толькі зайшоў у парылку, як пачуліся галасы:

– Падкінь! Разочкаў пяць, а то і ўсе дзесяць!

Справа мне знаёмая, чаму ж не ўважыць парыльшчыкаў, тым больш што сабралася іх там, як галак на таполі, – не злічыць. Наліў у тазік гарачай вады, узяў чарпак з адмысловай ручкай і пачаў падкідваць. Галоўнае тут – не заліць камяні, вось я і стараўся. Хвіліну кідаю, другую – маўчаць, толькі пакрэктваюць ад асалоды парыльшчыкі, а пасля і за венікі ўзяліся. Што тут усчалося! Лупцуюць сябе – ажно лісце сыплецца. Пасля, праўда, суцішыліся.

– Малайчына! – крыкнулі мне зверху. – Пачакай крыху, пасля яшчэ дабавіш!

Урэшце пачалі пакідаць палок, але ж не ўсе, а тут хтосьці зноў голас падаў:

– Падкінь, землячок, а то я так і не адагрэю свае костачкі!

Тут вырашыў я і астатніх сагнаць, бо самому хацелася хутчэй ірвануць на палок. Завіхаўся як мае быць.

– Ты што – звар’яцеў? Хопіць! – яшчэ чалавек пяць сiганулі ўніз.

– Там жа дыхнуць нельга!

– Давай-давай! – зноў прагучаў знаёмы голас.

Я падкінуў яшчэ разы два і зірнуў на палок. Там убачыў толькі аднаго дзядулю з коратка падстрыжанымі сівымі валасамі. Многія пакінулі парылку, але каля мяне засталося стаяць некалькі чалавек.

– А цяпер сам залазь да дзеда! – патрабавалі яны. – Пазганяў народ!

– Вам не дагадзіць: то многа, то мала, – адказаў я і хуценька ўзабраўся на палок.

Дыхаць і сапраўды было немагчыма, а тут яшчэ хтосьці ўскінуў вадзіцы на камяні... Добра, што ў мяне ваўняная шапачка была на галаве, інакш – наўрад ці выцерпеў бы. А дзеду хоць бы што, толькі пазіраў на мяне і ўсміхаўся.

– Трымайся, – ласкава прамовіў ён, – вось пагрэемся, а пасля і за венікі возьмемся. Я ў гэтую лазню яшчэ з бацькам сваім хадзіў.

– Няўжо?! – здзівіўся я. – Вам жа дзесьці за семдзесят.

– Крыху больш, – ён усміхнуўся і дадаў: – На мінулым тыдні дзевяноста пяць споўнілася.

– Ніколі б не паверыў, – адказаў я. – Выходзіць, што гэтай лазні больш за сотню гадоў.

– Дзесьці так, – адказаў ён, падымаючыся з лавы. – Хадзем адпачнем.

Мы спусціліся ўніз і выйшлі з парылкі. І толькі тут я поўнасцю яго разгледзеў: пад два метры росту, а плечы – быццам у таго волата. Ступаў лёгка, як штангіст на памосце. "І гэта ў такія гады, – падумаў я, – цуд ды і толькі". Прыселі на лаву ля акна.

– Ну, што? – пасля нядоўгага маўчання прамовіў ён. – Давай знаёміцца, – першы працягнуў мне руку і дадаў: – Кузьма Сакалоў.

Я назваў сябе, і мы парукаліся.

– Адчуваю ў табе беларускія каранёчкі. Ці не так?

– Угадалі. З Гродзенскай вобласці я, вучуся тут.

– А я з Брэсцкай. Калісьці падаўся мой бацька на заробкі ў Піцер. Было мне тады восем гадоў.

Вось і хадзілі ў гэтую лазню. Памыемся, бывала, я дадому бягу, а ён у піўную, але ніколі не напіваўся – ведаў сваю меру.

– І доўга тут жылі?

– Ды не, гадоў пяць. Пасля абрыдла бацьку гарадское жыццё, і вярнуліся ў сваю вёску. А праз які час зноўку я тут апынуўся – прызвалі служыць на флот.

– Цікава, – прамовіў я. Хацеў спытаць пра службу, але дзед Кузьма мяне апярэдзіў:

– Бяры венік, а то зальюць камяні, не папарымся як след.

Толькі пасля трэцяга заходу вырашыў ён крыху адпачыць. Я прынёс два куфлі піва, яно ў той час прадавалася проста ў лазні, ды зноў пачаў распытваць пра яго жыццё.

– Вось ты не паверыш, – пацягваючы піва, казаў дзед Кузьма, – што я да дзевяноста гадоў працаваў на чыгунцы. І не вартаўніком, а на пуцях: шпалы мянялі, рэйкі... І яшчэ б мог, але тут сыны населі: "Сароміш нас, табе што, грошай мала?" Таго не разумелі, што пры сіле я, дый без працы не магу. Але паслухаў – звольніўся. Праўда, і цяпер не сяджу склаўшы рукі, у вёсцы спраў хапае, паспявай толькі паварочвацца.

– Адкуль у вас такая моц? Мо валодаеце якім патаемным сакрэтам даўгалецця?

– Якое там! – ён махнуў рукой. – У нас амаль усе з радні доўгажыхары. Дзед мой сто дваццаць гадоў пражыў, бацька на сто дзесятым памёр. Але даўжэй за ўсіх пражыў бы мой дзядзька, бацькаў брат.

– Чаму?

– Вельмі моцны быў. Немцы расстралялі яго ў сорак другім годзе на сто пятым годзе жыцця, бо злавілі, калі ён вёз муку партызанам. Але галоўнае – веруючымі былі ўсе мае суродзічы. Я, напрыклад, у святы не працую. Летам, праўда, калі там сена ўратаваць ад дажджоў, то выйду, а так... Перад людзьмі ж сорамна. Сусед мой, пухам яму зямелька, як толькі, бывала, нядзелька

наступіць, то зранку дровы сячэ ці гной выкідвае. Колькі разоў яго папярэджваў, а ён толькі пасміхаўся. А пасля з лёгкімі ў яго штосьці сталася, так і не ўратавалі. Я табе шчыра скажу – без веры пражыць немагчыма. Раскажу адзін выпадак. Хадзілі мы ў кругасветку. І здарылася так, што апынуўся я за бортам. І каб жа шторм быў, а то поўны штыль. Толькі экватар перасеклі, спякота, вада – цяплей не трэба! Спужаўся, але трымаюся, а тут акулы... То злева плаўнік вытыркнецца з вады, то справа. Ну, думаю, канцы табе, Кузя. Тым часам акул яшчэ больш стала, зусім блізка падплываюць. Тут я зірнуў на неба і прашаптаў: "Госпадзі Ісусе Хрысце, памілуй мя!" І пачаў бесперапынку паўтараць гэтую кароткую малітву. І што ж ты думаеш? Амаль імгненна адплылі акулы ад мяне. Праўда, зусім не зніклі, трымаліся воддаль, але ж спакайней стала на душы. Перастану малітву шаптаць, яны зноў да мяне падплываюць.

– І як жа ўдалося выратавацца?

– Наш карабель мяне і падабраў. Як я упаў, гадзіны праз дзве села каманда абедаць, а мяне няма. І наш капітан, век за яго буду Бога маліць, аддаў загад павярнуць назад. Праз пяць гадзін мяне падабралі. Што на гэта скажаш?

– Дзівосы ды і толькі, – адказаў я. – Магчыма, у гэтай малітвы чароўныя словы. Вы яе раней ведалі?

– А як жа! Аднойчы трапілася мне ў рукі кніжка "Апавяданні вандроўніка". Там адзін жабрак апавядае пра сваё жыццё. Ён дзесьці вычытаў, што чалавеку трэба бесперапынна маліцца, вось... Дзе б ты ні быў, а паўтарай пра сябе: "Госпадзі Ісусе Хрысце, памілуй мя!" За працай, у час адпачынку і нават у сне. Калі знойдзеш тую кніжку, то пачытай, не пашкадуеш.

Ён дапіў піва, а я хуценька аднёс куфлі. Пасля яшчэ парыліся, я нават знямог, але трымаўся, бо няёмка было перад дзедам Кузьмой. Мне падалося, што ён і не думае выходзіць з лазні. Урэш-

це мы памыліся, апрануліся і выйшлі на вуліцу. Заканчваўся май, ласкава свяціла сонейка. Прыселі на лаўку ў скверыку.

– І да каго вы прыехалі? – спытаў я.

– Да праўнукаў. Старэйшы ў войска збіраецца, вось і вырашыў наведаць горад майго юнацтва, служыў тут.

– А на якім караблі?

– Спачатку на крэйсеры “Рурык”, а пасля даслужваў на імператарскай яхце “Штандарт”.

– Вось як! – здзівіўся я. – І цара бачылі?

– А то як жа. І не адзін раз!

– А хто быў капітанам “Штандарта”?

– Контр-адмірал Чагін.

– І як там служылася?

– Нічога. Крыху лепш кармілі, дый лішняя чарка перападала.

– Першы прыезд цара памятаеце?

– Было гэта ўлетку 1907 года. Цар Мікалай падняўся на палубу “Штандарта” пад гукі духавога аркестра. Стралялі гарматы, бесперапынна крычалі “Ура!”. Спачатку павітаўся з камандай, пасля ў суправаджэнні вялікага князя Мікалая Мікалаевіча і ўсёй дварцовай світы накіраваўся ў царскую рубку, дзе гасцей чакаў раскошна накрыты стол... А матросам выдалі па чарцы гарэлкі і загадалі: “Камандзе песні спяваць і весяліцца!” І вось тут я ўбачыў маленькага хлопчыка ў матроскай форме. За ім ішоў незнаёмы мне матрос. Хтосьці прашаптаў: “Наступнік трона!” Царскага сына звалі Аляксеем. Была ў яго і нянька Вішнякова. Яны пасля не адзін раз рабілі прагулкі на яхце, хадзілі нават у Гельсінгфорс.

Ён змоўк, зірнуў на зялёныя лісточкі таполі, уздыхнуў і сказаў:

– Усяго давялося пабачыць на сваім вяку, здавалася б, нажыўся, а паміраць усё адно неахвота.

Мне хацелася штосьці яму сказаць, суцешыць, але я прамаўчаў.

– Аднак, – дзед зірнуў на гадзіннік, – будзем развітвацца, а то мае пачнуць хвалявацца.

Мы падняліся з лаўкі.

– Трымайся, землячок, вучыся, але і нашу Беларусь не забывай. Ганарыся, што беларусам завешся, абавязкова вяртайся ў родныя мясціны. Толькі свая зямелька дае сілы і доўгае жыццё.

На развітанне дзед Кузьма моцна паціснуў мне руку. Крокаў праз дзесяць я спыніўся і азірнуўся. Былы матрос з яхты “Штандарт” няспешна крочыў па вуліцы. Ён рассякаў людскі натоўп, быццам той магутны крэйсер.

Я ў думках перахрысціў яго і прашаптаў: “Госпадзі! Зберажы яму здароўе на доўгія гады!”

І чамусьці адразу ж узнёсла і радасна стала на душы. Успомнілася мая маці, царква на ўскрайку вёсачкі і старэнькі наш бацюшка.

## Падсвечнік

Самота заўсёды навальвалася нечакана – вярэдзіла душу, прыносіла бяссонніцу. Зберагчыся ад яе было немагчыма. Сцяпан у такія хвіліны ўкладваўся ў свой ложак і заплюшчваў вочы. Не хацелася бачыць гэтую нахабную паненку, якая часцяком наведвалася ў яго халодны інтэрнацкі пакой. І няхай бы так да каго прыбілася, дык не – толькі яго ўлюбавала, быццам адчувала, што тут ёй можна ўволю ўсцешыцца.

Сцяпану было трыццаць восем гадоў, а ён усё яшчэ халасцякаваў. У каханні яму не шчасціла з юнацкіх гадоў. Але ён паспеў змірыцца з такім становішчам. Працаваў майстрам на кар’еры, здабываў гліну, з якой на камбінаце выраблялі цэглу і дрэнажныя трубкі.

Калі шчыра прызнацца – то на жыццё грэх было скардзіцца. У свой час, пасля заканчэння інстытута, так складваліся ў яго жыццёвыя абставіны, што давялося паблукаць па белым свеце не адзін дзесятак гадоў. Пачынаў з Сахаліна, пасля працаваў у Сібіры, трапіў нават і на спякотны поўдзень, дзе часцяком даймалі пясчаныя завірухі, а ў спакойныя дні, нават ноччу, не было асвяжальнай прахалоды.

Але заўсёды цягнула ў родныя мясціны, у сваю Беларусь. Пяць гадоў таму пашчасціла ўладкавацца на камбінат, які месціўся на ўскраіне абласнога цэнтра. На другі год працы дырэктар выдзеліў яму асобны пакойчык у інтэрнаце, абяцаў нават аднапакаёўку. Але з кожным годам ён адчуваў, што чагосьці не хапае яму ў жыцці. Але чаго? Ён і сам не ведаў. Адно разумеў – толькі не жанчыны. Гэта раней цягнула яго да дзяўчат, хацелася абняць, адчуць прыемную цеплыню жаночага цела... А вось цяпер пачаў астываць у сваіх жаданнях, але душа балела. Бывалі такія дні – месца сабе не знаходзіў, крыўдаваў на ўвесь белы свет.

Але аднойчы амаль усё імгненна змянілася ў ягоным жыцці. У самы разгар вясны Сцяпан нечакана захварэў і злёг. Так ён на здароўе, дзякуй Богу, не скардзіўся, але днямі прамок на рабоце да ніткі. Вясна для кар'ера сапраўднае бедства. Амаль усюды непралазная гразь, дарогі ўшчэнт размывае вада, і не адзін раз бывалі выпадкі, што затапляла ў забоі вялізны экскаватар.

Добра яшчэ, што ў іх камбінаце была свая паліклініка. Цэхавы ўрач, Святлана Мікалаеўна, маладая і вельмі прыгожая жанчына, хуценька змерыла яму тэмпературу і выпісала бальнічны лісток. Інтэрнат быў цераз дарогу, але ён ледзь да яго дабраўся, бо вельмі дрэнна сябе адчуваў. Як толькі ўвайшоў у свой пакой, то адразу ж наліў вады ў электрычны чайнік, а сам пачаў распранацца. Працяглае халасцяцкае жыццё прывучыла яго на выпадак нечаканай хваробы трымаць пад рукой неабходныя лекі. Ён дастаў з паліцы невялічкую баначку малінавага варэння, паклаў у каструлю засохлыя галінкі маліннiку, дабавіў рамонкаў і ўсё заліў кіпнем.

Пасля зняў з цвіка торбачку з сухарамі, знайшлося нават некалькі пачак пячэння. Усё гэта паставіў на дзве табурэткі ля ложка.

Цяпер можна было хварэць! Ён улёгся ў ложак і пачаў піць настоеную на травах гарбату. Крыху паляжаў і непрыкметна заснуў.

Прачнуўся толькі а дзесятай гадзіне раніцы наступнага дня. Адчуваў сябе крыху лепш, амаль не балела галава, але пад вечар тэмпература зноў узнялася. Градуснік паказаў трыццаць дзевяць з паловай. Палаў твар, сохлі губы. Ён нават крыху спалохаўся, бо такая тэмпература, калі ты размяняў чацвёрты дзесятак, не вельмі прыемная штука. Вырашыў усё-ткі прыняць таблетку, а што паробіш – трэба як-небудзь ратавацца.

Познім вечарам, перад тым як патушыць святло, ён зірнуў на невялічкі абразок Ісуса Хрыста, які вісеў побач на сценцы, і прашаптаў адзіную кароткую малітву, якую ведаў яшчэ з дзяцінства.

Толькі на трэці дзень падняўся Сцяпан з ложка. Адразу ж пагаліўся ды згатаваў сапраўдны сняданак: падсмажыў сала з цыбуляй, а ў апошні момант укінуў на патэльню два яйкі. Крыху шумела ў галаве, але ён адчуваў, што хвароба адступае, дый тэмпературы амаль не было.

Пасля зноў улёгся ў ложак – вырашыў не рызыкаваць, каб зноўку не адкінула, бо можна і ўскладненне адхапіць.

Пачытаў кніжку, а пасля дастаў з паліцы запаветны сшытак. Яго Сцяпан нікому не паказваў, бо там былі вершы. Пісаць пачаў даўно, але ў друку з'явіліся яны два гады назад. Пасля яшчэ друкаваўся, а некалькі вершаў нават трапілі ў калектыўны зборнік. А пасля таго, як са сталічнага часопіса яму паведамілі, што рыхтуюць падборку ягоных вершаў і прасілі даслаць фотакартку, то ён пачаў марыць і пра ўласную невялічкую кніжку.

Пад вечар вырашыў схадзіць у паліклініку. Чарга была невялікая. Хвілін праз дваццаць Сцяпан сядзеў перад Святланай Мікалаеўнай, якая штосьці хуценька пісала ў журнале. Пасля зірнула на яго, усміхнулася , і спытала:

– Ну, як сябе адчуваеш?

– Добра. Хацеў бы выпісацца.

Яна змерыла яму тэмпературу, праслухала і сказала:

– Проста не ведаю, што і рабіць з табою.

– А што такое? – спытаў ён сядаючы на крэсла.

– Непакоіць мяне твая невялічкая тэмпература – трыццаць шэсць і дзевяць, – яна на хвіліну змоўкла, а пасля дадала:

– Зробім так: я цябе выпішу, але заўтра зранку зрабі здымак груднай клеткі. Так нічога не праслухоўваецца, але штосьці мяне насцярожвае...

– Добра. Мне якраз на другую змену – паспею.

Ён падняўся, узяў свой бальнічны лісток, развітаўся і выйшаў з кабінета.

Яны былі ў даволі добрых адносінах. Святлана Мікалаеўна ведала пра яго жыццё, прапаноўвала нават яму ў жонкі сваю знаёмую настаўніцу, на што ён жартаўліва адказваў, што калі тая хоць крыху падобна на яе, то адразу ж згодзен. У самой было шчаслівае сямейнае жыццё: даволі малады муж, дзве прыгожыя дзяўчынкі-блізняты.

А колькі карысных парад давала яму наконт здароўя – не злічыць. Праз дзень яму патэлефанавалі на работу і тэрмінова загадалі з'явіцца ў паліклініку.

Калі нясмела зайшоў у кабінет, Святлана Мікалаеўна збіралася ўжо дадому, але ўбачыла яго, адклала сумачку і прысела за стол. Яго здзівіў насцярожаны позірк яе блакітных вачэй.

– Тут вось якая справа, – прамовіла яна, дастаючы ягоную картку,– прыйдзецца яшчэ падлячыцца.

– А што здарылася? – спытаў ён, працягваючы стаяць амаль ля самых дзвярэй.

– Здымак паказаў невялічкую плямку на правай палове лёгкага. Нічога страшнага, мне здаецца – звычайнае запаленне, невялічкі ачажок. Гэта яшчэ вельмі добра, што на такой ранняй стадыі мы яго выявілі. Заўтра возьмеш усё неабходнае і паедзеш у бальніцу трыкатажнай фабрыкі. Там цудоўныя ўрачы і замежнае абсталяванне.

– І доўга прыйдзецца там прабыць?

– Не менш за два тыдні.

Сцяпан развітаўся і выйшаў з кабінета. Адпрацаваў другую змену і вярнуўся ў інтэрнат а дванаццатай гадзіне ночы.

“Вось табе і на!” – думаў ён, лежачы ў ложку. Ведаў ён пра гэтыя плямкі на лёгкіх. Успомніў суседа Антона з іхняй вёскі. У таго таксама ўсё з плямкі пачалося, а праз чатыры месяцы было пахаванне.

Думкі, думкі... Ад іх было не абараніцца. Успомнілася маці. Дзесьці бульбачку, бедная, цягае са склепа, перабірае. Яно і не дзіўна – сярэдзіна красавіка, па-сапраўднаму прыпякае сонейка, а тут давядзецца ляжаць у душнай палаце, дый ці ўдасца яшчэ паправіцца? У яго назбіралася якраз адгулаў, і ён планаваў прыехаць у вёску дзён на дзесяць, каб дапамагчы пасадзіць бульбу на полі, ускапаць агарод, дый плот падрамантаваць.

Толькі пад самую раніцу ён крыху задрамаў, але які гэта быў сон, калі страх працягваў сядзець у ягонай душы...

У прыёмным пакоі бальніцы пра яго ўжо ведалі. Святлана Мікалаеўна, вось ужо добрая душа, паспела туды патэлефанаваць. У дадатак да ўсяго яшчэ і галоўнага ўрача папярэдзіла, з якім калісьці вучылася на адным курсе. Ці не з гэтай нагоды пасялілі яго ў невялікую палату, дзе стаялі ўсяго тры ложкі. Два былі занятыя, а трэці пуставаў. Прыбрана было, утульна, нават не раздражняў бальнічны пах.

Суседзі па палаце былі пенсіянеры. Аднаго з іх – невялічкага, чарнявага, непакоіў страўнік, а другога – былога настаўніка – сэрца. Яны са Сцяпанам амаль не размаўлялі. Настаўнік увесь час чытаў кніжку, а чарнявы моўчкі ляжаў на ложку. Сцяпану пачалі праз чатыры гадзіны даваць уколы. Неўзабаве чарнявага перавялі ў абласную анкалагічную бальніцу. Гэтая навіна яшчэ больш усхвалявала Сцяпана. Калі і ў яго штосьці знойдуць, то таксама туды перавядуць, а адтуль можаш і не вярнуцца...

Ён стараўся адагнаць ад сябе такія думкі, бо ад іх можа і здаровы чалавек захварэць, але нічога не выходзіла.

А тут яшчэ прыкмеціў, што лечачы ўрач, жанчына ў гадах, якая кожную раніцу рабіла абыход

палат, з нейкай асцярогай і спачуваннем на твары ўвесь час пазірае на яго. Сцяпану пададося, што яна аб чымсьці ведае, але пакуль яму не гаворыць. Вось і засела ў сэрцы нядобрае прадчуванне...

Праз тры дні трывога яшчэ больш узмацнілася. Чамусьці і медсёстры раз-пораз, быццам незнарок, заходзяць у іхнюю палату ды акідваюць яго пільным позіркам. Не такі ўжо ён прыгажун, каб зацікавіць маладых дзяўчатак. Тут было штосьці іншае, але што? Спытаць у іх баяўся. Яшчэ такое скажуць, што потым зусім розум страціш.

А за акном была вясна. І хаця толькі заканчваўся красавік, усталявалася такая цяплынь, што ваўсю зазелянелі бальнічныя таполі. Маркотна было адлежвацца ў такія дні на бальнічным ложку. Але ж нічога не паробіш.

І тут Сцяпан вось што надумаў: калі толькі будуць яго пераводзіць у анкалагічнае аддзяленне, то абавязкова збяжыць дадому. Бо калі ў яго знойдуць тую хваробу, якую ён і ў думках не хацеў называць, паратунку не будзе. Дык лепш ужо дома памерці. Пакуль хвароба зваліць з ног, паспее яшчэ маці бульбачку пасадзіць.

Было ўжо далёка за поўнач, калі ён урэшце заснуў. І прыснілася яму, што апынуўся ў незнаёмай мясцовасці, стаіць ля падножжа высакаватай гары. Навокал зелянее трава, ад дзівосных кветак ідзе адурманьвальны пах, а на небе толькі сонейка. І раптам заўважыў, як над гарою з'явілася невялікая кучаватая аблачынка. Яна імгненна пачала апускацца проста на яго. Хацеў кінуцца наўцёкі, але ногі быццам прыраслі да зямлі. Непадалёку ад зямлі аблачынка спынілася і з яе прагучаў голас: "Ты выздаравееш, але зрабі падарунак сваёй царкве!"

Не паспеў ён ачомацца, як аблачынка імгненна знікла з вачэй. Сцяпан азірнуўся навокал і... прачнуўся. Хто б гэта мог быць? Мо сам Ісус Хрыстос размаўляў з ім або спецыяльна дасланы Анёл? Успомніў расказ былога лётчыка, з якім пазнаёміўся ў цягніку. Яго збілі. Галодны і пара-

нены, рыхтаваўся памерці, бо сілы былі на зыходзе. І тут убачыў у белай покрыўцы Божую Маці. Яна сказала яму: "Ідзі за мной!" Ён з цяжкасцю падняўся і пайшоў, ледзь перастаўляючы ногі. Праз колькі часу Яна вывела яго на хутар і знікла.

І тут у Сцяпана адразу ж узняўся настрой. Так цудоўна ён сябе не адчуваў ужо многія гады. Успомніў сваю царкву. Яна стаяла непадалёку ад іхняй хаткі, на самым ускрайку вёскі. Прыгожая, белакаменная, пад цынкавым дахам і з пазалочаным купалам. Нядаўна святкавалі яе стодваццаціголддзе. Дзед Вінцук яму расказваў, што калі яе будавалі, то ў раствор, каб змацаваць камяні, дабаўлялі курыныя яйкі.

А першы бацюшка быў сапраўдны асілак. Аднойчы бацька дзеда Вінцука ішоўранічкай касіць, цемнавата яшчэ было, як заўважыў бацюшку ў сялянскай вопратцы. Той запраста браў рукамі вялізны камень і ўзносіў на рыштаванні. Днём майстры здагадваліся, хто тут пастараўся, але маўчалі...

Цяпер галаву Сцяпана свідравала адзіная думка: што ж падарыць у царкву? Можа, ікону? Але ж іх у царкве многа, ці знойдзецца нават месца? Урэшце вырашыў – пра ўсё напісаць маці, каб тая спытала ў бацюшкі.

А тут яшчэ з самага ранку пачалі адбывацца такія падзеі, што ён ледзь стрымліваў сябе ад радасці. Адразу ж пасля абходу ўрач паведаміла яму, каб у шаснаццаць гадзін быў у рэнтгенкабінеце. Якніяк, а ён ужо дзесяты дзень у бальніцы. Высветліў Сцяпан і прычыну загадкавых позіркаў медсёстраў. Аказваецца, выйшла ўрэшце з друку вялікая падборка ягоных вершаў у часопісе. Вось яны і пазіралі на яго, бо прозвішча і імя супадалі, а на фотакартачцы было малое падабенства.

Са спакойнай душой адправіўся і на прасвятленне. Жанчына доўга і ўважліва разглядвала ягоныя лёгкія, а пасля спытала:

– Дадому хочаш?

Спачатку не зразумеў – чаму яна так спытала, а пасля хуценька адказаў:

– Вельмі хачу. Вясна ж на дварэ.

Яна выключыла апарат, пачала штосьці пісаць, а пасля зірнула на яго і сказала:

– Зацягваецца твой ачажок. Магчыма, заўтра выпішам.

Праз тры дні Сцяпан быў ужо дома. Расказаў маці пра свае прыгоды ў бальніцы, і тая адвячоркам адразу ж падалася да бацюшкі. Сцяпан чакаў яе з нецярпеннем, бо хацелася падарыць у царкву сапраўды неабходную рэч. І калі маці вярнулася, то проста з парога прамовіла:

– Бацюшка сказаў, што ім вельмі патрэбен падсвечнік.

У Сцяпана адразу ж зніякавеў твар.

– У царкве іх многа, – адказаў ён.

– Не пра тыя ідзе гаворка, – маці хуценька зняла плашч. – У царкву патрэбен вынасны падсвечнік, бо драўляны зламаўся. Заўтра царкоўная касірка паедзе ў Мінск па свечкі, вось там і падсвечнік можна на складзе купіць. Бацюшка прасіў, каб ты ёй дапамог.

– Я згодзен.

– А без вынаснога падсвечніка ні адно маленне ў царкве не праходзіць, сам убачыш, – дадала маці.

– Вось і добра, – Сцяпан павесялеў. – А цяпер давай вячэраць.

Яны выехалі ў Мінск з самага ранку, а пад вечар былі ўжо дома.

Падсвечнік быў цудоўны. Танканогі, высокі, увесь зіхацеў на сонейку, пабліскваючы сваімі меднымі бакамі. Часам нават здавалася, што зроблены ён з чыстага золата. Сцяпан сам аднёс яго ў царкву.

Пасля цэлымі днямі быў заняты: рамантаваў плот, дапамагаў маці перабіраць бульбу. Яго прыемна здзіўляла тое, што ціхая радасць, якая пасялілася ў ягонай душы, пасля таго прарочага сну, не праходзіла.

Было такое прадчуванне, што ён далучыўся да чагосьці святога і патаемнага...

# Малітоўнік

Малітоўнік быў невялічкі, у карычневай вокладцы. На яго я выпадкова наткнуўся, калі перабіраў на гарышчы кніжкі. Я даставаў іх з абшарпаных чамаданаў, кошыкаў і нават са звычайных мяшкоў. У асноўным гэта былі падручнікі, па якіх я калісьці вучыўся ў школе, але часам трапляліся і даволі цікавыя творы з мастацкай літаратуры. Я абтрос з іх пыл і перанёс у свіран, дзе змайстраваў з новых дошак шыкоўныя стэлажы.

Малітоўнік забраў з сабою ў хату. Ён нагадаў мне падзеі трыццацігадовай даўнасці. Служыў я тады першы год у войску, вучыўся на механіка-вадзіцеля. І тут пасябраваў з Іванам Разгуляевым, або, як ўсе ласкава называлі яго, Ванюшам. Гэта быў сапраўдны асілак: рослы, шыракаплечы, а сілу меў – з дзесятак салдат наўрад бы з ім справіліся. Праўда, быў ён на дзіва спакойны і маўклівы. Цяжка было выцягнуць з яго лішняе слоўца. Нават на шматлікія жарты ў свой адрас амаль не звяртаў увагі.

Праз які месяц-другі я прыкмеціў, што ён зусім не атрымлівае лістоў, а ў кожны чарговы прыход паштальёна не звяртае на таго ўвагі. Аднойчы я запытаў яго аб гэтым. Ён моўчкі зірнуў на мяне, уздыхнуў і ціха сказаў:

– Я з дзіцячага дома.

Толькі пазней я даведаўся, што ягоная маці шаснаццацігадовай дзяўчынкай выпадкова зацяжарыла і памерла пры родах. Майму сяброўству паспрыяла яшчэ тое, што нашы ложкі ў казармах стаялі побач. Сам я да войска паспеў скончыць толькі тэхнічнае вучылішча трактарыстаў, а Ванюша горны тэхнікум, працаваў дзесьці на Урале. З вялікай ахвотаю расказваў мне пра вялізныя электрычныя экскаватары, на якіх працаваў некалькі гадоў.

У вольныя хвіліны, якія зрэдку нам выпадалі, Ванюша чытаў адну і тую ж кніжку. Праз які час я пачаў прыкмячаць, што чытае яе неяк дзіўна – заўсёды пачынае з сярэдзіны ды аніяк не можа

дачытаць да канца. Гэтая акалічнасць мяне зацікавіла. Аднойчы, выбраўшы зручны момант, я зазірнуў цераз яго плячо і ўбачыў, што ў той кніжцы ляжала яшчэ адна – зусім маленькая па сваіх памерах. Вокладка яе была ўмела і надзейна прымацавана да "Кароткага курса гісторыі КПСС".

"Вось табе і Ванюша", – падумаў я. Як піць даць – забароненую літаратуру чытае. У той жа вечар я спытаў у яго пра тую кніжку. Ён адразу ж збянтэжыўся, нават пачырванеў, азірнуўся навокал, а пасля ціха спытаў:

– А ты нікому не раскажаш?

– Ты ж мяне ведаеш – ні слова, – адказаў я.

Тады Ваня шапнуў мне на вуха:

– Гэта малітоўнік.

Я здзівіўся і адразу ж пачаў распавядаць яму, як пасля заканчэння дзесяцігодкі не паступіў у марское вучылішча, прыехаў дадому, ды не ведаў, куды падацца. Жыў толькі з маці, тая білася з апошніх сіл, працавала ў калгасе, а заробкі тады былі мізэрныя. Мне хацелася хутчэй рвануць у самастойнае жыццё, а тут такая асечка! Пайсці куды працаваць – пашпарта не было, бо ў той час вяскоўцам не выдавалі. Думаў я думаў, ды вырашыў падацца ў духоўную семінарыю. Тут якраз адзін хлопец з нашай вёскі вучыўся ў Жыровічах. Паехаў я туды, але і там не прынялі, бо гадамі не выйшаў – залічвалі толькі з васемнаццаці, а мне было шаснаццаць з паловай.

Ванюшу мой аповед зацікавіў да немагчымага. Не было таго дня, каб ён не распытваў пра жыццё семінарыстаў. А я ж і сам пра іх мала ведаў. І тут ён мне прызнаўся, што пасля службы вырашыў паступіць у семінарыю. А пасля, калі будзе магчымасць, то і духоўную акадэмію скончыць.

І вось цяпер, каб не марнаваць дарэмна часу, ён рыхтаваўся да будучых экзаменаў: завучваў на памяць малітвы, вывучаў лацінскую мову.

Адно было дрэнна: Ванюша амаль кожны дзень выходзіў паўгалодны з нашай вайсковай сталоўкі. Крыўдна было тое, што яму не хапала сантыме-

тра росту, каб атрымліваць двайную порцыю. Яе выдавалі тым, у каго рост быў сто дзевяноста пяць сантыметраў. І ён, бедачок, часцяком падыходзіў “да амбразуры”, дзе повар амаль заўсёды, калі не было побач начальства, кідаў Ваню чарпак-другі кашы.

Мне і самому ў войску вельмі хацелася есці. Калі былі грошы, то я забягаў у нашу вайсковую краму, купляў вялізны батон, бутэльку напітку і тут жа імгненна з’ядаў. Але аднойчы нам з Ванюшам пашчасціла – да таго наеліся, што ледзь у жывых засталіся.

Здарылася гэта пасля майскіх святаў. Амаль кожную нядзелю для нас была палёгка: з раніцы прабяжым крос, або яшчэ якія спаборніцтвы пройдуць, а пасля – вольныя казакі. А тут у чарговы выхадны паступіў загад: усёй роце вывучыць новую песню. Спяваць на галодны жывот нам з Ванюшам не вельмі хацелася. І тут нас, калі так можна сказаць, выратаваў даволі шустры малады капітан-артылерыст.

Наш ротны аддаў загад: хто не хоча спяваць – выйсці са строю. Набралася нас восем чалавек. Капітан нам растлумачыў, што затрымае на гадзіну, не больш. Пасля прыехалі на таварную станцыю і пачалі разгружаць з платформаў славутыя гарматы-саракапяткі. Управіліся хутка, але ж пасля давялося чысціць ствалы вялізным баннікам. Вось тут мы і папацелі. Прайшла гадзіна, другая, а мы і паловы не вычысцілі.

Стомленыя, злыя і галодныя як ваўкі, заявіліся мы ў свой полк толькі а палове пятай вечара. Капітан пагутарыў з дзяжурным па кухні, нам падалі тры бачкі з мясам і чатыры з кашай. І пачалі мы ўсё гэта ўплятаць. Што тут усчалося – толькі лыжкі мільгацелі.

Пасля ледзь дабраліся ў казарму. Вось дык сачканулі! Астатнія хлопцы з якую гадзіну паспявалі, ды былі вольныя, а мы, як тыя дурні, увесь выхадны ўкалвалі.

Але на гэтым нашы беды не скончыліся. Першым адчуў сябе дрэнна Сцёпа Казакевіч. Спачатку стагнаў на ложку, а пасля пачаў крычаць. Хуцень-

ка адправілі ў санчасць, бо ў яго пачаўся заварот кішок. Урачы ўратавалі, але давялося зрабіць аперацыю. А нас маёр медык вывеў на пляц і загадаў павольна хадзіць туды-сюды. Многім наш занятак здаўся дзіўным, яны не маглі ўцяміць – для чаго мы тут шпацыруем. Каля двух гадзін пратупалі пад няспынны рогат сваіх саслужыўцаў.

Але наш Ванюша ўсё-ткі атрымаў двайную порцыю. А здарылася вось што. Праз які месяц завітаў у наш полк з праверкай генерал медыцынскай службы. Танклявы, хударлявы дзядок, але з вельмі жвавымі і прывабнымі вачыма. Ён уважліва агледзеў санчасць, пабываў у казармах. Вядома ж, не прамінуў і нашу сталоўку. Там, як заўсёды, навялі ідэальны марафет. Мы толькі пачалі абедаць. А ў нашым узводзе быў такі Валера Сайгушаў – жартаўнік, якіх пашукаць. Анекдотаў ведаў – не злічыць!

Вось ён вазьмі і шапні за сталом:

– Ванюша! Такі момант упускаць грэх. Кінься ў ногі генералу – адразу выпіша двайную порцыю!

Мы ўсе прынялі ягоныя словы за чарговы жарт і моўчкі працягвалі абедаць пад пільным вокам нашага старшыні роты. Генерал, у суправаджэнні сваёй шматлікай світы, збіраўся якраз пакінуць сталоўку, як здарылася непрадбачнае. Нечакана для ўсіх наш Ванюша падняўся з-за стала і рашуча накіраваўся да генерала, які на хвіліну затрымаўся, акідваючы позіркам вялізную залу.

Мы думалі, што ён звернецца да генерала па ўсёй форме, а наш Ванюша і сапраўды ўпаў на калені і ледзь чутна прамовіў нізка апусціўшы галаву:

– Прашу двайную порцыю.

Наш камандзір палка збялеў, старшыня роты ледзь стрымліваў сябе, каб не накінуцца на Ванюшу з кулакамі. Збянтэжыўся і сам генерал.

– Поднимите его! – усклікнуў ён.

А калі яму растлумачылі сэнс Ванюшынай просьбы, то ён ускіпеў:

– Как же так?! Меньше сантиметра не хватает – это же ужас! Немедленно выписать двойную порцию!

Ванюша тым часам падняўся на ногі. Генерал са світай выйшаў са сталоўкі. Не паспеў Ванюша сесці за стол, як тут жа ля яго апынуўся старшыня роты.

– Я цябе накармлю! Здубееш у мяне на кухні!

Ванюшу пасля таго здарэння прапясочвала начальства не адзін дзень, але двайную порцыю ён атрымаў.

Сам я да канца сваіх дзён буду ўдзячны Ванюшу за тое, што ўратаваў мяне ад смерці.

Здарылася гэта на танкадроме. Суседняя рота здавала экзамены па ваджэнні танка, а мяне з Ванюшам адправілі абслугоўваць варонку. Гэта такая вялізная яміна-перашкода. Наша задача была ў тым, каб крыху падпраўляць яе. Але танкі імчалі адзін за адным. Тады мы вырашылі крыху пачакаць. Непадалёку, у маладым сасоннічку, разаслалі бушлаты ды прылеглі адпачыць.

Заканчваўся ліпень, дзянёк быў цёплы і сонечны, я нават зняў гімнасцёрку, каб крыху падзагарэць. Навокал стаяў гул ад танкавых матораў.

Праз які час я раптам убачыў перад сабою ствол танкавай пушкі. Не паспеў нават як след спалохацца, як Ванюша імгненна схапіў мяне за дзягу і перакінуў цераз сябе. І ў той жа момант за метр ад нас праімчаў танк, праехаўшы правай гусеніцай па маім бушлаце.

І толькі тут я зразумеў усё – закалаціліся і рукі, і ногі. Мы падышлі да варонкі і ўсё зразумелі. Туды заехаў адзін танк, яго крыху развярнула, і ён не мог адтуль выбрацца. Убачыўшы такое, іншыя вадзіцелі сталі абмінаць варонку, вось і паімчалі па сасонніку, дзе мы адпачывалі.

Пасля таго здарэння Ванюша стаў для мяне быццам родны брат. Я пастаянна ў думках прасіў Усявышняга, каб як-небудзь дапамог яму ў жыцці. Усё-ткі цяжка жыць, калі ў цябе няма родзічаў.

Мы ўжо рыхтаваліся да выпускных экзаменаў, як Ванюшу нечакана на тыдзень адправілі ў Маскву. Калі ён прыехаў, то расказаў, што яго адпраўляюць да канца тэрміна службы ў Егіпет на будаўніцтва Асуанскай плаціны.

Шкада было з ім развітвацца, але нічога не паробіш. А перад самым ад'ездам ён і падарыў мне свой малітоўнік, бо баяўся браць яго з сабою. Пасля дасылаў мне зрэдку кароткія лісты. Пісаў, што працуе на экскаватары, тыднямі стаіць страшэнная спякота, але пачаў патроху прывыкаць. Я ўжо заканчваў другі год службы, як Ванюша напісаў, што прыдбаў талон на аўтамабіль "Волга", які атрымае пасля вяртання на радзіму.

Гэтаму я вельмі ўзрадаваўся. Што б там ні казалі, а Божанька ёсць на небе і ўсё бачыць.

Вось і Ванюшу ён не пакінуў без увагі. Пасля так здарылася, што перапіска наша раптоўна спынілася, бо лісты ягоныя правяралі, многія словы былі выкрасленыя чырвоным чарнілам.

І па сённяшні дзень я не ведаю пра далейшы лёс Ванюшы. Але думаецца мне, што ён усё-ткі ажыццявіў сваю мару – стаў святаром.

І вось цяпер, калі часцяком навальваецца самота, я дастаю з паліцы малітоўнік, паволі перачытваю малітвы, успамінаю сваю маладосць, і адразу ж ціхая і светлая радасць распускаецца ў маёй душы.

## Незнаёмка з Эрмітажа

Вось тут мне амаль штодня выгаворваюць за маё халасцяцтва. Я і без гэтых дакучлівых размоў разумею свой промах, бо прагойсаў свае гадочкі з рукзаком за плячыма, прагуляў... А калі спахапіўся, то якая там жаніцьба – сёмы дзесятак размяняў. І цяпер, калі доўгімі зімовымі вечарамі жудасна скуголіць вятрыска ў коміне дзедавай хаты, я ўспамінаю пражытыя гады, падзеі і вось тут хачу расказаць пра адзін выпадак.

Думаецца мне, што ў той час сам Хрыстос паслаў мне тое выпрабаванне, каб пераканацца ў маёй веры. Даўно тое было. Жыў я тады з дзедам і бабуляй, бо бацьку з маці не памятаю, яны адышлі ў іншы свет, калі мне і года не было. Школу скончыў

у шаснаццаць гадоў. І дзед мой, царства яму нябеснае, які ў свой час служыў на крэйсеры “Алмаз”, мне і кажа:

– Ну, Паша, падвязвай лапці, вось табе сто рублёў, торба зрэбная, і адпраўляйся на ўсіх парусах у Пецярбург. Такі горад – век мяне будзеш успамінаць!

Лапці мне, праўда, падвязваць не давялося, гэта дзед ў маладосці ў іх разгульваў, а знайшліся падношаныя чаравікі. Мы іх падрамантавалі, змазалі гуталінам, і падаўся я ў Паўночную Пальміру.

Горад і сапраўды ўразіў мяне да немагчымага. Шырачэзныя вуліцы, а якія дамы, якія дварцы – сапраўдныя замкі! Уразіла і Нява-матухна: шырокая, вольная. Экзамены здаў – лепш не трэба. А праз дзень-другі ўбачыў сваё прозвішча ў спісах студэнтаў горнага інстытута.

І пачалося шчаслівае студэнцкае жыццё. Кожны дзень горад адкрываў мне свае таямніцы, здзіўляў і ўражваў сваёй прыгажосцю. Асабліва любіў я бываць у Эрмітажы. І не тады, калі там многа людзей, не... Спецыяльна выбіраў буднія дні, ды яшчэ калі за акном няспешна шапацеў надакучлівы дождждык.

Тады людзей у Эрмітажы было значна менш. Колькі тут было карцін знакамітых мастакоў на біблейскія сюжэты – не злічыць. Гадзінамі глядзеў на іх і не мог адарвацца ад ліку святых і самога нашага Збавіцеля – Ісуса Хрыста.

Сказаць, што ў той час я быў глыбока веруючым – было б няпраўдай. Але я ведаў некалькі малітваў, умеў хрысціцца дый пра царкоўныя святы мне шмат бабуля расказвала. Калі быў зусім маленькі, то добра памятаю, як яна перад сном доўга малілася – шаптала незразумелыя мне словы. Я заціхаў у такія хвіліны пад цёплай коўдрай і вельмі чагосьці баяўся.

І вось аднойчы, дзесьці так пад вечар, калі я стаяў у амаль пустым зале Эрмітажа перад карцінаю “З’яўленне Хрыста народу”, хтосьці асцярожна дакрануўся да маёй рукі, і я пачуў усхваляваны голас:

– Няўжо Ён калісьці сапраўды існаваў?

Я азірнуўся і ўбачыў перад сабою маладую дзяўчыну. Яе вялікія шэрыя вочы запытальна пазіралі на мяне, а чорныя валасы падалі на блакітную сукенку такога пакрою, што мне на імгненне падалося, ці не сышла яна толькі што з палатна вядомага мастака.

Крыху ачомаўшыся, я адказаў:

– Чаму існаваўу? Ён ёсць і цяпер, магчыма, нават знаходзіцца тут, побач з намі...

– Вось як?! – сцішаным голасам усклікнула яна і хуценька азірнулася.

Але побач нікога не было. Толькі ў самым кутку сядзела, ледзь стрымліваючыся, каб не задрамаць, старэнькая бабуля-назіральніца.

Калі мы выйшлі з Эрмітажа, яна ўзяла мяне за руку і амаль сілком пацягнула да чорнай “Волгі”. Пасля хуценька адкрыла заднія дзверцы і першая сiганула на мяккае сядзенне. Я хацеў закрыць дзверцы ды зрабіць таемнай незнаёмцы ручкай, але яна закрычала:

– Ты што?! Сядай побач, прамокнеш!

Толькі я ўсеўся, як маўклівы шафёр імгнення рвануў “Волгу” з месца. На мой здзіўлены позірк дзяўчына прашаптала:

– Машына майго таты, не бойся.

Так я пазнаёміўся з Вікай, якая жыла на Васільеўскім востраве, зусім непадалёку ад нашага інтэрната. Яна ў той час вучылася ва універсітэце.

З таго часу і пачаліся ў нас шчаслівыя спатканні. Хаця, хачу адразу ж сказаць, што мне чамусьці заўсёды было боязна не толькі яе абняць, але і дакрануцца да яе цёплых далоняў... Незразумелая, нябачная сіла ўтрымлівала мяне. Я нават іншы раз лавіў сябе на думцы, што і сапраўды баюся Вікі. Праўда, да сябе ў дом яна ніколі не запрашала, дый я і не набіваўся.

Але аднойчы, дзесьці так а дзесятай гадзіне вечара, калі я галодны, як той воўк у Піліпаўку, плёўся ў свой інтэрнат, мяне пераняў нечаканы дожджык. Імгненна наляцеў, ды такі спорны, што я не раз-

думваючы сігануў у тэлефонную будку, насупраць якой якраз і месціўся вялізны гмах-будынак, дзе жыла Віка.

Я вазьмі ды і пазвані ёй. Думаў, што яна ўладкоўваецца ў ложак, падрыхтаваўся пажадаць прыемных сноў, а яна спакойна мяне выслухала і запрасіла на каву...

Такога я не чакаў. Прызнаюся шчыра – збянтэжыўся, разгубіўся і зноўку чамусьці апанаваў страх. Але адступаць не было куды, і я рашуча накіраваўся да знаёмага пад'езда.

Віка сустрэла мяне ў шыкоўным японскім халаціку, які проста асляпляў, бо зіхацеў на ёй усімі колерамі вясёлкі...

З даволі прасторнай прыхожай мы прайшлі праз вялікую залу і апынуліся ў пакоі Вікі. Нічога лішняга тут не было: ложак, пісьмовы стол ля самага акна са шматлікімі шуфлядамі, люстэрка, а на сценах знаёмыя па Эрмітажы карціны знакамітых мастакоў. У самым куце стаяў тэлевізар, а на століку месціліся два тэлефоны – белага і чырвонага колеру. Дыхалася вольна, а ўсё з-за таго, што дом быў дарэвалюцыйнай пабудовы, – да столі было метры чатыры, а то і больш.

– Прысаджвайся, – Віка не зводзіла з мяне сваіх насмешлівых вачэй.

Я адразу ж усеўся ў прыземістае мяккае крэсла, якое стаяла побач са столікам, і з прыемнасцю адкінуўся на яго паслужлівую спінку. Віка ўселася насупраць.

– Можа, апрача кавы яшчэ чаго жадаеш, бо, пэўна ж, прагаладаўся.

Яна пазірала на мяне і ўсміхалася. І тут у мяне адразу ж прапаў страх, бо я адчуў нейкі падвох: запрасіла на каву, а сама нават з месца не зварухнецца, ды яшчэ здзекліва пасмейваецца, быццам не ведае пра студэнцкае жыццё.

"Але зараз, галуба, я табе пакажу!" – у думках узлаваўся я, а сам, зрабіўшы паблажлівую міну на твары, са спачуваннем зірнуў у яе нахабныя вочы і прамовіў:

– Перад кавай нядрэнна было б паласавацца ўсмажанай куркай з мясным салатам, дый бутэлька шампанскага не была б лішняю.

Віка спакойна мяне выслухала, а пасля зняла трубку з чырвонага тэлефона і камусьці паўтарыла мой заказ.

І літаральна хвілін праз дзесяць у пакой увайшла сапраўдная горнічная, якіх я бачыў толькі ў кінафільмах. Жанчыне было гадоў трыццаць: у карычневай сукенцы, беласнежным фартушку і такім жа чэпчыку на галаве, які ахопліваў толькі з бакоў яе каштанавыя валасы, прыгожа ўкладзеныя каронай. У руках яна трымала бліскучы, мне нават на імгненне падалося, ці не з чыстага срэбра, паднос, на якім загадкава паблісквала сваім коркам бутэлька шампанскага, была вялізная курыца, як потым аказалася – то быў певень, і мясны салат.

Усё гэта жанчына моўчкі паставіла на столік, а пасля ціха прамовіла:

– Смачна есці.

– Каву я сама згатую, – сказала ёй Віка, – можаш адпачываць.

Жанчына выйшла.

– Гэта наша хатняя работніца, – прамовіла Віка.

І толькі пасля, калі мы асушылі бутэльку, а ад пеўня засталіся адны костачкі, я, пацягваючы духмяную каву, урэшце зразумеў, што трапіў у вельмі заможную сям'ю. Аказалася, што бацька Вікі кіраўнік вышэйшага рангу – усё будаўніцтва ў Ленінградзе ідзе пад яго апекай. А маці таксама шышка – доктар навук, выкладае ва універсітэце. Я ніколі не думаў, што існуюць шасціпакаёвыя кватэры.

"Вось табе і Віка", – думаў я, няспешна чохаючы ў свой інтэрнат пасля такой шыкоўнай вячэры. Прызнаюся шчыра – наеўся, як казаў калісьці мой дзед, "ад пуза".

Але, на вялікі жаль, тая вячэра аказалася апошняй, бо ў далейшым здарылася вось што. Аднойчы

я выпадкова даведаўся, што ў нашай інстытуцкай бібліятэцы, акрамя тэхнічнай літаратуры, ёсць яшчэ і мастацкая.

Калі я зайшоў у спецыяльную залу, то вочы разбегліся ад паліц з кнігамі. Я падышоў да адной з іх і ўзяў у рукі вялізную па фармаце і даволі тоўстую кнігу ў карычневай вокладцы. Там былі вершы Аляксандра Блока. Я прывык да танюткіх кніжак знакамітага паэта, а тут трымаў у руках важкі том 1912 года выдання.

Адгарнуў наўгад і прачытаў:

“Твоё ложе – мой Храм и мой дом,
Грудь твоя – две лампады в нём,
Не нужна мне иная награда,
Только стать бы мне звонарём
И лампадщиком в Храме твоём!”

Я аслупянеў. Ніколі не думаў, што ў Блока ёсць такія радкі... Пагартаў далей, а там:

“В тёмной комнате ты обесчещена,
Светлой улице ты предана...
Ты идёшь – красивая женщина,
Ты – пьяна”.

І калі бібліятэкарка, даволі прывабная жанчына ў гадах, з пышнымі сівымі валасамі, зрабіўшы запіс у маю картку, перадавала мне ў рукі тую кнігу, то ціха прамовіла:

– Беражыце яе. Адзіны экземпляр. Я заўсёды хвалююся, калі яна пакідае бібліятэку.

Яна ставілася да кнігі як да жывой істоты. Запомніўся погляд яе сумных і ў той жа час пяшчотна-ўпрошваючых вачэй. Нават цяпер, калі прайшло столькі гадоў, бачу перад сабой яе дрыготкія рукі, усю яе постаць...

Кнігу я нікому не паказваў. Чытаў крадком, вечарамі, калі ўсе ў пакоі засыналі, бо ў мяне была настольная лямпа, дый ложак стаяў воддаль ад другіх, ля самага акна.

І ўсё-ткі спакусіў мяне д’ябал. Як ні трымаўся, але аднойчы паказаў тую кнігу Віцы. У яе дома

была цудоўная бібліятэка, якая займала асобны пакой. Там было столькі кніжак, што я быў упэўнены – мая яе не зацікавіць.

І якое ж было маё здзіўленне, калі яна ўважліва прагледзела кнігу, а пасля сказала:

– Вельмі шыкоўная кніжка! З такім фарматам у мяне ўжо ёсць кнігі Пушкіна, Лермантава, Талстога. І Блок якраз завяршыў бы гэтую геніяльную серыю. Як думаеш? – спытала яна і, падышоўшы да паліцы, асцярожна паставіла маю кнігу побач.

– Але гэта немагчыма! – я хуценька ўзяў кнігу ў рукі. – Яна з інстытуцкай бібліятэкі!

– Ну і што? Скажаш – скраў нехта ў інтэрнаце, а я заплачу ў дзесяцікратным памеры, а то і больш. Грошы ў мяне ёсць. Думаю, што трыста рублёў тваю бібліятэкарку задаволяць, як думаеш?

Я моўчкі пазіраў на яе, бо ледзь стрымліваў сябе, каб не сказаць ёй усё, што пра яе думаю. Але Віка ўспрыняла маё маўчанне па-свойму, бо праз некаторы час дадала:

– І ты ў накладзе не застанешся – атрымаеш тысячу рублёў. Купіш сабе матацыкл з люлькай. Прыедзеш на ім дадому, парадуеш дзеда з бабуляй.

Матацыкл быў маёй марай, і Віка пра гэта ведала.

– Я падумаю, – чамусьці шэптам прамовіў я, – але пакуль пакінуць кнігу ў цябе не магу. Дый спяшаюся, позна ўжо...

Мне хацелася як мага хутчэй пакінуць гэтую кватэру, бо зноўку апанаваў страх... Мне падалося, што вось-вось у пакой уварвуцца незнаёмцы ў масках, адбяруць кнігу, а самога звяжуць вяроўкамі ды засунуць у вялізны мяшок.

Я развітаўся з Вікай і хуценька падаўся ў прыхожую. Паспрабаваў сам адчыніць дзверы, але там былі ажно тры замкі. Урэшце падышла Віка і выпусціла мяне на волю.

Божухна мой! Да чаго я быў рады, калі ледзь не подбегам шыбаваў у свой інтэрнат, моцна трымаючы пад пахаю кнігу знакамітага паэта.

Але дзесьці так пад вечар наступнага дня загаварыў у маёй душы маленькі “чорны” чалавечак, які жыве ў кожным з нас...

“Згаджайся, – лісліва-танклявым голасам нашэптваў ён мне, – падумаеш – кніга. Ну і што?! Многія губляюць, тут няма нічога дрэннага!”

І да таго надакучваў мне, што я ажно раззлаваўся, сам не ведаючы на каго...

А ноччу мне прысніўся сон. Быццам знаходжуся ў незнаёмым пакоі, у якім няма ні вокнаў, ні дзвярэй. Сяджу на канапе, як раптоўна з’явілася Віка ў сваім раскошным японскім халаціку з пагарджальна-з’едлівай усмешкай на твары. Яна паволі набліжалася да мяне...

І тут – які жах, за два крокі ад канапы, на маіх вачах, яна паступова пачала губляць сваё аблічча і ператварылася ў сапраўднага д’ябла. Добра бачу маленькія вочкі, у якіх блукаў злосны агеньчык, твар у рабацінні, усё цела ў поўсці, вялізныя зубы з ікламі, а на галаве невялічкія рожкі. З адзення толькі чорныя штаны да каленяў, а з азадка звісаў сапраўдны хвост.

Д’ябал, усміхаючыся, набліжаўся да мяне выцягнуўшы наперад валасатыя рукі з вострымі і даўжэзнымі пазногцямі...

– Што, – урэшце прамовіў ён, – прадаў мне сваю душу за тысячу рублёў, га?! – і, дзіка прарагатаўшы, хуценька дадаў: – Аніякай Вікі на свеце няма! Гэта я быў у яе абліччы – я!

І ў гэты момант ён спрабуе схапіць сваімі рукамі мяне за горла. Я порстка адхіляю галаву назад, моцна ўдараюся ёю ў сцяну і... прачынаюся. Хлопцы спакойна пахрапваюць у сваіх ложках, а ў пакой праз акно спрабуе зазірнуць месяц. Узрадаваны, што гэта быў толькі сон, я выціраю насоўкаю ўспацелы лоб, а пасля дастаю з чамадана, што быў пад ложкам, запаветную кнігу. Асцярожна пагладжваю яе вокладку, а пасля кладу пад падушку. Толькі пад раніцу ўдалося крыху здрамнуць.

У той жа дзень аднёс кнігу ў бібліятэку. І адразу ж адчуў на душы палёгку. Было такое адчуванне, што здаў урэшце самы цяжкі свой жыццёвы экзамен.

З тае пары я пачаў баяцца прыгожых дзяўчат. Вось такая атрымалася гісторыя, шаноўнае спадарства, з якой і пачаліся мае доўгія халасцяцкія гады.

Але я не шкадую, не! Пабрэндаў па свеце, нагледзеўся розных дзівосаў, дзе толькі не давялося пабываць. Але пра свае вандроўкі раскажу іншым разам. Сцеражы вас усіх Бог!

## Галінка бэзу

У першай памяці бачу заплаканы твар нашай суседкі цеткі Клаўдзі. Я прачнуўся ад яе пацалункаў у сваім маленькім ложку і ўсё ніяк не мог зразумець, чаго яна плача.

– Вайна скончылася, уставай.

Яна яшчэ нешта сказала маёй маці і знікла.

– А чаго яна плача, мама?

– Ад радасці, вайна скончылася, усе дадому вернуцца, і наш татка прыедзе.

Свайго бацьку я не памятаў. Бачыў толькі фотаздымак, дзе ён такі малады, з усмешкай на твары, трымае на руках малюсенькае, загорнутае ў пялёнкі дзіця, якое мне не вельмі падабалася. Але мама ўпарта растлумачвала мне, што гэта я. Яшчэ памятаю, як, адпраўляючы лісты на фронт, яна абводзіла алоўкам маю далоньку, кожны пальчык. І я заўсёды прасіў яе напісаць татку, каб ён прывёз маленькую, але сапраўдную стрэльбу.

І вось такая доўгачаканая перамога! Мама вельмі чакала пісьма. Нарэшце і да нас зайшоў паштальён. Мама чытала маленькую паперку і плакала.

Праходзілі дні, вярталіся дадому салдаты. Кожны дзень хадзілі жанчыны на станцыю сустракаць цягнікі, якія бясконцым патокам ішлі з захаду на ўсход. На нашай станцыі якраз спыняліся, бо паравозы набіралі ваду. Мне вельмі хацелася туды схадзіць, але маці забараняла. І тады я ўцёк.

Што там рабілася! Салдаты, змучаныя, але шчаслівыя, весела смяяліся, набіралі ў кацялкі ваду, пыталіся пра самагонку, абдымалі маладых жанчын і дзяўчат. Амаль усе з медалямі, у

гімнасцёрках і мундзірах, пажылыя і маладыя, а некаторыя без рукі або нагі – усе ехалі дадому.

Я ведаў, што дома пападзе ад маці, але думаў – раптам прыедзе мой татка? Вось тады вернемся ўдвух і парадуем яе.

Але цягнік адыходзіў, наша маленькая станцыя заціхала, а таткі не было. Усе разыходзіліся, і я плёўся дамоў. Спачатку мама вельмі сварылася, але потым перастала...

І вось аднойчы, калі цягнік адышоў, на пероне застаўся адзін салдат, з рэчавым мяшком і без нагі. Ён азірнуўся, закінуў на плечы мяшок і, узяўшы мыліцы, пайшоў у кірунку нашай вёскі. Сэрца маё трывожна забілася. Можа, гэта мой татка? Без нагі?! Не можа быць, як жа ён касіць будзе?

Я не хацеў, каб гэта быў ён. Пайшоў услед за ім. Калі прайшлі палову дарогі, салдат прыкмеціў мяне. Я спыніўся.

– Бачу, нам да дарозе? Як цябе зваць?

– Міша я. Піліпаў сын.

Мы ўселіся ля дарогі.

– Піліпаў сын, гаворыш, які з Зарудзіч?

Я моўчкі кіўнуў.

– Вось яно што!

Ён дастаў вышыты кісет, скруціў цыгарку і са смакам зацягнуўся некалькі разоў.

– Войтавы вы, так?

– Войтавы. А вы што, нас ведаеце?

Я глядзеў на яго шматлікія медалі, што зіхацелі на гімнасцёрцы.

– Ведаў я твайго бацьку, прызываліся ў адным годзе, ды і ваявалі амаль што разам. Ён толькі пры гарматах быў, а я ў разведцы.

Ён уважліва пагладзеў на мяне, узлахмаціў шурпатай далонню мае валасы і дабавіў:

– Вось цяпер пазнаю: ты, брат, дакладная копія бацькі – і нос, і вочы, увесь у яго. Дык ты што ж – ходзіш яго сустракаць на станцыю?

– Кожны дзень хаджу, а мама плача. Ліст прынеслі, што загінуў ён, а я не веру. Бо татка абяцаў вярнуцца і стрэльбу мне прывезці. А можа, вы яго бачылі?

Ён паглядзеў на мяне, потым абняў за плечы і прытуліў да сябе.

Калі адпусціў, я ўбачыў дзве слязінкі, якія паволі цяклі па яго пачарнелым твары.

– Вось паглядзі, што я табе прывёз.

Ён пачаў дрыготкімі рукамі развязваць свой мяшок. Дастаў дзве пліткі шакаладу, цукеркі, круглыя пернікі.

– Бяры, гэта ўсё табе.

Такі шакалад я ўжо каштаваў. Яго аднойчы дала мне на вуліцы Света, яе бацька шмат прывёз. “Вось цяпер і яе пачастую”, – падумаў я. А то яна ўсё пыталася: “А мне што дасі?”

– І гэта табе, на, трымай.

Ён падаў мне штосьці прадаўгаватае і бліскучае. Гэта быў губны гармонік.

– Ну што, засядзеліся мы з табою, – ён дастаў невялікую прыгожую хустку, зláжыў усё і скруціў у вузельчык.

– Занясі дадому. Скажы маме, што гэта ваш татка прыслаў, а перадаў дзядзька Пеця. Праз дзянёк-другі зайду да вас.

Калі мы дайшлі да развілкі дарогі, ён спыніўся.

– Ну, мне сюды, у Вётхава.

– А вы татку майго не бачылі?

Дзядзька Пеця палажыў мне руку на плячо і ціха прамовіў:

– Ты не хадзі больш на станцыю, добра? Я заўтра прыйду да вас і ўсё раскажу.

Дома маці доўга распытвала мяне, а калі я развязаў вузельчык, абняла, моцна прыціснула да сябе і заплакала:

– Сірацінка мая залатая! Усё ходзіць, усё збірае, хто што дасць. Божачка ж мой, як нам жыць?!

Яна яшчэ доўга плакала, і мне было вельмі шкада яе.

Дзядзька Пеця прыйшоў да нас толькі праз чатыры дні. На жаль, ён быў без пагонаў і медалёў. Маці ўзрадавалася, паставіла на стол пляшку самагонкі і пачала рыхтаваць закусь.

– Не турбуйся, Галя, і так два дні моклі ў ёй. Вось каб сырадою халодненькага, то не адмовіўся б.

– Зараз пагляджу, дзесьці павінна быць!

Яна пайшла ў склеп і прынесла цэлы жбан. Дзядзька Пеця выпіў два кубкі.

– Халодненькі, чарцяка!

Потым маці ціха спытала:

– Пеця, раскажы, як усё было.

Ён змоўк, дастаў кісет і, не спяшаючыся, пачаў скручваць цыгарку. Потым доўга расказваў, як галадалі пад Ленінградам, як трапілі аднойчы ў акружэнне, што рабілася ў Берліне...

– Ой, Галя, колькі там хлопцаў палягло за адзін тыдзень да заканчэння вайны! І Піліп твой загінуў у Берліне, у вулічных баях. Адным снарадам увесь іх разлік накрыла. Гарматы нашы паблізу стаялі. Падбег я, а яго крыху зямлёю прысыпала. Ну, думаю, жывы застаўся, а ён толькі губамі прашаптаў штосьці – і усё, заціх. Пахавалі іх тут жа ў скверы, пад вялікім кустом бэзу. Я тады яшчэ галінку адламаў і палажыў вось у гэтую кнігу.

Дзядзька Пеця разгарнуў паперу, і я ўбачыў вялікую тоўстую кнігу.

– Вершы Лермантава 1900 года выдання. Піліп яе на вуліцы ў Ленінградзе падабраў і ўвесь час з сабой насіў.

Мама ўзяла кнігу, адгарнула і асцярожна дакранулася да маленькай засохлай галінкі бэзу. Яна доўга моўчкі гладзела на яе, і чуваць было, як слёзы капалі на пажоўклыя старонкі.

А вечарам, калі дзядзька Пеця пайшоў, яна чытала мне вершы і апавяданні пра маладога афіцэра, які ўкраў дзяўчыну, пра разбойніка Казбіча і яго цудоўнага каня...

Прайшлі гады. Я скончыў школу, працаваў. Потым мяне прызвалі ў армію. Тады ўпершыню я ўбачыў горад, дзе ваяваў мой бацька. Пабываў і на Піскароўскіх могілках. З та́го часу хаджу туды заўсёды, як прыязджаю ў Ленінград. Там таксама цвіце духмяны бэз, як і над магілай майго бацькі.

## ЗМЕСТ

### АПОВЕСЦІ

Апошні сезон ........ 6
Фіктыўны шлюб ........ 122
Грэшнік ........ 177

### АПАВЯДАННІ

Тэлеграма ........ 246
Мой сябар Венька ........ 268
Бабуліна нявеста ........ 283
Лета ў Макаце ........ 303
Здарэнне ў Бярозаўцы ........ 313
Двухтомнік ........ 329
Шабашнікі ........ 339
Партрэт ........ 353
Матрос з яхты “Штандарт” ........ 367
Падсвечнік ........ 372
Малітоўнік ........ 380
Незнаёмка з Эрмітажа ........ 385
Галінка бэзу ........ 393

Літаратурна-мастацкае выданне

**САВОСЬКА** ПАВЕЛ ПІЛІПАВІЧ

**АПОШНІ СЕЗОН**

Аповесці, апавяданні

Адказны за выпуск *Уладзімір Гніламёдаў*
Рэдактар *Андрэй Федарэнка*
Дызайн вокладкі *Сяргей Ждановіч*
Вёрстка *Ганна Кот*
Карэктар *Марына Салавей*

Падпісана да друку 01.07.2009. Фармат 84 х 108 1/32
Папера афсетная. Гарнітура "Candara". Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 23,0. Ул.-выд. арк 26,3. Наклад 200 асоб.
Замова 256.

Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства "Галіяфы"
ЛИ № 02330/0150300 ад 08.04.2008 г.
Вул. Брылеўская, 11-44, 220039, г. Мінск.
E-mail: vish@bk.ru
www.goliafy.com

Паліграфічнае выкананне:
Сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю "Медысонт".
ЛП № 02330/0150444 ад 22.01.2004 г.
Вул. Ціміразева, 9, 220004, г. Мінск.



**Павел Савоська** нарадзіўся ў 1941 годзе ў вёсцы Зарудзічы Смарганскага раёна. Пасля заканчэння Залескай сярэдняй школы і Друйскага тэхнічнага вучылішча, служыў у Савецкай Арміі. Нейкі час працаваў настаўнікам, экскаватаршчыкам, грузчыкам і плытагонам на лесанарыхтоўках у Сібіры. Скончыў Ленінградскі горны інстытут. Працаваў на Чукотцы горным майстрам, геолагам у старацельскіх арцелях "Дальняя" і "Мінерал". Займаўся бура-падрыўнымі работамі на Паўднёвым Урале, Казахстане і Латвіі. Быў старшым майстрам на Віцебскім аб'яднанні "Кераміка". Працаваў у газетах "Культура" і "Кнігарня". Друкаваўся ў часопісах "Полымя", "Маладосць", "Работніца і сялянка". Адзін з аўтараў калектыўнага зборніка "Краю мой – Нёман". Выдаў кнігі прозы "Ранішняя дарога" і "Запіскі халасцяка". Цяпер працуе тэхнікам у фірме "ЭПАМ – сістэмз". Жыве ў Мінску.

ВЫДАВЕЦТВА
ГАЛІЯФЫ

ISBN 978-985-6906-25-4
9 789856 906254

Павел Савоська

АПОШНІ СЕЗОН